Яўген Сямашка

# на Беларусі

Яўген
Сямашка

# Армія Краёва на Беларусі

Мінск

Беларускае выдавецкае Таварыства "Хата"
1994

ББК 68.46
С 30
УДК 355.35 (438+476) (091)+(947.6+943.8)
Рэцэнзенты: прафесар, доктар гіст. навук А. Ф. Хацкевіч, дацэнт, кандыдат гіст. навук Б. З. Даўгатовіч.

Сямашка Я. І. Армія Краёва на Беларусі.-- Мн.: Беларускае выдавецкае Таварыства "Хата". 1994.--416 с.
ISBN 985-6007-09-7

Гэту кнігу пачытае беларус, паляк, рускі, украінец, літовец. Успрымуць неадназначна. Але не застануцца абыякавымі. Ніхто.

Перакананасць наша ад ведання матэрыялаў, фактаў. Прыведзеныя дакументы, верыцца, нікога не пакінуць абыякавым. Ні таго, каго саджалі, ні таго, хто саджаў.

Дзейнасць Арміі Краёвай на Беларусі да гэтага часу фактычна "белая пляма" для нашага чытача. Пры напісанні кнігі аўтар выкарыстаў шматлікую літаратуру, выдадзеную на Захадзе, асабліва ў Польшчы, матэрыялы архіваў. Многія прыведзеныя ў кнізе дакументы друкуюцца ўпершыню. Ахопліваюцца падзеі ад верасня 1939 г. да жніўня 1954 г.

Дадзены слоўнік незразумелых слоў і тэрмінаў.

Для масавага чытача.

С $\frac{1303000000}{\text{ISBN 985-6007-09-7}}$ 14--94

ББК 68.46
БВТ "Хата", 1994
Я. І. СЯМАШКА 1994

## ТРЭБА РАСЧЫСЦІЦЬ ПОЛЕ

### Уступнае слова аўтара

Ранняя вясна 1957 года. Паўстанак. Прыкладна пяцьдзесят кіламетраў да Літвы і сто да Польшчы. Сонечна, холадна. Дзьме сухі, пранізлівы вецер. На высокім чыгуначным насыпе стаю з бацькам, чакаем прыгараднага поезда. Побач -- мужчыны з ваколіцы, рабочыя, едуць на другую змену. Пыхкаюць самакруткамі, вядуць няспешную размову пра жыццё-быццё. Падышоў яшчэ адзін пасажыр. Прывітаўся, спыніўся непадалёк, павярнуўся плячыма ў бок ветру, таксама закурыў, моцна закашляўся. Незнаёмцу гадоў пад сорак, у яго выхудлы, бледны твар. Адзеты ў ватнік цёмна-шэрага колеру, на нагах кірзавыя боты, на галаве -- паношаная выцвілая кепка, якая калісьці, пэўна, была чорнай. Мужчыны на імгненне прыціхлі, затым адзін спытаў напаўголас:

-- Хто гэта?

-- А ты што -- не пазнаў? -- таксама паціху прамовіў другі.

-- Рышард Кміта вярнуўся. Памятаеш, у Станкевічах жыў. Чуў я, у Варкуце сядзеў, на шахце тыраў. Відаць, хапануў ліха. Паслухай, як бухае -- нібыта ў бочку.

-- А-а-а... Чаму ж не памятаю. У белых* служыў. Бач, давалі ні то пятнаццаць, ні то ўсе дваццаць, а ён, выходзе, і дзесяці не адсядзеў.

-- Вось яно як, выходзіць, не такія яны і вінаватыя былі,- заўважыў хтосьці з размоўцаў.

-- Кінь-кінь,-- далучыўся да гутаркі чалавек у форменай фуражцы чыгуначніка.-- У нас проста так не сядзяць. Было за што.

-- Садзілі, ды яшчэ як,-- запярэчыў чыйсьці голас.-- Вазьмі тыя ж Станкевічы. Мужчынаў хапалі, разумею, было за што. А жанчынаў бралі за што? Нават з груднымі дзяцьмі звозілі. Усю вёсачку дачыста вымялі. Ды і мужчыны не ўсе былі замешаныя. Хоць бы гэты Рышард. Чым правініўся? Брат яго старэйшы, Антак, той сапраўды з

---

* Мясцовае насельніцтва заходняй часткі Беларусі ў час мінулай вайны савецкіх партызанаў назвала "чырвонымі", удзельнікаў Арміі Краёвай -- "белымі", альбо легіянерамі, польскіх партызанаў, якія падпарадкоўваліся савецкаму камандаванню,-- "зялёнымі".

карабінам швэндаўся. А Рышард увесь час дома сядзеў, са старым гаспадарку цягнуў. Нічога дрэннага не рабіў. А замялі.

-- Скуль ведаеш?-- не пагаджаўся чыгуначнік.-- Дыму без агню не бывае...

Загудзеў паравоз, размова абарвалася гэтак жа раптоўна, як і пачалася. Усе кінуліся да вагонаў. У дарозе бацька неахвотна паддаўся на мае роспыты, коратка паведаў пра драматычныя падзеі, надараныя тут у канцы красавіка 1949 года, пра горкі лёс жыхараў невялічкай вёскі Станкевічы на Лідчыне.

У адной з яе хатаў спынілася на начлег група "белых". На досвітку яе акружылі энкавэдзісты, як называлі жыхары супрацоўнікаў дзяржбяспекі. Завязалася перастрэлка. Страты былі з абодвух бакоў. Частцы начлежнікаў удалося вырвацца з акружэння, уцячы.

Жыхары Станкевічаў спазналі пекла.

Так я ўпершыню, яшчэ ў дзяцінстве, пачуў у вагоне поезда пра акаўцаў*.

На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў на тэму Арміі Краёвай (АК) на Беларусі ляжала табу. Нельга сказаць, што пра яе зусім не ўспаміналася публічна. Але тыя звесткі, якія траплялся ў друку, давалі няпоўную і, што горш ад усяго, скажоную карціну. Напрыклад, у "Советским энциклопедическом словаре" 1987 г. выдання сказана: "Армія Краёва ў 1942--1945 дзейнічала пад кіраўніцтвам польскага эмігранцкага ўрада ў акупаванай фашысцкай Германіяй Польшчы. Кіраўніцтва АК арганізавала і пачало Варшаўскае паўстанне 1944".

Як быццам аўтар энцыклапедычнага артыкула не ведаў, што Армія Краёва дзейнічала ў Заходняй Беларусі і ў Заходняй Украіне, на тэрыторыі Літвы і нават Латвіі, быццам ён не чуў пра працэс шаснаццаці ў Маскве ў чэрвені 1945 г. і пра тое, што здарылася з рэшткамі фарміраванняў АК у пасляваенны час.

У беларускай гістарычнай і мемуарнай літаратуры дастаткова добра адлюстравана баявая садружнасць беларускіх і польскіх партызанаў пад лозунгам "За вашу і нашу свабоду!". Яны мужна змагаліся ў савецкіх партызанскіх брыгадах і злучэннях, у асобных польскіх атрадах і групах пад кіраўніцтвам Вацлава Альхімовіча і Адама Свентажэцкага.

Нямала старонкаў гэтай тэме прысвечана і ў 3-томным фундаментальным даследаванні "Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков".

А дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай, калі не лічыць некалькі ўрывачных звесткаў у газетных артыкулах апошніх гадоў, для беларускага чытача да гэтага часу застаецца "белай плямай" гісторыі. Замоўчвалася. Як і замоўчваліся прычыны Катынскай трагедыі. Рабілася гэта, каб пазбегнуць складанасцяў у адносінах -- і без таго азмрочаных мноствам супярэчнасцяў імклівага

---

*У Польшчы вымаўляюць і пішуць -- акоўцы.

дваццатага веку -- паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі, а таксама з-за боязі вярэдзіць незагоеныя раны ад рэпрэсіяў.

Даваў сябе адчуваць навязаны зверху і падхоплены знізу беспрынцыповымі гісторыкамі і аўтарамі мемуараў антыгістарызм. Доўгі час многія падзеі і з'явы мінуўшчыны асвятляліся ў крывым люстэрку. Замоўчванне і скрыўленне да дабра не даводзяць. Падзеі былога ўсё часцей асвятляліся хлусліва -- за рубяжом і ў нас.

Людзям патрэбна праўда, якая б горкая яна ні была. І калі мы не на словах, а на справе хочам добрасуседскіх адносінаў з палякамі -- а гэтага якраз і патрабуюць доўгатэрміновыя інтарэсы незалежнай Беларусі,-- мы павінны перш за ўсё расчысціць поле, на якім хочам сустракацца з суседзямі, ад непаразуменняў.

Адным з метадаў такога ачышчэння з'яўляецца ўзаемнае праўдзівае асвятленне ўсіх выкрунтасаў і закутаў гісторыі. Мы не хочам нікога асуджаць, хваліць, папракаць. Мы хочам зразумець -- сябе, сябра, суседа. Балазе па-сапраўднаму зразумець суседа -- значыць, лепш пазнаць самога сябе.

Каб дайсці да сутнасці падзеяў, адбываных у заходніх абласцях Беларусі ў 1939--1952 гг., трэба звярнуць позірк у мінуўшчыну рэгіёна, пазнаць атмасферу грамадска-палітычнага жыцця ў міжваеннае дваццаціголдзе і напярэдадні нямецкай акупацыі, дакладна ўяўляць расстаноўку сілаў у перыяд фашыстоўскай навалы.

Неабходна памятаць, насельніцтва краю на працягу многіх стагоддзяў перацярпела шэраг сапраўды ўнікальных і беспрэцэдэнтных гістарычных пераменаў, сацыяльна-палітычных узрушэнняў. Вузел, які быў завязаны ў Крэўскім замку (Смаргонскі раён), так і застаўся неразвязаным да апошняга часу -- што б там ні гаварылі палітыкі, якім бы міралюбівым тонам ні былі прасякнуты заявы сучасных дзяржаўных дзеячаў Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. Не сакрэт, што ў гэтых чатырох дзяржавах, асабліва цяпер, калі яны сталі незалежнымі, у некаторых колах грамадстваў, і перш за ўсё ў асяродках інтэлігенцыі, назіраецца незадаволенасць існуючым статус-кво. Ёсць тэрытарыяльныя прэтэнзіі, узнікаюць пытанні ў сувязі з адраджэннем культуры нацыянальных меншасцяў, не ўсё так гладка ў адносінах паміж рэлігійнымі канфесіямі...

А тады, у канцы 14 ст., і феадалы Вялікага княства Літоўскага, і польскія феадалы, прымаючы ўмовы Крэўскай уніі, мелі свой інтарэс. Першыя хацелі на землях ВКЛ аслабіць уплыў Маскоўскага княства, другія -- пашырыць свае ўладанні за кошт беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх земляў.

Па ўмовах уніі Ягайла абавязаўся разам з падданымі прыняць каталіцкую веру. І ён стрымаў слова -- прыняў каталіцтва, атрымаў імя Уладыслаў, ажаніўся з польскай каралевай Ядзвігай і быў абраны каралём, адначасова застаючыся вялікім князем літоўскім. Праз два гады пасля уніі адбылося хрышчэнне літоўскага насельніцтва па каталіцкаму абраду. Пры ўмове прыняцця каталіцтва феадалам выдавалася грамата, у адпаведнасці з якой яны набывалі большыя правы, свабоды і прывілеі. Таму частка беларускіх і ўкраінскіх магнатаў, праследуючы чыста карыслівы інтарэс, таксама пачалі

прымаць каталіцтва і пераймаць польскую мову, змушаючы да гэтага -- дзе бізуном, дзе пернікам -- і сваіх падданых.

На беларускіх землях пачалі ўзводзіцца касцёлы і кляштары, будаўніцтва якіх шчодра падтрымлівалася Ватыканам і каралеўскім дваром. Каталіцкае веравызнанне хацелі зрабіць адзіным на ўсёй тэрыторыі ВКЛ. Але большасць беларускага насельніцтва, асабліва сялянства, захоўвала праваслаўную веру, нацыянальную культуру і мову сваіх продкаў.

Пачалося многавяковае супрацьстаянне і саперніцтва. Яго не змаглі пераадолець ні тры падзелы Рэчы Паспалітай, ні далейшыя войны, паўстанні і рэвалюцыі. У нейкай ступені -- яны засталіся і па сённяшні дзень. Ад трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) улада і дзяржаўнасць тут мянялася сем (!) разоў. Гэты рэгіён -- тэрыторыя шматвяковага сумеснага пражывання беларусаў, палякаў, "тутэйшых", літоўцаў, татараў. Усё гэта, зразумела, наклала свой адбітак на псіхалогію мясцовых жыхараў, іх жыццёвы ўклад, традыцыі, звычкі, характар.

Як вядома, па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышла значная частка заходніх беларускіх земляў. Да пачатку другой сусветнай вайны насельніцтва "Крэсув Всходніх" было падвергнута масіраванай ідэалагічнай апрацоўцы пад знакам нацыяналізму і вялікадзяржаўнага польскага шавінізму. Нацыяналістычная польская прапаганда для свайго ўздзеяння мела даволі багатую спрыяльную глебу. Ні для каго не з`яўляецца сакрэтам, што частку польскага насельніцтва ўсё яшчэ абцяжарвалі крыўды, абразы і прадузятасці рускіх, застаныя з часоў "падзелаў" і царызму, нядобразычча да рускіх перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Сказалася рэха вайны 1920 г., калі Чырвоная Армія (у паняцці людзей -- руская) грабіла, забівала багата мірных людзей. Дарэчы, арміі Тухачэўскага не мелі правіянтных складаў. Забяспечваліся самастойна, самахапам.

Давалі таксама пра сябе знаць рэлігійныя фактары, пазіцыя касцёла.

З другога боку, не забудзем, рэжым санацыі да беларусаў ставіўся як да людзей другога гатунку. Асабліва пакутавала беларускае сялянства. Большасць яго, беззямельнае і малазямельнае, жыло ў крайняй беднасці. Сяляне вымушаны былі працаваць за мізэрную плату ў паноў і асаднікаў сезоннымі рабочымі і парабкамі. За адзін прыём да доктара трэба было плаціць 2 злотыя -- кошт аднаго пуда хлеба.

У пошуках лепшае долі многія выязджалі на Захад. Дастаткова сказаць, што з беларускіх "крэсаў" з 1925 па 1939 г. эмігрыравалі ў Заходнюю Еўропу і Амерыку 78 тысяч чалавек. Безумоўна, у гаротным становішчы жылі і польскія рабочыя, сяляне, рамеснікі. Хваля за хваляй накатваліся масавыя пратэсты. У забастоўках, мітынгах, дэманстрацыях беларусы плячо ў плячо выступалі з польскім працоўным людам.

Але цяжкі сацыяльны прыгнёт беларусаў перамяжоўваўся з

абсалютным нацыянальным бяспраўем. Калі ў 20-х гг. было адкрыта 78 беларускіх школ і 4 гімназіі, то ў канцы 30-х гг. усе яны былі закрытыя. Непісьменным стала амаль палавіна насельніцтва. Нават сама беларуская мова апынулася пад забаронай. Не было нацыянальных тэатраў, пазакрываліся клубы, бібліятэкі, створаныя беларускімі культурна-асветніцкімі таварыствамі. Людзі, якія належалі па сваіму паходжанню, духоўнаму складу, мове да беларускай этнічнай супольнасці, на практыцы былі пазбаўлены права звацца беларусамі. Польскае ярмо для беларусаў было не лягчэйшае ад ярма рускага для паляка. Прыціск пальшчызнаю беларускасці на адвеку беларускай зямлі быў невыносны для кожнага хоць чуць-чуць свядомага, разумнага. Беларускасць пальшчызна заганяла туды, куды немцы, каб не Ягайла са сваімі дружынамі, загналі б польскую нацыю -- у нябыт.

Як немцы ў XIV стагоддзі абнямечвалі Маравію, Сілезію, вярхі кароны Польскай, так палякі вынішчалі ўсё беларускае на "Крэсах Усходніх". На зямлі беларускай.

...Выжылі. Але ўжо не ласкай, ксяндзоўскімі хцівымі абяцаннямі, а сілаю. Пад шыльдаю закону.

Сёння мы жывём у час вострых ацэнкаў і пераацэнкаў мінуўшчыны. Не трэба заплюшчваць вочы на тое, што і зараз асобныя навукоўцы лічаць, быццам жыццё пад Польшчай было вялікім шчасцем для насельнікаў Заходняй Беларусі. Маўляў, такім чынам народу ўдалося пазбегнуць масавых сталінскіх рэпрэсіяў і калектывізацыі.

Іншыя навукоўцы імкнуцца прадставіць уз'яднанне "крэсаў" з Савецкай Беларуссю "насільным далучэннем". Маўляў, "савецкая акупацыя" прынесла народу Заходняй Беларусі адны беды і няшчасці.

Мы не спрачаемся ні з тымі, ні з другімі. Мы не апраўдваем і не ганім. Болей таго, мы запрашаем нас дапоўніць, паправіць.

Вядома ж, няма і не будзе апраўдання ганебным злачынствам перыяду культу асобы. Не забудзем толькі, што і ў вольнай Польшчы часоў Пілсудскага арганізоўваліся карныя экспедыцыі для падаўлення шматлікіх сялянскіх выступленняў, што звычайным фактам польскага грамадскага жыцця сталі суды над рэвалюцыянерамі. "Славутая" Картуз-Бяроза, Віленскія Лукішкі, Гродзенская турма былі перапоўнены палітвязнямі. Усё гэта было. Ніякія спробы затушаваць ці абяліць падзеі даўно праляцелых дзён не дабавяць аўтарытэту перапісвальнікам падручнікаў па гісторыі Беларусі, Польшчы, Расіі, Літвы... Бо яшчэ нікому не ўдавалася нанава перабудаваць мінулае жыццё, якое ўжо не вернеш.

Каб не надта радаваліся цяпер "свабодалюбныя" Англія ці Францыя (не будзем нават успамінаць Германію ці ЗША, Японію ці Аргенціну) нашым славянскім бедам, непаразуменням, самадурству, то няхай абернуцца на сябе і сваё мінулае. Адразу супакояцца. Гэта ў іх цягнуліся войны па 30 і нават 100 гадоў, гэта ў іх стагоддзямі прыцясняюць рэлігійныя фанаты адзін аднаго. У іх і цяпер гучаць узрывы бомбаў, стрэлы. Не сціхаюць усё 20-е цывілізаванае стагоддзе. Успомнім Ольстэр, Ірландыю.

Ёсць сэнс задумацца над тым, што піша чалавек, якога ніяк

нельга западозрыць у сімпатыях да бальшавікоў і Саветаў. Вось урывак з успамінаў пра той час былога ўладальніка маёнтка, у будучым -- паручніка, камандзіра аднаго з буйнейшых партызанскіх атрадаў Стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай Каспера Мілашэўскага:

"Я нарадзіўся 5 лютага 1914 года ў маёнтку Брынічава Стаўбцоўскага павета Навагрудскага ваяводства. Майго бацьку звалі Адольф, а маці -- Элена. Яна паходзіла з сям'і Вераксаў, была ўнучкай удзельніка паўстання 1863 г. Бацькі займаліся сельскай гаспадаркай, у нас было 60 гектараў раллі, так што матэрыяльна нам былося не найгорш.

Зямля ўсходняй Навагрудчыны была заселена народамі дзвюх нацыянальнасцяў. Сярод насельніцтва на паўднёвым захадзе ад верхняга цячэння Нёмана 80 працэнтаў складалі беларусы, а каля 20 -- палякі, у асноўным рэшткі дробнай засцянковай шляхты, уладальнікі фальваркаў і маёнткаў, вайсковыя асаднікі. На паўночны ўсход ад Нёмана ў большасці жылі палякі. Праўда, яны найчасцей карысталіся беларускай мовай, аднак лічылі сябе палякамі, бо належалі да рымска-каталіцкага веравызнання, і сваіх суседзяў з-за Нёмана называлі "рускімі", або "кацапамі". Да асіміляцыі паміж гэтымі этнічнымі групамі не даходзіла, ва ўсякім разе, шлюбы паміж прадстаўнікамі гэтых групаў не заключаліся.

Сацыялістычныя ідэі, праніклыя з-за ўсходняй граніцы, сярод католікаў прыжываліся слаба -- у значнай ступені заслонай на іх шляху з'яўлялася санацыйная структура. Зусім інакш было на супрацьлеглым беразе Нёмана. Народ убогі, гаспадаркі невялічкія альбо зусім карлікаватыя, поўная адсутнасць прамысловых прадпрыемстваў, а значыць, і заробкаў, голад на прадвесні -- усё гэта падштурхоўвала бядноту да шукання нейкага выйсця. Таму прапаганда, асабліва па радыё з Мінску, тут з поспехам уздзейнічала на людзей. Сацыялістычныя лозунгі сярод убогага насельніцтва карысталіся вялікай папулярнасцю. Аднак прыхільнікаў другога грамадскага ладу санацыйныя ўлады садзілі ў турмы ці высылалі ў лагер у Бярозе Картузскай"*.

З гэтых словаў бачна, што не было міру ў грамадстве. Канфлікт выспяваў як на сацыяльнай глебе, так і на нацыянальнай аснове, патрабаваў развязкі.

Для многіх яна надышла нечакана. Ва ўсякім выпадку ніхто і прадбачыць не мог, што верасень 1939 г. з'явіцца крутым паваротам для ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі. Паварот гэты закране ўсіх, нягледзячы на нацыянальнасць, веравызнанне, сацыяльны статус. Адкрывалася новая, нязведаная старонка гісторыі.

Што тычыцца ўз'яднання беларускага народа ў адну сям'ю, то сама наша рэчаіснасць найлепшым чынам пацвярджае справядлівасць і наспелую неабходнасць гэтага гістарычнага акта... Сведка верасснёўскіх падзей 1939 г. народны паэт Беларусі Максім Танк праз

---

* Тут і далей фрагменты з польскіх крыніцаў даюцца ў перакладзе аўтара.

50 гадоў сказаў так: "Ніякім зводкам, рэляцыям, больш познім сведчанням гісторыкаў не пад сілу перадаць той энтузіязм і радасць, з якімі працоўныя Заходняй Беларусі віталі Чырвоную Армію".

Як бы хтосьці цяпер ні гаварыў, якую б гіпотэзу ні вылучаў, ніхто не зможа аспрэчыць былога. На самай справе просты беларускі люд сустракаў новую ўладу з захапленнем, хлебам-соллю, чым мог памагаў ёй. У польскім грамадстве "крэсаў" уз`яднанне беларусаў было ўспрынята з боллю, нават выклікала варожую рэакцыю.

Яшчэ болей узмацнялі такую варожасць грубыя парушэнні законнасці, атмасфера рэпрэсій, падазронасці, недаверу. Сярод розных слаёў польскага насельніцтва выспявала супраціўленне. Калі дакладней, то яно зараджалася адразу пасля прыходу савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Беларусі.

Многія польскія ваеннаслужачыя, у першую чаргу афіцэры, якім удалося пазбегнуць палону, не склалі зброі, перайшлі на падпольнае становішча, хаваліся ў лясах, склепах. Былы сакратар Аўгустоўскага павятовага камітэта партыі Беластоцкай вобласці Мікалай Аўхімовіч успамінае, што толькі ў гэтым павеце ў канцы 1939 г. дзейнічала каля 50 польскіх узброеных групаў. Яны не давалі супакою органам Савецкай улады ні днём, ні ўначы.

Такая сітуацыя, хоць у меншых маштабах, была характэрнай і для іншых паветаў (раёнаў) заходніх абласцей.

Такім чынам, зародкі Арміі Краёвай і папярэднічалых ёй падпольных арганізацый і ўзброеных групаў на беларускай зямлі пачалі з`яўляцца задоўга да прыходу нямецкіх захопнікаў. Польскія даследчыкі сёння не аспрэчваюць гэта.

Разглядаючы прававыя аспекты дзейнасці Арміі Краёвай на Беларусі, гісторыкі з Польшчы прыйшлі да наступнай высновы: змену граніцы пасля 17 верасня 1939 г. польскі бок не мог прызнаць да Патсдамскай канферэнцыі 1945 г., а гэта значыць, поўнасцю правамочным быў загад польскага ўрада ў эміграцыі пра стварэнне ваенных структураў у межах даваенных граніцаў і барацьбе за незалежнасць у межах Другой Рэчы Паспалітай (1918--1939 гг.).

Пагаджацца з такой высновай ці не? Думаем, для кожнага свядомага беларуса гэта пытанне гучыць чыста рытарычна. Рыжскі дагавор быў для беларуса несправядлівым, ён раз`ядноўваў адзінакроўных братоў. Вось чаму ў асноўнай сваёй масе беларускае насельніцтва з непрыхільнасцю ставілася да барацьбы акаўцаў, галоўнай мэтай якой было імкненне павярнуць назад кола гісторыі.

Разам з тым мы павінны аддаць даніну павагі тым удзельнікам Арміі Краёвай, якія змагаліся з фашысцкімі акупантамі, ушанаваць памяць тых, хто загінуў ад нямецкай кулі і застаўся навекі ляжаць у беларускай зямлі.

Трэба разумець, у вачах нашага народа наўрад ці могуць быць героямі тыя, хто пасля ліпеня 1944 і аж да 1954 г. хаваўся са зброяй у беларускіх лясах. Не толькі хаваўся. Ахвяры самі рабілі ахвярамі другіх, невінаватых.

Ваенны, старшыня калгаса, настаўнік, сельсаветчык, доктар,

кінамеханік, член сям'і неўпадабанага чалавека мог загінуць ад акаўца ні за панюх табаку. Пакрыўджаны, неабачна падвучаны на благое, крыўдзіў невінаватых, пладзіў крыўды. Тэрарызавалі беларускія вёскі... бо тут забітыя ўпалоханыя праслаўныя людзі не маглі раскідаць калгас.

На беззаконнае "энкавэдэшнікаў", якія скрыўлялі законы аб памілаваннях і амністыях, яны адказвалі сваім беззаконнем. Беларусы стралялі беларусаў. Удзень -- міліцыя і органы бяспекі, уначы -- акаўцы.

Колькі гэта магло цягнуцца?..

Кніга не прэтэндуе на ўсебаковую і вычарпальную распрацоўку складанай і вострай тэмы. Наша мэта -- паказаць некаторыя важнейшыя вехі дзейнасці Арміі Краёвай на Беларусі, расказаць пра сталыя вядомымі трагічныя выпадкі, якія надоўга азмрочвалі адносіны паміж суседзямі за Бугам, пасеялі недавер і падазронасць паміж праваслаўным і каталіцкім насельніцтвам Заходняй Беларусі.

Мы хочам атрэсці павуцінне плёткаў, чуткаў, домыслаў, свядомай хлусні...

Дык разбяромся. Расчысцім поле ад камення.

# Частка I. ПРАДВЕСНІКІ АК

## ЯШЧЭ ДА ВАЙНЫ

Верасень 1939 г. прынёс насельніцтву Заходняй Беларусі кардынальныя змены ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. Кастрычнік--лістапад характарызаваўся даволі талерантнымі адносінамі савецкай адміністрацыі да мясцовых жыхараў. Польскія чыноўнікі і службоўцы ніжэйшага рангу, акрамя асобаў, належных да рэпрэсіўнага апарату, засталіся на сваіх пасадах, дапамагалі ствараць органы новай улады. Функцыі дзяржаўнай міліцыі выконвала рабочая міліцыя. Ва ўсіх дзяржаўных установах беларуская, польская, руская і яўрэйская мовы лічыліся раўнапраўнымі. Праводзіўся добраахвотны набор насельніцтва на вугальныя шахты Данецкага басейна. Была ўведзена ўсеагульная абавязковая адукацыя для дзяцей і моладзі.

У верасні -- лістападзе 1939 г. 40--50 тысяч польскіх ваеннапалонных -- радавых салдатаў -- былі адпушчаныя на свабоду. Тычылася гэта галоўным чынам тых, хто пражываў на тэрыторыях, занятых Чырвонай Арміяй, перш за ўсё -- украінцаў і беларусаў. Ад верасня да лістапада прыкладна 25--30 тысяч былых польскіх ваеннаслужачых уцяклі з палону ў часе маршаў, пераезду з лагераў, бо, па пазнейшых прызнананнях некаторых з іх, у той час ахова была не вельмі пільнай. Усе яны аселі на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, прычым большасць з іх, як правіла, адразу ўлівалася ў рады падпольнага польскага супраціўлення.

У снежні 1939-- студзені 1940 г. былі нацыяналізаваныя фабрыкі, заводы, банкі і сістэма гандлю. Панская зямля была перададзена ва ўласнасць дзяржавы. У дзяржаўных установах, гандлёвых кропках пачалі ўводзіцца як абавязковыя беларуская і яўрэйская мовы. Правялі нацыяналізацыю жылых памяшканняў. У якасці грашовай адзінкі рубель замяніў злоты. Пасля выбараў у дзяржаўных установах сталі пераважаць беларусы, рускія і яўрэі. Польскіх служачых і настаўнікаў бязлітасна звальнялі. Са школьных праграмаў выключылі вывучэнне гісторыі Польшчы, зменшылі гадзіны навучання польскай мове -- на 50 % у параўнанні з выкладаннем беларускай і рускай. З дзяржаўных будынкаў зніклі шыльды з польскімі надпісамі. Пачалі арыштоўваць падазраваных дзеячаў палітычных арганізацыяў, афіцэраў, паліцэйскіх.

У лютым -- ліпені 1940 г. пачалася рэарганізацыя мясцовых

органаў улады па ўзорах Усходняй Беларусі. Стала праводзіцца калектывізацыя. Выдаваліся пашпарты. Пачаўся першы этап дэпартацыі мясцовага насельніцтва і бежанцаў з цэнтральнай Польшчы* Быў аб'яўлены прызыў у Чырвоную Армію. Закрылі граніцу з немцамі і забаранілі выезд у прыгранічныя раёны.

Са жніўня 1940 г. і па чэрвень 1941 г. сталі трохі лагоднейшыя адносіны савецкіх уладаў да польскага насельніцтва. Польская мова зноў пачала вяртацца ў надпісах на шыльдах дзяржаўных устаноў, назвах вуліцаў і г. д. Вярнулася яна і ў школы. У дзяржустановы пачалі прымаць былых польскіх служачых, настаўнікаў.

У перабудовачныя і постперабудовачныя часы многа сказана і напісана пра заганныя метады сталінскага кіравання ў сферы нацыянальнай палітыкі, назаўжды публічна і афіцыяльна асуджаны злачынствы і рэпрэсіі супраць цэлых народаў, у тым ліку беззаконне і дэпартацыі ў адносінах да польскага насельніцтва, апынулага ў 1939 г. у складзе СССР. Дарэчы, гэтыя бесчалавечныя акцыі сталі адной з важнейшых прычынаў росту польскага супраціўлення Саветам у пасляваенны перыяд.

Так, усё гэта было: здзекі, ссылкі, лагеры, рознага роду ўціскі. Але не трэба кідацца з адной крайнасці ў другую, не трэба маляваць мінуўшчыну адной фарбай -- белай, чорнай ці чырвонай. Паказ жыцця польскага насельніцтва ў азначаны перыяд на тэрыторыі былога СССР як паласу безупыннага нацыянальнага прыгнёту не адпавядаў бы гістарычнай праўдзе. Пра гэта сведчыць практыка культурна-асветніцкай дзейнасці бальшавіцкіх уладаў сярод палякаў Заходняй Беларусі, у тым ліку развіццё народнай асветы на Беласточчыне.

У перадваенны час у былой Беластоцкай вобласці існавала 859 польскіх школаў, у іх займалася больш за 112 тысяч дзяцей, 470 беларускіх школ, іх наведвалі каля 300 тысяч вучняў. У Беластоку, Гародні, іх ваколіцах у той час пражывала каля 300 тысяч жыдоў, пагэтаму пачала ствараццa сетка пачатковых і сярэдніх школаў з жыдоўскай мовай навучання,чаго не было пры Польшчы.

У верасні -- лістападзе 1939 г. у Беластоку было 55 школаў усіх тыпаў, у тым ліку 6 дзяржаўных гімназій, 6 прыватных гімназій, педагагічны ліцэй, гандлёвы ліцэй. У 1940/41 вучэбным годзе на іх базе пачаліся ствараццa тэхнікумы, дзесяцігодкі, сямігодкі, пачатковыя школы. Усе прыватныя навучальныя ўстановы сталі дзяржаўнымі.

Ствараліся новыя школы. Было адкрыта 95 сярэдніх і 108 няпоўных сярэдніх, у тым ліку 47 школаў для польскіх дзяцей і моладзі. Не хапала будынкаў, таму ў Беластоцкай вобласці пад новыя школы былі прыстасаваны 73 былыя маёнткі, якія наведвалі 10 тысяч вучняў. Статыстыка сведчыць, што да пачатку 1940 г. на

* Другі этап дэпартацыі пачаўся ў красавіку 1940 г., трэйці -- у ліпені 1940 г., чацвёрты (незакончаны)-- у чэрвені 1941 г. Усяго з Заходняй Беларусі за гэты час было дэпартавана больш за 120 тысячаў чалавек.

тэрыторыі Заходняй Беларусі існавала на 25 % школ больш, чым год таму.

Калі польскія даследчыкі, былыя і сённяшнія, дапускаем, свядома перакручваюць, уводзяць у зман цяперашняга чытача пра адносіны "праклятых" Саветаў, рускіх, украінцаў і беларусаў да бедных палякаў на "Крэсах Усходніх", то беларускія, рускія, украінскіяператалмачы розных узроўняў паўтараюць іх версіі, на наш погляд, з-за аднаго... гультайства і недасведчанасці. Лянота хадзіць у архіў, пацікавіцца данымі тагачасся; не ведае спраў у школах, бальніцах і ведаць не хоча...

Адбыліся значныя паблажкі для развіцця польскай культуры і мастацтва. У 1940 г. у Беластоку пачаў працаваць дзяржаўны драматычны тэатр. Ім кіраваў Аляксандр Вянгерка. На сцэне тэатра былі пастаўлены спектаклі па творах вядомых польскіх драматургаў: "Інтрыга і каханне" Лявона Шыллера, "Мараль пані Дульскай" і "Панна Малішэўская" Габрыэлі Запольскай, "Пажыццёвая рэнта" Аляксандра Фрэдра, "Кардзіян" Юліуша Славацкага, "Вяселле і лістападавая ноч" Тадэвуша Выспянскага. Дырэктар Аляксандра Вянгерка ўкараняў у тэатры польскую рэвалюцыйную традыцыю і падкрэсліваў, што "тэатр можа быць найлепшым правадніком камуністычнай ідэалогіі ў працоўныя масы". Спектаклі ішлі на польскай мове, на сцэне выступалі папулярныя ў той час акцёры: Ірына Бароўская, Яцэк Вашчаровіч, Севярын Бутрым, Толя Манкевіч, Анатоль Шалаўскі і інш. Пры тэатры, зазначым, паспяхова дзейнічала студыя для моладзі.

У Гародні пад кіраўніцтвам вядомага цяпер маскоўскага дзеяча культуры Сяргея Абразцова быў створаны лялечны тэатр, у ім працавалі Зося Ліснеўская, Ярэма Вальфіш. Такі самы тэатр быў адкрыты ў Навагрудку.

У кастрычніку і лістападзе 1940 г. урачыста адзначалі 85-ю гадавіну з дня смерці Адама Міцкевіча. У склад усесаюзнай камісіі па правядзенні ўрачыстасцяў у гонар вялікага польскага паэта, створанай пры Саюзе пісьменнікаў СССР, побач з іншымі славутымі пісьменнікамі таго часу ўвайшлі Янка Купала, Якуб Колас і Максім Танк. Шматлікія ўрачыстыя мерапрыемствы ў гонар ушанавання памяці Адама Міцкевіча адбываліся ў Мінску, Беластоку, Гародні. У Навагрудку быў адкрыты музей паэта, які існуе і па сённяшні дзень.

16 красавіка 1941 г. бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне пра заснаванне ў Гародні музея польскай літаратуры імя Элізы Ажэшка. Гэтая пастанова з'яўлялася вынікам бязмернага імкнення польскага насельніцтва да захавання сваёй культурнай і літаратурнай спадчыны, беражэння лепшых нацыянальных традыцыяў, з аднаго боку, і сведчыла пра павагу новай улады да тых польскіх дзеячаў, якія ўнеслі важкі ўклад у скарбонку сусветнай навукі і культуры, з другога боку.

З 1 кастрычніка 1940 г. у Мінску пачала выдавацца на польскай мове штодзённая грамадска-палітычная і эканамічная газета "Штандар вольнасці" ("Сцяг свабоды"). Яе галоўным рэдактарам быў паляк з Усходняй Беларусі, пісьменнік і літаратурны крытык Сцяпан

Майхровіч. У склад рэдакцыйнай калегі ўваходзілі Яніна Бранеўская, Людвік Главацкі і Канстанты Ансельм. Галоўны рэдактар у першым нумары абвяшчаў, што "Штандар вольнасці" будзе газетай для шырокіх працоўных масаў палякаў, прызываў да ўдарнай працы ў імя дабрабыту народа і эканамічнага развіцця Беларусі, Савецкага Саюза. Пры гэтым напамінаў пра шматгадовую барацьбу польскага народа супраць буржуазнага і панскага прыгнёту, пра польскія турмы і класавы ўціск. Газета неўзабаве стала надта папулярнай, у яе з`явілася шырокае кола аўтараў, нятштатных карэспандэнтаў, галоўным чынам з Гародні і Беластока. На старонках "Штандара вольнасці" адлюстроўваўся шырокі тэматычны дыяпазон: ад асвятлення эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы, краіне і свеце, праблемаў школьнага навучання і развіцця культуры да разгляду пытанняў з далёкага гістарычнага мінулага польскага народа, перыядаў паўстанняў і нацыянальна-вызваленчых рухаў.

Газеты на польскай мове выдаваліся ў іншых мясцовасцях. Некаторыя з іх, напрыклад "Новэ жыце" ("Новая жизнь") у Граеве, "Нова Ломжа" (Новая Ломжа"), выходзілі на дзвюх мовах адначасова. Акрамя гэтага, не забудзем, на абласных радыёстанцыях былі створаны польскамоўныя рэдакцыі.

Намі прыведзены ўсяго некалькі штрыхоў, якія, магчыма, дадуць сённяшняму чытачу, асабліва маладому, хаця б павярхоўнае ўяўленне пра вельмі складаную, да немагчымасці супярэчлівую і разам з тым жорсткую даваенную рэчаіснасць.

Вярталіся дамоў польскія ваеннапалонныя, хаця далёка не ўсе (яшчэ раз ўспомнім Катынь!), адкрываліся новыя школы, тэатры, праводзіліся ўшанаванні і ўрачыстасці, выдаваліся газеты, дзяліліся паміж галотай і няграматнай польскаю большасцю землі паноў і асаднікаў...

І на фоне ўсяго гэтага арышты, тэрор, дэпартацыі, расстрэлы. Такі быў суровы час. Ён дыктаваў людзям свае, няпісаныя законы, уцягваў у віхуру падзеяў, з якой далёка не ўсе выйшлі жывымі.

Усё ж запамятаем: большасць бедных палякаў (сялянаў, рабочых) вольна ўздыхнула пры "праклятых" Саветах. Дарэчы, як і беларусы, украінцы, рускія. Перакосаў, крыўдаў было мноства, але менавіта пасля 1917 г. стала магчымым жыхару СССР вучыць у тэхнікуме і інстытуце не аднаго, а ўсіх дзяцей (калі яны генна былі здольныя да засвойвання ведаў). Той жа працэс шырокапатокна ішоў і на Заходняй Беларусі. Зпрычыненыя няпраўды вярхам і няпраўдачкі нізам, на наш погляд, нашмат перакрываліся становчым, плюсавым.

Польскія ксяндзы і афіцэры -- разумныя людзі -- ведалі пра мінусы і плюсы старога і новага жыцця. Аднак вярбоўкаў новых і новых рэкрутаў у свае шэрагі не спынялі.

Чаму? Дзеля чаго? Што атрымалі?

На колькі мага аб`ектыўна працягнем свой аповяд далей і на гэтыя пытанні адкажам не мы -- вы самі, паважаныя чытачы.

## АБШАР БЕЛАСТОК

27 верасня 1939 года, напярэдадні акупацыі немцамі Варшавы, на Мокатаўскім лётным полі пабліз сталіцы прызямліўся самалёт. Прыбылы на ім сувязны прывёз з Румыніі пісьмо галоўнакамандуючага

польскімі ўзброенымі сіламі маршала Рыдз-Сміглы. Гэта быў загад кіраўніцтву абароны Варшавы пра стварэнне падпольнай ваеннай арганізацыі. Загад як бы ўзаконьваў, даваў "дабро" на падрыхтоўку канспіратыўнай сеткі. Прадбачылая хуткая капітуляцыя ўжо ішла ў Варшаве поўным ходам.

Тайную арганізацыю назвалі "Служба за перамогу Польшчы" (SZP -- СЗП). Яе кіраўніком быў прызначаны Міхаіл Такажэўскі-Карашэвіч. 13 лістапада па загаду генерала Уладыслава Сікорскага, які ў Парыжы ўзначальваў новы польскі ўрад у эміграцыі і польскія ўзброеныя сілы за мяжой, арганізуецца "Саюз узброенай барацьбы" (ZWZ -- ЗВЗ). З сікораўскім ЗВЗ паступова аб`ядналіся СЗП і шэраг іншых канспіратыўных фарміраванняў.

Дыяпазон уплыву СЗП пашыраўся на тэрыторыю былых "крэсаў". Пра гэта сведчыць іх арганізацыйная структура. Уся тэрыторыя" 2-й Рэчы Паспалітай была падзелена на 6 так званых абшараў. Адзін з іх -- "Беласток". Ён ахопліваў усю Заходнюю Беларусь. Кожны абшар з лета 1940 г. дзяліўся на ваенныя акругі, яны супадалі з межамі былых ваяводстваў. Такім чынам, Беластоку падпарадкоўваліся Палеская і Навагрудская акругі. Віленская акруга, у якую ўваходзіла значная частка беларускай тэрыторыі, уключна Маладзечна і Верхнядзвінск, дзейнічала самастойна.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З дырэктывы генерала Стэфана Равецкага ("Грота"), у будучым камандуючага Арміяй Краёвай, для камендантаў абшараў № 2 (Беласток) і № 3 (Львоў) ад 28 верасня 1940 года: "Зыход чаканага канфлікту паміж Расіяй і Германіяй у дадзены момант прадугадаць немагчыма. Для нас было б лепш за ўсё, калі б немцы атакавалі Расію, знішчылі яе ўзброеныя сілы і аблегчылі тым самым для нас вырашэнне ў будучым пытання аб нашай усходняй граніцы".

Стэфан Равецкі ў час напісання дырэктывы з`яўляўся кіраўніком ЗВЗ. Варта звярнуць увагу, дакумент адрасаваны да кіраўнікоў падпольных структураў на уз`яднаных Заходніх Беларусі і Украіне з СССР у верасні 1939 года.

Далей у дырэктыве падкрэслівалася, што, незалежна ад таго, стане ў будучай вайне СССР саюзнікам Англіі ці не, у любым выпадку пазіцыя ЗВЗ застанецца нязменнай. Пры магчымым наступленні савецкіх войскаў на Захад, што прадвызначала б разгром нямецкай арміі, дырэктыва рашуча патрабавала: "... вы павінны быць гатовымі выканаць мой спецыяльны загад па правядзенні масавых дыверсій і арганізацыі партызанскага руху"*.

Такая ўстаноўка давалася за восем месяцаў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Выданне гэтай агрэсіўнай дырэктывы -- далёка не выпадковы эпізод, а вынік мэтанакіраванай палітыкі. Пераканаўча сведчаць пра гэта многія дакументы. Пра некаторыя з іх пойдзе размова далей.

Але яшчэ задоўга да таго, як у Заходнюю Беларусь нелегаль-

---

* Дакументы камандавання АК цытуюцца па польскамоўным выданні кнігі "Армія Краёва ў дакументах", 1939--1945. Т. 1-5.-- Лондан, 1970--1981.

ным шляхам сталі даходзіць звесткі пра стварэнне цэнтра кіравання падпольнай барацьбой палякаў, тут ужо стыхійна з'явіліся ачагі супраціўлення Савецкай уладзе -- у Гародне, Брэсце, Лідзе, Баранавічах, Маладзечне, вядома ж, у Беластоку, які ў той час уваходзіў у склад БССР, а таксама ў многіх невялікіх гарадах, мястэчках, вёсках. Найбольшая канцэнтрацыя ўзброеных групаў, засталых ад разбітага Войска Польскага, была ў Гродзенскай (Рускай), Рудніцкай, Белавежскай, Налібоцкай і Ліпічанскай пушчах, у Аўгустоўскіх лясах.

Вялізныя лясныя масівы, падтрымка часткай каталіцкага насельніцтва стваралі неблагія ўмовы для існавання нелегалаў.

Па словах польскага даследчыка прафесара Томаша Стшэмбаша, яшчэ ў верасні 1939 г. камандуючы вайсковай групоўкай "Гродна" генерал Юзэф Альшына-Вільчыньскі, калі стала зразумела, што паражэнне непазбежна, вызваў афіцэра па справах дыверсій Францішка Сьленчку і даручыў яму арганізацыю канспіратыўнай работы. Падпалкоўнік Сьленчка пачаў энергічна выконваць даручэнне генерала, але ў пачатку кастрчніка мусіў пакінуць Гародню, пераехаў у Беласток. Яго замяніў афіцэр у званні капітана (прозвішча невядома), які закончыў стварэнне падпольнай арганізацыі.

Тут, у Гародні, паралельна дзейнічалі іншыя канспіратыўныя ячэйкі, у тым ліку польская ваенная арганізацыя, аснову якой складалі вучні мясцовых гімназій. Неўзабаве яна ўстанавіла кантакты з вучнёўскай моладдзю па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, сталі рэгулярна курсіраваць сувязныя, пачаліся сумесныя скаардынаваныя акцыі па антысавецкай прапагандзе. Жаночай падпольнай арганізацыяй кіравала ў Гародні Антаніна Гальска ("Шарлотка").

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў удзельніка даваеннага падполля ў Гародні Зянона Унгара:** "У канцы верасня 1939 г., пасля падзення ачагоў змагання з бальшавікамі, многія прадстаўнікі моладзі, выхаванай на традыцыях паўстанняў на паўночна-ўсходніх землях, уцяклі ў лясы, стыхійна стваралі атрады супраціўлення, збіралі кінутую войскамі зброю.

Ужо ў кастрычніку 1939 г. мы ведалі пра загад Такажэўска-Карашэвіча, які абавязваў стварэнне "Службы за перамогу Польшчы". З вуснаў у вусны перадавалі, што ў нас канспіратыўнымі акцыямі кіруе прысланы з Варшавы палкоўнік Сасабоўскі -- былы афіцэр з Гродзенскай акругі. Вера, што існуе такая падпольная арганізацыя на чале з вопытным камандзірам, давала добры стымул нашым намаганням пры стварэнні падпольных груп. На жаль (хоць у той час мы пра тое не ведалі), усё аказалася фікцыяй. З прычынаў, вядомых яму самому, Сасабоўскі перайшоў венгерскую граніцу*.

Пазбаўленыя каардынацыі малыя групкі СЗП дзейнічалі па сваёй ініцыятыве. Недахоп адпаведнай зброі, слабая ваенная падрыхтоўка, адсутнасць дасведчаных у партызанскай барацьбе кіраўнікоў абмяжоўвалі іх поле дзейнасці: знішчалі сродкі

* Праз венгерскую і румынскую граніцу ўцяклі на Захад многія польскія ваеннаслужбоўцы пасля паражэння ў вераснёўскай кампаніі 1939 г., каб не трапіць у палон і прадаўжаць барацьбу за мяжой.

камунікацый, рабілі начныя засады на адзінокія савецкія патрулі, нападалі на аддзяленні міліцыі, ліквідавалі калабарацыяністаў, чые імёны падказвала мясцовае насельніцтва.

Да мая 1940 г. хадзілі чуткі пра актыўнасць падпольных арганізацыяў. Гаварылі пра вялікі бой атрада СЗП савецкім войскам пад Шчучынам, начны налёт на Ваўкавыск, дзе штурмам узялі будынак следчага аддзела і вызвалілі зняволеных, ліквідавалі пры гэтым функцыянераў НКУС і міліцыі, пра ўзброеныя сутычкі ў Белавежскай пушчы і Аўгустоўскіх лясах.

Тады часта паўтаралі: Нарбут, Траўгут, Урублеўскі... Іменамі кіраўнікоў паўстання 1863 г. называлі атрады СЗП. Але найчасцей і найбольш ішла пагалоска пра адважныя ўчынкі "палкоўніка Воўка Тамбоўскага". З дня на дзень легенда пра яго набірала сілу. Мясцовае насельніцтва паўтарала яго імя з абогатварэннем, рускія -- са страхам. Учора атрад палкоўніка пусціў пад адхон савецкі поезд, сёння, на сто кіламетраў далей, рускі патруль папаў у ягоную пастку.

У канцы верасня 1939 г. адзін ляснічы з-пад Гродна быў арыштаваны. У час допыту ён назваў супрацоўніка НКУС "таварышам". Рускі адказаў з пагардай: "Тамбоўскі воўк табе таварыш". Пасля таго як яго выпусцілі з-пад арышту, ляснічы арганізаваў ячэйку СПЗ. Добра ведаў аколіцу, мясцовых жыхараў і стаў стрэмкай на целе акупанта. Узяў сабе клічку Воўк-Тамбоўскі, а сваю дружыну назваў "Тамбоўскія ваўкі". Калі чуткі пра іх разышліся, іншыя атрады СЗП пачалі зваць сябе таксама, а гмінныя фантазёры прысвоілі ляснічаму званне палкоўніка.

Вось так дзёрзкасць, памножаная на страх ворага, і мары мясцовага насельніцтва, прага ў безнадзейнай сітуацыі знайсці празарліўца, нарадзілі легенду "палкоўніка Воўка-Тамбоўскага".

Тым не менш на фоне "экспедыцый" НКУС, узрослага расійскага тэрору і арыштаў, следстваў, расстрэлаў і ссылкаў барацьба працягвалася. Пра тое сведчылі спаленыя выбарчыя ўчасткі ў часе так званага плебісцыту, які зацвердзіў уваходжанне "Крэсув Всходніх" у склад Савецкага Саюза, сведчылі і ўзарваныя на чыгунцы расійскія ваенныя транспарты".

Вось такая карціна паўстае з-пад пяра відавочцы тых падзей. Канешне, успаміны яшчэ не дакумент. Любыя мемуары нясуць у той ці іншай ступені пячатку аўтарскай суб`ектыўнасці. Зянон Унгар, які расцэньваў новую ўладу як акупантаў, не выключэнне, тым больш што ён неаднаразова ссылаецца на чуткі. Але з тым, як аўтар успамінае панавалыя ў асяроддзі палякаў настроі, напэўна, можна пагадзіцца. Сутнасць гэтых настрояў адназначна: большасць польскага насельніцтва Заходняй Беларусі не змірылася са сваім становішчам, мерылася змагацца.

## КАНСПІРАЦЫЯ НА ВІЛЕНШЧЫНЕ

Калі гаварыць пра арганізацыю і дзейнасць польскага супраціўлення, СЗП -- ЗВЗ --АК, на Заходняй Беларусі, проста немагчыма абмінуць Вільню. На працягу многіх стагоддзяў гэты слынны горад-- культурны і духоўны цэнтр трох суседніх народаў: беларусаў, палякаў, літоўцаў. Адразу заўважым, мы не будзем

заглядваць у тоўшчу часу, толькі коратка спынімся на кідкіх старонках гісторыі Віленшчыны, суадносныя з падзеямі ў кнізе.

15 сакавіка 1923 г. Канферэнцыя паслоў у Парыжы* на базе дэмаркацыйнай лініі ўстанавіла дзяржаўную граніцу паміж Літвой і Польшчай, несправядліва пакінула Віленскі край Польшчы. 19 верасня 1939 г. гэтую тэрыторыю заняла Чырвоная Армія, Віленская вобласць увайшла ў склад БССР, 10 кастрычніка 1939 г. у Маскве падпісаны яшчэ болей несправядлівы Дагавор аб перадачы Літве Вільні і Віленскай вобласці. Пры гэтым тры ўчасткі тэрыторыі, дзе сумесна пражывалі беларусы, палякі і літоўцы (Рымшанскі, Радунскі, Даўгелішскі паветы і раён Свянцянаў), былі далучаны да Беларусі. Але затым мудрыя маскоўскія галовы, напэўна, улічылі факт уваходжання Літвы ў склад СССР і яшчэ раз распарадзіліся тэрыторыяй так званай суверэннай Беларусі (незалежнай на словах і ў тэорыі) і Літве перадалі Свянцянскі раён і часткі тэрыторый Відзаўскага, Гадаўцішскага, Астравецкага, Воранаўскага, Радунскага раёнаў БССР.

Кіраўніцтва польскіх падпольных арганізацый, узніклых на Віленшчыне яшчэ ў верасні 1939 г., адрэагавала першымі, па-свайму -- па-ранейшаму лічыла гэты край неад'емнай часткай Польшчы. Пратэставала словам і куляю. Арганізацыйная структура СЗП -- ЗВЗ -- АК стваралася ў межах былога Віленскага ваяводства, ахоплівала не толькі пэўныя раёны Літвы, але і ўсю Віленскую вобласць Беларусі з такімі гарадамі і райцэнтрамі, як Маладзечна, Ашмяны, Астравец, Смаргонь, Браслаў, Мядзель, Міёры, Глыбокае, Шумілін, Нарач (Кабыльнік), Свір... Вось чаму віленская канспірацыя Арміі Краёвай для беларускага даследчыка выклікае заўсёды цікавасць.

Але перш чым перайсці непасрэдна да разгляду перапетый польскага падполля, ёсць сэнс сказаць слоў колькі пра грамадска-палітычную тагачасную сітуацыю на Віленшчыне. Гэта паможа нам лепей зразумець далейшае развіццё падзей.

З уключэннем Вільні ў склад Літвы тут з'явіўся Камітэт грамадскай апекі, гадавы бюджэт якога быў каля 200 тысяч літаў. Немалая сума. Камітэт фінансаваў і матэрыяльна памагаў беспрацоўным палякам.

Быў таксама арганізаваны Камітэт дапамогі бежанцам. Яго ўзначальвалі Ігнацы Загурскі і Марыя Петрусевіч. Сродкі на ўтрыманне паступалі з Англіі і ЗША.

З пачатку лістапада 1939 года задзейнічаў Польскі камітэт. Ім кіраваў прафесар Бранілаў Кжыжаноўскі, былы дэпутат сейма і сенатар, старшыня калегіі адвакатаў. У склад кіраўніцтва Польскага камітэта ўваходзілі былы рэктар універсітэта імя Стэфана Баторы, у той час рэдактар "Кур'ера віленскага" Вітольд Станевіч, Тадэвуш Кершаноўскі, Аляксандр Звярчыньскі і Ежы Дабжаньскі. Камітэт

* Канферэнцыя паслоў у Парыжы -- пастаянны орган, які быў створаны Вышэйшым Саветам Антанты ў 1919 г. для разгляду пытанняў, звязаных з выкананнем Версальскага мірнага дагавора.

разгарнуў палітычную і фінансавую дзейнасць, пакрываў выдаткі за прыватнае навучанне польскіх дзяцей, утрыманне гімназій Бенедыктантаў, Езуітаў і Назарэтанкаў.

Ён прадстаўляў інтарэсы віленскіх палякаў у зносінах з літоўскай адміністрацыяй. Для гэтых мэтаў польскі ўрад у эміграцыі выдзеліў 100 тысяч літаў. Іменна польскі камітэт дабіўся ад літоўскіх уладаў дазволу на святкаванне 11 лістапада 1939 г. Дня незалежнасці Польшчы.

Пры літоўскім Чырвоным Крыжы ў сваю чаргу створаны Камітэт дапамогі нацыянальным меншасцям, у склад якога ўваходзілі 5 палякаў, 5 жыдоў, 5 літоўцаў. Невядома па якой прычыне прадстаўнікі ЗША не прызналі названага камітэта і адмовілі яму ў фінансавай падтрымцы.

Сярод многіх дабрачынных арганізацыяў, якія існавалі ў тагачассе ў Вільні, была і польская вайсковая група -- Камітэт дапамогі афіцэрам. Ён шэфнічаў больш чым над 4500 вайскоўцамі, а таксама над 1244 сем`ямі афіцэраў у горадзе і па-за горадам. Месячны фонд для забеспячэння ваенных і іхніх сем`яў вымагаў ад Камітэта прыкладна 200 тысяч літаў.

Першая тайная арганізацыя, узніклая ў Вільні восенню 1939 года, называлася "Камісарыят жонду*". Узначальваў яе Бputаніслаў Сьвёнтніцкі. Кіраўнікі жонду прызнавалі правамочным адно -- урад Другой Рэчы Паспалітай у эміграцыі, настойліва патрабавалі ўстанавіць з ім кантакт. Аднак заўважу, "Камісарыят жонду" быў адной з многіх падпольных ячэйкаў, якія мелі розныя палітычныя адценні. Даволі шматлікім з`яўлялася згрупаванне чыста ваеннага тыпу пад назвай "Кола пулковэ"**, ёю кіраваў кадравы афіцэр падпалкоўнік Адам Абтуловіч.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў удзельніка даваеннага падполля на Віленшчыне капітана Аляксандра Васілеўскага.** "Я прыехаў у Вільню ў пачатку лістапада 1939 г. Вільня ўжо была пад літоўскай акупацыяй -- СССР перадаў яе Літве разам з заходняй часткай Віленскага ваяводства на падставе Дагавора між Літвою і СССР ад 10 кастрычніка 1939 г. У палове лістапада ўступіў у кантакт з капітанам Антонам Аляхновічам -- маім сардэчным сябрам па школе падхарунжых пяхоты, якую скончылі ў 1930 г. У 1939--1935 гг. мы разам служылі ў 5-м пяхотным палку легіёнаў, дзялілі супольны пакой. Паручніка Аляхновіча ў 1933 г. прынялі ў Вышэйшую ваенную школу, пасля яе заканчэння прысвоілі званне капітана. Накіравалі служыць у штаб 20-й пяхотнай дывізіі ў Баранавічах. Я ў той час служыў у Камарове, дзе быў інструктарам па стральбе і камандзірам роты.

Пад час вераснёўскай кампаніі А. Аляхновіч -- начальнік інтэнданцкай службы 33-й пяхотнай дывізіі. Трапіў у савецкі палон пад Брэстам, яму ўдалося ўцячы з эшалона, які вёз ваеннапалонных

---

* Жонд (польск.)-- урад.

** "Палковая суполка"

на Усход. У пачатку кастрычніка 1939 г. прабраўся ў Вільню. Тут скантактаваўся з польскім падполлем, стаў актыўна ўдзельнічаць у канспіратыўнай арганізацыі "Камісарыят жонду" выконваў у ёй функцыі начальніка ваеннага аддзела.

Аляхновіч прапанаваў мне ўступіць у гэтую арганізацыю.

Праз некалькі дзён Аляхновіч ("Метэор") прадставіў мяне Сьвёнтніцкаму ("Ойцу"). Апошні праінфармаваў мяне, што арганізацыя дзейнічае ў паразуменні з Варшавай і намагаецца наладзіць сувязь з урадам Рэчы Паспалітай у Францыі. Прапанаваў узяць на сябе функцыі каменданта гарнізона Вільні. Я згадзіўся, пакінуў за сабою права пры любой зручнай магчымасці выехаць на Захад для паступлення ў польскую армію, што фарміравалася пад камандаваннем генерала Сікорскага.

З гэтага часу маім непасрэдным кіраўніком стаў капітан Антон Аляхновіч. Я ў супрацоўнікі падабраў паручніка Юліана Петрашэўскага з 5-га пяхотнага палка легіёнаў, прызначыў сваім намеснікам. Вільня пад савецкай акупацыяй знаходзілася з 19.9.39 да 27.10.39. Потым горад быў перададзены ў склад Літвы, якая была ў той час незалежнай і нейтральнай дзяржавай. Літоўцы ўвялі ў Вільні ваенны стан. Пачалася спешная, прымусовая літвінізацыя горада.

(З Каўнаса (даўняга Коўна) задумалі перанесці сталіцу ў Вільню. Назвалі па-свойму. Матывы не тлумачыліся ні палітыкамі, ні газетамі: будзе сталіца ў Вільнюсе, то мужыкі (чытай, беларусы) не змогуць яе адняць ад нас. Ды і даўгарукая, словуняверная Масква не зможа, пасаромеецца ад народа адняць яго сталіцу.

Далейшыя падзеі паказалі, што думкі і справы літувісцаў у даным накірунку былі прарочыя. Зямлю, на якую яны гістарычна мелі меней правоў, чым беларусы, ад іх ніхто нават не спрабаваў адняць. Вільня стала Вільнюсам.-- Я. С.).

15 снежня быў закрыты універсітэт імя Стэфана Баторы. Крытычнай стала сітуацыя ваенных уцекачоў, якіх у лютым 1920 года было пад 40 тысяч.

Аднак у параўнанні з тэрорам, зазнаным віленчукамі падчас 38-дзённага знаходжання Саветаў (НКУС паспеў за гэты час арыштаваць і дэпартаваць звыш 500 палякаў), літоўскія ўлады былі лепшыя, чым савецкія. 2 лістапада было адноўлена выданне "Кур'ера віленьскага" -- газеты, польскай па духу. Трохі пазней пачала выходзіць "Газета цодзенна". Яе рэдагаваў Юзэф Мацкевіч -- брат Станіслава*. Гэтае выданне ставілася да літоўцаў лаяльна.

Тайныя польскія арганізацыі развіваліся ў Вільні стыхійна, прычым правілы канспірацыі не заўсёды захоўваліся на ўзроўні -- вынік браку падпольнага вопыту ў тутэйшых палякаў, іх лёгкадумных адносінаў да літоўскай улады.

Асабліва гэта было характэрна для моладзі, якая пачала ва ўсіх арганізацыях адыгрываць усё большую ролю. З яе ўдзелам стварылі многа падпольных групаў. Яны выдавалі лістоўкі і рукапісныя газеткі з надта антылітоўскім зместам. У студзені 1940 г. адна з такіх

---

* Станіслаў Мацкевіч-Цат-- у даваенні вядомы польскі публіцыст, пісьменнік, гісторык. Працаваў у папулярнай віленскай газеце "Слова" ліберальнага накірунку.

маладзёжных арганізацый правалілася, праўда, нешматлікая. Арыштавалі некалькі чалавек. І хоць літоўская прэса і радыё падалі тыя арышты як вялікі поспех Саугумы*, адчувальны ўдар па польскай канспірацыі, на самай справе гэта быў малазначны інцыдэнт, ён не меў жаднага ўплыву на развіццё тайнай арганізацыі падпольнай Польшчы".

Як сведчыць гэты ўрывак з успамінаў, удзельнікам падполля на Віленшчыне пры сметанаўскім рэжыме жылося больш-менш спакойна.

У такіх умовах ім лягчэй было аб'яднаць свае сілы і стварыць адзіную канспіратыўную сетку. Як і ў Заходняй Беларусі, на першапачатковым этапе аб'яднанне праходзіла ў рамках СЗП. У лістападзе 1939 г. галоўнакамандуючы СЗП генерал Міхал Такажэўскі-Карашэвіч накіраваў з Варшавы ў Вільню трох афіцэраў -- падпалкоўнікаў Януша Галадыка, Нікодэма Суліка і маёра Аляксандра Кжыжаноўскага, з якім на старонках кнігі чытач спаткаецца яшчэ не раз. Ім было даручана арганізацыя на тэрыторыі Віленшчыны ваяводскага камандавання СЗП. Падпалкоўнік Сулік і маёр Кжыжаноўскі паспяхова прабраліся ў Вільню ў снежні 1939 г., а падпалкоўніку Галадыку не пашанцавала -- затрымалі на літоўскай граніцы і накіравалі ў лагер для інтэрніраваных польскіх вайскоўцаў.

Нікодэм Сулік энергічна прыступіў да фармавання СЗП. Ён прыцягнуў да справы падпалкоўніка Адама Абтуловіча з "Кола пулковага", былога сенатара, маёра запасу Уладыслава Каміньскага, а таксама ксяндза Казіміра Кухарскага. Пра апошняга трэба сказаць асобна. Разумны, хітры езуіт, вядомы ў Вільні выхаваўца клерыкальнай моладзі і грамадскі дзеяч; на той час ксёндз Кухарскі ўзначальваў дабрачынную арганізацыю пад назвай Камітэт грамадзянскай самадапамогі. Кухарскі карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай у мясцовага насельніцтва. Якраз ён і скантактаваў Суліка з прадстаўнікамі наладжаных ужо важнейшых канспіратыўных арганізацыяў. Як паказвала здавённая, стагоддзі тамтэйшая практыка, практыка сучасся, нашага стагоддзя, служкі каталіцкае веры, на наш погляд, найпершыя ў такіх пытаннях -- барацьбы за пальшчызну. Асабліва р'яныя яны барацьбіты за веру і вельку Польшчу не на Захадзе, дзе з-за іх кансерватыўнасці і адсталасці, нягнуткасці выспела і перамагла рэфармацыя, дзе Крулеўства Польскэ, а потым і Жэч Паспаліта страціла багата земляў,-- асабліва вялікія яны ваяўнікі на Усходзе. На адвеку беларускіх землях.

Карацей кажучы, галоўнай мэтай спаткання Суліка з мясцовымі падпольшчыкамі з'яўлялася падпарадкаванне ўсіх падпольных групоўкаў кіраўніцтву СЗП і наладжванне супрацоўніцтва паміж рознымі палітычнымі плынямі.

Сустрэча адбылася ў манастыры езуітаў па вуліцы Вальнай. З'явілася 12 чалавек: падпалкоўнік Нікодэм Сулік, Браніслаў Сьвёнтніцкі, капітан Аляксандр Васілеўскі, паручнік Юліан Петрашэўскі (апошнія тры прадстаўлялі "Камісарыят жонду"), Пётр

---

* Літоўская палітычная паліцыя.

Каўнацкі і Вітальд Сьвершэўскі ("Стронніцтво Народовэ"-- Народная партыя), Ежы Дабжаньскі (Польская сацыялістычная партыя). Былі прадстаўнікі санацыі і клерыкалаў. Старшыннічаў у часе сустрэчы ксёндз Казімір Кухарскі.

Яго прамова выклікала моцнае ўражанне ў прысутных і вызначыла поспех спаткання. Пасля Кухарскага выступіў Нікодэм Сулік. Ён назваўся прадстаўніком галоўнакамандуючага СЗП, раскрыў мэты і задачы арганізацыі, звярнуўся да прысутных з прапановай далучыцца да СЗП з усімі навербаванымі групоўкамі.

Усе былі ў прынцыпе згодныя. Адзіным спрэчным пунктам заставаліся адносіны да прадстаўнікоў санацыі, якія, па агульнай думцы сабраных, неслі адказнасць за паражэнне ў вайне. Завязалася жорсткая дыскусія, ці могуць прадстаўнікі санацыі ўвайсці ў кіраўніцтва віленскай канспірацыяй. Урэшце рэшт пераважыў погляд, што да супрацоўніцтва ў імя барацьбы за незалежнасць павінны быць прыцягнуты ўсе партыі. Лагер пілсудчыкаў і блізкіх яму падпольных фарміраванняў не выключаюць. На палітычныя інтрыгі, барацьбу і разборы стане часу пасля вайны. Прысутныя згадзіліся на беспярэчнае падпарадкаванне з гэтага моманту ўсіх кіраваных імі групаў ваеннага і цывільнага падполля аднаму цэнтру --"Службе за перамогу Польшчы". Адначасова пастанавілі, што важнейшыя партыі дэлегуюць паўнамоцных прадстаўнікоў у Віленскую ваяводскую раду, якую пазней называлі Рада акругі ці Каменданцкая рада -- дарадчы орган пры камандуючым ваяводскім СЗП.

Па прапанове ксяндза адзінадушна зацвердзілі кіраўніком ваяводскага СЗП падпалкоўніка Нікодэма Суліка. Яго намеснікам і начальнікам штаба быў прызначаны падпалкоўнік Адам Абтуловіч. Інтэндантам стаў маёр Аляксандр Кжыжаноўскі. Ксяндзу Кухарскаму даверылі фінансаванне справы, а таксама ячэйку легалізацыі, аб якой будзе сказана падрабязней. Прапагандысцкую работу, уключаючы выданне органа СЗП, якому далі назву "Польска ў вальцэ"*, усклалі на маёра запасу, былога сенатара Уладыслава Каміньскага. Агульнаарганізацыйнымі пытаннямі даручылі займацца падпалкоўніку Антону Аляхновічу. Функцыі каменданта горада Вільні па-ранейшаму павінен быў выконваць капітан Аляксандр Васілеўскі. Кіраўніком канспірацыі ў былым Віленскім ваяводстве, гэта значыць і на значнай частцы тэрыторыі Беларусі, застаўся маёр Юзэф Рочняк. Канспірацыя ў самім горадзе Вільня Рочняку не падпарадкоўвалася.

Вопыт падпольнай барацьбы "ўсіх часоў і народаў" яскрава сведчыць, што самыя патаемныя канспіратары -- жывыя людзі, ім трэба карміцца, адзявацца, мець дах над галавою, магчымасць для свабоднага перамяшчэння, лячыцца пры хваробе і г. д. А каб усё гэта стала даступным, неабходна здабываць адпаведныя дакументы. Фабрыкацыяй фальшывых дакументаў і займалася ячэйка легалізацыі, якой кіраваў ксёндз Кухарскі. У склад ячэйкі ўваходзілі дзевяць чалавек. Непасрэднымі ж арганізатарамі былі Станіслаў

---

* "Польшча ў барацьбе".

Кялка -- служачы кляштара езуітаў пры касцёле Св. Казіміра, браты Міхаіл і Рамуальд Варакомскія (апошні да вайны скончыў аддзяленне жывапісу Віленскага універсітэта).

Ячэйка легалізацыі першапачаткова размяшчалася ў раёне Новы Свет па вуліцы Варшаўскай у доме Рымкевічаў, а потым -- у квартале Крывое кола па вуліцы Філарэцкай. Ячэйка дзялілася на два аддзелы: тэхнічны (кодавая назва "Кузня") і справаводчы (кодавая назва "Гаспода"*). У "Кузню" ўваходзілі наступныя майстэрні: графічная, фатаграфічная, цынкаграфія, фатаграфія, станок вулканізацыі пячацяў і друкарня.

У першую чаргу дакументы выраблялiся вайскоўцам, яны маглі выехаць за мяжу, галоўным чынам праз Коўна -- пры пасрэдніцтве англійскага пасольства. Дакументы выраблялiся і для тых удзельнікаў падполля, якія заставаліся на Віленшчыне і не мелі пасведчання асобы. З кастрычніка 1939 г. і па май 1940 года ячэйка легалізацыі вырабіла больш чым тры тысячы фальшывых дакументаў.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Аляксандра Васілеўскага:** "Ужо праз тыдзень пасля прыезду ў Вільню атрымаў даваенны пашпарт на імя жыхара Вільні. Я быў прыемна здзіўлены дасканаласцю выканання дакумента, чоткасцю дзеяння легалізацыйнай ячэйкі. Той фальшывы пашпарт, дарэчы, аформлены на маё сапраўднае прозвішча, я спакойна выкарыстоўваў багата разоў і на яго падставе атрымаў пазней літоўскае пасведчанне асобы, што мне вельмі аблегчыла жыццё ў акупаванай літоўцамі Вільні".

Як ужо адзначалася, у часе васьмімесячнага панавання незалежнай Літвы на Віленшчыне былі спрыяльныя ўмовы для дзейнасці польскага падполля. У прынцыпе не было ніякай перашкоды для разбудавання моцнай баявой арганізацыі. Аднак з увагі на тое, што Літва заставалася нейтральнай дзяржавай, урад Польшчы ў той час не хацеў ускладнення адносін з ёю, дапускаць узнікненне канфліктных сітуацыяў паміж палякамі і літоўцамі. Таму ад польскіх кіраўніцкіх колаў ішла грозная забарона прадпрымаць у Вільні сякія-такія ўзброеныя акцыі, сабатаж і дыверсіі. Выключэннем з`яўляліся рэпрэсіі ў адносінах да калабарацыяністаў, даносчыкаў і правакатараў. У такой сітуацыі СЗП у Вільні дзейнічаў на падставе наступных прынцыпаў:

1. Зрабіць упор на арганізацыйны бок справы, стварыць мадэль кіравання і сувязі, сканцэнтравацца на падрыхтоўцы кадраў.

2. Пры вярбоўцы членаў СЗП браць пад увагу не колькасць, а толькі якасны фактар, вербаваць у першую чаргу кадравых афіцэраў і падафіцэраў, а таксама падхарунжых.

3. Правядзенне дабрачыннай і апякунскай дзейнасці, перш за ўсё ў адносінах да сем`яў вайскоўцаў, якія знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Інфармацыйна-разведвальная, прапагандысцкая, ідэйна-выхаваўчая работа.

У гэтым накірунку і дзейнічаў Віленскі штаб СЗП --ЗВЗ. Была створана моцная кадравая арганізацыя, якая была добра падрых-

---

* Карчма.

тавана да ўзброенай барацьбы. У сакавіку 1940 года ў сувязі з рэарганізацыяй віленскі СЗП пачаў называцца ЗВЗ (Саюз узброенай барацьбы).

Тым часам адбыліся персанальныя змены ў кіраўніцтве польскім падполлем на Віленшчыне. Па загаду камандуючага ЗВЗ у канцы сакавіка 1940 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі быў накіраваны падпалкоўнік Адам Абтуловіч, яго суправаджаў маёр Юзэф Рочняк. Ім была даручана каардынацыя дзеянняў структураў у былым Навагрудскім ваяводстве. Начальнікам штаба Віленскай акругі стаў маёр Аляксандр Кжыжаноўскі, інтэндантам быў прызначаны Станіслаў Кялка. Юзэфа Рочняка замяніў капітан Збігнеў Брадзікоўскі.

У чэрвені 1940 г. Вільня зноў стала савецкай. Грамадска-палітычная сітуацыя для віленчукоў змянілася карэнным чынам. Перамены закранулі матэрыяльную і духоўную сферы жыцця. Справа не толькі ў тым, што, напрыклад, замест "Кур`ера віленьскага" і "Газеты цодзеннай" пачаў выдавацца орган ЦК КП(б) Літвы "Праўда віленьска", а прадукты харчавання і рэчы першай неабходнасці падняліся ў цане. Пачынаў дзейнічаць берыеўскі рэпрэсіўны апарат. Для польскага падполля надышлі не проста цяжкія часы, а страшныя часы. Энкавэдэсцкі хапун зачастую браў людзей не па іх віне, за праўчынкі, а па прафесійных, нацыянальных абставінах -- на Беларусі, Расеі, Украіне, Каўказе. Што ўжо было казаць пра палякаў у "вызваленай" Літве. Іх хапалі з прычыння і беспрычыння.

І выклікалі лютую несправядлівую, зласнюшчую ярасць. Супраціўленне да ўсяго рускага, савецкага.

Ва ўсіх ячэях і групах польскага супраціўлення, прыціхлага ад смяртэльных і меткіх (гэтага не адымеш) удараў, зацвірчэлі патокі нянавісці. Тым большай, чым бяссільнымі аказваліся ўсе групкі перад сапраўднаю воляю і сілаю.

Адны сеялі, не ведалі, што жаць будуць другія, трэція таіліся, цярпелі, ведалі, што прыйдзе час -- і адальюцца воўку авечыя слёзы, і не ведалі, што расплачвацца за іх рашучую нянавісць будуць невінаватыя. І яны самі.

## ЯНЫ ІШЛІ НА ЎСХОД

Поруч з арганізатарамі падполля, эмісарамі ад палітычных партыяў і прадстаўнікамі эміграцкага ўрада на тэрыторыю Заходняй Беларусі сталі пранікаць і кадравыя польскія разведчыкі. Трэба адзначыць, у міжваенне супрацьстаянне савецкіх і польскіх разведчыкаў было вельмі вострым. Гэта бачна і з успамінаў былога супрацоўніка Галоўнага разведвальнага ўпраўлення (ГРУ) Чырвонай Арміі, генерала ў адстаўцы Віталя Нікольскага: "Заключэнне пакта з Германіяй, уступленне савецкіх войскаў на тэрыторыю Польшчы было нечаканасцю для ваеннай разведкі. Мы не змаглі нават паспець перадыслацыраваць далей на Захад усю агентуру з усходніх абласцей Польшчы, усе нашы інфарматары пры імклівым руху Чырвонай Арміі да Буга аказаліся ў савецкім тыле".

Да сказанага ёсць рэзон дадаць, што, акрамя ГРУ, на тэрыторыі "крэсаў" актыўна дзейнічала і палітычная разведка НКУС.

Перманентны паядынак вялі з імі сектар "Усход" 2-га аддзела генштаба Войска Польскага (разведслужба)-- славутая "двуйка" -- і дэфензіва (палітычная паліцыя). З прыходам Чырвонай Арміі органы НКУС адразу распачалі аператыўную работу па выяўленні былых паліцэйскіх, турэмшчыкаў, жандараў, афіцэраў і падафіцэраў Корпуса пагранічнай аховы (КОП) і, вядома ж, разведчыкаў. Многіх арыштавалі, адправілі ў турмы і лагеры, іншых расстралялі.

А камусьці пашанцавала, удалося ўцалець. Сярод іх аказаліся афіцэры, якія мелі вопыт разведвальнай і контрразведвальнай работы на ўсходнім кірунку -- ротмістр Аляксандр Стпічыньскі, маёр Юзэф Стансьліцкі, палкоўнік Лявон Цясак. Да вайны Цясак быў шэфам контрвыведкі пры камандаванні акругі корпуса ДОК-3 "Гродна", у склад якога ўваходзілі Вільня і большая частка Палесся. Цяпер ім трэба было заняцца сваім ранейшым "рамяслом" ужо ў новых абставінах. Стаяла задача пранікнуць з Генеральнай губерні* туды, дзе яшчэ нядаўна яны адчувалі сябе гаспадарамі.

Польскі кадравы разведчык Павел Марыя Лісевіч у сваёй кнізе "Безіменныя" канстатуе: "Існуе памылковы, досыць распаўсюджаны погляд, што быццам бы ЗВЗ пачаў развіваць разведвальную дзейнасць на тэрыторыі СССР толькі пасля нямецкага нашэсця. На самай справе гэта наступіла адразу пасля ўтварэння галоўнага камандавання ЗВЗ у Варшаве, дакладней пасля 29 чэрвеня 1940 г., калі Варшаве быў падпарадкаваны абшар-3--паўднёва-ўсходні. Равецкі** паслаў тэлеграму Саснкоўскаму,*** у якой дакладваў, што арганізуе разведку "на Саветы" з цэнтрам у Варшаве. Трэба памятаць, у лонданскіх кіраўніцкіх колах**** панавала дактрына "двух ворагаў", якая прадпісвала СЗП--ЗВЗ--АК змагацца на два франты -- як з немцамі, так і з Саветамі".

У адпаведнасці з названай дактрынай варшаўскае кіраўніцтва ЗВЗ прыкладала велізарныя намаганні для атрымання разведвальных даных на ўсходнім накірунку. У раёне дэмаркацыйнай лініі -- на нямецкім баку -- былі створаны закамуфліраваныя назіральныя пункты разведкі: у асноўным каля шляхоў зносінаў. Потым пачалі ствараца рэзідэнтуры. Ужо ў канцы 1939 г. першым шэфам 2-га аддзела СЗП у Вільні быў афіцэр па мянушцы "Гелена" (прозвішча невядома). Затым яго месца заняў палкоўнік Збігнеў Цэнтняроўскі.

---

* Па дэкрэту Гітлера ад 8--12 кастрычніка 1939 г. тэрыторыя Польшчы, акупаваная вермахтам, была падзелена на 2 часткі: сярэднюю і паўднёвую (генеральная губерня з цэнтрам у Варшаве) і заходнюю і паўночную (увайшлі ў склад рэйха). У 1941 г. да Германіі была далучана і Беласточчына (Бэцырк Беластолк -- Беластоцкая акруга), у тым ліку Гродна, Ваўкавыск, Масты, Бераставіца, Зэльва і частка Шчучынскага раёна.

** Стэфан Равецкі ("Грот") -- з 1939 г. намеснік галоўнакамандуючага СЗП, з 30 чэрвеня 1940 г. галоўны камендант ЗВЗ.

*** Казімеж Саснкоўскі -- галоўны камендант ЗВЗ з 13 лістапада 1939 г. да 30 чэрвеня 1940 г.

**** Масцца на ўвазе польскі ўрад у эміграцыі

Але, па прызнанню ўпамянутага Ежы Марыі Лісевіча, Цэнтняроўскі вынікі працы меў вельмі мізэрныя, не змог нават стварыць агентурную сетку, а вясной 1941 г. быў арыштаваны органамі НКУС.

На далейшае яго абавязкі па чарзе выконвалі Баляслаў Новік ("Маеўскі"), капітан Стэфан Ставей ("Атума") і палкоўнік Тодар Цэтыс ("Вікінг").

Шэфам аддзелаў "двуйкі" ў Навагрудскай акрузе быў капітан Баляслаў Васілеўскі ("Бустрамяк"), у Беластоку -- Віталь Бжэскі ("Саха"), у Брэсце -- паручнік Аляксандр Куніцкі ("Мар`ян", "Слодзік", "Француз"). Апошні да разведвальнай дзейнасці прыцягнуў групу супрацоўнікаў брэсцкай пошты і тэлефоннай станцыі.

Між тым савецкая разведка таксама не драмала. Замест асталых на занятай Чырвонай Арміяй тэрыторыі сваіх ранейшых інфарматараў ГРУ і органы НКУС пачалі інтэнсіўную вярбоўку новых агентаў з ліку польскіх грамадзянаў, пражывалых на тэрыторыі Генеральнай губерні. За няпоўныя два гады на савецкую разведку пачалі працаваць 140 палякаў з Генеральнай губерні, у тым ліку маёр артылерыі Любаслаў К. Прыйдзе час, і ён адыграе вельмі важную ролю ў разгроме органамі НКУС польскага падполля на Віленшчыне ў 1944--1945 гг.

Галоўнае камандаванне ЗВЗ якшчэ ў той час, калі яго штабкватэра знаходзілася ў Парыжы, хацела наладзіць рэгулярную кур`ерскую сувязь з абшарам Беласток і Віленшчынай, але гэта аказалася нерэальным. Калі трасу ў Вільню ці Гродна кур`ер з Варшавы мог перадолець за 10 дзён, то парыжскаму кур`еру патрабавалася ад двух да трох тыдняў. З вясны 1940 г. пераходы праз граніцу на тэрыторыю СССР сталі для кур`ераў ЗВЗ увогуле вельмі небяспечныя. Для жыцця. Іх расстрэльвалі па суду, але хутка.

У адным з рапартаў вясной 1941 г. Стэфан Равецкі ("Грот") быў вымушаны прызнаць, што кур`ерскую сувязь з усходнімі абшарамі на належным узроўні падтрымліваць не ўдаецца. З восені 1939 г. да 22 чэрвеня 1941 г. на "крэсы" пасылалася 86 кур`ераў. Назад вярнулася 16.10 затрымалі пры пераходзе граніцы, 12 арыштавалі ў час выканання заданняў, астатнія праваліліся з дапамогай агентуры НКУС. Уратаваць сваё жыццё пашанцавала меншасці, 44 кур`еры загінулі. Сярод удачлівых аказаўся Людвік Калькштэйн-Сталіньскі, які паспяхова выканаў заданне на тэрыторыі Віленскай акругі, прабраўся ў Варшаву і быў прызначаны ў разведгрупу пад кодавай назвай "Страган". Потым яму даручылі арганізаваць самастойную аператыўную разведвальную групу. Яна была створана і атрымала назву "Ханка" ("Х") -- па псеўданіму яе кіраўніка. Пазней група "Х" вяла разведвальную дзейнасць не толькі ў Генеральнай губерні, але і на акупаванай немцамі тэрыторыі СССР.

Як ужо адзначалася, з кур`ерскай місіяй і пэўнымі арганізатарскімі паўнамоцтвамі на тэрыторыю Навагрудскай акругі былі накіраваны з Вільні падпалкоўнік Абтуловіч і маёр Рочняк. Няма ніякіх дакументальных даных, як яны выконвалі свае паўнамоцтвы. Вядома толькі, што пазней па прыгавору спецыяльнага суда ЗВЗ Адам Абтуловіч быў застрэлены па падазрэнні ў супрацоўніцтве з савецкімі органамі

дзяржбяспекі. Пра лёс Юзэфа Рочняка звесткі не захаваліся. Праўда, у сувязі з акалічнасцю пэўную цікавасць выклікае ўрывак з успамінаў знаёмага нам Каспера Мілашэўскага.

"Вясной 1940 г.,-- піша ён,-- прыбыў да мяне ў Брынічава Стаўбцоўскага павета нехта Таргоньскі. Сказаў, што з`яўляецца капітанам Войска Польскага і хацеў бы знайсці са мной паразуменне і абмеркаваць папярэднія ўмовы стварэння канспірацыі для барацьбы за незалежнасць. Пасля абгаварэння ўсіх магчымасцяў для вядзення падпольнай работы мы прыйшлі да высновы, што няма жадных даных на існаванне на нашай тэрыторыі вышэйшай канспіратыўнай ячэйкі, з якой можна ўстанавіць кантакт, атрымаць інструкцыі і, зыходзячы з іх, пачаць дзейнічаць згодна з агульнымі прынцыпамі падпольнай барацьбы. Праз некалькі дзён Таргоньскі падаўся ў бок Волмы і Ракава, каб зарыентавацца ў тутэйшым становішчы і распазнаць настрой мясцовага насельніцтва, падабраць прыдатных для падпольнай работы. Але там яго напаткала няўдача -- быў арыштаваны".

Ёсць падставы меркаваць, што Таргоньскі гэта і ёсць Юзэф Рочняк. Прадстаўляючыся Мілашэўскаму, ён мог змяніць прозвішча і воінскае званне для канспірацыі. На карысць гэтай версіі сведчаць яшчэ два факты. Рочняка паслалі ў Навагрудскую акругу ў канцы сакавіка. Мілашэўскі таксама адзначае, што незнаёмы прыбыў да яго вясной. Што ў радах ЗВЗ дзейнічаў капітан Таргоньскі і быў накіраваны на Навагрудчыну, ні ў дакументах, ні ў мемуарнай літаратуры не ўпамінаецца.

Нягледзячы на значныя страты ў кадрах, практычна ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі была пакрыта канспіратыўнай сеткай польскага супраціўлення. Прычым падпольныя ячэйкі існавалі не толькі ў гарадах, але і ў мястэчках і вёсках. Адна з такіх арганізацый была створана ў былым Васілішкаўскім (цяпер Шчучынскі) раёне.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў удзельніка АК Юліана Трусілы.**
"У Васілішках і ваколіцах падпольная група сфармавалася ў снежні 1939 г. ці ў студзені 1940 г. Не ведаю дакладна, хто быў яе заснавальнікам, але, на маю думку, галоўную ролю адыграў ксёндз капітан Ігнацы Цыранькі і дарожны майстра Васілішкаўскай гміны падхарунжы Сыльвестр Петрашун. Першы мог прымаць рапарты і аддаваць загады выкарыстоўваючы спавядальню. А другі быў, бадай, адзіным чалавекам у гміне, які пры Савецкай уладзе застаўся на сваёй ранейшай пасадзе. Выконваючы службовыя абавязкі -- кантроль за станам шашы і працай падначаленых дарожных рабочых -- меў магчымасць без перашкодаў і не выклікаючы падазрэнняў раз`язджаць па ўсёй гміне і спатыкацца з патрэбнымі людзьмі.

Адрэзак шашы, падкантрольны Петрашуну, цягнуўся з Хадзілоняў праз Васілішкі ў Скрыбаўцы, прыкладна 40 кіламетраў. Хтосьці з дарожных рабочых, прозвішча не памятаю, згадзіўся выконваць кур`ерскія функцыі -- адзін раз пабываў у Варшаве і тройчы ў Вільні. Мэта паездкаў -- пошукі кантактаў з падпольным цэнтрам. Пасля таго,як удалося наладзіць кантакт з камандаваннем

у Вільні, сувязь з нашай арганізацыяй пачалі падтрымліваць кур`еры штаба акругі. Сустрэчы адбываліся ў Лідзе і Гародні.

Аб тым, што падпольная арганізацыя ў Васілішках існавала, яскрава сведчыць і той факт, што ў верасні 1940 г. пачаліся арышты. З нашай мясцовасці ў той час арыштавалі Яна Філіповіча і Яна Калесніка (абодва з маёй вёскі Глінічы), Скарба (з Васілішкаў), Навадворскага (з Мякішаў). Мой брат Стасік тады праходзіў курс перападрыхтоўкі на вайсковых зборах у Лідзе, і яго ўзялі прама ў казарме. Ксёндз Цыраньскі і вікарый Крыньскі былі таксама затрыманы, але іх праз некалькі дзён адпусцілі. Добра ведаю, у тыя дні пад следчым арыштам знаходзіліся многія жыхары з Лідскага павета і з самой Ліды".

А вось як выглядае карціна арганізацыі падполля ў Заходняй Беларусі ў данясеннях варшаўскага кіраўніцтва.

## АБШАР БЕЛАСТОК. НАВАГРУДСКАЯ АКРУГА.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарта № 118 галоўнага каменданта ЗВЗ генерала Стэфана Равецкага ("Грота") эміграцкаму ўраду ў Лондане:**

**"16/. Куркі***

**Акруга не выйшла з уступнай арганізацыйнай фазы.**

**Пачатак актыўнага дзеяння аддзела 2 і аддзела 10.**

**У акрузе налічваецца 8 абводаў**. Тры яшчэ незадзейнічаныя - - з-за недахопу афіцэраў.**

**У "Лэнцэ***" і "Бары****" існуюць зачаткі баявых узводаў".**

## АБШАР БЕЛАСТОК. ПАЛЕСКАЯ АКРУГА.

**Спробы стварэння арганізацыі СЗП -- ЗВЗ у рамках Палескай акругі з-за панесеных вялікіх стратаў не далі таго эфекту, на які разлічвала польскае камандаванне. Гэта бачна з фрагмента рапарта № 79 галоўнага каменданта ЗВЗ Стэфана Равецкага ("Грота"):**

**"Перад выбухам нямецка-савецкага канфлікту 22.6.1941 .**

**1. Сувязь. Рэгулярную сувязь у час савецкай акупацыі падтрымліваць было немагчыма. Граніца была шчыльна замкнёна, а кур`еры праваліваліся.**

**Арганізацыйная работа на тэрыторыі савецкай акупацыі была вельмі цяжкай.**

**2. Акруга Палессе**

---

* Кодавая назва Навагрудскай акругі.

** Па вайсковай тэрміналогіі польскага камандавання СЗП -- ЗВЗ -- АК абвод, як адзінка адміністрацыйнага дзялення, адпавядаў тэрыторыі павета (раёна).

*** Лэнка (польск.) -- луг. Кодавая назва Шчучынскага абводу.

**** Кодавая назва Лідскага абводу.

Камендантам акругі быў "Кузьма*.
Яго намеснік — спачатку "Вільк" ("Марыя**"), а з чэрвеня 1940 г. — "Рыбак***". "Вільк" ("Марыя") вёў разведку.
Кузьма падрыхтаваў 12 падхарунжых, з якімі цяпер няма сувязі.
У канцы жніўня 1940 г. "Кузьму" арыштавалі. Па загаду "Вілька" былі знішчаны ўсе запісы і шыфры "Кузьмы" . Работа практычна спынілася."
З польскіх крыніцаў вядома, што ў Давыд-Гарадку спрабаваў арганізаваць канспіратыўную сетку з работнікаў мясцовых лясніцтваў былы валынскі ваявода Генрык Ёжэўскі, яго выкрутасы ваеннага лёсу закінулі на Палессе. Усе спробы значымых вынікаў не прынеслі.
Пра станаўленне польскага падполля ў Віленскай акрузе, якая ў склад абшару Беласток не ўваходзіла, а падпарадкоўвалася непасрэдна галоўнаму камандаванню СЗП-ЗВЗ, было сказана ў раздзеле "Віленская канспірацыя". Трэба толькі адзначыць, што ў перадваенны час тут была створана, дзякуючы ў значнай ступені прыбылай з Варшавы кіраўніцкай групе афіцэраў, найбольш актыўная і баяздольная арганізацыя.
На тэрыторыі Беларусі, як структурная частка Віленскай акругі, існаваў Браслаўска-Пастаўскі інспектарат. Ён складаўся з Браслаўскага, Дзісненскага, Маладзечанскага, Ашмянскага, Пастаўскага і Вілейскага абводаў.
Усе польскія падпольныя фарміраванні на былых "крэсах" чакалі свайго часу "Ч". Ён, па задуме польскіх кіраўнічых колаў, павінны быў прабіць увесну 1941 г. Менавіта на гэты час намячалася ўсеагульнае ўзброенае паўстанне.

## ПАД УДАРАМІ НКУС

Калі падсумаваць сказанае ў папярэдніх раздзелах, то вырысоўваюцца наступныя малюнкі.
17 верасня 1939 г. для польскай дзяржавы, ва ўсялякім разе для яе кіраўніцтва, СССР быў такім самым агрэсарам, як і немцы. Праўда, польская вярхоўная ўлада з гадамі забудзе, што СССР неаднойчы прапаноўваў Польшчы заключыць узаемныя дамовы. На выпадак вайны таксама. Палякі дужа не любяць успамінаць, што яны ад перагавораў фактычна адмовіліся. Пасля прыходу Чырвонай Арміі кіраўніцтва Польшчы знаходзілася на сваёй зямлі ўсяго адныя суткі. Уцякло. Пра ўступленне ў вайну з Савецкім Саюзам афіцыйна не аб'явіла.
Аднак паход Чырвонай Арміі, распрапагандаваны Масквой як вызваленчы, для заходніх беларусаў і заходніх украінцаў ён менавіта такім і быў, польскія пасольствы ў сарака дзяржавах свету абвясцілі як агрэсію СССР. "Праклятыя" Саветы фактычна сталі заадна з

---

* Капітан Аляксандр Хабіняк.
** Прозвішча невядома.
*** Ксаверы Сасіноўскі.

Германіяй. Саветы супрацьстаялі лагеру саюзнікаў, якія падтрымлівалі Польшчу.

З такога пункту гледжання зыходзілі арганізатары канспіратыўнай польскай сеткі на "крэсах". Яе галоўная мэта -- падняць народ на паўстанне, вярнуць Польшчы тэрыторыі ў давераснёўскіх граніцах. Паўстанне павінна было ахапіць усю былую Другую Рэч Паспалітую, у тым ліку Заходнюю Беларусь.

У той час кіраўніцтва ЗВЗ жыло ў палоне ілюзіяў. Вясной 1940 г. пачнецца наступленне саюзнікаў па ўсяму фронту. Немцы будуць нашчэнт разбітыя англа-французскімі войскамі, вызваленне ўсходніх земляў ад Саветаў проста непазбежнае. Як двойчы два. Таму перад польскім падполлем у той час стаяла найважнейшая задача -- выдатна падрыхтаваць паўстанне. Збіралася зброя, па-антысавецку агітавалася насельніцтва, арганізоўвалася разведка. На шлях зносінаў, па якіх з СССР у Германію паступалі нафта, бензін, другая стратэгічная сыравіна, былі факты сабатажу. Дзейнічалі і партызанскія групы, хаця, будзем шчырымі, партызанскі рух не атрымаў шырокага развіцця. Згаснуў, не спраўдзіўшыся.

Усё гэта не магло не застацца па-за ўвагай органаў НКУС. Удары савецкай дзяржбяспекі па польскім падполлі былі бесперапынныя, бязлітасныя. Пад іх пападалі радавыя члены канспіратыўных ячэйкаў і вышэйшае кіраўніцтва, у тым ліку кіраўнікі Беластоцкага абшару. З 1940 г. аднаго за адным арыштоўвалі выконваючых абавязкі камендантаў падпаручніка Антаніна Іглеўскага ("Нечуй"), перакінутага з Варшавы на пасаду каменданта абшару-2 падпалкоўніка Юзэфа Спыхальскага ("Сьцібор")*, яго спадарожніка і памочніка маёра бранетанкавых Яна Шульца-Праўдзіца Шляскага ("Барсук"), другіх афіцэраў. З вышэйшага кіраўніцтва абшару Беласток удалося ўцалець адно маёру Уладыславу Лінярскаму ("Мсціславу"). Страшэнны ўдар абрушыўся і на гродзенскае падполле, дзе да таго часу паспелі стварыць два абводы-- "Правы Нёман" і "Левы Нёман".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў былога начальніка Беластоцкага абласнога ўпраўлення НКУС БССР С. С. Бельчанкі:** "...На працягу 1939--1940 гадоў праз граніцу па рознага роду пропусках і вусных дазволах пераходзіла вельмі шмат людзей. Разам з тым павялічвалася

---

* Як сведчыць Антанін Іглеўскі, падпалкоўнік Спыхальскі прыбыў да яго з Варшавы ў кастрычніку 1940 г. разам з Праўдзіцам , каб наладзіць, зкаардынаваць і пракантраляваць дзейнасць ЗВЗ у Беластоцкай, Навагрудскай і Палескай акругах. Сам Іглеўскі знаходзіўся на нелегальным становішчы, пражываў у мясцовасці Вялікі Дуб на Беласточчыне. Адразу пасля прыбыцця Спыхальскі пачаў інспектаваць канспіратыўную сетку ў Ломжыцкім, Сувальскім і Аўгустоўскім паветах. Праз два тыдні, на пачатку лістапада, Спыхальскі і Іглеўскі адбылі ў напрамку Вільні. 17 лістапада іх арыштавалі ў часе начлегу ў вёсцы Марусы.

Каля года яны правялі ў савецкай турме. У канцы 1941 г., як і многія іншыя польскія афіцэры, адбывалыя пакаранне ў савецкіх турмах і лагерах, былі вызвалены ў адпаведнасці з дамовай савецка-польскага пагаднення. Спачатку знаходзіліся ў фарміраваным корпусе генерала Андэрса, потым іх перакінулі ў Англію, дзе прайшлі перападрыхтоўку ў спецшколе дыверсій. Шостага сакавіка Спыхальскаму прысвоілі званне палкоўніка. Абодвух на самалётах дэсантавалі ў Польшчу для ўдзелу ў падпольнай рабоце -- Спыхальскі 31 сакавіка 1942 г., Іглеўскі на год пазней -- 12 лютага 1943 г.

Як афіцэр сувязі штаба вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Лондане "Сьцібор" (ён карыстаўся даверам і павагай генерала Сікорскага) прыбыў у Польшчу з надзвычай шырокімі паўнамоцтвамі, з практычна неабмежаванай

колькасць нелегальных пераходаў граніцы. У пошуках выратавання ад фашысцкіх рэпрэсій на наш бок пераходзілі некаторыя жыхары акупаваных краінаў (палякі, французы, галандцы, бельгійцы, нарвежцы, жыды). Нелегальныя пераходы выклікаліся і тым, што новая граніца парушыла сваяцкія і другія сувязі паміж людзьмі. Узнікла сур`ёзная небяспека: масавы паток насельніцтва мог быць выкарыставаны гітлераўскай разведкай для вядзення шырокай разведвальнай і падрыўной дзейнасці супраць нашай краіны.

Напружанай была атмасфера ў прыгранічных і прылеглых раёнах заходніх абласцей. У той час як рабочыя, беднякі і большая частка сялян-сераднякоў з усіх сіл памагалі станаўленню і ўмацаванню Савецкай улады, эксплуататарскія класы спрабавалі вярнуць старыя парадкі. Варожую пазіцыю да Саветаў займала і каталіцкае духавенства.

Намаганнямі аператыўнікаў тэрытарыяльных органаў і пагранічнікаў у параўнальна кароткі тэрмін удалося арганізаваць разведвальную службу. Мне і другім работнікам упраўлення часта даводзілася бываць на граніцы, сумесна з пагранічнікамі праводзіць складаныя чэкісцка-вайсковыя мерапрыемствы па яе ўмацаванні. Трэба сказаць, патрыятычна настроеная частка мясцовага насельніцтва заўважала варожую дзейнасць некаторых элементаў, сігналізавала пра гэта. Людзі прыходзілі на заставы, у камендатуры, атрады, гарадскія і раённыя апараты НКУС -- НКДБ* і паведамлялі нам пра з`яўленне ў іхніх вёсках і на хутарах падазроных асобаў.

---

свабодай дзеянняў. У прыватнасці "Сьцібор" мог самастойна, без узгадненняў карыстацца радыё, сувяззю паштоваю, мог перасылаць рапарты і данясенні ў Лондан. Меркавалася, ён будзе адыгрываць адну з важнейшых роляў у кіраўніцтве падполлем. Але лонданскі эмісар не знайшоў агульнай мовы з тутэйшым гаспадаром -- генералам "Гротам", быў прызначаны на другарадную пасаду інспектара штаба.

Па некаторых звестках, адной з прычынаў непаразумення Стэфана Равецкага ("Грота") са Спыхальскім з`яўлялася тое, што контрразведцы ЗВЗ -- АК стала вядома пра сустрэчу Спыхальскага з братам Мар`янам, адным з арганізатараў і кіраўніком Гвардыі Людовай -- падпольнай антыфашысцкай арганізацыі, якая аб`ядноўвала ў сваіх шэрагах левыя сілы. Левых (камуністаў, сацыялістаў і проста дэмакратаў) польскія генералы цярпець не маглі. Як і ксяндзы. Узгадаем паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Зачалі ўсё палякі, узняліся першымі палякі, а расхлёбваць самую горкую кашу давялося беларусу. Яно не скончылася б так трагічна, каб польскія тагачасныя "генералы" не адракліся ад Каліноўскага, не распылялі сілы, не грызліся за першынство між сабою.

Пасля вайны жонка палкоўніка Юзэфа Спыхальскага пісала, што Спыхальскі атрымаў заданне ад Сікорскага шукаць кантакту з левымі сіламі Супраціўлення. Поўнасцю свае паўнамоцтвы "Сьцібор" не змог рэалізаваць на практыцы, бо яго роля ў кіраўніцтве ЗВЗ -- АК заставалася малазначнай. Пры сустрэчы ў Варшаве ў лютым 1943 г. са сваім былым паплечнікам па беластоцкім падполлі Антанінам Іглеўскім Юзэф Спыхальскі скардзіўся, што яму даводзіцца працаваць з людзьмі, якія асабістыя амбіцыі ставяць вышэй інтарэсаў Польшчы, справы. Пазней "Сьцібор" быў прызначаны камендантам Кракаўскай акругі АК. Схоплены гестапа 24 сакавіка 1944 г. Закатаваны ў канцлагеры Заксенаўзен у жніўні 1944 г.

Калі былі створаныя групы і брыгады садзейнічання з мясцовых жыхараў, дык яны самі нярэдка затрымлівалі падазроных асобаў і перадавалі іх пагранічнікам.

Паляпшэнне разведвальнай і контрразведвальнай работы, якую вялі пагранічнікі, не замарудзіла адбіцца на агульным становішчы справаў. Удалося ліквідаваць многія пункты пераправы агентаў праціўніка, павялічылася лічба затрыманых парушальнікаў граніцы. Толькі з кастрычніка 1940 г. па красавік 1941 г. на ўчастках трох пагранічных атрадаў Беластоцкага накірунку было затрымана каля 120 чалавек. У 69 выпадках пры сутычках з парушальнікамі пагранічным нарадам давялося ўжываць зброю.

Збіраючы разведвальныя дадзеныя, варожая агентура імкнулася ўстанавіць сувязь з настроенымі антысавецкі асобамі, схіляла іх да актыўнага супрацоўніцтва. Адзін з выкрытых намі агентаў паказаў, як яго ледзь не прымусова цягнулі на сувязь з кіраўніком падпольнай арганізацыі ў Гродна.

Зімой 1940 г. я прыехаў у Гродна, каб дапамагчы начальніку гарадскога аддзела НКУС Адзінцову. Паступіў сігнал пра існаванне ў горадзе глыбока законспіраванай падпольнай арганізацыі, якая мела друкарню і вялікую колькасць зброі. Акурат у гэты час у Гродне і другіх населеных пунктах з'явіліся антысавецкага зместу лістоўкі.

Адзінцоў паказаў мне запіску, аўтар яе не называў свайго прозвішча, прасіў ва ўмоўленым месцы арганізаваць яму сустрэчу з начальнікам абласнога ўпраўлення НКУС. *

Да запіскі быў прыкладзены білет на апошні сеанс у адзін з кінатэатраў, удакладнялася, што аўтар будзе сядзець справа ад мяне і на маё пытанне "Цікавая карціна?", адкажа "Гавораць, цікавая". Праз паўгадзіны ён паднімецца і пойдзе да выхаду, а мне патрэбна, не губляючы яго з віду, выйсці з кінатэатра і рухацца ўслед за ім да вугла завулка (указана назва). Там памінаваць яго, сесці ў сваю машыну, а ён праз некалькі хвілінаў таксама сядзе ў гэтую машыну.

Прыняўшы ўсе неабходныя меры, каб пазбегнуць непрыемнасцяў, калі ўсё гэта акажацца элементарнаю лавушкаю ці правакацыяю, мы выканалі план дзеянняў аўтара запіскі. З драбнюсенькаю розніцаю. У машыне чакаць невядомага засталіся я з Адзінцовым, а ў кінатэатр у суправаджэнні двух разведчыкаў пайшоў адзін з нашых аператыўных работнікаў.

Праз 40 хвілінаў у нашай машыне сядзеў чалавек гадоў 45,

---

* Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 3 лютага 1941 г. НКУС СССР быў раздзелены на два самастойныя органы: Народны камісарыят унутраных справаў СССР і Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі СССР. 20 ліпеня 1941 г. НКДБ СССР і НКУС СССР былі аб'яднаны ў адзін Наркамат -- НКУС СССР. 14 красавіка 1943 г. быў зноў створаны самастойны Наркамат (з 1946 г. -- Міністэрства) дзяржаўнай бяспекі. 5 сакавіка 1953 г. МУС і МДБ СССР аб'яднаны ў адно Міністэрства ўнутраных справаў. Адпаведныя змены адбываліся і ў рэспубліканскіх, абласных і раённых органах унутраных справаў і дзяржаўнай бяспекі.

інтэлігентнага выгляду: добра размаўлялы па-руску, хоць і з польскім акцэнтам. Ён сказаў, што хоча ведаць, з кім будзе размаўляць, папрасіў пацвердзіць дакументам. Пра сябе паведаміў, што ў Гродне ён праездам, за прыналежнасць да Кампартыі Польшчы доўга сядзеў у турме, вызвалены Чырвонай Арміяй. Прозвішча яго Сядлоўскі. Дадаў: "Я магу назвацца любым прозвішчам, тым болей, што ніякіх дакументаў у мяне няма. Да пытання, якое прывяло мяне да вас, гэта не мае ніякага прамога дачынення. Палітычныя перакананні заставілі мяне шукаць сувязі з вамі, каб расказаць, што, можа быць, не зусім ясна ў гэты момант". Ён падрабязна расказаў пра тыя сілы, якія не могуць прымірыцца з новымі парадкамі і вядуць падрыўную работу супраць Савецкай улады.

-- На жаль, я не магу назваць вам канкрэтных асобаў, якімі трэба зацікавіцца,-- працягваў незнаёмец.-- Але дзяўчына Марыся, якая жыве па адрасу... (назваў дакладны адрас), вядзе падазроны спосаб жыцця, часта на некалькі дзён адлучаецца з дому. Раю да яе прыглядзецца. Калі ўзнікне неабходнасць сустрэцца са мною, я буду ў Львове (указаў адрас).

Падзякаваўшы субяседніка, мы паехалі.

Праз некаторы час былі атрыманы даныя пра Марысю. Маладая, надта прыгожая дзяўчына. Нядаўна прыехала ў Гродна быццам бы з Варшавы. Стала вядома, што Марыся часта ездзіла па чыгунцы з Гродна ў Львоў, па дарозе на некаторых станцыях сустракаецца з маладымі людзьмі, вядзе з імі сяброўскія гутаркі, штосьці ад іх атрымоўвае і штосьці ім перадае. Часам зварочвала ў бок ад чыгункі, карысталася спадарожнымі падводамі. Некаторыя павозкі яе чакалі быццам спецыяльна.

Маладыя людзі сустракаліся з Марысяю, таксама часта адлучаліся з дому, часта сустракаліся з другімі маладымі людзьмі. Вымалёўваўся дужа цікавы ланцужок сувязных.

Час прыспешваў. Марысю затрымалі. На першым допыце яна катэгарычна ўсё адмаўляла. Потым заявіла, што яе паездкі і сувязі маюць асабісты, інтымны характар.

Яна з сям'і сярэдняга дастатку, яе бацькі педагогі, ніколі не прымыкалі ні да якіх партыяў. Значыць, сям'я не магла падштурхнуць яе на барацьбу з намі. Тут сказваўся чыйсьці варожы ўплыў.

У апошніх размовах я адчуў хісткасць яе перакананняў, хоць нацыяналістычныя антысавецкія погляды пра будучыню Польшчы яна не хавала, нават спрабавала пераканаць мяне ў сваёй праваце.

Яе не катавалі, не марылі голадам. Проста расказалі, што яе і сувязных чакае пры далейшых адмаўленнях ад відавочных фактаў, выкручваннях. Чакае не праз год-два -- праз месяц. Суд, катарга. Як і кожнага шпіёна і дыверсанта.

Аднойчы сама папрасіла, каб яе вызвалі на допыт.

-- Я хачу прасіць вас,-- сказала Марыся,--каб вы далі слова, што не зачэпіце тых, хто памыляецца таксама як я. Іх нямала. Мне надта шкада іх, тым больш што ў многім вінавата я сама. Зараз я гатова несьці поўную адказнасць за ўчыненае. Па ўсёй строгасці савецкіх законаў.

Я паабяцаў уважліва разабрацца з кожным чалавекам паасобку. Марыся расказала пра шырокую сетку заканспіраванай польскай антысавецкай арганізацыі. Арганізацыя набывае зброю, боепрыпасы і захоўвае ў надзейных месцах, пра іх ведаюць нямногія. Гродзенская арганізацыя звязана з арганізацыямі іншых гарадоў, у тым ліку Львова. На чале кожнай з іх стаіць камендант. Кіраўніцкія ўказанні паступаюць з Варшаўскага цэнтра.

Небяспека існавання разгалінаванай падпольнай арганізацыі стала ўпаўне відавочнай. Трэба было пранікнуць у самае ядро арганізацыі, выявіць галоўных яе кіраўнікоў, месцы іх знаходжання, яўкі, паролі. Толькі асоба, якая карысталася даверам у арганізацыі, магла дапамагчы нам сабраць такія звесткі. Марыся дала згоду паспрабаваць памагчы нам. Мы ішлі на рызыку. А раптам яе чыстасардэчнасць толькі гульня, сэнс яе -- імкненне любою цаною вызваліцца, уратаваць арганізацыю ад правалу? Гэта магло адбыцца. Аднак мы ўсё ж вырашылі дзейнічаць. Рызыкаваць. Час губляць нельга было.

Мы далі Марысі шанец загладзіць сваю віну, пазбегнуць турмы самой і блізкім. Хутка пераканаліся, не памыліліся. Умелая і самаахвярная дзяўчына памагла знайсці добрых памочнікаў. Яны сабралі дастаткова матэрыялаў, што выкрывалі кіраўнікоў арганізацыі і яе актыву ў падрыўной антысавецкай дзейнасці.

Аператыўныя органы сумесна з пагранічнымі і ўнутранымі войскамі правялі чэкісцка-вайсковую аперацыю. Сярод арыштаваных аказаліся некаторыя кіраўнікі і актыў буржуазна-нацыяналістычнага падполля на чале з важным эмісарам "Стэфанам". Пры вобыску нам трапіла багата важных дакументаў, нямала замежнай валюты.

Вайсковымі сіламі ўдалося нанесці ўдар па месцах базавання бандаў. Бандыты былі ўзброены пісталетамі, вінтоўкамі, аўтаматамі, гранатамі, ручнымі і станкавымі кулямётамі, мінамётамі. Многія ўзоры захопленай намі зброі аказаліся нямецкага паходжання. У гэтай аперацыі ўдалося выявіць цэлую сістэму схронаў -- месцаў укрыцця бандытаў, іхніх кіраўнікоў.

З цягам часу мы пачалі атрымліваць усё новыя і новыя даныя. Уцалелыя арганізацыі буржуазна-нацыяналістычнага падполля ўзялі накірунак на збор разведвальных даных. Не паўстанне са зброяй у руках, але ўсё роўна не падаруначак.

Была знойдзена магчымасць пранікнуць у кіруючыя цэнтры новага падполля.

У жніўні 1940 г. прыйшло паведамленне, што на ўчастку Аўгустоўскага пагранічнага атрада ў апошняй дэкадзе жніўня павінны быў перакінуты на нашую тэрыторыю чалавек з вельмі важнай місіяю. Пагранічнікі арганізавалі ўзмоцненую ахову граніцы ў накірунках магчымага руху парушальніка. У цёмную дажджлівую ноч парушальнік быў затрыманы, пад узмоцненым канвоем дастаўлены ў Аўгустоўскі райаддзел НКУС. Затрыманага старанна абшуквалі. Акрамя сахарыну, у яго нічога не знайшлі.

Знешнія прыкметы чалавека супадалі з данымі пра магчыма

важнага парушальніка. Пераход граніцы затрыманец тлумачыў жаданнем абмяняць сахарын на тлушч, бо, маўляў, нямецкія акупанты забіраюць у польскага насельніцтва прадукты і людзі галадаюць. Усё праўдзіва. Усё-такі зрабілі паўторны, больш пільны вобыск. Удалося знайсці ў каўняры кашулі маленькі шматок папяроснай паперы з незразумелым тэкстам. Затрыманы пачаў даваць блытаныя, супярэчлівыя паказанні, сцвярджаў, што кашулю купіў тры дні таму ў аднаго чалавека. Пра знойдзеную запіску не мае ніякага паняцця.

Нарэшце, адчуваючы, што ўсё больш і больш заблытваецца, ён сказаў: "Добра, я буду гаварыць усю праўду, толькі паабяцайце, што мяне не расстраляюць". Прыйшлося растлумачыць, што нашы судовыя органы ўлічваюць факт чыстасардэчнага і поўнага прызнання віны.

Знойдзеная шыфраваная запіска была адрасавана важаку антысавецкай падпольнай арганізацыі ў Беластоку. Адрасату прапаноўвалася аказваць усялякую дапамогу кур`еру ў выкананні атрыманага задання. Гаспадары за мяжой былі незадаволены ходам антысавецкай падрыўной работы і для актывізавання яе накіравалі асабістага ўпаўнаважанага.

Атрыманыя звесткі навялі на думку завабіць на тэрыторыю Беларусі дзеячаў кіраўніцкага цэнтра, у прыдатным месцы арганізаваць нараду ўсіх актывістаў падполля і... затрымаць іх.

Пачатак аперацыі быў шматабяцаючым, але потым выйшла замінка. У кіраўнікоў варожай разведкі, напэўна, з`явіліся сумненні, а то і падазрэнні. Яны паслалі новага сувязнога. Пераход таго на нашу тэрыторыю, сустрэча з першым упаўнаважанцам праходзілі пад нашым назіраннем. Новы сувязны ўпэўніўся, што ўсё ў парадку, адбыў за кардон. Праз два тыдні цераз спецыяльна падрыхтаваную -- быццам падполлем -- пераправу сувязны вывеў на нашу тэрыторыю эмісара з вялікімі паўнамоцтвамі, ён прыбыў для дапамогі антысавецкаму падполлю.

Хутка на адным з глухіх хутароў сабралася запланаваная намі нарада камендантаў павятовых арганізацыяў і кіраўнікоў буржуазна-нацыяналістычнага падполля. Аперацыя па захопу ўдзельнікаў нарады разварочвалася па раней намечаным плане. Да пачатку нарады, да 12 гадзінаў ночы, мы ўжо высветлілі, хто і адкуль прыбыў на хутар. Ноч стаяла цёмная, бязмесячная. Нашы людзі непрыкметна падцягнуліся да хутара, акружылі яго. Было вядома., што нарада ахоўваецца, у кожнага з яе ўдзельнікаў ёсць пісталет і гранаты. Аперацыю вырашылі распачаць у 0.30. Кожная група па сігналу старшага павінна кінуцца да хутара і дакладна выканаць сваю задачу. Поспех гарантаваўся неспадзяванасцю і арганізаванасцю дзеянняў.

Нечакана падзьмуў свежы вецер. Воблакі парадзелі, з`явіўся месяц, асвяціў ваколіцу. Пры месяцы, вядома, не ўдасца напасці знянацку. Часу аставалася ўсё меней, хвіліны ляцелі імгненнямі. Няўжо аперацыя сарвецца?! Усе ў вялікім напружанні. Паглядвалі на гадзіннікі, на неба. Вось шалапут месяц! Вызірнуў, як не трэба.

І раптам -- моцны парыў ветру, месяц схаваўся за вялікім

воблакам. Наступілая раптоўна цямнеча ўсіх як па камандзе падняла на ногі. Мы кінуліся да хутара. Ахова (12 чалавек) без ніводнага стрэлу была схоплена і абяззброена. Наступіла чарга і саміх удзельнікаў нарады. Аперацыя прайшла паспяхова.

Так была абезгалоўлена антысавецкая буржуазна-нацыяналістычная арганізацыя на тэрыторыі Беластоцкай вобласці і прылеглых да яе раёнаў".

Канешне, з пункту гледжання сённяшняга дня лексіка ўспамінаў былога супрацоўніка НКУС выглядае некалькі архаічнай. На самай справе, называць "бандытамі" людзей, якія, рызыкуючы ўласным жыццём, змагаліся за ідэю, за ўласную дзяржаву, безаглядна верылі ў яе, няхай сабе і стаялі на супрацьлеглым баку барыкадаў, мякка кажучы, непрыгожа. Але з песні слова не выкінеш. Для Бельчанкі гэтыя змагары, якіх у Польшчы завуць лепшымі сынамі і дачкамі народа, былі лютымі, ненавіснымі ворагамі, іх ён выкарчоўваў, як толькі мог.

Успаміны энкавэдзіста у кантэксце даследаванай тэмы прадстаўляюць пэўны інтарэс хоць бы таму, што гэта відавочца і ўдзельнік апісаных падзеяў. Мы проста не маем права ігнараваць яго сведчанні, адмахвацца ад яго бачання праяваў вострай, зацятай барацьбы непрымірымых праціўнікаў. Мы сказалі ў прадмове, паўторымся і тут: будзем удзячныя за любыя дапаўненні тэксту. Дапаўненні з любых бакоў барыкадаў.

У ходзе даследавання тэмы нам яшчэ не раз прыйдзецца звяртацца да ўспамінаў былых чэкістаў, спасылацца на матэрыялы тых ці іншых крымінальных справаў савецкіх судовых органаў. Вядома, у сувязі з гэтым на старонках кнігі будуць сустракацца словы і выразы тыпу "бандыты", "бандгрупы", "нацыяналістычнае антысавецкае белапольскае контррэвалюцыйнае падполле" і г. д. Камусьці яны будуць рэзаць слых ці калоць у вока.

Што ж зробіш! Так тады гаварылі, так пісалі, і, зразумела, адпаведна дзейнічалі. І калі быць максімальна дакладным, прыйдзецца захаваць у кнізе і тую лексіку, якая ўжывалася ў тагачассе, бо лексіка мінуўшчыны -- таксама гісторыя, а наша задача -- паказаць былое так, як было ў жыцці, нічога не абяляць і нічога не затушоўваць.

А цяпер давайце зноў вернемся ў даваенны жорсткі і супярэчлівы час, калі ў абставінах "пастаянна абвостранай", па выразу Сталіна, "класавай барацьбы" знішчаліся варожыя гнёзды, "выкарчоўваліся ворагі". Як сведчаць архіўныя даныя, толькі да ліпеня 1940 г. у Заходняй Беларусі было арыштавана 8815 членаў польскай канспіратыўнай сеткі: 3231 з іх -- як "удзельнікі контррэвалюцыйных арганізацыяў". Надалей махавік рэпрэсіі набіраў большыя абароты.

Прыкладна па такім сцэнарыі, выкарыстаным у Беластоку і Гародні, разгромлівалася польскае падполле і ў другіх рэгіёнах Заходняй Беларусі. Энкавэдзісты выходзілі на след аднаго альбо некалькіх удзельнікаў канспірацыі, нехта абавязкова "расколваўся". У Лідзе ім аказаўся маёр Рыпер -- інтэндант мясцовага гарнізона да верасня 1939 г. У свой час ён служыў у аўстра-венгерскай арміі,

потым -- у легіёнах Пілсудскага. Па паходжанні -- аўстрыйскі яўрэй. Жаніўся на польцы, прыняў каталіцкую веру. Арыштаваны ў канцы 1940 г.

"Зламаўся" ў часе допытаў. У выніку схапілі больш 200 чалавек з канспіратыўнай сеткі Лідскага абводу. Гэта быў самы буйны правал ЗВЗ на тэрыторыі беларускіх "крэсаў" напярэдадні вайны. Сам Рыпер загінуў у часе эвакуацыі турмы на ўсход 23 чэрвеня 1941 г. Ад каго -- нямецкіх бомбаў ці куляў зацятых ахоўнікаў, што выконвалі бяссэнсавыя загады? Устанавіць нам не ўдалося.

## УЗНЯЎСЯ МЕЧ НАД ВІЛІЯЙ

У параўнанні з Заходняй Беларуссю раскрыццё і разгром органамі НКУС -- НКДБ польскіх канспіратыўных арганізацыяў на Віленшчыне пачаўся на 9 месяцаў пазней. Тым не менш удары дзяржбяспекі па віленскаму падполлю аказаліся таксама вельмі адчувальнымі, жорсткімі, хоць не ў такой ступені, як у астатняй Беларусі.

Ужо са жніўня 1940 г. пачаліся масавыя арышты. І тут не абышлося без здрады. Былы афіцэр польскай арміі Ян Шаблоўскі, які яшчэ перад вераснёўскай кампаніяй быў разжалаваны ў радавыя, а потым выгнаны з арміі за ўчыненую растрату па лініі інтэнданцкай службы, пачаў супрацоўнічаць з органамі НКУС. Праўда, доўга супрацоўнічаць яму не давялося. Па прыгавору спецыяльнага суда ЗВЗ пры штабе акругі Шаблоўскі быў застрэлены ў сваёй кватэры па вуліцы Пяскі на Антокалі. Прывяла прыгавор у выкананне карная група пад кіраўніцтвам падхарунжага Даніэля Кастравіцкага ("Данака").

Некаторым афіцэрам удалося пазбегнуць энкавэдзістаў, ім давялося перайсці на нелегальнае становішча. Сярод іх аказаліся і тыя, хто ўваходзіў у кіроўнае ядро падполля: маёр Аляксандр Кжыжаноўскі ("Сьмёнтак"), капітан Антоні Аляхновіч ("Метэор"), капітан Скшэч ("Палескі"), паручнік Аляксандр Васілеўскі, падпаручнік Бужыньскі і іншыя.

У пачатку сакавіка 1941 г. у Коўне правалілася канспіратыўная ячэйка ЗВЗ на чале з паручнікам Збігневам Ёнтысам. Абвалам пакацілася новая хваля арыштаў. Напрыканцы сакавіка прама на вуліцы былі затрыманы капітан Кароль Зялінскі ("Бжоза"), камендант Віленскага падпольнага гарнізона, і паручнік Стэфан Чэрнік ("Орлат"), начальнік аддзела сувязі штаба акругі. Па рашэнню каменданта Нікодэма Суліка Зяліньскага замяніў паручнік Балеслаў Васілеўскі ("Зоя"). Праз месяц яго таксама арыштавалі.

Ноччу з 10 на 11 красавіка 1941 г. узялі маёра Уладыслава Каміньскага ("Сьліву"), а праз два дні, у велікодную нядзелю -- самога каменданта акругі падпалкоўніка Нікодэма Суліка і разам з ім адваката Яна Вісьціскага -- старшыню спецыяльнага суда пры камендатуры акругі. Праз некалькі дзён у арыштоўную сетку папаліся іншыя члены штаба акругі, сярод іх шэф "двуйкі" (разведкі)

падпалкоўнік Зыгмунт Цэнтняроўскі ("Зыгмунт"), інтэндант Юліан Петрашэўскі ("Юліан"), падпаручнік Садоўскі. У рэшце рэшт у канцы мая 1941 г. такі самы лёс напаткаў ксяндза Казіміра Кухарскага ("Шчэпана") -- аднаго з галоўных, зацятых арганізатараў і натхніцеляў віленскай канспірацыі.

Пасля арышту падпалкоўніка Суліка выконваць абавязкі камендапта акругі пачаў маёр Аляксандр Кжыжаноўскі. Ён хаваўся ў Лендвараве, адтуль кіраваў падпольнай работай, час ад часу нелегальна прабіраўся ў Вільню, наладжваў асабістыя кантакты з вайскоўцамі і з цывільнымі дзеячамі канспірацыі. Для захавання рэшткаў арганізацыі Кжыжаноўскі забараніў правядзенне антысавецкіх акцыяў, засталаму складу акругі загадаў перайсці ў глыбокае падполле. Калі ўжыць марскую тэрміналогію -- легчы на дно. Дэканспіраваным у выніку правалаў рэкамендаваў хавацца ў правінцыі.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў удзельніка Віленскага падполля Аляксандра Васілеўскага:** "Калі хваля арыштаў узмацнела, я пераехаў з Вільні ў Навасады, фальварак майго цесця, які знаходзіўся на правым беразе Віліі прыкладна за 6 кіламетраў на захад ад Вільні. Хутка даведаўся, што супрацоўнікі НКУС былі ў маёй жонкі па вуліцы Ліпавай, 4 і распытвалі пра мяне. Неўзабаве да мяне дайшла вестка, што маёй персонай цікавіліся і ў маці, якая тады жыла ў фальварку Дэгіні.

З кожным днём ставала ўсё гарачэй ад энкавэдзісцкіх агідных шчупальцаў. У Навасадах я ўжо не адчуваў сябе ў бяспецы, тым больш, суседзі ведалі, што я афіцэр. У першыя дні чэрвеня 1941 года падчас спаткання з камендантам акругі я праінфармаваў яго, што мяне шукаюць і таму вымушаны змяніць месца сховішча. Маёр Кжыжаноўскі адказаў, што таксама мае такі намер, бо больш не адчувае сябе ў Ландвараве ўпэўнена, параіў разам прыглядзецца да адпаведнага месца, дзе маглі б знайсці сховішча. Гэтую справу мы меліся канчаткова абгаварыць на спатканні ў плябані ксяндза Сьвіркоўскага, прадстаўніка епіскапскай курыі ў радзе акругі.

За дзень перад дамоўленым спатканнем у Вільні зноў пачаліся масавыя арышты. На досвітку можна было бачыць на вуліцах шмат ваенных грузавікоў са спецыяльна нарошчанымі бартамі, наладаваных мужчынамі і жанчынамі, старымі і дзецьмі. На кожным грузавіку былі салдаты НКУС, на некаторых -- малады жыд, хціўыя здраднікі добра ведалі горад і служылі карнікам за праваднікa. Уражаных людзей выцягвалі з кватэраў у ясны, сонечны дзень -- груба, адкрыта, нягледзячы на густы вулічны рух. Натоўпы арыштаваных запіхвалі ў Новай Вілейцы ў таварныя вагоны і вывозілі на Усход.

У нядзелю я падаўся на ўмоўленае спатканне да ксяндза Сьвіркоўскага на вуліцы Роса. Размаўлялі за палуднем, ім пачаставаў

нас ксёндз Сьвіркоўскі. Акрамя мяне, прысутнічалі маёр Кжыжаноўскі, Вітольд Сьвяржэўскі -- член рады акругі, і яшчэ некалькі чалавек, іх сёння ўжо не помню.

У часе размовы ксёндз Сьвіркоўскі параіў, каб запагрожаныя арыштам перабраліся ў мястэчка Кена (15 кіламетраў на ўсход ад Вільні). Паблізу Кены ў знаёмага ксяндзу лесніка можна знайсці працу на вырубцы лесу.

У панядзелак, 16 чэрвеня 1941 г., мы паехалі -- згодна з парадай -- у Кену. Мы -- гэта Кжыжаноўскі, Сьвяржэўскі, я і яшчэ тры чалавекі. Прыйшлі да рэкамендаванага лесніка. Ён з ахвотай прапанаваў усім нам працу -- ашкурваць дрэвы.

Пасля тыдня сумленнага выстарвання, у суботу, каля полудня, я прыбыў у Вільню. Намерыўся вярнуцца ў Кену ў панядзелак. З Вільні падаўся ў Навасады. Туды тым часам пераехала жонка. Даведаўся, што ў той час, калі мы знаходзіліся ў Кене, у Вільні працягваліся бесперапынныя масавыя арышты. Штодня на ўсход ад`язджалі запоўненыя вязнямі таварныя цягнікі. Ніякага следства практычна не вялося. Хапун мёў западозраных у машыны, адтуль у турму, а то і напрамую ў цягнік.

...Раніцаю 24 чэрвеня Вільня была ў руках немцаў. Як пазней даведаўся, з апошняга падрыхтаванага да адпраўкі транспарту Саветы паспелі вывезці толькі частку людзей. Ноччу з 23 на 24 чэрвеня чыгуначнікі-палякі, выкарыстаўшы неразбярыху на чыгуначнай станцыі і паніку, ахапілую палахліўцаў-канваіраў НКУС, адчапілі частку вагонаў, так што ад`ехала ўсяго палова саставу поезда. З асталых вагонаў вызвалілі многа сотняў людзей. Сярод апынулых на свабодзе аказаліся нашы афіцэры, у тым ліку капітан Станіслаў Патоцкі ("Камень", "Вэнгельны"), паручнікі Балеслаў Васілеўскі ("Зоя"), Стэфан Чэрнік ("Орлат"), Вільгельм Тупікоўскі ("Вільгельм"), Грацыян Фруг ("Гураль", "Шчэрбец"), падпаручнік Садоўскі і супрацоўнік падпольнай газеты "Польска в вальцэ" Станіслаў Ваўжыньчык ("Лігенза").

На жаль, Саветы паспелі вывезці ксяндза Кухарскага і паручніка Петрашэўскага. Абодва потым апынуліся ў Польскіх узброеных сілах на Захадзе. Падпалкоўнік Сулік і маёр Каміньскі былі вывезены яшчэ раней, напэўна, хутка пасля арышту. Сулік камандаваў пазней, ужо ў чыне брыгаднага генерала, 5-й (Крэсовай) пяхотнай дывізіяй, а Уладыслаў Каміньскі ў званні падпалкоўніка быў камандзірам 13-га батальёна ў той самай дывізіі. Загінуў пад Монтэ-Касіно".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ**

**З рапарта № 79 галоўнага каменданта ЗВЗ генерала Стэфана Равецкага ("Грота") польскаму вярхоўнаму галоўнакамандаванню ў Лондане:**

"Ф) Аддзельная Віленьска-Ковенская акруга.

Арышты на тэрыторыі акругі прывялі да вельмі вялікіх стратаў у штабах і радах арганізацыі.

За перыяд ад 22.03. да 15.04.1941 арыштавалі: каменданта акругі "Ладыну"*, Ёнціса** -- каменданта абводу Коўна, Каміньскага***, Зяліньскага і яго намесніка. У выніку, што Ёнціс і Зяліньскі не вытрымалі на зверскіх допытах, арыштавалі таксама ксяндза Кухарскага.

Увогуле забралі каля 100 чалавек.

Паводле перакананняў бальшавікоў і літвінаў, быццам ліквідавана ўся канспіратыўная сетка.

"Сьмёнтак", які застаўся кіраваць штабам, свядома падтрымлівае такую думку, каб захаваць кадры ад небяспекі правалу. Нягледзячы на нязменна цяжкія ўмовы і недахоп сродкаў "Сьмёнтак" вёў працу бесперапынна.

Выдадзеныя польскія газеты: "Ютро Польскі***** і "Польска в кальцэ"******".

## АРЫШТЫ І ДЭПАРТАЦЫЯ

Польскае падполле перыядачна абезгалоўлівалі, бязлітасна наносілі ўдар за ўдарам па нізавых звёнах. Нягледзячы на ўсё гэта, яно жыло, дзейнічала. Падавалася, касцёр супраціўлення пасля чарговых масавых арыштаў вось-вось патухне. Але на змену выбылым у строй уліваліся свежыя сілы, яны не давалі патушыць тлелы агеньчык.

Інакш быць не магло. Большасць каталіцкага насельніцтва на "крэсах" ні ў якім разе не хацела змірыцца са сваім становішчам і намерана было змагацца да канца, кладучы на алтар барацьбы за нацыянальную ідэю ўсё новыя і новыя ахвяры, за ідэю вызвалення ад кіпцюрыстых Саветаў, за ідэю аб'яднання Польшчы ў адну дзяржаву. Вялікую, вольную. У старых межах.

---

* Нікодэм Суслік. Па ўмовах палітычнага пагаднення паміж Польшчай і СССР ад 30 ліпеня 1941 г. аб узаемнай дапамозе ў вайне з Германіяй усе арыштаваныя органамі НКУС -- НКДБ былі вызваленыя з месцаў зняволення і мелі магчымасць у складзе арміі Андэрса выбрацца за межы СССР.

** Пра тое, што Збігнеў Ёнціс не вытрымаў у часе следства, сведчыць удзельнік падполля Браніслаў Кжыжаноўскі. Як вынікае з некралогу ў газеце "Жыце Варшавы" ад 18.11.1984 г., капітан Збігнеў Ёнціс памёр у Атаве 27.10.1984 г.

*** Уладыслаў Каміньскі -- маёр запасу, пасля падпалкоўнік, былы ўладальнік маёнтка на Віленшчыне, палітык-эканаміст, прадстаўляе левае крыло санацыі. У падполлі ўдзельнічаў у выданні газеты "Польска в вальцэ". Загінуў пад Монтэ-Касіно (1944).

**** Ксёндз Казімір Кухарскі.

***** Маёр Аляксандр Кжыжаноўскі, пазней -- падпалкоўнік "Дзяміда", "Вільк".

****** "Раніца Польшчы".

******* "Польшча ў барацьбе".

Што гэтыя межы няпольскія, ведалі гісторыкі і палітыкі. Не яны, выканаўцы ідэі. Барацьбіты за ідэю не шкадавалі ні сваіх галоваў, ні чужых.

Сітуацыю добра ведалі ў вышэйшым кіраўніцтве СССР, больш таго, яе загадзя прадбачылі. Там зразумелі: каб палажыць канец супраціўленню, трэба да канца "выкарчаваць варожыя гнёзды", інакш кажучы, поўнасцю ліквідаваць сацыяльную, нацыянальную і рэлігійную базы, якія падпітвалі ачагі падполля.

Ужо ў першыя дні пасля ўступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі пачаліся арышты. Яны ахапілі розныя слаі насельніцтва -- па ўзросту, паходжанні. сацыяльным становішчы, веравызнанню і нават нацыянальнасці, бо ў ліку арыштаваных былі не адно палякі, але і беларусы, яўрэі, украінцы, немцы, латышы літоўцы... Паводле польскага гісторыка Збігнева Сямашкі (Зэшыты хісторычнэ*. Парыж. 1975. № 31. Аб паляках у СССР), трапілі пад следства і былі пазбаўлены свабоды наступнай катэгорыі грамадзяне:

-- хто да верасня адыгрываў тую ці іншую ролю ў кіраўніцтве краінай, грамадска-палітычныя дзеячы ўсіх рангаў і любых нацыянальнасцяў;

-- афіцэры і падафіцэры Войска Польскага як кадравыя, так і запасу, а таксама афіцэры і падафіцэры паліцыі, якія не трапілі ў палон у час верасnёўскай кампаніі;

-- хто быў працадаўцам альбо займаўся гандлем у значных маштабах, гэта значыць памешчыкаў, прадпрымальнікаў, уладальнікаў аптовых складаў і больш-менш значных магазінаў;

-- каго ведалі ў грамадстве і хто мог аказаць на яго ўплыў;

-- хто сваімі дзеяннямі альбо на словах выступаў супраць СССР ці кампартыі да верасня 1939 г.;

-- хто актыўна падтрымліваў польскую дзяржаўнасць;

-- хто з`яўляўся агентам польскай паліцыі (паліцэйскія сакрэтныя архівы трапілі ў рукі савецкіх органаў);

-- хто пасля ўстанаўлення Савецкай улады на "крэсах" выказваў негатыўныя адносіны да савецкіх парадкаў;

-- хто нелегальна пераходзіў граніцу;

-- хто належаў да ЗВЗ ці іншых нелегальных арганізацыяў, кружкоў, у тым ліку маладзёжных;

-- хто ў мінулы час быў звязаны з кампартыяй, але па розных прычынах адышоў ад яе;

-- на каго рабілі даносы;

-- арыштавалі таксама большасць прастытутак.

Услед за арыштамі пачалася дэпартацыя. Беспрэцэндэнтнай па маштабах і жорсткасці акцыі папярэднічала выяўленне і рэгістрацыя органамі НКУС -- НКДБ "сацыяльна небяспечных элементаў". Яшчэ 29 снежня 1939 г. была прынята пастанова Саўнаркома СССР № 2122--617 і зацверджана Палажэнне аб спецпасяленні і працаўладкаванні асаднікаў, выселеных з заходніх абласцей УССР і БССР. Палажэнне падпісаў нарком унутраных спраў Лаўрэнцій Берыя. Для спешнага выканання пастановы на чыгуначныя станцыі было пастаўлена 55 эшалонаў.

---

* Гістарычныя сшыткі. Часопіс, які выдаецца ў Парыжы на польскай мове.

Копія

ЗУСІМ САКРЭТНА

Зацверджана
Пастановай СНК Саюза ССР
ад 29 снежня 1939 г.
№ 2122--617 сс

## ПАЛАЖЭННЕ

### аб спецпасяленнях і працоўным уладкаванні асаднікаў, выселеных з заходніх абласцей УССР і БССР

1. Асаднікі і іх сем'і, перасеменыя НКУС СССР з заходніх абласцей УССР і БССР, размяшчаюцца для працоўнага выкарыстання ў спецпасёлках, арганізаваных у раёнах лясных распрацовак Наркамлесу СССР.

2. Спецпасёлкі для перасяленцаў-асаднікаў арганізуюцца НКУС СССР з разліку ад 100 да 500 сем'яў на адзін пасёлак.

3. Адвядзенне жылых памяшканняў і камунальна-бытавога абслугоўвання спецперасяленцаў-асаднікаў праводзіць Наркамлес СССР па нормах, устаноўленых для рабочых прамысловасці. Пры гэтым кожнай сям'і спецперасяленцаў-асаднікаў прадастаўляецца асобны пакой або асобнае месца ў бараку з разліку не меней 3 кв. м. жылой плошчы на чалавека.

4. Адміністрацыйнае кіраванне спецпасёлкамі асаднікаў ажыццяўляецца раённымі і пасялковымі камендатурамі НКУС СССР. Пасялковыя камендатуры НКУС СССР арганізуюцца ў кожным спецпасёлку, а раённыя камендатуры НКУС СССР - у адміністратыўных раёнах з размяшчэннем іх у цэнтры тэрыторыі, на якой размешчаны спецпасёлкі.

5. Камендатуры НКУС СССР у спецпасёлках ажыццяўляюць улік спецперасяленцаў-асаднікаў, вядуць барацьбу з уцёкамі, сочаць за захаваннем устаноўленага ў пасёлках грамадскага парадку і правілаў працоўнага карыстання.

6. Выдаткі на ўтрыманне раённых і пасялковых камендатур, а таксама выдаткі, звязаныя з адміністрацыйным абслугоўваннем спецперасяленцаў-асаднікаў (сродкі перасоўвання, паштова-тэлеграфныя выдаткі і інш.) робяцца па каштарысах камендатур за лік сродкаў, утвораных у парадку штомесячных адлічэнняў ад заработнай платы спецперасяленцаў-асаднікаў, у межах не звыш 10%...[1)]

17. Усе працаздольныя спецперасяленцы-асаднікі абавязаны займацца грамадска-карыснай працай на работах, прадастаўленых ім прадпрыемствамі Наркамлеса.

19. Спецперасяленцы-асаднікі і іх сем'і, паселеныя ў

спецпасёлках, не маюць права выезду за межы адміністрацыйных раёнаў. Адлучкі са спецпасёлкаў або месца працы на час звыш 24 гадзін, а таксама перамяшчэнне ў межах пасёлка з аднаго барака (дома) ў другі дапускаецца толькі з дазволу каменданта пасёлка.

Народны камісар унутраных спраў Саюза ССР
Л. БЕРЫЯ".

"ЗУСІМ САКРЭТНА

Зацверджана
пастановай СНК
Саюза ССР
ад 29 снежня 1939 г.
№ 2122—617 сс

ІНСТРУКЦЫЯ

Народнага камісарыята ўнутраных спраў Саюза ССР
ад 29 снежня 1939 года

1. Высяленне асаднікаў з заходніх абласцей УССР і БССР праводзіцца адначасова па УССР і БССР у дзень, назначаны НКУС СССР.

2. Пры высяленні асаднікаў уся нерухомая маёмасць, сельгасінвентар, хатняя жывёла застаецца на месцы і прымаецца па акту мясцовымі ўпраўленнямі.

3. Асаднікам дазваляецца забраць з сабой наступнае:

1) адзенне, 2) бялізна, 3) абутак, 4) пасцельныя рэчы, 5) посуд сталовы (лыжкі, нажы, відэльцы), чайны і кухонны, 6) харчы з разліку месячнага запасу на сям'ю, 7) дробны гаспадарчы і бытавы інструмент (сякера, піла, лапата, малаток, каса, граблі і г. д.), 8) грошы (сума не абмяжоўваецца) і бытавыя каштоўнасці (кольцы, гадзіннікі, завушніцы, бранзалеты, партсігар і да т. п.), 9) куфар ці скрыню для рэчаў.

4. Агульная вага пералічаных рэчаў не павінна перавышаць 500 кг на сям'ю.

Дадатак: Грувасткія рэчы, у тым ліку гаспадарчы інвентар, перавозяцца ў спецыяльна выдзеленых вагонах.

5. Адпраўка асаднікаў да месца пасялення выконваецца эшалонамі ў складзе 55 эшалонаў, абсталяваных па-зімоваму для перавозак людзей (у тым ліку адзін класны вагон для аховы і адзін абсталяваны санізалятар). У кожны вагон змяшчаецца 30 чалавек дарослых і дзяцей з іх рэчамі. Для грувасткіх рэчаў на кожны эшалон выдзяляецца па 4 таварныя вагоны.

6. На кожны эшалон НКУС СССР прызначае начальніка эшалона і адпаведную ахову. Наркамздраў СССР забяспечвае эшалоны медыцынскім персаналам у складзе аднаго медфельчара і дзвюх

медсясцёр на кожны эшалон і адпаведнымі медыкаментамі.

За 10 дзён да падачы вагонаў НКУС СССР прадстаўляе НКШЗ заяўку на эшалоны з дакладным указаннем дня падачы эшалонаў, станцыі пагрузкі і станцыі прызначэння. Падача эшалонаў забяспечвае НКШЗ не пазней за 3 дні з моманту паступлення заяўкі НКУС СССР.

7. У дарозе на чыгунцы спецперасяленцы-асаднікі атрымліваюць бясплатна адзін раз у суткі гарачую страву і 800 г хлеба на чалавека. Гатаванне і выдача ежы на шляху руху робіцца па заяўках начальніка эшалона НКУС трэстам чыгуначных рэстаранаў і буфетаў Наркамхарчу СССР. Аплата выдаткаў на харчаванне спецперасяленцаў-асаднікаў па дарозе руху вытвараецца НКУС СССР.

8. Спецперасяленцы-асаднікі накіроўваюцца на лесараспрацоўкі Наркамлесу ў Кіраўскую, Пермскую, Валагодскую, Архангельскую, Іванаўскую, Яраслаўскую, Новасібірскую, Свярдлоўскую і Омскую вобласці, Краснаярскі і Алтайскі край і Комі АССР і размяшчаюцца на месцах працы ў асобных пасёлках ад 100 да 500 сем`яў у кожным. Падрыхтоўку да прыёму спецперасяленцаў-асаднікаў, прадастаўленне ім памяшканняў і працаўладкаванне іх ускладаецца на Наркамлес СССР.

9. Перавозка спецперасяленцаў-асаднікаў ад станцыі прыбыцця да месца пасялення арганізуецца НКУС СССР. Наркамлес СССР выдзяляе ў распараджэнне НКУС СССР неабходны аўтатранспарт і харчаванне ў колькасці, забяспечваючай адначасова перакідку прыбылых спецперасяленцаў-асаднікаў.

У выпадку неабходнасці краявыя і абласныя камітэты абавязаны прадаставіць у распараджэнне НКУС СССР дадатковы аўтагужтранспарт шляхам прыцягнення мясцовых арганізацый і калгасаў.

Народны камісар унутраных спраў Саюза ССР
Л. БЕРЫЯ".

Асаднікі -- былыя польскія вайскоўцы, якія належным чынам зарэкамендавалі сябе ў часе савецка-польскай кампаніі 1920 г., у асноўным жыхары цэнтральнай і заходн яй Польшчы. За самааддадную службу ім даваліся надзелы зямлі на тэрыторыі "крэсаў". Асаднікі тут з`яўляліся апорай рэжыму санацыі, нярэдка выконвалі паліцэйскія функцыі ў адносінах да мясцовага (карэннага) насельніцтва. У сваю чаргу тутэйшыя жыхары, асабліва дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва, з яўнай непрыязню ставілася да чужынцаў, зайздросціла, што ім былі аддадзены лепшыя кавалкі зямлі, ды і размеры надзелаў у дзесяткі разоў пераўзыходзілі бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. Аб антыасадніцкіх настроях, бытавалых між сялянаў, сведчаць самасуды, якія адбываліся пасля прыходу на "крэсы" Чырвонай Арміі. Напрыклад, 22--23 верасня 1939 г. мясцовае насельніцтва з ваколіцаў Скідаля ўчыніла расправу над былымі легіянерамі-асаднікамі ў Лерыполі, Жыдомлі, Будоўлі, Ракіце.

У выніку загінулі 42 чалавекі. Тое ж самае адбылося і ў ваколіцах мястэчка Азёры, хаця там лік ахвяраў быў крыху меншы.

Польскае спрыянне польскаму элементу сярод мужыкоў-беларусаў, зачыненне беларускіх школ, прыцясненне праваслаўя, усямернае ўзвялічванне хітрамудрых ксяндзоў, вялізарнае беспрацоўе сярод беларусаў у мястэчках, гарадах і нават вёсках -- усё спрыяла накопліванню не проста нядобразычча да асаднікаў. Нянавісці. Кацёл закіпаў. Прыход Саветаў, аднолькава бязлітасных, як відно з прыведзенага спісу, да палякаў і беларусаў, спярша мроіўся выбаўленнем ад ярма пакутаў.

Але бывала і так, што ў катэгорыю асаднікаў органы НКУС залічвалі тых, хто падпадаў пад тэрмін "класава чужы ці варожы элемент", у прыватнасці работнікаў польскай лясной старажовай аховы. За перыяд з 13 па 15 лютага 1940 г. было выселена з заходніх вобласцяў рэспублікі 50 732 чалавекі гэтай катэгорыі перасяленцаў (9584 гаспадаркі асаднікаў і ляснікоў).

У адпаведнасці з берыеўскім палажэннем яны размяшчаліся ў спецпасёлках для выкарыстання на прымусовых работах у раёнах лясных распрацоўкаў, гэта значыць, у Кіраўскай, Пермскай, Валагодскай, Архангельскай, Іванаўскай, Яраслаўскай, Новасібірскай, Свярдлоўскай, Омскай абласцях, Краснадарскім, Алтайскім краях і Комі АССР.

Дэпартацыя ахоплівала ўсё новыя і новыя кантынгенты насельніцтва. 2 сакавіка 1940 г. СНК СССР прыняў пастанову № 289--127 сс, яна прадугледжвала высяленне з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны сем`яў усіх тых, хто знаходзіўся ў лагерах для ваеннапалонных і ў турмах -- былых афіцэраў Войска Польскага, паліцэйскіх, турэмшчыкаў, жандараў, разведчыкаў, памешчыкаў, фабрыкантаў, чыноўнікаў былога польскага дзяржапарату, удзельнікаў паўстанцкіх і контррэвалюцыйных арганізацыяў, бежанцаў з тэрыторыі былой Польшчы, якая адышла да Германіі. Бралі і выказалых жаданне выехаць з Савецкага Саюза на занятую немцамі тэрыторыю і не прынятых германскімі ўладамі.

10 сакавіка 1940 г. СНК СССР пастановаю № 496--177 сс зацвердзіў спецыяльную інструкцыю па высяленні асобаў, якія падпадалі пад пастанову ад 2 сакавіка. У ёй указвалася, што дэпартацыі падляжаць 22--25 тысячаў сем`яў, у асноўным у Казахскую ССР, а таксама тлумачылася, што ад`язджэнцы маюць права на правоз маёмасці не больш як 100 кілаграмаў на аднаго члена сям`і. Рыхтаваліся да гэтай акцыі і органы НКУС.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З распараджэння генерала НКУС Івана Сярова: "Дэпартацыя антысавецкіх элементаў з`яўляецца праблемай вялікай палітычнай значнасці. План дэпартацыі павінны быць распрацаваны ў падрабязных дэталях і ажыццяўляцца выканаўчай тройкай у кожнай вобласці і раёне. Гэта задача павінна быць здзейснена пры захаванні поўнага спакою, каб не выклікаць дэманстрацыі незадаволенасці і панікі сярод мясцовага насельніцтва".**

Трэба адзначыць, рашэнне вярхоўнай улады аб правядзенні дэпартацыі выконвалася няўхільна. Канваіраванне перасяленцаў у

вагоны на чыгуначныя станцыі адбылося ў максімальна кароткія тэрміны -- за трое сутак, а дакладней -- ночаў, з 13 да 15 красавіка 1940 г. Каб вывезці дэпартаваных толькі з чыгуначнай станцыі горада Ліды, спатрэбілася 300 вагонаў, з Ломжы і Граева (Беластоцкая вобласць)-- 40 вагонаў. Гэтыя лічбы даюць уяўленне пра тое, што справа была пастаўлена з шырокім размахам. У той перыяд з нашай рэспублікі, Заходняй Беларусі, на Усход было вывезена 26 777 чалавек.

## СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

Верна: Начальнік аддзела
працоўных пасяленняў
ГУЛАГа НКУС СССР
ст. лейтэнант д. б. Канрадаў

З даведкі начальніка
ОТП ГУЛАГ НКУС СССР
ст. лейтэнанта В. Канрадава
на імя Л. Берыя. Красавік 1940 г.

### АБ ПРЫЁМЕ І РАССЯЛЕННІ АСАДНІКАЎ

Аперацыя па перасяленню асаднікаў з заходніх абласцей УССР і БССР пачалася 10 лютага 1940 г. Для аказання дапамогі ў падрыхтоўцы і прыёме асаднікаў на месцы ў УНКУС былі камандзіраваны 18 супрацоўнікаў НКУС СССР. Усяго перасеrange 139 596 асаднікаў, якія расселены ў 21 краях і абласцях, у 115 спецпасяленнях.

Нацыянальны склад спецпасяленцаў —
польскіх асаднікаў і бежанцаў.

Красавік 1941г.

| Нацыянальнасць | Усяго | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | асаднікі | бежанцы |
| палякі | 96593 | 88654 | 7939 |
| яўрэі | 59031 | 179 | 58852 |
| украінцы | 9334 | 7811 | 1523 |
| беларусы | 9084 | 9002 | 62 |
| немцы | 271 | 152 | 119 |
| іншыя | 2730 | 1514 | 1210 |
| Усяго | 177043 | 107332 | 69711 |

У даных няма звестак пра нацыянальны склад 33 539 спецпася-

ленцаў (27270 асаднікаў і 6269 бежанцаў), што жывуць пераважна ў Казахскай ССР, Краснаярскім краі і Валагодскай вобл.

Перасяленне асаднікаў і бежанцаў праходзіла ў цяжкой форме. Высокай была смяротнасць, і асабліва ў асаднікаў. З моманту прыбыцця на спецпасяленне і да 1 ліпеня 1941 г. нарадзілася 4211 і памерла 12319 чал., у тым ліку ў асаднікаў адпаведна 2694 і 10557, у бежанцаў — 1517 і 1762 чал. (у гэты лік не ўваходзяць народжаныя і памерлыя ў студзені--сакавіку 1941 г. у Казахскай ССР, Комі АССР, Молатаўскай і Іванаўскай абласцях).

Копія
Зусім сакрэтна

ЦК ВКП (б) тав. СТАЛІНУ

Пасля даклада Вам НКУС СССР у красавіку -- ліпені 1940 г. пра недахопы працоўнага выкарыстання асаднікаў і бежанцаў, перасеЛеных з заходніх абласцей УССР і БССР, Наркамлес СССР не прыняў неабходных мераў да арганізацыі поўнага выкарыстання на рабоце гэтых кантынгентаў і да палепшання іх жыллёва-бытавых умоў.

Паступаючыя ад упраўлення НКУС матэрыялы сведчаць пра тое, што Наркамлес не забяспечвае ў дастатковай колькасці леспрамгасы інструментамі, піламі, сякерамі, напільнікамі, цэнтроўкамі, самацягамі, цёплым спецадзеннем і абуткам.

Колькасць нявыкарыстанай на працы леспрамгасаў працаздольнай часткі спецперасяленцаў відаць з наступнай табліцы:

| Назва рэспублік, краёў і абласцей | Колькасць працаздольных спецперасяленцаў | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | выкарыстоўваецца на работах | не выкарыстоўваецца на работах |
| Архангельская вобл. | 26600 | 25192 | 4468 |
| Комі АССР | 9987 | 8685 | 1302 |
| Свярдлоўская вобл. | 9226 | 6012 | 3214 |
| Краснаярскі край | 8770 | 7297 | 1473 |
| Алтайскі край (Захсібтранслес) | 1708 | 1440 | 268 |
| Усяго: | 59351 | 48626 | 10725 |

Акрамя ўказаных 10 725 спецперасяленцаў, не ахопленых працай, у трэсце "Ураллес" Краснаярскага краю і "Захсібтранслес" Алтайскага краю многа нявыхадаў на працу ў выніку аддаленасці

спецперасяленцаў (10--15 км) ад лесарасправовак, куды спецперасяленцы павінны хадзіць пешшу.

...У Надомскім раёне Архангельскай вобл. з 1549 спецперасяленцаў, выкарыстаных на працы, 737 чал. не маюць абутку.

У Вінаградаўскім раёне той жа вобласці з-за адсутнасці абутку не працуе звыш 100 чал.

...Аналагічнае становішча з арганізацыяй працавыкарыстання асаднікаў і бежанцаў на рабоце, з забеспячэннем інструментамі і спецабуткам і ў другіх раёнах названых рэспублік і абласцей, а таксама Кіраўскай, Іркуцкай, Новасібірскай і Горкаўскай абласцей.

...Ва ўсіх спецпасёлках Алтайскага краю баракі да зімы не падрыхтаваныя: печы не складзеныя, вокны не зашклёныя. Такое ж становішча з рамонтам баракаў у Свярдлоўскай, Молатаўскай, Праслаўскай, Валагодскай, Іркуцкай абласцях, Алтайскім краі і Комі АССР. У спецпасёлках Чурга, Солач, Шокша, Беразоўск, Лугаўское Вельцкага раёнаў і Каношскага раёна Архангельскай вобл.-- баракі-сталовыя, медпункты, лазні і іншыя камунальныя памяшканні не абсталяваны неабходным інвентаром. Многія з іх не асвятляліся з-за адсутнасці газавых лямпаў. Аналагічнае становішча і ў спецпасёлках іншых абласцей.

...Школы, дзе займаюцца дзеці спецперасяленцаў, недастаткова абсталяваныя школьным інвентаром. Адчуваецца востры недахоп у падручніках і вучнёўскіх прыладах. Многія школы перапоўненыя.

...НКУС просіць Вашых указанняў Наркамлесу і Наркамздраву СССР.

Народны Камісар унутраных спраў СССР
Камісар дзяржбяспекі (Л. Берыя)"

"Копія

ЦК ВКП (б) таварышу СТАЛІНУ І. В.

У спецыяльных пасёлках НКУС у 14 рэспубліках, краях і абласцях расселена 26 353 сям'і (77 288 чал.) спецперасяленцаў-бежанцаў, высланых з заходніх абласцей Украінскай і Беларускай ССР у адпаведнасці з пастановай СНК Саюза ССР № 497--177 сс 10 красавіка 1940 г.

Працоўнае выкарыстанне іх арганізавана галоўным чынам у прадпрыемствах лясной прамысловасці і каляровай металургіі на падставе дагавораў, заключаных НКУС з Наркамлесам і Наркамколерметам.

У складзе бежанцаў ёсць 15 000 чал. спецыялістаў і рамеснікаў, у тым ліку -- 3000 з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Частка спецыялістаў і рамеснікаў у колькасці 5000 чал. выкарыстоўваюцца па спецыяльнасці ў прадпрыемствах па месцы размяшчэння спецперасяленцаў. Астатнія 10 000 чал. выкарыстоўваюцца на асноўных работах у лесе і па здабычы золата з-за немагчымасці прадаставіць ім працу па спецыяльнасці.

У выніку сваёй непрыстасаванасці да фізічнай працы яны выконваюць вытворчыя нормы ад 20 да 60%, зарабляюць ад 2 да 5 руб. у дзень, што не забяспечвае пражытачнага мінімуму.

НКУС лічыць мэтазгодным у мэтах паляпшэння гаспадарчага ўладкавання спецперасяленцаў, а таксама раменнікаў, фізічна непрыгодных для працы на лясных і горных работах па месцы рассялення, перавесці са спецпасёлкаў у гарады і населеныя пункты гэтых жа рэспублік і абласцей, за выключэннем рэспубліканскіх і абласных цэнтраў, для працоўнага ўладкавання на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці і саматужна-прамысловай кааперацыі.

Пры станоўчым вырашэнні пытання гэтыя катэгорыі бежанцаў з іх сем'ямі будуць прымацаваны да пэўных пунктаў жыхарства, без права выезду і з абавязковай яўкай на рэгістрацыю ў органы НКУС. Прашу Вашых указанняў[2].

Народны камісар унутраных спраў Саюза ССР
Л. БЕРЫЯ.

## ДЫРЭКТЫВА[3]

аб высяленні сацыяльна-чужога элемента з рэспублік Прыбалтыкі,
Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, Малдавіі

Падстава: Пастанова ЦК ВКП (б) і СНК СССР ад 14 мая 1941 г. за № 1299--526 сс.

Катэгорыі асоб, належачых высяленню па гэтай дырэктыве:

1) актыўныя члены контррэвалюцыйных арганізацый і члены іх сем'яў;

2) былыя жандары, ахоўнікі, кіруючы склад паліцыі, турмаў і радавыя паліцэйскія і турэмшчыкі пры наяўнасці кампрматэрыялаў[4];

3) былыя буйныя памешчыкі, гандляры (з гадавым абаротам звыш 150 тысяч лат); былыя фабрыканты (з гадавым абаротам звыш 200 тысяч лат) і буйныя чыноўнікі былых буржуазных урадаў разам з членамі іх сем'яў;

4) былыя афіцэры, у адносінах якіх маюцца кампрматэрыялы (у

---

[1] Далей выкладаліся абавязкі камендантаў.

[2] На дакуменце ёсць паметка "Наркому дакладзена. Пытанне вырашана".

[3] З дакументаў Аддзела па нагляду за следчымі справамі ў органах бяспекі.

[4] Пад кампрматэрыяламі трэба разумець матэрыялы аб антысавецкай дзейнасці і аб сувязях з іншаразведкай.

тым ліку, і тыя, што служылі ў тэрытарыяльных корпусах Чырвонай Арміі);

5) члены сем`яў удзельнікаў контррэвалюцыйных арганізацый, асуджаных да вышэйшай меры пакарання, а таксама тых, хто хаваўся і перайшоў на нелегальнае становішча;

6) асобы прыбылыя па рэпатрыяцыі з Германіі, а таксама хто паехаў з Латвіі ў Германію пры наяўнасці ў адносінах да іх кампрматэрыялаў;

7) збеглыя з былой Польшчы, хто і адмовіўся прыняць савецкае грамадзянства;

8) крымінальны элемент, які працягвае займацца злачыннай дзейнасцю;

9) прастытуткі, зарэгістраваныя ў паліцыі і займаныя ранейшай дзейнасцю;

Са спецзапіскі нам. начальніка УНКУС па Акмолінскай вобласці лейтэнанта д. б. Чаурына. 21 мая 1941 г.

Прыбылыя ў лютым 1940 г. на тэрыторыі Акмолінскай вобласці спецперасяленцы-палякі: асаднікі, высланыя з заходніх абласцей Беларусі ў колькасці 411 сем`яў (агульнай колькасцю 2036 чал.), былі размешчаны ў 4 спецпасёлках -- Сталінскім, Сцепнякоўскім, Шортадзінскім раёнах Акмолінскай вобласці.

Прыбылы кантынгент згодна з генеральным і лакальным дагаворам выкарыстоўвацца на работах на прадпрыемствах залатой прамысловасці ў сістэме трэста "Каззолата".

..З боку гарздраваў прыняты меры да вылечвання хворых спецперасяленцаў-цынготнікаў, урачы наведвалі іх кватэры і праводзяць адпаведныя супрацьцынговыя мерапрыемствы.

Іншых эпідэмічных захворванняў, такіх, як: тыф, адзёр, шкарлятына і г. д. сярод спецперасяленцаў няма і смяротных выпадкаў ад эмідэміяў сярод іх няма і не было.

У якіх умовах праходзіла перасяленне, яскрава сведчаць пратаколы пасяджэнняў Перасяленцкага ўпраўлення СНК СССР за студзень 1940 г. Пра змест гэтых пратаколаў расказаў маскоўскі гісторык Мікалай Бугай (Бугай Н. Ф. К вопросу о депортизации. История СССР. 1989. № 6). Становішча справаў было настолькі жахлівым, што ўпраўленне змушана было непасрэдна ўмяшацца ў дэпартацыю, у выніку чаго з`явіўся загад пра паляпшэнне медабслугоўвання і мерах адказнасці. Аднак якіх-небудзь фактычных зменаў у лепшы бок не адбылося. Гэта якраз і высветлілася пры праверцы медабслугоўвання перасяленцаў з Беларусі. "Вагоны падаваліся ў антысанітарным стане, іх дэзінфекцыя не праводзілася, не былі ўцеплены, адсутнічала неабходнае абсталяванне",-- адзначалася ў дакладной запісцы Перасяленцкага ўпраўлення аб дэпартацыі 200 спецперасяленцаў, якіх везлі ў Карэла-Фінскую АССР і ў раёны

Сібіры ў верасні 1940 г. Везлі ў холад напаўраздзетых людзей у халодных вагонах. Як жывёлу.

І пасля энкавэдзісты лгалі адзін аднаму і прапагандыстам, усяму народу, што аб'ектыўных прычынаў для барацьбы з імі ў палякаў, беларусаў, жыдоў, украінцаў не было.

Хлусня не можа быць вечнай. Але... трэба думаць не толькі пра сябе. Пра ўсіх. Тадышні боль палякаў мы разумеем.

У дапаўненне да гэтага не выконваўся і загад упраўлення № 314 ад 12 верасня 1940 г. пра абавязковую арганізацыю буфетаў на чыгуначных станцыях і забеспячэнне перасяленцаў гарачымі полуднікамі. Дэпартаваныя адчувалі вострую патрэбу ў харчаванні, элементарным куску хлеба, у медыцынскай дапамозе. Многія з іх не маглі перанесці доўгі знясілены шлях на Усход. Паміралі. Канчалі самагубствам.

У службовай запісцы Берыі на імя Сталіна ад 1 мая 1944 г. адзначалася, што ў працэсе даваеннай дэпартацыі палякаў ва ўсходнія раёны краіны памерлі 11.516 чалавек. Прычыны не ўказваліся. Як і працэнты ад агульнай колькасці ўсіх вывезеных.

Па загаду НКУС СССР у маі--чэрвені 1941 г. пачалося высяленне тых, хто быў абвінавачаны ў контррэвалюцыйных выступленнях, крадзяжы сацыялістычнай уласнасці, разбоях, наўмысных забойствах, згвалтаваннях, падробцы грашовых знакаў, хаванні агнястрэльнай зброі. Было прынята палажэнне "Аб парадку выкарыстання ссылкі для некаторай катэгорыі злачынцаў". 21 мая 1941 г . Берыя падпісаў загад НКУС, у адпаведнасці з якім ссыльныя з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны рассяляліся на 20 гадоў у Кустанайскай вобласці. Каб іх туды даставіць, гэтым жа загадам выдзяляліся 964 вагоны для людзей і 532 вагоны для грузаў. Як паведамляў начальнік ГУЛАГа НКУС СССР В. Наседкін, для правядзення гэтай аперацыі было асігнавана 18,5 млн. рублёў.

## СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

**З дакладной запіскі начальніка 6 аддзела ГЭУ НКУС СССР капітана дзяржбяспекі Бязрукава**

**18 кастрычніка 1940 г.**

**ЗУСІМ САКРЭТНА**

**Народнаму камісару ўнутраных спраў Саюза ССР**
**Камісару дзяржбяспекі 1-га рангу тав. Л. П. Берыя**

## ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА

аб выніках праверкі працоўнага выкарыстання і бытавога ўладкавання спецперасяленцаў, паселеных у Казахскай ССР.

Згодна з пастановай СНК Саюза ССР ад 10 красавіка г. г. № 497--178 сс у Казахскую ССР было перасалена з заходніх абласцей Украіны і Беларускай ССР -- 60 667 (па другіх даных, 61 092 чал.) членаў сем`яў рэпрэсіраваных удзельнікаў паўстанцкіх арганізацыяў, афіцэраў былой польскай арміі, паліцэйскіх, турэмшчыкаў, жандараў, памешчыкаў, фабрыкантаў і чыноўнікаў былога польскага дзяржаўнага апарату.

Размешчаны яны ў Акцюбінскай, Акмолінскай, Кустанайскай, Паўладарскай, Паўночна-Казахстанскай і Сяміпалацінскай абласцях. З іх 35 729 чал. расселены ў калгасах, 15 923 -- у саўгасах і 8000 чал. - у рабочых пасёлках розных прамысловых прадпрыемстваў.

Нягледзячы на вялізарны недахоп рабочых рук ва ўсёй народнай гаспадарцы Казахскай ССР і нягледзячы на яшчэ большыя магчымасці развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі рэспублікі, працоўнае выкарыстанне спецперасяленцаў пастаўлена крайне нездавальняюча. У Паўладарскай вобл. працаздольныя спецперасяленцы выкарыстоўваюцца на 45%. З 8700 чалавек, расселеных у Кустанайскай вобласці, працаўладкаваны толькі 1901 чалавек. Аналагічнае становішча і ў другіх абласцях...

БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Спасюка, аднаго з дэпартаваных, у будучым салдата 1-й Польскай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, палкоўніка Войска Польскага ў адстаўцы: "20 чэрвеня 1941 г., напярэдадні нямецкай агрэсіі, мая сям`я была дэпартавана на падставе даносу трох чалавек. Мы жылі тады ў ваколіцы Ліды. У той самы дзень, 20 чэрвеня, нас біткам нагналі ў таварныя вагоны, і мы паехалі на Усход. Сярод дэпартаваных былі літоўцы і латышы. Эшалон, у якім мы ехалі, бамбілі нямецкія лётчыкі. Пасля прыбыцця на чыгуначную станцыю Ачынск за Уралам афіцэр НКУС гаварыў нам на пляцу, што мы высланы на 20 гадоў добраахвотнай працы. ("Добраахвотнай!" -- Я. С.). Са станцыі Ачынск нас развезлі ў калгасы і саўгасы. Ехалі мы на валах двое сутак".

У пачатку чэрвеня 1941 г. у дарозе знаходзіліся 92 вагоны з перасяленцамі. З Заходняй Беларусі толькі ў Алтайскі край накіроўваліся 9 984 чалавекі, частка перасяленцаў з нашай рэспублікі апынулася ў Омскай вобласці.

Гэта былі не толькі палякі, але і прадстаўнікі другіх нацыянальнасцяў. Дарэчы, па дадзеных, згаданых у кнізе польскага даследчыка Пятра Жароня "Польскі народ у Савецкім Саюзе ў час 2-й сусветнай вайны" (Варшава. 1990), ад агульнага складу дэпартаваных у даваенны перыяд з тэрыторыі Беларусі беларусы складалі 6 працэнтаў. Па падліках беларускага гісторыка Мікалая Шумейкі, агульная колькасць рэпрэсіраваных у заходніх абласцях Беларусі склала 24 863 сям`і, альбо 10 338 чалавек. Гэта, калі не лічыць тых, хто

знаходзіўся пад следствам, адбываў пакаранне ў турмах і лагерах, расстрэляных па прыгаворах хуткіх ваенных трыбуналаў, тройкаў і г. д. Ва ўпамянёным пісьме Берыі на імя Сталіна адзначалася, што ў канчатковым выніку да вайны было дэпартавана 389 382 палякі, з іх асаднікаў -- 243 106 чалавек, андэрсаўцаў -- 76 110 чалавек, членаў іх сем`яў -- 43 755 чалавек.

Вайна не дала поўнасцю закончыць дэпартацыю. Менавіта з засталых стваралася Армія Краёва на Беларусі. Гнеўная, рэзкая і бязлітасная. Да жалю бязлітасная зачастую да невінаватых. Да тамтэйшых жыхараў, да беларусаў.

Пройдзе час, і махавікі перасяленцкай машыны пачнуць круціцца ў адваротны бок. Узнікнуць дзесяткі юрыдычных актаў аб зняцці абмежаванняў, аб рэабілітацыі, аб прызнанні незаконнымі і неабгрунтаванымі праведзеныя акцыі.

Аднак усё будзе потым, праз якіх гадоў пятнаццаць. А пакуль што, у пачатку чэрвеня 1941 г., 92 эшалоны з перасяленцамі з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны няспешна цягнуліся на Усход. Іх суправаджалі стогны, енкі, слёзы. Вінаватых і невінаватых мужчынаў і жанчынаў, падлеткаў, дзяцей. Жахоцце дэпартацыі -- у высяленні ўсіхным: сям`і, роду. Без следства і суда. Нібы высялялі людзей абыякавыя да ўсяго чужынцы, іншапланетцы. Нібы ніхто не разумеў, што праклён так сабе не сыходзіць. Упадзе на вінаватага.

## СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

### УКАЗ

### ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

аб зняцці абмежаванняў з некаторых катэгорый спецперасяленцаў

1. Зняць абмежаванні і вызваліць з-пад адміністрацыйнага нагляду органаў МУС:

а) пасобнікаў нацыяналістычнаму падполлю і членаў іх сем`яў;

б) былых кулакоў і членаў іх сем`яў;

в) членаў сем`яў былых памешчыкаў, фабрыкантаў, гандляроў, кіраўнікоў і ўдзельнікаў буржуазных палітычных партыяў і антысавецкіх арганізацыяў, кіруючых дзеячаў былых буржуазных урадаў.

2. Устанавіць, што зняцце абмежаванняў па спецпасяленню з асоб, пералічаных у артыкуле I гэтага Указа, не цягне за сабой вяртання ім маёмасці, канфіскаванай пры высяленні, і што яны не маюць права вяртацца ў месцы, адкуль былі выселены.

Вяртанне ўказаных асоб да ранейшых месцаў жыхарства можа дапускацца толькі з дазволу выканаўчых камітэтаў абласных Саветаў дэпутатаў працоўных або Саветаў Міністраў рэспублікі (без абласнога дзялення), з тэрыторыі якіх праводзілася высяленне.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета ССР
К. ВАРАШЫЛАЎ,
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета ССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль, 19 мая 1958 г.

# ЧАСТКА 2
# ПАД ЗНАКАМ КАНЦЭПЦЫІ "ДВУХ ВОРАГАЎ"

## У НОВЫХ АБСТАВІНАХ

Да канца 1940 г. штабам генерала Стэфана Равецкага ("Грота") у Варшаве быў падрыхтаваны план практычных дзеянняў ЗВЗ. План атрымаў назву "Аператыўны рапарт 54". Ён прадугледжваў, што:

-- Польшча будзе вызвалена ў выніку ваенных аперацыяў заходніх саюзнікаў:

-- напярэдадні паражэння Германіі ў Польшчы ўспыхне ўсенароднае паўстанне. Меркавалася, гэта будзе аднаразовая ўзброеная акцыя, на першапачатковым этапе -- у сярэдняй Польшчы. Гэтаму павінны былі спадарожнічаць разбурэнні камунікацый і сувязі. Пасля перыяду самастойных дзеянняў (два-тры дні) паўстанне намячалася ўзмацніць дапамогаю з паветра -- скідваннем зброі, боепрыпасаў і дэсантаў часцей польскіх узброеных сілаў на Захадзе;

-- галоўная мэта паўстання -- узяцце ўлады ў свае рукі на ўсіх землях у рамках граніцаў да верасня 1939 г. У тым ліку і на "Крэсах Всходніх". (Чужая зямля, як бачна, стала сваёю. Лёгка гісторыя забываецца!)

У аснове плана ляжаў загад генерала Уладыслава Сікорскага, прэм`ера эміграцкага ўрада і вярхоўнага галоўнакамандуючага польскімі ўзброенымі сіламі, ад 18 чэрвеня 1940 г. Ён прадпісваў устрымлівацца да пары да часу ад ваенных дзеянняў, што адпавядала канцэпцыі "двух ворагаў", паводле якой Германія і СССР павінны былі абяскровіць сябе ў будучай вайне, а да таго часу дзейнасць ЗВЗ абмяжоўвалася сабатажам і разведкаю.

21 студзеня кур`ер па асобных даручэннях паміж Варшавай і Лонданам палкоўнік Казімір Іранэк-Асмецкі накіраваўся з гэтым планам на берагі Тэмзы. На стол генерала Сікорскага "Аперацыйны рапарт 54" лёг ажно 25 чэрвеня 1941 г., калі ўжо немцы напалі на СССР. Гэта істотна мяняла ваенна-палітычную сітуацыю, рабіла поўнасцю неактуальным план штаба "Грота". Трэба адзначыць, і пасля нашэсця немцаў на нашу краіну, стратэгія і тактыка польскага ўрада ў Лондане абапіралася на ваенную канцэпцыю Вялікабрытаніі, якая ў той момант яшчэ не прадугледжвала адкрытай узброенай барацьбы з акупантамі.

30 ліпеня 1941 г. савецкі пасол у Лондане Іван Майскі і генерал Уладыслаў Сікорскі падпісалі пагадненне пра нармалізацыю адносінаў паміж урадамі СССР і Польшчы і сумеснай барацьбе з Германіяй. У сітуацыі, калі Польшча стала перакідным мастом з Германіі на

Усходні фронт, узрастала і роля ЗВЗ. Пра гэта сведчыць і тое, што па радыёстанцыі "Вісла" была ўстаноўлена прамая радыёсувязь паміж кіраўніцтвам ЗВЗ і камандаваннем Чырвонай Арміі.

Лонданскае пагадненне "Майскі-Сікорскі" не прывяло да фундаментальных пераменаў у стратэгіі ўрада Сікорскага. Ён у далейшым разлічваў на вызваленне Польшчы заходнімі саюзнікамі. Альбо пры іх рашальным удзеле. ЗВЗ па-ранейшаму прадпісвалася не ўступаць у актыўную ўзброеную барацьбу з акупантамі, прытрымлівацца прынцыпу "эканоміі крыві", што, пэўна, можна зразумець. За аднаго ліквідаванага немца расстрэльвалі 10--15 палякаў Абмежаваная барацьба, засяроджванне намаганняў на падрыхтоўцы ўсеагульнага ўзброенага паўстання, разведка, сабатаж, дыверсіі -- такім заставаўся дыяпазон дзейнасці ЗВЗ у 1941 г., калі на вялізным фронце ад Баранцавага да Чорнага мораў кіпела барацьба, калі СССР фактычна сцякаў крывёю.

Узгадненне пачынанняў ЗВЗ з ваеннымі планамі Вялікабрытаніі было ўскладзена на англійскую службу Special Orqanization Executive (SOE) -- (Упраўленне спецыяльнымі аперацыямі), створаную летам 1940 г. у рамках ваенна-эканамічнага міністэрства. З 1940 г. з ёю цесна супрацоўнічаў 4-ы аддзел* штаба польскага вярхоўнага галоўнакамандавання ў Лондане. SOE рэалізавала стратэгію брытанскай ваеннай палітыкі, у тым ліку -- вызначала накірункі ЗВЗ - - АК, ускладала на першапачатковай стадыі гітлераўскага нашэсця на СССР на іх арганізацыю разведкі, дыверсіяў і сабатажу. Гэта былі галоўныя задачы палякаў. Павел Марыя Лісевіч у кнізе "Безіменныя" гаворыць пра той перыяд, у прыватнасці, наступнае: "Англійская разведка развівала сваю дзейнасць не толькі на тэрыторыі Польшчы. Існуюць сляды англійскай разведкі, скіраваныя на Савецкі Саюз".

Тое, што рыцары плашча і шпагі туманнага Альбіёна, здаўна, мякка кажучы, былі нераўнадушныя да сакрэтаў СССР, у часе Вялікай Айчыннай вайны таксама, хоць дзяржавы і выступалі саюзнікамі ў барацьбе супраць немцаў, ні для каго не навіна. Павел Марыя Лісевіч падкрэслівае другое: англійская сакрэтная служба ў сваім імкненні пранікнуць на акупаваную немцамі тэрыторыю Савецкага Саюза выкарыстоўвала магчымасці разведкі ЗВЗ -- АК. Гэта ведалі ўсе. Асабліва чэкісты. Гэтая акалічнасць вельмі важная для разумення таго, чаму ў будучым з лютаю зацятасцю органы савецкай контрразведкі праследавалі асабліва тых акаўцаў, якія прайшлі падрыхтоўку ў Англіі і былі дэсантаваныя на самалётах у Польшчу, а адтуль перакінуты на Беларусь, Літву і на Украіну, і прычым не толькі разведчыкаў.

Значную частку разведвальнай сеткі былога 2-га аддзела генштаба Войска Польскага перанялі ЗВЗ -- АК. Сюды ў ходзе аб'яднання сілаў польскага падполля былі перададзены разведвальныя падраздзяленні іншых канспіратыўных арганізацыяў, напрыклад, спецгрупа "Мушкецёры", створаная капітанам Стэфанам Вітkoўскім

* Аддзел, які непасрэдна займаўся каардынацыяй падпольнага руху ў Польшчы і адказваў за сувязь Варшавы з Лонданам.

("Тэнчыньскі"). Гэтая група мела непасрэдны кантакт з англійскай разведкай. Сетка разведкі ЗВЗ -- АК ахоплівала Польшчу, Трэці рэйх і яго саюзнікаў, а таксама акупаваную тэрыторыю СССР. Разведаддзелам штаба ЗВЗ -- АК па чарзе кіравалі: падпалкоўнік Вацлаў Бэрка, падпалкоўнік Мар'ян Дробік, палкоўнік Казімір Іранэк-Асмецкі.

Стратэгічная разведка ЗВЗ -- АК з дапамогаю тэрытарыяльных разведорганаў сістэматычна збірала ваенную, эканамічную, палітычную і тэхнічную інфармацыю, яна аналізавалася ў ваеннадаследчым бюро 2-га аддзела штаба (кіраваў падпалкоўнік Богдан Зяліньскі). У ходзе аналізу ўдавалася расшыфроўваць важныя рашэнні камандавання вермахта.

Сістэматычныя назіранні за перамяшчэннем часцей вермахта па тэрыторыі Польшчы не толькі дазволілі "вылічыць" тэрмін удару па СССР, але і ўстанавіць на 70 працэнтаў дыслакацыю і накірункі наступлення нямецкіх ударных груповак. Усе вынікі гэтага аналізу напярэдадні нападзення фашысцкай Германіі на СССР былі перададзены ў штаб вярхоўнага галоўнакамандуючага польскімі ўзброенымі сіламі ў Лондане.

У 1941--1943 гг. істотную ролю адыгрывала разведка на важнейшых транспартных магістралях. Пастаяннае назіранне за перамяшчэннямі нямецкіх войскаў і тэхнікі ў бок фронту і назад давалі магчымасць здабываць інфармацыю пра намеры немцаў.

Разведка ЗВЗ --АК раскрыла нямецкую шыфравальную сістэму. Было ўстаноўлена, што лічбы ад 100000 да 300000 азначалі ваенны эшалон з жывой сілай, звыш 300000- з тэхнікай і амуніцыяй, звыш 600000-эшалоны з фронту, у тым ліку з раненымі. Былі таксама ўстаноўлены кодавыя назвы перамяшчэння часцей вермахта на фронт і з фронту. Напрыклад, разведцы ЗВЗ -- АК стала вядома, што перакідка танкавай дывізіі "Герман Герынг" у перыяд з 29 сакавіка да 2 красавіка з паўднёвай Францыі праз Львоў на Усходні фронт адбывалася пад кодавай назвай "Брунгільда", што для гэтага трэба 75 эшалонаў і г. д.

Дзякуючы скрупулёзнаму аналізу перамяшчэнняў па чыгунках і шасейных магістралях, АК патрафіла зарыентавацца, што кірунак нямецкага наступлення ў 1942 г.-- не Масква, а паўднёвая частка Усходняга фронту. Пра маштабы разведкі на лініях камунікацыяў сведчыць той факт, што толькі за першы квартал 1944 г. было зарэгістравана 15107 ваенных эшалонаў, прычым вызначылі, што 8520 з іх накіроўваюцца на фронт.

Разведцэнтр ЗВЗ -- АК тэрыторыю СССР, прылеглую да лініі фронту, падзяліў на "экспазітуры", участкі, якія ў сваю чаргу складаліся з "пляцувак" (разведвальных пастоў)-- пастаянных і рухомых. Пляцуўкі рухаліся ўслед за лініяй фронту. Для каардынацыі усёй работы на ўсходнім накірунку ў разведцэнтры быў створаны сектар "Усход" пад кодавай назвай "ВВ-72", пазней --"Пральня". Рэзідэнтуры Варшаўскага цэнтра знаходзіліся ў Беластоку, Брэсце, Львове, Цярнопалі, Станіславе (Івана-Франкоўск). Участак-1 (паўночны) ахопліваў паўночную частку Палесся, а таксама тэрыторыю ад Дзвіны да Ленінграда. Кіраўніцтва ўчастка-1 знаходзілася ў

Баранавічах. Участак-2 з цэнтрам у Вільні ахопліваў на поўначы Дынебург (Дзвінск, Даўгаўпілс), а далей на Усход -- Полацк, Віцебск, Смаленск. Рэзідэнтамі ў Вільні па чарзе з`яўляліся: ротмістр Томаш Зан ("Олесь"), ротмістр Гіцэвіч, паручнік Францішак Мішчак ("Сільва").

Між іншым, толькі праз шмат гадоў пасля вайны шырокай польскай грамадскасці стала вядома, што віленская разведка ЗВЗ--АК спрабавала пранікнуць у тайну нямецка-літоўскіх перагавораў летам 1939 г. Аб гэтым сведчыць нядаўна адкрыты архіў былога ўпраўлення бяспекі ў Быдгошчы. Восенню 1949 г. тут адбыўся судовы працэс над трыма афіцэрамі АК -- Вітольдам Мільвідам, Ежы Лазіньскім і Уладыславам Субартовічам, супрацоўнікамі контрразведкі Віленскага штаба АК з так званай групы "Цэцылія". 3 верасня 1949 г. усе трое былі прыгавораны да смяротнага пакарання, 12 лістапада таго ж года расстраляны. Захаваліся матэрыялы следства па іх справе.

На адным з допытаў падпаручнік Мільвід расказаў аб безвыніковых пошуках арыгінала нейкага тайнага пагаднення паміж Літвой і немцамі летам 1939 г. Вітольд Мільвід сцвярджаў, што ў чэрвені 1943 г. пісьменнік, член дыверсійнай віленскай групы Сяргей Пясэцкі даведаўся ад знаёмага журналіста і пісьменніка Юзэфа Мацкевіча (пра яго ўпамінаецца ў раздзеле "Віленская канспірацыя" гэтае кнігі), што ардынатар Віленскай епархіі, епіскап Ратайкіс хавае ў сваім прыватным архіве па вул. Велькай якісьці тайны дакумент. Меркавалася, гэта быў тэкст тайнага дагавора паміж трэцім рэйхам і Літвой, па якім Германія гарантавала далучэнне да Літвы Вільні і Віленшчыны. Пры гэтым немцамі вылучалася ўмова, у адпаведнасці з якой урад Літвы згаджаўся на стварэнне на гэтай тэрыторыі нямецкіх ваенных базаў. Дагавор меркавалася падпісаць летам 1939 г., мабыць, у часе візіту Гітлера ў Клайпеду.

Безумоўна, такую інфармацыю разведка АК не магла прапусціць міма вушэй. Загад быў адназначны: дакумент трэба выкрасці. Для даследавання тапаграфіі прылеглай мясцовасці, распазнання плана схемы будынку ў рэзідэнцыю епіскапа накіравалася разведчыца "Люцына" (прозвішча невядома). Каб сабраць неабходныя звесткі пра размяшчэнне пакояў, абстаноўцы ў кватэры ардынатара, трэба было прыдумаць важную прычыну для візіту. "Люцына" сказала, што прыйшла параіцца наконт скасавання шлюбу. Але далей канцылярыі яе не пусцілі. Тады ў рэзідэнцыю епіскапа паспрабаваў прабрацца сам Сяргей Пясэцкі. Яму таксама не пашанцавала.

Канешне, у той час у Вільні ніхто не падазраваў пра існаванне, а тым больш -- змест , тайнага пратаколу "Молатаў-Рыбентроп". Згодна з яго першапачатковым варыянтам ад 23 жніўня 1939 г., як вядома, Літва павінна была апынуцца ў сферы нямецкага ўплыву, у сувязі з чым інтарэсы Літвы на Віленшчыне прызнаваліся Германіяй і Літвой.

Пазней немцы адракліся -- узамен на Люблінскае ваяводства -- ад "апекі" над Літвой, гэта адлюстравалася ў пагадненні аб граніцах, заключаным з СССР 28 верасня 1939 года. Як было на самай справе з тайнымі перагаворамі паміж Германіяй і Літвой, ці існавала

дамоўленасць на гэты конт паміж Гітлерам і Сметона, на жаль, яшчэ не высветлена да цяперашняга часу.

З участка-2 (віленскага) восенню 1941 г. быў выдзелены самастойны ўчастак-2А з цэнтрам у Мінску, якім спачатку кіраваў ротмістр Юзэф Сьфіда ("Юстын"), а пазней, з красавіка 1942 г., інжынер-хімік педагог Гражына Ліпіньска ("Данута"). Абавязкі сувязной мінскай рэзідэнтуры выконвала на пачатку Яўгеня Рубан, з якой "Юстын" яшчэ ў 1939--1940 гг. сумесна партызаніў у атрадзе легендарнага ў Польшчы маёра "Хубала".

Пра "Дануту" хацелася б сказаць асобна. Яшчэ ў даваенны час, студэнткаю, а затым асістэнткаю Варшаўскага палітэхнічнага інстытута, яна пазнаёмілася з выкладчыкам гэтай ВНУ прафесарам Вацлавам Іваноўскім -- вядомым дзеячам беларускага нацыяналістычнага руху. У 1938/39 навучальным годзе працавала ў Гародні дырэктарам гарадскога вытворчага аб'яднання для жаночых школаў. З восені 1939 г.-- актыўная ўдзельніца Гродзенскага падполля. Канспіратыўная арганізацыя была разбіта органамі НКУС у 1939 г., яе члены арыштаваны і асуджаны ваенным трыбуналам. Тэрмін пакарання Гражына адбывала ў Мінскай турме. У чэрвені 1941 г. у час эвакуацыі турмы на Усход адважнай маладзіцы ўдалося ўцячы. Вярнулася ў Варшаву.

Тым часам Вацлаў Іваноўскі апынуўся ў Мінску, немцы прызначылі яго бургамістрам горада. Лічыўся адной з галоўных фігур у асяродку беларускіх дзеячаў. Зімой 1942 г., будучы па нейкіх справах у Варшаве, выпадкова сустрэў Гражыну Ліпіньску і прапанаваў ёй працу ў Мінскай гарадской управе. "Данута", якая пад той час была звязана, у рамках канспіратыўнай работы, з разведкай АК, са згоды свайго кіраўніцтва прыняла прапанову Іваноўскага і, здабыўшы верагодныя дакументы, пачала працу ў Мінскай гарадской управе і... адначасова ў разведцы. Пасля арышту немцамі ў сакавіку 1942 г. "Юстына" ўзначаліла разведвальны ўчастак-2А. Гэтую функцыю паспяхова выконвала да 3 ліпеня 1944 г.-- моманту вызвалення Мінска ад фашыстаў. Была арыштавана органамі НКДБ. У Польшчу вярнулася ў 1956 г. У 80-я гады напісала кнігу ўспамінаў "Калі я забуду пра іх...", прысвечаную перыпетыям ваеннага жыцця. Назва кнігі даволі шматзначная: хачу і не магу забыць ваеннае ліхалецце; дарагія людзі памятаюцца заўжды; калі я забуду пра іх -- будзе дрэнна мне...

Такім чынам, ужо на пачатку Вялікай Айчыннай вайны польскія разведвальныя пасты былі створаны на лініі Рыга -- Даўгаўпілс -- Мінск -- Мазыр -- Жытомір -- Вінн іца. Як сведчыць Павел Марыя Лісевіч, яшчэ ў чэрвені 1941 г. адзін з кіраўнікоў Варшаўскага разведцэнтра падпалкоўнік Францішак Герман даў заданне паручніку Аляксандру Куніцкаму, які ў той час быў рэзідэнтам разведкі ЗВЗ у Брэсце, перакінуць на акупіраваную тэрыторыю СССР трох сувязных сектара "ВВ-72" з радыёстанцыяй. Непасрэдна перакідку сувязных арганізаваў Тадэвуш Шчур ("Дуда"), ён уладкаваў іх на працу ў ваенную аўтакалону на пасады аўтамеханікаў. Іх залічылі ў склад нямецкай часці, якая накіроўвалася на паўднёвы ўчастак Усходняга

фронту. У выніку польскія разведчыкі амаль легальна дабраліся ў раён Растова-на-Доне, дзе эфектыўна вялі разведвальную работу.

Для сувязі польскіх разведгруп з цэнтрам выкарыстоўваліся розныя нямецкія фірмы, якія працавалі на вермахт, а таксама ваенна-будаўнічая арганізацыя Тодт, у якую прымалі на працу і палякаў. Дастаткова сказаць, што з 1 сакавіка 1942 г. па 29 лютага 1944 г. на акупаваную немцамі тэрыторыю СССР было выслана каля 2300 кур`ераў варшаўскага разведцэнтра. Нядрэнна была наладжана і радыёсувязь. Пачынаючы з чэрвеня 1943 г. сувязь камандавання АК з абшарамі і акругамі адбывалася з дапамогай радыёцэнтра "Порт", які дзейнічаў у Англіі, а пад канец 1943 г. гэтыя функцыі пераняў радыёцэнтр "Ютшэнка"* на тэрыторыі Італіі. Рэзідэнтура стратэгічнай разведкі ўчастка 2А ў Мінску мела сваю радыёстанцыю. Такімі радыёстанцыямі валодалі таксама валынская і харкаўская рэзідэнтура.

Побач з разведкай далёкага радыуса дзеяння ў акругах ЗВЗ -- АК былі арганізаваныя лакальныя разведгрупы. Напрыклад, у Навагрудскай акрузе гэта была самастойная служба, якая падпарадкоўвалася толькі каменданту. Узначальваў яе падпаручнік Стэфан Федаровіч. У Віленскай акрузе разведвальная ячэйка была створана ў рамках Бюро інфармацыі і прапаганды (БІП), прымаючы пад увагу добрую тэхнічную і паліграфічную базы бюро.

Па ацэнках польскіх даследчыкаў, эфект працы разведкі ЗВЗ -- АК на ўсходнім накірунку быў надзвычай прадукцыйны. Яна сістэматычна давала камандаванню поўнае ўяўленне пра дзеянні нямецкіх сухапутных і паветраных сілаў на гэтым фронце, а таксама пра ваенна-эканамічны патэнцыял ворага па- за ўсходнімі граніцамі рэйха. Работа разведкі ЗВЗ -- АК атрымала высокую ацэнку англійскай Інтэліджэнс Сервіс: "Польская разведка з`яўляецца нашай найлепшай крыніца інфармацыі, датычнай усходняга фронту" (С. Карбоньскі. Польская падпольная дзяржава. Парыж. 1975). Ацэнка польскай разведкі савецкімі разведчыкамі нам невядома. Нават у час вайны з немцамі ў большай ступені гэта былі праціўнікі, чым саюзнікі, а праціўнікі, як вядома, адзін аднаго хваліць не любяць.

## "ЦІХАЦЁМНЫЯ"

Такую назву атрымала спецыяльнае фарміраванне польскіх узброеных сілаў на Захадзе (Англія), прызначанага для абвучэння і падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў і спецыялістаў дыверсіям і разведцы, накіраваных для барацьбы з немцамі на акупаваных тэрыторыях. Пасля заканчэння практычнага курса навучання "ціхацёмныя" закідваліся на смалётах у Польшчу, дзе штаб ЗВЗ -- АК размяркоўваў іх у адпаведнасці з надзённымі патрэбамі падпольнай работы. З 15 лютага 1941 г. па 26 снежня 1944 г. у Польшчу былі закінуты 372 парашутысты, у тым ліку 28 палітычных кур`ераў. Многіх паслалі на тэрыторыю "крэсаў". У час вайны загінулі 108 "ціхацёмных", 92-- у барацьбе з немцамі.

---

* Ранішняя зорка.

Ініцыятыва ўмацавання падпольных арганізацыяў ЗВЗ -- АК падрыхтаванымі за мяжой спецыялістамі паходзіць ад маёраў Мацея Калянкевіча, нашага земляка з Ваўкавыскага павета, і Яна Гурскага. Два сябры, маладыя афіцэры штабной службы, яшчэ ў лютым 1940 г. прадставілі генералу Сікорскаму ў Парыжы прапановы па падрыхтоўцы дэсантнікаў для перакідвання ў Польшчу. Пакуль гэтая важная ідэя абмазгоўвалася вышэйшым кіраўніцтвам, Францыя пацярпела паражэнне, а польскія эмігранцкія ўлады і ваеннаслужачыя вымушаны былі перабрацца ў Англію.

Тут Калянкевіч і Гурскі напомнілі пра цікавы дакумент з часоў іх знаходжання ў Парыжы і ў рэшце рэшт дамагліся свайго -- у Шатландыі пад эгідай ужо ўпомненай англійскай спецслужбы SOE былі адкрыты тайныя курсы для падрыхтоўкі будучых дэсантнікаў. Дарэчы, абодва ініцыятары таксама закончылі іх і былі закінуты на самалётах у Польшчу. Неўзабаве беларус Мацей Калянкевіч ("Котвіч") стаў адным з віднейшых кіраўнікоў Арміі Краёвай на Беларусі. Заўважым таксама, што многія з так званых усходніх палякаў -- гэта тыя ж беларусы, выхаваныя ў нявер'і ў беларускасць, у пашане да каталіцызму, польскасці. Калі іхняе выхаванне ахоплівае не адно, два, а то і тры пакаленні -- то яны ўжо зацятыя ваяўнікі за пальшчызну. Супраць беларускасці, то бок сваіх продкаў. Як гэта зачастую зараз назіраецца на Беласточчыне, Гродзеншчыне, Брэстчыне, Віцебшчыне. Міншчыне.

Назву "ціхацёмныя" прыдумалі для сябе самыя курсанты падчас знясільных начных трэніроўкаў. Яна лаканічна і даволі трапна падкрэслівала спецыфічны характар навучання і будучай службы: начныя палёты, скокі на парашутах у нязведанае, падпольныя акцыі... І ўсё -- ціха, тайна, упоцемку.

Вярбоўка добраахвотнікаў пачалася восенню 1940 г. Як сам акт вярбоўкі, так і працэс навучання захоўваліся ў глыбокай таямніцы, каб інфармацыя пра падрыхтоўку людзей для выканання спецыяльных заданняў не прасачылася за строга абмежаванае кола асобаў і не стала здабыткам агентаў абвера, з прысутнасцю якіх у Англіі належала лічыцца.

З 2413 добраахвотнікаў было адабрана 605 чалавек, самы старэйшы з іх меў 54 гады, малодшы -- 20. Сярод "ціхацёмных" былі прадстаўлены ваенныя кадры ўсіх званняў -- ад дывізійнага генерала да радавога, і ўсіх радоў войскаў. Навучанне вялося па наступных спецыяльнасцях: дыверсія, разведка, сувязь, авіяцыя, штабныя афіцэры, інструктары бронетанкавых войскаў. Перыяд абвучэння-- ад некалькі месяцаў да года. Найдаўжэй рыхтаваліся афіцэры разведкі.

Першы палёт на тэрыторыю Польшчы адбыўся ноччу з 15 на 16 лютага 1941 г. З Англіі вылецелі тры чалавекі -- капітан авіяцыі Станіслаў Кшымоўскі ("Костэк"), паручнік кавалерыі Юзэф Забельскі ("Жбік") і палітычны кур'ер Чэслаў Рачкоўскі. Скочылі ў чорную ноч, не ведалі дакладна, дзе знаходзяцца. Аказалася, на тэрыторыі, далучанай да Германіі. У час прызямлення Забельскі атрымаў

траўму. Рачкоўскага немцы арыштавалі як кантрабандыста ў час пераходу граніцы і выпусцілі толькі праз год. Астатнія два дабраліся да мэты, кожны сваёй дарогай, 20 лютага былі ў Варшаве. Так пачалася акцыя дэсантавання "ціхацёмных" на радзіму.

Адзін з гэтых людзей, Станіслаў Янкоўскі, кіраваў аддзелам легалізацыі і тэхнічнага забеспячэння разведкі Арміі Краёвай. Выдаў двухтомныя ўспаміны пад назвай "Агатон" з фальшывым аўсвайсам у сапраўднай Варшаве" (Варшава. 1984.). Першы том ягоных мемуараў амаль цалкам прысвечаны "ціхацёмным". Фрагмент з кнігі, звязаны з прызямленнем маёра Мацея Калянкевіча ("Котвіча") і яго спадарожнікаў, дае ўяўленне пра ўмовы іхняга спаткання з Польшчай, за якую ім лёс наканаваў змагацца да канца.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў "ціхацёмнага" Станіслава Янкоўскага:** "Першую папраўку ў маё наіўнае пачуццё бяспекі і нуды ўнесла звестка аб лёсе групы "Жакет"* у складзе паручніка Мар`яна Юрэцкага ("Арава" -- кіраўнік), маёра інжынерных войскаў Мацея Калянкевіча ("Котвіча"), паручнікаў Альфрэда Пачкоўскага ("Ваня") і Анджэя Сьвёнткоўскага ("Амурат", "Эфендзі"), а таксама двух палітычных кур`ераў -- падпаручніка Тадэвуша Хцюка ("Цэльт") і Віктара Стшэлецкага ("Бука").

З лаканічнай інфармацыі маёра Перкінса можна было зрабіць вывад, што дэсантаванне "жакетаў" не было на сто працэнтаў удалым. Праўда, афіцыйна англічане нам гаварылі, што ўсё о`кей, але з-за дробных недамоўкаў, якія вельмі тонка адчувала "ціхацёмная" брація, падазравалі, што не ўсё скончылася добра. Так яно было на самай справе -- з шасцярых двое загінулі, толькі чацвёра дайшлі да Варшавы.

Група "жакетаў", апрача звычайнай экіпіроўкі, павінна была даставіць у Польшчу 380 тысяч долараў, запакаваных у 12 аднакілаграмовых герметычных ёмкасцях. У сувязі з дадатковым уцяжарваннем парашутаў вырашылі запакаваць асабістыя рэчы, напрыклад, запаснае адзенне, у багажны мяшок, каб мець большую свабоду рухаў. Мяшок быў прымацаваны да асобнага парашута, яго трэба скінуць паміж скокамі трэцяга і чацвёртага парашутыстаў.

Дэсантаванне "жакетаў" меркавалася здзейсніць у раёне на захад ад Скерневіцаў. Старт бамбардзіроўшчыка "Галіфакс" з 138-га авіядывізіёна з польскім экіпажам (камандзір экіпажа паручнік М. Вадзіцкі) адбыўся 27 снежня 1941 г. у 19.20 з палявога аэрадрома Леконфільд. Ляцелі высока. Самалёт быў абстраляны над Даніяй. Скідванне пачалося ў 2.30 ночы.

Экіпаж самалёта так і не распазнаў вызначанае месца. Замест раёна Скерневіцаў парашутысты былі скінуты за 20 кіламетраў на поўнач ад Ловіча, на густы лес пры шашы Сохачэў -- Гэмбін. Амаль побач з граніцай Генеральнай Губерні, але на супрацьлеглым баку, дзе была тэрыторыя, далучаная да рэйха. Гэтая акалічнасць фатальна паўплывала на лёсы дэсантнікаў. "Арава" і "Котвіч" завіслі на

* Кожная аперацыя па перакідцы "ціхацёмных" на акупаваную немцамі тэрыторыю мела сваю кодавую назву. У дадзеным выпадку -- "Жакет".

дрэвах. "Котвіч" вызваліўся сам і сцягнуў свой парашут. З-за цемнаты і завеі "Араву" знайшлі толькі пасля доўгіх пошукаў. Вісеў на стропах парашута, быў непрытомны. Знялі яго, але парашут з дрэва сцягнуць не ўдалося. У выніку пад кучай галля схавалі толькі 4 парашуты, шлёмы і камбінезоны. Чакалі, пакуль развіднее, каб знайсці мяшок з багажом. Пераканаліся, што мяшок завіснуў на вяршыні высознага дрэва.

"Арава" з "Амуратам" засталіся, каб зняць парашуты. Камандзір групы перадаў усе долары "Котвічу" і "Ваню" і загадаў усім прабірацца на кантактны пункт у Даманевіцах ці ў Скерневіцах (усе паранейшаму былі ўпэўнены, што знаходзяцца ў раёне Скерневіцаў.)

Групу "Котвіча" акружыў патруль нямецкай жандармерыі. Адзін з немцаў быў з сабакам. Парашутысты загадзя дамовіліся, што будуць выдаваць сябе за сезонных рабочых, якія вяртаюцца"nach Hauze" (дамоў), што пачнуць страляць толькі, калі іх прывядуць у будынак ці пачнуць рабіць вобыск. Наіўнае тлумачэнне не дало жаданага выніку, нямецкі сяржант загадаў ім маршыраваць пад канвоем да жандармскага паста, які знаходзіўся ад месца затрымання "ціхацёмных" прыкладна за адзін кіламетр. Прывялі ў пакой, дзе стаяла па-святочнаму прыбраная ёлачка, паставілі ўсіх чацвярых у шарэнгу і пачалі вобыск.

"Ціхацёмныя" застрэлілі жандармаў за некалькі секунд. Зразу ўзяліся за немцаў, якія знаходзіліся ў другіх памяшканнях будынка. У суседнім пакоі наткнуліся на кабету і мужчыну, якія ўпалі на калені і па-нямецку і па-польску малілі пра літасць. Ад іх даведаліся, што знаходзяцца ў вёсцы Вшэлін паблізу Сохачэва. Распыталіся таксама, дзе можна здабыць каня і воз. Перад адыходам "Ваня" не забыў застрэліць вялізную аўчарку. У часе перастрэлкі "Котвіч" быў паранены, адкрылася моцнае кровацячэнне.

Знайшлі каня і воз, палажылі раненага. На ляцелым па выбоінах возе "Ваня" зрабіў "Котвічу" перавязку. Той меў прастрэленае левае прадплечча і два пераломы. Страціў дужа багата крыві, але быў прытомны. Праз некаторы час адпусцілі фурмана разам з канём. Каб ўратаваць немца ад рэпрэсіяў з боку ягоных суайчыннікаў і збіваць са следу пагоню, сказалі яму вяртацца дамоў, паведаміць жандармерыі, што над ім быў учынены акт тэрору і што вёз іх у кірунку Ловіча.

Гэткім чынам рассталіся з чарговым фурманам, а самі развітаўшыся з палітычнымі кур`ерамі (для якіх існавалі аддзельныя кантактныя пункты), рушылі пешшу праз лес у кірунку Скерневіцаў, намагаючыся як найхутчэй адысці ад Ловіча. Ранены "Котвіч" трымаўся мужна, але ішоў вельмі павольна. Па дарозе пры характэрным "чубе" дрэў "Ваня", які да таго часу нёс на плячах усю валюту, частку каштоўнага грузу закапаў у кустах, рэшту доляраў праз некаторы час схаваў у гумне ля напатканай самотнай халупы, у якой жылі палякі.

Далей двое адважных прабіраліся па глыбокім снезе толькі ўночы. Ранены "Котвіч" усё больш слабеў, ішлі памалей і памалей. Нарэшце дапляліся да плябані ў Даманевіцах, дзе знаходзіўся

кантактны пункт. Прадбачлівы "Ваня" пакінуў раненага на могілках, побач з плябаняю, а сам выращыў разведаць становішча ў плябані. І хоць ксёндз памыліўся, называючы водзыў, хутка канчаткова высветлілася -- тутака свае. Праз некалькі хвілінаў "Ваня" раздзеў "Котвіча", даў яму лекі, зрабіў па ўсіх правілах перавязку, накарміў, паклаў спаць.

Дзякуючы ксяндзу звязаліся з мясцовай арганізацыяй ЗВЗ, і 31 снежня абодва былі ў Варшаве. "Котвіч" прыйшоў на кантактны пункт па вуліцы Служэўскай вечарам, калі ўжо дзейнічала камендан-цкая гадзіна. Сілаў хапіла толькі для таго, каб пачуць водгук -- абамлеў проста ў калідоры. Падняты па трывозе доктар Ежы Шульц агледзеў раненага, аказаў яму медыцынскую дапамогу, паклаў у шпіталь, дзе "Котвічу" была зроблена аперацыя. 3 студзеня ён пасяліўся на канспіратыўнай кватэры па вуліцы Тополевай, знаходзіўся там, пакуль рана не загаілася канчаткова.

Потым у Варшаву прывезлі грошы і смутную вестку пра смерць паручніка Мар`яна Юрэцкага ("Аравы") і Анджэя Сьвёнткоўскага ("Амурата").

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З дэпешы генерала "Грота" ў Лондан ад 3 студзеня 1942 г.: "Скідванне 27/28 наступіла ў рэйху, на лес, адбыўся бой з пагранічным патрулём, забітыя 4 немцы. Ваня і раненны Котвіч прыбылі да нас. Аб рэшце людзей, пошце і грошах пакуль звесткаў няма. Частка парашутаў захоплена. Раён шчыльна акружаны немцамі. Пляцоўкі Лэнка, Струга не дзейнічаюць, кантактныя пункты пад пагрозай, далейшыя скіды ў гэтым раёне немагчымыя. Новыя адрасы паведамлю дадаткова. Каліна 474".**

**Удакладняючы рапарт "Грота" паведамляў для Лондана акалічнасці смерці парашутыстаў: "... Арава (з поштай) і Амурат заставаліся пэўны час на месцы прызямлення, каб схаваць засталыя парашуты. На іх натрапіла нямецкая аблава, арганізаваная пасля сутычкі з групай Котвіча. Захапілі знянацку і застрэлілі".**

"Ціхацёмныя", якія былі накіраваны на Беларусь і на Віленшчыну і загінулі ў часе вайны (па няпоўных даных):

1. Капітан пяхоты Францішак Цеплік ("Хатрак"). Скок 30.4.1944 г. Загінуў у баі з аператыўнай групай НКУС пад Сурконтамі на Гродзеншчыне 21.8.1944 г.

2. Паручнік кавалерыі Мечыслаў Экхард ("Бацян"). Скок 1.11.1942 г. Арыштаваны ў Давыд-Гарадку як афіцэр дыверсійнай базы 19.10.1942. г. Замучаны ў гестапа.

3. Падпаручнік пяхоты Лёнгін Юркевіч ("Мыш"). Скок 13.3. 1943 г. Арыштаваны гестапа ў лістападзе 1943 г. у Вільні. Замучаны ў часе следства.

4. Маёр інжынерных войскаў Мацей Калянкевіч. Скок 2.12.1941 г. Камандзір Наднёманскага злучэння АК. Загінуў 21.8. 1944 г. у баі з аператыўнай групай НКУС пад Сурконтамі на Гродзеншчыне. Вестка аб прысваенні звання падпалкоўніка і назначэнні камендантам Навагрудскай акругі прыйшла ўжо пасля яго смерці.

5. Сяржант сувязі Станіслаў Казімерчык ("Ксёндз"). Скок 16.2.

1943 г. Накіраваны для канспіратыўнай работы ў Вільню. Арыштаваны ў Астралэнцы ў маі 1943 г., загінуў.

6. Паручнік пяхоты Пётр Матылевіч ("Кшэмень", "Граб"). Загінуў 7.01.1944 г. у баі з немцамі пад Мікулішкамі на Ашмяншчыне, перад смерцю быў прызначаны намеснікам камандзіра партызанскай брыгады АК капітана Адама Барычкі ("Броны").

7. Капітан артылерыі Богдан Юліуш Пёнткоўскі ("Мак"). Скок 4.03.1942 г. Арыштаваны гестапа ў снежні 1942 г., падвергся катаванням. Ранены падчас спробы ўцячы з Мінскай турмы, памёр у сакавіку (?) 1943 г.

8. Паручнік артылерыі Ян Піўнік ("Пануры"). Скок 7.11.1941 г. Камандзір батальёна АК Наднёманскага злучэння. Загінуў 16.04. 1944 г. у часе штурму нямецкага шутцпункта ў Еўлашах на Лідчыне.

9. Ротмістр кавалерыі Ян Скрахоўскі ("Астрога"). Скок 30.4.1944 г. Загінуў у баі з аператыўнай групай НКУС пад Сурконтамі на Гродзеншчыне.

10. Маёр кавалерыі Тадэвуш Сакалоўскі ("Троп"). Скок 30.3.1942 г. Арыштаваны гестапа ў Мінску 8.12.1942 г. Закатаваны ў турме 6.2.1943 г.

11. Падпаручнік пяхоты Ян Марэк ("Валька"). Скок 6.01.1942 г. Удзельнік дыверсійных акцыяў на Брэстчыне. 13.05.1943 г. цяжка паранены гестапаўцамі ў Варшаве пры спробе ўцячы па даху дома на вул. Вспульнай. У шпіталі пакончыў жыццё самагубствам.

12. Падпаручнік сувязі Ежы Штром ("Пільнік"). Скок 8.04.1944 г. Загінуў у чэрвені 1944 г. падчас дыверсійнай акцыі ў Лідзе.

13. Паручнік пяхоты Станіслаў Вінтэр ("Станлей"). Скок 1.09. 1942 г. Камандзір 3-га батальёна 78-га пяхотнага палка АК на Гродзеншчыне. Затым -- у 2-й арміі Народнага Войска Польскага. Загінуў у бітве з немцамі ў першай палове 1945 г.

14. Паручнік артылерыі Мечыслаў Шчэпаньскі ("Дэмбіна"). Скок 4.05. 1944 г. Ваяваў у 77-ым пяхотным палку АК Навагрудскай акругі. Загінуў у 1945 г.

15. Капітан артылерыі Вацлаў Заорскі ("Рыба"). Скок 3.09. 1942 г. Спецыяліст па дыверсіях. Арыштаваны гестапа ў Мінску 8 ці 9.12.1942 г. У турме пакончыў жыццё самагубствам.

16. Падпаручнік сувязі Станіслаў Запаточны ("Пломень"). Скок 3.09.1942 г. Арыштаваны гестапа ў Вільні ў час работы радыёстанцыі на Антокалі. Атруціўся ў часе следства.

17. Паручнік бронетанкавых войскаў Збігнеў Пясэцкі ("Орлік"). Скок 15.02.1942 г. Удзельнік падполля ЗВЗ -- АК на беларускім Палессі. Загінуў у часе вайны.

18. Падпаручнік Марыян-Збігнеў Гарчыньскі ("Скала"). Кіраўнік курсаў падрыўнікаў у Палескай акрузе АК. Памёр ад запалення горла ў лістападзе 1943 г. Быў пахаваны пад чужым прозвішчам-- Стэфан Герман.

19. Падпаручнік Ян Грыг ("Дзядзя"). Камандзір партызанскага атрада ў Палескай акрузе АК. Загінуў у баі з немцамі ў снежні 1943 г.

20. Падпаручнік Лешак Ляпчыньскі ("Жаль"). У 1944 г. камандзір сапёрнай роты 8-га батальёна Наднёманскага злучэння АК. Лёс невядомы.

Частка "ціхацёмных", якія ўдзельнічалі ў акаўскім падполлі на тэрыторыі Беларусі, засталіся жывымі. Але лёс іх пасля вайны склаўся па-рознаму.

1. Падпалкоўнік (доктар) Альфрэд Пачкоўскі ("Ваня"). Скок 28.12.1941 г. Кіраўнік дыверсійнай групы ЗВЗ --АК на Брэстчыне. Пасля вайны жыў у Польшчы.

2. Паручнік пяхоты Збігнеў Вэнкевіч ("Забаўка"). Скок 28.03. 1943 г. Удзельнік акаўскага падполля на беларускім Палессі. Пасля вайны жыў у эміграцыі.

3. Капітан пяхоты Балеслаў Контрым ("Жмудзін"). Скок 1.09.1942 г. Член дыверсійнай групы на беларускім Палессі. Пасля вайны ў Польшчы быў абвінавачаны ў супрацоўніцтве з немцамі, пакараны смерцю. Рэабілітаваны пасмяротна.

4. Маёр кавалерыі Ежы Сакалоўскі ("Міра"). Скок 31.03.1942 г. Удзельнік дыверсійнай групы ЗВЗ -- АК на Міншчыне. Памёр пасля вайны ў Польшчы.

5. Капітан артылерыі Казімеж Смольскі ("Сосна"). Скок 4.09.1942 г. Удзельнік дыверсійнай групы ЗВЗ -- АК на Міншчыне. Пасля вайны жыў у Польшчы.

6. Капітан пяхоты Ян Смеля ("Вір", "Ліпэк"). Скок 7.01.1942 г. Удзельнічаў у дыверсійных акцыях на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Латвіі. Пасля вайны жыў у Польшчы.

7. Капітан пяхоты Адам Барычка ("Брона"). Скок 9.04.1942 г. Удзельнічаў у дыверсійных акцыях у паўночнай частцы Беларусі, Літве, Латвіі. Камандзір Браслаўскай брыгады АК. Пасля вайны жыў у Польшчы.

8. Паручнік артылерыі Раман Рамашкан ("Марыя"). Скок 9.04.1942 г. Удзельнік дыверсійных акцый на Віленшчыне і ў Беларусі. Памёр пасля вайны.

9. Паручнік Адольф Пільх ("Даліна"). Камандзір Стаўбцоўскага партызанскага злучэння АК. У 1944 г. прабіўся з часткай свайго атрада на тэрыторыю Польшчы.

10. Капітан пяхоты Станіслаў Сэндзяк ("Варта"). Скок 4.09. 1942 г. Начальнік штаба Навагрудскай акругі АК. Пасля вайны жыў у Польшчы.

11. Паручнік Эзэхель Лось ("Іква"). Камандзір 1-й роты Стаўбцоўскага злучэння АК. Захоплены ў палон партызанамі. 1 снежня 1943 г. частка злучэння была раззброена па загаду начальніка штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнкі і камандуючага злучэннем партызанаў Баранавіцкай вобласці В. Я. Чарнышова ("Платона"). Паручнік Лось з чатырма іншымі афіцэрамі АК быў дастаўлены самалётам у Маскву на Лубянку. Пасля вайны вярнуўся ў Польшчу.

12. Паручнік Лех Рыдзеўскі ("Гром"). Камандзір 2-й роты Стаўбцоўскага злучэння АК. Яго спасцігнуў такі самы лёс, што і паручніка Лося.

З успамінаў "ціхацёмнага" Станіслава Янкоўскага ("Агатона"). "У 1941 г., калі я рыхтаваўся да скоку на радзіму, начальнік школы ў адной з размоваў прывёў статыстычныя даныя, складзеныя англічанамі, паводле якіх сярэдні тэрмін жыцця парашутыста-

дэсантніка, закінутага на акупаваную ворагам тэрыторыю, складае каля шасці месяцаў.

Тады не ўсведамляў, што гэты статыстычны вывад, няхай сабе з нязначнымі карэктывамі, будзе датычыць нашых лёсаў. Што той скок праз люк ў падлозе "Галіфакса" навекі звязаў нас не толькі сяброўствам і патрэбай успамінаў да канца жыцця, але і сляпымі правамі ваеннай статыстыкі. Цяпер -- праз гады -- магу сказаць, што англічане памыліліся ненамнога".

"Ціхацёмныя" поўнасцю зазналі ўдары вайны. Неміласэрных да іх лёсаў удараў было болей, чым ім уяўлялася.

## "ВАХЛЯЖ"*

26 "ціхацёмных" накіравалі ў "Вахляж". Гэта кодавая назва спецыяльнага падраздзялення ЗВЗ -- АК для правядзення дыверсіяў і разведкі на акупаваных немцамі заходніх тэрыторыях Савецкага Саюза. Рашэнне пра стварэнне "Вахляжа" было прынята ў жніўні 1941 г.

У той час, калі ў Варшаве закладвалі падмуркі новай канспіратыўнай арганізацыі, польскі ўрад у Лондане перажываў глыбокі крызіс. У сувязі з новай сітуацыяй, узніклай ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны, СССР аўтаматычна аказаўся ў адным з палякамі і саюзнікамі антыгітлераўскім лагеры. Вайна СССР з Германіяй у палітычных колах Англіі была ўспрынята з энтузіязмам.

Нагадаем: к таму часу гордая Англія, галава вялізнай імперыі, дашчэнту была замучана татальнымі бамбардзіроўкамі. Брытанцы вельмі баяліся прамога нямецкага ўварвання непасрэдна на тэрыторыю Англіі. Савецка-польскае пагадненне "Майскі-Сікорскі" ад 30 ліпеня 1940 г., а пасля і ваенны дагавор ад 14 жніўня 1941 г. пра стварэнне ў СССР польскай арміі, якая павінна была змагацца з Германіяй поруч з Чырвонай Арміяй, былі падпісаны з адпаведным націскам англійскіх кіраўніцкіх колаў, якія выдатна разумелі, што зыход Другой сусветнай вайны вырашыцца не на Захадзе, тым болей не за акіянам, а на Усходзе.

Усходняя палітыка Сікорскага выклікала буру пратэстаў з боку кансерватыўных сілаў польскай вярхушкі, і перш-наперш -- прыхільнікаў санацыі (пілсудчыкаў). Падпісанне пагаднення "Майскі-Сікорскі" з'явілася сігналам для новай франтальнай атакі на Сікорскага і яго аднадумцаў. У пагадненні пытанне пра будучую савецка-польскую граніцу было пакінута адкрытым. Іменна за гэта пачалі крытыкаваць кіраўніка ўрада, якога абвінавацілі ў тым, што не змог дабіцца ад СССР гарантыі вяртання да граніцаў, устаноўленых Рыжскім мірным дагаворам 1921 г.

На знак пратэсту з падпісаным пагадненнем тры міністры -- Аўгуст Залескі, Мар'ян Сейда і генерал Казімір Саснкоўскі -- падалі ў адстаўку. Безумоўна, і Сікорскі падзяляў апаску сваіх палітычных праціўнікаў, што будучыня польскіх граніцаў застаецца невядомай,

* Вахляж (польск.) -- веер.

але ў той час, калі вырашаўся лёс сусветнай цывілізацыі, ён зыходзіў з наступных фактаў: 1. Быў не зусім адпаведны момант для распачынання калатнечы пра граніцы; 2. За першым пагадненнем будуць наступныя; 3. Час выбівацца да размовы з вялікім суседам; 4. Без памогі СССР любое польскае пытанне не вырашыцца ні зараз, ні пасля.

Канешне, гэтую сітуацыю добра разумелі і англічане, найбольш прадбачлівыя прыхільнікі Сікорскага, але з імі пагаджаліся далёка не ўсе. Адвечны гонар і імперская прага атрымаць шмат пры наймалых уласных высілках бралі верх. Дальнабачнага, цвярозага палітыка Сікорскага замшэлыя кансерватары гатовы былі разарваць. Крытыкавалі ўсё больш смела.

У верасні 1941 г. у Лондане стала вядома, што на пачатку кастрычніка для перагавораў з польскім урадам сюды прыбудзе прадстаўнік савецкага генштаба. Меркавалася, тэмай размоваў стане пытанне пра аказанне Захадам СССР хуткай і канкрэтнай дапамогі. Тут і за акіянам разумелі: без СССР яны не ўцалеюць. Не загінуць Іваны, загінуць Джоны. Адзіная рэальная сіла супраць немцаў -- СССР. У Англіі і ЗША нават прамысловасць усё яшчэ не перабудавалася на ваенны лад. Пазнейшыя падзеі -- час адкрыцця другога фронту -- пацвердзілі такія меркаванні.

Захад збіраўся памагчы не проста адступалай Чырвонай Арміі, каб нейкім чынам умацаваць Усходні фронт, Захад збіраўся памагчы сабе.

У той час саюзнікі не маглі ці не хацелі (спрэчка гісторыкаў пра гэта ідзе да сённяшняга часу) эфектыўна аблегчыць становішча СССР -- ні ў плане адкрыцця другога фронту, ні масіраванымі бамбардзіроўкамі прамысловых цэнтраў Германіі. Як адзіную рэальную магчымасць для аказання нейкай дапамогі Чырвонай Арміі тады ў Лондане разглядалі дыверсіі на лініях забеспячэння немцамі Усходняга фронту, а тыя пераважна праходзілі (90 %) праз тэрыторыю акупаванай Польшчы.

Стан арганізацыі, узбраення і кадравага складу Саюза ўзброенай барацьбы, наймацнейшай польскай канспіратыўнай арганізацыі, а практычна ў той час -- летам 1941 г. -- адзінай, якую можна было браць у разлік, не пакідалі ілюзій: правядзенне шырокамаштабных дыверсій пад сілу толькі ЗВЗ. Летам "Вахляж" існаваў яшчэ толькі ў плане штаба генерала "Грота". Нягледзячы на гэта, іменна з ім, "Вахляжам", які знаходзіўся ў зародкавым стане, лонданскае камандаванне польскімі ўзброенымі сіламі, падштурхоўваннае англійскім урадам, звязвала свае пачынанні па аказанню рэальнай дапамогі Чырвонай Арміі.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Шыфроўка (рапарт № 54) генерала Сікорскага галоўнаму каменданту ЗВЗ генералу "Гроту" ад 6 верасня 1941 г.: "Чакаю ад вас, пан генерал, паведамлення, ці зможа ЗВЗ арганізаваць іншыя дыверсіі (акрамя тых, што вяліся да гэтага часу.- - Дапушчэнне аўтара) з больш шырокім радыусам дзеяння на савецкіх тэрыторыях -- на ўсход ад польска-савецкай граніцы 1939 г.".**

Адказ галоўнага камендanta ЗВЗ у Лондан 22 верасня 1941 г., у якім прадстаўлены план арганізацыі "Вахляжа":

"1. Прынцыпы арганізацыі.

Стварэнне дыверсійна-сабатажнай і партызанскай сеткі на ўсход ад польскай дзяржаўнай граніцы ідзе поўным ходам пад назвай "Вахляж".

Будуць дзейнічаць 5 рэгіёнаў:

1. Поўдзень Украіны
2. Поўнач Украіны
3. Палессе
4. Беларусь
5. Інфлянты*

Для кожнага раёна прадугледжваецца кіраўніцтва, падбіраюцца людзі для знішчэння аб'ектаў, правядзення дыверсій і партызанскіх групаў.

Цэнтральнае кіраўніцтва пры галоўнакамандаванні ў Вацлаве**.

Сетка сувязі цэнтра з раёнамі, адрозная ад ЗВЗ*** і сеткі ўсходняй разведкі. Навучанне спецыялістаў пакуль што ў Варшаве, хутка -- у раёнах.

2. Заданні "Вахляжа".

Аператыўныя:

а) падрыхтаваць знішчэнне чыгуначных і шасейных камунікацыяў, выканаць гэта ў прызначаны тэрмін. Прадбачу выкананне гэтай задачы найпазней, як пярэдадзень паўстання;

б) праводзіць бягучыя дыверсійныя акцыі на камунікацыях, складах і знішчэнне асабовага саставу ў рамках, якія не будуць перашкаджаць выкананню галоўнага задання. У прынцыпе "Вахляж" супраць немцаў, аднак можа быць прыдатным і супраць Расіі.

3. Стан цяперашні:

а) цэнтр створаны;

б) адбор людзей для раёнаў працягваецца;

в) навучанне ідзе ў цэнтры;

г) эмісары і арганізатары ў раёны часткова высланыя;

4. Ацэнка магчымасцяў.

Сёння цяжка прадбачыць, што можам выканаць. Пакуль спрыяльныя магчымасці вырысоўваюцца на Белай Русі. Толькі на 1.01.42 буду поўнасцю ведаць нашы шанцы, перыяд да 4 (чацвёрты квартал--Я. С.) лічу за пробны, мантажны, пасля гэтага тэрміну распачнём акцыю.

5. Неабходнасць дапамогі:

а) дасылка нам людзей, падрыхтаваных для вядзення дыверсіяў

---

*Тэрыторыя не толькі ў Латвіі вакол Даўгаўпілса, але і частка тэрыторыяў Пскоўскай, Ленінградскай абласцей.-- Дапушчэнне аўтара.

**Вацлаў -- кодавая назва Варшавы.

*** ЗВЗ (Саюз узброенай барацьбы).

(спецыялісты па ўзрывах мастоў, знішчэнню чыгуначных саставаў і аўтамашынаў, якія добра ведаюць адну з наступных моваў: украінскую, беларускую, рускую, нямецкую (апрача польскай.-- Я. С.);

б) падрыхтоўка да 1 лютага 42 забеспячэння раёна 1-5 дыверсійнымі матэрыяламі і людзьмі з дапамогай авіятранспарту;

в) неадкладная дастаўка вызначаных 100 тысяч долараў на Усход і сістэма забеспячэння грашыма не знізу, а зверху;

г) уся акцыя "Вахляжа" праводзіцца без сувязі, дзе б там ні было, з Саветамі.

Каліна*".

У канцы лістапада 1941 г. начальнік польскага штабу вярхоўнага галоўнакамандавання ў Лондане генерал Тадэвуш Клімецкі накіраваў галоўнаму каменданту ЗВЗ дырэктыўнае пісьмо:

"У сувязі з аператыўным планам, які змешчаны ў рапарце № 54, перадаю частку дырэктывы вярхоўнага галоўнакамандуючага, датычнай змены сітуацыі ў сувязі з савецка-нямецкай вайной і гарантыямі бяспекі ў адносінах з Савецкай Расіяй. Гэтае пытанне застаецца актуальным і надалей, бо, нягледзячы на дагавор, немагчыма быць пэўнымі пра пазіцыю Расіі ў адносінах да Польшчы пры паражэнні Германіі. Можа стварыцца такая сітуацыя, што ў той час, калі краіна (Польшча.--Я. С.) распачне ўзброеную вялікую акцыю супраць немцаў, Чырвоная Армія пажадае перайсці граніцу Польшчы без згоды польскага ўрада, паставіць нас перад здзейсненым фактам.

НВ** прытрымліваецца такой думкі, што ў выпадку такога ўступлення Чырвонай Арміі на нашу тэрыторыю, гэты акт павінны быць расцэнены як варожы і напаткаць узброенае супраціўленне з нашага боку, мэта якога -- перад вачыма ўсяго свету падкрэсліць наша выключнае права на забеспячэнне непарушнасці граніцаў сваёй айчыны.

У сувязі з гэтым перадаю Вам, пан генерал, наступныя дырэктывы, вельмі важныя з палітычнага пункту гледжання.

1. Узброенае супраціўленне павінна быць падрыхтаваным, па магчымасці моцным, на лініі польска-савецкай граніцы ў верасні 1939 г.

2. Вельмі важна, каб далей, у глыбіні Савецкіх войскаў, раёны Вільні і Львова маглі абараняцца (ад Саветаў.-- Я. С.) доўгі час, нават у ізаляцыі. Выкарыстанне іншых магчымасцяў арганізацыі супраціўлення НВ пакідае, пан генерал, на Ваша вырашэнне.

Пры адсутнасці адпаведных загадаў НВ, якія б нанава арыентавалі Вас, пан генерал, пра намеры Савецкай Арміі, трэба

* Генерал Стэфан Равецкі ("Грот").

** НВ -- вярхоўны галоўнакамандучы генерал Сікорскі.

**будзе дзейнічаць у залежнасці ад таго, як савецкія войскі пачнуць ставіцца да грамадскіх і ваенных уладаў нашай краіны..."***

У гэтай і другой перапісцы выразна дае знаць ранейшая варожасць і недавер з боку польскіх кіраўніцкіх колаў у адносінах да СССР, няўпэўненасць да патэнцыяльнага саюзніка ў сумеснай барацьбе супраць немцаў. Няма вольнае Польшчы, СССР ужо 5 месяцаў сам сцякае крывёю ў небывалай па сваіх маштабах вайне з фашысцкай Германіяй і перамолвае нямецкія сілы, а былыя настроі яшчэ не змяніліся ў стане польскай эміграцыі ў Англіі і цэнтрах падполля ў Польшчы. Не прайшла крыўда на верасень 1939 г.

Так, холад недаверу да сталінскага кіраўніцтва па-ранейшаму існаваў, але адкрытая варожасць супраць СССР, якая была да 22 чэрвеня 1941 г., паступова прыйшла ў сутыкненне з патрэбай цвярозай ацэнкі палітычнай сітуацыі. Перш за ўсё на гэта паўплывала стойкасць і мужнасць Чырвонай Арміі. Напоперак прагнозам многіх заходніх палітыкаў і стратэгаў СССР не стаў на калені перад знішчальнымі ўдарамі гітлераўскай браніраванай машыны і, нягледзячы на вельмі цяжкія страты ў людзях і тэхніцы, а таксама страту вялізнай тэрыторыі, не здаўся ганебна, як Францыя і другія краіны, а мужна трымаўся. Не толькі супраціўляўся восенню 1941 г., але і перайшоў узімку 1941/42 гг. да часткова ўдалых атакоўных дзеянняў. СССР звязваў на Усходнім фронце 90 % нямецкіх сілаў, багата дывізіяў сатэлітаў Рэйха. Гэта дазволіла добра перадыхнуць заходнім саюзнікам. Нанава ацаніць сітуацыю.

На трохі свабаднейшы ад былога польскага гневу і эмоцыяў погляд істотна паўплывалі візіт генерала Сікорскага Сталіну ў снежні 1941 г., абвяшчэнне польска-савецкай дэкларацыі пра дружбу і ўзаемную дапамогу, вызваленне з савецкіх лагераў і турмаў дзесяткаў тысяч палякаў, фармаванне на тэрыторыі СССР статысячнай арміі генерала Уладыслава Андэрса**.

Усё гэта не магло не адбіцца і на дзейнасці ЗВЗ. У яго кіраўніцтве на пераломе 1941/42 гг. наступіла змена настрояў, з'явілася пачуццё неабходнасці выконваць саюзніцкі абавязак не на словах, а на справе. Хопіць змагацца за пальшчызну на словах. Справаў не было. Гэта разумелі ў ЗВЗ. Адна з галоўных задач канкрэтнай барацьбы з немцамі ў сувязі з гэтым ускладвалася на "Вахляж".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З дэпешы № 499 штаба генерала Сікорскага "Гроту" ад 5.02.1942 г.: "Каліна". У сувязі з сітуацыяй на**

---

* У раздзелах, якія прысвечаны "Вахляжу", дакументы цытуюцца па польскаму выданню манаграфіі Цэзарыя Хлябоўскага "Вахляж" (Варшава, 1985 г.).

** У выніку лонданскіх палітычных інтрыгаў і інсінуацыяў польская армія пад кіраўніцтвам генерала Андэрса не прыняла ўдзелу ў баях на Усходнім фронце, а ў адпаведнасці з савецка-польскімі дамовамі 21 ліпеня 1942 г. была эвакуіравана за мяжу -- на Блізкі Усход. Палякі бераглі сваіх людзей( Бераглі сілы для будучай барацьбы? Няведаем.-- Я. С).

**Усходнім фронце пажадана максімальна не дапускаць руху нямецкага транспарту. У сувязі з вышэйсказаным НВ загадвае ўзмацніць акцыі сабатажу ў раёнах вузлоў: Ваўкавыск -- Баранавічы, Брэст -- Жабінка, Здалбунаў -- Львоў -- Краснае. Спрадвечныя польскія тэрыторыі беражыце. "Хан"*.**

**У адказ на радыёграму № 499 генерал "Грот" адсылае радыёграму № 98 ад 16.02. 1942 г.: "Галоўнакамандуючаму. На 499 паведамляю, што аддаў загад на правядзенне сабатажу таксама на вузлах Маладзечна і Вільня".**

Трэба заўважыць, што хаця загады былі аддадзены, дыверсійныя акцыі "Вахляжа" пачаліся дзесьці праз два месяцы, не раней.

Калі падсумаваць сказанае, можна зрабіць наступны вывад. У планах польскага галоўнакамандуючага "Вахляж" прызначаўся для дзеянняў на карысць савецкага фронту, чаго ў той час настойна дамагаліся англійскія ўлады. Але гэта адзін, чыста знешні бок справы. З другога боку, і гэта трымалася ў сакрэце, заданні "Вахляжа" былі звязаны з падрыхтоўкай польскім урадам у Лондане і кіраўніцтве ЗВЗ -- АК у Польшчы ўсеагульнага ўзброенага паўстання. Мы вызвалім сябе самі. Не поўнасцю, то хоць сталіцу. Але -- самі. Без "праклятых" Саветаў і маскалёў. У вызвольным паўстанні "Вахляжу" адводзілася роля прыкрыцця такога паўстання ў глыбіні краіны, прыкрыцця з Усходу -- ад адступоўных немцаў і наступоўных Саветаў.

"Вахляж" таксама павінны быў збіраць інфармацыю -- у цесным супрацоўніцтве з 2-ім (разведвальным) аддзелам польскага генштаба -- пра вермахт і пра асабовы склад і ўзбраенні Чырвонай Арміі. "Вахляж" павінны быў працаваць і на карысць англійскай разведкі.

У канцы жніўня 1941 г. галоўны камендант ЗВЗ ("Грот") прызначае кіраўніком "Вахляжа" падпалкоўніка Яна Уладаркевіча ("Даміана"), начальнікам штаба -- падпалкоўніка Адама Рэмігіуша Грахольскага ("Доктар", "Інжынер", "Валігура", "Брохвіч"). У канцы сакавіка ў часе інспекцыйнай паездкі ў Львоў Ян Уладаркевіч раптоўна памёр. З сярэдзіны красавіка абавязкі кіраўніка выконвае Адам Грахольскі, у канцы мая ён зацвярджаецца на гэту пасаду пастаянна. Штаб узначаліў маёр Стэфан Рыхтэр ("Тумры"). Яны кіравалі "Вахляжам" да апошніх дзён яго існавання.

Тэрыторыю будучых дзеянняў падзялілі -- у агульных рысах -- на дзве вялізныя зоны. Першая -- тылавая, служыла чымсьці накшталт трампліна для вылазкаў у раёны намечаных баявых дзеянняў. Гэтую зону з захаду абмяжоўвала ракадная лінія з Ліды праз Беласток, Брэст, Ковель да Львова. З Усходу яе замыкала савецка-польская граніца да верасня 1939 г.

Другая зона -- тэрыторыя дыверсіяў і прыкрыцця: на ўсход ад даваеннай савецка-польскай граніцы, па лініі Заходняя Дзвіна (у далейшым -- Дзвіна.-- Я. С.), Днепр (з пэўнымі пераходамі яе, аднак без пераходаў на поўнач лініі Даўгаўпілс -- Полацк). На поўдні такая лінія цягнулася праз Цярнопаль, Днепрапятроўск, Ізюм над Данцом.

---

* Тадэвуш Рудніцкі.

Абедзве зоны (ад Варшавы да Дзвіны і Дняпра) былі разбіты на пяць участкаў. Калі кінуць позірк на карту магчымых дзеянняў дыверсійных арганізацыяў, стрэлкі прамяніста разыходзяцца ад Варшавы ва ўсходнім накірунку. У савакупнасці малюнак умоўных знакаў на карце нагадваў веер. Адсюль, паўторымся, і назва арганізацыі -- "Вахляж" ("Веер").

Пранумараваныя з поўдня на поўдзень участкі мелі свае радыусы дзеяння, пераважна ўздоўж чыгунак і шасейных аўтамагістраляў. Прадугледжвалася, што каманды, накіраваныя на кожны з гэтых участкаў, павінны былі "апякаць" іх, пачынаючы з тэрыторыі першай зоны і канчаючы паласой у тыле нямецкіх войскаў прыкладна ў раёнах Дзвіны і Дняпра, уключаючы ракадныя лініі праз усе пяць участкаў з поўдня на поўнач. Першы і другі ўчасткі ахоплівалі Украіну, трэці -- тэрыторыю па лініі Брэст -- Пінск -- Давід-Гарадок -- Мазыр -- Гомель. Участак чацвёрты ўключаў раёны Ліды, Мінска, Барысава і Оршы. Дыяпазон дзеяння ўчастка пяць: трохкутнік па лініі Вільня -- Даўгаўпілс -- Полацк.

У адпаведнасці з планам на кожным участку дыверсійныя акцыі павінны былі выконваць дасканала і ўсебакова падрыхтаваныя групы: 1-4 ці 1-6 чалавек. Ім дазвалялася дзейнічаць самастойна. У часе польскага паўстання намечанага на лета 1942 г., спецгрупам уздоўж чыгункаў і дарогаў стратэгічнага прызначэння, якія вялі да мастоў на Дзвіне і Дняпры, загадвалася правесці дыверсійныя акцыі адначасова. Варыянт "А" (план-мінімум) прадугледжваў знішчэнне 45 мастоў, у тым ліку 15--стратэгічнага прызначэння. Чатыры з іх планавалася ўзарваць на Дзвіне, у раёне Яльца, дзе адлегласць паміж Дзвіной і Дняпром каля 60 кіламетраў, дзесяць -- на Дняпры і трыццаць мастоў -- на васьмі пад`яздных дарогах да гэтых рэкаў па іх абодвух баках.

Па варыянту "Б" (план-максімум) намячалася ўзарваць альбо спаліць дадаткова сто мастоў на васьмі важнейшых магістралях, пралеглых з Усходу на Захад і ўздоўжкі дзвюх ракадных дарогаў. Пасля выканання заданняў дыверсійныя групы павінны былі стаць зародкамі партызанскіх атрадаў, мэта якіх -- не дапусціць аднаўлення руху на разбураных лініях камунікацыяў, усялякімі спосабамі дэзарганізаваць тыл, нішчыць боезапасы і г. д.

Такім чынам, аператыўныя дзеянні "Вахляжа" павінны былі папярэднічаць выкананню ім сваёй галоўнай задачы ў канчатковай фазе вайны -- стаць перашкодай на шляху немцаў і рускіх, усяго, што магло адмоўна паўплываць на намечаны зыход узброенага паўстання ў Польшчы.

Што й казаць, надзеі на спецыяльную дыверсійную арганізацыю ўскладваліся вялікія. Але "чалавек плануе, а Бог вынікуе". Альбо, датычна дыверсантаў, скажам так: з велькай хмары дождж малы. Пачатковыя і канчатковыя вынікі дзейнасці "Вахляжа" аказаліся несувымернымі з напланаванымі задачамі і панесенымі стратамі. Усе планы і планікі лонданскіх у прынцыпе мудрых і адданых радзіме людзей зачастую аказваліся бурбалкамі. Ляціць -- вялікая, вабная; не паспела датыкнуцца да сцяблінкі, ніткі, падлогі -- лопнула. Пшык!

Планаванне барацьбы "Вахляжа" выявіла тое, што ведаюць усе разведкі свету: армія ўсё вырашае. Не дыверсант. Шкоду, калецтвы прынесці ён можа, перамогу -- не.

Змена сітуацыі на Усходнім фронце, пераацэнка камандаваннем АК канцэпцыі ўсеагульнага польскага ўзброенага паўстання (мыльная бурбалка.-- Я. С.) і, нарэшце, расшыфроўка сеткі "Вахляжа" нямецкай разведкай прывялі да яго ліквідацыі. Прыйшлося спешна перадаваць кадры і ўзбраенне ў распараджэнне штабоў адпаведных акругаў АК.

Тым не менш людзі з "Вахляжа" правялі шэраг вялікіх дыверсійных акцый супраць немцаў. На беларускай зямлі многія мужныя барацьбіты, удзельнікі гэтых акцыяў, загінулі. "Вахляж" для беларускага чытача -- невядомая старонка гісторыі. Падзеі, звязаныя з дзейнасцю "Вахляжа", безумоўна, заслугоўваюць, каб пра іх распавядаць падрабязней.

"Вахляж" і Армія Краёва не проста звязаныя -- непадзельныя. Адно выйшла з другога. Адвага і бяздумнасць перапляліся невыпадкова.

## "ВАХЛЯЖ". УЧАСТАК 3.

Да вясны 1942 г. "Вахляж" перажываў арганізацыйны перыяд. 3 сакавіка 1942 г. дыверсійныя групы пачалі пранікаць на тэрыторыю Беларусі. Першым пачаў "абжывацца" ўчастак 3--Беларускае Палессе. Сюды прыбыла група ў складзе чатырох чалавек: "ціхацёмныя" капітан Альфрэд Пачкоўскі ("Ваня"), падпаручнік Ян Марэк ("Бэбі"), паручнікі Збігнеў Пясэцкі ("Орлік") і Збігнеў Бэнкевіч ("Забаўка"). У маі на ўчастак 3 было перакінута з Варшавы яшчэ каля 20 чалавек. Яны ўцягнулі ў "Вахляж" некалькі дзесяткаў мясцовых жыхароў. Усяго на палескім участку, па няпоўных даных, было 156 членаў гэтай арганізацыі. У асноўным аселі ў трох гарадах -- Брэсце, Пінску, Лунінцы. У Давыд-Гарадку, ля былой савецка-польскай граніцы, стваралася дыверсійная база для рэйдаў ва ўсходнія раёны Беларусі.

Да канца першай дэкады мая 3-ці ўчастак не атрымаў ніводнага кілаграма выбуховых рэчываў, але група пачала дзейнічаць. 11 красавіка на Каралеўскім канале (Пінск -- Антопаль) узарвала рачны манітор з нямецкім патрулём.

26 мая на паўтаракіламетровым адрэзку ўздоўж шашы Мінск -- Брэст знішчылі лінію ваеннай тэлефоннай сувязі. Акцыяй кіравалі капітан "Ваня", падхарунжы Збігнеў Слончыньскі (Жбік") і вахмістр Міхаіл Жаўняровіч ("Гарда"). Група -- 11 чалавек -- сутыкнулася з нямецкай ваеннай калонай. Было забіта 5 немцаў, у тым ліку капітан вермахта, і адзін баец з "Вахляжа" -- Часлаў Нуркевіч-Яскольскі ("Гжыб"). Бадай, гэта першая ахвяра, якую панёс "Вахляж" на беларускай зямлі.

2--3 мая каманда ўчастка 3 зрабіла рэйд па-за межы "сваёй" тэрыторыі -- на чыгунку Мінск--Гомель. У сямі месцах разбурылі чыгуначнае палатно і ўзарвалі рэйкі пад эшалонам. Прыкладна ў той час, 17 мая, група капітана "Вані" абстраляла запальнымі кулямі

нямецкі эшалон на лініі Мінск -- Лунінец. Ён перавозіў гарматы і некалькі платформаў з прасаваным сенам. Як аказалася, пад сенам былі замаскіраваны 4 цыстэрны з авіябензінам. Пасля чарговага выстралу адна з цыстэрнаў узарвалася, увесь эшалон ахапіла полымя.

Цікава было б даведацца, колькі польскіх гераічных учынкаў прыпісалі сабе беларускія партызан, мужанцы, лясныя браты, барацьбіты, помсціўцы? Эпітэт можна выбраць любы, але што такое прысваенне магло быць, не выключаецца. Мы ведаем нямала выпадкаў, як па аднаму ўзрыву на мосце ішлі ў Маскву тры розныя данясенні. Думаецца, забіралі сабе справы другіх людзей не толькі ўсходнікі, а і заходнікі, то бок палякі прысвойвалі чужыя подзвігі.

Такое высвятленне яшчэ чакае сваіх архівістаў-даследчыкаў.

З кожным днём дыверсіі на ўчастку 3 набіралі тэмп. На пачатку чэрвеня 1942 г. у Брэст прыбыла з Варшавы новая група з 6 чалавек. Падмацаваная трыма ўзрыўнікамі з мясцовай каманды "Вахляжа", 1 ліпеня група пад кіраўніцтвам падпаручніка "Бэбі" рушыла на чыгунку ў раён Капцэвічаў. Два дні бесперапыннага маршу. Група сходу прыступіла да выканання задання. Пры ўзрыве ваеннага эшалона паравоз сышоў з рэйкаў і пацягнуў за сабой з высокага насыпу некалькі вагонаў. "Бэбі" быў перакананы, што гэта эшалон з ваеннай амуніцыяй і боепрыпасамі, загадаў абстраляць першы вагон, у якім звычайна ехалі канваіры. Але як на бяду ўвесь цягнік аказаўся запоўнены пяхотай. Яна імгненна адкрыла кінжальны агонь з аўтаматаў.

Вахляжаўцы адскочылі ў лес і пачалі зваротны бег. Тым часам немцы абвясцілі пра дыверсію ўсе бліжэйшыя гарнізоны. Пачалося праследаванне. Калі дыверсанты спыніліся перадыхнуць у нежылым напаўразваленым будынку, іх абкружыла паліцыя. Пачаўся штурм. У часе перастрэлкі загінуў падпаручнік Мікалай Сацэвіч ("Татуньця").

Трэніраваным ,вопытным падрыўнікам усё ж удалося вырвацца з кальца акружэння. Група раздзялілася натрая, далей парашылі прабірацца па некалькі чалавек. Не ўсім пашчаслівіла дайсці да Брэста. У сутычках з паліцыяй былі забіты Вітольд Громельскі ("Вітэк"), Міхаіл Жаўняровіч ("Гарда"), параніла Збігнева Ваякоўскага ("Пшэдваёвец").

12 ліпеня група пад камандаваннем капітана "Вані" для правядзення чарговай дыверсійнай акцыі накіравалася пад Маларыту. У час агляду імі чыгуначнага палатна нечакана пад`ехаў маларыцкі ландрат Штраўх са сваім братам--капітанам вермахта, які знаходзіўся ў адпачынку. Група адкрыла агонь. Братоў і шафёра-салдата забілі на месцы.

Праз два дні, у час урачыстага пахавання Штраўхаў, 18 чалавек з "Вахляжа" на дзвюх грузавых машынах выехалі з Брэста на тое самае месца, дзе сутыкнуліся з немцамі. Замініравалі рэйкі і залеглі побач у лесе. Чакалі некалькі гадзінаў, прапусцілі два кантрольныя патрулі. Нарэшце з боку Брэста паказаўся ваенны эшалон. Калі наскочыў на міну, паравоз сышоў з рэйкаў, вагоны пачалі нагрувашт-

чвацца адзін на другі. З узарванага цягніка пачалася страляніна. Група адышла. Ад шальной кулі загінуў сувязны Ян Тшэцяцкі.

Напэўна, няма патрэбы спыняцца на кожнай дыверсійнай акцыі паасобку, паколькі, як мы ўжо змаглі пераканацца, яны ў прынцыпе нагадваюць адна другую: рэйды, засады, узрывы, перастрэлкі, пагоні, акружэнні і ... чалавечая кроў. На нашу думку, ёсць сэнс назваць важнейшыя акцыі "Вахляжа". Коратка, у храналагічным парадку. Яны пададзены на аснове дакументальных даных і сведчанняў непасрэдных удзельнікаў падзеяў (Цэзарый Хлябоўскі. "Вахляж". Варшава, 1985).

30 ліпеня 1942 г. група Мар`яна Пшысецкага ўзрывае ваенны эшалон на лініі Пінск -- Лунінец, уступае ў бой з аховай.

1 жніўня 1942 г. група Збігнева Ваякоўскага ўзрывае рэйку на лініі Брэст -- Баранавічы, пускае пад адхон ваенны эшалон пад Бярозай.

13 жніўня 1942 г. Комплексная акцыя 3-га ўчастка: спалены шасэйны мост на лініі Пінск -- Брэст у Кобрыне, пушчаны пад адхон паравоз, узарвана чыгуначнае палатно на лініі Брэст -- Баранавічы, зроблены наезд эшалона на паравоз у выніку ўмысна няправільнага пераводу стрэлкі на лініі Брэст -- Гомель.

Жнівень 1942 г., трэцяя дэкада. Спроба разборкі артылерыйскіх снарадаў для набыцця ўзрыўных рэчываў, выкраданне немца-мінёра, расстрэл яго ў часе аблавы.

16 верасня 1942 г. група паручніка Люцыяна Шыдлоўскага ўзрывае на ўсход ад Лунінца ваенны эшалон, які ішоў у напрамку Гомеля.

26 верасня 1942 г. група аховы штаба 3-га ўчастка пад кіраўніцтвам сяржанта Альбіна Знаеўскага ("Знайды") узрывае рэйкі на чыгунцы Мінск -- Брэст у раёне Жабінкі.

30 верасня 1942 г. Тая ж самая група разбурае чыгуначнае палатно на лініі Мінск -- Брэст у раёне Бярозы.

Побач з правядзеннем дыверсій "Вахляж" прымаў энергічныя захады па збору разведвальных дадзеных. У 1941 г. брэсцкай групе сабатажу на чыгунцы пад кіраўніцтвам Станіслава Закшэўскага ("Жучка"), у якую, дарэчы, уваходзілі людзі розных нацыянальнасцяў -- палякі, беларусы, рускія, украінцы і нават немцы,--удалося завязаць кантакт з італьянскім капралам Алімпіо Цуронэ. Ён служыў у ваеннай камендатуры Брэсцкага чыгуначнага вузла, з`яўляўся намеснікам нямецкага каменданта капітана Брунера. Праз гэты вузел на Усходні фронт накіроўваліся і італьянскія часці. У камендатуры патрэбны быў прадстаўнік італьянскіх ваенных уладаў. Таму капрал апынуўся ў Брэсце. Група Закшэўскага ўстанавіла тры важныя акалічнасці, якія ахарактарызавалі Алімпіо: ён ніколі не быў прыхільнікам фашызму, употайку ненавідзеў свайго фанабэрыстага начальніка (апошні таксама ставіўся да італьянца з пагардай) і пакінуў на радзіме шматдзетную сям`ю, на ўтрыманне яе ўвесь час не хапала грошай. А тут італьянцу прапанавалі долары, і яны, у спалучэнні з дзвюма першымі акалічнасцямі, зрабілі сваю справу. Цуронэ пачаў супрацоўнічаць з "Вахляжам".

З мая да верасня 1942 г. ён пастаўляў інфармацыю пра ўсе эшалоны, якія кіраваліся праз Брэст на Усходні фронт. Польскі даследчык Цэзары Хлябоўскі сцвярджае, што гэта былі бясцэнныя даныя, бо Алімпіо меў доступ да сакрэтных пакетаў. У іх гаварылася пра напрамак руху цягнікоў, колькасную і якасную характарыстыку эшалонаў, нумары палкоў, дывізій, і, бывала, прозвішчы камандзіраў, пра перавозкі зброі і тэхнікі, напрыклад, колькасць платформаў, занятых танкамі, станцыю адпраўкі і прызначэння.

У верасні Цуронэ перавялі з Брэсцкай камендатуры на Усходні фронт, і 3-ці ўчастак "Вахляжа" страціў цэнную крыніцу інфармацыі. Праўда, у нейкай ступені гэтая страта пакрывалася данымі, якія ўдавалася вывуджваць з дапамогай людзей, працавалых у Брэсцкім драмтэатры. Частымі гасцямі на спектаклях былі нямецкія афіцэры, генералы і чыноўнікі высокага рангу. Змест іхніх канфідэнцыяльных гутаркаў у час знаходжання ў ложы для ганаровых гледачоў станавіўся вядомым кіраўніцтву "Вахляжа".

На ўсё гэта патрэбныя былі грошы, і немалыя. У прынцыпе дзейнасць "Вахляжа" нядрэнна фінансавалася валютай з Лондана. Але сродкаў усё ж не хапала, да таго ж на пачатку ліпеня 1942 г. правалілася сувязная, якая везла з Варшавы ў Брэст валюту для патрэбаў 3-га ўчастка. Падхарунжы Вайноўскі ("Матор") тады быў асабістым шоферам брэсцкага надляснічага. Даведаўшыся аб правале сувязной, прапанаваў "Ваню" арганізаваць засаду на шашы Брэст -- Высокае, калі ён будзе везці свайго шэфа з грашыма (каля 50 тысячаў карбаванцаў) для выплаты зарплаты рабочым лясной гаспадаркі. Так і зрабілі. Група Ваякоўскага затрымала аўтамабіль, немца абяззброілі, грошы забралі.

Недзе каля 25 кастрычніка 1942 г. у час адной з засадаў затрымалі грузавік, які вёз трох чыноўнікаў з апарату Пінскага староства. Разам з імі ехала і жанчына-немка. Аказалася, яны везлі з пінскага філіяла ў брэсцкі банк знятыя з абароту на Піншчыне савецкія рублі для далейшага іх выкарыстання ў прыфрантавой зоне (курс маркі да рубля ў той час складаў 1:10). Машыну спалілі разам з грашыма, у немцаў адабралі зброю, абутак і расстралялі. Жанчыну адпусцілі. Ніхто падумаць не мог, што гісторыя будзе мець працяг. Годам пазней капітан "Ваня" ехаў у Варшаве на трамваі "Толькі для немцаў". У тым жа трамваі ехала жанчына з разбітага грузавіка. Яна пазнала "Ваню", падняла лямант. Той мусіў на хаду выскачыць з трамвая і ледзь-ледзь паспеў схавацца.

У верасні 1942 г. "Ваня" атрымаў заданне асабіста ад кіраўніцтва "Вахляжа" Адама Грахольскага прывесці ў выкананне смяротны прыгавор ураджэнцу Дзівіна Яну Кухце. Гэта быў небяспечны агент гестапа. З яго непасрэдным удзелам немцы раскрылі падпольныя антыфашысцкія арганізацыі ў Львове, Роўна і Брэсце. Пасля здрадніка накіравалі на Палессе для знішчэння партызанскага руху ў Кобрынскім і Пінскім раёнах. Начальнік штаба 3-га ўчастка АляксандрКівале ("Клебан") к таму часу ўжо ведаў пра правакатарскую дзейнасць Кухты і падтрымаў рашэнне Цэнтра. У прынцыпе падобныя акцыі

выконвалі спецкаманды, падпарадкаваныя штабу акругаў ЗВЗ -- АК, але на Палессі гэткай не было.

Прывяла прыгавор у выкананне група ў складзе чатырох чалавек -- Ян Мацієўскі, Ежы Вайноўскі і два паліцэйскія з Кобрына, якія працавалі на "Вахляж". Мацієўскі і Вайноўскі прыехалі ў Кобрын на легкавушцы, якую апошні "пазычыў" у свайго шэфа надляснічага. Сустрэліся са "сваімі" паліцэйскімі. Тыя праінфармавалі, што на кватэры Кухты якраз сёння нарада тайных супрацоўнікаў гестапа, і таму зручны момант расквітвацца з усімі разам. Сапраўды, пры шчодра накрытым стале сядзела пяць мужчынаў і адна жанчына. Мацієўскі страляў з аўтамата. Ніхто не паспеў падняцца з-за стала. Прывезлі ў Брэст 6 камплектаў дакументаў і 6 адзінак каратккаствольнай зброі.

Паміж тым над камандай 3-га ўчастка пачалі згушчацца хмары. Яшчэ ў пачатку жніўня 1942 г. у Брэст дайшла чутка пра арышт і змяшчэнне ў Пінскую турму ўсёй групы Пшысецкага -- 5 чалавек. У канцы ліпеня ён вывеў сваіх хлопцаў на чыгунку Пінск -- Лунінец, каля раз`езда Лоўча ўзарвалі поезд, які ішоў з Брэста на Усход. Паравоз зляцеў з рэйкаў, ахова адкрыла агонь.

У пошуках зброі вахляжаўцы смела кінуліся да вагонаў. Замест яе знайшлі кансервы і каньяк. Адышлі са здабычай у маёнтак Клобы, непадалёку Парахонска, распачалі выпіўку. Тым часам паднятыя па трывозе немцы з навакольных жандармерыяў арганізавалі аблаву. Не выключана, што хтосьці данёс пра месца падрыўнікоў. Раптоўны налёт жандармерыі на маёнтак заспеў усіх моцна п`янымі.

Павярхоўны вобыск не даў вынікаў, але ўсіх пяцярых усё роўна павезлі ў Пінск для допыту. Змясцілі ў камеру папярэдняга зняволення пры жандармерыі -- у падвале казармаў па вуліцы Альбрэхтаўскай, там даведаліся, што тут сядзіць і Ядвіга Снапко. Яна па загаду Пшысецкага даволі часта хадзіла на "чорны" рынак мяняць вахляжаўскія долары на рублі, нядаўна была затрымана паліцэйскімі.

Доўга сядзець нікому не давялося. Сумелі разарваць краты на акне і ўсе ўцяклі. Хаваліся ў Брэсце. Двое з іх -- Тадэвуш Гарашча ("Марынаж") і Станіслаў Грабоўскі ("Каро") знайшлі прытулак на вуліцы Дамброўскага, на гарышчы інтэрната работнікаў арганізацыі "Тодта". Ім было забаронена пакідаць сховішча. Але рызыкнулі, выйшлі на рынак. Тут іх зноў арыштавалі. Хоць катавалі, хлопцы нікога не выдалі. Праз некалькі тыдняў, 1 снежня 1942 г., былі расстраляныя ў Брэсцкай турме.

У верасні гестапа напала на след кіраўніка базы "Вахляжа" ў Аранчыцах Эдварда Яшніцкага, арыштавала яго і разграміла базу. Прыкладна ў той час паступілі першыя сігналы, што гестапа пачало "паляванне" на камандзіра 3-га ўчастка капітана "Ваню". У сувязі з пачатымі праваламі ён выращыў эвакуіраваць з Брэста ў Варшаву рэзервовую сетку "Вахляжа" і паручніка Збігнева Бянкевіча ("Забаўку"). Пачаў настойліва дамагацца адклікання яго з участка.

У час знаходжання ў Варшаве "Ваня" далажыў кіраўніцтву, што, нягледзячы на націск штаба, павялічыць маштаб дыверсій не

ўдаецца. Усе спробы "зачапіцца" за Гомель, стварыць там базу -- адна з галоўных задач 3-га ўчастка -- правальваюцца.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З данясення камандзіра 3-га ўчастка капітана Альфрэда Пачкоўскага ("Вані") ад 17.10.1942 г. кіраўніку "Вахляжа" палкоўніку Адаму Грахольскаму: "Унікнуўшы глыбей у мясцовую сітуацыю, прыходзіш да вываду, што ў цяперашні момант нам тут няма работы. Уся ініцыятыва на нашым участку застаецца ў савецкіх руках. Калі, аднак, ёсць неабходнасць выканаць ролю прыкрыцця, то, на маю думку, належыць на пагранічныя тэрыторыі Польшчы (маюцца на ўвазе граніцы да верасня 1939 г.— Я. С.) заслаць афіцэраў, якія падбяруць сабе кадры з ліку мясцовага насельніцтва. Асесці на савецкіх тэрыторыях практычна немагчыма, па-першае, бо нашы людзі слаба альбо зусім не валодаюць рускай мовай, і, горш за ўсё, дэканспіруюць сябе знешнім сваім выглядам.**

**Узарваць рэйкі і загінуць -- гэта не геройства. Ужыцца ў мясцовае асяроддзе -- вось дзе майстэрства. Мы ўжо балансуем некалькі месяцаў і, на жаль, не бачу ніякіх вынікаў нашай працы, горш таго — адны трагічныя выпадкі і велізарныя выдаткі. Цалкам разумею, што ва ўсякай акцыі прадугледжваюцца ахвяры, але найперш трэба зрабіць пералік вартасці аб`екта на валюту чалавечага жыцця. Хоць савецкія партызанскія атрады вялікія па колькасці і ўзброеныя "да зубоў", яны за славаю не гоняцца, а дзейнічаюць з разлікам".**

Калі меркаваць па зместу данясення, то сёння, з вышыні часу, мы можам упэўнена, без усялякіх нацяжкаў, сказаць, што капітан "Ваня" быў чалавекам цвярозага розуму. У сваіх высновах абапіраўся на рэаліі жыцця. Але нярэдка вышэйшае начальства зыходзіць са сваіх, нібыта вышэйшых інтарэсаў, хаця на паверку гэтыя інтарэсы могуць прынесці больш шкоды, чым выгады. Так было і ў дадзеным выпадку. З перыяду побыту "Вані" ў Варшаве паходзіць запіска палкоўніка Грахольскага, якая сведчыць, што кіраўнік "Вахляжа" ўсё яшчэ ўсур`ёз планаваў далейшае пранікненне на Усход, стварэнне аператыўных базаў на савецкіх тэрыторыях да 1939 г., і перш за ўсё ў Гомелі..

Між тым Гомель настойліва, як закліванне, паўтараецца ў дырэктывах цэнтральнага штаба на працягу ўсяго існавання 3-га ўчастка. Ён -- як не дасягнутая мэта дзеяння. У сувязі з гэтым Грахольскі быў настроены не толькі замяніць "Ваню" на пасадзе кіраўніка ўчастка чалавекам, які "больш аптымістычна б глядзеў на перспектыву асваення савецкіх тэрыторый", але і значна абнавіць склад штаба Палескага ўчастка. Толькі неспадзяваны арышт у Варшаве новага кандыдата на пасаду камандзіра Станіслава Вяржбіцкага ("Перса"), да арышту начальніка аператыўнага аддзела "Вахляжа", перапыніў план Грахольскага па замене кадравага складу ўчастка. Ім па-ранейшаму застаўся кіраваць "Ваня".

Нягледзячы на пагрозу правалу "Вані" на Палессі і яго неаднаразовыя просьбы пра адкліканне, ён атрымаў загад вяртацца ў Брэст. Калі яго знаходжанне ў горадзе далей будзе немагчымым, "Ваню" рэкамендавалася перанесці штаб з Брэста ў лес. Больш таго,

у сярэдзіне лістапада было прынята рашэнне аб разбудове дыверсійнай базы ў Давыд-Гарадку, умацаванні яе кіраўніцтва паручнікам Мечыславам Экхардтам ("Бацянам"). Яго прыезд у Давыд-Гарадок павінны быў супасці з канцэнтрацыяй невялікіх партызанскіх групаў 3-га ўчастка на землях на ўсход ад савецка-польскай граніцы да 1939 г., а таксама з пашырэннем дыверсіяў у гэтых раёнах.

17 лістапада 1942 г. капітан "Ваня" і паручнік "Бацян" выехалі на аўтамабілі з Варшавы ў Брэст. Там забралі з сабой Пятра Доўнара ("Азора") і вечарам, 17 лістапада, прыбылі ў Давыд-Гарадок. Сустрэліся з былым кіраўніком базы паручнікам Мар`янам Чарнецкім ("Рысем"). На яго кватэры пакінулі чамадан з рэчамі "Бацяна", радыёстанцыю, частку прывезеных з Варшавы ўзрыўных устройстваў і рушылі на выкананне дыверсіі.

Ноччу з 18 на 19 пры пераходзе адной з рэчкаў пад капітанам пэнкнуў лёд, ён зламаў нагу. Таварышы зрабілі яму перавязку і пакінулі ў шалашы ля смалярні, а самі вярнуліся ў Давыд-Гарадок. "Ваню" 20 лістапада ў шалашы захапіла паліцыя, якая прачэсвала мясцовасць у пошуках уцёклых з Давыд-Гарадоцкага гета яўрэяў. Яго пагрузілі на воз і прывезлі ў мястэчка.

"Бацяну" і "Азору" з дапамогай "Рыся" ўдалося раздабыць падводу і паперку ад начальніка мясцовай паліцыі, у якой сцвярджалася, што воз едзе на цагельню, а яго гаспадарам патрэбен пропуск на выезд з горада. З гэтай паперкай накіраваліся ў паліцэйскі ўчастак, каб выканаць фармальнасць. "Бацян" зайшоў у памяшканне, "Азор" застаўся пры конях. У гэты час да воза падышлі паліцэйскія і з-за цікавасці адкрылі ляжалы на ім мяшок, у ім знайшлі зброю. Адразу абшукалі "Азора" і "Бацяна".

Далей ланцужок пацягнуўся проста да "Рыся", якога адразу арыштавалі. У час вобыску ў яго кватэры былі знойдзены англійская радыёстанцыя выпуску 1942 г. і рэйкавыя міны. У той жа дзень пад вечар прывезлі "Ваню". У ходзе допытаў ні Пачкоўскі, ні астатняя тройка не прызналіся, што знаёмыя паміж сабою і падтрымлівалі якія-небудзь кантакты.

У тую ж ноч у час допыту загінуў паручнік Мечыслаў Экхардт ("Бацян"). Ён біўся з жандарамі, быў некалькі разоў паранены з пісталета і дабіты жалезным шворнам. Па другіх звестках, пакончыў жыццё самагубствам.

Праз некалькі дзён арыштаваных перавезлі ў Столін, а ў пачатку снежня -- у Пінскую турму. Як аказалася, там ужо сядзела Марыя Снапко, сястра ўжо знаёмай нам Ядзвігі Снапко. Марыю арыштавалі ў адплату за ўцёкі сястры З дапамогай падкупленых ахоўнікаў арыштаваным акаўцам удалося звязацца з мясцовай сеткай АК.

Вестка пра арышт капітана "Вані" і яго сяброў дайшла да Варшавы 15 снежня 1942 г. Адразу новым кіраўніком 3-га ўчастка быў назначаны "ціхацёмны" капітан Баляслаў Контрым ("Жмудзін"). Ён да вайны служыў афіцэрам паліцыі ў Вільні і Брэсце і добра ведаў мясцовую абстаноўку. Разам з групай суправаджэння "Жмудзін" некалькі разоў прыязджаў у Брэст, але практычна нічога не паспеў

зрабіць для ўзнаўлення баявой дзейнасці Палескага ўчастка, бо к таму часу ўжо было прынята рашэнне пра ліквідацыю "Вахляжа". "Жмудзіну" давялося абмежавацца чыста арганізацыйнымі пытаннямі па перадачы кадраў і амуніцыі ў распараджэнне штаба Палескай акругі АК.

Тым часам галоўнае камандаванне АК пачало думаць пра вызваленне вязняў Пінскай турмы. У апошні дзень снежня выкананне гэтага задання было даручана двум "ціхацёмным" -- паручнікам Яну Піўніку ("Пануραму") і Яну Рагоўскаму ("Чарцы"). Яны падабралі сабе ў памочнікі яшчэ двух "ціхацёмных" -- паручнікаў Міхаіла Фіялку ("Казу") і Вацлава Калісту ("Кра") і некалькі радавых акаўцаў. У першыя дні студзеня 1943 г. група выехала на аўтамабілі ў Брэст. Кіраваў акцыяй "Пануры".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў "ціхацёмнага", начальніка аддзела легалізацыі і тэхнічнага забеспячэння разведцэнтра АК Станіслава Янкоўскага ("Агатона"):** "Вясною 1942 г. "Чарка"-- Ян Рагоўскі -- быў прызначаны на 2-гі ўчастак "Вахляжа", якім кіраваў "Пануры"-- Ян Піўнік, яго сардэчны сябра, адзін з першых "ціхацёмных", закінутых у Польшчу. Гэты ўчастак ахопліваў вялізную тэрыторыю, роўную чвэрці Польшчы, з сямю базамі -- у Роўне, Луцку, Шапятоўцы, Бярдзічаве, Жытоміры і Кіеве.

"Пануры", разважлівы чалавек і добры арганізатар, пачаў дзейнічаць пасля азнаямлення са сваёй тэрыторыяй. Ужо ў маі група была гатова ўзарваць эшалоны на большасці чыгуначных ліній, пралеглых праз участак. Праблему аператыўнай сувязі -- асноўны варунак спраўнай дзейнасці дыверсійных групаў на вялізнай тэрыторыі -- "Пануры" вырашыў праз засылку сваіх людзей у дапаможную службу сувязі, арганізаваную немцамі з тутэйшага насельніцтва. Для забеспячэння нармальнага функцыявання і рамонту ваенных тэлефонных ліній немцы стварылі так званыя камендатуры сувязі, у якія, акрамя ваенных падраздзяленняў, уваходзілі мясцовыя жыхары -- з іх арганізоўваліся дапаможныя роты. Свая уніформа і дакументы давалі ім магчымасць без перашкодаў рухацца ўздоўж камунікацыйных ліній.

Гэта было добрым прыкрыццём для дзейнасці дыверсійных групаў. "Пануры" і "Чарка" спаўна выкарысталі такую аказію. Напрыклад, з 205 чалавек дапаможнай роты ў Роўне было 120 байцоў "Вахляжа", у тым ліку тры афіцэры-дэсантнікі, закінутыя з Англіі. Аднойчы "Пануры" і "Чарка" накіраваліся ў інспекцыйную паездку і былі затрыманы лятучай брыгадай жандармерыі, прызначанай для барацьбы супраць партызанаў.

-- Не білі нас, не катавалі,-- раскажа мне пазней "Чарка".--

-- Проста не давалі есці. Тры разы ў дзень суп з лісцяў, адзін раз кавалак сухога хлеба.

Праз тыдзень так згаладнелі, што нават перасталі думаць пра ўцёкі. Ад галоднай смерці іх уратавалі два гадзіннікі, за якія начальнік турмы згадзіўся падкарміць і далучыць да групы вязняў, што пад аховаю працавалі на лесанарыхтоўках. Абодва хутка сталі "форарбайтэрамі" (старшымі рабочымі), і паколькі добра наладзілі

працу і не білі падначаленых, пачалі карыстацца павагай зняволеных, даверам аховы. Праз два тыдні ўцяклі.

Служыць у "Вахляжы" на сваім участку яны ўжо не маглі, бо немцы іх шукалі. Пастанавілі вярнуцца ў Варшаву. Пераход на некалькі соцень кіламетраў, праз дзве моцна ахоўныя граніцы, па бездаражы і з абыходам людных месцаў, заняў болей месяца. У верасні мне пазваніла "цётка Антося" (Міхаліна Вішанеўска, удзельніца Варшаўскага падполля АК.-- Я. С.) і прапанавала спаткацца за кавай у бары "Марго". З бара на вуліцы Вспульнай мы пайшлі ў шпіталь на вуліцы Чырвонага Крыжа. "Чарка" ляжаў абяссілены, апухлы з голаду, у нарывах, з вялікай тэмпературай. У штанах, якія яму прынесла "цётка Антося", трэба было распароць калошы, бо ногі распухлі, што іх нельга было надзець.

-- Далі мне ў косці,-- усміхнуўся "Чарка", сілы для размовы не меў. Сябра таксама тут лекаваўся.

Я вырабіў для абодвух дакументы. Пілі вітаміны і хутка выздараўлівалі пад клапатлівай апекай Крыстыны Уейскай, кузіны "Чаркі". Неўзабаве пачалі выходзіць у горад.

Дзіўна, але факт: "Пануры", легендарны камандзір партызанскага згрупавання ў Свёнтакшыцкіх гарах, які з трысцінаю ў руцэ смела праходжаўся ўздоўж рыгаючага агнём нямецкага цягніка, у Варшаве адчуваў сябе няўпэўнена, баяўся. Не давяраў цеснай вуліцы, перагружаным трамваям, фальшывым дакументам. Сялянскаму сыну з Яновіцаў Апатоўскага павета ў вялікім горадзе было не па сабе. Сядзеў на кватэры і сумаваў па сапраўднай справе.

Аднак адпачывалі абодва нядоўга. У снежні 1942 г. камендант АК асабіста даверыў ім вызваленне з Пінскай турмы кіраўніка 3-га ўчастка "Вахляжа", "ціхацёмнага" "Ваню"-- Альфрэда Пачкоўскага і яго таварышаў. Заданне вельмі цяжкае. Акцыя павінна была адбыцца за 300 кіламетраў ад варшаўскай базы. Пінская турма добра ахоўвалася. У горадзе знаходзілася больш за тры тысячы ўзброеных немцаў, у тым ліку механізаваная рота для барацьбы з партызанамі".

18 снежня група "Панурага", якая складалася з 16 байцоў "Вахляжа" (9 чалавек далучылася ў Брэсце), зрабіла налёт на турму ў Пінску. Вызваліла арыштаваных польскіх афіцэраў. Гэтую аперацыю польскія даследчыкі лічаць адной з самых бліскучых баявых акцыяў усёй Арміі Краёвай не толькі на "Крэсах Всходніх", але і ў гісторыі польскага супраціўлення ў цэлым.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** **Рапарт галоўнага каменданта АК "Грота" ў польскі генштаб у Лондане: "20.11.42 г. у ваколіцы Давыд-Гарадка арыштавалі трох афіцэраў "Вахляжа", якія накіроўваліся на выкананне даручанага задання. Па майму загаду кіраўнік "Вахляжа" прыступіў да арганізацыі акцыі, каб вырваць іх з рук ворага. У палове снежня мінулага года кур'еры "Вахляжа" ўстанавілі, што арыштаваныя афіцэры знаходзяцца ў турме ў Пінску. На месцы была вывучана магчымасць іх адбіцця, устанавілі сувязь з вязнямі і паведамілі іх аб нарыхтаванай акцыі.**

18 студзеня (1943) у перадвячэрнія часы група рушыла да

турмы на двух аўтамабілях ("Форд"* і "Опель"). "Пануры" разам з трыма чалавекамі, адзін з іх у нямецкай форме, пад'ехаў да варотаў турмы. Рэшта групы пад кіраўніцтвам "Чаркі" засталася на варце ў двух пунктах ля муроў турмы. Афіцэр, які выступаў у ролі нямецкага ваеннаслужачага, патрабаваў, каб адкрылі вароты. У момант заезду на двор турмы два нашы чалавекі праслізнулі праз вароты і пачалі абяззбройваць стражніка. Ён супраціўляўся і быў забіты з пісталета. Уязныя вароты без прамаруджвання закрылі, месца забітага стражніка заняў чалавек з групы, узброены аўтаматам. Па сігналу клаксона, які падаў "Пануры", праз мур пераскочыла рэшта засталых на вуліцы людзей і маланкава прыступіла да далейшага выканання акцыі. Два чалавекі ўварваліся ў канцылярыю турмы, дзе забілі двух аказалых супраціўленне нямецкіх стражнікаў. Аднаму з нашых прастрэлілі руку. Тым часам "Пануры" разам з перадзетым у нямецкую форму афіцэрам патрабаваў адкрыцця варотаў ва ўнутраны двор турмы. Іх адкрылі. Ён раззброіў стражнікаў. Ім загадалі легчы ніцма на зямлю. Вартаваць вароты застаўся адзін з нашых людзей. Адначасова цераз унутраны мур пералезлі 4 чалавекі для падстрахоўкі на выпадак, калі б на патрабаванне "Панурага" не адчынілі ўнутраных варотаў. "Пануры" разам з некалькімі людзьмі забег у будынак турмы, раззброіў захопленых знянацку стражнікаў, здабыў ключы і адкрыў усе камеры турмы. Трох арыштаваных афіцэраў "Вахляжа" адразу правялі да чакалага ля турэмнай сцяны "опеля". Да засталых вязняў "Пануры" звярнуўся па-руску, растлумачыўшы, што яны свабодныя. Перад тым, як пакінуць турму, стражнікаў замкнулі ў камерах, папярэдзілі, што калі паднімуць трывогу, то будуць закіданыя гранатамі.

Тым часам да выязных варотаў нечакана прыйшлі турэмныя работнікі і змена стражы. Стаялы на варце наш чалавек не разгубіўся і хутка зарыентаваўся ў сітуацыі. Ён прапускае іх па чарзе і загадвае неадкладна легчы на зямлю, ліквідуе тым самым небяспечную пагрозу падняцця трывогі звонку.

Пасля таго як пакінулі турму разам з трыма вызваленымі зняволенымі, група паехала ў напрамку Брэста над Бугам. Пры ад'ездзе ад турмы трэснула шына "Опеля". Немагчыма было развіць патрэбную хуткасць. На 14 кіламетры ад Пінска вязні пераселі ў "Форд", бо рызыкоўна было накладваць новую шыну, мяняць новае кола. "Опель" аблілі на шашы бензінам і спалілі. У папярэдне падрыхтаваным месцы вязняў схавалі і забяспечылі ўсім неабходным. Праз два дні ім дапамаглі перайсці граніцу і 20 студзеня 1943 г. яны далажылі пра сваё прыбыццё ў штабе "Вахляжа". "Пануры" разам з рэштай каманды вярнуўся ў штаб на наступны дзень. Пераход граніцы быў ускладнены, бо ахову неслі двайныя нарады".

"Пануры" і "Чарка" за правядзенне гэтай аперацыі былі ўзнагароджаныя вышэйшымі адзнакамі воінскай доблесці -- крыжамі

* "Форд" -- грузавік.

Віртуці Мілітары, а 15 удзельнікаў налёту на Пінскую турму -- Крыжамі Валечных (Барацьбітоў).

Для мясцовага насельніцтва гэтая акцыя мела іншыя ўзнагароды. Трагічныя вынікі. У адплату немцы ўзялі 34 заложнікаў, у асноўным мясцовых жыхараў польскай нацыянальнасці. Праз некаторы час 30 з іх расстралялі на яўрэйскіх могілках у Іванаве.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Аб'ява на нямецкай і ўкраінскай мовах, якая была развешана ў людных месцах на Піншчыне: "18 студзеня 1943 г. былі агідным чынам замучаныя польскімі актывістамі старэйшы вахмістр Герлінгер і вахмістр Цыльнер. У адплату за гэта сёння былі расстраляны 30 польскіх заложнікаў. Пінск, 21 студзеня 1943 г. Акружаны камісар Кляйн".**

На гэтым нямецкія рэпрэсіі не спыніліся. З 6 па 10 лютага 1943 г. была арыштавана вялікая група ўдзельнікаў акаўскага падполля ў Брэсце, у тым ліку некалькі "вахляжаўцаў", задзейнічаных у пінскай акцыі. 24 чалавек адразу расстралялі, сярод іх -- начальніка штаба 3-га ўчастка паручніка Аляксандра Півале ("Плебана").

27 лютага кіраўнік "Вахляжа" Адам Грахольскі ў прысутнасці фармальнага камандзіра 3-га ўчастка "Жмудзіна" перадаў прарэджаную нямецкімі арыштамі каманду гэтага ўчастка са зброяй і амуніцыяй у распараджэнне каменданта Палескай акругі Арміі Краёвай маёра Станіслава Добрскага ("Жука").

Як і прадбачыў капітан "Ваня", акаўскі рух на Палессі, у адрозненне ад Прынямоння і Віленшчыны, не атрымаў належнага развіцця. Прычына не адныя нямецкія рэпрэсіі. У гэтым рэгіёне актыўна дзейнічалі савецкія партызаны, ваенныя фарміраванні АУН (Арганізацыя ўкраінскіх нацыянэлістаў) і УПА (Украінская паўстанцкая армія). Дзейнічалі і атрады польскай Гвардыі Людовай, якой кіравалі камуністы. Дарэчы, польскія камуністы плячо ў плячо змагаліся з беларускімі партызанамі, у гэтай сумеснай барацьбе кавалася сапраўднае братэрства па зброі.

Акаўцам на Палессі так і не ўдалося толкам развярнуцца.

Падсумоўваючы вынік дзейнасці Палескага ўчастка Арміі Краёвай, трэба адзначыць: сваёй галоўнай задачы, звязанай з прыкрыццём польскага паўстання ад немцаў і Саветаў, яго каманда не выканала. У гэтым няма віны людзей, якім загадалі ўзяцца за загадзя асуджаную на правал справу. Яны ўнеслі сваю долю ў агульную справу вялікай Перамогі, многія заплацілі за гэта крывёю, а хтосьці і жыццём. Мы абавязаны памятаць пра гэта.

## "ВАХЛЯЖ". УЧАСТАК 4. МІНСКІ КІРМАШ

Бадай, самым важным па сваім стратэгічным значэнні для камандавання ЗВЗ -- АК з'яўляўся 4-ы ўчастак. У адпаведнасці з "планам прыкрыцця", які прадугледжваў затрымку ва Усходняй Беларусі як немцаў, так і Саветаў на выпадак шырокага польскага ўзброенага паўстання, дыверсіі намячаліся ў трохвугольніку "А"

(Мінск -- Орша -- Жлобін) і ў трохвугольніку "Б" (Полацк -- Невель -- Віцебск).

Перакідныя базы для руху на Усход планавалася размясціць у былым Навагрудскім ваяводстве і ў Гародні. Але жыццё часцяком абвяргае самыя прадуманыя і падрабязныя планы. Першай няўдачай штаба "Вахляжа" на 4-ым участку з'явілася тое, што ён пачаў "абжывацца" як мінімум на паўгода пазней намечанага. Гэта было звязана з афёрай палкоўніка "Мядзведзя".

Справа "Мядзведзя" падрабязна разглядаецца ў працы Цэзарыя Хлябоўскага, дзе прыведзены шматлікія дакументы, сведчанні і ўспаміны відавочцаў, версіі, здагадкі і меркаванні. Але многае ў важнай гісторыі і да цяперашняга часу застанецца няясным. Нам невядома сапраўднае прозвішча палкоўніка -- польскія даследчыкі яго не называюць у сувязі з тым, што яшчэ і па сёння жывуць сямейнікі "Мядзведзя". Коратка паведамляецца, што ён удзельнічаў у савецка-польскай вайне 1920 г., у 1928/34 гадах камандаваў пяхотным палком, потым падаў у адстаўку. У час вераснёўскай кампаніі 1939 г. абараняў Варшаву, быў паранены. Ніхто дагэтуль не ведае, якім чынам палкоўніку ўдалося звязацца з кіраўніцтвам "Вахляжа".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З дакладной запіскі палкоўніка Адама Грахольскага ("Доктара"), якая падрыхтавана ў кастрычніку 1942 г. і носіць назву "Справа 3": "Восенню 1941 г. кіраўніцтва 18 (першая кодавая назва "Вахляжа".—Я. С.) атрымала звесткі, што "Мядзведзь" з'яўляецца камандзірам тайнай вайсковай арганізацыі.**

**"Мядзведзь" патлумачыў, што яму падпарадкоўваецца тайная ваенная арганізацыя ў Генеральнай губерні і на "Крэсах Всходніх" (Беларусь, Гродзеншчына, Навагрудчына — да Полацка і Стоўбцаў). Яна вельмі магутная, налічвае тысячы людзей... Паводле яго слоў, у арганізацыі багата афіцэраў штабных і нештабных, яны яму давяраюць і безагаворачна падпарадкоўваюцца.**

**"Мядзведзь" пачаў супрацоўнічаць з 18, пра што было вядома галоўнакамандаванню... Атрымаў высокае прызначэнне кіраўніка 4-га ўчастка.**

**Праз некаторы час "Мядзведзь" прадставіў мне З. (маёр Зыгмунт Рэлішка.— Я. С.) як свайго намесніка. Пачалася праца "Мядзведзя" і Зыгмунта як кіраўніка ўчастка 4".**

У сакавіку 1942 г. "Мядзведзь" у сваім рапарце ў цэнтр сігналізаваў пра магчымасці прывесці ў баявую гатоўнасць 2000 кавалерыстаў, 4000 пехацінцаў, 800 артылерыстаў, 1800 чалавек з іншых радоў войск, усяго 8600 чалавек. І зразу патрабаваў на ўтрыманне сваёй арганізацыі 133025 злотых (па сведчанню прафесара Хлябоўскага, агульны бюджэт "Вахляжа" ў той час складаў 170000 злотых).

У красавіку маёр Зыгмунт Рэлішка далажыў "Доктару", што "пад пэўным націскам" адабраў касу ад "Мядзведзя", бо "вялася яна няправільна". А калі называць рэчы сваімі імёнамі, то "Мядзведзь" у асабістых карысных мэтах дапускаў буйныя фінансавыя злоўжыванні, што і пацвердзіла спецыяльнае расследаванне.

Горш таго. Аказалася, што ніякай арганізацыі "Мядзведзя", якую штаб лічыў асновай 4-га ўчастка на Усходзе, проста не існуе. Усе росказні пры тысячы "верных і падрыхтаваных людзей"-- чысты блеф. "Насуперак ілжывым рапартам пра казачны стан арганізацыі (колькасны склад і ўзбраенне),-- адзначаецца ва ўжо цытаванай службовай запісцы "Доктара",-- падаваным камендантам тутэйшых тэрыторыяў, на поўначы Белай Русі мы сутыкнуліся з выразнай нелаяльнасцю да пальшчызны і нас. Рапарты аказаліся хлуслівымі. Камендант аддадзены пад суд".

Сапраўды, справу палкоўніка "Мядзведзя" накіравалі ваеннаму пракурору, але ніякага пакарання "Мядзведзь" не панёс, бо знайшоў прыстанішча ў шарэнгах Нацыянальных узброеных сілаў (НСЗ)-- крайне рэакцыйнай, нацыяналістычнай арганізацыі пілсудчыкаў. Яго месца заняў маёр Зыгмунт Рэлішка.

Паспрабуем прааналізаваць, хто ж такі палкоўнік "Мядзведзь", чаму ўтойваецца яго прозвішча?

Малюначак высвеціцца непрывабненькі. Той малюнак, які пасляваенныя разумныя даследчыкі Польшчы нездарма старанна ўтойваюць. Бо назаві прозвішча, і ўсе знаёмцы палкоўніка будуць доўга смяяцца. Яны ведаюць гэтага чалавека, звычкі, характар.

Дык хто ж "Мядзведзь"?

Адзін з тых упэўненых, валявых, разумных верхаглядаў, мноства якіх напладзілася ў Польшчы пасля 1920 года. Вусы, прыгажосць твару, карэктнасць, галантнасць, жыцейская пракіднасць, гонар -- і пустата ўнутраная, безадказнасць. Бярэцца такі пазёр за што хоча. Абяцае шмат.

Адзін з тых, хто і давёў Польшчу да развалу шмат стагоддзяў таму, два стагоддзі таму, у гэтым стагоддзі.

Палкоўніка "Мядзведзя" можна параўнаць з некаторымі даваеннымі савецкімі будзёнаўцамі: вусы, адвага, павярхоўнасць. Сам бязграматны, а бярэцца за любую справу. Пра вынікі не думае. У заварушны час "Мядзведзь" вырашыў пасмакаваць жыцця. Піў, гуляў, кіраваў.

Фініш заканамерны. Нават польскія даследчыкі яго прозвішча не ўспамінаюць.

А за два месяцы да выкрыцця аферы палкоўніка "Мядзведзя" штабу "Вахляжа" ўладарна напомніў пра сябе Лондан. (Колькі хваленых рапартаў пайшло па інстанцыях! Няспраўдзіліся надзеі. Прапалі вялікія грошы).

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ З загада генерала Сікорскага № 499 ад 5.02.1942 г.: "Генералу Каліна (Стэфан Равецкі--Я. С.)**

**З пункту гледжання на агульнае палажэнне неабходна ўзмацненне дыверсійна-сабатажных акцыяў з мэтай перапынку руху нямецкіх эшалонаў на Усход.**

**Цяпер, у пік падрыхтоўкі немцаў да наступлення на Усходзе, як і ў часе самога наступлення, Армія Краёва мусіць паказаць асаблівую актыўнасць і прынесці непрыяцелю як мага больш шкоды. Да гэтага нас абавязвае саюзніцкі абавязак.**

Услед з інструкцыяй 1340 загадваю вам, пан генерал:

1) Падтрымліваць у павышаным напружанні сабатажныя дзеянні на ўсёй тэрыторыі Польшчы.

2) На абшарах на ўсход ад польскай граніцы распачаць дыверсійна-сабатажныя дзеянні як можна ў большым маштабе.

3) Асабліва важна правесці моцныя акцыі:

а) у раёне 2. На лініі Карасцень — Жытомір — Кіеў;

б) у раёне 4. На вузле Мінск і адрэзках Мінск — Барысаў і Мінск — Бабруйск;

в) на вузле Полацк і адрэзках лініі Полацк — Віцебск і Полацк — Вялікія Лукі;

г) у раёне 5. На вузле Дзвінск і лініі Дзвінск — Пскоў, а таксама Дзвінск — Полацк.

Аб ходзе выканання дакладваць.

Вярхоўны галоўнакамандуючы Сікорскі. Генерал броні".

Са зместу загада бачна, генерал Сікорскі хацеў паказаць і англічанам, і савецкаму боку, што на Усходзе польскае галоўнакамандаванне мае ў наяўнасці неабходныя сілы і сродкі для правядзення эфектыўных дыверсіяў: асабліва на 4-ым участку. На самай справе ўсё было наадварот. Як мы ўжо ведаем, палкоўнік "Мядзведзь", запэўніваючы сваіх начальнікаў, што на Усходзе яму падпарадкоўваецца добра заканспіраваная і падрыхтаваная да дыверсіяў нелегальная сетка, проста ўводзіў іх у зман. Ілюзіі (на яве хлусні) паверылі польскія штабісты.

4-ы ўчастак на той момант да баявых дзеянняў быў зусім непадрыхтаваны. Загад Сікорскага паступіў акурат тады, калі штаб "Вахляжа" поўнасцю пераканаўся: запэўненні "Мядзведзя", што тут вялікая арганізацыя, мноства сваіх людзей, аказаліся блефам. Загад і сама афера засталі кіраўніцтва "Вахляжа" неспадзеўкі.

Пачаўся ліхаманкавы пошук выйсця. Не маглі ж паведаміць Сікорскаму, што заданне зрываецца, бо яны слаба працуюць, больш гавораць, чым робяць. Што іх рапарты былі хлуслівыя, бо, ці бачыце, ашукаў "Мядзведзь".

У выніку спешна нарадзіўся план шырокамаштабнай, адчаяннай акцыі пад назвай "Мінскі кірмаш". Ставілася мэта серыяй дыерсіяў на чыгунках вакол Мінска на нейкі час поўнасцю ізаляваць важны чыгуначны вузел. Аперацыі надавалася надта велізарнае значэнне. Ёю ўзяўся кіраваць сам Адам Грахольскі. Ён выехаў на тэрыторыю Беларусі.

Усяго ў "Мінскім кірмашы" было задзейнічала каля 30 чалавек, большасць афіцэраў, у тым ліку 4 "ціхацёмныя", "Троп", "Міра", "Мак" і "Кшэмень".

**БЫЛО ГЭТА ТАК.** З успамінаў Станіслава Янкоўскага ("Агатона"): "У канцы красавіка 1942 г. было вырашана правесці пробную акцыю. На працягу адной ночы чатыры групы павінны былі пусціць пад адхон там чатыры цягнікі. "Джуль" (Богдан Пёнткоўскі, ён жа "Мак".--Я. С.) быў прызначаны кіраўніком акцыі і адначасова кмандзірам адной з групаў. Другую групу ўзначаліў "Міра". Меліся

ехаць (з Варшавы.--Я. С.) некалькі чалавек на аўтамашыне ў якасці тэхнікаў і рабочых будаўніцкай фірмы, якая абслугоўвала авіякаманду "Масква", а сама знаходзілася ў Мінску. Я зрабіў для "Джуля:"канкарту (пасведчанне асобы ў часе нямецкай акупацыі.--Я. С.), іншыя неабходныя дакументы на прозвішча Станіслава Карпіньскага. Ён папрасіў мяне здабыць і камандзіровачнае пасведчанне з адпаведнымі пячаткамі. І гэта было зроблена. Доўга насміхаліся мы з гітлераўскай пячаткі:

-- Бач ты на іх, авіякаманда "Масква"-- ці не занадта рана...

Павінны былі адправіцца на грузавой аўтамашыне, якую вёў нямецкі вайсковы шафёр, спецыяльна падкуплены для гэтага "падарожжа". Аўтамабіль быў заладваны толлю і бочкамі са смалой, а ў смале -- зброя, амуніцыя і ўзрыўчатыя матэрыялы.

Пазней "Міра" ўспамінаў:

**Да Буга мы даехалі без усялякіх прыгодаў. Нямецкія патрулі на ваенную машыну ніякай увагі не звярталі, увесь кантроль абмяжоўвася адно праверкаю дакументаў вадзіцеля. І толькі на мосце, перад заездам у Брэст, пагранічны нарад на чале з афіцэрам гестапа старанна і ўважна абшукаў нас, праверыў дакументы... Адзін наш хлопец за тое, што ў часе вобыску трымаў у роце цукерку, быў пабіты і прыніжаны. На тым наша прыгода скончылася і мы спакойна прыехалі ў Брэст.**

Вярнуліся праз тыдзень. Усе чатыры групы выканалі вызначаныя заданні без стратаў у людзях. Аднак рух на чыгуначных лініях быў спынены ўсяго на некалькі гадзінаў. У немцаў былі сапёрныя каманды на аўтадрэзінах, яны хутка праводзілі рамонт".

Трэба адзначыць, не для ўсіх удзельнікаў акцыі "Мінскі кірмаш" закончыўся паспяхова. Група Мірона Закер-Акшаноўскага рашыла зрабіць перадышку на базе "Вахляжа" ў Нясвіжы. Яны трапілі сюды акурат у той час, калі немцы лавілі мясцовых жыхараў для пасылкі на прымусовыя работы. У час праверкі дакументаў былі затрыманы Войцэх Вішнеўскі, Збігнеў Крысевіч і Генрых Рацкі. Праз некалькі дзён у ліку 170 падазроных арыштаваных іх павялі на расстрэл пад маёнтак Малева ля вёскі Малева непадалёку ад Нясвіжа. Уцячы ўдалося аднаму Крысевічу. Праз дзён колькі, зусім хворы, ён даплёўся на гродзенскую базу.

Камандзір групы Закерт-Акшаноўскі са сваім напарнікам (прозвішча невядома) у часе аблавы сутыкнуўся з самім бургамістрам Нясвіжа Калошам і сказаў, што прыехаў сюды ў пошуках маці, аднак дапусціў пралік -- назваў адрас кіраўніка нясвіжскай базы Нуркевіча. Праўда, апошняга змаглі своечасова папярэдзіць пра небяспеку, і ён паспеў уцячы ў лес літаральна за некалькі хвілінаў да прыходу жандармерыі. З гэтага часу функцыі кіраўніка нясвіжскай пляцоўкі пачаў выконваць падхарунжы Урублевіч. А Закерт-Акшаноўскі, хоць і "засвяціў" Нуркевіча, сам з таварышам шчасліва пазбегнуў арышту, падаўся на базу ў Ліду, а адтуль найхутчэй вярнуўся ў Варшаву.

Адразу пасля аперацыі "Мінскі кірмаш" кіраўніцтва "Вахляжа" імкнулася навярстаць упушчанае ў сувязі з аферай палкоўніка

"Мядзведзя", ліхаманкава распачало падрыхтоўку новых базаў 4-га ўчастка для дыверсіяў ва ўсходнія раёны Беларусі. Пачынаць гэтую работу ім не прыйшлося на голым месцы.

Яшчэ ў 1941 г., да ўстанаўлення сувязі са штабам "Вахляжа", маёр Зыгмунт Рэлішка па сваёй уласнай ініцыятыве выслаў двух чалавек для пошукаў кантактаў з асноўнай (ці ствараная) за Бугам польскай канспіратыўнай арганізацыяй. Адзін з хадакоў, Пётр Моська, пранік даволі далёка на Усход. Прабіраўся ён без усялякіх дакументаў, ледзь не за нямецкімі часцямі, па тэрыторыях, дзе непадзельна гаспадарыла нямецкая ваенная адміністрацыя прыфрантавых арміяў, калі яшчэ і ў паміне не было хоць якіх-небудзь правілаў акупацыйнага рэжыму аб парадку перамяшчэння.

Па прыбыцці ў Гродна выйшаў на сувязь з удзельнікам даваеннай польскай канспірацыі Казімірам Маркоўскім і накіраваў яго ў Варшаву па адпаведныя інструкцыі, а сам паехаў цераз Ваўкавыск у Баранавічы, потым -- Гарадзею. Тут пры Саветах хаваўся да чэрвеня 1941 г. ад органаў НКУС брат варшаўскага інжынера Яна Кашарскага ("Бялага")-- будучага гаспадара канспіратыўнай кватэры 4-га ўчастка ў Варшаве па вул. Шпітальнай, 10 -- Станіслаў Кашарскі, ротмістр 26-га уланскага палка, які да верасня 1939 г. дыслацыраваўся ў Баранавічах. Станіслаў таксама атрымаў загад прыехаць у Варшаву. Забягаючы крыху наперад, адзначым: Кашарскі выканаў загад. Прайшоў перападрыхтоўку на кароткатэрміновых дыверсійных курсах у Варшаве, вярнуўся на ранейшае месцажыхарства з заданнем арганізаваць у Гарадзеі дыверсійную групу.

Тым часам Пётр Моська падаўся ў Мінск. Шукаў каго-небудзь, хто праінфармаваў бы яго магчымасць "зачапіцца" ў сталіцы, правяраў шанцы для расквартаравання дыверсійных групаў. Але ў зруйнаваным і вынішчаным Мінску Моська нічога канкрэтнага не знайшоў. Адтуль на спадарожнай вайсковай машыне ён накіраваўся ў Маладзечна, пасля ў Полацк. Упэўніўшыся, што ўсе атрыманыя ў Варшаве яўкі не дзейнічаюць, згаладнелы настолькі, што ледзьледзь ногі цягаў, вярнуўся дамоў па ўжо пракладзенаму шляху -- праз Баранавічы і Гродна.

У лістападзе 1941 г. на тэрыторыю 4-га ўчастка непасрэдна па заданню штаба "Вахляжа" прыбылі трое -- ужо знаёмыя Пётр Моська і Казімір Маркоўскі, а таксама Баляслаў Лапінскі. Усе трое --выхадцы з "крэсаў", добра ведалі мясцовую спецыфіку, мелі багата знаёмых па вучобе, харцэрскіх гульнях, вайсковай службе ў паўночна-ўсходніх гарнізонах. Гэтая акалічнасць аблягчала ім вядзенне падпольнай работы.

Арганізацыя базы "Вахляжа" ў Гродне пачалася са згуртавання некалькіх былых харцэраў, а закончылася, пад восень 1942 г., стварэннем буйной падпольнай ячэйкі прыкладна з 30 чалавекаў. Галоўная заслуга ў гэтым Казіміра Маркоўскага. Ён удзельнічаў у вераснёвай кампаніі 1939 г. Пасля паражэння вярнуўся на радзіму, у Гродна. Ранняй вясной 1940 г. на свой страх і рызыку перайшоў савецка-нямецкую граніцу, у Варшаве скантактаваўся з маёрам

Рэлішкам, уступіў у ЗВЗ, закончыў курсы падрыўнікаў і атрымаў загад вярнуцца ў Гродна для наладжвання падпольнай барацьбы з Саветамі.

З пачаткам Вялікай Айчыннай сувязь паміж Маркоўскім і Рэлішкам, дзякуючы Пятру Моську, узнавілася. Маркоўскі зноў пабываў у Варшаве і атрымаў заданне стварыць у Гродне перакідны пункт на трасе Варшава -- Малкіня -- Ліда -- Маладзечна.

Першапачаткова за гэтую справу ўзяліся чатыры сям'і: Маркоўскія, Аўчаркі, Сяміньскія, Віткевічы -- і некалькі чалавекаў іх блізкіх і знаёмых. База стваралася пад відам майстэрні па вырабу дзіцячых цацкаў. Майстэрню абсталявалі ў доме Браніслава Кміты. Усе яе работнікі прынялі прысягу на вернасць ЗВЗ. Сярод іх брат і сястра Казіміра Маркоўскага -- Іларыён і Ядзвіга, Галіна Сяміньска-Унук, Ядзвіга Гнядко, Глеб Міхайлаў, Мар'ян Віткевіч, Мечыслаў Лада і іншыя. У асноўным усе юнакі і дзяўчаты, усе даваенныя харцэры.

Яшчэ да пачатку зімы перавалачны пункт у Гродне быў падрыхтаваны для прыняцця вялікіх партый людзей. Для штаба "Вахляжа" ён меў найважнешае значэнне, бо з восені 1941 г. Беластоцкую вобласць (Бэцырк Беласток -- Акруга Беласток), у тым ліку і Гродна, далучылі да Усходняй Прусіі. Такім чынам, самая кароткая дарога на ўчастак 4, а потым і на ўчастак 5 была перасечана тэрыторыяй, далучанай да рэйха, а таксама дзвюма граніцамі: паміж Генеральнай губерняй і Усходняй Прусіяй, Усходняй Прусіяй і Генеральнай акругай Беларусь -- прыкладна ў раёне Астрыны -- Шчучына.

У выніку паездкаў братоў Маркоўскіх у Вільню для збыту прадукцыі майстэрні быў пратораны шлях, якім потым карыстаўся і пяты ўчастак. Праўда, у адной з такіх паездкаў Іларыёна Маркоўскага моцна збілі нямецкія пагранічнікі. Назаўтра браты вырашылі не вазіць размалёваныя лялькі ў Вільню, а лепш адкрыць уласны магазін у Гродне.

У новую краму паставілі свайго чалавека -- Вітольда Карэйву. Потым нанялі яшчэ адзін будынак у цэнтры горада. Ён меў тры выхады на тры вуліцы і быў ідэальным месцам для канспіратыўных сустрэчаў. У любы момант тут маглі спыняцца кур'еры "Вахляжа".

Гродзенскі асяродак развіваўся хуткімі тэмпамі. Маркоўскі вербаваў усё новых і новых людзей сярод былых гродзенскіх харцэраў. Асабліва прыдатнымі для падпольнай работы аказаліся Ян Сяміньскі, Бярнард Грывач і Ян Аўчарэк. Іменна яны, дзякуючы працы ў трансагенцтве немца Кунтэра, мелі неабмежаваныя магчымасці перамяшчэнняў па Акрузе Беласток.

Потым прыбылі яшчэ свежыя сілы: былы падафіцэр з 76-га пяхотнага палка Міхаіл Крыгчыньскі, Станіслаў і Мар'ян Віткевічы -- машыністы паравоза, яны часта курсіравалі па лініях Гродна -- Ліда, Ліда -- Вільня. Крыху пазней да іх далучыўся яшчэ адзін машыніст -- Юзэф Рымкевіч, з ягонаю дапамогай на Усход былі перакінуты многія жаўнеры "Вахляжа". Каштоўныя паслугі пачаў аказваць кіраўніцтву базы завербаваны Маркоўскім супрацоўнік бюро Гродзенскага ландрата Вацлаў Залеўскі -- здабываў пропускі

і пашпарты для патрэбаў арганізацыі. Асяродак у горадзе над Нёманам паступова набываў характэрныя рысы баявой дыверсійнай арганізацыі.

Пасля курса навучання ў Варшаве Станіслаў Кашарскі аб'явіўся ў Нясвіжы ў маі 1942 г. Да таго часу тут ужо дзейнічала мясцовая арганізацыя АК, ёю кіраваў былы падхарунжы 27-га уланскага палка Здзіслаў Нуркевіч ("Бліскавіца", "Ноч", "Нячай"). Кашарскі, наколькі гэта было магчымым па ўмовах канспірацыі, азнаёміў яго з планамі "Вахляжа". Пачалася сумесная нелегальная работа, да якой была прыцягнута добра арганізаваная нясвіжская ячэйка, у тым ліку сын Нуркевіча з такім жа імем, як і бацька (сувязны), а таксама былыя падафіцэры 27-га (Баранавіцкага) уланскага палка -- старшыя вахмістры Стэфан Марціноўскі, Уладыслаў Лушчак, вахмістры Ян Арцішэўскі, Цыпрыян Несцярук, сяржант Міхаіл Шымчык, капітан запасу з таго самага палка Шаблеўскі, сувязная Ева Грынкевіч.

Як мы ўжо ведаем, пасля аперацыі "Мінскі кірмаш" нясвіжская група засталася без свайго кіраўніка. Ён, каб пазбегнуць арышту, уцёк партызаніць у лес. Ядро групы заставалася на месцы. У хуткім часе, восенню 1942 г., гэтай "пляцуўцы" выпадзе адыграць вельмі важную ролю этапна-транзітнага пункта для перакідкі дыверсійных групаў "Вахляжа" ў Мінск, а таксама стаць базай для захоўвання зброі і выбуховых рэчываў, прызначаных на ўсходні накірунак.

Пад восень нясвіжскі асяродак папоўніўся яшчэ вахмістрам з 27-га уланскага палка. Гэта быў Юзэф Лянчэўскі, які ў мясцовасці Гараймоўшчына каля Стоўбцаў кіраваў мясцовай ячэйкай АК. З яго дапамогай адшукалі ў лесе пад Стоўбцамі закапаныя ў часе выправы на "Мінскі кірмаш" 2 бочкі пораху. Іх адкапалі, даставілі ў Гараймоўшчыну і падзялілі на дробныя партыі, расфасавалі. Ішла актыўная падрыхтоўка для вылазкаў у трохкутнік "А": Мінск -- Орша -- Жлобін.

Так развіваліся падзеі ў двух, асвоеных да таго часу, крайніх пунтах 4-га ўчастка -- Гродне і раёне Нясвіж -- Стаўбцы. Ну, а камандзір Зыгмунт Рэлішка асталяваўся ў Лідзе. Нястомны Пётр Моська адшукаў для свайго шэфа надзейную кватэру, і той пераехаў у Ліду ў канцы мая 1942 г. Ён добра ведаў "крэсы", бо з 1919 г. да 1935 г. служыў у Гродне, у штабе корпуса. Як падаў у адстаўку, працаваў у дзяржаўным упраўленні фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, што давала магчымасць часта бываць па службовых справах практычна ва ўсіх рэгіёнах Заходняй Беларусі, у тым ліку ў Лідзе. Так што Рэлішка тут пачуваўся сваім чалавекам. Праўда, як сведчаць дакументы тых часоў, ён не спяшаўся актыўнічаць.

Услед за маёрам Рэлішкам у Ліду прыбыў ротмістр "Цыган" з часткай групы. Трэба адзначыць, што ротмістр (сапраўднае прозвішча Уладыслаў Казлоўскі) быў таксама з немалым жыццёвым вопытам. Родам ён з Брэста, у час савецка-польскай вайны 1920 г. быў ад'ютантам генерала Сікорскага. У міжваенне займаўся адвакатураю. У часе прыезду ў Ліду яму было дзесьці каля 50 гадоў. Пасля некалькіх дзён адпачынку пераехаў у Бакшты, дзе для яго было вызначана пастаяннае месца пражывання.

Праз тыдзень пасля "Цыгана" маёру Рэлушку далажыў аб сваім прыбыцці падпаручнік Януш Міхель, недавучаны студэнт ветэрынарнага факультэта, але з фальшывым дыпломам фельчара на імя Дарыуша Жаброўскага. Разам з ім прыехала жонка-медсястра. Прадставіліся галоўнаму ўрачу Лідскага павета і па дамоўленасці з ім аселі медыкамі ў 6 кіламетрах ад станцыі Юрацішкі.

У чэрвені прыбылі з Варшавы капрал Станіслаў Габрысяк ("Яцэк") са спадарожнікам "Здзіхам" (прозвішча невядома). Абодвух Рэлішка накіраваў у Бакшты, у распараджэнне ротмістра "Цыгана". Яшчэ праз некаторы час да іх далучыўся Мацей Бітнер -- сын будучага камандзіра 9-й дывізіі АК генерала "Халькі".

Такім чынам, у канцы чэрвеня спецыяліст па дыверсіях падпаручнік Януш Міхель пачаў лекаваць як фельчар, а ў свабодны час рыхтаваў 2 групы мінёраў. Па 6 чалавек у кожнай, людзі былі з асяродка Бакшты -- Юрацішкі.

У чэрвені і ліпені група ротмістра "Цыгана" прыступіла да дыверсійных акцыяў на чыгунках Ліда -- Маладзечна і Баранавічы --Мінск. Ёй удалося прыцягнуць да супрацоўніцтва супраць немцаў начальніка мясцовай беларускай паліцыі разам з яго падначаленымі -- каля 30 чалавек. Палякаў адразу стала ледзь не ўдвая меней сярод падпольшчыкаў, але групы лічыліся польскімі.

Абжываць трохкутнік "Б" прыбылі з Варшавы яшчэ два афіцэры "Вахляжа" -- Ежы Банасікоўскі ("Мундэк") і Пётр Матылевіч ("Кшэмень"). Яны аселі ў ваколіцах Міёраў, дзе захавалася ніштаватая польская праслойка. Пачалі работу па двух накірунках -- разведка і падрыхтоўка кадраў. Вопытныя разведчыкі адразу зразумелі, што прыбылым з Генеральнай губерні людзям тут асталявацца будзе неймаверна цяжка, і адразу ж адмовіліся ад прысылкі новых барацьбітоў. Парашылі ствараць дыверсійныя групы з мясцовай моладзі, якая не была на падазрэнні ў паліцыі і добра ведала тутэйшыя мясціны. Тым больш што добраахвотнікаў хапала.

Праз два месяцы баявы шкілет пляцоўкі "Б" ужо існаваў. У ёй было прыкладна 40 чалавек, падзеленых на сем групаў, яны знаходзіліся ў Міёрах, Друі, Лявонпалі, Дзісне, Глыбокім і Крулеўшчызне. Падрыхтоўку завербаваных праводзіў "Кшэмень".

Тым часам "Мундэк" пры дапамозе прыцягнутых да супрацоўніцтва палякаў-чыгуначнікаў з Полацка разведваў масты, раз'езды, інтэрвалы руху паяздоў на лініях Полацк -- Пскоў і Полацк -- Невель. Некалькі паездкаў у Полацк у форме чыгуначніка пацвердзілі магчымасць размяшчэння тут людзей "Вахляжа" і дазволілі зрабіць малюнкі мастоў, зарыентавацца ў сістэме аховы чыгункі. Можна было прыступаць да правядзення дыверсійных акцыяў, але перашкаджала тая ж самая прычына, што і на другіх участках -- не было выбуховых рэчываў. Каб не сядзець склаўшы рукі, вырашылі пачаць сабатаж на чыгунцы пры дапамозе механічных пашкоджанняў чыгуначнага палатна.

Ад ліпеня да верасня групы трохкутніка "Б" 10 разоў разбуралі палатно, сцягвалі рэйкі і прыкладна столькі разоў спілоўвалі слупы ваенных тэлефонных ліній.

З цэнтра па-ранейшаму звесткаў не было, міны ніхто не дастаўляў.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Ежы Банасікоўскага:** "Наш энтузіязм, гэта значыць мой і "Кшэменя", быў паралізаваны адсутнасцю сувязі з Мінскам, Лідай і Варшавай. Восенню 1942 г. нечакана заявіўся на "маліну" ў Місьніках Януш Скальскі ("Пеця Вагін"). Ад яго даведаўся пра кадравыя перастаноўкі ў Мінску і Лідзе. З большага я прадставіў яму нашу сітуацыю і папрасіў наладзіць больш цесныя кантакты з кіраўніцтвам 4-га ўчастка, даставіць выбуховыя матэрыялы і аказаць фінансавую дапамогу. Былі мы без грошай, жылі за кошт патрыятычна настроеных нашых гаспадароў. Януш паехаў. Далейшы збег выпадкаў у Мінску не дазволіў яму аднавіць з намі кантакты. Мы па-ранейшаму заставаліся ў адзіноце, адсечаныя ад цэласці "Вахляжа".

Тым часам я пабываў з "Кшэменем" у Полацку, каб пераканацца ў праўдзівасці рапартаў нашых чыгуначнікаў. Адсутнасць кантактаў з цэнтрам дзейнічала нам на нервы. Жылі ў прадчуванні нядобрага. Пачалі шукаць нашых калегаў з 5-га ўчастка. Два разы пабывалі ў Латвіі. Пятрусь Кшэмень у пошуках кантактаў з 5-ым участкам дабраўся да Даўгаўпілса.

На жаль, на такія кантакты мы не выйшлі. Пачалі шукаць кантакты з мясцовай сеткай АК.

Беларуская паліцыя папярэдзіла, што данясе на нас немцам.

Вырашылі любой цаной дабрацца да Вільні, каб на месцы даведацца, што сталася з "Вахляжам". У пошуках кантактаў з мясцовай АК выявілася, што ўжо доўгі час знаходзімся пад яе наглядам, тыя падазравалі нас правакатарамі і нават хацелі ліквідаваць.

Пасля многіх намаганняў устанавілі кантакт з Вільняй, у выніку шчаслівага збегу акалічнасцяў (мяне пазнаў па фотаздымку маёр Ярэма*, пазнейшы мой начальнік), справа пайшла латва. Мы атрымалі новыя фальшывыя дакументы і загад з`явіцца на даклад да Вілька**, камандуючага акругі АК".

Між іншым у сваім рапарце ў цэнтр маёр Рэлішка ўпікаў "Мундка" за самавольную адлучку і невыкананне даручанага задання. Справа гэтая дыскутавалася паміж імі ў пасляваенны час, але, вядома, кожны з іх застаўся пры сваёй думцы. Што датычыць трохкутніка "Б", то ні штаб "Вахляжа", ні кіраўніцтва 4-га ўчастка чамусьці не захацелі (ці не змаглі) выкарыстаць падрыхтаваную "Мундкам" і "Кшэменем" групу для дыверсіяў, намаганні мясцовых барацьбітоў засталіся нявыкарыстанымі.

Прыкладна такі самі лёс напаткаў базу ў Гродне. У кастрычніку 1942 г. яна канчаткова страціла сувязь са штабам "Вахляжа" і пачала дзейнічаць па ўласнай ініцыятыве. Былі створаныя дзве дыверсійныя групы. Першая акцыя прайшла пад кіраўніцтвам Казіміра Маркоўскага -- узарвалі рэйкі на лініі Гродна -- Маладзечна, выкарыстаўшы

---

* Чэслаў Дэмбіцкі.

** Аляксандр Кжыжаноўскі.

куплены ў немцаў па спекуляцыі тратыл. Быў пушчаны пад адхон нямецкі эшалон і на паўсутак спынены рух цягнікоў.

У канцы лістапада і пачатку снежня гэтая ж група ўзарвала паравоз і некалькі вагонаў з вугалем і дровамі пад Лідай. Другая група, узначальваная Янам Аўчарэкам, выканала падобную дыверсію на чыгунцы Гродна -- Вільня, ля станцыі Парэчча.

Зімой 1942/43 гг. у сувязі з адсутнасцю кантакту з цэнтрам Гродзенская база спыніла сваё існаванне. Дыверсійныя групы прадаўжалі дзейнічаць, асабліва актывізаваліся з прыходам вясны. Большасць людзей заставалася ў горадзе, а частка выйшла ў лес пад Парэчча і стварыла там невялікі партызанскі атрад, якім кіраваў Бярнард Гжывач ("Бэрка"). Пачыналася новая старонка ў гісторыі Арміі Краёвай на Беларусі -- партызанская.

Нам думаецца, няўважлівасць кіраўніцтва "Вахляжа" да гродзенцаў тлумачыцца звычайным чыноўніцкім бюракратызмам. Рукі не даходзілі.

## "ВАХЛЯЖ". УЧАСТАК 4. МІНСКАЯ ТРАГЕДЫЯ

Восенню 1942 г. пачалося асталяванне трохкутніка "А" з базай для вылазкаў у Мінску. Першы кур`ер з Варшавы, які па заданню маёра Рэлішкі ўпершыню пабываў у акупаванай беларускай сталіцы, быў Пётр Моська. Як мы памятаем, сваю першую выправу на Беларусь ён зрабіў амаль год таму па трасе Малкіня -- Гродна -- Ваўкавыск -- Баранавічы -- Гарадзея -- Мінск. Успамінаў пра тое першае падарожжа Пятра не засталося. Вядома толькі, што яму ў Мінску не ўдалося завязаць ніякіх кантактаў. Але ў архіве Ваенна-гістарычнага інстытута ў Варшаве захоўваецца рапарт (май 1942 г.) аднаго з кур`ераў "Вахляжа" (прозвішча невядома), які прыязджаў у Беларусь праз паўгода пасля Моські.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарта невядомага кур`ера АК. "За Стоўбцамі пачынаецца іншы свет. Дарога з цвёрдым пакрыццём абрываецца і аж да Койданава, першай савецкай вёскі (мястэчка.-- Я. С.) здаецца зусім дзікім, незаселеным краем, сярод густых некранутых бароў. Для паездкаў на аўтамабілі дарога ні ў якім разе непрыгодная. Па абодвух яе баках ляжыць суцэльная сцяна разбітай, пакрытай іржою нямецкай тэхнікі. Гэта адрэзак дарогі рабіў найбольшае ўражанне -- яе з пункту гледжання на акаляючы пейзаж, так і з пункту гледжання на магчымую сустрэчу з партызанамі. Пра існаванне апошніх нас папярэджвалі на кожным кроку. Калі мы пыталіся ў нямецкіх паліцэйскіх патрулёў, ці бяспечная дарога, адказ быў заўсёды нязменным: рознае бывае, будзьце ўважлівымі.**

**Пад Койданавам выбраліся, нарэшце, з лесу... Краявід змяніўся цалкам, мы ўбачылі агромністыя, узгоркавыя, бязлесныя абшары. Межаў няма нідзе. Пачаўся край калгасаў, зямля не ведае ні межаў, ні граніцаў. Аж да лініі гарызонту цягнуцца палеткі, маркотныя, апусцелыя і закінутыя...**

**Аднак сустрэча з мурамі Мінска была самай нечаканаю, прыгнёткаю. Ужо пры ўездзе ў горад, на першых слупах віселі трупы людзей. Першая напатканая намі плошча таксама была "аздоблена" вісельнікамі. На ажыўлены, рухлівы, гаваркі натоўп рынку глядзелі з вышыні васковыя, бяскроўныя твары павешаных.**

Усе замучаныя былі адзеты па-цывільнаму, выглядалі падобнымі на сялянаў, ля ног кожнага з іх была прымацавала аб'ява, што такая смерць напаткае кожнага, хто паспрабуе перашкаджаць пераможнай барацьбе немцаў. Подпіс -- гестапа. Як мы пазней даведаліся, павешаныя былі партызанамі. Мясцовая газета паведамляла, што ў той дзень павешана 30, а расстраляна 120 злоўленых партызанаў. УМінску ўсе былі пераконаныя, што ніводзін з павешаных не ўдзельнічаў у партызанскім руху. Узялі першых папалых, каб тэрарызаваць народ.

Мінск да вайны налічваў за 200000 жыхараў. Сёння ад іх не засталося і паловы. Горад знішчаны амаль цалкам: з мураваных жылых дамоў засталося некалькі сотняў. Цэнтр зруйнаваны з зямлёй, уцалелі ўсяго дзве цэрквы і некалькі здаравенных, сучасных бальшавіцкіх гмахаў, у тым ліку 9-павярховы будынак урада, дзе размяшчаюцца цяперашнія нямецкія адміністрацыйныя ўстановы, цудоўны гмах нацыянальнай оперы і некалькі вялікіх фабрычных будынкаў. На фоне велізарнай пустэчы руінаў і папялішчаў гэтыя ўцалелыя вялізныя будынкі, узведзеныя з шырокім урбаністычным размахам, пакідаюць асабліва моцнае ўражанне.

Непарушнымі засталіся прадмесці Мінска з тысячаў маленькіх, драўляных хатаў-развалюхаў. Стан прадмесцяў роспачны. Кіламетрамі цягнуцца балоцістыя вуліцы, абстаўленыя пахіленымі хаткамі з дзіравымі стрэхамі, дзе-нідзе з рэшткамі агарожы, без брамаў, часта без шыбаў у вокнах. Ля дамоў няма агародаў, такое ўражанне,што насельніцтва Мінска не ведае, што такое кветкі...

Цяперашні Мінск уяўляецца адзіным велізарным ваенным лагерам. Многа немцаў-вайскоўцаў, цывільных немцаў нябачна. Пануюць законы ваеннага часу.

Расстрэлы за дробязь -- звычайная рэч. Камендацкая гадзіна пачынаецца ў 9 вечара. Ночы неспакойныя, пастаянна даносіцца страляніна. Бальшавіцкіх самалётных налётаў на горад даўно не было".

Тым не меней на знішчаны і зруйнаваны горад восенню 1942 г. была сканцэнтравана асаблівая ўвага штабістаў "Вахляжа". "Абжыванне" Мінска праходзіла насуперак волі маёра Рэлішкі і, не выключана, без яго ведама. Пляма недаверу, якая лягла на палкоўніка "Мядзведзя", закранула і невінаватага Рэлішку. Тым больш што ён, знаходзячыся ў Лідзе, напісаў абшырную грунтоўную рэляцыю на адрас кіраўніцтва. Яна вызначалася выразным крытычным тонам да дырэктываў штаба, адкрытым пажаданнем абмежавацца толькі лакальнымі акцыямі, патрабаванні варшаўскага кіраўніцтва, на думку маёра, вынішчвала сілы ўчастка. Ды і выканаць заданні было проста немагчыма. Гэтая рэляцыя, вядома, прыйшлася не да спадобы камандаванню "Вахляжа", і лёс маёра быў прадвызначаны.

У канцы верасня 1942 г. у Ліду наляцела камісія на чале з самім "Доктарам". Фармальны повад -- фінансавая рэвізія. Ад маёра Рэлішкі дамагаліся квітанцыяў, расходнай кнігі і г. д. Канешне, весці такую "бухгалтэрыю" ва ўмовах канспірацыі было проста дурасцю. Рэлішка не змог абвергнуць прад'яўленыя абвінавачванні. Як і папярэднік, палкоўнік "Мядзведзь", ён папоўніў шарэнгі НСЗ -- Нацыянальных узброеных сіл.

У часе Варшаўскага паўстання адважны маёр камандаваў брыгадай НСЗ. Пасля вызвалення Польшчы яго арыштавала польская служба бяспекі. Дзякуючы намаганням групы жыдоў, якіх ён вызваліў у часе паўстання і сфарміраваў з іх гаспадарчы ўзвод у сваёй брыгадзе, быў адпушчаны на свабоду. Удзельнічаў у антыкамуністычным падполлі. Восенню 1945 г. камандаванне НСЗ паслала яго на Захад для ўстанаўлення кантактаў з Нацыянальнай партыяй. Жыў у Швецыі, Англіі, а затым асеў у Канадзе. Памёр у 1956 г.

Аднак вернемся да падзеяў 1942 г. Трохкутнік "А" штаб "Вахляжа" хацеў асталяваць людзьмі, якім верыў бязмежна. Першнаперш -- "ціхацёмнымі".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Янкоўскага ("Агатона"):** "Удалая распазнаўчая акцыя, праведзеная пад кіраўніцтвам "Джуля" (маецца на ўвазе аперацыя пад кодавай назвай "Мінскі кірмаш.--Я. С.), дала польскаму боку аргументы для размоваў з саюзнікамі ў Лондане. Здавалася, што АК будзе здольна выконваць дыверсійныя акцыі ў прыфрантавой паласе. Але далейшае развіццё падзеяў паказала, наколькі памылковай была высокая ацэнка.

Вырашылі стварыць дыверсійныя групы на найважнейшым, 4-ым участку "Вахляжа", у накірунку Баранавічы -- Мінск -- Орша. Гэтую работу даручылі "Джулю" і "Марыі". Яны павінны былі ехаць у якасці будаўнічых тэхнікаў, таму, будучы архітэктарам, я стараўся пазнаёміць іх з азамі новай прафесіі. Падрыхтаваў дакументы, дамовіліся пра кантакты праз "цётку Антосю" на выпадак, калі б чаго ад мяне патрабавалі. Сустракаліся, успаміналі час, праведзены ў Шатландыі, курсы "ціхацёмных". Але думкамі абодва былі ўжо там, у прыфрантавым тыле. Пад час апошняга спаткання -- у бары "То Ту" на Брацкай -- Джуль пазнаёміў мяне з прыгожай, чорнавалосай дзяўчынай, Данутай Рыльскай, якая там працавала афіцыянткаю.

-- Дануся, мая жонка.

Выехаў ён назаўтра".

Замест Зыгмунта Рэлішкі начальнікам 4-га ўчастка быў прызначаны "ціхацёмны" маёр Тадэвуш Сакалоўскі ("Троп"). Ён адразу перанёс штаб-кватэру ўчастка з Ліды ў Мінск, пачаў безупынна курсіраваць па лініі Баранавічы -- Ліда -- Варшава, каб найхутчэй падрыхтаваць участак вядзення баявых акцыяў. Але галоўную ролю ў ягоным асталяванні ў Мінску сыгралі не "ціхацёмныя", а даўнішні сябра Рэлішкі інжынер Ян Кашарскі ("Белы"). Іменна з яго дапамогаю ўдалося ўкараніць у фірмы, якія падпарадкоўваліся арганізацыі Тодт, першую шматлікую групу (15 чалавек) жаўнераў "Вахляжа", выехалых ў Мінск.

Сярод іх былі Станіслаў Касьцеляк, Максіміліян Янчэўскі, Міхаіл Бубен, былы марак Пінскай флатыліі Міхал Захарчук, Уладыслаў Сасноўскі, паручнік Стэфан Дэрферт, капітан Шчэньсняк. Вядомыя толькі псеўданімы некалькіх групоўцаў: паручнік "Бук", "Барс", "Збышак", "Храпак", "Уладак", "Эдак", "Войтак". "Іго". Ад аднаго з 15 у спіску не захавалася ні прозвішча, ні псеўданіма.

Шчэньсняк быў па прафесіі тэхнік-дантыст і збіраўся адкрыць у Мінску зубны кабінет. У канцы лістапада 1942 г. у горадзе замацаваліся 50 жаўнераў "Вахляжа", прычым 40 з іх былі перакінутыя

з Генеральнай губерні, у тым ліку "ціхацёмныя" маёр "Троп", капітан "Мак" (ён жа "Джуль"), ротмістр "Міра", паручнік "Сосна", капітан "Рыба".

Большая частка працавала ў арганізацыі Тодта. Насілі нямецкую ваенную форму, праўда, без знакаў адрознення, з жоўтай павязкай на рукаве, на якой чорнымі літарамі было напісана: "Im Dienst der Deutschen Wermacht". Пасяліліся ў начлежных бараках, якія ахоўваліся ўзброенымі вартаўнікамі Тодта. Гэта стварала пэўныя нязручнасці ў сувязі з выхадамі на дыверсійныя заданні. Пачалі думаць як перабрацца на прыватныя кватэры. Дзякуючы шчодрым паднашэнням аднаму з упраўляючых мінскай арганізацыі Тодта інспектару Гомберту, атрымалі дазвол на ўладкаванне па-за баракамі нямецкай ваенізаванай будаўнічай фірмы. Кватэры ў Мінску памагла шукаць знаёмая мінчанка Ліда Тычына.

Пасяліліся ў раёне Грушаўкі, непадалёку ад чыгункі, побач з тутэйшым чорным рынкам пад назвай "Суражскі базар", на вуліцах Грушаўская, Пакгаўзная, на 2-ім Грыгор`еўскім завулку. У асноўным іх прытулілі аселыя тут яшчэ з дарэвалюцыйных часоў сем`і палякаў і дружныя з імі сем`і беларусаў. Жылі ў малых, драўляных, напаўразваленых доміках Арцішэўскіх, Асіноўскіх, Матавільцаў, Навумчыкаў.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Янкоўскага ("Агатона"):** "У прыфрантавой паласе, нашпігованай жандармерыяй і гестапаўцамі, дзе кожны цывільны чалавек выклікаў падазрэнне, адзіным спосабам легалізацыі была праца прыбылых з Варшавы жаўнераў "Вахляжа" ў польскіх фірмах, якія вялі будаўніча-транспартныя работы для немцаў. Працаўнікі гэтых фірмаў хадзілі ў нямецкіх мундзірах, што дазваляла закватараваць у Мінску, перамяшчацца без абмежаванняў па легальных дакументах. Інжынер Кісялеўскі, кіраўнік адной з такіх фірмаў, які супрацоўнічаў з АК, згадзіўся пакрываць іх канспіратыўную дзейнасць.

"Джуль" і "Міра" спачатку жылі ў бараках фірмы, работнікамі якой афіцыйна лічыліся. Аднак сумеснае пражыванне са шматлікай групаю людзей, сярод якіх былі тайныя нямецкія агенты, перашкаджала справе. "Джуль" ("Мак") пераехаў на кватэру да дзвюх полькаў -- сясцёр Арцішэўскіх, пражывалых у драўлянай халупе на Рыгораўскім завулку, ля вялікай і шумнай базарнай плошчы.

Усе яны вядуць разведвальную работу, ствараюць дыверсійныя групы па-за Мінскам, збіраюць зброю, арганізуюць дыверсіі. Устанаўліваюць кантакты з савецкімі партызанамі з Налібоцкай пушчы, спрабуюць узгадніць акцыі".

Некаторыя з гаспадароў, якія далі прытулак жаўнерам "Вахляжа", напрыклад Кацярына Асіноўская і Цэцылія Матавілец, былі звязаныя з дзейнічалай у Мінску пад кіраўніцтвам Яўгена Сняжкова савецкай разведвальнай групаю. Прафесар Цэзарый Хлябоўскі, спасылаючыся на рапарт капітана "Міры", піша, што цераз іх былі спробы ўстанавіць кантакты з беларускімі падпольшчыкамі і партызанамі. На рубяжы верасня і лістапада пры пасрэдніцтве Кацярыны Асіноўскай дайшло да спаткання капітана "Мака" ("Джуля") з кіраўніком савецкай дыверсійнай групы. Абодва бакі ўзаемна праінфарміравалі пра свае намеры, дамовіліся, што будуць папярэд-

жваць адны другіх пра месца і час планаваных дыверсійных акцыяў, каб пазбегнуць дубліравання і няшчасных выпадкаў. Гэты факт Яўген Сняжкоў пацвердзіў пры сустрэчы з Хлябоўскім у снежні 1966 г. у Мінску.

За разгортваннем дзейнасці "Вахляжа" ў Мінску пільна назірала рэзідэнт польскай разведкі далёкага радыуса дзеяння, ужо знаёмая нам па гродзенскай канспірацыі 1939 г. Гражына Ліпіньска ("Данута"). Яна, не забудзем, па пратэкцыі бургамістра Вацлава Іваноўскага працавала ў гарадской управе. Яе загадзя папярэдзіў цэнтр, і мінская група "Вахляжа" папала ў поле зроку рэзідэнта з самага пачатку існавання. У верасні 1942 г. з "Данутай" сустрэліся ротмістр "Міра" і капітан "Мак". Вопыт "Дануты" за час паўгадовай разведвальнай дзейнасці на гэтай тэрыторыі, а таксама доступ да нямецкай адмінстрацыі і беларускай управы вельмі прыгадзіліся "Вахляжу". Бо не заўсёды прыбылыя з Варшавы ці дэсантаваныя з Англіі людзі патраплялі прыстасавацца да новых, надзвычай складаных мінскіх варункаў пражывання, мала што ведалі практычнае.

У канцы кастрычніка -- пачатку лістапада ў Мінск пачала прыбываць на аўтамабілях арганізацыі Тодта ўзрыўчатка. Адну партыю выбуховых матэрыялаў удалося перакінуць з Варшавы сюды паветраным шляхам. Нямецкі бамбардзіроўшчык Ю-52, адрамантаваны на Варшаўскім авіярамонтным заводзе, ляцеў на франтавы аэрадром з прамежкавай пасадкай у Мінску. Закамуфляваная "пасылка", надзейна прыстроеная на борце самалёта -- з дазволу немцаў -- удала прыбыла да месца прызначэння. Тут яе забралі паручнікі Дэрферт ("Стэфан") і Касьцеляк ("Ясень"). Словам, назапашванне зброоі і выбуховых рэчываў ішло поўным ходам.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Янкоўскага ("Агатона"):** "Былі цяжкасці з хаваннем зброі і выбуховых матэрыялаў. "Джуль" вырашыў зрабіць для іх схрон на паддашку свайго жылога пакоя. Працуючы электраманцёрам на аэрадроме Мінск -- Паўднёвы, "Джуль" за некалькі кілаграмаў саланіны атрымаў дазвол разабраць для абагрэву ўласнае кватэры напаўразвалены невялікі драўляны барак. Надыходзіла зіма, для такой руплівасці былі падставы.

Ён аддаў дрэва для абпалу сваім гаспадыням, сёстрам Арцішэўскім, дапамог ім злажыць паліва на гарышча. Стала звычайным, што перад кожным "службовым" выездам пан Сташэк Карпіньскі (пад гэтым прозвішчам капітан Богдан Пёнткоўскі працаваў у Мінску.-- Я. С.), далікатны, ветлівы кватарант, рыхтаваў са сваімі калегамі запас дроў для гаспадыняў, распілоўваў дошкі і бярвенне. Пад выглядам хатняй работы паступова ствараласе абсталяванне для прэпаравання мінаў. Гестапа не хутка знойдзе там 30 пісталетаў, больш тысячы патронаў, 450 кг выбуховых матэрыялаў (у тым ліку 50 кг англійскага пластыку, скінутага на парашуце), некалькі дзесяткаў гранатаў і мінаў з запозненым запальнікам для разміншчэння ў чыгуначных вагонах. Увесь крапатліва сабраны "Джулем" арсенал".

Тым часам паміж "ціхацёмнымі", якія складалі кіроўнае ядро ўчастка 4, паміж кіраўніком участка "Тропам" і "старыжыламі" мінскай канспірацыі "Макам" ("Джулем") і "Мірам" пачаліся спрэчкі, як быць далей. "Троп" настойваў на неадкладнай актывізацыі дыверсіяў. Два апошнія ведалі пра рашэнне камандавання распусціць

арганізацыю, меркавалі, што пераход да актыўных дзеянняў прывядзе да правалу; меркавалі паступова ўжывацца ў асяроддзе, разгаліноўваць канспіратыўныя ячэйкі і перанесці пачатак баявых дзеянняў на вясну 1943 г.-- ужо ў рамках новай дыверсійнай арганізацыі.

У такой сітуацыі маёр "Троп" вырашыў пазбавіцца ад непажаданых паплечнікаў-апанентаў. У канцы кастрычніка паслаў "Міру" ў Варшаву для падрыхтоўкі новай групы людзей, а калі той 22 лістапада вярнуўся назад, адразу накіраваў яго ў Слуцак з заданнем арганізаваць там дыверсійную базу.

"Мак" ("Джуль") атрымаў загад ехаць у Нясвіж за новай партыяй узрыўчаткі. Менавіта ў той час, 24.11.1942 г., незадаволены "Міра" абхадным шляхам высылае напаўасабістае пісьмо "Доктару", у якім наракаў на свайго камандзіра за некампетэнтны падбор кадраў і прасіў пра назначэнне ў Мінск "Панурага" і "Чаркі".

"Троп" тым часам сам, без абодвух праціўнікаў актыўных дыверсіяў, пачаў дзейнічаць рашуча.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Януша Скальскага ("Пеці Вагіна"):** "Дзесьці ў палове лістапада гаварыў мне "Мак"... што Лондан жадае ўзмацнення дыверсійных акцыяў на карысць рускіх, жадае, каб мы выявілі большую актыўнасць. Напэўна, англічане хацелі паказаць расіянам, што іх дыверсійныя каманды ў тыле нямецкага фронту дзейнічаюць актыўна. Бо гэтае актыўнасці, як казаў мне "Мак", вельмі дамагаліся рускія... Гэта быў сталінградскі перыяд... Падобна "Троп" хацеў адразу актывізаваць дыверсійную работу. Гэтаму супраціўляўся "Мак", ён хацеў арганізаваць базы ў Бабруйску, Слуцку, Барысаве і Смаленску. Лічыў, адзіночныя выбухі на рэйках дадуць нямнога, трэба працаваць усёй арганізаванай сеткаю. Дадатковым фактам нашай сціхасці было тое, што мы не мелі камплектаў "левых" дакументаў, па якіх можна было перамяшчацца па тэрыторыі.

Нягледзячы на гэта, "Троп" прагнуў акцыі. Было вырашана, што мы пачнём працаваць на адрэзку Мінск -- Смаленск у рухомых групах, якія будуць выкідвацца з аўтамабіля. Рэгулярна, праз некалькі дзён, у Смаленск павінна была ехаць грузавая машына па паперах Баўлейтунга, у ім выязджалі б з Мінска 3-4 групы. Аўтамабіль меўся ехаць ноччу, выкідваць па дарозе групы, прызначаныя для правядзення акцыяў.

Грузавік даязджаў бы да Смаленска, паварочваў назад і на досвітку забіраў бы групы пасля выканання акцыяў.

Задума вар'яцкая, але на практыцы яе можна было ажыццявіць, калі ўлічыць, што немцы пры наступленні змроку не паказвалі на шашы носа, а паперы Баўлейтунга былі надзейныя і не маглі выклікаць падазрэнняў. Такі аўтамабіль я павінны быў у палове снежня загнаць у Варшаву, каб яго адпаведным чынам падрыхтавалі.

Аднак "Троп" нецярпліваўся. Прыняў рашэнне пра выхад баявой групы на лінію Мінск -- Барысаў уночы з 3 на 4 снежня. Група ў складзе трох чалавек: капітан "Рыба", "Мірэк" і "Пеця Вагін", гэта значыць -- я, узарвалі поезд каля Плісы і дакладна ў 24 гадзіны далажылі пра вяртанне. Гэта была самая дзіўная група, у якой мне даводзілася браць удзел. Пайшлі мы на рэйкі ў нямецкіх мундзірах,

без якіх-небудзь дакументаў... Гэта была гульня са смерцю. Поспех групы пацвердзіў тэорыю "Тропа", які праз некалькі дзён вырашыў паўтарыць акцыю пад Ратамкаю, у 9 км ад Мінска. Прыняў рашэнне індывідуальна, бо ў той час у Мінску не было "Мака", "Міры", "Рыбы" і Смольскага".

Група, у складзе якой былі "Дрэўнікоўскі" (прозвішча невядома), Юзэф Вікторэк і Войцех Роса, аказалася менш вопытнай, недасведчанай. Дыверсія не задалася. Група наранку са ўсім сваім ладункам прыйшла на станцыю Ратамка, каб вярнуцца цягніком у Мінск, бо ў 8.00 павінны быць на ранішняй паверцы ў сваёй фірме. Ніхто з іх не ведаў, што тае самае начы савецкія падрыўнікі за некалькі кіламетраў адсюль пусцілі пад адхон нямецкі ваенны эшалон, і з самага рання нямецкая палявая жандармерыя вяла пошук падрыўнікаў. "Вахляжаўцаў" затрымалі ў Ратамцы з усімі мінамі, толам.

Роса ўцёк, а "Дрэўнікоўскага" і Вікторэка арыштавалі. На першым жа допыце-збіванні "Дрэўнікоўскі" пачаў выдаваць усіх, каго ведаў. На працягу некалькіх дзён у рукі немцаў трапілі 17 чалавек з "Вахляжа", у тым ліку ўсё кіраўніцтва 4-га ўчастка, і сярод іх чацвёра "ціхацёмных", а таксама інжынер Юльян Кісялеўскі, 40 работнікаў яго фірмы, усяго каля 70 чалавек.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарту Багуслава Галанта ("Зніча"): "Даехалі мы разам да Мінска (з Нясвіжа "Мак" вярнуўся ў суправаджэнні Галанта, Карчэўскага і Нуркевіча. --Я. С.) і падаліся на "маліну" да "Мака"... Мы не чулі, як пад'ехалі аўтамабілі гестапа з прыглушанымі маторамі. Гестапаўцы ўварваліся ў пакой з ускінутымі пісталетамі. Мы з сабою зброі не мелі (такі быў загад для "Вахляжа" ў Мінску). Пасля вобыску нам дазволілі апусціць рукі. Вялікую цікавасць у гестапаўцаў выклікала прывезеная намі паклажа. Вывернулі рэчавыя мяшкі і знайшлі выбуховыя матэрыялы. Адзін з іх выцягнуў запальныя шнуры і спытаўся: "Што гэта? Першым адазваўся "Мак", паясніў, што гэта электрапровад, а сам ён па прафесіі электрык.**

**Такім чынам выскародны "Мак" узяў на сябе тое, што магло абцяжарыць маю віну, засцярог мяне з самага пачатку і пасля, у час допытаў, ад катаванняў у гестапа".**

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Янкоўскага ("Агатона"):** "Цвёрдым застаўся "Джуль" да канца. Вытрымаў здзекі і катаванні, нікога не выдаў з асталых на свабодзе. Абараніў нават сваіх гаспадыняў, сясцёр Арцішэўскіх, бо запэўніваў гестапа, што "хозяйка" нічога не ведала пра склад зброі на паддашку.

Паверылі. Арыштаваны намеснік "Джуля" капітан "Рыба"-- Вацлаў Заорскі, мой сябра і камандзір маёй батарэі ў Францыі, а потым афіцэр разведкі 1-га артылерыйскага дывізіёна ў Шатландыі, пакончыў з жыццём самагубствам. Калі яго прывезлі ў будынак СД, папрасіўся ў туалет і там, раней чым паспеў перашкодзіць пільнавалы яго эсдэман, разгрыз пілюлю з цыяністым каліем.

Арыштаваных жаўнераў "Вахляжа" дапытваў спецыяльна прысланы з Берліна высокі чын гестапа, таму што знойдзеныя

англійская зброя і пластык указвалі сувязь мінскай групы з Варшавай. Каб здабыць інфармацыю, катавалі ўсіх. Дарэмна! "Троп"-- Тадэвуш Сакалоўскі, камандзір 4-га ўчастка, быў замучаны ў часе следства ў гестапа. "Джуль"-- адзін з найболей абвінавачаных -- вытрымаў мучэнні, не паддаўся".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З тайнага данясення начальніка паліцыі СД Остланда* штандартэнфюрэра СС (прозвішча неразборліва) рэйхскамісару, гаўляйтэру Лёзэ аб сітуацыі ў Мінску ад 15.12.1942 г.**

"Датычыць: польскай тэрарыстычнай групы "Кірунак" на Беларусі.

Як праінфармаваў мяне начальнік Паліцыі Бяспекі на тэрыторыі Беларусі, сіламі Паліцыі Бяспекі 7.12.1942 г. удалося раскрыць у Мінску тайную польскую арганізацыю. На дадзены момант з яе членаў арыштаваны 68 асобаў. Сярод арыштаваных знаходзяцца таксама і кіраўнікі арганізацыі. Спадзяёмся на новыя арышты, асабліва ў іншых мясцовасцях Беларусі.

На цяперашні час устаноўлены наступныя дэталі і падрабязнасці.

Раскрытая арганізацыя з`яўляецца польскай тэрарыстычнай арганізацыяй пад назвай "Кірунак", размешчана на ўсім польскім абшары Беларусі і Украіны. Сваю штаб-кватэру мае ў Варшаве, але кіруе ёю і фінансуе Лондан. Праўдападобна, у дадзеным выпадку мы маем справу з чыста ваенным фармаваннем. У Варшаве ў тамтэйшым галоўным аддзеле павінна знаходзіцца шмат польскіх парашутыстаў, яны і камандуюць усёй арганізацыяй.

Гэтая арганізацыя ў асноўным асталявалася ў польскіх будаўніцкіх фірмах, якія працуюць на аэрадромах і на іншых ваенных аб`ектах. Яе падраздзяленні знаходзяцца ў Брэст- Літоўску, Слуцку, Роўна і ў Мінску, а таксама ў адным з гарадоў на поўдні Украіны, назва якога пакуль што невядома, павінна існаваць падобнае падраздзяленне. Акрамя таго, падгрупы ў стане фарміравання павінны быць у наступных гарадах: Вільня, Даўгаўпілс (магчыма, і ў Пскове), Барысаў і Бабруйск. Задачай гэтых арганізацыяў з`яўляецца -- абарона граніцаў былой польскай дзяржавы.

Арганізацыя рыхтуе ўзрывы важных чыгуначных і камунікацыйных пунктаў на выпадак адступлення нямецкіх войскаў. Аднак іменна цяпер яна атрымала заданне весці дыверсіі на важнейшых чыгуначных лініях, каб унерухоміць пастаўкі на фронт. Патрэбна лічыцца з тым, што багата дыверсіяў у раёне Маладзечна — Заслаўе — Мінск, якія прыпісваюцца мясцовым бандам, былі зроблены іменна гэтымі групамі. (Дыверсіі зрабілі савецкія падрыўнікі.-- Я. С.).

---

* У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем таго часу ў склад рэйхскамісарыяту Остланд уваходзілі генеральныя акругі -- Беларусь, Літва, Латвія.

У выніку прадпрынятых на гэты момант мераў знойдзены наступныя матэрыялы: 12 брэзентавых мяшкоў, у якіх змяшчаюцца па два гатовыя ўзрыўныя камплекты, 3 авальныя кантэйнеры з запальнікамі і 7 бляшаных скрынкаў, у кожнай 4 шт. ракеты сігнальныя, 11 бляшанкаў з порахам (менш 30 кг), 2 бутэлькі ад гарэлкі з порахам, 1 бутэлька з калій-бромам, 8 "мышак" запальных (дапушчальна, англійскай вытворчасці), 11 электрычных запальнікаў, 6 адзіночных запальнікаў, 6 авальных скрынак з запальнікамі, 4 плоскія бляшаныя скрынкі з запальнікамі, 6 электрычных ліхтароў, 7 рулонаў электрычнага кабелю, 3 кабелі з запальнымі капсуламі, 1 сумка з рознымі інструментамі для вырабу ўзрыўных прыстасаванняў, 4 скрынкі з ампуламі страфантыну і камфары, 10000 рэйхсмаркаў.

Акрамя таго, знойдзены і канфіскаваны спраўны перадатчык амерыканскай вытворчасці. Ключ да шыфра перадатчыка ў нашым распараджэнні. Цяпер ён расшыфраваны.

Іншыя сховішчы выбуховага матэрыялу ў блізкіх і далёкіх ваколіцах Мінска нам вядомыя і будуць выяўленыя. З паказанняў арыштаваных вынікае, што ў тых сховішчах знаходзіцца, праўдападобна, таксама зброя".

Безумоўна, сведчыць Цэзарый Хлябоўскі назва, арганізацыі "Кірунак"-- гэта не што іншае, як "Адрэзак" ці "Участак". Не прагучала і ў катаваннях сапраўдная назва арганізацыі -- "Вахляж". Хоць у немцаў былі дадзеныя, што за ліквідаванай "пляцуўкай" у Мінску стаіць варшаўскі цэнтр і Лондан, у іх не было ўпэўненасці, што адтуль паветраным шляхам закідаліся людзі і дастаўлялася амуніцыя. У іх руках быў усяго адзін радыёперадатчык у Мінску. Галоўных каналаў сувязі з Генеральнай губерняй, асабліва з Варшаваю, нямецкай паліцыі выявіць не ўдалося.

19 студзеня 1943 г. з Варшавы ў Мінск выехалі два афіцэры -- начальнік штаба арганізацыі маёр Стэфан Рыхтэр ("Тумры") і ротмістр "Міра" (пасля арышту ў старажытным Слуцку ён уцёк і ў канцы снежня дабраўся да Варшавы). Разам з паручнікам Стэфанам Дэрфертам і Тадэвушам Романам ("Тадзік Дужы") яны атрымалі загад вызваліць арыштаваных з Мінскай турмы. 6 лютага, за некалькі гадзінаў перад спробай вызвалення арыштаваных, немцы ўварваліся на кватэру маёра "Тумры". Іх выдаў стражнік-украінец, якога "вахляжаўцы" спрабавалі падкупіць для арганізацыі ўцёкаў. У часе схваткі загінуў сам маёр і паручнік Дэрферт. Адначасова праведзеная немцамі акцыя ў турме прынесла смерць маёру "Тропу", а таксама "Мірку"-- Мірону Закерту-Акшаноўскаму. Астатнія загінулі пазней. Так што з 17 чалавек уцалелі толькі Казімір Смольскі ("Сосна"), Багуслаў Галант ("Зніч"), Казімір Хацянкевіч, а таксама Златавін, якім было наканавана спазнаць пекла канцлагераў, у тым ліку Асвенціму.

Гэты ўчастак кіраўнікі "Вахляжу" прызналі ліквідаваным і не перадавалі яго нікому, хоць, акрамя мінскай базы ў раёне Круляўшчызны, існавала сетка з некалькіх дзесяткаў чалавекаў, а таксама некалькі групаў і асяродкаў, дзейнічалых на Навагрудчыне.

Да сказанага варта дабавіць, ротмістру "Міры" пашанцавала ў другі раз. Ён пазбегнуў арышту. Кружною дарогаю смяляк дабраўся праз два тыдні ў Варшаву і пацвердзіў чуткі пра ліквідацыю 4-га ўчастка. Мінчанка Кацярына Асіноўская, уладальніца хаты, у якой пражывалі "вахляжаўцы", загінула ад рук немцаў у лютым 1943 г. за сувязь з польскім падполлем у Мінску. Загінула не адна яна, а сотні жыхараў Мінска.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарту АК у штаб вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Лондане пра страты ў Мінску ад 27.02.1943 г.: "У часе падрыхтоўкі баявой акцыі для вызвалення з турмы ў Мінску польскіх і савецкіх жаўнераў у сумеснай барацьбе з немцамі загінулі два польскія і адзін савецкі афіцэр".**

**ДЫВЕРСІЙНЫЯ АКЦЫІ "ВАХЛЯЖА" НА ЎЧАСТКУ 4, паводле Цэзарыя Хлябоўскага.**

Па няпоўных даных, на ўчастку 4 было задзейнічана 155 чалавек.

Красавік--май 1942 г. Дыверсійная акцыя пад кодавай назвай "Мінскі кірмаш". Узрывы рэйкаў у раёне Мінска спецыяльнай групай, прыбылай з Варшавы.

25 чэрвеня 1942 г. Узрыў трох вагонаў з амуніцыяй на магістралі Краснае--Радашковічы.

16 ліпеня 1942 г. На станцыі Ліда ў цыстэрну з бензінам укінуты самаробны запальны зарад. Падпаручнік Януш Міхель і "Жаба" (прозвішча невядомае) з асяродка Бакшты--Юрацішкі. Вынік не распазнаны.

Ліпень--верасень 1942 г. Каля 10 механічных пашкоджанняў рэйкаў і прыкладна столькі ж тэлефонных ліній групай трохкутніка "Б" падпаручнікаў Ежы Банасікоўскага і Пятра Матылевіча ў раёне Круляўшчызны, Глыбокага і Міёраў.

10 жніўня 1942 г. Сутыкненне двух ваенных эшалонаў у раёне Заслаўля ў выніку няправільнага пераводу стрэлкаў. Група асяродка Бакшты--Юрацішкі.

4 верасня 1942 г. Пушчаны пад адхон рамонтны цягнік на адрэзку Ратамка--Заслаўе. Група асяродка Бакшты--Юрацішкі.

15 верасня 1942 г. Здабыты ручны кулямёт, 5 карабінаў і 2 скрынкі з боепрыпасамі ў шутцпункце Іўе. Група асяродка Бакшты--Юрацішкі.

25 верасня 1942 г. На станцыі Ліда падсыпалі жалезныя апілкі ў змазачнае масла, якім шмаравалі буксы паравозаў. Група асяродка Бакшты--Юрацішкі.

Канец кастрычніка 1942 г. Пад Гауяй (Лідскі раён) пушчаны пад адхон паравоз і некалькі вагонаў з грузамі. Група Казіміра Маркоўскага ("Казіка-1")

Канец лістапада--пачатак снежня 1942 г. Пушчаны пад адхон два эшалоны з вугалем і дровамі. Група асяродка Бакшты--Юрацішкі.

4 снежня 1942 г. Узрыў ваеннага эшалона пад Плісай на лініі Мінск--Барысаў. Група Вацлава Заорскага ("Рыбы").

Зроблена нямала. "Вахляжу" ёсць чым ганарыцца, праўда, калі разглядаць іх ваенныя здабыткі асобна. Бо калі параўнаць іх дзейнасць з дзейнасцю беларускіх партызанаў і падпольшчыкаў хоць бы адной вобласці -- Мінскай -- то параўнанне не на карысць палякаў. Як мухі са сланом.

## "ВАХЛЯЖ". УЧАСТАК 5.

Стварэнне базы "Вахляжа" на тэрыторыі 5-га ўчастка, у Вільні, звязана з асобай ужо знаёмага нам па віленскай канспірацыі ў 1939--1941 гг. Браніслава Кжыжаноўскага ("Баўтрука"). У красавіку 1942 г. ён прыбыў у Варшаву, каб завязаць кантакты з падпольным цэнтрам. З дапамогаю даваеннага саслужыўца Мацея Калянкевіча ("Котвіча") пазнаёміўся з кіраўніцтвам "Вахляжа".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Браніслава Кжыжаноўскага:** "Назаўтра ў канспіратыўнай кватэры з`явіўся афіцэр, якому мяне абяцалі прадставіць. Гэта быў капітан "Дан", намеснік камандзіра дыверсійнай арганізацыі (маёр Стэфан Рыхтэр -- начальнік штаба "Вахляжа", ён жа "Тумры".-- Я. С.). Манера паводзінаў, лексікон, відавочна блізкія адносіны з Калянкевічам выдавалі ў ім кадравага ваеннага, належнага да эліты афіцэрскага корпуса.

За ім прыйшоў самавіты мужчына, твар быў пакрыты густым шчаціннем. Усё гэта прыдало яму такі канспіратыўны выгляд, што калі б я быў гестапаўцам, арыштаваў бы яго на вуліцы без ваганняў пры першай жа сустрэчы. Абодва капітаны адносіліся да яго далікатна і з павагаю. Гэта дазваляла меркаваць, што я маю справу з палкоўнікам ці генералам. Нягледзячы на мае прапановы, прынцып дзеяння па-за граніцамі 1939 г. застаўся ранейшым. Барадаты "доктар Валігура" (палкоўнік Адам Грахольскі.--Я. С.), кіраўнік "Вахляжа", цвёрда падкрэсліў: "За кожны выстрал на нашым баку граніцы будзе суд".

Далейшая наша размова тычылася маіх паездкаў у ваколіцы Турманта, Дукштаў, Браслава, Дзісны...

На наступны дзень у нейкім утульным прыватным памяшканні мяне прадставілі высокаму, хударляваму пану, дзесьці пасля сарака, які не рабіў уражання, што ён палявы афіцэр. Трымаўся ветліва, нават сардэчна, але ў смутных яго вачах хавалася нешта прытоенае, як у чалавека, які не прывык выстаўляць напаказ свае пачуцці. Гэта быў капітан "Бязмен", кіраўнік 05 (Леон Лаплеўскі -- камандзір участка 5), які з групай з дзесяці чалавек якраз збіраўся ў Вільню. Мне не далі ніякіх іншых звестак пра яе склад, але не было сумнення, сярод іх знойдуцца і парашутысты, што нядаўна прыбылі з Англіі, таксама як і Калянкевіч".

На пачатку мая "Баўтрук" вярнуўся ў Вільню з заданнем як мага хутчэй арганізаваць базу для перакідкі людзей на Усход, што было неадкладна зроблена. Першымі прыбылі сюды, прыкладна 11--12 мая 1942 г., "Бязмен" і яго намеснік, "ціхацёмны", Ян Смеля ("Ліпэк"). Праз тыдзень прыехалі яшчэ трое: Казімір Семашкевіч ("Рагач"), Мар`ян

Кісялевіч ("Мірэк-1") і Зыгмунт Аўгустоўскі ("Сьлепаврон"). І, нарэшце, пад канец мая, з Варшавы прыбыла трэцяя група -- "ціхацёмныя" Адам Барычка ("Брона"), Раман Рамашкан ("Марыя"), а таксама браты Белакур --Ежы ("Корд") і Міхал ("Шарэк"), і Вітольд Кільгоўскі ("Грэк").

Атрымаўшы з дапамогаю легалізацыйнай ячэйкі (кодавая назва "Гаспода") фальшывыя дакументы, а хтосьці і без дакументаў, накіраваліся на Усход --"Марыя" пад Браслаў, "Мірэк", "Сьлепаврон", "Грэк" у раён Дзісны і Дзвіны. "Корд" захварэў на жаўтачку і некалькі тыдняў лячыўся ў Вільні, а "Брона" па просьбе "Баўтрука" арганізаваў кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы падрыўнікоў.

Кіраўнік участка 5 сваю штаб-кватэру размясціў пад Браславам у маёнтку Пеліканы, у ім гаспадарыла Соф`я Тарлецкая. Разам пасяліўся і падрыўнік "Сьлепаврон". Астатнія "вахляжаўцы" закватаравалі ў маёнтках і фальварках Стацюны, Кавалёва, Некрашы і Міёры. Як абсталяваліся, у Варшаву паехаў "Брона", каб далажыць "Доктару", што людзі ўшчыльную падышлі да запланаваных для дыверсій раёнаў, але работа стрымліваецца з-за адсутнасці выбуховых матэрыялаў. Атрымаў адказ, што машына са ўзрыўчаткаю ўжо, пэўна, даехала да Вільні.

Сапраўды, доўгачаканы грузавік з тратылам, пластыкам, дэтанатарамі і г. д. удала дабраўся на віленскую базу. Суправаджаць аўтамабіль і трох варшавякаў у Відзы быў прызначаны Даніэль Кастравіцкі, той самы "Данэк", што кіраваў тэрактам у Вільні (канец лістапада 1940 г.) у адносінах да агента НКУС, даваеннага польскага афіцэра Яна Шаблоўскага. Той самы "Данэк", каторы пасля тэракта быў арыштаваны савецкімі органамі дзяржбяспекі і здзейсніў немагчымае -- у часе допыту абяззброіў і задушыў афіцэра -- следчага НКУС і ўцёк, забраўшы з сабою папку са сваёй крымінальнай справай.

Славуты віленскі баявік "Данэк" новае заданне атрымаў на кантактным пункце па вул. Міцкевіча. Вядома, ніхто не ведаў, што за "Данэкам" сачыла літоўская паліцыя -- саўгума. На сваёй канспіратыўнай кватэры ён спаткаўся з сябрам, і абодва, прыхапіўшы з сабою зброю, пайшлі туды, дзе іх чакаў "вахляжаўскі" аўтамабіль з трыма варшавякамі. Шпікі з саўгумы рашылі затрымаць іх на набярэжнай Віліі -- ля Зялёнага моста. Сябра Даніэля схапілі, а сам ён вырваўся з учэпістых рук сышчыкаў і кінуўся наўцёкі ўздоўж набярэжнай, раз-пораз адстрэльваючыся. Але адважнаму не пашанцавала. Сутыкнуўся з нямецкай аўтакалонай. З двайнога пераплёту не выцерабіўся -- загінуў у перастрэлцы.

Пра гэты трагічны выпадак імгненна паведамілі "Баўтрука". Той зходу зразумеў, што пры вобыску ў адзенні забітага "Данэка" знойдуць картку з назвай пункта прызначэння -- Відзы. Таму адразу ж паслаў сваю сувязную папярэдзіць пра небяспеку экіпаж аўтамабіля.

Члены экіпажа пакінулі свой груз у ваколіцы Вільні і выехалі ў Варшаву. Такім чынам, выбуховыя рэчывы па прызначэнню трапілі са значным спазненнем. З-за непаладкаў, звязаных з дастаўкай зброі, мінаў, фінансавых сродкаў, дыверсійныя групы не былі гатовы да актыўных дзеянняў. Хапала другіх няўвязкаў. Напрыклад, цяжка было нават знайсці лодкі, каб пераплыць Дзвіну.

**БЫЛО ГЭТА ТАК.** **З успамінаў Вальдэмара Жабы з дыверсійнай групы "Марка":** "У нашу задачу ўваходзіла разведка тэрыторыі на другім баку граніцы, падрыхтоўка пераправы праз Дзвіну для планаваных дыверсійных акцыяў на чыгуначнай лініі Даўгаўпілс -- Полацк -- Віцебск. У хуткім часе мы зрабілі дзве вылазкі ў Латвію, каб падрыхтавацца да фарсіравання Дзвіны. Але, як аказалася, пераправіцца на супрацьлеглы бераг не надта проста, бо рака тут шырокая, мела імклівае цячэнне. Засталося адзінае выйсце -- пераплываць на лодках. У сувязі з гэтым мы вялі пошукі на беразе ракі ад Друі да Краслаўкі.

Лодка на рацэ, вядома, звычайная з`ява, але не ў часе вайны і не на граніцы спакойнай Латвіі з ненадзейнай Браслаўшчынай. Захоўваючы максімальную асцярожнасць, каб нас не дэканспіравалі, мы марна трацілі час на бясплодныя пошукі. Праўда, у некалькіх месцах лодкі мы знайшлі, але на прывязі і пад пільнай аховай адказных за іх захаванне ўладальнікаў. У сувязі з выключна важным характарам нашй акцыі выкраданне лодкаў належала выключыць, і тэрмін выканання дыверсіі і надалей заставаўся нявызначаным. Засмучанымі вярталіся мы на досвітку на базу. Па дарозе нішчылі тэлекамунікацыйныя лініі праціўніка, пралеглыя непадалёку ад нашага шляху. Хоць гэта быў зусім невялікі ўрон для мілітарнай сілы непрыяцеля, на іншае ў нас тады не было магчымасці".

Побач з нявырашанымі пытаннямі чыста арганізацыйнага плана на паўночным усходзе Беларусі "вахляжаўцаў" напаткала праблема, якую капітан "Ваня", кіраўнік 3-га ўчастка, назваў галоўнаю і якую ён сфармуляваў так: "Ужыцца ў мясцовае асяроддзе -- вось дзе майстэрства". Такое ўжыванне не было простым і лёгкім.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарта камандзіра 5-га ўчастка капітана Леона Каплеўскага ("Бязмена") кіраўніку "Вахляжа" Адаму Грахольскаму ад 15--20 жніўня 1942 г. "Пан Доктар. Дакладваю агульную справаздачу пра зробленае да гэтага часу...**

**Сітуацыя агульная. Каб ахарактарызаваць істотныя варункі нашай работы, трэба асвяціць фон, на якім яна разгортваецца. Група 05 (участак 5.--Я. С.) знаходзіцца на тэрыторыі трох раздзеленых граніцамі так званых дзяржаваў -- Літвы, Беларусі і Латвіі. На кожнай з гэтых тэрыторый палітычныя, ваенныя, адміністрацыйныя, эканамічныя і г. д. варункі розныя, у сувязі з гэтым умовы нашай працы адрозныя. У першым перыядзе, арганізацыйным, належала пераадолець на кожнай з гэтых тэрыторый шэраг спецыфічных цяжкасцяў. Самай цяжкай наша сітуацыя была ў Літве ў сувязі з асабліва моцным праследаваннем палякаў. Поўная там усеагульная дэпрэсія (не выключаючы "Мёду*) і страх перад рэпрэсіямі ўскладнілі пошук пэўных пунктаў апоры: адрасы, прадстаўленыя кіраўніцтвам мясцовай акругі (маецца на ўвазе Віленская акруга АК.-- Я.С.) былі пераважна ненадзейнымі. Сістэма пастаяннага тузання палякаў шматлікай, добра арганізаванай літоўскай паліцыяй, загад рэгістрацыі непасрэдна ў паліцыі, абавязковая неабходнасць мець літоўскія пашпарты, затрыманне асобаў, не зарэгістраваных у дадзенай**

мясцовасці, пастаяннае прыцягненне на прымусовыя работы, пераважна палякаў, масавае забойства палякаў у сувязі са "свянцянскай справай"**, праверка дакументаў на дарогах -- усё гэта выключна тармазіла нашы пачынанні і прымушала ўсю ўвагу сканцэнтраваць перш за ўсё на бяспецы людзей з групы. Паволі нам удалося закватараваць у каланістаў (хутаранцаў.--Я. С.) альбо ў асяродках так званай дробнамаянтковай шляхты, найбольш прыхільнай і патрыятычна настроенай. Іншыя праслойкі польскага насельніцтва аднесліся да нас даволі стрымана. Вымушаны прызнаць, што варожыя, жорсткія адносіны літоўцаў да палякаў адбіліся вельмі адмоўна на пазіцыі апошніх, што ў выніку прывяло да амаль поўнага знікнення нашай арганізацыйнай сеткі на тэрыторыі.

Рухаючы групу далей на Усход, мы натрапілі на мноства цяжкасцяў. На Беларусі (польскай) адносіны мясцовага беларускага насельніцтва да палякаў несумненна іншыя, чым на Літве. Былі б яны яшчэ больш прыязнымі, каб не нямецкая прапаганда, якой паслужваецца кліка так званых беларускіх дзеячаў з Браслаўскага староства на чале з Кавальскім. Гэтая кліка, на першы погляд, пранямецкая, а фактычна дзейнічае па ўказцы Саветаў, стараецца усялякімі спосабамі прыцінскаць польскае насельніцтва. Выключную дапамогу ў гэтым ім аказваюць папы.

Адной з прычынаў, якія ўскладняюць нашае прабыванне на гэтай тэрыторыі, з'яўляецца пашпартны рэжым. У выпадку затрымання асобы, якая не зарэгістравана на гэтай тэрыторыі, яна трактуецца на ўзроўні савецкіх дыверсантаў. Апошніх у лясах знаходзіцца вялікая колькасць, адчуваюць сябе амаль зусім бяспечна і беспакарана з прычыны зычлівых адносінаў да іх беларускага насельніцтва і цярпімасці да такога стану рэчаў вышэй упамянутага Кавальскага.

З другіх цяжкасцяў, звязаных са знаходжаннем на гэтай тэрыторыі, трэба назваць добра арганізаваную павятовай клікай сістэму шпіёнаў-палякаў. Усё гэта прымушае пастаянна хавацца не толькі ад мясцовых уладаў, але і ад насельніцтва. Нарэшце, і гэта самае галоўнае, уся тэрыторыя Беларусі (польскай) у радыусе майго дзеяння моцна насычана камуністычным элементам. Нямецкая адміністрацыя, яўна пад уплывам Кавальскага, на ўсё гэта глядзіць скрозь пальцы. У такіх умовах беларускае насельніцтва амаль у адкрытую рупліва супрацоўнічае з савецкімі партызанамі, а як тыя што-небудзь выкінуць (рабункі двароў і засценкаў), то гэта цягне за сабой рэпрэсіі супраць... палякаў. Бо яны ненадзейныя і непатрэбныя на гэтай тэрыторыі элементы. У апошнія часы здараюцца шматлікія

---

* Мёд -- кодавая назва Вільні.

** 20.05.1942 г. атрад беларускіх партызанаў пад камандаваннем Фёдара Маркава напаў на нямецкі легкавы аўтамабіль каля Свянцянаў і забіў двух нямецкіх чыноўнікаў -- Ёзэфа Бека і Вальтэра Груля -- і аднаго афіцэра вермахта. У адказ нямецкі гебітскамісар з Вільні загадаў літоўскай паліцыі расстраляць 400 палякаў са Свянцанаў. Літоўцы забілі 1200 прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі са Свянцянаў і ўсяго раёна, а потым дадаткова расстралялі 150 вязняў-палякаў з Лукішскай турмы ў Вільні.

арышты і расстрэлы палякаў. Назіраючы такі стан рэчаў, прыходжу да беспамылковага вываду, што ў пераходны перыяд тэрыторыя Беларусі (польскай) і часткова Літвы (усходні рэгіён) будзе без прамаруджвання апрацаваная мясцовым (узброеным) камуністычным элементам у цесным паразуменні са шматлікімі, добра арганізаванымі савецкімі бандамі.

Што датычыць дзейнасці нашай арганізацыі на Беларусі, то, на жаль, трэба прызнаць яе вялікую бездапаможнасць. Брак энергічнага, планава і сур'ёзна дзейнага кіраўніцтва, брак зброі і фінансавых сродкаў у вялікай ступені паралізуюць патрыятычны парыў мясцовай польскай моладзі, расчараванай адсутнасцю моцнай рукі і магчымасці больш жывога ўдзелу ў арганізаванай рабоце. Моладзь стыхійна цягнецца да кожнай акцыі, што мае канкрэтную мэту. У такіх умовах вярбоўка ў нашу групу не мела б цяжкасцяў. За рэдкімі выключэннямі тэрыторыя Беларусі ў дадзены момант абсалютна не падрыхтавана на выпадак узброенага выступлення ў адпаведны час".

Тым не менш, нягледзячы на такі, прама скажам, песемістычны тон рапарта, кіраўніцтву 5-га ўчастка ўдалося арганізаваць шэраг дыверсійных акцыяў. Упершыню ўзарвалі мінай рэйкі на лініі Вільня -- Даўгаўпілс, праўда, без значнага ўрону для немцаў -- поезд паспеў праскочыць раней, чым адбыўся выбух. Але пазней дыверсійныя групы гэтага ўчастка дзейнічалі больш паспяхова і эфектыўна, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі.

**ДЫВЕРСІЙНЫЯ АКЦЫІ "ВАХЛЯЖА" НА ЎЧАСТКУ 5** (паводле апрацавання прафесара Цэзарыя Хлябоўскага).

9 жніўня 1942 г. Узрыў рэйкаў (выбух перад паравозам) на магістралі Даўгаўпілс --Ленінград. Група "Броны" і "Шарэка" (Міхала Белакура).

Жнівень 1942 г. Першая -- другая дэкада. Пашкоджанне рэйкаў узрывам міны на лініі Мінск -- Вільня -- Даўгаўпілс. Група "Броны".

Сярэдзіна жніўня 1942 г. Узрыў слупа пад электралініяй высокага напружання каля Даўгапілса. Група "Броны"--"Шарэка".

Жнівень--верасень 1942 г. Узрыў ваеннага эшалона на лініі Віцебск--Даўгаўпілс Вітальдам Кільгоўскім ("Грэкам"). Раненне "Грэка", а затым смерць -- у дарозе ці па прыезду ў Варшаву.

Жнівень -- верасень 1942 г. Узрыў пад эшалонам з нямецкай ваеннай амуніцыяй на лініі Даўгаўпілс -- Ленінград, нагрувашчванне вагонаў, рух спыніўся на некалькі гадзінаў. Група "Ліпка".

Верасень, першая дэкада 1942 г. Узрыў эшалона з ваеннай тэхнікай на лініі Даўгаўпілс -- Ленінград, за станцыяй Тышкі. Частка грузавых платформаў з артылерыяй і аўтамабілямі падае з насыпу, частка нагрувашчваецца на рэйках. Лінія выходзіць са строю на некалькі гадзінаў.

12--13 верасня 1942 г. Узрыў на лініі Даўгаўпілс -- Рэзекне. Нераспазнаны вайсковы эшалон часткова зыходзіць з насыпу. Перапынак руху каля сутак. Група "Шарэка".

3--5 кастрычніка 1942 г. Узрыў на лініі Вільня -- Коўна. Некалькі платформаў, гружаных вугалем, спадаюць з насыпу. Перапынак руху на некалькі гадзінаў. У дапаўненне -- крушэнне выратавальнага поезда. Група "Баўтрука".

Кастрычнік, першая дэкада. 1942 г. Узрыў міны пад ваенным эшалонам на лініі Даўгаўпілс -- Рэзекне. Эфект не распазнаны. Група "Корда" (Ежы Белакура).

Сярэдзіна кастрычніка 1942 г. Група "Броны" разнімае рэйкі каля станцыі Юзэфава на лініі Полацк -- Даўгаўпілс. Без эфекту.

Кастрычнік 1942 г. Узрыў на лініі Даўгаўпілс -- Рэзекне каля Ардавы эшалона з амуніцыяй, перапынак руху каля 3 сутак. Група Станіслава Александровіча -- уладальніка хутара ў Гроцішках (Латвія).

20 лістапада 1942 г. Узрыў рэйкаў пад нераспазнаным транспартам на лініі Віцебск -- Даўгаўпілс, каля Індры. Група "Мірэка".

29 лістапада 1942 г. Узрыў рэйкаў пад эшалонам з танкамі на лініі Вільня -- Коўна, поезд ледзь затрымаўся на насыпе. Група Яна Насуты ("Града").

4-ы квартал 1942 г. Узрыў рэйкаў пад эшалонам на лініі Даўгаўпілс -- Рэзекне. Эфект не распазнаны. Група "Сьлепаврона".

4-ы квартал 1942 г. Група Паўла Багдановіча ўзрывае рэйкі пад эшалонам на лініі Віцебск -- Даўгаўпілс. Вынік не распазнаны.

27 снежня 1942 г. Узпыў рэек на лініі Вільня -- Коўна. Група Альтфрэда Завадзкага ("Коса").

* * *

У гэтай кнізе свядома абмінаецца дзейнасць баявых і разведвальных групаў 4-га ўчастка ў раёне Даўгаўпілса і Рызе, таму што яна выходзіць за рамкі даследаванай тэмы. Па гэтай жа прычыне мы не расказваем тут аб перыпетыях стварэння 1-га і 2-га ўчасткаў "Вахляжа"-- яны дзейнічалі на Украіне.

Адзначым толькі, на ўкраінскіх участках акцыі "Вахляжа" не атрымалі належнага развіцця, не пакінулі хоць трохі значнага следу сярод яго баявых набыткаў. На тое былі свае падставы: масавыя карныя акцыі немцаў і ўкраінскіх нацыяналістаў з АУН -- УПА па вынішчэнню польскага насельніцтва, пралікі кіраўніцтва "Вахляжа" і проста выпадковы збег акалічнасцяў -- узгадаем хаця б арышт "Панурага" і "Чаркі" на 2-ім участку.

Бясконцыя правалы і няўдача на ўсіх участках, гібель людзей, часам бяссэнсавая, прымусілі галоўнае камандаванне АК яшчэ ў верасні 1942 г. задумацца аб рэарганізацыі "Вахляжа". Аднак падзеі развіваліся настолькі імкліва, а неэфектыўнасць запланаваных дзеянняў дыверсійных групаў настолькі відавочнай, што ўжо на рубяжы верасня і кастрычніка лёсы украінскіх участкаў "Вахляжа" былі прадвырашаныя. Тутэйшыя ўчасткі павінны былі знікнуць.

Праўда, падзеі на ўчастках усё яшчэ сведчаць, што аж да лістапада 1942 г. кіраўніцтва "Вахляжа" намагалася любой цаной узмацніць актыўнасць баявой дзейнасці ўчасткаў. Дастаткова сказаць, што ў верасні--кастрычніку была накіравана яшчэ адна партыя (ужо апошняя) "ціхацёмных" з вераснёўскіх дэсантаў: "Жмудзін" і "Бацян"-- на 3-ці ўчастак, "Сосна" і "Рыба"-- на 4-ы.

Ліквідацыю "Вахляжа" прыспешыла і здрада падхарунжага Томаша Сандэцкага ("Смугі"), тайнага агенга гестапа, ад'ютанта начальніка 5-га аддзела (сувязі) у варшаўскім штабе арганізацыі. Па яго даносу гестапа арыштавала 11 чалавек, у тым ліку чатырох дзяўчат-сувязных. Крыху забягаючы наперад, трэба сказаць, што спецыяльны ваенны суд пры галоўным каменданце АК 5.07.1943 г. прыгаварыў здрадніка да пакарання смерцю. Прыгавор быў прыведзены ў выкананне 30.08.1943 г. Да таго часу "Вахляж" ужо перастаў існаваць. Яшчэ 17 сакавіка 1943 г. быў расфарміраваны штаб арганізацыі, яго каманда перайшла ў розныя структуры Арміі Краёвай, якая, не забудзем, знікаць і не думала. Мацнела.

А цяпер коратка падсумуем сказанае ў раздзелах, прысвечаных гісторыі гэтай дыверсійнай арганізацыі. Калі падысці да справы фармальна то "Вахляж" існаваў 19 няпоўных месяцаў -- з канца жніўня 1941 г. да паловы сакавіка 1943 г. Але нас цікавіць перш за ўсё яго баявая дзейнасць -- з сакавіка па снежань 1942 г., бо рэшту часу занялі марудлівыя і нудныя арганізацыйны і ліквідацыйны перыяды.

На наш погляд, найбольш эфектыўная і грунтоўная ацэнка выканання заданняў "Вахляжам" дадзена ў манаграфіі прафесара Хлябоўскага. Ён лічыць, што 8 месяцаў актыўнасці "Вахляжа" зрабілі прынцыповы пералом у псіхіцы людзей з польскага падполля. Умацавалі іх. Прымусілі паверыць у свае сілы. Навучылі армейскай вытрымцы і хітрасці.

З гэтым можна пагадзіцца. Іменна "Вахляж" як састаўная частка ЗВЗ -- АК быў першай польскай канспіратыўнай арганізацыяй, якая перайшла ад слоў да непасрэдных баявых дзеянняў з даволі шырокім дыяпазонам, павяла актыўную барацьбу супраць нямецкіх акупантаў. Прычым барацьба гэтая не абмежавалася аднаразовай акцыяй адной групы, яна ахапіла вялікія тэрыторыі і заняла значны адрэзак часу. Важна: барацьба разгарэлася не тады, калі вораг стаў "пахнуць трупам", а ў той час, калі немцы былі на вяршыні сваёй ваеннай моцы.

Так, задачы, якія ставіліся перад "Вахляжам" у плане польскага ўсенароднага паўстання, ён не выканаў, бо і само паўстанне не адбылося. Не дабіўся ён і эфектыўнасці дыверсій, на якую разлічвала камандаванне. Але адна справа -- аддаць загад і зусім іншая -- асталяваць людзей у вызначанай мясцовасці і своечасова даставіць туды ўзрыўчатку. Сказаць "узарвём цягнік" і ўзарваць хоць адну рэйку -- розныя рэчы. Кіраўнікі "Вахляжа" ў гэтым пераканаліся надзвычай хутка.

Трэба сказаць прама: на тэрыторыі Усходняй Беларусі, раёнах запланаваных дыверсіяў жаўнеры "Вахляжа" адчувалі сябе чужынцамі, так і не змаглі па-сапраўднаму "зачапіцца" за беларускую зямлю і распачаць баявыя акцыі.

Тым не менш, паводле Цэзарыя Хлябоўскага, у якасці "пабочнага прадукта" "Вахляж" запісаў на свой рахунак шэраг несумненных дасягненняў. Галоўнае з іх -- ён мабілізаваў, падрыхтаваў і выпрабаваў у дзейнасці людзей, якія стануць асновай пры фарміраванні пазней баявых адзінкаў Арміі Краёвай на Беларусі. І не толькі тут.

## ПЛАН "НАВАЛЬНІЦА" ("БУРА")

Прыкладна з паловы 1941 г. Саюз узброенай барацьбы (польская абрэвіятура -- ЗВЗ) паступова пачаў ператварацца з кадравай арганізацыі ў масавую. Гэта адбывалася за кошт аб'яднання падпольных вайсковых арганізацый і ў сувязі з прытокам новых сілаў з ліку грамадзянскага насельніцтва. Загадам вярхоўнага галоўнакамандуючага генерала Сікорскага 14 лютага 1942 г. ЗВЗ быў перайменаваны ў АК -- Армію Краёву (Айчынную Армію).

Галоўнымі камендантамі АК былі: генерал Стэфан Равецкі ("Грот")-- да 30 чэрвеня 1943 г. (арыштаваны гестапа, замучаны ў канцлагеры Заксенхаўзен па асабістым загадзе Гімлера); генерал Тадэвуш Камароўскі ("Бур")-- да падзення Варшаўскага паўстання 1944 г., памёр у эміграцыі ў 1966 г.; генерал Леапольд Акуліцкі ("Нядзвядак")-- памёр 24 снежня 1946 г. у маскоўскай турме Бутыркі. Прычыны смерці не ўстаноўленыя дакументальна, хаця здагадвацца пра іх можна.

У канцы 1942 г. змянілася структура АК. У студзені 1943 г. Равецкі аддаў загад пра стварэнне спецыяльнага падраздзялення -- "Кедыву" (Кіраўніцтва дыверсіямі). У яго ўвайшлі "Вахляж", Згуртаванне Помсты і Тайная вайсковая арганізацыя. "Кедыў" узначаліў спярша палкоўнік Яўгеніуш Фельдорф ("Ніл"), а потым -- Ян Мазуркевіч ("Радаслаў"). Аб напрамках дзейнасці "Кедыву" сведчаць назвы сектараў яго штаба: аператыўны, навучання, разведкі, сувязі, падпольнай вытворчасці, прамысловага сабатажу, чыгуначнага сабатажу, камунікацыйны, хімічны, бактэрыялагічны, бюро аналізу і г. д. Непасрэдна "Кедыву" падпарадкоўваўся шэраг дыверсійных групаў. Яго тэрытарыяльная структура ў адрозненне ад "Вахляжа" была цесна звязана са штабамі акругаў, інспектаратаў, абводаў.

У 1943 г. пад націскам камандавання АК было створана Кіраўніцтва падпольнай барацьбы, якое аб'ядноўвала і каардынавала дзейнасць усіх сілаў польскага супраціўлення. Яго ўзначаліў генерал Равецкі.

На фоне рэарганізацыі структур АК удакладняліся яе стратэгічныя і тактычныя мэты. Восенню 1942 г. быў падрыхтаваны новы план баявых дзеянняў. Ён зноў прадугледжваў усеагульнае

паўстанне, у ходзе якога трэба было: а) вызваліць польскія землі ад немцаў; б) здабыць зброю і ваенную амуніцыю; в) супрацьстаяць намерам украінскіх нацыяналістаў; г) адрадзіць Войска Польскае; д) аднавіць дзяржаўную адміністрацыю; е) падтрымаць у краіне парадак і спакой, прадухіліць спробы дзяржаўных пераваротаў; ж) па меры магчымасці перайсці да ўзброенай экспансіі на нявызваленыя польскія тэрыторыі, заняцце якіх разглядалася як гарантыя існавання польскай дзяржавы.

Як бачым, у параўнанні з першым планам (гл. раздзел "У новых абставінах") тут ваеннай рыторыкі паменшала, граніцы 1939 г. не ўпамінаюцца, выразы больш асцярожныя. Але па сутнасці змест яго застаецца ранейшым, бо "пераход да ўзброенай экспансіі на нявызваленыя польскія тэрыторыі" гэта нішто іншае, як пастаноўка пытання пра тыя самыя граніцы 1939 г., а задача прадухілення спробаў дзяржаўных пераваротаў нават і думкі не дапускала аб змене дзяржаўнага ладу ў краіне.

Між тым прадаўжалася перапіска па асабліва важных пытаннях паміж галоўным камендантам АК і вярхоўным галоўнакамандуючым у Лондане. Так, на пытанне генерала "Грота" ад 28 лістапада 1942 г., Сікорскі адказаў, што ў планах паўстання Чырвоную Армію трэба разглядаць як саюзніка. Яшчэ 12 студзеня 1943 г. галоўны камендант далажыў аб сваіх сумненнях і апасках у сувязі з чаканым раскрыццём АК Чырвонай Арміяй. А ўжо пад канец лютага прапанаваў паднімаць паўстанне па зонах, па меры руху праз польскія землі Усходняга фронту, і хаця са супраціўленнем, але прыняў устаноўкі свайго вярхоўнага галоўнакамандуючага наконт трактавання Чырвонай Арміі як саюзніка.

Канешне, на ўсе "саступкі" і памяркоўнасць польскіх генералаў паўплывалі разгром немцаў пад Сталінградам і агульная сітуацыя на Усходнім фронце -- хвалёны вермахт пакаціўся назад. Уніз. Здавалася б, усё ў савецка-польскіх адносінах хілілася да лепшага, паступова з'яўлялася ўзаемаразуменне двух бакоў у тым, што датычыла галоўнага: трэба разбіць немца, а спрэчкі пра граніцы і другія далікатныя праблемы адлажыць на потым, пасля перамогі. Але абставіны зложыліся так, што дасягнутае крохкае паразуменне неўзабаве рухнула як картачны домік. На ўвесь свет, як гром сярод яснага неба, прагучала страшнае слова "Катынь".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. Хроніка падзей, звязаных з Катынню.** Паводле Чэслава Мадайчыка.1942/43 г.г. "...Лета 1942 г. Працавалыя непадалёку ад Смаленска ў нямецкай будаўнічай арганізацыі "Тодт" палякі даведваюцца ад мясцовага насельніцтва пра тое, што ў Катынскім лесе знаходзяцца масавыя захаванні польскіх ваеннаслужачых. Ва ўказаным месцы былі пастаўлены два бярозавыя крыжы.

Люты 1943 г. Захаваннем зацікавілася нямецкая тайная палявая паліцыя. Былі дапытаны мясцовыя жыхары, праведзены раскопкі часткі тэрыторыі, у выніку якіх выяўлены магілы. Таемны рапарт трапляе да Альфрэда Йодля, а копія рапарта -- да прафесара Вроцлаўскага ўніверсітэту Герхарда Бутца, спецыяліста судовай медыцыны, будучага кіраўніка эксгумацыйных работаў.

29 сакавіка. Ускрыццё магілаў.

4 красавіка. Старшыня Польскага Чырвонага Крыжа (ПЧК) Вацлаў Ляхерт пастаўлены ў вядомасць аб рашэнні выслаць у раён Смаленска дэлегацыю з мэтай агляду масавага захавання польскіх афіцэраў. З даклада генеральнага сакратара ПЧК Казіміра Скаржынскага, прадстаўленага на пасяджэнні праўлення ПЧК у чэрвені 1943 г.: "... Абставіны, спадарожныя накіраванню дэлегацыі ў Смаленск, выразна сведчаць пра тое, што нямецкія ўлады будуць імкнуцца да ўцягнення ПЧК як аднаго з узаемадзейных фактараў у арбіту мэтанакіраванай і ўжо пачалай прапаганды. Становіцца відавочным ужо зараз, што забойствы ў Катыні будуць выкарыстаны немцамі як аб'ект шырокамаштабнай прапаганды, заклікаНай служыць палітычным мэтам і ўтваралай непрадбачаныя цяжкасці польскаму ўраду..."

13 красавіка. У афіцыйных колах рэйха пачынае цыркуляваць інфармацыя аб выяўленні захавання польскіх афіцэраў.

Са службовай запіскі Франца Альфрэда Зікха Іахіму Рыбентропу: "1943. IV. Берлін. Начальнік культурна-палітычнага аддзела Міністэрства замежных спраў -- у канцылярыю міністра.

13 красавіка ў 22.30 пазваніў намеснік начальніка знешнепалітычнага дэпартамента міністэрства прапаганды рэйха міністэрскі саветнік Грэгары, а неўзабаве за ім і міністэрскі дырэктар Бердт і па даручэнні рэйхміністра доктара Гебельса паведаміў наступнае. У раёне Смаленска выяўлена шмат пакаранняў, якія ажыццяўляліся ДПУ. У масавым захаванні знойдзена 12.000 польскіх афіцэраў. Гутарка ідзе пра ўсіх польскіх афіцэраў, што трапілі ў рукі Саветаў у ходзе іх уваходу ва Усходнюю Польшчу... Эксгумацыя паказала, што ўсе афіцэры засталіся з рамянямі, ідэнтыфікацыйнымі знакамі, ардэнамі і дакументамі, так што магчымая індывідуальная ідэнтыфікацыя. Да эксгумацыі прыцягнулі Польскі Чырвоны Крыж, дэлегацыю польскіх вучоных, урачоў, артыстаў, прамыслоўцаў. Фюрэр аддаў цяпер загад распаўсюджваць інфармацыю пра дадзены інцыдэнт па ўсяму свету, выкарыстоўваючы пры гэтым усе сродкі, якія былі ў наяўнасці. Рэйхміністр Гебельс праінфармуе прэсу і кінахроніку. Рэйхсміністр Гебельс выказаў пажаданне, каб прыцягнуць да эксгумацыі астанкаў у апошніх вялікіх магілах камісію Міжнароднага Чырвонага Крыжа. Паколькі эксгумацыйныя работы прасунуліся вельмі далёка, трэба ўлічваць час года, што ўплываў на гніенне трупаў, запрасіў Міжнародны Чырвоны крыж як мага хутчэй.

Прашу інструкцый (подпіс Зікх)".

14 красавіка. Чарговая польская "тэхнічная" група, у тым ліку і доктар Скаржынскі, вылятае ў Смаленск. З даклада Скаржынскага: "Неабходна таксама памятаць, што ў катынскім пытанні, зрэшты, як і ў многіх другіх, мэты нямецкай палітыкі і мэты ПЧК зусім разыходзіліся. ПЧК імкнуўся да таго, каб астанкі польскіх афіцэраў пасля правядзення цяжкіх і складаных эксгумацыйных і ідэнтыфіцыйных работ як мага хутчэй знайшлі спакой у новых магілах. Для нямецкіх уладаў важнай была толькі прапаганда..."

14 красавіка. Берлін. Службовая запіска дзяржаўнага сакратара, начальніка ўпраўлення НСДАП па рабоце з немцамі за мяжой Эрнста Вільгельма Боле Гімлеру па пытанню запрашэння генерала Сікорскага як прыватнай асобы ў Катынь.

"Тычыцца забойства польскіх афіцэраў каля Смаленска.

Адзін з нямецкіх партайгэносэн, пражывалы за мяжой, выказаў жаданне -- у сувязі з прапагандысцкім выкарыстаннем масавага забойства польскіх афіцэраў -- перадаць мне сваю прапанову, якую я б сфармуляваў наступным чынам:

Урад рэйха або міністр прапаганды рэйха адкрыта прапануюць урадам варожых дзяржаў пераканацца пры дапамозе накіравання вопытных урачоў ці судовых экспертаў у небывалай жорсткасці бальшавікоў, вядома, гарантуючы поўную бяспеку. Было б вельмі мэтазгодна пану Сікорскаму як прыватнай асобе таксама даць гарантыю поўнай бяспекі, прадстаўляючы магчымасць удзелу ў апазнанні забітых польскіх афіцэраў.

Няма ніякіх сумненняў у тым, што ўрады варожых дзяржаў **не прымуць прапановы, не дазволяць выехаць і пану Сікорскаму** (выдзелена намі.--Рэд.), які, мусіць, прыняў бы гэту прапанову. Лічу, аднак, што прапагандысцкае ўздзеянне такой прапановы на сусветную грамадскую думку было б велізарным, тым больш што пан Сікорскі на ўсе свае запатрабаванні пра месца знаходжання палонных афіцэраў адказу з Крамля не атрымаў. Акрамя таго, акт ідэнтыфікацыі забітых з`явіўся б эфектыўным сродкам прапагандысцкага ўплыву на іх родных, а таксама не пакінуў бы сумненняў у адносінах да лёсаў тых шматлікіх палякаў, якія апынуліся на савецкай тэрыторыі".

14 красавіка. Першая інфармацыя пра забітых у Катыні паяўляецца ў "Новым кур`еры варшаўскім", які пазней пачынае публікаваць спіскі ахвяраў.

14 красавіка. Польскі ўрад у Лондане даведваецца пра паездку дэлегацыі з акупіраванай Польшчы ў Катынь.

15 красавіка. Генерал Уладыслаў Сікорскі (кіраўнік польскага эміграцыйнага ўрада ў Лондане) на сняданні ў Чэрчыля прадстаўляе даклад, дзе адлюстраваны ўсе аспекты польска-савецкіх адносінаў. З выпадку паведамлення аб Катыні, англійскі прэм`ер заўважыў, што нямецкая прапаганда імкнецца пасеяць разлад паміж саюзнікамі і перасцярог ад правакацыі: "Калі іх няма ў жывых, вы ўжо нічога не зможаце зрабіць, каб вярнуць іх да жыцця".

15 красавіка. 7.15. Масква. Паведамленне Маскоўскага радыё: "...Нямецка-фашысцкая інфармацыя ў сувязі з гэтай справай не пакідае ніякіх сумненняў з прычыны трагічных лёсаў былых польскіх ваеннапалонных, якія выкарыстоўваліся на будаўнічых работах у 1941 г. у раёнах на захад ад Смаленска і якія разам з многімі савецкімі грамадзянамі, пражывалі ў раёне Смаленска, трапілі ў рукі нямецка-фашысцкіх катаў летам 1941 года пасля адступлення савецкіх войскаў са Смаленскай вобласці...."

17 красавіка. Бі-бі-сі перадае паведамленне, з якога становіцца

вядомым, што польскі ўрад звярнуўся ў Міжнародны Чырвоны Крыж (МЧК) з просьбай накіраваць дэлегацыю ў Катынь.

У той самы дзень адбылося пасяджэнне ўрада Сікорскага, у час якога прынята заява ў сувязі з адбылым у Катыні. У ёй, у прыватнасці, адзначаецца, што польскі ўрад ад імя народа Польшчы рэзка пратэстуе супраць спробаў выкарыстаць у сваіх інтарэсах злачынства, у якім немцы абвінавачваюць другіх, для апраўдання злачынстваў уласных. "Звышкрывадушнае абурэнне нямецкай прапаганды не заслоніць перад светам ахвяраў аднаўленых і працяглых злачынстваў супраць польскага народа".

17 красавіка. Жэнева. Польская нота перадаецца кіраўніцтву МЧК праз паўгадзіны пасля ўручэння аналагічнай нямецкай ноты.

19 красавіка. Масква. У "Правде" друкуецца артыкул на катынскую тэму, якая ў рэзкім тоне крытыкуе" польскіх памагатых Гітлера", якія падтрымліваюць нацысцкіх правакатараў. Галоўным аргументам такога абвінавачвання з`яўляецца супадзенне па часе ўручэння ў Жэневе нямецкай і польскай нотаў.

21 красавіка. Лондан. На чарговым паседжанні ўрада Сікорскі просіць, каб у ходзе інфарміравання грамадскасці па катынскаму пытанню пазбегнуць выпадаў, супярэчлівых абранаму курсу ў польскай знешняй палітыцы.

21 красавіка. Масква. У асабістым пасланні Сталіна к Чэрчылю адзначаецца, што варожая кампанія супроць Савецкага Саюза пачалася ў нямецкай і польскай прэсе адначасова і праводзіцца ў адным і тым жа духу. " Гэтыя абставіны не пакідаюць сумнення, што паміж ворагам саюзнікаў, Гітлерам, і ўрадам пана Сікорскага існуе кантакт і змова у правядзенні гэтай варожай кампаніі". Менавіта наяўнасцю такой змовы Сталін абгрунтоўвае неабходнасць разрыву адносін з польскім урадам, выказвае спадзяванне, што брытанскі прэм`ер з разуменнем аднясецца да гэтага кроку, які СССР вымушаюць зрабіць.

24 красавіка. Лондан. Адказ Чэрчыля, у якім ён запэўняе Сталіна, што Англія выступае супраць якога-небудзь расследавання МЧК на любой тэрыторыі, акупіраванай немцамі. Чэрчыль выказвае таксама спадзяванне, што да канчатковага разрыву адносін паміж урадамі СССР і Польшчы не дойдзе.

У той жа дзень вечарам адбылася сустрэча брытанскага міністра замежных спраў з генералам Сікорскім. Ідэн угаворвае Сікорскага адмовіцца ад дэмаршу ў адрас МЧК, матывуючы сваю прапанову тым, што польскі ўрад, апялюючы ў МЧК, прадпрымае крок, "... у выніку якога ў выйгрышы будзе ці Германія, ці Расія, але ніколі -- Польшча". Сікорскі адхіляе прапанову Ідэна.

25 красавіка. Чэрчыль накіроўвае чарговае пісьмо Сталіну, заклікаючы -- у імя інтарэсаў антыгітлераўскай кааліцыі -- да працягу супрацоўніцтва. Англійскі прэм`ер растлумачвае таксама абставіны звароту польскага ўрада ў МЧК. У той жа дзень прыходзіць пісьмо ад Сталіна, які паведамляе Чэрчылю, што пытанне аб разрыве адносін з польскім урадам прадвызначана канчаткова (аналагічнае паведамленне атрымаў прэзідэнт Рузвельт).

26 красавіка. 0.15 мін. Куйбышаў. Польскаму пасольству ўручаецца нота савецкага ўрада аб разрыве адносін з Польшчай. Тадэвуш Ромер двойчы адмаўляецца прыняць ноту, пратэстуючы супраць дзеянняў савецкага боку.

28 красавіка. Масква. Ванда Васілеўская (адна з кіраўнікоў Саюза польскіх патрыётаў у СССР) заяўляе, што польскі эміграцыйны ўрад у Лондане канчаткова скампраметаваў сябе, "удзельнічаючы ў арганізаванай гітлераўцамі антысавецкай прапагандзе, гэтай авантуры ў Катынскім лесе, якая інкрымінуе савецкім органам расстрэл польскіх афіцэраў, якіх у сапраўднасці знішчылі самі немцы".

29 красавіка. Лондан. "Дзеннік польскі" апублікоўвае ўрадавую дэкларацыю ад 28 красавіка ў адказ на ноту СССР, у якой адзначаецца, што, нягледзячы на ўсе складанасці і супярэчнасці ў польска-савецкіх адносінах, палітыка польскага ўрада накіравана на ўмацаванне ўзаемадзеяння з СССР.

30 красавіка. Лондан. Польскае прэс-агенцтва інфармуе, што МЧК паведаміў аб цяжкасцях, звязаных з выкананнем сваёй місіі ў Катыні. У гэтых умовах польскі ўрад задаволіўся даным адказам з прычыны свайго звароту ў МЧК.

У той жа дзень Чэрчыль у сваім пісьме да Сталіна выказаў расчараванне разрывам польска-савецкіх адносінаў, заўважыўшы мімаходам, што катынская справа "з`явілася трыумфам Гебельса".

1 мая. Польская рабочая партыя выдае адозву, у якой катынскае злачынства ставіць у віну гітлераўцам.

5 мая. Польскі пасол пакідае тэрыторыю Савецкага Саюза.

8 мая. Масква. Апублікавана паведамленне аб згодзе савецкага ўрада на фарміраванне ў СССР польскай дывізіі.

Чэрвень. Смаленск. У Катыні знойдзена 4143 ахвяры, з іх апазнана 2730. Не былі зроблены эксгумацыі астанкаў прыкладна 150--200 чалавек, што пакоіліся ў апошняй магіле. (Нямецкія даныя аб поўным ліку ахвяр --12000, савецкія даныя--11000. Даныя абодвух бакоў не былі пацверджаны дакументамі.)

25 верасня. Савецкія войскі вызваляюць Смаленск.

26 верасня. Спецыяльная камісія пад кіраўніцтвам М. Н. Бурдэнкі пачынае расследаванне ў Катыні.

24 студзеня 1944 года. Апублікавана афіцыйнае паведамленне аб выніках работы камісіі. Адзначалася, што ваеннапалонныя палякі знаходзіліся ў трох лагерах на захад ад Смаленска і напярэдадні вайны былі задзейнічаны на дарожных работах. Пасля захопу Смаленска немцамі ў верасні 1941 года апынуліся на акупіраванай тэрыторыі. Восенню гэтага ж года фашысцкія захопнікі зрабілі ў Катынскім лесе масавыя расстрэлы польскіх ваеннапалонных. Расстрэлы ажыццяўляла ваенная каманда пад кодавай назвай "Штаб 537-га рабочага батальёна", якую ўзначальваў оберлейтэнант Арэнс і яго памочнікі -- обер-лейтэнант Рэкс і лейтэнант Гот.

У паведамленні падкрэслівалася, што гэта правакацыйная акцыя была задумана акупантамі ў сувязі з рэзкім пагаршэннем ваенна-палітычнай сітуацыі фашысцкай Германіі ў пачатку 1943 года, з

мэтай утойвання ўласных злачынстваў, дыскрэдытацыі органаў Савецкай улады, а ў канчатковым выніку -- пасеяць варожасць паміж савецкім і польскім народамі.

У дакуменце, прадстаўленым камісіяй, раскрываюцца метады, з дапамогай якіх фашысцкія захопнікі шукалі "сведак" сярод савецкіх грамадзянаў для пацверджання сваёй фальшывай версіі. У ход пайшлі ўгаворы, подкуп, пагрозы, а калі не памагала -- прымяняліся жорсткія катаванні і здзекі. Вясной 1943 г. немцы звозілі ў Катынь астанкі імі ж самімі расстраляных польскіх ваеннапалонных з іншых месцаў. У раскопках катынскага захавання акупацыйныя ўлады выкарысталі 500 савецкіх ваеннапалонных, якія пасля завяршэння работ былі знішчаны. Вывады камісіі суправаджаліся данымі судова-медыцынскай экспертызы.

1--3 ліпеня 1946 года. Нюрнберг. У абвешчаным прыгаворы нямецкім ваенным злачынцам катынскае злачынства не ўпамінаецца.

І толькі праз 45 гадоў катынскае пытанне ў нашай краіне было ўзнята зноў, і мы даведаліся ўсю страшную праўду аб гэтай трагедыі. У 1992 г. Масква перадала Польшчы дакументы, звязаныя з расстрэлам польскіх афіцэраў у Катыні. Іх апублікавалі ў Варшаве. У Маскве вытрымкі з гэтых дакументаў абнародавалі ў канцы 1992- - пачатку 1993 гадоў.

А тады, у 1943 г., разрыў дыпламатычных адносінаў паміж СССР і польскім урадам адразу паставіў сілы АК у новую сітуацыю. Няма ніякіх сумненняў, што на далейшую пазіцыю кіраўніцтва Арміі Краёвай паўплывала і трагічная смерць генерала Сікорскага -- умеранага палітыка з цвярозымі поглядамі, які ў складанейшых умовах савецка-польскіх адносінаў мог балансаваць на грані немагчымага. Пасаду вярхоўнага галоўнакамандуючага заняў палітычны антыпод Сікорскага -- генерал Казімір Саснкоўскі. Прыкладна ў той час наступіла замена і на пасадзе галоўнага каменданта АК -- замест арыштаванага Стэфана Равецкага быў прызначаны генерал Тадэвуш Камароўскі ("Бур").

Рамкі партызанскай дзейнасці АК былі абмежаваны дырэктывамі ўжо вядомай нам англійскай спецслужбы SOE--Special Organisation Executive (Кіраўніцтва спецыяльнымі аперацыямі). Уяўленне аб маштабах ахопу гэтай службы даюць такія лічбы: на пачатак 1944 г. яе кіраўніцкі цэнтр налічваў 13000 чалавек, у тым ліку 9000 вайскоўцаў. Яна была падзелена на шэраг нацыянальных сектараў, сярод іх -- два польскія, два французскія, бельгійскі, грэка-югаслаўскі, албанскі, чэшскі, дацкі, нарвежскі, італьянскі і г. д.

Галоўнай мэтай SOE з'яўляецца імкненне ўзяць кіраўніцтва Супраціўленнем ва ўсёй акупаванай немцамі Еўропе пад свой кантроль і каардынаваць яго дзейнасць, асабліва ў справе сабатажу, разведкі, псіхалагічнай вайны -- і ўтрымаць такім чынам народы еўрапейскага кантыненту ў сферы англійскага ўплыву.

У гэтай сітуацыі немалаважным, а, можа, і самым важным, з'яўляецца той факт, што SOE не толькі імкнулася падпарадкаваць сабе рух Супраціўлення ўсёй Еўропы, але і падтрымлівала яго

матэрыяльна, у тым ліку і АК. Дарэчы, у еўрапейскім Супраціўленні па сваёй колькасці Армія Краёва была самым буйным фарміраваннем (паводле розных крыніцаў, у 1944 г. АК налічвала ад 250.000 да 350.000 чалавек).

Трэба адзначыць, што на першапачатковым этапе SOE супраціўлялася масаваму росту партызанскага руху на базе АК і пераходу ад партызанскай барацьбы да нацыянальнага паўстання. План усенароднага паўстання АК не ўмяшчаўся ў рамкі брытанскай стратэгіі, якая прадугледжвала наступленне на Балканах. Англійскі план уварвання на кантынент не ахопліваў тэрыторыю Польшчы. Па гэтай прычыне SOE не жадала лічыцца з падрыхтоўкай польскім урадам у Лондане і АК усеагульнага паўстання. Запланаванае камандаваннем АК шырокая падтрымка паўстання з дапамогай авіяцыі, перакідвання паветраным шляхам у Польшчу часцей польскіх узброеных сілаў на Захадзе, а таксама дапамога ў даўзбраенні і падрыхтоўцы спецыялістаў у Англіі не заахвочвалася. Наадварот, дапамога значна зменшылася. Абмяжоўваліся палёты з Англіі на Польшчу, стала мізэрнай колькасць скіданых грузаў для АК: Польшча апынулася на пятым месцы пасля Югаславіі, Францыі, Грэцыі, Італіі.

Напэўна, іменна па гэтай прычыне польскі эміграцыйны ўрад стаў шукаць падтрымкі ў другога магутнага саюзніка -- ЗША, і ў першую чаргу ў амерыканскім Упраўленні стратэгічных службаў, папярэдніку цяперашняга ЦРУ. Падтрымка Злучанымі Штатамі Польшчы ў яе ваенных начынаннях праявілася, у прыватнасці, у стварэнні пры саюзніцкім Камітэце начальнікаў штабаў у Вашынгтоне польскай вайсковай місіі на чале з палкоўнікам Леонам Міткевічам.

Тым часам пасля выпрацоўкі агульных прынцыпаў стратэгіі краінаў-удзельніцаў антыгітлераўскай кааліцыі пэўныя змены адбыліся і ў ваеннай дактрыне SOE. Яна ўжо не была супраць пашырэння партызанскага руху, праўда, з адной агаворкай -- партызанскія дзеянні весці толькі ў рамках падпарадкавання англійскаму штабу ваенна-марскіх сілаў.

У самой Польшчы пераход да больш актыўных дзеянняў кіраўніцтва АК прыспешвала актыўная ўзброеная барацьба Гвардыі Людовай (Народнай Гвардыі), якой кіравалі камуністы. Шэраг бліскучых партызанскіх акцый "людоўцаў" яскрава сведчыў, хто ёсць на справе сапраўдны барацьбіт за свабоду польскага народа і незалежнасць краіны. Каб не страціць свой уплыў у грамадстве, АК проста-такі вымушана была праяўляць актыўнасць. Перш за ўсё гэта знайшло адлюстраванне ў павелічэнні сабатажу ў прамысловасці, на транспарце, у акцыях помсты за тэрор акупантаў і супраць здраднікаў і калабарацыяністаў.

Што датычыць пазіцыі Арміі Краёвай на "крэсах", то тут яна мела сваю спецыфіку, і пра гэта пойдзе гаворка ў наступных раздзелах.

На пераломе 1943/44 гг. для Лондана і польскіх кіроўных колаў стала відавочна, што польскія землі вызваліць Чырвоная Армія. Таму ўжо вясной 1944 г. SOE пачало шукаць новыя шляхі для

рэалізацыі англійскай стратэгіі ва Усходняй, Сярэдняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе. У ходзе гэтых пошукаў SOE вырашыла падтрымаць адхіленую да гэтага часу канцэпцыю ўсеагульнага нацыянальнага паўстання АК. Для Арміі Краёвай павялічылася матэрыяльная дапамога (скідванне зброі), хоць да таго часу тэрыторыя Польшчы ўжо знаходзілася ў стратэгічнай сферы Чырвонай Арміі.

Усе надзеі на вызваленне Польшчы з дапамогаю заходніх саюзнікаў, выношваныя кіраўніцтвам АК на працягу доўгага часу, не спраўдзіліся. На прамую ўзброеную падтрымку гэтых саюзнікаў АК ужо не магла разлічваць. У дадзенай сітуацыі кіраўніцтва Арміі Краёвай мусіла адмовіцца ад свайго ранейшага плана ўсенароднага ўзброенага паўстання. Замест яго з`явіўся новы план, пад кодавай назвай "Навальніца". У ваенных адносінах ён быў накіраваны супраць Германіі, у палітычным сэнсе -- супраць СССР. У загадзе штаба АК у сувязі з гэтым гаварылася прама: "Належыць імкнуцца да таго, каб супраць уступаючых савецкіх войскаў выйшаў польскі камандуючы, за плячыма якога бітвы з немцамі, і ў выніку гэтага ён становіцца паўнапраўным гаспадаром...."

У адпаведнасці з планам "Навальніца" ўзброеныя дзеянні АК -- на той выпадак, калі няма неабходных умоваў для паўстання -- павінны былі заключацца ў правядзенні дыверсіяў і праследаванні адступаючых немцаў. Палітычнай мэтай "Навальніцы" было: узяць пад свой кантроль важнейшыя ваенна-стратэгічныя, прамысловыя, адміністрацыйныя і культурныя цэнтры краіны яшчэ да таго, як іх вызваліць Чырвоная Армія ад немцаў, пераняць грамадзянскую ўладу ў свае рукі "дэлегатамі"-- спецыяльнымі паўнамоцнымі прадстаўнікамі лонданскага эміграцыйнага ўрада.

Такі падыход, на думку аўтараў плана "Навальніца", павінны быў зрабіць польскі лагер у Лондане паўнапраўным гаспадаром у адносіх да наступлення Чырвонай Арміі і раўнапраўным яе партнёрам у барацьбе з немцамі. Важнейшай палітычнай мэтай "Навальніцы" было: прымусіць СССР зноў прызнаць лонданскі эміграцыйны ўрад адзіным законным прадстаўніком інтарэсаў Польшчы, устанавіць савецка-польскую граніцу па стану на верасень 1939 г.

Вось дзе, на нашу думку, трэба шукаць першапрычыну трагедыі АК на "Крэсах Усходніх". Глыбока памыляліся польскія дзеячы, што выношвалі гэтыя планы, быццам Сталін і Берыя не будуць ведаць пра іх тайныя намеры. У тых умовах лідэры СССР ніколі не пагадзіліся з правіламі ваенна-палітычнай гульні, якую ім прапаноўваў Лондан. Не маглі пагадзіцца.

Многія гісторыкі сходзяцца на тым, што план "Навальніца" не належыць трактаваць у якасці прынцыповага павароту ў стратэгіі АК. Новы элемент, маўляў, у плане -- прадпасылка сумеснага ваеннага супрацоўніцтва з Чырвонай Арміяй.

А фактычна ўся навізна новага польскага плана была дымавой заслонай для рэалізацыі палітычных мэтаў лонданскага лагеру. У рэшце, пра якое сур`ёзнае супрацоўніцтва з Чырвонай Арміяй на высокім узроўні можна весці размову, калі разарваныя дыпламатычныя адносіны паміж Польшчай і СССР.

Найістотную ролю ў плане "Навальніцы" адыгрываў і вызначаны тэрмін пачатку паўстання. Заўчасная рэалізацыя "Навальніцы" асуджвала АК на вынішчэнне немцамі, як і здарылася, дарэчы, занадта позны пачатак пазбаўляў яе ўплыву на вызваленне краіны. Ні пра якія роўныя адносіны з рускімі не магло быць размовы. Спазненне з "Навальніцаю" паказвала Лондану, ЗША слабасць польскіх пазіцыяў. Па ўсіх асноўных накірунках. Гэтага АК дапусціць не магла.

Праўда, пра план "Навальніцы" ёсць і другія, супрацьлеглыя думкі, аднак гэта ўжо іншая тэма.

## ПАЛЕСКАЯ АКРУГА АК

Гэта, бадай, самая спецыфічная з усіх існавалых акругаў АК. У выніку нямецкага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення ў 1941/44 гг. яна аказалася "расчлянёнай" на тры часткі: паўднёва-ўсходняя (Брэст, Кобрын, Іванава, Пінск, Драгічын, Столін, Камень Кашырскі) увходзіла ў рэйхскамісарыят Украіна; паўночна-ўсходняя (Ружаны, Пружаны, Косава) належала да рэйхкамісарыяту Остлянд; а паўночная (Высокае, Каменец) была ўключана ў Беластоцкую акругу (Бэцырк Беласток), якая ў сваю чаргу падпарадкоўвалася Усходняй Прусіі.

Такім чынам, найбольш значная частка беларускай Палескай акругі АК апынулася ў складзе рэйхскамісарыяту Украіна. Акаўскаму падполлю прыходзілася там мець дачыненне не толькі з нямецкімі карнымі органамі, але і з фарміраваннямі ўкраінскіх нацыянальных і нацыяналістычных войскаў.

Пра падзел -- падзелы!-- ваенных украінскіх групаў, атрадаў, злучэнняў, войскаў даследчыкі братняй Украіны напісалі нямала, грунтоўна. З розных пазіцыяў. Асабліва ў апошнія гады, калі ў многіх месцах гатовыя ставіць помнікі Махно, Пятлюру, Бандэру.

Даследаваць узаемаадносіны ўкраінцаў паміж сабою, немцамі, рускімі, яўрэямі, беларусамі пад час нямецкага ліхалецця -- не наша тэма. Таму скажам пра іх вельмі коратка. Толькі каб адцяніць гістарычны фон, на якім адбываліся апісаныя падзеі.

Нацыянальны і нацыяналістычны ўкраінскі рух вёў сваю радаслоўную ад дзейнай яшчэ з даваення Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў (АУН), якая традыцыямі, карэннямі, ідэалогіяй брала пачатак з Сямёна Пятлюры. Напярэдадні вайны АУН субсідзіраваў і падтрымліваў германскі абвер. Ужо 22 чэрвеня 1941 г. аўнаўцы актыўна ўключыліся ў барацьбу: знянацку напалі на Саветы -- на чырвонаармейскія часці, жорстка распраўляліся з партыйным і савецкім актывам. У перыяд акупацыі ўсіх жыхараў Палесся (акрамя яўрэяў і так званых усходнікаў -- з імі ў АУН былі ўласныя, своеасаблівыя падрахункі) аўнаўцы пачалі запісваць украінцамі. Як вядома, АУН захапіла ўладу ў мясцовых органах адміністрацыйнага кіравання амаль паўсямесна.

Прайшоў некаторы час. Немцам не спадабаліся "імперскія" амбіцыі тадышняга кіраўніка АУН Сцяпана Бандэры. Супраць вярхушкі АУН былі прыняты крутыя меры. Бліжэйшых паплечнікаў Бандэры расстралялі, сам ён апынуўся ў канцлагеры Заксенхаўзен. У радах аўнаўцаў наступіў раскол.

З'явіліся мельнікаўцы. Яны пагадзіліся з нямецкай канцэпцыяй будучыні Украіны і безагаворачна падпарадкоўваліся гаўляйтэру

Эрыку Коху, рэйхскамісару Украіны. Іменна з радоў мельнікаўцаў фарміравалася цывільная адміністрацыя, украінская дапаможная паліцыя, а таксама добраахвотная 14-я дывізія СС "Галічына".

Другое крыло аўнаўцаў, бульбаўцы, гуляла ў "апазіцыю" да акупацыйных уладаў, але на самай справе іх таксама забяспечвалі немцы. "Канспірацыя" бульбаўцаў не ставіла сваёй мэтай барацьбу з акупантам, а перш за ўсё дамагалася ачышчэння "рідней" Украіны ад неўкраінскага элемента. Паўсюдна павінна была стварацца чыста, "самасційна" Украіна -- ад Карпатаў да Прыпяці і ад Дона да Сана. Па няпоўных даных, толькі на Беларускім Палессі ад рук рознага роду ўкраінскіх нацыяналістычных фарміраванняў загінула каля 15 тысяч чалавек.

У 1943 г., калі для немцаў запахла паражэннем, яны пайшлі на злучэнне двух украінскіх лагераў, у выніку была створана Украінская паўстанцкая армія (УПА). Назву яе запазычылі ад нелегальнай лакальнай арганізацыі, што дзейнічала на Валынскім Палессі ў 1939--1940 гг. Асноўная задача, якую немцы ставілі ў абавязак УПА,-- барацьба з антыфашысцкім рухам супраціўлення, перш-наперш з савецкімі партызанамі.

"Нявыхаваныя" савецкія давалі ваякам УПА пры сутычках вялікі адпор.

Вельмі добра праявіла сябе ў барацьбе з упаўцамі і партызанскае злучэнне "Ешчэ Польска не згінэла" пад камандаваннем Роберта Сатаноўскага -- ён падпарадкоўвася савецкаму штабу партызанскага руху.

Што датычыць АК на Беларускім Палессі, то яна, за выключэннем лакальных узброеных сутычак, адкрытай узброенай барацьбы з УПА не вяла. З простай прычыны -- акаўскага партызанскага руху тут фактычна не было. Групкі, ячэйкі, схроны... і абачлівае чаканне.

Пра складаную сітуацыю, з якой пастаянна прыходзілася сутыкацца ўдзельнікам антыфашысцкага руху на Брэстчыне, сведчыць насычанасць гэтай тэрыторыі вайсковымі часцямі і карнымі органамі -- немцамі, іх сатэлітамі і калабарантамі. На Прыбужжы дзейнічалі часці СС, СД, гестапа, абвера, пагранічная стража, транспартная паліцыя, жандармерыя, крымінальная паліцыя, эйнзатцгрупы ("спецыялісты" па масаваму знішчэнню насельніцтва) і г. д. Усяго каля 15 найменняў розных карных органаў. Не забудзем, што лініі камунікацый ахоўвалі часці 8-га венгерскага корпуса. З другога боку, лютавалі фарміраванні калабарантаў. Акрамя УПА, была створана ўкраінская хільфспаліцыя -- дапаможная паліцыя. У рэйхскамісарыяце Украіна -- украінская хільфспаліцыя, на тэрыторыі Остлянда -- беларуская. У Бэцырку Беласток -- усё як у рэйху плюс беларуская паліцыя.

Усё сведчыла пра надзвычайную складанасць умоваў, у якіх даводзілася працаваць антыфашысцкім падполлям на Палессі, у тым ліку і акаўскаму.

Зародкі канспіратыўных ячэйкаў на Палескай акрузе ЗВЗ -- АК, як ужо намі адзначалася, з'явіліся тут яшчэ ў даваенны час. Сама акруга ў Варшаўскім і Лонданскім штабах праходзіла пад кодавымі назвамі "Фортэца" ("Крэпасць")--1939/41 гг.; "Квадра"--1941/43 гг.; "Твердза" ("Цытадэль")--1943/44 гг.

Адным з першых арганізатараў тутэйшага падполля ЗВЗ -- АК быў начальнік Брэсцкага раённага вузла сувязі інжынер Станіслаў Корвін-Крукоўскі ("Рвіконь", "Ніврок"). Канспіратыўная арганізацыя

ахоплівала не толькі горад, але і правінцыю. Асноўны ўпор быў зроблены на збор разведвальных даных, для гэтага ў падпольшчыкаў былі добрыя магчымасці. Яны, напрыклад, маглі ў той час праслухоўваць тэлефонныя размовы паміж Масквою і Берлінам.

Першым камендантам Палескай акругі ЗВЗ (сакавік -- жнівень 1940 г.) з'яўляўся капітан Аляксандр Хабіняк ("Кузьма"); арыштаваны пасля органамі НКУС; лёс невядомы. Затым акругу ЗВЗ -- АК узначальвалі: паручнік Ксаверы Сасіноўскі ("Рыбак"), жнівень 1940 г.-- чэрвень 1941 г.; арыштаваны органамі НКУС; лёс невядомы; Францішак Файкс ("Ардыньскі"), кастрычнік -- снежань 1941 г.; Станіслаў Добрскі ("Жук", "Майстар"), снежань 1941 г.-- красавік 1944 г.; Юзэфа Сварцэвіч, май -- жнівень 1944 г. (выконвала абавязкі каменданта); арыштавана з мужам і сынам органамі дзяржбяспекі. Да 1956 г. Сварцэвічы знаходзіліся ў лагеры ў Варкуце, потым вярнуліся ў Польшчу.

З надыходам нямецкай акупацыі на Брэстчыне стыхійна, незалежна ад Варшавы і Лондана, утварылася польская падпольная арганізацыя "Шанец" ("Рэдут") на чале са Збігневам Сланчыньскім ("Ястшэмбец", "Кміціц"), на першапачатковым этапе ў асноўным яна складалася з моладзі (каля 10 чалавек), але пазней пачала разрастацца. Да яе далучыліся прызначаны немцамі першы прэзідэнт Брэста Бранікоўскі, ксёндз Ежы Урбановіч, доктар Казімір Пашкевіч, турэмны стражнік Дарасіньскі. На час уваходжання "Шанца" ў структуру ЗВЗ -- АК (вясна 1942 г.) ён налічваў каля 250 чалавек.

Пачыналі "шанцавікі" са здабывання зброі. Для гэтага вялі пошукі ў разбураных і самахоць пакінутых савецкіх умацаваннях уздоўж Буга. Там знайшлі 3 кулямёты, больш 20 вінтовак, аўтаматы, багата патронаў, гранаты. Наладжвалі прапагандысцкую работу, распаўсюджвалі лістоўкі, выдавалі газету "Шанец", праўда, невялікім тыражом-- каля 250 экземпляраў адзін выпуск.

Адна з задачаў, якую паставіла перад сабою арганізацыя -- гэта выкрыццё і знішчэнне калабарантаў і карнікаў. Восенню 1941 г. застрэлілі сярод белага дня небяспечнага агента гестапа па мянушцы "Рымша", а праз некаторы час -- прама на ступеньках будынку гестапа афіцэра СД Вайзэ.

Дапамагалі выжыць савецкім ваеннапалонным. Зімой 1941/42 гг. у Брэсцкім лагеры ад голаду і холаду загінула каля 8000 байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Члены "Шанца" перадавалі сюды харч. Арганізавалі ўцёкі 14 чалавек, іх потым пераправілі ў ваколіцы Ковеля, дзе ў той час пачалі з'яўляцца зародкі будучых партызанскіх атрадаў.

Адначасова "Шанец" праводзіў сабатажныя акцыі на чыгунцы, шасэйных дарогах, іншых лініях камунікацыяў, укараняў сваіх людзей у паліцыю, розныя органы акупацыйных уладаў.

Пасля прыбыцця на Палессе камандзіра 3-га ўчастка "Вахляжа" капітана Альфрэда Пачкоўскага ("Вані"), пра яго ўжо ішла гаворка, частка людзей з "Шанца" ўвайшла ў гэтую дыверсійную арганізацыю, астатнія -- у тэрытарыяльныя ячэйкі ЗВЗ -- АК.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА І КАДРАВЫ СКЛАД ПАЛЕСКАЙ АКРУГІ АК
### (паводле Чэслава Голуба)

Яшчэ летам 1941 г. на Палессе з Варшавы пачалі прыбываць прадстаўнікі штаба ЗВЗ для ўзнаўлення дзейнасці акругі. абезгалоўленай і дэзарганізаванай органамі НКУС у 1940/41 гг. Услед за часцямі вермахта сюды прабраліся эмісары з Варшавы і Беластока. Яны прашчупвалі магчымасці стварэння падпольных ячэйкаў у Брэсце, Пінску, Кобрыне, Лунінцы. У канцы 1941 г. сюды быў накіраваны падпалкоўнік Францішак Файкс для ўзначальвання акругі. Пад яго кіраўніцтвам быў створаны штаб акругі: начальнік арганізацыйнага аддзела паручнік Збігнеў Міляноўскі («Сокал»), начальнік аддзела разведкі і контрразведкі сяржант Аляксандр Куніцкі («Француз»), начальнік аддзела сувязі падпаручнік Ядзвіга Астаневіч («Ірэна»), начальнік аддзела легалізацыі Браніслава Дабравольская («Рома»), начальнік санітарнай службы доктар Казімір Пашкевіч.

У такім складзе штаб акругі праіснаваў нядоўга. У сувязі з тым, што ў Польшчу была адклікана — па розных прычынах — частка кіраўніцкіх кадраў, у тым ліку падпалкоўнік Файкс, на мяжы 1941/42 гг. арганізуецца новы штаб. Ён пратрымаўся ў асноўным сваім складзе да вясны 1944 г. Камендантам акругі быў прызначаны маёр Станіслаў Добрскі («Майстар»), яго намеснік — маёр Станіслаў Кавальскі («Зянон»), начальнік штаба — маёр Стэфан Размарыноўскі («Пухач»), начальнік аператыўнага аддзела — капітан Эміль Маркевіч («Ян»), начальнік аддзела разведкі і контрразведкі — капітан Віктар Гавурскі («Вжос»), начальнік інтэнданцкай службы — паручнік Гжэгож Гарагляд («Пушчык»), шэф Кедыву (Кіраўніцтва дыверсіямі) — маёр Ян Каваль («Базыль»), начальнік Бюро інфармацыі і прапаганды (БІП) — Геранім-Эдвард Грушчыньскі («Хел»), а з 1943 г.— Юзэф Лукашэвіч («Гарт»). І толькі начальнікам аддзела сувязі паранейшаму заставалася «Ірэна» — Ядзвіга Астаневіч.

Штабу Палескай акругі ЗВЗ—АК была падпарадкавана ўся канспіратыўная сетка былога Палескага ваяводства. У граніцах паветаў ствараліся абводы, ім, у сваю чаргу, падпарадкоўваліся раёны і пляцоўкі. На момант поўнага завяршэння структурнай арганізацыі (красавік 1944 г.) акруга налічвала 4272 чалавекі, у тым ліку — 3050 радавых, 42 афіцэры, 454 падафіцэры, астатнія ўваходзілі ў дапаможныя службы: сувязь, санчасць, забеспячэнне і г. д.

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці АК на Палессі з'яўлялася разведка і контрразведка. Акаўскія агенты змаглі прабрацца нават у святая святых немцаў — гестапа. Перакладчык шэфа гестапа Густава Эцінгера працаваў на АК (прозвішча невядома, у 1943 г. быў дэканспіраваны і расстраляны). Сакратарка Эцінгера, маладая прыгажуня, таксама ўвесь час супрацоўнічала з акаўскім падполлем (пасля вайны жыла ў Польшчы). Наогул, свае людзі ў АК былі амаль ва ўсіх звеннях акупацыйнай улады ў Брэсце і ў правінцыі — у пастарунках украінскай і беларускай дапаможнай паліцыі, у

адміністрацыі чыгуначнай станцыі , у венгерскім корпусе, на вузле сувязі, на пошце, у вайсковых рамонтных майстэрнях, транспартных, будаўнічых фірмах і г. д. На разведку АК працавалі настаўнік гімназіі Юліан Шпынар, яго жонка урач Казімера, настаўнік Крулікоўскі, адвакат Крыньскі, група так званых усходнікаў, ці, як іх называлі палякі, рускіх. Вахмістр з Аўстрыі, антыфашыст па пераканаННях, таксама дапамагаў польскаму падполлю.

Важным кантактным пунктам акаўскай разведкі з'яўляўся рэстаран у Брэсце «То ту» («Гэта тут»), які быў на ўтрыманні Яўгені Енжыеўскай. Яе дачка Марыя, абслуговы персанал рэстарана, як і сама гаспадыня, выконвалі даручэнні польскай рэзідэнтуры, інфармавалі аб канфедэнцыяльных размовах падвыпілых нямецкіх ваенных і цывільных чыноў, ажыццяўлялі кур'ерскую сувязь.

Разведка АК сістэматычна пастаўляла ў Лондан і Варшаву каштоўную і дакладную інфармацыю пра рух нямецкіх вайсковых злучэнняў і тэхнікі па чыгуначных, шасэйных і водных магістралях, аб становішчы на фронце і ў Палескім рэгіёне. Гэтаму садзейнічалі не толькі пастаяннае вонкавае назіранне за перамяшчэннем транспарту на цэнтральны ўчастак фронту і назад, але і доступ да сакрэтных дакументаў, і нават магчымасць знаёміцца з асабістымі пісьмамі гітлераўскіх вайскоўцаў. Нягледзячы на ваенную цэнзуру, там змяшчалася нямала важнай для разведкі інфармацыі.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З рапарта № 93—12 варшаўскага цэнтра АК у лонданскі штаб (снежань 1941 г.): «Рух на фронт. У сярэднім насіленне руху вайсковых саставаў для асобных накірункаў за суткі складае: Тшэў 16, 7, Варшава 26, 76, Дэмбін 10, 01, Кракаў 10, Беласток 12, Брэст 22, 18, Пшэмысль 5, 3, Дарогуск 5, 3...**

**Ідэнтыфікацыя. У накірунку цэнтральнага ўчастка Усходняга фронту не ідэнтыфікавана ніякіх вялікіх груповак. Сума зафіксаваных 292 эшалонаў з войскам, у тым ліку 63 саставаў з танкамі, эквівалентная прыкладна 4 вялікім часцям, у тым ліку адной бронетанкавай.**

**Рух з фронту... У перыяд з 1 да 30.11.41 г. усяго прайшло 1429 эшалонаў і 14 729 вагонаў, з іх: а) з цэнтральнага ўчастка фронту 1050 саставаў, 11 569 вагонаў...»**

Як бачна з гэтага дакумента, змешчаная ў ім інфармацыя была надзвычай важнай для ваенных штабаў вышэйшага рангу. Толькі за паўтара года з Брэста ў Лондан было перададзена каля 150 радыёшыфроўкаў разведвальнага характару. Невядома толькі, ці дзяліўся своечасова Лондан гэтымі звесткамі з Масквой, дзе яны, зразумела, былі ў той час патрэбны больш за ўсё.

Зберажэннем акаўскага падполля ад пранікнення ў яго шарэнгі агентуры непрыяцеля займалася контрразведка. На падставе сабраных ёю матэрыялаў на тэрыторыі акругі былі прыведзеныя ў выкананне прыгаворы спецыяльнага ваеннага трыбунала над здраднікамі: 1942 г.— 16, 1943 г.— 9, 1944 г.— 4. Акрамя таго, на падставе сабраных тут матэрыялаў больш за дзесяць смяротных прыгавораў было прыведзена ў выкананне па-за межамі акругі. Напрыклад, у Варшаве былі ліквідаваныя небяспечныя агенты брэсцкага гестапа Шчэпаноўскі і Пачыбут.

Але, нягледзячы на ўсе сродкі перасцярогі, час ад часу па тэрыторыі акругі пракочваліся хвалі арыштаў, смяротных караў і карных экспедыцый. Першы адчувальны ўдар па ўдзельніках польскага падполля на Палессі быў нанесены ў сувязі з праваламі «Вахляжа» на мяжы 1941/42 гг. Аб гэтым намі ўжо сказана.

Другая хваля рэпрэсіяў супраць акаўцаў пракацілася тут у 1943 г. У лютым была раскрыта дыверсійная група Юзэфа Боруха («Крука») — са здрады аднаго з членаў гэтай групы. Усяго тады арыштавалі 21 чалавек, 19 з іх расстралялі 26.06.1943 г. Але пасля доўгіх намаганняў контрразведцы АК удалося распазнаць здраднікаў. Сярод іх аказаўся і камендант Брэсцкага абводу маёр Уладзімір Купіч («Ян», «Зыгмунт»). Ён быў схоплены гестапа вясной 1943 г. і падпісаў — невядома з якой прычыны — абавязацельствы пра супрацоўніцтва. Па рэкамендацыі гестапа ўзяў сабе ў памочнікі для здрадніцкай дзейнасці Баляслава Лопяна («Вілька»), які раней стаў на агідны шлях. Купіча застрэліў праз вакно ў яго ўласнай кватэры акаўскі баявік Анатоль Дубовік («Дуброўскі»). Лопяну ўдалося пазбегнуць заслужанай кары і ён пачаў служыць у гестапа адкрыта.

Новы ўдар па акаўскай разведцы на Палессі быў нанесены ў пачатку 1944 г. Арыштавалі і расстралялі некалькі дзесяткаў чалавек, у тым ліку Яўгенію Енджыеўскую, яе дачку Марыю і групу рускіх. Гестапа выйшла і на след рэзідэнта Віктара Гавурскага («Вжоса»), які замяніў адазванага ў Польшчу Куніцкага. «Вжос» прыбыў у Брэст разам са сваім братам Генрыкам вясной 1943 г., апошні абслугоўваў радыёстанцыю. Пры спробе арышту Віктар Гавурскі прыняў атруту. Такі ж самы лёс спасцігнуў і яго бліжэйшага памочніка Тадэвуша Лоека, які таксама не даў сябе арыштаваць,— раскусіў ампулу з цыяністым каліем.

Побач з разведкай і контрразведкай кіраўніцтва АК на Палессі імкнулася актыўна весці сабатажна-дыверсійную работу. Гэтыя акцыі арганізоўваліся спецыяльным падраздзяленнем пад назвай Кедыў (Кіраўніцтва дыверсіямі). На Брэстчыне ў Кедыў увайшлі рэшткі ўцалелых людзей з «Вахляжа», а таксама свежыя сілы. На пачатку ў ім было 35 чалавек. Узначальваў Кедыў маёр Ян Коваль («Базыль»). У яго рамках было створана некалькі баявых групаў. Адна з іх называлася «Дружына», яна сфарміравалася вясной 1942 г. пад кіраўніцтвам Баляслава Сянкевіча, у асноўным складалася з чыгуначнікаў. Спачатку падпарадкоўвалася непасрэдна штабу акругі, а потым была перададзена ў распараджэнне Кедыву. Пад канец існавання налічвала каля 60 чалавек.

На рахунку «Дружыны», паводле даных аўтара кнігі «Палеская акруга АК» Чэслава Голуба, 6 крушэнняў нямецкіх эшалонаў з палівам, баявой тэхнікай і боепрыпасамі каля Лунінца, Пінска, Снятава і Жабінкі, мноства больш дробных дыверсіяў і сабатажных акцыяў, у тым ліку шматлікія пашкоджанні паравозаў і вагонаў, перавозка матэрыялаў і людзей з падполля АК, перасылка вагонаў і грузаў на памылковы адрас ў выніку падробкі праязных дакументаў, з-за чаго тыя вагоны і грузы «блукалі» працяглы час невядома дзе.

Менавіта з актыўным удзелам «Дружыны» вялася разведка на чыгунцы, збор інфармацыі аб руху цягнікоў на фронт і ў адваротным напрамку. У выніку пастаяннага назірання рэгістраваліся апазнавальныя знакі вайсковых саставаў, устанаўліваліся грузы, месца іх прызначэння і станцыя прыбыцця. У 1942 г. «Дружына» наладзіла сувязь і падтрымлівала — з дапамогай Сымона Буксы — цесны кантакт з савецкімі партызанамі, дастаўляла ім боепрыпасы, медыкаменты і г. д.

Дзякуючы сапраўды жалезнай дысцыпліне, якая была ўласціва чыгуначнікам «усіх часоў і народаў» (прафесія абавязвала), на працягу доўгага часу «Дружына» амаль не мела стратаў. Сярод яе членаў не знайшлося ніводнага здрадніка. За перыяд існавання яна сутыкнулася толькі з дзвюма сур`ёзнымі непрыемнасцямі — гэта арышт Лаўрыновіча, які адказваў за склад зброі і выбуховых рэчываў, а таксама выкрыццё радыёперадатчыка, які забяспечваў патрэбы разведсектара «Дружыны».

З восені 1943 г. пачала дзейнічаць спецгрупа «Іскра». У як склад уваходзіла каля дзесяці чалавек, але засталося вядомым прозвішчам ўсяго аднаго з іх — Зоф`я Мянсовіч. На мяжы 1943/44 гг. «Іскра» арганізавала серыю выбухаў на чыгуначных станцыях у Брэсце (тройчы) і Араньчыцах (1 раз). У адным з выпадкаў член гэтай групы, пераадзеты ў форму нямецкага салдата, здаў у камеру захоўвання багажу ранец, у якім знаходзілася міна з гадзіннікавым механізмам. Выбух разнёс камеру захоўвання на шчэпкі, былі паранены тры немцы і цывільная жанчына.

У лістападзе 1943 г. у зале чакання пакінулі 3 чамаданы з узрыўнымі ўстройствамі. Выбух наступіў у той момант, калі ў зале знаходзіліся салдаты-адпускнікі. Няма дакладных даных пра вынікі дыверсіі. Вядома толькі, што пасля выбуху на вакзале ўсе выхады з яго былі перакрыты жандармерыяй, да будынка вакзала хутка пачалі пад"язджаць санітарныя машыны, у якія выносілі забітых і параненых. У зале чакання ўсе шыбы павыбівала ўзрыўной хваляй, а сцены і лаўкі пасекла асколкамі і запырскала крывёю.

Вясной 1944 г., калі ў Брэсце зноў пачаліся масавыя арышты, гестапа схапіла некалькі дзесяткаў чалавек — удзельнікаў супраціўлення, у тым ліку — усю групу «Іскра». Зоф`ю Мянсовіч публічна павесілі на так званым малым рынку, астатніх расстралялі, пра што немцы паведамілі ў расклееных лістоўках.

Дыверсійна-сабатажныя групы АК былі створаны і ў другіх гарадах і мястэчках Брэстчыны. Найбольш вядомыя з іх — у Жабінцы (33 чалавекі, кіраўнік Уладыслаў Таталь), а таксама ў Лунінцы і Бярозе. Самая значная акцыя — узрыў вайсковага эшалона ў ноч з 2 на 3 студзеня 1944 г. на раз`ездзе Тэўлі.

У распараджэнне Палескага Кедыву па загаду галоўнага штаба АК прыбыў з Беластока акругі «ціхацёмны», паручнік Марыян-Збігнеў Гарчыньскі («Скала»). Ён арганізаваў курсы падрыўнікоў з ліку моладзі, занятай на торфараспрацоўках. Але курсы праіснавалі няпоўны месяц і распаліся, бо ў лістападзе паручнік «Скала» памёр

ад запалення горла і быў пахаваны пад чужым прозвішчам — Стэфан Герман.

Для наладжвання дыверсійнай працы сюды прыбылі з Варшавы яшчэ два афіцэры — паручнік Зыгмунт Скудзельскі («Цэзары») і падпаручнік Сергіуш Шорын («Боньча»). Першы быў прызначаны кіраваць групай «Конар-1» (25 чалавек), у абавязкі яе ўваходзіла выкананне прыгавораў ваенных трыбуналаў. Другі ўзначаліў групу «Конар-2» (75 чалавек), яе задача — арганізаваць дыверсіі ў Брэсце і Брэсцкім абводзе. Але больш-менш значных акцыяў групы не правялі. У студзені 1944 г. у сувязі з пагрозай арышту «Цэзары» і «Боньча» пакінулі Брэст і ўцяклі ў Варшаву.

Партызанскі рух АК на Палессі з-за вядомых ужо нам прычынаў не атрымаў такога развіцця, яе на Віленшчыне і Навагрудчыне. Тут не было створана ніводнага буйнага злучэння, а тыя невялічкія (ад дзесяці да паўсотні чалавек) і недаўгачасныя групы можна назваць атрадамі з вялікай нацяжкаю. Такія групы, як мы памятаем, арганізоўваліся яшчэ ў рамках аперацыі «Вахляж».

Летам 1943 г. у лес накіраваліся з дзесятак чалавек, у асноўным дэканспіраваныя, пад кіраўніцтвам Люцыяна Шыдлоўскага. Яны дзейнічалі ў раёне Лунінец — Столін. Прыкладна ў гэты час арганізавалася нешматлікая група Альбіна Знаеўскага. Але ім было «зацесна», бо пастаянна даймалі бульбаўцы і мельнікаўцы, не было дружбы і з савецкімі партызанамі. Летам 1943 г. абедзве групы вымушаныя былі перайсці на тэрыторыю Беласточчыны.

Штаб АК Палескай акругі з кожным днём адчуваў вострую патрэбу ў кадрах для ўмацавання падпольнага і партызанскага руху. Каб запоўніць гэты прабел, у красавіку 1943 г. у лясах ля Маларыты былі арганізаваны курсы падхарунжых, падафіцэраў і санінструктараў — усяго каля 60 чалавек. Курсамі кіраваў прысланы з Варшавы падпаручнік, «ціхацёмны» Ян Грыг («Дзядзя»). Можна меркаваць, што вучоба была пастаўлена на высокім узроўні, бо экзамен група курсантаў здала на выдатна — узарвалі нямецкі цягнік з адпускнікамі і разграмілі пост украінскай паліцыі

З выпускнікоў лясной школы быў створаны партызанскі атрад (45 чалавек) пад камандаваннем падпаручніка Яна Грыга. Першачарговай задачай камандзір лічыў у той момант барацьбу з бульбаўцамі. І пачалася яна даволі паспяхова. Ушчэнт разбілі некалькі ўкраінскіх падраздзяленняў, знішчылі іх месцы дыслакацыі. Бульбаўцы запрасілі ў немцаў падмогу. Тыя імгненна адкліккнуліся і арганізавалі шырокамаштабную аблаву. Атраду Грыга пашэнціла — прарваў кальцо акружэння і без стратаў адступіў у лясныя балоты. З гэтага часу лёс павярнуўся спіной да падпаручніка. Атрад зноў акружылі немцы — у першай дэкадзе снежня 1943 г. У часе паўторнага прарыву камандзір загінуў. За месяц атрад страціў 16 чалавек і быў расфарміраваны ў раёне Брэста. Партызаны былі размеркаваны па акрузе.

З пачатку 1943 г. па загаду штаба акругі пачалі стварацца

зародкі атрадаў пад агульнай назвай «Ватра». Лік адкрыла група пад камандаваннем паручніка Войцеха Збілюты («Юра»). Яго штаб АК накіраваў у распараджэнне Палескага Кедыву з Генеральнай губерні. Дзейнічалі ў трохкутніку Брэст — Пружаны — Кобрын. Ім не пашанцавала з самага пачатку — група была раззброена савецкімі партызанамі. Праўда, «Юру» і яшчэ некалькім чалавекам удалося ўцячы. Усё пачалі па-новаму, і праз некаторы час атрад налічваў каля 60 чалавек. З гэтага часу атрад амаль ніколі не выходзіў на акцыі ў поўным складзе, дзейнічалі невялічкімі групкамі, пастаянна перамяшчаліся з месца на месца. Нападалі на пастарункі паліцыі і жандармерыі, наладжвалі дыверсіі на дарогах, знішчылі лініі камунікацыяў.

У ноч з 27 на 28 кастрычніка 1943 г. штаб атрада закватараваў у радавым маёнтку Касцюшкаў — Сяхновічах. Тагачасная ўладальніца маёнтка Кулакоўская данесла немцам, якія з дапамогай украінскай паліцыі на золку ўдарылі па няпоўным атрадзе. У часе бою загінулі 10 акаўцаў. Тым не менш «Юру» ўдалося прабіцца праз ачапленне, і ўжо 11 лістапада атрад узнавіў сваю дзейнасць.

Восенню 1943 г. паміж савецкімі партызанамі, якія ваявалі ў гэтых раёнах, і акаўцамі была заключана дамоўленасць пра ўзаемную дапамогу. Ратуючыся ад няспыннага праследавання немцаў і паліцаяў, атрад «Юра» выйшаў у зону дыслакацыі савецкіх партызанаў. Там ён быў уключаны (па словах Чэслава Голуба, прымусова) у склад аднаго з атрадаў брыгады імя Сталіна ў якасці 3-й (польскай) роты. У той час ён налічваў каля 100 байцоў. У сакавіку 1944 г. разам з брыгадай перайшоў лінію фронту. Былых акаўцаў накіравалі ў 4-ю дывізію 1-й арміі Войска Польскага. Паручнікаў "Юра" і яго намесніка сяржанта Францішка Вайтовіча («Баруту») энкавэдзісты арыштавалі. "Юр" вярнуўся ў Польшчу ў 1955 г., лёс «Баруты» невядомы.

У раёне Пінск — Лунінец з лета 1943 г. дзейнічала група «Ватра-2» пад камандаваннем Чэслава Каміньскага. У канцы снежня была рассеяна савецкімі партызанамі, частка людзей загінула, астатнія паразбягаліся. Падобны лёс напаткаў і групу Казімірчыка («Ясельды»), якая была раззброена савецкімі паблізу Гарадца. На гэты раз абышлося без кровапраліцця. Мірна, без крывавых эксцэсаў далучылі да савецкіх партызанаў і атрад «Араньчыцы» пад кіраўніцтвам Эдварда Ямніцкага («Явара»), які дзейнічаў на тэрыторыі абводу Косава — Пружаны.

Бадай, найбольш трагічна склаўся лёс партызанскай групы «Ватра-3», якую ўзначальваў паручнік Францішак Муханьскі (ксёндз з Антопаля). Вясной 1944 г. у час маршу ў раён Белавежскай пушчы ўся група была знішчана немцамі ля вёскі Шэрашава.

18 красавіка 1944 г. у вёсцы Пелішча каля Высокага ўзнік зародак атрада «Ватра-4» (камандзір Станіслаў Набялак — «Марэк»). Праз два месяцы ад яго адпачкавалася група «Ватра-5», якую ўзначаліў харунжы Казакевіч («Поп»). «Ватра-4» адышла з гэтых мясцінаў у раён прадугледжанай дыслакацыі, «Ватра-5» засталася.

Апошняя 4 ліпеня 1944 г. сутыкнулася з адсталай нямецкай часцю і панясла значныя страты ў людзях.

Тым часам «Ватра-4» прыбыла ў раён Белавежскай пушчы, дзе на базе Палескай акругі па загаду Варшавы павінна была фарміравацца 30-я пяхотная дывізія АК. Жаўнеры энергічна прыступілі да стварэння неабходнай базы, але марнымі былі іх намаганні. Савецкае наступленне было настолькі імклівым, што пра фарміраванне дывізіі не магло быць размовы. 17 ліпеня 1944 г. «Варта-4» была раззброена рэгулярнай чырвонаармейскай часцю ў раёне Пружаны — Белавежа, а назаўтра ў суправаджэнні двух савецкіх афіцэраў дастаўлена ў штаб 8-й гвардзейскай арміі. Супрацоўнікі «Смершу» правялі допыт, але нікога не арыштавалі.

Групу ў поўным саставе накіравалі ў Гайнуўку, а потым — зноў у Белавежу, адкуль яна пешшу рушыла ў напрамку Высокага і далей — у бок Буга. Па дарозе «Ватра-4» папаўнялася новымі сіламі, падбірала кінутую немцамі зброю, і 6 жніўня, калі прыбыла ў раён Сямятычаў, было ў ёй 150 чалавек. Тут пачалося фарміраванне ўпамянутай 30-й дывізіі. Сюды па загаду камандавання прабраліся і людзі з брэсцкай гарадской падпольнай арганізацыі АК.

У апошніх чыслах мая 1944 г. з ваколіцы Атвоцка пад Варшавай на Палессе накіраваўся партызанскі атрад «Давід» (65 чалавек), ім камандаваў капітан Альфрэд Пачкоўскі («Ваня»), ужо добра знаёмы нам па дзейнасці 3-га ўчастка «Вахляжа». Сам ён ураджэнец Пружанаў. Атрад лічыўся элітным, большасць у ім складалі варшавякі — падхарунжыя і падафіцэры. Паводле першапачатковага плана, атрад павінны быў стаць зародкам 84-га пяхотнага палка 30-й дывізіі. Пасля прыбыцця ў раён прызначэння «Ваня» пачаў шукаць кантакты з мясцовымі групамі АК — яму пазарэз былі патрэбныя людзі для папаўнення сваіх шарэнгаў. Аднак выйсці на кіраўніцтва мясцовага падполля не ўдавалася.

29 чэрвеня атрад спыніўся на адпачынак у ваколіцах вёскаў Сушкі і Маньчакі. Адразу пра яго данеслі немцам — солтыс з Маньчакоў і жонка каваля з Ясёнаўкі. Атрад «Вані» знянацку атакавалі рота вермахта, падраздзяленні нямецкай жандармерыі і беларускай паліцыі. Загінула 11 акаўцаў, сярод іх тры савецкія хлопцы, якія вырваліся з нямецкага палону. Яны далучыліся да капітана Пачкоўскага дзесьці на тэрыторыі Польшчы. Лейтэнант Вася, радавыя Алёша і Лёнька. Прозвішчы невядомыя.* У час бою капітан «Ваня» быў цяжка паранены. Страты немцаў, жандармаў і паліцаяў — 52 чалавекі.

Атрад «Давід» адступіў на паўночны захад, і 8 ліпеня, выходзячы з кола аблавы, ля вёсачкі Рускуў ушчэнт разбіў падраздзяленне нямецкай жандармерыі. Павярнуў на поўнач, у раён Сямятычаў, на новае месца канцэнтрацыі 30-й дывізіі АК, якое было перанесена сюды з Белавежскай пушчы ў сувязі з прасоўваннем на захад лініі фронту.

---

* Пазней савецкіх і польскіх воінаў перазахавалі ў брацкай магіле ў вёсцы Верхавічы Камянецкага раёна, устанавілі абеліск. У кастрычніку 1993 г. палякі тут паставілі мемарыяльны крыж.

30-ю дывізію пяхоты было даручана сфарміраваць падпалкоўніку Генрыку Краеўскаму («Чашка»), «ціхацёмнаму», новаму каменданту Палескай акругі АК. Але не ўсе ішло, як хацелася акаўскаму камандаванню. Сфарміраваць не толькі дывізію, але і паўнакроўны полк стала справай праблематычнай. Краеўскі тут быў ні пры чым. Яшчэ ў Варшаве ён некалькі разоў меў гутаркі са сваім папярэднікам Станіславам Добрскім («Жукам») і той не змог паведаміць ніякай дакладнай інфармацыі пра кадравую сітуацыю на Палессі. Напрыклад, група «Ватра-1», якая ўжо даўно перастала існаваць як баявая адзінка АК, была «перададзена» новаму каменданту як дзейная.

К таму часу ў выніку масавых правалаў, карных экспедыцыяў, нямецкіх рэпрэсіяў супраць мірнага насельніцтва ў Брэсцкім гарадскім абводзе АК страты ў асабовым складзе дасягнулі 60%, у Камені Кашырскім — больш за 75%. Абводы АК Пружаны і Столін былі вынішчаны амаль цалкам.

Між тым, камандаванне АК у Варшаве лічыла стварэнне дывізіі адной з важнейшых сваіх задачаў. Пра гэта сведчыць той факт, што ў распараджэнне Краеўскага было накіравана 6 «ціхацёмных», якія справядліва лічыліся залатым фондам АК.

20 ліпеня часці 30-й дывізіі, фарміраванне якой так і не было завершана, прыступілі да выканання акцыі «Навальніца», у той час да яе далучыліся савецкая разведгрупа Макарава, якая пастаянна падтрымлівала радыёсувязь з наступаўшай на гэтым участку 65-й арміяй пад камандаваннем Паўла Батава і перадавала інфармацыю пра рух нямецкіх войскаў. Здарылася так, што ў той момант акаўцы знішчылі штаб нямецкай дывізіі, у іх рукі трапілі сакрэтныя штабныя дакументы, у тым ліку план абароны. Яны былі перададзены савецкім разведчыкам.

Часці Краеўскага сустрэліся з Чырвонай Арміяй непадалёку ад Брэста. Немцы якраз спрабавалі праравацца на Поўнач. Ва ўзаемадзеянні з савецкім артпалком акаўцы ўтрымлівалі невялікі адрэзак фронту ў раёне прарыву 65-й арміі. Пасля фарсіравання пераправы праз Буг услед за савецкімі войскамі часці Краеўскага 6 жніўня ўступілі ў мястэчка Сарнакі, дзе да іх далучылася новае папаўненне з ліку добраахвотнікаў. У раёне Белай Падляскі на працягу некалькіх дзён перафарміроўваліся атрады АК. У колькасным плане асабовы склад дывізіі выглядаў плачэўна. На 10 жніўня 1944 г. у ёй налічвалася каля 1500 чалавек. З запланаваных трох палкоў толькі адзін, 82-гі, трохі набліжаўся да неабходнай лічбы, у 83-м — было ўсяго 150 чалавек.

Пасля таго як Краеўскі атрымаў звестку пра арышт ў Грабоўцы штаба 34-га пяхотнага палка 9-й дывізіі АК (Беластоцкая акруга), раззбраенні гэтага палка савецкімі часцямі, ён паведаміў па рацыі ў Варшаву пра сітуацыю, што склалася, і прыняў рашэнне ісці на дапамогу ўдзельнікам Варшаўскага паўстання.

Планавалі праравацца на левы бераг Віслы і далучыцца да паўстанцаў. І гэтаму плану не суджана было збыцца. У ваколіцах Седльцаў савецкімі войскамі быў раззброены батальён Багуміла Мадэйскага. Асноўныя сілы кватаравалі ў раёне Атвоцка. Тут з усіх

палескіх фарміраванняў АК быў сабраны атрад у колькасці 250 чалавек, для яго выдзелілі самую лепшую зброю.

19 жніўня 1944 г. у Атвоцк прыехалі савецкія грузавікі, яны павінны былі перавезці атрад да Віслы, у раён Сандамірскага плацдарма, дзе рыхтавалася наступленне на Варшаву. Аднак аўтамабілі накіраваліся ў другі бок — праз Мінск Мазавецкі ў Вялікі Дэмб. Тут атрад быў раззброены, афіцэры арыштаваныя і вывезеныя на перасыльны пункт у Брэст, а жаўнераў накіравалі пад канвоем у Майданэк пад Люблін, у лагер для інтэрніраваных.

Хоць і позна, але групы АК зажадалі выступіць разам з савецкімі часцямі супраць немцаў. Прычыны — розныя. Вынік — інтэрніраванасць: абяззбройванне акаўцаў, рассылка па лагерах.

## НАВАГРУДСКАЯ АКРУГА АК

Паняцце «Навагрудская акруга Арміі Карёвай» у сэнсе адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення не адпавядала цяперашняму Навагрудскаму раёну, а ахоплівала абшырную тэрыторыю былога Навагрудскага ваяводства альбо (прыкладна) даваеннай Баранавіцкай вобласці, у складзе якой былі 23 раёны: Юрацішкі — на поўначы, Ляхавічы — на поўдні, Шчучын — на захадзе, Івянец — на ўсходзе. Штаб акругі знаходзіўся ў Лідзе, а ўзброеныя фарміраванні АК дыслакаваліся ў асноўным на правабярэжжы Нёмана. Левабярэжжа кантралявалі беларускія партызаны. Вядома, падзел гэты быў даволі ўмоўны, бо не раз акаўцы суседнічалі з беларускімі партызанамі.

Трэба сказаць, у працах многіх польскіх гісторыкаў па заслузе ацэнены ўклад беларускага народа ў разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гарачы патрыятызм і самаадданасць беларусаў. «Усе спробы акупантаў уцягнуць беларусаў у барацьбу на свой бок не мелі поспеху,— піша доктар навук Мечыслаў Юхневіч.— Аб`яўленая БЦР зімой і вясной 1944 г. усеагульная мабілізацыя ў так званую Беларускую краявую абарону закончылася безвынікова..."

Даючы ацэнку баявой дзейнасці беларускіх партызанаў, Мечыслаў Юхневіч адзначае, што «яны прадстаўлялі сабой сур`ёзную сілу, здольную весці арганізаваную барацьбу з узброеным да зубоў акупантам, кантралявалі стратэгічныя магістралі, узрывалі эшалоны з жывой сілай і тэхнікай праціўніка, атакавалі аўтакалоны на дарогах, дэзарганізавалі работу нямецкай адміністрацыі, вялі ваенную разведку, выконвалі спецыяльныя заданні».

Разам з тым трэба адзначыць, што сярод беларускіх партызанаў баранавіцкага злучэння на гэтай зямлі змагалася каля 500 прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці., раскіданых па розных атрадах і брыгадах, для прыкладу, у брыгадах імя Чапаева, імя Шчорса, імя Жукава, імя Сталіна, імя Панамарэнкі, «26 гадоў БССР». Яны ўдзельнічалі ў большасці баявых акцыяў сваіх фарміраванняў. У складзе брыгадаў імя Сталіна і імя Чапаева ў ноч з 7 на 8 мая 1943 г. грамілі моцны нямецкі гарнізон у мястэчку Налібокі. У жніўні і ў верасні 1943 г. удзельнічалі ў рэйкавай вайне на адрэзку Стаўбцы —

Гарадзея, а ў ноч з 5 на 6 верасня атакавалі нямецкі гарнізон у Сялевічах каля Нясвіжа.

Польскія партызаны мелі добрую рэпутацыю сярод таварышаў па зброі, карысталіся павагай камандзіраў. Дарэчы, і самі выконвалі кіроўныя функцыі. Доктар Бенядзікт Шыманскі быў начальнікам медслужбы Баранавіцкага злучэння. Антон Станкевіч камандаваў брыгадай імя Ленінскага камсамола (раён Ліды і Шчучына). Ян Навіцкі быў намеснікам камбрыга імя Чкалава.

З палякаў ствараліся і асобныя фарміраванні, якія змагаліся пад савецкім кіраўніцтвам,— так званыя зялёныя. У раёне мястэчка Васілішкі дыслакаваўся польскі партызанскі атрад імя Ванды Васілеўскай пад кіраўніцтвам капітана Вацлава Альхімовіча. У апошні перыяд нямецкай акупацыі ў Налібоцкай пушчы быў створаны польскі партызанскі атрад — «Першы батальён Варшаўскага пяхотнага палка імя Тадэвуша Касцюшкі». Ім камандаваў дэсантаваны з Вялікай зямлі паручнік Міхаіл Голдыс. У партызанскім атрадзе імя Будзённага брыгады «26 гадоў БССР" знаходзілася польская рота (камандзір Ян Ліхута), касцяк яе складалі добраахвотнікі з Гарадзішча. У раёне Валожына -- Івянца ў брыгадзе імя Чкалава дзейнічала польская разведвальная група Адама Светажэцкага, былога інспектара АК з Нясвіжа, на базе яе пазней была сфарміравана рота пад кіраўніцтвам рабочага з Лодзі Юзэфа Мархвінскага. Так што не ўсе палякі ў Заходняй Беларусі былі ў радах Арміі Краёвай, як праўда і тое, што не ўся АК на гэтай тэрыторыі складалася выключна з палякаў. Падрабязней пра гэта будзе сказана пазней.

Арганізацыйная сістэма Навагрудскай акругі, паводле Яна Васевіча і Юзэфа Вільбіка, прадугледжвала падзел на «абводы», адпаведныя паветам у рамках польскага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення да 1 верасня 1939 г. У сваю чаргу «абводы» дзяліліся на раёны і пляцоўкі, на базе якіх пазней ствараліся роты і ўзводы. Раён ахопліваў некалькі гмінаў (сельсаветаў) і адпавядаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму дзяленню савецкага часу. Пляцоўка ахоплівала, як правіла, адну гміну (сельсавет). Да мая 1942 г. Навагрудская акруга ахоплівала 5 паветаў: Шчучынскі, Лідскі, Стаўбцоўскі, Навагрудскі і Валожынскі (апошні пазней быў перададзены ў Віленскую акругу). Абодва аўтары даследавання падкрэсліваюць, што 40% жаўнераў Навагрудскай акругі АК — гэта праваслаўныя беларусы*. А калі да гэтай лічбы дадаць беларусаў-католікаў і так званых тутэйшых, то мы ў нейкай ступені будзем мець сапраўднае ўяўленне пра Армію Краёву на гэтай тэрыторыі. Гэта спецыфічна беларускі варыянт змагарнае часці супраць акупанта. Не польскай, як мяркуюць асобныя «знаўцы» з Варшавы.

Першым камендантам акругі быў маёр Мікалай Крайнік («Гжымала»). З восені 1942 г. на гэтай пасадзе яго замяніў падпалкоўнік Януш Шульц (Праўдзіц-Шляскі), які, як мы ўжо ведаем, быў арыштаваны ў 1940 г. органамі НКУС на тэрыторыі Беластоцкай

---

* Па падліках прафесара Аляксандра Хацкевіча з Мінска, у складзе АК на Беларусі было 30--40% беларусаў -- праваслаўных і католікаў.

вобласці. У пачатку вайны ўцёк пры эвакуацыі мінскай турмы на ўсход. На гэтай пасадзе ён знаходзіўся да 12 чэрвеня 1944 г. Пра гэтага чалавека засталіся супярэчлівыя ўспаміны. Справа ў тым, што ў Праўдзіца-Шляскага былі далёка не дружалюбныя, а часам нават і варожыя адносіны са сваім суседам — камендантам Віленскай акругі АК падпалкоўнікам Аляксандрам Кжыжаноўскім («Вількам»). Таму людзі з блізкага акружэння «Вілька» ўспамінаюць пра яго, мякка кажучы, без сімпатыі. Затое паплечнікі Праўдзіца трактуюць свайго былога шэфа з нехаванаю павагаю.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў начальніка штаба Навагрудскай акругі «ціхацёмнага» Станіслава Сэндзяка:** «У пачатку кастрычніка 1942 г. мяне назначылі начальнікам штаба Навагрудскай акругі. Лепей і быць не магло. Навагрудчыну добра ведаў з даваення, няраз думаў, каб туды папасці. У тыя мясціны цягнулі мяне знаёмыя мне людзі. Спадзяваўся таксама, што там буду радзей спатыкацца са здрадаю.

Хутка ў Варшаву прыбыў камендант Навагрудскай акругі падпалкоўнік «Праўдзіц» — Януш Праўдзіц-Шляскі. Бачыўся з ім часта, і з яго расказаў пазнаваў склад штаба акругі, камендантаў абводаў, варункі працы... і стан узбраення, арганізацыю сувязі, расстаноўку нямецкіх сілаў і многія іншыя справы, якія мяне цікавілі. «Праўдзіц» праз два тыдні выехаў у Ліду, а я ўсё яшчэ працаваў у Варшаве...

«Праўдзіц» добра ведаў канспіратыўную справу. Меў талент у падборы патрэбных людзей, што было адной з найважнейшых рысаў кіраўніка такога тыпу. Яго ад'ютант — «Здзіслаў» (падпаручнік Зянон Батаровіч.— Я. С.), былы камандзір узвода 29-га Гродзенскага палка лёгкай артылерыі; намеснікам заставаўся капітан «Сава» — Уладыслаў Ставоўскі, афіцэр з Валожынскай брыгады Корпусу пагранічнай аховы.

Камендант акругі меў сваю, дарэчы, вельмі слушную, канцэпцыю ўзброенай барацьбы ў першым перыядзе стварэння і ўзмацнення канспірацыі. 80% жаўнераў Арміі Краёвай на нашай тэрыторыі былі вяскоўцы. Вораг кантраляваў тэрыторыю. У маёнтках пасадзіў сваіх упраўляючых (фэрвальтэраў), у адміністрацыйныя органы ўкараніў сваіх людзей. Гэта нам пагражала поўнай стратай свабоды дзеянняў, чаго нельга дапускаць. Немцы і падазраваныя ў супрацоўніцтве з імі элементы павінны былі знікнуць не толькі з вёскаў, але і з мястэчкаў.

Тактыка нашай барацьбы з акупантам была наступнай: мы мерыліся знішчыць немцаў і нямецкія ўлады, а потым «дапамагаць» немцам у стварэнні новых органаў адміністрацыі, укараняючы туды сваіх людзей. Гэта не было для нас складаным, бо мясцовыя органы ўлады, асабліва на правым беразе Нёмана, дзякуючы папярэднім загадам штаба акругі, у большасці былі ў нашых руках, што давала нам магчымасць падсоўваць немцам сваіх людзей на пасады там, дзе мы хацелі. Рэдка хто з немцаў ці іх паслугачоў асмельваўся заняць пасаду, якая «асвабаджалася» ў выніку нашых акцый».

Сам Януш Праўдзіц-Шляскі ў 1976 г. выдаў у Лондане кнігу

успамінаў пад назвай «Навагрудчына ў барацьбе 1940—1945». Пэўнае ўяўленне пра жыццёвую і палітычную пазіцыю аўтара, на наш погляд, дае вось такі ўрывак: «Нямецкая разведка не была надта здольная ці небяспечная. Нямецкія жандармы плацілі канфідэнту (даносчыку. — Я. С.) 500 рэйхсмаркаў у месяц, гэта была вялікая сума. Для параўнання: мая стаўка каменданта акругі была ў той час 200 рэйхсмаркаў. Гэтай сумы хапала ў цэлым для нядрэннага задавальнення маіх асабістых патрэбаў. Таму не было нічога дзіўнага, што маса бальшавікоў і энкавэдзістаў супрацоўнічала з гестапа, жандармерыяй і паліцыяй, а таксама тэндэнцыйна нішчыла польскі элемент.

Пры дапамозе высокага нямецкага ваеннага чыноўніка «Н», які супрацоўнічаў з польскай канспірацыяй, была ліквідавана савецкая камуністычная арганізацыя, што перашкаджала нам у працы, падкопвалася пад нашу арганізацыю і садзейнічала масавым арыштам палякаў гестапа, якое на 90% складалася з былога НКУС.

Ліквідаваць такую арганізацыю, якая супрацоўнічала з гестапа, было цяжка. Уступіць у адкрытую барацьбу не выходзіла. Першапачаткова для спробы мы аддалі ў рукі гестапа некалькі членаў камуністычнай арганізацыі. Чакалі выніку, але дарэмна. Праз пару дзён іх выпусцілі і перакінулі для дзеяння на другой тэрыторыі. Мы былі засмучаныя. Пан «Н» (высокі нямецкі чыноўнік) параіў пачакаць, а праз пару дзён даў нам знаць, што на нашу тэрыторыю прыбыў атрад нямецкай тайнай палявой жандармерыі № 400. Мы перадалі ім спісак членаў камуністычнай арганізацыі — каля 40 чалавек. У выніку на працягу двух тыдняў былі арыштаваны 80 чалавек, частку з іх расстралялі, частку вывезлі. Такім чынам, часткова мы заплацілі за нашы крыўды і маглі працаваць далей».

Тое, што Праўдзіц-Шляскі ненавідзеў бальшавікоў і НКУС, зразумела. Чалавек, які зведаў пакуты ў падвалах НКУС і ў савецкай турме, любіць іх не мог. Здзіўляе другое. Беспардонная хлусня каменданта. Факты неабвержана сведчаць, што, пакуль акаўцы спалі, раздумвалі і прыкідвалі што ды як, камуністычнае падполле ў Лідзе дзейнічала, правяло шэраг сур'ёзных акцыяў. Усё гэта пацверджана дакументальна, неаднаразова асвятлялася ў беларускім пасляваенным друку, у тым ліку ва ўспамінах аднаго з кіраўнікоў лідскага падполля Роберта Сасноўскага. І ніхто гэтага не аспрэчыў па сённяшні дзень.

Праўдзіц-Шляскі піша, што лідскае гестапа на 90% складалася з былых супрацоўнікаў НКУС, што тайнымі агентамі гестапа, ці, як выражаецца Праўдзіц-Шляскі, канфідэнтамі, была маса бальшавікоў і энкавэдзістаў, якія прадаліся за рэйхсмаркі. Хлусня, ды й годзе! Не трэба праводзіць ніякіх спецыяльных даследаванняў, каб даказаць даўно ўсім вядомае: камуністаў немцы адразу расстрэльвалі ці кідалі ў канцлагеры. Канешне, траплялся здраднікі сярод камуністаў і энкавэдзістаў, але ж не 40 чалавек адразу — у такім невялікім па тым часе гарадку, як Ліда... Іх усіх разам было меней.

Не выключана, што людзі з акружэння Праўдзіца залажылі, выдалі ворагу патрыётаў-беларусаў.

Да таго, калі верыць Праўдзіцу-Шляскаму, у атрадзе

жандармерыі № 400 знаходзіліся дурні, якія не маглі распазнаць, хто іхні агент, і пачалі расстрэльваць без суда і следства. Разам з тым Праўдзіц-Шляскі ўпарта не хоча прызнаць, што лідскую гарадскую арганізацыю АК выдаў немцам сын сапраўднага польскага афіцэра Ежы Рыпер, сын таго самага маёра-інтэнданта Рыпера, які вясной 1940 г. раскрыў органам НКУС Лідскую арганізацыю польскага ЗВЗ. Бацька прадажнік, і сын прадажнік. Вось і атрымліваецца: з хворай галавы — на здаровую. Можна любіць ці ненавідзець беларусаў, камуністаў, але трэба жыць з фактамі ў ладзе. Асабліва чалавеку, які піша мемуары. У нацяжках і хлусні меру знаць.

У першапачатковым перыядзе арганізацыяй акругі АК займаліся 92 афіцэры і 250 падафіцэраў. Начальнікам аператыўнага аддзела штаба быў капітан Уладыслаў Ставоўскі («Сава»), ад'ютантам каменданта, начальнікам сувязі і легалізацыі — падпаручнік Зянон Батаровіч («Здзіслаў» «Хмара»), начальнікам разведаддзела — капітан Баляслаў Васілеўскі («Бустрамяк»), інтэндантам — падпаручнік Стэфан Мэнкальскі («Дунін»), начальнікам бюро інфармацыі і прапаганды — Станіслаў Ваўжыньчык («Лігенза»), начальнікам інжынернай службы — падпаручнік Юзэф Лубікоўскі («Сібірак»), шыфравальшчыцамі штаба — Марыя Купрыяновіч («Марыя»), Аліна Яноўская («Сава»), кур'ерамі штаба — Рэгіна Даноўская («Котка») і «Хільда» (прозвішча невядома).

Да лістапада 1942 г. арганізацыя акругі была завершана.

Абвод Шчучын (кодавая назва «Лэнка» — «Луг») узначаліў падпаручнік Казімір Кшывіцкі («Веслаў»).

Абвод Ліда («Бор») — Ольгерд Кушалеўскі («Суліма»).

Абвод Валожын («Бжоза» — «Бяроза») — капітан Станіслаў Дэдэліс («Паль»).

Абвод Навагрудак («Ставы») — Людвік Ненартовіч («Мядзянка»).

Абвод Стаўбцы («Слуп») — падпаручнік Аляксандр Варакомскі («Свір»).

Абвод Слонім («Пяскі») — капітан Мечыслаў Астроўскі («Картач»).

Абвод Баранавічы («Пушча») — капітан «Юзэф» (прозвішча невядома).

Абвод Нясвіж («Стражніца») — паручнік Мацей Вінтэр («Станлей»).

Першая партызанская група Навагрудскай акругі АК з'явілася ў чэрвені 1942 г. Гэта быў невялікі атрад пад нумарам 301, якім кіраваў афіцэр былога 23-га ўланскага палка падпаручнік Ян Скорб. У 1943 г. у лес выйшлі другія атрады. Як правіла, яны насілі чырвонаармейскую форму, каб не наклікаць збоку немцаў рэпрэсій супраць мясцовага польскага насельніцтва. Менавіта ў такой экіпіроўцы ў лютым 1943 г. рушыў з Ліды са сваімі людзьмі ў ваколіцы Беліцы падпаручнік Стэфан Заянчкоўскі («Рагнар»). Яго атрад атрымаў нумар 342, а ўжо ў ліпені колькасна пераўзыходзіў батальён.

Прыкладна ў той жа час у раёне Лугамовічы — Трабы — Юрацішкі быў створаны 321-ы атрад, якім камандаваў падпаручнік

Эдзіслаў Булак-Балаховіч («Здрой») — сын смутна вядомага на Беларусі з часоў грамадзянскай вайны генерала Булак-Балаховіча.

Неўзабаве ад 301-га (Шчучынскага) атрада адасобіліся аддзельная дыверсійная група падпаручніка «Вальтэра» і новы, 313-ы атрад пад кіраўніцтвам паручніка «Саўкі». Рэшта 301-га атрада, падмацаваная свежымі сіламі (да 100 чалавек) і ўзбраеннем, перадыслацыравалася на правабярэжжа Нёмана.

У гэты час змяніўся камандзір атрада — замест «Пушчыка», які стаў ад'ютантам каменданта акругі, быў прызначаны ротмістр Юзэф Сьвіда («Лех»), ужо знаёмы нам былы рэзідэнт польскай разведкі ў Мінску, сын былога ўладальніка маёнтка Малеч на Брэстчыне. Пасля правалу ў Мінску нейкім чынам яму ўдалося вырвацца з турмы. У Варшаве атрымаў назначэнне ў Навагрудскую акругу.

Летам 1944 г. у трохкутнік Нача — Воранава — Эйшышкі вывеў свой атрад (314-ы) падпаручнік Ян Барысевіч («Крыся»), кіраўнік канспіратыўнай сеткі ў Васілішках і ваколіцах. Пад канец лета 1943 г. на тэрыторыі абводу Баранавічы быў арганізаваны 341-ы партызанскі атрад пад кіраўніцтвам падпаручніка «Міхала».

У кастрычніку ў раён Іўя з сярэдняй Польшчы прыбыў ўдарны кадравы батальён пад камандаваннем Баляслава Пясэцкага («Саблеўскага») і паручніка Станіслава Каралькевіча («Шчэнснага»). Першы быў адным з палітычных дзеячаў Канфедэрацыі народа, крайне рэакцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі пілсудчыкаў, другі — кадравым афіцэрам. Першы ў асноўным займаўся палітычнай работай, дарэчы, да вайны ён узначальваў у Польшчы радыкальна-нацыяналістычную, прафашысцкую арганізацыю «Фаланга». Другі адказваў за справы вайсковыя. Батальён быў укамплектаваны ў асноўным гарадской моладдзю з Мазоўша і Падляшша, меў у сваім складзе многа афіцэраў і падафіцэраў.

Нарэшце, на пераломе 1923/24 гг. у распараджэнні акругі прыбывае знаёмы нам з аперацыі па вызваленню вязняў пінскай турмы Ян Піўнік («Панур»).

У далейшым штаб акругі правёў рэарганізацыю акругі. На базе ранейшых і пазней створаных атрадаў былі сфарміраваны батальёны, з іх аб'ядноўваліся злучэнні. На базе злучэнняў прадугледжвалася стварэнне палкоў, існоўных на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства да верасня 1939 г., а іменна: 77-ы пяхотны полк (Ліда), 78-ы пяхотны полк (Баранавічы), 27-ы полк уланаў (Баранавічы). Такім чынам, у канчатковай фазе ваенная структура Навагрудскай акругі, паводле даследавання Яна Васевіча і Юзэфа Вільбіка, выглядала так:

1. Наднёманскае злучэнне — камандзір маёр Мацей Калянкевіч («Котвіч»). Склад злучэння: 1-ы батальён 77-га пяхотнага палка, 700 чалавек, камандзір капітан Уладыслаў Жогла («Зых»); 4-ы батальён і прыданы яму эскадрон уланаў, 1600 чалавек, камандзір падпаручнік Стэфан Заянчкоўскі («Рагнар»); 8-ы батальён, 200 чалавек, камандзір Тадэвуш Масакоўскі («Ястшэмбец»).

2. Паўночнае злучэнне — камандзір паручнік Ян Барысевіч («Крыся»). Склад злучэння: 2-гі батальён 77-га пяхотнага палка, 650

чалавек, камандзір «Крыся»; 5-ы батальён, 300 чалавек, камандзір капітан Станіслаў Трушкоўскі («Штрэмер»).

3. Усходняе злучэнне — камандзір Станіслаў Дэдэліс («Паль»). Склад злучэння: 3-ці (ударны кадравы) батальён 77-га пяхотнага палка, 480 чалавек, камандзір падпаручнік Баляслаў Пясэцкі («Саблеўскі»); 6-ы батальён, 520 чалавек, камандзір Станіслаў Дэдэліс.

4. Заходняе злучэнне — камандзір Ян Піўнік («Пануры»). Склад злучэння: 7-ы батальён 77-га пяхотнага палка, 780 чалавек, камандзір Ян Піўнік, пасля смерці 16.06.1944 г. яго замяніў падпаручнік Баямір Тважыньскі («Астоя»).

5. Стаўбцоўскае злучэнне — камандзір паручнік Адольф Пільх («Гура», «Даліна»). Склад злучэння: 1-ы батальён 77-га пяхотнага палка, 700 чалавек, камандзір капітан (ваенны лётчык) Вітольд Грыневіч («Дзвіг»); 27-ы уланскі полк, 350 чалавек, камандзір харунжы Здзіслаў Нуркевіч («Ноч», «Нячай»).

У часе падрыхтоўкі да акцыі «Бура» дадаткова былі сфарміраваны: Нясвіжскі батальён, 500 чалавек, камандзір паручнік Мацей Вінтэр («Станлей»), Баранавіцкі батальён, 700 чалавек, камандзір паручнік «Юзэф-2» (прозвішча невядома). Паводле Януша Праўдзіца-Шляскага, у канчатковай фазе свайго існавання Навагрудская акруга налічвала каля 8000 чалавек непасрэдна ў баявых часцях. Акрамя гэтага, у канспіратыўнай сетцы было задзейнічана болей 15 тысяч чалавек (маюцца на ўвазе асобы, якія прынялі прысягу).

Як ужо адзначалася, 16 чэрвеня 1944 г. загінуў самы славуты партызан Арміі Краёвай паручнік «Пануры». Здарылася гэта пры разгроме нямецкай пагранічнай заставы ў Еўлашах (Шчучынскі раён). Аперацыя пачалася даволі ўдала, заставалася захапіць толькі адзін бункер, у якім абараняўся нямецкі унтэр-афіцэр. «Пануры» падняў узвод у атаку і са сваім ад'ютантам рабіў кароткую перабежку. У гэтым час і быў скошаны кулямётнай чаргой. Загінула яшчэ 8 акаўцаў. «Панурага» — Яна Піўніка — пахавалі ў мястэчку Ваверка (Лідскі раён) ля муроў касцёла.

Паводле падлікаў Януша Праўдзіца-Шляскага, з першага студзеня 1942 г. і да прыходу Чырвонай Арміі фарміраванні АК Навагрудскай акругі правялі 102 узброеныя сутычкі з немцамі. Сапраўды, дакументальна пацверджана, што ў гэты перыяд акаўцы правялі некалькі дзесяткаў лакальных, часам даволі дзёрзкіх акцыяў супраць немцаў і паслугачоў. Напрыклад, налёты на варожыя гарнізоны ў Радуні, Беняконях, Юрацішках, Шчучыне, вызваленне зняволеных лідскай турмы, праўда, толькі «сваіх», дыверсіі на лініях камунікацый, знішчэнне штутцпунктаў на скрыжаваннях дарог і г. д. Летам 1944 г. былі знішчаны 7 нямецкіх пагранічных заставаў.

Але разам з тым лічба ўзброеных сутычак (102) з немцамі, прыведзеная былым камендантам Навагрудскай акругі, выклікае сумненне. Спашлюся на такія факты. У працы Праўдзіца-Шляскага пералічаны ўсе населеныя пункты, ля якіх ці ў якіх прахoдзілі баі, засады, дыверсіі, некаторыя месцы — з указаннем дакладнай даты акцыі. Адзначаецца, напрыклад, што 3-ці батальён АК правёў

аперацыю ў Станкевічах, 7-ы батальён — у Скрыбаўцах. Між тым у выніку роспытаў мясцовых жыхароў старэйшага пакалення гэтых і навакольных вёскаў, усе яны, як адзін, сцвярджаюць, што ў той час тут не прагучаў ніводны стрэл, ніхто не чуў пра якія-небудзь сутычкі з немцамі.

Шчучын у працы Праўдзіца-Шляскага ў гэтым кантэксце ўспамінаецца тройчы. Але добра вядома, што сапраўдная баявая аперацыя супраць нямецкага гарнізона ў Шчучыне была толькі адна, у ёй, дарэчы, загінулі 43 акаўцы. Вечная ім памяць!

Кожнаму зразумела, не знойдзеш, бадай, ні аднаго баявога камандзіра ці военачальніка, каб ён наўмысна змяншаў колькасць сваіх перамогаў і павялічваў паражэнні. Хутчэй наадварот. Асабліва гэтым хварэюць аўтары пасляваенных мемуараў. Армейцы і партызаны, блізкія і далёкія, за гэтымі граніцамі і за тымі граніцамі. Чалавечая слабасць — паказаць сябе з лепшага боку — асабліва прачытваецца ў пазнейшых мемуарыстаў. У таго, хто пісаў не пасля падзеі, а праз гады пасля падзеі.

Таму не будзем ставіць у вялікую віну гэтую нязлосную хваробу — пераўвелічэнне польскіх заслугаў — Праўдзіцу-Шляскаму. Нас цікавіць зусім іншае. Нават у параўнанні з вялізнымі маштабамі Другой сусветнай вайны 8000 чалавек у батальёнах (плюс больш 15 тысяч у падполлі) — гэта не малая сіла. Дарэчы, усе партызаны АК былі вельмі добра ўзброеныя і нядрэнна абмундзіраваныя. Як адзначае ў сваіх успамінах начальнік штаба акругі Станіслаў Сэндзяк, без зброі добраахвотнікаў у батальёны не залічвалі.

Факты сведчаць, што гэтая сіла не была па-сапраўднаму пушчана ў ход, не змагла рэалізаваць свае магчымасці супраць немцаў, спаўна выкарыстаць наяўны падпольны і ваенны патэнцыял. Чаму?

Чаму ўзброеныя і добра абучаныя фарміраванні Навагрудскай акругі, дарэчы, і другіх рэгіёнаў Беларусі, засталіся практычна ў баку ад антыфашысцкай барацьбы? Чаму камандаванне акругі адказалася ад баявога супрацоўніцтва з кіраўніцтвам савецкіх партызанскіх злучэнняў і фактычна займала вычакальную пазіцыю?

Калі пагартаць старонкі працаў некаторых польскіх навукоўцаў, асабліва аўтараў мемуараў, якія жывуць ці жылі ў эміграцыі, то ў іх адказ па сутнасці зводзіцца да аднаго і таго: вінаватыя Масква і камандаванне савецкімі партызанамі. Вінаватыя ў тым, што не адмовіліся ад «Крэсаў Всходніх». Вінаватыя, што былі прынятыя Тэгеранскае і Ялцкае пагадненні. Вінаватыя, што былі дэпартацыі польскага насельніцтва (як быццам беларусаў ці ўкраінцаў не дэпартавалі). Беларусы вінаватыя ў Катынскай трагедыі. Вінаватыя, што некаторыя савецкія партызанскія камандзіры павялі сябе з акаўцамі, мякка кажучы, не па-джэнтльменску (быццам афіцэры АК з самага пачатку загарэліся да Саветаў вялікай любоўю).

Гэты спісак абвінавачанняў і прэтэнзіяў можна прадаўжаць.

Так, сапраўды Масква была вінавата ў многім. Але калі спыніцца адно на віне Масквы, гэта будзе далёка не ўся праўда. Гэта будзе частка праўды. Другую яе частку трэба шукаць у многім недальна-

бачнай, прама скажам, крайне антысавецкай — асабліва пасля трагічнай гібелі разважнага і мудрага Сікорскага — палітыцы польскага эміграцыйнага ўрада ў Лондане. Гэты ўрад ні ў якім разе не хацеў зміръщца з існуючым статус-кво на ўсходніх граніцах. Урад выступіў з лозунгам «двух ворагаў». Менавіта адсюль выходзіў і другі лозунг, звернуты да Арміі Краёвай на «крэсах»: «Стаяць са зброяй ля нагі!» Інакш кажучы — не выступаць супраць гітлераўцаў. Чакаць. Чакаць! Чакаць!

Хто чакаў? Як сведчаць успаміны Станіслава Сэндзяка, 80 працэнтаў складу Навагрудскай акругі АК складалі сяляне-беднякі і серадняі, многія з іх нават не ўмелі чытаць і пісаць. Ім, безумоўна, вельмі складана было разабрацца ў хітрасплятеннях і нюансах тагачасных палітычных рэаліяў.

На нашу думку, трэба з вялікай пашанай ставіцца да памяці загінулага на беларускай зямлі ў баі з немцамі, легендарнага ў Польшчы Яна Піўніка («Панурага»). Партызан, сапраўдны патрыёт сваёй радзімы, ён не шкадаваў жыцця ў барацьбе за незалежнасць Польшчы. Палажыў галаву.

Разам з тым гэта быў чалавек свайго часу, з усімі ўласцівымі яго пакаленню стэрэатыпамі поглядаў. Дык вось, у архівах дзяржбяспекі захоўваецца данясенне савецкага разведчыка, якое непасрэдна датычыцца гераічнага «Панурага».

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. «Зусім сакрэтна. Даведка № 1973.**

**Карэспандэнт № 36 Давыдаў 5.06.44 г. паведамляе поўны тэкст нядаўняга загаду камандзіра белапольскага батальёна Панурага:**

**«Партызанам гэтых раёнаў...**

**У сувязі з тым, што ваша дзейнасць не адпавядае інтарэсам польскага народа і польскай дзяржавы, загадваю вам спыніць яе. Даю вам тэрмін да 1 чэрвеня 1944 г., на гэты час загадваю вам:**

**1. Альбо ліквідаваць усе свае (цяперашнія) сувязі і перайсці за Нёман на службу жыдоўска-бальшавіцкіх бандаў;**

**2. Альбо з'явіцца да мяне са зброяй (...) у польскія партызанскія часці, каб разам абараняць мясцовае насельніцтва, незалежна ад нацыянальнасці і рэлігіі (...), ад грабежнікаў і бандытаў як нямецкіх, так і жыдоўска-бальшавіцкіх.**

**У выпадку невыканання майго загаду да вызначанага тэрміну, мы будзем вымушаныя ліквідаваць вас узброеным шляхам. Злоўленых аддам пад суд.**

Камандзір 7-га **пяхотнага палка «Пануры».**

У заключэнне савецкі разведчык паведамляе:

**«Нядаўна тут белапалякі спалілі болей 30 хутароў і знішчылі мірнае насельніцтва за сувязь з савецкімі партызанамі».**

Хто мае вочы — бачыць. У загадзе героя, камандзіра батальёна ўсё сказана ясней яснага. Палякі не проста чакалі, хітравалі.

Яны падлічалі. Пралівайце кроў вы. Знішчайце адзін аднаго. Мы пачакаем. Мы змусім вас да пакоры і падначалення. Наш час блізка.

Карэспандэнт № 36 — гэта чалавек, які працаваў на чэкісцкую спецгрупу «Наватары» НКДБ БССР, дэсантаваную ў Заходнюю Беларусь. Загад "Панурага" ў штаб атрада польскіх партызанаў імя Ванды Васілеўскай (камандзір Вацлаў Альхімовіч), да так званых зялёных.

Калі падысці да справы нефармальна, то ў загадзе, як і ў асобе яго аўтара, увасоблены ўсе супярэчлівасці тагачаснага перыяду. «Пануры», сялянскі сын з цэнтральнай Польшчы, не які там шляхецкі выскачка, а чалавек, які выбіўся ў афіцэры, дзякуючы выключна асабістым якасцям — кемлівасці, мужнасці. Ён недалюбліваў паноў і паўпанкаў. «Пра «Панурага»,— успамінае Станіслаў Сэндзяк,— сярод мясцовага насельніцтва ішла пагалоска як аб найсправядлівым чалавеку. Затое на яго трохі абуралася тутэйшая засцянковая шляхта, ад якой «Пануры» дамагаўся, каб перш за ўсё яна «свяціла» прыкладам. Сялянаў надта суцяшала, калі ад паручніка «атрымлівалі па заслугах» які-небудзь ганарлівы мясцовы шляхцюк або ўладальнік маёнтка, якога немцы вызначылі быць «фэрвальтэрам» (упраўляючым)».

З другога боку, Ян Піўнік («Пануры»), быў сынам свайго часу з усімі перажыткамі, прадузятасцямі, перакананнямі. Выхаваны ў духу нянавісці да ўсяго савецкага, да партызанаў, да Чырвонай Арміі, хоць яна і несла вызваленне ад чумы фашызму народам Еўропы, у тым ліку і радзіме «Панурага». Так, ён мог заступіцца за селяніна і аддаць загад усыпаць 10 ці 25 шомпалаў шляхцюку, але гэты ж самы чалавек мог пагражаць смерцю, як гэта бачна з загаду, адзінакроўным братам-палякам (зялёным), бо тыя асмельваліся думаць і рабіць хоць крыху што не так, як хацелася правіцелям з Лондана. Калі б «Пануры» не загінуў ад кулі немца, можна не сумнявацца, яго спасцігнуў бы той самы лёс, што і «Котвіча», «Рагнара», «Крысю» і многіх іншых, якія адразу пасля выгнання з тэрыторыі «крэсаў» немцаў выступілі са зброяй у руках супраць Саветаў.

У барацьбе з «праклятымі» бальшавікамі актыўнасць акаўцаў была поўная, праявілася адразу. Без вычаканняў.

Праўда, за іх актыўнасць і гераізм на крэсах лілася беларуская кроў. Беларусы-каталікі і праваслаўныя, запісаныя палякамі, альбо засталыя на адвечна радзінных запісах — беларус — дабраахвотна ці з прымусу ваявалі за пальшчызну. За чужаніцтва.

Расплачваліся за дурату не адныя воіны. Іх сем'і.

...Такім чынам, менавіта ў лозунгу «двух ворагаў», у першую чаргу, ляжалі вытокі трагедыі простых беларускіх і польскіх людзей, патрыятызм, адданасць радзімай зямлі, высокую ступень рэлігійнасці якіх польская вярхушка выкарыстоўвала для дасягнення сваёй вузкаэгаістычнай і, як выйшла на паверку, недасягальнай мэты. Здарылася тое, што ўжо неаднойчы было ў гісторыі: безадказныя палітыканы робяць непапраўныя памылкі, а разлічваецца за іх так

званы маленькі чалавек, уласнымі пакутамі і крывёю. І пакутамі сяброў, крэўных.

## ВІЛЕНСКАЯ АКРУГА АК

Вільня — «паўночная Венецыя», «жамчужына ў кароне», па сведчаннях польскіх гісторыкаў. Горад і ў час нямецкай акупацыі заставаўся Вільняй. Даваенныя дэпартацыі, фашысцкія рэпрэсіі моцна паўплывалі на духоўную атмасферу горада, але не ўсё было вынішчана. Яшчэ заставалася багата інтэлігенцыі — мозгу нацыі, — а там, дзе інтэлігенцыя, абавязкова заструменіць інтэлектуалізм, палітычнае жыццё. Няхай сабе і прыглушанае, канспіратыўнае ці напаўканспіратыўнае, але яно абавязкова будзе, бо такая ўжо гэтая «праслойка». Заўсёды думае. А раз думае, то без палітыкі не можа.

У Вільні і на Віленшчыне акупацыйную рэчаіснасць насельніцтва ўспрыняло неадназначна. Частка інтэлігенцыі, сярод яе прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў — літоўцы, палякі, беларусы, — адкрыта падтрымала немцаў. Большасць паставілася нейтральна. Але вельмі шмат былі настроеныя да захопнікаў варожа, сталі на шлях падпольнай барацьбы. У першую чаргу левыя, пракамуністычныя сілы, падпарадкаваныя літоўскаму штабу партызанскага руху на чале з Антанасам Снечкусам. Пад уплывам камуністаў была і падпольная арганізацыя Віленскага гета (да вайны ў горадзе пражывала больш як 55 000 яўрэяў). Гетам кіраваў Ісаак Віттэнберг. Левыя сілы палякаў аб'яднаў для антыфашысцкай барацьбы былы студэнт факультэта права Віленскага універсітэта, палітвязень у даваенных польскіх турмах Ян Пшэвальскі, ён жа — другі сакратар Віленскага падпольнага гаркама Кампартыі Літвы.

У красавіку 1943 г. з Вялікай зямлі на Віленшчыну быў дэсантаваны Вітольд Сянкевіч, паляк па нацыі. Ён стаў камісарам партызанскай брыгады імя Адама Міцкевіча, аснову якой складалі палякі. У цэлым брыгада была інтэрнацыянальнай.

Адначасова Сянкевіч рэдагаваў падпольную антыфашысцкую газету «За вольнасць», якая выдавалася на польскай мове. У 1943 годзе быў створаны Саюз польскіх патрыётаў. Яго ўзначаліў Ян Пшэвальскі. Саюз прызываў палякаў дапамагаць Чырвонай Арміі ў барацьбе з немцамі, выступаў за стварэнне польскай дзяржавы ў этнічных граніцах, за гарманічнае супрацоўніцтва з СССР пасля вайны. Адначасова сцвярджаў, што польскі ўрад у Лондане не з'яўляецца правамочным прадстаўніком польскага народа. Саюз выдаваў сваю газету — «Штандар вольнасьці» («Сцяг свабоды»). У 1944 г. гестапа выйшла на след Яна Пшэвальскага, патрыёта закатавалі ў турме.

Частка літоўцаў не захацела супрацоўнічаць ні з немцамі, ні з камуністамі, стварылі сваю арганізацыю, праўда, нешматлікую,— Літоўскую падпольную армію (літоўская абрэвіятура — ЛЛА). 30 чэрвеня 1942 г. па ініцыятыве групы польскіх незалежнікаў з Віленскай дэмакратычнай канцэнтрацыі адбылося спатканне з

прадстаўнікамі ЛЛА. Літоўскі бок прадстаўлялі 2 сацыялісты і два «людоўцы» — «народнікі». Ад палякаў у сумеснай канферэнцыі прынялі ўдзел сацыяліст Ежы Дабжаньскі, Людвік Хмай (Народная партыя), Эдмунт Грачанік (Дэмакратычная партыя) і Казімір Кравец (беспартыйны). Абмяркоўваліся праблемы сумеснага супрацоўніцтва і пасляваеннага ўстройства. Канкрэтнае рашэнне не прынялі.

Наступная літоўска-польская канферэнцыя адбылася восенню 1942 г. Літоўцы патрабавалі ў палякаў: каму будзе належаць Вільня? З польскага боку ўхіліліся ад прамога адказу: гэтае пытанне трэба адкласці да заканчэння вайны, каб яго потым на мірнай падставе маглі вырашыць прадстаўнікі законных урадаў зацікаўленых бакоў. Такім чынам, і гэтая канферэнцыя закончылася безвынікова.

Трэцяе, апошняе, літоўска-польскае спатканне адбылося на пераломе 1943/44 гг., на якім дыскутавалася праблема пра магчымасці стварэння сумеснага антынямецкага фронту. З Каўнаса прыехала дэлегацыя ад прэзідыума Камітэта незалежнай Літвы (літоўская абрэвіятура — НЛК). Пытанні абмяркоўваліся тыя самыя: граніцы, прадухіленне нацынальных канфліктаў, канцэпцыя стварэння Канфедэрацыі дзяржаў Усходне-Сярэдняй Еўропы. Намеры і словы так і засталіся словамі, бо ад удзельнікаў гэтых спатканняў тады вельмі мала залежала, а яшчэ правільней будзе сказаць — нічога не залежала. Лёсы пасляваеннага ўстройства вырашаліся ў Тэгеране і Ялце, і толькі там.

Аднак у кантэксце даследаванай тэмы нас больш ад усяго цікавяць тыя палітычныя плыні, якія былі непасрэдна звязаны з АК. Трэба сказаць, па сваіх ідэйных накірунках гэтыя сілы былі крайне разнашэрсныя. Дзейнічалі Нацыянальная партыя, Народная партыя, Польская сацыялістычная партыя, Віленская дэмакратычная канцэнтрацыя, арганізацыя пілсудчыкаў і г. д. Бадай, самы моцны ўплыў на польскае і беларускае насельніцтва мела каталіцкае духавенства.

Камендант Віленскай акругі АК падпалкоўнік Аляксандр Кжыжаноўскі («Вільк»), кадравы афіцэр артылерыі, быў рамантыкам па натуры, але з вялікімі палітычнымі амбіцыямі. Нездарма многія афіцэры, асабліва з акружэння Праўдзіца-Шляскага, каменданта Навагрудскай акругі, ставіліся да «Вілька» з непрыязню, лічылі, што той уявіў сябе правадыром і палітычным лідэрам усіх паўночна-ўсходніх земляў, гэта значыць — Віленшчыны і Навагрудчыны, для чаго, на думку паплечнікаў Праўдзіца-Шляскага, у Кжыжаноўскага не хапала неабходных здольнасцяў і якасцяў.

Так яно было ці не так, не нам меркаваць, асабліва заднім чыслом, але факт застаецца фактам: віленскі камендант імкнуўся і ўмеў падтрымліваць найлепшыя адносіны з усімі палітычнымі плынямі на тэрыторыі акругі. Зразумела, акрамя «чырвоных элементаў». У красавіку 1942 г. дэлегатам жонду (прадстаўніком лонданскага ўрада) пры камандаванні акругі быў прызначаны Зыгмунд Федаровіч (Нацыянальная партыя), а яго намеснікамі сталі прадстаўнікі практычна ўсіх дробнабуржуазных і нацыяналістычных групоўкаў ,а таксама ксёндз Кісель ад Віленскай курыі. Пры дэлегатуры быў створаны

дарадчы орган — Канвент палітычных партыяў. Потым па ініцыятыве «Вілька» і пры яго непасрэдным удзеле з`явіўся Палітычны камітэт падпольнай барацьбы, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі розных палітычных групоўкаў. Да ўсяго гэтага трэба дабавіць Бюро інфармацыі і прапаганды (БІП), якое непасрэдна падпарадкоўвалася 4-му аддзелу штаба АК у Варшаве.

Кіраўніком віленскага БІПу стаў сацыяліст Ежы Дабжыньскі. Ён рэдагаваў падпольны двухтыднёвік «Непадлегласць» («Незалежнасць»), аб`ём 6—12 старонкаў. Першы яго нумар выйшаў 15 ліпеня 1942 г., апошні — ужо пры Саветах, дарэчы, таксама ў падполлі, у снежні 1944 г. На яго старонках адлюстраваліся галоўныя напрамкі акаўскай прапаганды на «крэсах»: адзіны законны ўрад Польшчы — эміграцыйны ўрад у Лондане; граніцы Польшчы па стану на 31.08.1939 г. павінны заставацца непарушнымі; барацьба да поўнай перамогі і здабыццё незалежнасці.

Літаратура пра Віленскую акругу АК вельмі багатая і разнастайная. У пасляваенныя гады паявіліся навуковыя працы, мемуары, мноства артыкулаў у перыёдыцы на Захадзе (Англія, Францыя, ЗША, Канада) і ў самой Польшчы. Сярод іх — фундаментальная манаграфія «Віленская аперацыя АК» Рамана Кораба-Жэбрыка, публіцыстычнае даследаванне «Вострая Брама» Яна Эрдмана, кнігі ўспамінаў — «Віленскі гадавальнік» Браніслава Кжыжаноўскага, «Над Нёманам і Ашмянкай» Тадэвуша Гаштольда, нарыс "Псеўданім "Лупашка" Дарыуша Фікуса, белетрыстыка Сергіуша Пясэцкага і Юзэфа Мацкевіча. Але, на наш погляд, найбольшую цікавасць для даследчыка тэмы прадстаўляе кніга Эдмунда Банасікоўскага «На заклік Віленскай зямлі».

Хаця, як і большасць мемуараў, яна, канешне, таксама грашыць суб`ектывізмам.

Больш аб`ектыўнай і грунтоўнай выглядае праца Кораба-Жэбрыка, але яна ахоплівае даволі кароткі прамежак часу ў дзейнасці АК на Віленшчыне, а дакладней — яе канчатковую фазу. На гэтым фоне кніга Банасікоўскага выгадна вылучаецца, у ёй пададзены практычна ўвесь перыяд віленскай эпапеі АК — ад арганізацыі акругі да разгрому яе органамі НКДБ. Болей таго, аўтар прасочвае пасляваенныя лёсы найбольш значных фігураў канспірацыі.

З Эдмундам Банасікоўскім мы ўжо сустракаліся, калі вялі гаворку пра трохвугольнік «Б» 4-га ўчастка «Вахляжа» (раён Глыбокага — Круляўшчызны — Полацка). Пасля ліквідацыі «Вахляжа» ён назначаецца намеснікам камандзіра інспектарату «Ф» (Ашмяны — Вілейка — Маладзечна) Віленскай акругі АК. Затым — афіцэр па аператыўных пытаннях штаба 3-га злучэння (Ашмянскага).

Пасля акцыі «Вострая Брама» і прыходу Чырвонай Арміі ён удзельнік антысавецкага падполля на Віленшчыне. Разам з Антоні Снарскім («Сольным») рэдагаваў падпольную газету «На зэв земі ойчыстэй» — «На прызыў бацькаўшчыны». Потым нелегальна перабіраецца ў Польшчу, а адтуль, у красавіку 1946 г., у Швецыю. З 1951 г. жыў у ЗША.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Эдмунда Банасікоўскага:** «У палове мая 1943 г. я прыбыў у фальварак Ройсты, у трох кіламетрах на поўнач ад Ашмян. Там мяне чакаў інспектар «Худы» (Чэслаў Дэмбіцкі, ён жа «Ярэма».- - Я. С.). Гэта была не першая наша сустрэча. Год назад, пасля загаду Варшавы аб правядзенні акцыі пад кодавай назвай «Мінскі кірмаш», мэтай якой была ізаляцыя чыгуначнага вузла ў Мінску Літоўскім (так ён называе Мінск, сталіцу Беларусі, — Я. С.), я апынуўся ў фальварку Лаўскі Брод (Валожынскі раён.— Я. С.), каб далучыцца да групы людзей, адкамандзіраваных у маё распараджэнне з Варшавы.

У доме Рамуальда Радзевіча (гаспадара фальварка.— Я. С.) я тады пазнаёміўся з «Худым», але не ведаў, што ён быў кіраўніком канспірацыі ў тутэйшых раёнах. Напэўна, нечым яму прыглянуўся, бо калі ён даведаўся, што пасля разгрому і ліквідацыі «Вахляжа» я знаходжуся ў распараджэнні штаба Віленскай акругі, папрасіў «Вілька» накіраваць мяне ў яго інспектарат. Псеўданім «Худы» быў у вострым кантрасце з сапраўднай постаццю ашмянскага інспектара. Высокі, мажны, моцнай будовы, ён чымсьці прываблівал да сябе людзей. Нарадзіўся ў Івашкевічах на Падоллі ў 1899 г., выхадзіўся ў Адэсе, дзе скончыў гімназію. У 1919 г. добраахвотнікам уступіў у легіён, у першы полк лёгкай артылерыі. За кампанію 1919—1920 гг. адзначаны ордэнам Віртуці Мілітары і 4 разы — Крыжам Валечных. Пасля заканчэння польска-бальшавіцкай вайны камандзір узвода ў падраздзяленні, якое было ў асабістым распараджэнні маршала Пілсудскага. Пасля дэмабілізацыі скончыў у Варшаве Вышэйшую школу сельскай гаспадаркі, атрымаў дыплом інжынера-агранома.

У 1925 г. «Худы» («Ярэма») асеў на Віленшчыне, ажаніўся з пані Геленай, яна з дочкамі Ірэнай і Ганнай была яго верным спадарожнікам па рабоце ў польскім падполлі — ад восені 1939 г. да апошніх хвілінаў крывавай драмы тых земляў. У перадваенны перыяд, 1936—1938 гг., Чэслаў Дэмбіцкі з`яўляўся дэпутатам сейма. Акрамя баявых узнагародаў, «Ярэма» быў удастоены Залатога крыжа заслугі і ордэна Палонія Рэсцітута.

«Ярэму», даўняга, выпрабаванага супрацоўніка «Вілька» ў віленскім падполлі, ён прызначыў кіраўніком інспектарату Ашмяны.

У доўгай і сяброўскай-гутарцы «Ярэма» стараўся прадставіць мне дзейнасць руху супраціўлення на Ашмяншчыне ад моманту ўступлення на гэтую зямлю гітлераўскіх войскаў. Расказваў мне пра знішчэнні жыдоўскага насельніцтва спецыяльным падраздзяленнем СС, успамінаў аб мясцовых польскіх сабатажных акцыях і пра стан канспіратыўнай сеткі інспектарату. Гаворачы аб сваіх планах на будучыню, даваў мне поўную волю дзеянняў пры стварэнні баявых адзінкаў на падведамнай яму тэрыторыі. Аднак папрасіў, каб для пачатку пазнаёміўся з мясцовасцю і людзьмі, якія ў розных раёнах займаюць тыя ці іншыя пасады і чакаюць канкрэтных указанняў. Ашмянскі інспектарат «Ф» падпарадкоўваўся Віленскаму штабу і складаўся з трох паветаў: Ашмяны, Вілейка, Маладзечна. Кожны павет у арганізацыйнай структуры супадаў з абводам.

Першае кантактнае звяно, за якое мне давялося зачапіцца, быў

камендант Ашмянскага абводу «Тур» — Вітольд Туронак, упраўляючы кантраляванага немцамі маёнтка пад Ашмянамі. Аднак у самыя Ашмяны, адзін са старэйшых гарадоў на Віленшчыне, які налічваў каля 9000 жыхароў, я ўкараняўся надта асцярожна. Праз горад праходзіў старадаўні тракт, які калісьці называлі Паштовым альбо Ашмянскім. Зараз гэта важная дарога звязвала Вільню з Мінскам Літоўскім. Гэтую камунікацыйную артэрыю пільна ахоўвалі, у сувязі з чым у горадзе стаяў моцны нямецкі гарнізон. У людзей часта правяралі дакументы.

Пад канец мая выехалі з сувязным у інспекцыйную паездку. На фурманках — па вёсках і фальварках. Спатыкаўся з тутэйшымі людзьмі, якія працавалі ў канспірацыі (сам Банасікоўскі паходзіў з цэнтральнай Польшчы.— Я. С.). Яны адрозніваліся характарамі, але адна рыса часта кідалася ў вочы. Яна дамінавала ў пачуццях большасці насельніцтва Віленшчыны:усе яны любілі Бацькаўшчыну.

Калі ў час першай маёй паездкі непасрэдна сутыкнуўся з вёскай, са здзіўленнем наглядаў на дзелавітых канспіратараў, гатовых на любую ахвяру. Назіраў за выдатна арганізаванымі канспіратыўнымі пунктамі, дзе ішла вайсковая падрыхтоўка, месцамі, дзе ў выдатным стане захоўваліся карабіны, радыёпрыёмнікі і г. д. Ад усяго веяла разуменнем сур'ёзнасці моманту і пачуццём абавязку. Маладыя хлопцы, якія ніколі не служылі ў войску, былі дысцыплінаваныя, як старыя жаўнеры. Ну, а ветэраны войска польскага імкнуліся быць прыкладам для іншых, неаднаразова самі добраахвотна прапаноўвалі паслугі для выканання небяспечных заданняў. Нават калі на полі было шмат працы, заўсёды знаходзіліся ахвотнікі на сваіх конях і фурманках прывезці з Вільні выбуховыя рэчывы, а ў раён Смаргоні, Дзевянішкаў ці Крэва — новыя партыі гранатаў. Такія заданні не былі лёгкімі. Многія гаспадары, нават незаможныя, прадавалі цялушку ці бычка, каб купіць сабе наган альбо абрэз — «бо заўша ў руцэ трэба мець штосьці цвёрдае, калі жывеш з ворагам пад бокам».

Большасць вясковага насельніцтва, з якім мне даводзілася сутыкацца, лічыла сябе «тутэйшымі». Размаўлялі па-беларуску, але адчувалі сябе звязанымі з польскім рухам за незалежнасць і марылі пра паражэнне акупантаў з Захаду і з Усходу.

Невялікі працэнт беларускай інтэлігенцыі, які варожа ставіўся да Польшчы, пайшоў на супрацоўніцтва з немцамі, стварыўшы Беларускую цэнтральную раду ў Мінску Літоўскім. Як і ў кампаніі 1939 г., калі беларусы лаяльна выконвалі свой жаўнерскі абавязак пад польскім сцягам, так і цяпер мужчыны, асабліва моладзь, добраахвотна ішлі на барацьбу з немцамі.

Маладзечанскі абвод, кодавая назва «Млека» («Малако».— Я. С.) даходзіў да Налібоцкай пушчы. З самага пачатку ён прыцягваў увагу штаба інспектарату «Ф» магчымасцю стварэння ў гэтых раёнах партызанскіх групаў. Яшчэ ў снежні 1942 г. для дапамогі каменданту гэтага абводу «Гаеўскаму» (Уладыслаў Бурак — былы студэнт юрыдычнага факультэта Віленскага універсітэта. — Я. С.) быў накіраваны кадравы афіцэр падпаручнік Адам Вальчак («Сэмп»,

«Мірскі»), які пасля кантактаў у плябані ў Гарадку на Бярэзіне з ксяндзом Віктарам Гагаліньскім (у будучым капелан інспектарату «Ф» і Ашмянскага злучэння АК.— Я. С.) пасяліўся ў маёнтку Бальцэры. Такім чынам, тут абаснаваўся цэнтр канспіратыўнага кіраўніцтва абводам.

З наступленнем вясны 1943 г. Маладзечанскі абвод пачаў выказваць энергічную ініцыятыву і актыўнасць у падрыхтоўцы людзей да ўзброенага выступлення супраць акупанта. «Сэмп» і яго паплечнікі не сядзелі на месцы. Рыхтавалі моладзь і ўстанаўлівалі кантакты з суседнім падполлем у Івянцы, нават з савецкім атрадам «сталінцаў» на чале з камісарам Кляўковым.

У сувязі з бурнай дзейнасцю тутэйшага асяродка «Ярэма» праз свайго ад`ютанта «Рафала» («Вітольда Стацэвіча.— Я. С.) перадаў загад пра арганізацыю ўзброенага атрада ў лесе, які мог весці барацьбу супраць немцаў. З`яўленне нешматлікага першага атрада супала з заканчэннем нямецкай блакады Налібоцкай пушчы. Камандзірам атрада быў прызначаны падхарунжы «Сьвіт» — камендант асяродка Ракаў (Тадэвуш Баравінскі.— Я. С.). Праз некаторы час да яго далучыўся разам з некалькімі людзьмі «Малы» (Анджэй Кутзнер.— Я. С.), які стаў намеснікам «Сьвіта».

Першы баявы збор атрада адбыўся 7 ліпеня 1943 г. у лясным масіве паблізу Гарадка. На пачатку ў атрадзіку налічвалася 15 чалавек...

Наранку 26 верасня 1943 г. атрад «Сьвіта» разам з коннай разведкай вярнуўся пасля разгрому аднаго з нямецкіх пунктаў забеспячэння на базу ля хутара Малі — у 5 кіламетрах на поўнач ад Астраўца. Калі пасля начнога маршу партызаны ляглі спаць у гумне, іх акружылі немцы, падмацаваныя падраздзяленнем літоўскай паліцыі. Бой быў крывавым. Перакрыжаваны агонь немцаў з розных бакоў паралізаваў рух палякаў. У пачатку боя цяжка паранілі «Сьвіта», камандзіра атрада.

Толькі пасля палудня партызанам удалося адарвацца ад месца сутычкі і перайсці ў прылеглыя лясы, забраўшы з сабою раненых. Накіроўваліся пад вечар у бок леснічоўкі Піліпяны, стараліся ратаваць жыццё сваіх таварышаў. Дарэмна. Першым сканаў «Сьвіт», а пазней два яго жаўнеры...

Ля леснічоўкі пахавалі трох першых партызанаў інспектарата «Ф», загінуўшых на абароне віленскай зямлі.

Пасля смерці «Сьвіта» камандаваць атрадам стаў «Малы».

Так, паводле Банасікоўскага, арганізоўвалася Віленская акруга АК. Не маючы намеру ўступаць у спрэчку з аўтарам, тым не менш ёсць сэнс выказаць некаторыя свае меркаванні. Лёгкі недавер, прама скажам, выклікае сцвярджэнне аўтара, што бедны селянін гатовы быў прадаць бычка ці цялушку, каб купіць наган ці абрэз, што гэты самы селянін проста- такі гарэў жаданнем кінуць поле ў разгар жніва і ехаць на сваім кані ў Вільню па гранаты. Той самы гаротны ашмянскі мужык, у якога ад голаду «як кісель дрыжыць жывот», той самы цёмны, пагарджаны панам мужык, якога аплакаў у творах вялікі беларускі гуманіст Францішак Багушэвіч.

Канешне, можна не сумнявацца, што ў жыцці канкрэтнага атрада так і было, як піша Банасікоўскі: зброю на свае грошы куплялі, за мінамі ў Вільню ездзілі.

Толькі не трэба, на наш погляд, шукаць прычыну згоды беларуса ваяваць сумесна з палякамі ў «глыбокім польскім патрыятызме беларускага селяніна». Справа не ў гэтым. На працягу стагоддзяў тутэйшы мужык звык пакорліва павінавацца двум чалавекам: сваму пану і сваму ксяндзу. Адвеку іх слова з'яўлялася законам для халопа. Гэтая рабская пакорлівасць перадавалася з пакалення ў пакаленне, стагоддзямі, усмоктвалася з малаком маці. У час адбываных падзеяў тут па-ранейшаму ўладарылі паны і ксяндзы. Вядома ж, мясцовы мужык ненавідзеў немца. Але акупант бываў наскокамі, а свой пан камандаваў штодзённа. Немец біў, пагражаў, а свой ксёндз, аўтарытэт якога для селяніна быў бясспрэчны, правіў слова Божае, наяву і ўпотайку нашэптваў, што трэба дапамагчы пану ў барацьбе з немцам. Хто ж аслухаўся б?!

Банасікоўскі, тады яшчэ малады чалавек, а тым больш — чалавек прышлы, не тутэйшы, зразумела, мог не заўважаць усіх мясцовых тонкасцяў. Падпольная работа для яго ахутана арэолам рамантыкі, за любым рызыкоўным учынкам беларускага мужыка. які дзейнічаў з прынукі свайго пана і поўнага адабрэння духоўнага настаўніка — ксяндза, ён бачыць рамантыку, пачуццё ўсеахватнага патрыятызму.

На самай справе ўсё выглядала намнога празаічней. Хаця спрэчкі няма, моладзь ва ўсе часы, павінуючыся прызыву крыві продкаў, цягнецца да зброі і волі, не вельмі часам задумваецца пра палітычныя, патрыятычныя, нацыянальныя матывы барацьбы. Дык моладзі, адважнай і нядумкай, найбольш за ўсё і палягло ў вайне. Як і ў другіх войнах.

У маі 1944 г. Віленская акруга АК была канчаткова сфарміравана. У адрозненне ад Навагрудскай тут замест батальёнаў ствараліся брыгады. У апісанні Эдмунда Банасікоўскага яе структура выглядала так.

**ЗЛУЧЭННЕ № 1 — ВІЛЕНСКАЕ** (інспектарат «А»— Віленска-Тракайскі):

камандзір злучэння маёр Антоні Аляхновіч («Пахарэцкі»);
начальнік штаба капітан Аляксандр Васілеўскі («Алясіньскі»);
3-я брыгада — камандзір паручнік Грацыян Фруг («Шчэрбец»);
5-я брыгада — паручнік Зыгмунд Шандзеляж («Лупашка»);
7-я брыгада — паручнік Вільгельм Тупікоўскі («Вільгельм»);

**ЗЛУЧЭННЕ № 2 — ПАЎНОЧНАЕ** (інспектараты «А» і «Б» і тэрыторыя Свянцянскага, Браслаўскага, Дзісненскага і Пастаўскага абводаў):

камандзір злучэння маёр Мечыслаў Патоцкі («Вэнгельны»);

начальнік штаба паручнік Ян Драздовіч («Гервазы»);

1-я брыгада (Віленская), 580 чалавек, камандзір паручнік Чэслаў Громбшэўскі («Юранд»);

4-я брыгада («Нарач»), 620 чалавек, падпаручнік Лёнгін

Вайцяхоўскі («Ронін»), у маі 1944 г. была падпарадкавана камандзіру 5-й брыгады Зыгмунту Шандзеляжу;

23-я брыгада (Браслаўская), 410 чалавек, паручнік Віктар Кісель («Сьвятолдыч»), ранейшы камандзір ротмістр Мар'ян Кісялеўскі загінуў 21 чэрвеня 1944 года ў баі пад Лакацінамі;

34-я брыгада (Дрысвяцкая), 320 чалавек, паручнік Казімір Краўзэ («Ваўжыцкі»);

36-я (кадравая) брыгада, 360 чалавек, паручнік Вітольд Кеўліч («Вуяк»);

**ЗЛУЧЭННЕ № 3 — АШМЯНСКАЕ** (ахоплівала тэрыторыі Ашмянскага, Вілейскага і Маладзечанскага абводаў);

камандзір маёр Чэслаў Дэмбіцкі («Ярэма»);

начальнік штаба капітан Міхаіл Квакшыс («Каваль»);

8-я брыгада — камандзір Вітольд Туронак («Тур»);

9-я брыгада — харунжы Казімір Шашкевіч («Малы»);

12-я брыгада — паручнік Адам Вальчак («Нетапеж»).

Акрамя названых, на тэрыторыі акругі дзейнічала 6 (асобная) брыгада пад камандаваннем маёра Францішка Каправіцкага («Конара»). Камендантам акругі быў падпалкоўнік Аляксандр Кжыжаноўскі («Вільк»), начальнікам штаба — маёр Тэадор Цэтыс («Слаў»). Эдмунд Банасікоўскі чамусьці ўказаў колькасны састаў толькі брыгады 2-га (Паўночнага) злучэння. А ў сукупнасці на тэрыторыі акругі пад ружжо было пастаўлена 9000 чалавек, на тысячу болей, чым у Навагрудскай. У цэлым акаўская канспіратыўная сетка колькасна пераўзыходзіла ўзброеныя фарміраванні ў два-тры разы.

У палітычным плане дзейнасць Арміі Краёвай на Віленшчыне амаль не адрознівалася ад Навагрудскай, хаця і мела сваю спецыфіку. Гэтая спецыфіка ў сваю чаргу была звязана з тым, што тут акаўскай канспірацыі прыходзілася мецць справу не толькі з немцамі і савецкімі партызанамі, але і з літоўцамі. Трэба адзначыць , польска-літоўскія адносіны пасля Вялікага Кастрычніка і на працягу міжваеннага дваццацігоддзя былі не ў найлепшым стане.

Не будзем удавацца ў гэтую вельмі далікатную — да сённяшняга дня — тэму, адно напомнім: узаемныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі ў міжваеннае дваццацігоддзе некалькі разоў пераходзілі ва ўзброеныя канфлікты, уплывалі на адносіны людзей, будзілі такую міжнацыянальную варожасць, што яна адбівалася і на бытавым узроўні.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў афіцэра АК Баляслава Штрома:**

«Свае першыя працоўныя крокі ў якасці каморніка я зрабіў ва ўладаннях Біржышкаў (размова ідзе пра красавік 1940 г. — Я. С.), вядомай па ўсёй Літве сям'і з трох братоў, старэйшы з якіх быў прафесарам Ковенскага універсітэта, другі брат — урачом, таксама ў Коўне, а трэці, Станіслаў, — аграномам у Шытальскай гміне.

Станіслаў Біржышка быў літоўскім шавіністам. Забараніў сваёй матцы, польцы, размаўляць з дзецьмі па-польску.

Я закватараваў у паноў Біржышкаў. Маці ўладальніка маёнтка згадзілася мяне сталаваць. Спачатку пан Станіслаў на мяне пагляд-

ваў коса, але паступова прызвычаіўся, а часам нават пачаў шукаць мае кампаніі.

У тым часе Літвой кіраваў Антанас Сметона, які быў жанаты з полькай з сям'і Хадакоўскіх з-пад Яшунаў. Дзяцей сваіх Сметона пасылаў у польскую гімназію ў Коўне — і адначасова праследаваў палякаў, імкнуўся пазбавіць іх нацыянальнай прыналежнасці. Гэта праводзілася такімі самымі метадамі, якія прымянялі да палякаў немцы на Мазурах.

Для пацвярджэння прывяду толькі некалькі фактаў. Аднойчы літоўскія ўлады аб'явілі пра змену пашпартоў. У новых пашпартах мянялі польскія прозвішчы, перакладаючы іх на літоўскую мову. Напрыклад, Сасноўскі — Пушыналіс, Бжазоўскі — Бержаліс, Казлоўскі — Авінус. Калі прозвішча перакласці было немагчыма, на канцы дабаўлялі «чус». Напрыклад, Даўнаровіч — Даўнаравічус. Калі хто не пагаджаўся з такой заменай бацькаўшчыны, шаўлісы білі яго шомпаламі ад карабінаў — па 25 удараў кожнаму пратэстанту. Самыя стойкія атрымлівалі па 50 удараў.

Апавядаў мне пра тое Даўнаровіч, які і пасля 50 удараў шомпалам застаўся са сваім сапраўдным прозвішчам. Такіх палякаў было шмат. Палякі (і беларусы — Я. С.) на Літве ў той час складалі больш за 35% ад агульнай колькасці двухмільённага насельніцтва».

Думаецца, гэты ўспамін асобых каментарыяў не патрабуе. Няма нічога дзіўнага, што прытоеная варожасць на бытавым узроўні, наяўная ў міжваенне, крайне абвастрылася ў гады нямецкай акупацыі, прычым — з дамешкам палітычных матываў. Пад'юджваныя немцамі, літоўскія нацыяналісты імкнуліся поўнасцю кантраляваць Віленшчыну, распальвалі варожасць да палякаў і беларусаў. Баявікі-шаўлісы бясчыннічалі на вуліцах Вільні і ваколіцах. Літоўская тайная паліцыя — саўгума — актыўна супрацоўнічала з гестапа ў справе ліквідацыі камуністычнага і акаўскага падполля. Карныя фарміраванні так званых панарскіх стралкоў вялі сябе бязлітасна да нелітоўцаў..

Пад эгідай немцаў для барацьбы з партызанамі — як савецкімі, так і АК — быў створаны спецыяльны дапаможны корпус, ім камандаваў генерал Павілас Пляхавічус. Камандаванне Віленскай акругі АК спрабавала знайсці якую-небудзь форму паразумення з літоўскай ваеншчынаю, прапанавала, між іншым, адкласці тэрытарыяльныя спрэчкі да адпаведнага моманту, на што прадстаўнікі штаба Пляхавічуса паставілі свае ўмовы: палякі адмаўляюцца ад прэтэнзіяў на Вільню; атрады АК пакідаюць тэрыторыю Літвы, якая прызнана немцамі; палякі Віленшчыны павінны ўступіць у літоўскае войска, каб разам з немцамі змагацца супраць Саветаў. Камандаване АК, вядома, не магло пагадзіцца з такімі ўмовамі. Усе спробы паразумення закончыліся безвынікова. А значыць — вайна. Узаемная, між суседзямі-братамі.

Бадай, першае сапраўднае баявое хрышчэнне партызаны АК на Віленшчыне атрымалі ў пачатку студзеня 1944 г. ля вёскі Мікулішкі на Ашмяншчыне. Сюды з Ашмянаў выехала нямецка-літоўская карная экспедыцыя для ліквідацыі атрада паручніка

Грацыяна Фруга («Шчэрбца»), які дыслакаваўся ў 12 кіламетрах на паўночны захад ад Граўжышкаў. Акаўцаў карнікі атакавалі знянацку, завязаўся кровапралітны бой. Невядома, чым закончылася б сутычка для атрада «Шчэрбца», каб на дапамогу ім не паспеў са сваімі людзьмі «ціхацёмны», паручнік Пётр Матылевіч («Кшэмень»), які кватараваў непадалёку. Яго неспадзяваны ўдар з фланга вырашыў усё — нямецка-літоўскі карны атрад быў разбіты ўшчэнт. Загінулі ўсе нямецкія жандармы з Ашмянаў і Гальшанаў разам са сваім камандзірам. Загінулі 20 літоўскіх паліцэйскіх. Было забіта 5 акаўцаў, сярод іх «Кшэмень» — адзін з самых адчайных дыверсантаў «Вахляжа».

У канцы чэрвеня 1992 г. у Мікулішках адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка загінулым акаўцам. Былі госці з Вільні, Польшчы, прадстаўнікі мясцовых беларускіх уладаў і грамадскасці, журналісты. Ксёндз Бенядзікт Высіньскі адслужыў жалобную імшу. Усё як мае быць.

Толькі адна дэталь у дасведчанага чалавека няможа не выклікаць здзіўлення. У прамовах ля помніка, у газетных справаздачах чамусьці ўспаміналася адна нямецкая жандармерыя, а пра карнікаў літоўскай нацыянальнасці — ні слова.

Ох, і кароткая ў людзей памяць.

Вастрыё першых партызанскіх акцыяў АК на Віленшчыне было, паводле Банасікоўскага, накіравана на ліквідацыю тэрытарыяльных пастоў літоўскай паліцыі. У ноч з 9 на 10 лютага 1944 г. атрад «Тура» атакаваў літоўскіх паліцэйскіх у Болтупах пад Ашмянамі. Уцалелыя літоўцы паўцякалі, пост быў ліквідаваны.

20 лютага адбылася наступная антылітоўская акцыя — у Крэве. Па іроніі лёсу там, дзе 14 жніўня 1385 г. была падпісана Крэўская унія, у тым самым Крэве, якое адыграла важную палітычную ролю ў беларуска-літоўска-польскіх адносінах у 14 стагоддзі, аб'яднанымі сіламі атрадаў «Тура» і «Нетапежа» быў разгромлены моцны паліцэйскі гарнізон літоўцаў, які налічваў каля 70 чалавек. Больш яны ў Крэва ўжо не прыйшлі. Не маглі.

У красавіку 1944 г. 5-я брыгада АК пад камандаваннем «Лупашкі» рушыла на тэрыторыю так званай Ковенскай Літвы, каб здабыць зброю, амуніцыю і харчаванне. Частка брыгады была атакавана войскамі Пляхавічуса. Літоўскія сілы моцна перавышалі акаўскія, і яны мусілі рэціравацца назад. Як сведчыць Эдмунд Банасікоўскі, гэта была першая ўзброеная сутычка партызанаў АК з новастворанымі літоўскімі ваеннымі фарміраваннямі.

Калі ўжо суседзям не ўдалося зміръщца, то няхай бы і ваявалі ў Ковенскай Літве ці пад Вільняй. Але ж не! Як не раз бывала ў гісторыі, арэнай польска-літоўскага супрацьстаяння стала шматпакутная беларуская зямля, яе адвечныя землі — Ашмяншчына, Смаргоншчына, раёны Астраўца і Воранава.

Часці генерала Пляхавічуса прайшлі перападрыхтоўку ў Вільні пад патранажам нямецкіх афіцэраў, накіраваліся на Беларусь для вынішчэння партызанскага руху ў яе паўночных раёнах. Па загаду немцаў Пляхавічус раздзяліў свой корпус на некалькі аператыўных

групаў, каб ахапіць і кантраляваць як мага большую тэрыторыю. Камандаванне Віленскай акругі АК, наадварот, вырашыла весці барацьбу з літоўскімі фарміраваннямі буйнымі ўдарнымі групоўкамі, што ў канчатковым выніку абумовіла поўны разгром літоўцаў. Самаўпэўненасць да дабра нікога не вядзе.

7 мая 1944 г. сіламі 8-й і 9-й брыгадаў АК быў разбіты літоўскі батальён ля вёскі Граўжышкі на Ашмяншчыне. 13—14 мая сіламі 8--12- і 13-й брыгадаў АК ля Талмінава і Мур-Ашмянкі зноў пабілі літоўцаў, прычым літоўскія страты былі даволі значныя — 70 забітых, каля 130 параненых, 150 — узялі ў палон. Рэшта недабіткаў уцякла з поля бою. Страты збоку АК — 19 забітых і 14 параненых.

Прыкладна ў той час закончыліся няўдачамі карныя экспедыцыі корпуса Пляхавічуса ля Тургеляў, Табарышкаў і Беняконяў. Тут у сутычкі з літоўцамі паспяхова ўступаў батальён з Навагрудскай акругі АК пад камандаваннем капітана Станіслава Трушкоўскага («Штрэмера»). Гэтыя паражэнні мелі фатальны зыход для літоўскага корпуса і яго камандзіра.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Банасікоўскага:** "Пасля разгрому атрадаў групы Ашмены (адзін з літоўскіх афіцэраў.— Я. С.) і пасля яе паражэння ў раёне Мур-Ашмянка--Талмінава рэшткі корпуса Пляхавічуса яшчэ заставаліся, паводле данясенняў нашай разведкі, у Навасёлках, за 8 кіламетраў на поўнач ад Ашмянаў, і ў Гальшанах. Потым атрымалі паведамленне: літоўцы паспешліва ўцякаюць з гэтых мясцовасцяў, пакідаюць некаторыя склады з харчам і абмундзіраваннем.

Пасля серыі ганебных паражэнняў корпуса Пляхавічуса немцы не хавалі пагарды да найменшага са сваіх сатэлітаў. У Ашмянах нямецкія ўлады арганізавалі «парад» раздзетых да бялізны, прыкрытых адно коўдрамі літоўскіх жаўнераў. На чале калоны гэтых гратэскавых атрадаў крочылі афіцэраў Пляхавічуса, якія замест пераможных шабляў мусілі несці ў руках сімвалічныя мётлы.

Генерал Пляхавічус яшчэ спрабаваў ратаваць рэшту сваіх войскаў, імкнуўся вывесці іх у лясы, але было позна. Немцы здагадаліся аб намерах генерала і прыступілі да раззбраення літоўцаў. 17 мая 1944 г. Пляхавічус быў арыштаваны, яму прад`явілі абвінавачанне ў сувязях з замежным ворагам. Літоўскі корпус быў расфарміраваны, жаўнераў накіравалі на работу ў Германію».

Але нямецкі тэрор у адносінах да нелітоўскага насельніцтва Віленшчыны стаў яшчэ болей жорсткі і бязлітасны. Рэгулярна праводзіліся арышты, вязняў накіроўвалі ў лагер Правенішкі каля Каўнаса. У ноч з 16 на 17 верасня 1943 г. былі схоплены 140 заложнікаў з ліку славутай інтэлігенцыі, сярод іх 14 вядомых прафесараў Віленскага універсітэта, 5 вучоных-медыкаў, 10 чалавек расстралялі ў дзень арышту.

Праўда, знаходзіліся сярод інтэлігенцыі і такія, хто быў на паслугах у немцаў. Камандаванне АК здрады не даравала. Акцыі помсты здзяйсняла спецыяльная група «Кедыў» («Кіраўніцтва дыверсіямі»), якая была створана пры штабе акругі. У сакавіку застрэлілі галоўнага рэдактара пранямецкай газеты на польскай

мове «Гонец цодзенны» («Ганец штодзённы») Чэслава Анцарэвіча, у чэрвені — небяспечных агентаў гестапа Казіміра Кялбоўскага і Мар'яна Падабу, у ліпені —Альдону Выляжыньскую, якая паходзіла з сям'і вядомых музыкантаў з Віленскай кансерваторыі.

У лютым 1944 г. добра ўзброены атрад Анджэя Кутзнера (амаль 50 чалавек) атрымаў заданне ліквідаваць тайнага агента гестапа Пятра Рачкоўскага, фатографа ў Забрэззі, у 10 кіламетрах ад чыгункі Маладзечна — Ліда. У мястэчку быў участак беларускай паліцыі і кватаравала рота вермахта. Акцыя ў акаўцаў сарвалася. Анджэй Кутзнер («Малы»), адзін з найбольш здатных і баявітых афіцэраў акругі, загінуў.

Што датычыць узброенай барацьбы з немцамі, то вынікі акаўскіх фарміраванняў на Віленшчыне былі надта сціплыя, меншыя нават, чым у Навагрудскай акрузе. Па прызнанню Эдмунда Банасікоўскага, «польская лясная партызанская акцыя была запозненай. Самыя зручныя для дзейнасці базы перахапілі савецкія партызаны». Тым не менш акаўскія атрады на Віленшчыне правялі супраць немцаў шэраг баявых аперацыяў, прычым некаторыя з іх прайшлі даволі паспяхова.

21 красавіка 1944 г. на ўчастку чыгункі Падброддзе — Лынтупы група пад камандаваннем намесніка камандзіра 5-й брыгады Яна Віктара Вёнцэка («Ракача») атакавала нямецкі таварны поезд, у палон былі захоплены 24 немцы. Праз тры дні тая самая група затрымала і на некаторы час авалодала «Ўрлаўбцугам» — поездам, якім нямецкія афіцэры і салдаты вярталіся з адпачынку на Ленінградскі фронт. У выніку было знішчана 75 немцаў ваенных і 17 — цывільных.

У канцы сакавіка 1944 г. пасля ўдалай акцыі ў Крэве атрад «Тура» вяртаўся на месца сваёй пастаяннай стаянкі. У ваколіцах Астраўца ён выпадкова напаткаў атрад «ціхацёмнага» Адама Барычкі. Параіліся і вырашылі паспрабаваць выкурыць немцаў з мястэчка. У Астраўцы, Астравецкім маёнтку і на чыгуначнай станцыі Гудагай у сукупнасці знаходзілася 250 немцаў — салдаты вермахта, жандармерыя і 3 каманды з арганізацыі Тодта. Сілы акаўцаў — каля 200 чалавек. Бой пачалі ноччу, 31 сакавіка, працягваўся некалькі гадзінаў. Захапілі большую частку мястэчка, маёнтак, тартак, некалькі складаў, штаб арганізацыі Тодта.

Супраціўленне палякам было моцным, але акаўцы ўмела выкарысталі раптоўнасць і ўжо былі блізкімі да агульнай перамогі. Аднак пад ранак на дапамогу мясцоваму гарнізону з Гудагая прыбыла франтавая рота вермахта, якую знялі прама з эшалона. Гэта прдвызначыла зыход сутычкі. Акаўцы адступілі, праўда, з багатымі трафеямі, у тым ліку легкавы аўтамабіль. У баі цяжка параніла Адама Барычку, некалькі акаўскіх жаўнераў загінула. Па дарозе на Дзевянішкі акаўцы разабралі рэйкі на чыгунцы Гудагай — Солы. У

выніку пайшоў пад адхон эшалон, што рухаўся з Маладзечна.

Прыкладна такая гісторыя адбылася 27 красавіка 1944 г. у вёсцы Ластаянцы ля тракта Баруны — Забрэззе, пры чыгунцы Маладзечна — Ліда. У штабе 13-й брыгады АК стала вядома, што там знаходзіцца шмат багатых складаў — са зброяй, харчам, амуніцыяй. Аперацыяй удала кіраваў камандзір брыгады «Нетапеж». Але немцы паспелі звязацца па тэлефоне з Маладзечнам, адтуль на поездзе хутка прыбыло падмацаванне. Вылазка акаўцаў не ўдалася.

Былі, канешне, і паспяховыя акцыі, асабліва каля возера Нарач. Але ў цэлым партызанская актыўнасць акаўскіх фарміраванняў на Віленшчыне не адпавядала магчымасцям і сілам камандавання акругі. Тут, як і на Навагрудчыне, яны таксама «стаялі з ружжом ля нагі» і чакалі пачатку аперацыі «Вострая Брама».

## У ПОШУКАХ ПАРАЗУМЕННЯ

Такія пошукі мелі месца — з боку савецкіх партызанаў і з боку акаўцаў. Асабліва ў першы перыяд пасля з'яўлення ў беларускіх лясах узброеных групаў АК. На спробы ўстанавіць кантакты з камандаваннем савецкіх брыгадаў і атрадаў акаўцы атрымлівалі ўзаемнасць. Супрацоўніцтва двух бакоў у неймаверна цяжкіх умовах нямецкай акупацыі было ўзаемна карысным.

Яно і зразумела. Простым людзям і большасці палявых камандзіраў з АК, якія нездарэмніцы ўзялі ў рукі карабіны і вінтоўкі, у той час не было чаго дзяліць з савецкімі партызанамі. Разам хаваліся, галадалі і мерзлі ў лясах, разам пераносілі цяжкасці і нягоды ваеннага ліхалецця — фашысцкія аблавы, карныя экспедыцыі, блакады.

Трэба было ваяваць супраць агульнага ворага — моцнага, хітрага, бязлітаснага. Людзі і без азоў палітграматы маглі разабрацца што да чаго, бо на ўласнай скуры адчувалі лютую нянавісць і безупыннае цкаванне чужаземцаў, якія лічылі сябе на нашай зямлі вышэйшай расай, пагарджалі ўсім славянскім.

І, не чакаючы загадаў са штабаў у Лондане, Варшаве, Маскве, акаўцы і савецкія партызаны, людзі розных светапоглядаў, веравызнанняў, нацыянальнай прыналежнасці, паходжання, сацыяльнага статуса, выхавання, — па сваёй ініцыятыве пачалі шукаць шляхі да супрацоўніцтва, да ўзаемнага пазнання суседзяў. Каб змагацца і перамагаць. Каб выжыць. Пра гэта сведчаць успаміны ўдзельнікаў і відавочцаў тых падзеяў.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў паручніка Баляслава Штрома («Ляса») — намесніка камандзіра 6-й роты 7-га батальёна Навагрудскай акругі АК:**

«Пасля паспяховай акцыі ў Радуні наша рота была на слыху ўсіх атрадаў. Нават зацікавіліся намі партызаны з Рудніцкай пушчы, яны выказалі жаданне пазнаёміцца. Прыслалі да нас сувязнога з запрашэннем да іх у госці. Запрашэнне было прынята, і аднойчы «Антоні» — Януш Барэвіч — я і два ахоўнікі-жаўнеры на конях

рушылі ў вызначанае месца — за рэчкай Сольчай, на ўскрайку пушчы, да нейкай леснічоўкі. Нас віталі афіцэры ў званні маёраў. Захапляліся канём «Антоні», белым арабскім скакуном пад афіцэрскім кавалерыйскім сядлом.

Памятаю іх. Адзін моцны мажны брунет з чорнай бародкай, другі — бландзін, трэці — у чорным цывільным пінжаку. Рэшта круцілася на кухні, рыхтавала закусь, смажыла рыбу.

Напачатку адрэкамендаваліся: Забоцін, Казлоў, Сева... Потым адзін з іх сказаў: «Хацелі пазнаёміцца з вамі, бо вы — сапраўдныя малайцы, ліквідавалі фашысцкія гарнізоны ў Суботніках і асабліва ў Радуні. Яны псавалі нам нервы пры выправах на ўзрывы ваенных эшалонаў».

Частавалі нас некалькі гадзін. «Антоні» не ведаў рускай мовы, таму я выступаў у ролі перакладчыка. За сталом панавала сардэчная атмасфера, ёй спрыялі чаркі бімбру пад рыбу. Размова круцілася вакол баявых акцыяў нашых і партызанскіх атрадаў. Яны мелы добрыя вынікі ў знішчэнні чыгуначных транспартаў, у рэйкавай справе былі па-за канкурэнцыяй. Ля Іўя пусцілі пад адхон эшалон з танкамі тыпу «Тыгр». Я аглядаў тое месца праз некалькі дзён пасля акцыі і бачыў у рове перавернутыя танкі, разбітыя нашчэнт чыгуначныя платформы, разбураныя, пагнутыя ў спіраль рэйкі на адлегласці каля 300 метраў. Усё гэта было зроблена ва ўмовах, калі чыгунку ахоўвала падраздзяленне вермахта за паўкіламетра ад месца дыверсіі. Нават калі немцы сядзелі ў бункерах, на чыгунцы педантычна курсіравалі нямецкія патрулі. У задушэўнай гутарцы правялі мы некалькі гадзінаў. Не абышлося без песні. Я прапанаваў заспяваць «Славное море, священный Байкал» — песню, якую любіў заўжды. Аказалася, усе за сталом яе добра ведалі. Хутка паплыла харавая мелодыя, яна яскрава напомніла мне мой побыт у Расіі ў часе першай сусветнай вайны, ля Волгі, у Кастрамской губерні.

Тым часам «Антоні» намагаўся атрымаць ад партызанаў у падарунак супрацьтанкавае ружжо, прапаноўваў узамен свайго любімага скакуна. Тыя пасмяяліся з прапановы. Пажартавалі: конь белай масці, будзе занадта прыкметны ў лесе. На сваё ўтрыманне скакун патрабуе шмат выдаткаў, у тым ліку збожжа, а з тым у іх не вельмі добра...

Абмеркавалі мы магчымасць правядзення сумеснай акцыі па разгрому гарнізона ў Лідзе. У гэтай справе савецкія афіцэры выказалі вялікую развагу і прадбачлівасць, негатыўна паставіліся да плана «Антоні». Сапраўды, спроба напрамую атакаваць гарнізон у Лідзе, які складаўся з двух палкоў вермахта, артылерыйскага дывізіёна, танкавай брыгады і авіячасці, не мела б жаднага шанца на поспех. Нават аб'яднаўшы свае сілы, наша агнявая моц была да смешнага малой у параўнанні з нямецкім гарнізонам. Рызыка ў такіх выпадках не аплачваецца. Ахвяры, пры атацы Ліды, былі б несувымеральнымі з мэтаю. Да таго ж мы не вызвалілі б Ліду.

Пагаварылі пра магчымую сумесную абарону нашых стаянкаў, аднак канкрэтнае рашэнне не было прынята. Позняй ноччу мы

развіталіся з сімпатычнымі гасціннымі таварышамі па сумеснай барацьбе і рыссю паскакалі на нашу базу каля Бутрыманцаў».

З успамінаў капітана Станіслава Трушкоўскага («Штрэмера»), камандзіра 5-га батальёна Навагрудскай акругі АК:

«Пасля некалькіх пытанняў пра мой батальён: які колькасны састаў, колькі маю афіцэраў, якіх, якое ўзбраенне і г. д. «Вількь» (падпалкоўнік Аляксандр Кжыжаноўскі.— Я. С.) загадаў мне далажыць пра ўсю гаму нашых узаемаадносінаў з савецкімі партызанамі з Рудніцкай пушчы.

З ходу далейшай размовы я зрабіў вывад, што «Палешука» (Адама Шыдлоўскага, новага каменданта Навагрудскай акругі АК.— Я. С.) гэтая тэма надта цікавіць, бо ён з вялікаю ўвагаю слухаў мой рапарт, хаця сам у размову не ўступаў. Я дапусціў, што справа заключэння паразумення з савецкімі партызанамі цалкам даспела, каб падняць яе вышэй і давесці да агульнага пагаднення ўсіх партызанскіх атрадаў з абодвух бакоў. Для гэтага ёсць усе варункі.

Адказ маіх субяседнікаў звёўся да таго, што, на жаль, няма ў нас у гэты момант кампетэнтнага чалавека, які меў бы неабходныя паўнамоцтвы. Спыніліся на падтрыманні кантактаў, гутарках і... чаканні.

Я атрымаў загад наладзіць асабісты кантакт з камандзірам савецкіх партызанаў у Рудніцкай пушчы, абмеркаваць пытанні па супрацоўніцтву і як мага хутчэй далажыць пра перагаворы «Вільку».

З фальварку над Сольчай адаслаў запіску «Шчэпачу» (падхарунжаму Славінскаму.— Я. С.), у якой папрасіў яго скантактаваць мяне з кіраўнікамі савецкіх партызанаў.

Спатканне адбылося праз дзён колькі ў цагляным доміку кіраўніка фальварка Старыя Раклішкі. Разам са мной былі інтэндант батальёна і ад'ютант. З боку партызанаў з Рудніцкай пушчы прысутнічалі палкоўнік «Габрыс», маёр «Сева», а таксама капітаны Забоцін і Казлоў, якія не ўжывалі псеўданімаў. Савецкія афіцэры былі адзетыя ў новую, з іголачкі, форму, з пазалочанымі пагонамі... Адзін Забоцін меў на сабе чорны цывільны пінжак, падпяразаны дзягаю, да яе быў прымацаваны пісталет у вялікай драўлянай кабуры.

Палкоўнік «Габрыс», высокі, хударлявы бландзін са светлаблакітнымі вачыма, вельмі бледны, выглядаў на хворага, цярпеў ад малярыі. У часе размовы вычэкваў, што скажуць другія, але, адчувалася, апошняе слова застаецца за ім. Маёр «Сева», шчуплы шатэн, таксама паводзіў сябе стрымана.

Раз ініцыятыва сустрэчы, хай сабе і на «лакальным узроўні», зыходзіла ад мяне, я праінфармаваў прысутных, што некалькі дзён таму асабіста давёў кіраўніцтву польскіх партызанаў пра стан нашых узаемаадносінаў і вынікную з іх карысць для абодвух бакоў. Мае пачынанні ў наладжванні кантактаў з савецкімі партызанамі ўхвалены маім камандаваннем, я пацвердзіў яго зацікаўленасць у супрацоўніцтве на ўсёй віленска-навагрудскай тэрыторыі.

Пачаў горача прапаноўваць сваім партнёрам па перагаворах,

каб і яны, са свайго боку, пачалі дзейнічаць як мага больш энергічна ў напрамку ўстанаўлення добрых узаемаадносінаў паміж савецкімі партызанамі і польскімі атрадамі.

Мае субяседнікі выказвалі жывую зацікаўленасць у далейшым развіцці нашых кантактаў, але падкрэслівалі неабходнасць нармалізацыі адносінаў — накшталт паразуменняў, якія былі заключаныя раней з нашым 5-ым батальёнам. Хаўрусавацца патрэбна было ў першую чаргу з польскімі атрадамі, што дыслакуюцца вакол Рудніцкай пушчы. Гэта было слушным, я адчуў палёгку, што мы на правільным шляху.

За некалькі дзён да гэтай сустрэчы я праінфармаваў у Германішках «Шчэрбца» (падручніка Грацыяна Фруга.— Я. С.) пра мае адносіны з савецкімі партызанамі. Ён добра разумеў важнасць для палякаў магчымасці ўваходу ў Рудніцкую пушчу пры нямецкай карнай акцыі ці аблаве, быў шчыра зацікаўлены ў пагадненні з савецкімі партызанамі. Тую самую пазіцыю займаў маёр «Конар» (Францішак Капроўскі.— Я. С.), угаварыў таксама паручніка «Крысюё» (Яна Барысевіча.— Я. С.), каб і ён устанавіў кантакт з нашымі суседзямі-партызанамі.

Аднак савецкі палкоўнік «Габрыс» выказаў думку, што ён прадстаўляе толькі гарнізон Рудніцкай пушчы, а ў справе ўстанаўлення кантактаў і пагадненняў у больш шырокім маштабе выказвацца не захацеў. Спыніліся на тым, што савецкі партызанскі штаб перадасць нашы прапановы свайму кіраўніцтву.

Да бліноў мой інтэндант папрасіў у гаспадара фальварка рыбу. Пасля афіцыйных дэбатаў, для стварэння больш таварыскага настрою, на «канферэнцыйны» стол падалі трохі вышчарбленую фаянсавую каструлю, лыжкі. Нарэзаны хлеб, некалькі талеркаў і гліняных міскаў, відэльцы, шклянкі завяршылі «шыкоўнае» накрыццё стала.

Кампанейскую мужчынскую гутарку крыху стрымлівала, што палкоўнік «Габрыс» практычна зусім не выпіваў. Пасадзіў каля сябе польскага інтэнданта, таксама непітушчага. Інтэндант добра размаўляў па-руску, яны ціха субяседнічалі. Ажыўленне ў застоліцу ўносіў «Шчэпач», які часта стукаўся з капітанам Казловым, бландзінам з нядрэннай барадой. Былі яны сярод нас самымі маладымі, прыгожымі і весела перакульвалі свае шклянкі, патрасалі бародкамі — адзін чорнай, іспанскай, а другі саламяна-рыжаватай, а ля Мікалай II.

Рассталіся пад вечар. Хоць на тым першым маім спатканні з суседзямі з Рудніцкай пушчы да канкрэтных рашэнняў не дайшло, сам факт знаёмства з савецкімі афіцэрамі меў для мяне важнае значэнне. Асабістае знаёмства аблегчыла далейшыя мае адносіны з партызанамі, паклала пачатак супрацоўніцтву.

Праз некалькі дзён наш інтэндант сабраўся ў паездку на тэрыторыю для забеспячэння нас прадуктамі харчавання, я скарыстаў аказію і прапанаваў паручніку «Крысю» паехаць разам з ім і дапамагчы нашым савецкім суседзям харчамі. «Крыся» прыняў маю прапанову, па палудні абодва рушылі праз мост на Сольчы на Доўгую Выспу, дзе іх чакалі гаспадары Рудніцкай пушчы і наш «Шчэпач».

Я чакаў іх звароту ў Бутрыманцах, у плябані. Прыйшоў вечар,

мы з ксяндзом павячэралі. Апусцілася ноч. Гаспадыня паслала мне на вузкай канапцы ў ядальні, ксёндз пажадаў добрай ночы і пайшоў адпачываць. Я хутка заснуў.

Сярод ночы мяне разбудзілі шумлівыя галасы. У пакой уварваўся знерваваны «Крыся», за ім у такім самым стане — інтэндант.

— Нарэшце прыехалі! — усклікнуў я.— Ну што, паручнік, якія першыя ўражанні?

— Усё лухта і нічога больш! — з абурэннем выкрыкнуў «Крыся».— Не бачу ніякай магчымасці, каб з Саветамі можна было дамовіцца. Я б ім харч ніколі не пасылаў.

— З кім размаўлялі? — спытаў я ў інтэнданта.

— Сёння ў іхнім штабе быў адзін маёр «Грозны». Нікога болей. Мы для іх — ніхто.

Я не стрымаў смеху:

— Ну што ж, панове. Нам не застаецца нічога іншага, як добра выспацца. Бо невядома, што нам прынясе новы дзень.

Праз хвіліну пачуўся хуткі тупат конскіх капытоў. Харчаўнікі ад'ехалі. А я выбіўся са сну, раздумваў пра здаранае. Нядобра выйшла, што «Крыся» трапіў акурат на «Грознага».

Спаткаліся два байцоўскія пеўні і давай падскокваць... Нічога з гэтага не магло атрымацца добрага.

Наранку мне адрапартоўваўся «Шчэпач». Запылены, недаспаны, з кругамі пад вачамі.

— Ну, якое ўражанне аб «канферэнцыі»?

Збянтэжаны «Шчэпач» гаварыў штосьці пра марную трату часу і нявыкарыстаныя магчымасці. Усё гэта было праўдай.

— Хто ад іх быў яшчэ, акрамя «Грознага»?

— Капітан Забоцін.

— Ну, і што Забоцін? Вы размаўлялі з ім?

— Гаварыць не захацеў. Узмахнуў рукой і сказаў: «Петухи».

У наступны дзень з Вільні вярнуўся падпаручнік «Ліха» (Станіслаў Шабуня.— Я. С.). Ён прывёз вусны адказ «Вілька» на адасланы яму рапарт. У прынцыпе «Вільк» пагаджаўся з маімі поглядамі, выказанымі ў рапарце, аднак тэрміновыя справы не дазвалялі яму выехаць да нас з Вільні ў бліжэйшыя дні. Аднак, сказаў «Шабуня», хутка мне паведамяць пра яго прыбыццё на нашу тэрыторыю, і ўжо тады я павінны буду скантактаваць яго з кіраўніцтвам савецкіх партызанаў у Рудніцкай пушчы. Несумненна, праблема прынцыповых дамоўленасцяў для «Вілька» з'яўлялася нялёгкай і магла пераходзіць межы яго кампетэнцыі. Атрымаць дазвол з Варшавы — справа няпростая і няскорая. Ды ці, у рэшце рэшт, усё заканчвалася на Варшаве?

У трэцяй дэкадзе чэрвеня (1944 г. — Я. С.) я атрымаў ад «Вілька» паведамленне. Ён выклікаў мяне ў свой штаб пад Ашмянамі, адначасова загадваў папярэдзіць кіраўніцтва савецкіх партызан у Рудніцкай пушчы, што ён паставіў за мэту заключыць афіцыйнае пагадненне.

Як мага хутчэй скантактаваўся я з капітанам Забоціным.

Забоцін выказаў поўнае разуменне становішча, абяцаў прыкласці ўсе намаганні, каб намечанае спатканне адбылося ў самы кароткі тэрмін.

У штабе акругі ў вёсцы Валкарабішкі я далажыў пра сваё прыбыццё. «Вілька» не было, чакалі яго прыезду. У штабе ведалі, што я тут павінны заявіцца, але ніхто не быў упаўнаважаны весці са мною размову. Нічога не заставалася, як набрацца цярпення і чакаць.

Мінуў дзень, запоўнены гадзінамі пакутлівага чакання, позна ўвечары прыехаў «Вільк», стомлены, заклапочаны. Я адрапартаваўся. У адказ — далікатна сфармуляваная просьба пацярпець і пачакаць.

Савецкія войскі перайшлі з-за Дняпра ў вялікае наступленне, сакрушальнымі ўдарамі прарвалі нямецкі фронт і перамяшчаліся на Захад па 40 кіламетраў у дзень. Можна лёгка падлічыць, за колькі дзён убачыш Чырвоную Армію. У такой сітуацыі кожны дзень быў дарагім".

Спробы знайсці паразуменне мелі месца не толькі ў расказаных эпізодах. Прыклады баявога супрацоўніцтва паміж савецкімі партызанамі і акаўцамі адзначаліся ў многіх рэгіёнах Заходняй Беларусі.

У Налібоцкай пушчы добрыя ўзаемаадносіны першапачаткова складваліся паміж атрадамі АК (больш за 300 чалавек) пад камандаваннем Каспера Мілашэўскага («Левальда») і Івянецкім партызанскім злучэннем (камандзір Рыгор Сідарок — «Дубаў»). У чэрвені 1943 г. у час разгрому атрадам Мілашэўскага моцнага нямецкага гарнізона ў Івянцы брыгада імя Чкалава перакрыла вакольныя дарогі і тым самым дала акаўцам магчымасць без стратаў адысці да месца дыслакацыі.

Праз 3-4 дні пасля адыходу атрада Мілашэўскага з Івянца мястэчка было акупавана прыбылымі з Мінска нямецкімі бронемашынамі і танкамі. У Івянцы немцы не знайшлі тых, хто ўчыніў разгром гарнізона, і яны пачалі помсціць мясцоваму насельніцтву, некалькі чалавек расстралялі.

Плячо ў плячо стаялі савецкія і польскія партызаны ў час блакады гітлераўцамі Налібоцкай пушчы ў ліпені - жніўні 1943 г. Пра маштабы нямецкай акцыі «Герман» сведчаць прыцягнутыя для яе выканання сілы. Амаль 60-тысячная варожая групоўка прымяняла танкі, цяжкую артылерыю, авіяцыю.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Каспера Мілашэўскага**: «У канцы ліпеня 1943 г. мы былі падняты па трывозе коннай разведкай харунжага Здзіслава Нуркевіча («Ночы»), які знаходзіўся з эскадронам за 20 кіламетраў на ўсход ад пушчы. Ён паведаміў, што ў нашым накірунку ідуць калоны нямецкіх войскаў. Мы неадкладна апавясцілі кіраўніцтва савецкіх партызанаў.

Да нас прыбылі камандзір злучэння партызанскіх брыгадаў палкоўнік Сідарок («Дубаў»), маёр Васілевіч, капітан Сціпчанка і другія. На сумеснай нарадзе мы намецілі ўчасткі абароны і тактыку ўзаемадзеяння. Нашай групе была пастаўлена задача замкнуць

галоўны тракт, які звязваў Мінск з Навагрудкам і праходзіў праз Івянец, Налібокі, пушчу, Кромань ля Шчары, а таксама прылеглыя да тракту дарогі і падыходы. Усё на адрэзку прыкладна ў 10 кіламетраў. Накірункі на поўнач і поўдзень ад нашай групоўкі былі заблакаваны савецкімі брыгадамі».

Амаль тры тыдні пабрацімы стрымлівалі атакі нашмат мацнейшых сілаў праціўніка, а потым з баямі, са значнымі стратамі прарываліся праз кальцо акружэння. Быў пакладзены добры пачатак для баявога супрацоўніцтва паміж атрадам АК і злучэннем савецкіх партызанаў.

У ходзе аперацыі «Герман» немцам не ўдалося дабіцца пастаўленай мэты.

У Нарачанскай партызанскай зоне побач з фарміраваннем Фёдара Маркава, у будучым героя Савецкага Саюза, з вясны 1943 г. быў арганізаваны першы польскі партызанскі атрад Віленскай акругі АК пад камандаваннем падхарунжага Антоні Бужыньскага («Кміціца»), былога аднакурсніка Маркава па даваеннай вучобе ў Свянцянскай настаўніцкай семінарыі. Беларусы і палякі разам дыслацыраваліся, узгаднялі свае дзеянні, праводзілі сумесныя акцыі. У прыватнасці, разбілі гарнізон у Кабыльніку (цяпер — Нарач), ліквідавалі паліцэйскі ўчастак у Вайстоме, раззброілі нямецкую жандармерыю на пераправе цераз Вілію.

У начной смелай атацы здабылі многа зброі, амуніцыі, боепрыпасаў. Акрамя таго, у ходзе акцыі знішчылі мост на Віліі, які немцам так і не ўдалося адбудаваць.

Былі і другія факты супрацоўніцтва двух народаў. І не віна, а бяда ўпамянутых і не згаданых тут людзей, што ў далейшым, па прычынах, ад іх незалежных, яны так і не змаглі практычна рэалізаваць магчымасці для цеснага супрацоўніцтва.

Думаецца, вельмі трапна зазначыў адзін з аўтараў успамінаў пра тагачассе Станіслаў Трушкоўскі («Штрэмер»), што ў тых драматычных абставінах праблему супрацоўніцтва не пад сілу было вырашыць ні радавым байцам, ні камандзірам атрадаў, ні камендантам накшталт «Вілька», ні нават Варшаве.

Усё рашалася ў Лондане і Маскве. Але прынятыя там рашэнні на корані загубілі жывое чалавечае імкненне жаўнерскай масы народаў-суседзяў да супрацоўніцтва, да сумеснай барацьбы з агульным ворагам.

Паразуменне ў салдатаў было блізкае. Яно памагло б палітыкам, ачысціла б дарогу Лондану і Маскве.

Аднак кола ўзаемнасці і супрацоўніцтва не расшырылася. Наадварот, звузілася,

Вынік непаразуменняў — патокі крыві, у асноўным беларускай. Беларус-католік, запісаны палякам, і беларус-праваслаўны, запісаны ў пашпарце беларусам, доўга па вайне расплачваліся ўласным лёсам і лёсам дзяцей, бо ручайкі паразумення ў гады вайны не зліліся, не сталі бруістаю рэчкаю.

15 ліпеня 1942 г. па дарозе з Вільні ў Варшаву, непадалёку ад Слоніма, загінулі тры жаўнеры з Варшаўскай транспартнай базы «Вахляжа» — Фелікс Дунін-Карвіцкі («Ліс»), яго фальшывыя дакументы былі зроблены на прозвішча Янкоўскага, Ян Ярашэвіч (Ліпіньскі), інжынер Ежы Мечнікоўскі (Яворскі). Яны даставілі на аўтамабілях выбуховыя рэчывы на 5-ы ўчастак «Вахляжа» і вярталіся ў Варшаву.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Паведамленне начальніка паліцыі СД Слонімскай акругі ад 13 жніўня 1942 г. накіравана на адрас дырэкцыі завода сельгасмашынаў пад Варшавай; па дакументах гэтага завода ехала група «Ліса»:**

**«15.07.1942 г. каля 15.00 упраўленне жандармерыі ў Слоніме атрымала паведамленне, што на аўтастрадзе Слонім — Ваўкавыск абстраляны два лёгкія грузавікі, пазначаныя рэгістрацыйнымі нумарамі Остланда 9062 і 8878. У грузавіках знайшлі абвугленыя трупы. Грузавікі, паводле сведчанняў сялянаў, абстраляла з лесу запальнымі кулямі вялікая партызанская банда. Шафёрам удалося спыніць аўтамабілі, аднак пры спробе выбрацца з кабінаў яны былі смяротна параненыя і згарэлі ў запалавелых машынах. Да гэтага часу не змаглі ўстанавіць асобы двух шафёраў, бо іх дакументы немагчыма прачытаць. Трэці, Мечнікоўскі, у час нападзення спрабаваў выскачыць з аўтамашыны, быў смяротна паранены некалькімі стрэламі, упаў тут жа, каля машыны. Усувязі з гэтым яго труп быў ахоплены полымем часткова і асобу Мечнікоўскага можна было ідэнтыфікаваць на падставе ўцалелых дакументаў».**

Цяпер яшчэ адзін дакумент.

**З рапарта паручніка Станіслава Вяржыньскага («Тадэвуша Смотрыча»), афіцэра з 1-га аддзела штаба «Вахляжа» ад 6.08.1942 г.**

**«З транспартнага аддзела (штаба) былі забіты ў аўто і спалены бальшавіцкімі партызанамі Янкоўскі, Карвіцкі і інжынер Мечнікоўскі...»**

Трагічны эпізод на дарогах вайны. Адзін з мноства. Дробязны факт. У той час на палях бітваў гінулі тысячы, дзесяткі тысячаў. І ўсё ж, як справядліва адзначыў Эрнэст Хемінгуэй, можна прывыкнуць да вайны, але нельга прывыкнуць да смерці. Нават цяпер, праз многія гады, сухія радкі падобных дакументаў навейваюць жудасць.

У дадзеным выпадку ёсць сэнс звярнуць увагу на змест і тон вытрымкі з рапарта Станіслава Вяржыньскага. Безапеляцыйна сцвярджаецца, што жаўнеры з транспартнага аддзела «Вахляжа» былі «забіты... і спалены бальшавіцкімі партызанамі». Гэты выраз пакідае ўражанне, быццам савецкія партызаны знішчылі польскіх падпольшчыкаў знарок, як заклятых ворагаў. Іменна таму арганізавалі засаду на шашы. Між іншым, да сённяшняга дня дакладна не высветлена,хто на самай справе ўчыніў гэты тэракт. У паведамленні начальніка Слонімскай СД адзначаецца, што машыну абстраляла партызанская банда. Але ці гэта сапраўдныя савецкія партызаны, ці

банда звычайных рабаўнікоў, якіх у той час нямала швэндала па лесе, ніхто не ведае дасюль.

Канешне, нельга выключаць, што машыну сапраўды падпалілі партызаны. У той сітуацыі яны на сто працэнтаў былі ўпэўнены — знішчаюць немцаў, помсцяць ворагу. Бо хто мог адкрыта раз'язджаць на аўтамабілях па шашы ў ліпені 1942, як не немцы ці паслугачы.

Так, магла надарыцца трагічная памылка. Гэта добра разумелі ў штабе «Вахляжа», але ўсе, аўтары рапарта і чытачы рапарта, гналі антысавецкія стэрэатыпы і прадузятасць. Бальшавіцкія партызаны — заведамыя злачынцы.

Вышэйшае начальства, вядома, пагаджалася, у полымя ўзаемнай варожасці кідалася яшчэ адна галавешка. І не асаджвала размовы.

Рэцыдывы варожасці паміж савецкімі партызанамі і акаўцамі існавалі з самага пачатку. Бясспрэчна. Аб прычынах яе нямала сказана ў папярэдніх раздзелах. Але прыкладна з другой паловы 1943 г. нацягнутыя адносіны яшчэ больш абвастрыліся, набылі формы ўзброенага супрацьстаяння.

Як ужо адзначалася, гэта найперш звязана з нашумелай на ўвесь свет катыньскай трагедыяй і, як вынік, разрывам дыпламатычных адносінаў паміж СССР і польскім урадам Сікорскага. Дарэчы, у заходніх абласцях Беларусі тады не ўсе паверылі паведамленням нямецкай і пранямецкай прэсы пра трагедыю ў Катыні. Многія, у тым ліку і акаўцы, лічылі, гэта чарговая фашысцкая правакацыя. Тым не меней, прорва паміж савецкімі партызанамі і фармаваннямі АК у той час значна павялічылася.

Шэраг польскіх даследчыкаў і аўтараў мемуараў, асабліва што надрукавалі кнігі і артыкулы ў эміграцыі, прычыны ўзброенага супрацьстаяння паміж савецкімі партызанамі і атрадамі АК на беларускіх «крэсах» звальваюць на "праклятых" Саветаў. Вельмі любяць спасылацца на тры дакументы:

пастанову ЦК КП (б) Беларусі ад 22 чэрвеня 1943 г. «Аб мерапрыемствах па далейшаму развіццю партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі»;

пісьмо ЦК КП(б)Б «Аб ваенна-палітычных задачах у заходніх абласцях Беларусі»;

сакрэтны загад камандзірам і камісарам атрадаў брыгады імя Сталіна Баранавіцкага злучэння, які штаб брыгады выдаў 30 лістапада 1943 г.

У першых двух дакументах вызначаліся асноўныя крытэрыі, якімі павінны былі кіравацца падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі да «польскіх буржуазных нацыяналістаў». Адзначалася, што існаванне розных арганізацыяў, кіруемых польскімі буржуазнымі цэнтрамі, належыць трактаваць як «процінраўнае ўмяшанне ў справы нашай дзяржавы». Нацыяналістычныя атрады і групы, створаныя польскімі рэакцыйнымі коламі, трэба было ізаляваць ад насельніцтва шляхам стварэння савецкіх атрадаў і групаў з працоўных польскай нацыянальнасці. Падпольным партыйным камітэтам рэка-

мендавалася «ўсімі спосабамі выкрываць і распускаць нацыяналістычныя атрады і групы».

Ці правамернай была такая пастаноўка пытання? Калі пакінуць па-за ўвагай шаблоны сталінскай прапаганды, тагачасную замшэлую палітлексіку, а ўнікнуць у сутнасць і дух дакументаў, то на пастаўленае пытанне напрошваецца станоўчы адказ. Правамерная.

Партызанская разведка не драмала, у Маскве добра ведалі, што палітычныя эмісары з-за Буга пастаянна нагнятаюць антысавецкую істэрыю, увесь час паднімаюць пытанне пра будучую польска-савецкую граніцу і г. д. Асаблівы недавер камандавання і асобых аддзелаў выклікала прыбыццё ў атрады АК на Заходняй Беларусі парашутыстаў — "ціхацёмных" з Англіі. Савецкія партызаны падазравалі, і не без падстаў, што тыя працуюць на англійскую разведку.

У заходніх абласцях Беларусі дзейнічала крайне рэакцыйная арганізацыя пілсудчыкаў — Нацыянальныя ўзброеныя сілы (польская абрэвіятура — НСЗ). Ад яе дыстанцыравалася нават мясцовае кіраўніцтва АК.

У раёне Налібокаў немалую актыўнасць праяўляла тутэйшая ячэйка НСЗ, яе ўзначальваў камендант Мечыслаў Грыгаровіч («Гжэгаж»). У ёй аб'ядноўвалася моладзь і частка каталіцкага духавенства на чале з ксяндзом Байкам. У маі 1943 г. камандзір атрада АК Каспер Мілашэўскі сустрэўся з Мечыславам Грыгаровічам, каб абмеркаваць узаемаважныя пытанні. Размовы не атрымалася. «Гжэгаж» адразу прыгразіў Мілашэўскаму палявым судом за «раскольніцкую дзейнасць на яго тэрыторыі».

Ксяндзы і іхнія прыхільнікі не перамяніліся. Паляк грозіць паляку судом, бо той не так ваюе з агульным ворагам.

Смех і грэх.

Такіх фактаў было шмат. У пачатку вайны і ў сярэдзіне. Па ўсіх «крэсах».

Атрадзікі, кіраваныя пілсудчыкамі і натхняныя ксяндзамі, яшчэ горай сустракалі ініцыятыву беларускіх партызанаў.

Усе факты «пальшчызны» сустракалі рэзкую ацэнку савецкага кіраўніцтва падпольным партызанскім рухам у Заходняй Беларусі, Масквы. Да таго, яшчэ раз успомнім, ужо былі разарваныя дыпламатычныя адносіны паміж урадам СССР і польскім у Лондане. Стварылася такое становішча, калі зноў стала бліжэй да вайны, чым да міру. Іменна ў такіх палітычных абставінах з'явіліся на свет дакументы ЦК КП(б)Б. Тэндэнцыйныя, натхнялыя Масквою, яны не ўлічвалі складанасць моманту, усе нюансы і хітрасплячэнні польскага руху супраціўлення. Не ўлічвалася, што, напрыклад, Армія Краёва і Нацыянальныя ўзброеныя сілы — не адно і тое.

Калі з больш-менш дэмакратычнай АК можна было ісці на такі-сякі кампраміс, спрабаваць знайсці агульную мову, то з НСЗ падобнае было проста немагчымым з-за адкрыта варожай, непрымірымай пазіцыі.

Ва ўпамянутых дакументах не давалася адказу, як ставіцца да групаў ці атрадаў АК, якія ішлі на кантакт з савецкімі партызанамі,

жадалі ўдзельнічаць у сумесных антыфашысцкіх акцыях. Гэта прадвызначыла і з'яўленне вышэйназванага загада па брыгадзе імя Сталіна. Згодна з загадам камандзіры і камісары ўсіх пяці атрадаў павінны былі 1 снежня 1943 г. «прыступіць асабіста да раззбраення ўсіх польскіх легіянераў (партызанаў). Канфіскаваныя зброю і дакументы зарэгістраваць, а ўсіх легіянераў, разам з канфіскаванаю зброяю, даставіць у польскі атрад Мілашэўскага ў ваколіцах Несцяровічаў Івянецкага раёна».

Фармальным повадам для інцыдэнту з'яўлялася праблема забеспячэння харчаваннем партызанаў (АК і савецкіх) у навакольных вёсках. Іншымі словамі — "раздзел сфераў уплыву». Была дамоўка, што ў вёсках побач з пушчай забаранялася рэквізаваць у насельніцтва харч, адзенне, корм для коней. Аднак на практыцы дамоўленасць парушалася як з аднаго, так і з другога боку. Былі канфлікты, у тым ліку і ўзброеныя. У лістападзе 1943 г. уланы з эскадрона Здзіслава Нуркевіча («Ночы») расстралялі групу партызанаў з так званага (акаўцамі) жыдоўскага атрада Сямёна Зорына (значную частку атрада складалі асобы яўрэйскай нацыянальнасці), бо тыя займаліся марадзёрствам у каталіцкіх вёсках. Даўно наспяваны канфлікт успыхнуў. На жаль, патушыць яго не ўдалося.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Каспера Мілашэўскага:** «У пачатку лістапада (1943 г.— Я. С.) да нашага атрада далучылася група з 30 добра ўзброеных чалавек з Маладзечна пад кіраўніцтвам паручніка Гаеўскага. У яе складзе было некалькі падхарунжых і адзін афіцэр. Злучэнне маёра «Вацлава» (Вацлава Пэлькі.— Я. С.) цяпер налічвала каля 600 жаўнераў.

У лістападзе не выканалі ні адной акцыі, рыхтавалі запасы харчавання на зіму, будавалі цёплыя зямлянкі, часовыя канюшні. 2-я рота паручніка «Грома» («ціхацёмны» Лех Рыдзеўскі.— Я. С.) тым часам рыхтавалася да дыверсійных акцыяў.

Тым часам супрацоўніцтва з кіраўніцтвам савецкіх партызанаў пачало выразна псавацца. Даволі часта непаразуменні паміж дробнымі групамі абвастралі сітуацыю і патрабавалі вялікіх намаганняў і ўзаемных захадаў для знаходжання вінаватых. Савецкае камандаванне з недаверам аднеслася да прыбылых у наш атрад новых афіцэраў-парашутыстаў. Я часта ездзіў у савецкі штаб, савецкія афіцэры бывалі ў нас, усё каб высветліць сумненні, якія турбавалі савецкіх.

Пад канец лістапада савецкае камандаванне паведаміла нам пра інцыдэнт паміж групай нашай кавалерыяй і савецкімі партызанамі з атрада імя Пархоменкі на чале з Зорыным. Я накіраваўся з паручнікам Гаеўскім у савецкі штаб, каб высветліць дэталі канфлікту. Аказалася, у мясцовасці Дубнікі дайшло да ўзброенай сутычкі, у выніку засталіся забітыя і параненыя. Афіцэры з савецкай арміі жадалі выдачы ў іх рукі падхарунжага «Ночы», які ўзначальваў у час сутычкі польскую групу. Аднак ён быў перавезены сваімі падначаленымі ў невядомае нам месца і там схаваны.

Тым не менш савецкія афіцэры штодзённа прыязджалі да нас і патрабавалі выдачы падхарунжага «Ночы». Маёр «Вацлаў» заўважыў

нервовасць савецкіх прадстаўнікоў, дыпламатычна вырашыў на некаторы час пакінуць штаб.

Калі мы вярнуліся ў пушчу, засталі групу савецкіх афіцэраў. Яны паведамілі, што маюць пэўныя звесткі аб рыхтаванай нямецкай акцыі ў Налібоцкай пушчы. Маёр «Вацлаў» склікаў нараду польскіх афіцэраў, на якой вызначылі склад польскай дэлегацыі. У яе, акрамя мяне, увайшлі: маёр «Вацлаў» (Вацлаў Пэлька), паручнік «Іква» («ціхацёмны» Эззэхель Лось), падпаручнік «Вальдан» (Валенты Пархімовіч), падпаручнік «Клін» (Юліуш Баброўніцкі), вахмістар Гаворка, плютуновы (узводны.— Я. С.) Скродзкі, ксёндз-капелан Сувала і яшчэ некалькі чалавек.

На сустрэчы ў сувязі з разыходжаннем поглядаў дэлегацыяў нас абяззброілі і інтэрніравалі.

Частку нашага атрада ў Дрывезне (каля 400 жаўнераў) таксама раззброілі. Нашы групы ў іншых месцах па чарзе складалі зброю. Пазбеглі раззбраення адно кавалерыйскі эскадрон і некалькі афіцэраў, якія знаходзіліся па-за стаянкай».

Да сказанага Касперам Мілашэўскім трэба дадаць, што раззбраенне і інтэрніраванне адбыліся без значных ахвяраў. Ён сам і яшчэ чатыры афіцэры, у тым ліку «ціхацёмныя» Эззэхель Лось («Іква») і Лех Рыдзеўскі («Гром»), былі дастаўлены ў Маскву на Лубянку і вярнуліся ў Польшчу пасля заканчэння вайны.

Трэці «ціхацёмны» паручнік Адольф Пільх («Гура») пазбегнуў арышту, уцёк з лагера. Пад яго кіраўніцтвам быў створаны новы атрад з ліку неінтэрніраваных. З гэтага часу Пільх стаў заклятым ворагам каварных савецкіх партызанаў. «Гура» заключыў штосьці накшталт часовага перамір'я з нямецкімі гарнізонамі ў Івянцы і Ракаве, стаў атрымліваць ад новых «саюзнікаў» зброю і боепрыпасы і выкарыстоўваць іх у барацьбе з савецкімі партызанамі. Ужо ў сярэдзіне снежня 1943 г. немцы даставілі ў атрад «Пільха» 10000 адзінак амуніцыі, 2 станкавыя кулямёты і 4 мінамёты.

А вось як выглядаюць тыя падзеі ў інтэрпрэтацыі другога боку. Гэты бок прадстаўляе адзін з арганізатараў створанай летам 1941 г. у Дзяржынску падпольнай арганізацыі Генадзь Васільевіч Будай. Восенню 1942 г. пайшоў у партызаны, быў камісарам Івянецкага партызанскага злучэння, рэдагаваў раённую газету «Народный мститель». Ён відавочца і ўдзельнік апісаных вышэй падзей, праўда, ацэньвае іх са свайго пункту гледжання.

**БЫЛО ГЭТА ТАК.** З успамінаў Генадзя Будая (даюцца ў скарачэнні): «У Налібоцкай пушчы дзейнічаў самастойны польскі партызанскі атрад, якім камандаваў былы афіцэр польскай арміі Каспер Мілашэўскі. Спачатку паміж членамі гэтага атрада і савецкімі партызанамі былі нармальныя ўзаемаадносіны. Яны часта сустракаліся, памагалі адзін аднаму ў час аперацый супраць гітлераўцаў.

Прыкладам такога баявога ўзаемадзеяння можа служыць разгром варожага гарнізона ў Івянцы.

Аднак хутка мы адчулі, што камандаванне польскага атрада

пазбягае нас. Больш таго, палякі спынілі ўзброеную барацьбу з акупантамі, адседжваліся ў лесе.

— Чаму не ваюеце, не ходзіце на «жалезку»,— пыталіся мы.

— У нас мала патронаў, няма ўзрыўчаткі,— чуліся ўхілістыя адказы.

— Мы дадзім вам тол, навучым, як рабіць міны, дапаможам боепрыпасамі,— прапаноўваў міжрайцэнтр (маецца на ўвазе Івянецкі падпольны міжрайцэнтр.— Я. С.).

У адказ — маўчанне.

Тады мы яшчэ не ведалі ўсёй праўды аб намерах польскіх буржуазных нацыяналістаў... Але пра штосьці ўжо здагадваліся.

Сідарок (кіраўнік Івянецкага міжрайцэнтра.— Я. С.) неяк прапанаваў мне:

— Давай з'ездзім да палякаў, пагутарым шчыра з байцамі, паспрабуем даведацца, чаму яны перасталі ваяваць.

Непадалёку ад міжрайцэнтра размяшчалася адно з падраздзяленняў польскага атрада, якім камандаваў былы асаднік падхарунжы Нуркевіч, і мы накіраваліся туды. Сустрэлі нас насцярожана. На стале з'явілася самагонка. Мы з Сідарокам, зразумела, не пілі, а Нуркевічу не заміналі, бо ведалі, што выпіць ён любіць. Праз якуюнебудзь паўгадзіну яго ўжо давялося цягнуць у зямлянку. Тады мы падселі да байцоў ля кастра.

Як высветлілася, у атрад Мілашэўскага прыбыў эмісар польскага эміграцыйнага ўрада ў Лондане па мянушцы Гура з дырэктывай: з немцамі не ваяваць, у кантакты з савецкімі партызанамі не ўступаць, трымаць вінтоўку ля нагі, назапашваць сілы.

Абапіраючыся на рэакцыянераў тыпу Нуркевіча, лонданскі эмісар разгарнуў несамавітую дзейнасць. Група Гуры і Нуркевіча пачала сілком забіраць у сваю банду палякаў, а тых, хто не згаджаўся супрацоўнічаць з імі, — расстрэльваць. Яна правакавала сутычкі з нашымі партызанамі, здаралася, забівала іх з-за вугла, адкрыта ішла на супрацоўніцтва з гітлераўцамі. У вёсках польскія нацыяналісты вялі антысавецкую прапаганду, тэрарызавалі палякаў і беларусаў, якія дапамагалі народным мсціўцам.

Дарэчы... Здзіслаў Нуркевіч у 1960 годзе быў выкрыты органамі дзяржбяспекі Польскай Народнай Рэспублікі і панёс заслужаную кару, а яго паплечнік... Гура (Адольф Пільх) хаваўся пад крыльцам сваіх заступнікаў у Англіі.

У партызанскіх газетах, лістоўках, у вусных гутарках з насельніцтвам... выкрываліся інтрыгі ворагаў польска-савецкай дружбы, растлумачваліся іх каварныя мэты...

Мы дапамагалі людзям разабрацца, дзе іх сябры, а дзе ворагі».

Акаўцы, са свайго боку, таксама дапамагалі разабрацца... А ў выніку такіх «разборак» — кровапралітная барацьба двух братніх славянскіх народаў, гледзячы на якую, немцы, канешне ж, паціралі рукі ад задавальнення.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З рапарта галоўнага каменданта АК генерала Тадэвуша Камароўскага («Бура») у штаб польскага

вярхоўнага галоўнакамандавання ў Лондане ад 1 сакавіка 1944 г. пра сітуацыю ў Навагрудскай акрузе:

«У акрузе на першае месца ў працы высунулася самаабарона ад варожай савецкай партызаншчыны і жыдоўска-камуністычных бандаў. З гэтай мэтай нашы атрады былі адмабілізаваны і згрупаваны ў трох батальёнах: батальёны 77 пяхотнага палка — Наднёманскі і УБК (ударны кадравы батальён.— Я. С.), якія дзейнічаюць на правым беразе Нёмана: батальён 78 пяхотнага палка, Стаўбцоўскі, у раёне Стоўбцаў.

19.11.43 г. падраздзяленне Наднёманскага батальёна вяло бой у раёне Жалудка з савецкімі партызанамі ў колькасці 1500 чалавек на працягу дня. Савецкі атрад вымушаны быў перайсці праз пераправу на другі бераг Нёмана. Савецкія страты — забітыя, параненыя, патанулыя — каля 200 чалавек, а таксама ўвесь абоз і шмат узбраення. Нашы страты: 2 забітыя, 1 ў палоне і некалькі параненых.

Наднёманскі батальён і УБК дзейнічалі часткова на левым беразе ракі. У выніку раёны Ліды, Шчучына, Валожына і паўночная частка Навагрудскага абводу былі поўнасцю ачышчаны ад савецкіх бандаў».

Камендант Навагрудскай акругі АК Януш Праўдзіц-Шляскі ў сваёй кнізе «Навагрудчына ў барацьбе. 1940—1945» адзначае, што фарміраванні гэтай акругі з 1 студзеня 1942 г. і да моманту прыходу Чырвонай Арміі правялі 185 баёў і ўзброеных сутычкаў, з іх 102 — з немцамі, іхнімі паслугачамі, 83 — з савецкімі партызанамі, адпаведна ў працэнтах — 55 і 45. Статыстыка больш чым красамоўная. У вайну ўжо акаўцы Навагрудчыны ваявалі амаль нароўні з немцамі і Саветамі.

Чаму?

Адказ кожны чытач лёгка выведзе сам.

Не менш драматычна развіваліся падзеі ў Віленскай акрузе АК. Першы сур'ёзны канфлікт адбыўся ў Нарачанскай партызанскай зоне. Калі савецкія партызанскія разведчыкі прынеслі ў свой штаб нелегальную газету Віленскай акругі АК «Неподлеглосць» («Незалежнасць») з апісаннем катынскай трагедыі, з іншымі матэрыяламі рэзка антысавецкага зместу, гнеў і абурэнне партызанскіх камандзіраў былі бязмежнымі. Усе былі ўпэўненыя, гэта нішто іншае, як агідны паклёп на гераічны савецкі народ. У адплату быў аддадзены загад абяззброліць і расфармаваць акаўскі атрад Антоні Бужыньскага («Кміціца»).

Загад выканалі ў пачатку восені 1943 г. Кіраўніцтва атрада арыштавалі. Некалькі камандзіраў адразу расстралялі. Частку радавых байцоў размеркавалі па падраздзяленнях брыгады Фёдара Маркава і ў толькі што створаны польскі атрад імя Ванды Васілеўскай. Ён падпарадкоўваўся савецкаму камандаванню. Многа акаўцаў разбеглася.

На гэтым справа не скончылася. Адно самадурства спарадзіла другое. На ўдар акаўцы адказалі ўдарам, і не адным.

Па загаду штаба Віленскай акругі АК у Нарачанскі край прыбыў паручнік Зыгмунт Шэндзеляж («Лупашка»). З рэшткаў атрада

«Кміціца» і навабранцаў ён сфармаваў новы атрад, на яго базе пазней была створана 5 (Віленская) брыгада. «Лупашка» адразу пачаў дзейнічаць так, быццам забыўся, што ўсе яны ўзялі ў рукі зброю, каб змагацца з немцамі. Ворагам № 1 для яго сталі савецкія партызаны. Ім ён не даваў спакою ні днём ні ўначы — арганізоўваў засады, нападаў знянацку на дробныя савецкія групы. Амаль кожная такая сутычка заканчвалася крывёй і ахвярамі.

Саветы жалі пасеянае. Масква, Лондан, Варшава мыслілі высока, а расплачваліся за адарванасць іх мыслення радавыя салдаты. Беларусы і палякі.

На ўзроўні камандзіраў глупства сітуацыі ацанілі зразу. Славяне б'юцца адзін з адным, а не з заклятым ворагам — немцамі.

Штаб Фёдара Маркава накіраваў «Лупашку» адкрытае пісьмо, прапаноўвалася спыніць узаемнае знішчэнне і неадкладна пачаць перагаворы. Далі гарантыі ненападзення на палякаў. Сустрэча адбылася на хутары Сянгуцава ля вёскі Бібікі. Савецкую дэлегацыю ўзначальваў старшы лейтэнант Валасны, акаўскую — паручнік Шэндзеляж. Гэта былі ўступныя размовы.

Спатканне на больш высокім узроўні адбылося ў Сыраватках непадалёку ад Свіра. АК прадстаўляў камендант Віленскай акругі Аляксандр Кжыжаноўскі («Вільк»), з савецкага боку прысутнічаў камандзір брыгады імя Гастэлы Віктар Манохін. Размова ішла ў нервовай, напружанай атмасферы. Рэзкія ўзаемныя папрокі тычыліся будучай савецка-польскай граніцы, раззбраення атрада «Кміціца», антысавецкай прапаганды на старонках падпольнага перыядычнага друку АК, забеспячэння харчаваннем у навакольных населеных пунктах.

Закраналіся другія непрыемныя тэмы. Тон дыскусіі ўсё больш абвастраўся і, нягледзячы на ўсе намаганні Манохіна, да паразумення не дайшлі. Недавер і варожасць узялі верх над цвярозым разлікам.

22 лютага 1944 г. часці злучэння Фёдара Маркава ўсёй моцаю атакавалі 5-ю брыгаду АК каля рэчкі Стрэчынка і вёскаў Рудзішы і Лозава. Пасля інтэнсіўнай перастрэлкі «Лупашка» адвёў жаўнераў у бок Вільні. Урок быў занадта моцны, а сілы няроўныя. «Лупашка» часова прыпыніў аблавы і засады на савецкіх партызанаў. Перамір'е так і не наступіла.

Як вядома, у лістападзе 1943 г. кіраўнікі ўрадаў СССР, ЗША і Англіі на радзе ў Тэгеране папярэдне рашылі прызнаць граніцы паміж СССР і Польшчай па лініі Керзана. Гэты факт у сукупнасці з іншымі — пра іх сказана вышэй — паставіў акаўцаў на «крэсах» перад дылемаю. Альбо актыўна ўключацца ў савецкі партызанскі рух (савецкія сілы ў Заходняй Беларусі прыкладна ў чатыры разы пераўзыходзілі фарміраванні АК), альбо ісці за Буг, на акупаваныя польскія землі, дзе такіх прышэльцаў, па праўдзе сказаць, ніхто не чакаў. Камандаванне АК на «Крэсах Всходніх» (са згоды свайго камандавання) выбрала трэці шлях — заставацца на месцы і весці барацьбу на два фронты. Вынікі гэтай барацьбы скрупулёзна падлічыў Януш Праўдзіц-Шляскі — мы іх назвалі.

Канфліктную сітуацыю спрабавалі выкарыстаць немцы. Яны

імкнуліся ўстанавіць кантакт з атрадамі АК, аказаць ім дапамогу зброяй і боепрыпасамі, а затым падштурхнуць да барацьбы супраць савецкіх партызанаў, страшных для немцаў усё болей.

Дзесьці на стыку студзеня—лютага 1944 г. камандзір 5-й брыгады Віленскай акругі АК атрымаў пісьмо ад немцаў з прапановай спыніць узаемную барацьбу. «Лупашка» ўхіліўся ад адказу, сказаў, што гэта справа не ў яго кампетэнцыі. Неадкладна паведаміў «Вільку» прапанову немцаў.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў падпаручніка Антоні Рымшы, камандзіра эскадрона 5-й брыгады:**

«...Крыху пазней «Лупашка» мне перадаў адказ «Вілька»: ён можа спаткацца, але толькі выслухаць прапанову камандзіра вермахта. Праз тыдзень я атрымаў загад ад «Лупашкі» прыбыць у вёску Супраненты (Астравецкі раён) і адтуль суправаджаць «Вілька» ў вёску Свайгіні, дзе яго павінна была чакаць нямецкая дэлегацыя. Немцам завязалі вочы. Іх суправаджаў з-пад Старой Вілейкі «Жбік».

Спатканне адбылося ў гасціннага гаспадара ў мясцовасці Свейгі.

..."Вільк", адзеты ў цывільнае адзенне, сеў за стол і засланіў фіранкай акно... З нямецкага боку былі тры афіцэры ў ваеннай форме. Спярша «Вільк» асабіста праверыў пасведчанне аднаго з іх, яно было падпісана фельдмаршалам... Нямецкую дэлегацыю ўзначальваў палкоўнік Зейдлер фон Рохенфельд. У якасці перакладчыка выступаў немец з-пад Познані, па прафесіі каморнік. Трэці быў супрацоўнікам СД са Старой Вілейкі.

...Нямецкі палкоўнік коратка абмаляваў сітуацыю на тэрыторыях, апанаваных партызанамі, а таксама цяжкасці, напатканыя немцаў пры забеспячэнні войскаў на Усходзе. Паведаў пра турботы, звязаныя з праходжаннем эшалонаў на тэрыторыі Віленшчыны і Навагрудчыны... Растлумачыў, што прыбыў з паўнамоцтвамі для ўстанаўлення кантактаў з польскімі ляснымі атрадамі і ўступнымі прапановамі на гэты конт.

«Вільк» адказаў, што ён гатовы выслухаць прадстаўніка вермахта, хаця нямецкія прапановы пасля стольскіх гадоў тэрору супраць палякаў на гэтых землях з`яўляюцца неспадзяванымі.

Нямецкі палкоўнік прапанаваў устрымацца ад зачэпных акцыяў як з аднаго, так і з другога боку. У абмен на бяспечнае перамяшчэнне нямецкіх цягнікоў праз тэрыторыю, кантраляваную палякамі, немцы абяцалі дастаўляць узбраенне, абмундзіраванне і прадукты харчавання для польскіх лясных атрадаў. «Вільк» спытаў, як выглядала б такое забеспячэнне на практыцы.

Нямецкі прадстаўнік з дапамогай перакладчыка растлумачыў, што дзе-небудзь непадалёку чыгуначнай станцыі, якую мы можам выбраць самі, немцы будуць складзіраваць прызначаныя для нас зброю, боепрыпасы, абмундзіраванне і правіянт, пра што нам загадзя паведамяць. Ахова гэтых аб`ектаў была б дзеля вока, яе без цяжкасці можна захапіць ці прагнаць".

"Вільк", па словах Антоні Рымшы, гэтую прапанову адхіліў. Тады нямецкі прадстаўнік спытаў, на якіх умовах магло б дайсці да спынення агню з абодвух бакоў. «Вільк», адзначае аўтар успамінаў,

даў згоду абмеркаваць гэтае пытанне толькі з такім прадстаўніком вермахта, які будзе ўпаўнаважаны галоўнакамандуючым Усходнім фронтам. «Вільк» потым дасць адказ. Пасля скантактавання са сваім вышэйшым кіраўніцтвам.

Па сведчанню Рымшы, перагаворы працягваліся і наступны дзень, закончыліся нічым.

Спробы немцаў устанавіць кантакты з фарміраваннямі АК на Віленшчыне не былі аднаразавымі. У студзені — лютым 1944 г. супрацоўнікі нямецкай жандармерыі звярталіся з аналагічнымі прапановамі да камандзіраў атрадаў Грацыяна Фруга («Шчэрбеца») і Адама Барычкі («Броны»), прапаноўвалі спыніць агонь і распачаць сумесную акцыю супраць савецкіх партызанаў. Прапанова засталася без адказу.

У сакавіку 1944 г. камандаванне Віленскага гарнізона афіцыйна, праз шэфа абвера, звярнулася ў штаб Віленскай акругі АК з прапановай заключыць ваеннае пагадненне для правядзення сумеснай аперацыі па ачышчэнню Віленшчыны ад савецкіх партызанскіх атрадаў. Узамен на згоду абяцалі зброю, правіянт і ўсю неабходную амуніцыю. «Вільк», які да таго часу пракансультаваўся з кіраўніцтвам у Варшаве, весці якія-небудзь перагаворы з немцамі катэгарычна адмовіўся.

Тым не менш немцы, у якіх даўно ўжо збілі пыху пад Сталінградам і Курскам, на морах і ў Афрыцы, не трацілі надзею. Яны ўжо шукалі дапамогі дзе маглі. І ў тых палякаў, якіх ненавідзелі, якім у польскай сталіцы, у Варшаве, забаранілі разам ездзіць у аўтобусах, забаранілі хадзіць па ўсіх баках вуліцаў.

Паражэнні вучаць. Як і любы боль. Паразумнелі немцы позна. Камандаванне АК баялася з імі ўжо нават садзіцца за адзін стол.

Адна з апошніх спробаў перацягнуць на свой бок акаўцаў і нацкаваць іх на савецкіх партызанаў была звязана са знаходжаннем «Лупашкі» ў Віленскім гестапа па вул. Ахвярнай. Існуюць дзве версіі, якім чынам ён там апынуўся. Паводле першай, напорны «Лупашка» спецыяльна паехаў у гестапа для ўзгаднення супрацоўніцтва ў правядзенні сумеснай барацьбы супраць вераломных савецкіх партызанаў. Паводле другой, у час гасцявання ў стрыечнай сястры ў Вільні быў выпадкова арыштаваны літоўскай паліцыяй і перададзены ў гестапа.

Немцы нядаўняга перагаворніка сходу прызналі. У страшным для віленчукоў доме па вуліцы Ахвярнай «Лупашку» паводзілася няблага. Сядзеў, праўда, у камеры, але падсілкавацца запрашалі ў канцылярыю. Частавалі гарэлкай і лікёрамі. Прапановы былі тыя самыя: дапамога акаўцам зброяй, амуніцыяй і нават нямецкімі інструктарамі-дарадцамі, калі «Лупашка» пагодзіцца разам выступіць супраць Саветаў. «Лупашка» зусім нядаўна не раз нападаў на савецкіх, рабіў гэта з помсты. Па ўласнай ініцыятыве, можа, быў бы не супраць і цяпер пайсці...

Але ваенны чалавек з пашанай ставіўся да загадаў вышэйшага начальства. Гэтае начальства, не столькі «Вільк», як Варшава і Лондан, любое супрацоўніцтва з немцамі ў той час, несумненна,

палічыла б здрадаю і правакацыяю, і яго ініцыятарам было б не здабраваць.

У рэшце рэшт усё скончылася на тым, што «Лупашку» ў гестапа выдалі пропуск, далі 100 рэйхсмаркаў на дарогу і адпусцілі на волю. Пэўна, немцы спадзяваліся, што ў будучым ён можа спатрэбіцца. Праз некалькі дзён паручнік зноў узначаліў 5-ю брыгаду.

Што датычыць Навагрудскай акругі АК, то тут некаторыя камандзіры заключалі з немцамі пагадненні пра «нейтралітэт». Мусіць, у пэўнай ступені садзейнічаў гэтаму паталагічны антысаветызм каменданта акругі Януша Праўдзіца-Шляскага.

Успомнім: у 1940 г. ён быў арыштаваны органамі НКУС за нелегальны пераход граніцы і падпольную антысавецкую дзейнасць. Да прыходу немцаў сядзеў у турме ў Мінску.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, першыя кантакты акаўскіх афіцэраў з гітлераўцамі адбыліся без яго ведама. У прыватнасці, менавіта так зрабіў Адольф Пільх («Гура») ў раёне Налібоцкай пушчы. Дарэчы, атрад «Гуры» з лістапада 1943 г. і па жнівень 1944 г. (8 месяцаў) не правёў ні аднаго бою з немцамі, затое меў 32 узброеныя схваткі з савецкімі партызанамі. Яго прыкладу паследаваў і Анджэй Кутзнер («Малы»), пакуль па загаду штаба акругі не быў перадыслацыраваны з атрадам з ваколіцаў Ракава ў Ашмянскі раён.

Сярод падзеяў, звязаных са спробамі немцаў «пабратацца» з АК, самай нашумелай з'яўляецца справа Юзэфа Сьвіды («Леха»), таго самага ростмістра Сьвіды, які на першапачатковым этапе кіраваў рэзідэнтурай польскай разведкі ў Мінску. У красавіку 1942 г. яго арыштавала СД, але праз тры месяцы выпусціла. Паводле яго слоў, з-за адсутнасці доказаў.

Прыязджае ў Варшаву. У сувязі з мелым арыштам немцамі для разведкі ўжо быў непрыгодны. Атрымаў назначэнне ў Навагрудскую акругу, куды прыбыў летам 1943 г. Праўдзіц-Шляскі паставіў яго камандзірам Наднёманскага злучэння. У гэты час пачаліся канфлікты з савецкімі партызанамі, супраць якіх ротмістр быў настроены вельмі варожа. На гэтай глебе пачаліся яго кантакты з немцамі.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Юзэфа Сьвіды:** «У палове снежня (1943 г.— Я. С.) стараста з Няцечы (Лідскі раён.— Я. С.) прынёс пісьмо, пакінутае ў яго немцамі. Напісана яно было па-нямецку. Штаб нямецкай аператыўнай групы «Мінск», наглядаючы за маёй барацьбой з савецкімі партызанамі, выказваў гатоўнасць дастаўляць атраду патрэбную зброю і амуніцыю. Адказ я павінны быў даць тым самым шляхам. Праз старасту.

Спачатку хацеў прапанову праігнараваць, потым рашыў параіцца з камендантам акругі падпалкоўнікам Шляскім.

Хутка надарылася аказія: камендант адведаў мяне на куццю, 24 снежня.

...Паказаў пісьмо немцаў Шляскаму і прапанаваў яму прыняць гульню, трактаваць яе як ваенную хітрасць. Звярнуў яго ўвагу, што план «Навальніца» накладвае на Навагрудскую акругу асабліва адказныя задачы, а пастаяннае папаўненне добраахвотнікамі патра-

буе вялікай колькасці ўзбраення. Калі будзем мець зброю, толькі ад нас залежыць, супраць каго яе ўжыць.

Спачатку Шляскі адмаўляўся. Не хацеў даць згоду, бо апасаўся рызыкі і непрыемнасцяў для сябе. Тады я сказаў яму, што задачу ўзмацнення баявой моцы акругі стаўлю на першы план...

Шляскі яшчэ раз абдумаў усю справу і сказаў: «Дзейнічай, толькі не едзь, пан, на спатканне да іх адзін».

Я не паехаў адзін. Узяў з сабою «Бартка» з БІПу (Бюро інфармацыі і прапаганды.— Я. С.), прозвішча не памятаю, журналіста, ці, можа, публіцыста, выпускніка Ягелонскага універсітэту, які бегла размаўляў па-нямецку. Быў ён маім перакладчыкам.

Паехалі на конях. Ва ўмоўленым месцы нас чакаў нямецкі вайсковы аўтамабіль. Прывёз у Ліду, у адзін з будынкаў на тэрыторыі казармаў. Пасярод вялікай залы стаяў накрыты казённым зялёным сукном стол. Нас чакалі два вышэйшыя афіцэры (хіба, палкоўнікі) са штаба аператыўнай групы «Мінск» у акружэнні мясцовых афіцэраў з войска і паліцыі. Быў таксама начальнік інтэнданцкай службы Лідскай акругі.

... Пасля абмену прывітаннямі я ўзяў слова, каб папярэдзіць, што не прадстаўляю ніякай нацыянальнай групы, ніякай партыі, ніякай падпольнай арганізацыі. Б'ю бальшавікоў сваімі рукамі і для гэтага патрабую зброю. Потым выклаўжыў ім загадзя падрыхтаваныя даныя аб нашых запатрабаваннях зброі і амуніцыі — не менш як на два батальёны. У першай партыі хацеў атрымаць цяжкую аўтаматычную зброю, гранатамёты і амуніцыю, у наступнай — супрацьтанкавае ўзбраенне.

Калі я скончыў пералік (немцы адразу папярэдзілі, што супрацьтанкавую зброю пакуль даставіць не могуць), галоўны нямецкі чын заўважыў: «Увесь час пан ставіць нам задачы, але пан нічога не кажа, што абяцае ўзамен».

Адказаў, што нічога не магу абяцаць, акрамя таго, што буду і ў далейшым біць бальшавікоў, а пасля атрымання зброі не распачну ніводнай зачэпнай акцыі супраць немцаў. Прычым папярэдзіў: калі змест нашай размовы будзе немцамі калі-небудзь раскрыты, паразуменне імгненна і аўтаматычна разрываецца.

Такімі былі перагаворы ў Лідзе.

Яшчэ перад выездам я падзяліўся сваімі планамі з «Рагнарам», «Міхалам», «Барткам» і «Зыхам». Калі вярнуўся, асабіста правёў гутаркі з усімі камандзірамі батальёнаў, з «Саблеўскім» таксама. Не выказаў ніякіх перасцярогаў і пярэчанняў. Канешне, нікому не казаў пра згоду на іх каменданта Шляскага.

На працягу студзеня, лютага і сакавіка 1944 г. ва ўмоўленыя пункты было дастаўлена, бадай, 5 транспартаў зброі».

Так было ці не так, сказаць сёння цяжка. Цытаваныя радкі Юзэф Сьвіда пісаў у сакавіку 1985 г. Да таго часу памерлі ўсе названыя ім сведкі і відавочцы, у тым ліку Праўдзіц-Шляскі. Запярэчыць былому ротмістру ніхто не змог. У кантэксце даследаванай

тэмы для нас важныя факты, якія прызнае і сам Юзэф Сьвіда: кантакты з немцамі былі, зброю акаўцы ад іх атрымлівалі.

Вось што на гэты конт выказвалі былыя паплечнікі Юзэфа Сьвіды па АК. Выказвалі задоўга пасля вайны.

Станіслаў Сэндзяк, начальнік штаба Навагрудскай акругі АК: «У палове студзеня 1944 «Лех» (...) праясніў прычыны сваіх дзіўных паводзінаў у дачыненні да барацьбы з немцамі ў снежні 1943 г. і студзені 1944 г. Смерць сябра паручніка «Кубуся» (паручнік Тадэвуш Брынчыньскі загінуў у сутычцы з савецкімі партызанамі.— Я. С.), звестка пра ліквідацыю батальёна 78 пяхотнага палка ў Налібоцкай пушчы савецкімі партызанамі, непрыязныя адносіны да палякаў савецкіх партызан на левым беразе Нёмана — усё гэта закранала яго глыбока. У канчатковым выніку прывяло да памылковага рашэння, якое пагражала страшнымі вынікамі. «Лех» насуперак указанням галоўнага камандавання і штаба акругі вырашыў змяніць фронт і не выконваў наказ пра супрацоўніцтва з савецкімі партызанамі, пачаў ставіцца да іх як да ворагаў.

У слушнасці свайго рашэння хацеў пераканаць штаб акругі сілай. Першай яго ахвярай стаў баранавіцкі інспектар капітан Анджэй Вяжбіцкі («Юзэф»). 20.01.1944 г. ён прывёў на тэрыторыю ротмістра «Леха» групу з 20 чалавек, яны ў баранавіцкім інспектараце былі дэканспіраваны. «Лех» запрасіў яго на размову палітычнага характару. Пачуўшы безнадзейную канцэпцыю ротмістра «Леха» пра супрацоўніцтва з немцамі, "Юзэф", афіцэр з высокім інтэлектуальным узроўнем, адразу, вобразна кажучы, лінуў на яго цэбар халоднай вады. Раз'юшаны «Лех» загадаў яго арыштаваць. Капітан «Юзэф» быў занадта спрытны, каб сядзець пад арыштам. Праз тры дні быў у мяне ў Лідзе».

Крыху інакш апісвае гэты інцыдэнт падпалкоўнік Януш Праўдзіц-Шляскі:

«Лех» хацеў ухапіць уладу ў свае рукі, пачаў настройваць лавушкі на мяне і афіцэраў штаба акругі. Яму ўдалося схапіць інспектара раёна Поўдзень («Баранавічы»), які ехаў на нараду ў штаб акругі, капітана «Юзэфа». Трымаў пад вартай некалькі дзён, прапаноўваў яму розныя пасады ў абмен на супрацоўніцтва. Аднак трапіў на цвёрдага чалавека, які казаў яму праўду ў вочы. Нарэшце яго вызваліў. Капітан «Юзэф» пасля вызвалення прыбыў да мяне, далажыў пра паводзіны «Леха».

У другой палове студзеня 1944 года Праўдзіц-Шляскі быў выкліканы па службовых пытаннях у Варшаву. У той час туды прыехаў начальнік штаба акругі Станіслаў Сэндзяк («Варта»).

«У Варшаве,— успамінае падпалкоўнік Праўдзіц-Шляскі,— я атрымаў падрабязны рапарт ад начальніка штаба капітана «Варты» аб далейшых самавольствах «Леха» і яго шкоднай дзейнасці. Адчуўшы, што справа зайшла занадта далёка, звярнуўся да начальніка штаба Галоўнага камандавання генерала Пялчынскага, прадставіў яму ў сукупнасці ўсю варожую дзейнасць «Леха». Пасля некалькіх сустрэчаў генерал Пялчынскі пайшоў мне насустрач, накіраваў у акругу маёра «Котвіча»... Надзяліў яго шырокімі паўнамоцтвамі».

Чашу цярпення камандавання акругі «Лех» перапоўніў учынкамі, звязанымі з вызваленнем зняволеных акаўцаў з Лідскай турмы. Акцыя была прызначана на 18 студзеня 1944 г. Для яе правядзення штаб акругі патрабаваў ад ротмістра прысляць групу жаўнераў. Той адмовіўся. Тады Сэндзяк знайшоў патрэбных людзей у батальёне «Крысі». Аперацыя прайшла паспяхова. Балазе адзін а ахоўнікаў турмы працаваў на АК, для напарнікаў загадзя была падрыхтавана схема будынка турмы. Ключы падрабілі, ахову напаілі. Увайшлі на тэрыторыю турмы без адзінага стрэлу, вызвалілі арыштаваных палякаў, без адзінага стрэлу выйшлі за вароты. Без усякіх здарэнняў пакінулі горад.

Пра тое, што атрымалася пазней, піша Праўдзіц-Шляскі:

«Тым часам стала вядомым, што «Лех» заключыў паразуменне з немцамі, каб стварыць польскую дывізію для барацьбы з бальшавікамі. Жадаючы выказаць сваю лаяльнасць у адносінах да немцаў, распарадзіўся лёсам вызваленых арыштантаў па ўласным меркаванні. Частку з іх расстраляў, а трупы расклаў, як сардзіны, на шашы ў напрамку Жалудка. Пасля паведаміў немцам, што ўцекачоў схапіў і расстраляў».

У сакавіку ў ваколіцах мястэчка Васілішкі, прыкладна за 50 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Ліды, над ротмістрам Сьвідай адбыўся суд.

Па версіі падпалкоўніка Праўдзіца-Шляскага, падзеі развіваліся так:

«Пасля нашага прыезду ў акругу «Котвіч» выклікаў «Леха». Я са свайго боку назначыў палявы суд у складзе: старшыня — паручнік «Саблеўскі», асэсары — паручнік «Астоя» і паручнік «Пануры», абвінаваўца — капітан «Варта». Суд пасля разгляду справы вынес прыгавор пра пакаранне смерцю.

«Котвіч» на падставе сваіх паўнамоцтваў абскардзіў прыгавор. Вынік — выкананне прыгавору адкладвалася да заканчэння вайны. «Лех» атрымаў права рэабілітацыі. Я вельмі дзівіўся гэтай папраўцы, бо і за меншыя правіннасці расстрэльвалі, прычым прыгавор выконваўся неадкладна. Толькі праз некаторы час, будучы ў Варшаве, даведаўся, што «Котвіч» стрыечны брат «Леха».

Пасля вайны некаторыя польскія аўтары страцілі нямала чарніла, каб абяліць Юзэфа Сьвіду, спасылаліся на супярэчлівыя абставіны ваеннага часу, спрабавалі даказаць, што ротмістр «Лех» мусіў «какетнічаць» з немцамі па чыста тактычных матывах. Праз дзесяткі гадоў усе кропкі над «і» расставіў сам Сьвіда, які на той час жыў эмігрантам у ЗША.

Яго адкрытае пісьмо ў 1985 г. надрукавала парыжская газета «Культура» (выдаецца на польскай мове). У ім «Лех» растлумачыў матывы свайго супрацоўніцтва з немцамі, прызнаваў, што гэта не была выпадковасць. Як вынікае з пісьма, ён цалкам падзяляў тэорыю генерала Саснкоўскага пра «двух ворагаў». Бальшавікі з цягам часу для яго сталі большымі ворагамі, чым немцы. У сваіх учынках аўтар пісьма не пакаяўся. Падкрэсліў, што яму не патрэбна, каб яго абялялі гісторыкі, маўляў, невінаватыя не патрабуюць апраўдання.

# СВАЯ КАШУЛЯ БЛІЖЭЙ ДА ЦЕЛА

Размова пра Армію Краёву на Беларусі будзе няпоўнай, калі не закрануць пытання аб узаемаадносінах акаўскага падполля з дзеячамі Беларускай краёвай абароны (БКА), Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР) і створанымі беларускімі нацыянальнымі і нацыяналістычнымі фарміраваннямі.

Гэтая тэма падрабязна і грунтоўна разглядаецца ў кнізе Юры Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», выдадзенай у Мінску на беларускай мове ў 1993 г. і ўжо знаёмай нашаму чытачу.

Як адзначае Юры Туронак, у Мінску ў ліпені 1942 г. адбыліся перагаворы паміж прадстаўнікамі галоўнага камандавання Арміі Краёвай Зоф`яй Дабжыньскай («Евай») і кіраўніком Партыі беларускіх нацыяналістаў Янкам Станкевічам.

СТАНКЕВІЧ: «...Смутная вайна, у якой гестапа пралівае польска-беларускую кроў, у значнай ступені ідзе па віне мясцовых палякаў. Сярод беларусаў распаўсюдзілася думка, што «двудушнай палітыкай тутэйшых палякаў» кіруе польская цэнтральная ўлада, бо ў розных аддаленых ад сябе мясцовасцях палякі паводзілі сябе аднолькава пры ўваходжанні немцаў. Беларусы ўвогуле баяліся трапіць немцам на вочы, затое палякі віталі іх з энтузіязмам, дзякавалі за вызваленне ад бальшавікоў і запэўнівалі, што толькі палякі — сапраўдныя прыяцелі заходняй культуры і Германіі. Маўляў, яна прынесла ім вызваленне ад прыроджанага ворага — Саветаў, у той час як беларусы — гэта натуральныя бальшавікі, якія арыентуюцца на Усход. Першая кроў, якая пралілася пры нямецкай акупацыі, была беларуская».

ДАБЖЫНЬСКАЯ: «Я адказала на гэта (Станкевічу.— Я. С.): «Даю слова гонару, што такога распараджэння ўладаў (з энтузіязмам сустракаць немцаў.— Я. С.) не было, але, наадварот, такія паводзіны — здрада Польшчы, і сапраўдныя польскія ўлады пакараюць гэтых людзей за здраду дзяржаве... Я папрасіла пералічыць мясцовасці, дзе падобныя выпадкі мелі месца, а таксама даць пайменны спісак палякаў, якія працавалі на немцаў».

Паводле Туронка, адным з галоўных ініцыятараў супрацоўніцтва паміж АК і беларускім нацыяналістычным рухам быў мінскі бургамістр Вацлаў Іваноўскі. Дарэчы, яму прысвечана і другая кніга гэтага даследчыка — «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі» (Варшава. 1992).

Юры Туранок на падставе дакументаў сцвярджае, што Іваноўскі асабіста патраніраваў гэтае супрацоўніцтва, менавіта з яго дапамогай кіраўніцтва польскага падполля пачало шукаць кантактаў з прадстаўнікамі беларускіх нацыяналістычных колаў. Сам Іваноўскі перад ад"ездам у Мінск правёў перагаворы ў Вільні з начальнікам разведкі ЗВЗ-АК Томашам Занам. Пазней, ужо будучы бургамістрам, ён уладкаваў на службу ў Мінскую гарадскую ўправу польскага разведчыка Вітаўта Буткевіча, а праз некаторы час — Гражыну Ліпіньску («Дануту»). Пра яе ішла размова ў папярэдніх раздзелах.

Іваноўскі, піша Юры Туронак, «аблегчыў разведчыкам іх працу, запрасіў на такія пасады, дзе яны не толькі трымалі пад кантролем свае раёны, але ў дадатак мелі доступ да гаспадарчай інфармацыі вайсковага значэння. У канцы 1942 г. Іваноўскі выкарыстаў свае магчымасці, каб вырваць з рук гестапа Вітаўта Буткевіча, якога арыштавалі па даносу за прыналежнасць да польскага падполля, перасцярог польскіх дыверсантаў ад учынкаў, якія маглі парушыць канспірацыю. Паводле сведчанняў удзельнікаў польскага падполля ў Мінску, ад Іваноўскага яны атрымлівалі, бясспрэчна, вялікую дапамогу».

Як сведчыць далей Юры Туронак, вясною 1942 г. пры ўдзеле Самуіла Кастравіцкага, афіцэра разведаддзела штаба ЗВЗ-АК, даўняга сябра Іваноўскага, было падрыхтавана спецыяльнае данясенне, прысвечанае беларускай праблеме, гэты рапарт праз галоўнае камандаванне быў перасланы Сікорскаму. У ім паведамлялася, што некаторыя беларускія дзеячы шукаюць кантактаў з польскім падполлем, каб дасягнуць паразумення ў справе супольнай абароны ад Расіі, вызвалення ўсёй Беларусі з дапамогай Польшчы і заключэння з Польшчай цеснай федэрацыі. У рапарце прапаноўвалася тэрмінова ўвайсці ў кантакт з гэтымі дзеячамі.

Размова прадстаўнікоў ЗВЗ-АК і Партыі беларускіх нацыяналістаў адбыліся, як ужо адзначалася, у ліпені 1942 г. у Мінску, потым працягваліся ў студзені 1943 г. у Варшаве. а пад канец гэтага года — у Вільні. Самастойна спрабаваў наладзіць кантакты з кіраўнікамі польскага падполля і Радаслаў Астроўскі.

Але ні ў адным з выпадкаў да паразумення так і не дайшло, бо ў кожнага з бакоў былі свае інтарэсы і мэты, кожны імкнуўся нацягнуць коўдру на свае плечы. Так што ўсе гэтыя перагаворы, кантакты не мелі больш-менш значнага ўплыву для развіцця тагачасных падзеяў, уся перагаворная валтузня абсалютна не паўплывала на становішча ў баявых адзінках і нізавых падпольных звеннях ЗВЗ-АК, дзе самым лепшым аргументам для размоваў з праціўнікам ці сапернікам лічыліся штык і куля.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў начальніка штаба Навагрудскай акругі АК Станіслава Сэндзяка («Варты»):** «Працы было надзвычай многа, і, як гэта заўсёды бывае на пачатку, ішла яна не вельмі спорна. Трэба было звязаць усе разрозненыя канспірацыйныя групы ў адпаведныя фарміраванні, арганізаваць сувязь паміж атрадамі і БІП (Бюро інфармацыі і прапаганды), і, у рэшце рэшт, перш чым пайсці ў атаку, пачаць абараняцца. Сітуацыя станавілася ўсё больш пагрозлівай. Немцы пачалі тут ствараць беларускую дзяржаву. Яе элітай павінны былі стаць Беларуская народная самадапамога (БНС), арганізацыя, якая складалася з нацыяналістаў. Сталіцай гэтай дзяржавы з`яўляўся Мінск. Тэрыторыя Навагрудскага ваяводства, за невялікім выключэннем, уваходзіла ў склад гэтай новай Беларусі.

Беларуская народная самапомач была зусім нешматлікай, але як і кожная крайне нацыяналістычная арганізацыя, вельмі актыўнай і фанатычнай. Сваімі смяротнымі ворагамі лічыла камуністаў і

палякаў. Пошук камуністаў у той час натыкаўся на многія цяжкасці. Зрэшты, гэта быў перыяд, калі немцы білі Чырвоную Армію, і дні Савецкага Саюза, здавалася, злічаныя. Гэта ў значнай меры садзейнічала таму, што БНС усю сваю лютую нянавісць скіравала супраць палякаў. У Слоніме, Баранавічах, Стоўбцах і многіх іншых месцах у першай палове 1942 г. учынялі літаральна разню польскай інтэлігенцыі*.

Тыя жахлівыя выпадкі спасціглі наш штаб якраз у той час, калі пачыналася стварэнне абводаў у паўднёвай частцы акругі, гэта значыць у вельмі крытычны момант, калі яшчэ нашы сілы не былі арганізаваны задаць разбойнікам такога перцу, каб яны запамяталі да канца вайны.

Саюзнікам палякаў у барацьбе з БНС быў беларускі люд. (Сэндзяк мае на ўвазе каталіцкую штяхту.— Я. С.). Яго негатыўная пазіцыя ў адносінах да БНС прымусіла немцаў да змены тактыкі. Справа ў тым, што акупанты сталі перад неабходнасцю запаўнення мноства вакансіяў у розных установах і арганізацыях, узнікла патрэба ў адукаваных людзях, а такімі людзьмі былі тут (маецца на ўвазе Заходняя Беларусь.— Я. С.) пераважна палякі. Тысячы чалавек, асабліва ў гарадах, тады пыталіся ў нас, ці згаджацца на прапановы немцаў заняць тую ці іншую пасаду. Камендант акругі вырашыў, што трэба ўкараняцца ўсюды, дзе толькі можна, на ўсе пасады. Гэтае рашэнне мела вялізны ўплыў на ўсю дзейнасць нашай канспірацыі ў акрузе.

Там, дзе абводы былі добра арганізаваны, перш за ўсё Ліда, Шчучын, Валожын, Стаўбцы, адміністрацыйнае кіраванне ў гарадах і мястэчках хутка пераходзіла ў рукі членаў Арміі Краёвай. Затое на поўдні здзейсненая рукамі БНС бойня палякаў вельмі запазніла наша ўкараненне. У Мінску, дзе мы не паспелі своечасова асталявацца, справа насаджэння нашых людзей на патрэбныя нам пасады была ў дрэнным стане.

На правым беразе Нёмана ў руках членаў Арміі Краёвай

* Паводле Юры Туронка, восенню 1942 г. у Слоніме сярод польскай інтэлігенцыі 84 чалавекі былі расстраляны, да канца акупацыі ў акрузе з працы выгналі каля 1000 палякаў -- іх замянілі беларусамі. У Навагрудку 31.07.1942 г. таксама было расстраляна некалькі дзесяткаў палякаў, між іншым, некалькі ксяндзоў, а 1.08.1943 г.--12 манахіняў. Тое самае адбывалася і ў Вілейскай акрузе: улетку 1942 г. сярод польскай інтэлігенцыі загінула больш за сто чалавек. Па абвінавачанню ў сувязі з акаўскім падполлем немцы расстралялі 9 ксяндзоў у Лідзе, у тым ліку ксяндза з Васілішкаў Цыраньскага -- аднаго з першых арганізатараў польскага падполля ў Заходняй Беларусі ў 1939/40 гг.

У адказ на гэтыя карныя акцыі акаўцы ўзмацнілі тэрор супраць беларускага насельніцтва. Юры Туронак адзначае, што асабліва вялікіх памераў ён дасягнуў у Лідскай акрузе, дзе ад рук АК загінула каля 1200 беларусаў, якія былі на службе ў немцаў.

аказаліся наступныя сферы кіравання: чыгунка, шасейныя дарогі, лясная гаспадарка, гандлёвая сетка, сельская гаспадарка, арганізацыя Тодт, гарадское ўпраўленне, апякунскі савет, друкарня, выраб пячатак і штэмпеляў, а таксама беларуская паліцыя*.

Такім чынам, да канца 1942 г. маёр (падпалкоўнік) Праўдзіц са сваімі супрацоўнікамі завяршылі арганізацыю Навагрудскай акругі і адначасова ўкаранілі сваіх людзей у адміністрацыйна-кіраўніцкі апарат на значнай частцы Беларусі.

У час акупацыі для нас вельмі важна было, як будуць адносіцца да акупантаў тутэйшыя людзі. Для высвятлення гэтага пытання многа часу не спатрэбілася. Яны адразу сталі нашым маўклівым саюзнікам. Маўклівым таму, што так вырашыла наша вышэйшае кіраўніцтва — ваеннае і палітычнае. Загад галоўнага штаба забараняў нам прымаць у шарэнгі Арміі Краёвай грамадзянаў, якія не з`яўляліся палякамі.

Варшава ўсё яшчэ не разумела Навагрудка. Гэта было наперакор нашым перакананням. Бо нас не пакідала ўпэўненасць, што перажываем перыяд, калі без палітычных і грамадскіх пераменаў не толькі не выйграем бітву за будучыню, але і прайграем за сучаснасць. Не драматызуючы праблемы, мы вырашылі вясной 1943 г. падрыхтаваць па гэтай справе мемарандум, які б звярнуў увагу галоўнага камандавання на існуючую ў нас сітуацыю і змяшчаў просьбу пра дазвол прыцягнуць тутэйшае сімпатызоўнае нам насельніцтва да сумеснай барацьбы з немцамі.

Для нас гэтая справа была тым больш важная, што ў паўднёвай частцы акругі мы павінны былі выканаць цяжкія баявыя задачы ў часе паўстання і адступлення немцаў. На жаль, у некаторых пунктах, напрыклад, у раёне Бытаня (масты на Шчары) ці на чыгуначнай станцыі Івацэвічы, мы адчувалі сябе настолькі слабымі, што выкананне такіх задачаў было праблематычным.

Мы мелі ўсе варункі, каб сярод тутэйшага люду знайсці дзейсных саюзнікаў у барацьбе з ворагам. Наш мемарандум па беларускаму пытанню апрацаваў былы камендант асяродка Навагрудак Людвік Ненартовіч («Мядзянка»). Мы яго рапарт неадкладна накіравалі ў штаб галоўнага камандавання. Вельмі спяшаліся, асабліва я,бо на маіх плячах ляжала адказнасць за як мага хутчэй рэалізацыю плана па прывядзеню ўсёй акругі ў баявую гатоўнасць.

У хуткім часе я таксама паехаў у Варшаву. Там мне сказалі, што наша справа, якая датычыць дастаўленага раней у штаб мемарандума, уладжана не будзе, бо гэтай праблемай цяпер займаецца камен-

---

* Пра гэта ведалі немцы. Як сведчыць Юры Туронак, лідскі акруговы камісар (гебітскамісар) у сваёй справаздачы ад 15.08. 1944 г. адзначаў, што "ў выніку тэрарыстычных акцый белапалякаў беларускі ўплыў неўзабаве спыніўся, так што ў рэшце стала немагчыма прыцягнуць беларускія адміністрацыйныя сілы на кіраўніцкія пасады". Камісар дадаваў, што 500-асабовая дапаможная паліцыя ў гэтай акрузе па-ранейшаму складалася з палякаў, ён лічыў гэтых людзей за цалкам ненадзейны элемент.

дант Віленскай акругі «Вільк», і толькі ён, а не хто іншы, будзе весці перагаворы на вышэйшым узроўні з беларускімі дзеячамі ў Вільні.

Я папрасіў, каб мне далі, у меру магчымасці, вычарпальныя патлумачэнні ў гэтай справе. Далі. Назвалі нават некалькі прозвішчаў тых беларускіх «дзеячаў» і катэгарычна забаранілі нам рабіць хоць якія-небудзь крокі ў гэтым накірунку. Мы выканалі загад не без абурэння і шкадавання. Заставалася нам адно: высветліць, хто яны, тыя дзеячы. Вынік быў такі, як і прадбачылі. Калі б яшчэ жыў цар Мікалай і прынеслі яму для зацвярджэння спіс тых «дэлегатаў» на перагаворы, падпісаў бы яго абедзвюма рукамі.

Кім былі тыя дзеячы? Беларускі народ альбо зусім іх не ведаў, альбо ведаў вельмі слаба. Нашчадкі царскіх паноў і царскіх чыноўнікаў, прывезеных сюды з глыбіні Расіі ў часы пасля «раздзелаў». Пасля ліквідацыі царызму яны сталі тут «беларускімі дзеячамі», упырсквалі ў людзей яд нянавісці.

Мы не цікавіліся ў далейшым, што далі каменданту Віленскай акругі тыя «палітычныя» размовы на «вышэйшым узроўні». Відавочных эфектаў тых размоў з «палітычнымі дзеячамі» ў Вільні мы не заўважылі.

Беларускі люд з усім спакоем трымаўся сваёй пазіцыі да канца акупацыі. Адмежаваўся ён ад БНС, а створаную акупантам новую Беларускую дзяржаву ігнараваў».

Як мы ўжо аднойчы падкрэслівалі, любыя ўспаміны носяць суб'ектыўны характар. У гэтым сэнсе фрагмент мемуараў Станіслава Сэндзяка — не выключэнне. З аднаго боку, ён, на наш погляд, прыпісвае Беларускае народнай самадапамозе большае значэнне, чым яна мела на самай справе, бо БНС не атрымала значнай падтрымкі ў беларускага насельніцтва і не стала сапраўды масавай арганізацыяй. З другога боку, суб'ектыўныя ўспаміны ў значнай ступені характарызуюцца спрошчаным падыходам да разгляду праблемы. Ніяк нельга пагадзіцца з аўтарам, што сярод дзеячаў беларускага нацыяналістычнага руху ў гады другой нямецкай акупацыі былі толькі нашчадкі царскіх чыноўнікаў і папоў і за іх абедзвюма рукамі прагаласаваў бы цар Мікалай. Тыя ж Янка Станкевіч, Вацлаў Іваноўскі прытрымліваліся выразнай каталіцкай і прапольскай арыентацыі.

Але ж не будзем залішне прыдзірлівымі да Станіслава Сэндзяка, тым больш што карэктывы ў гэтую справу ўнёс яго суайчыннік Юры Туронак. Сур'ёзны кваліфікаваны даследчык ярка паказаў узаемаадносіны паміж польскай АК і ваеннымі фармаваннямі БЦР і БНС на зямлі беларускай.

Давайце не забываць: успаміны пісаў былы вайсковец, і ён усе тагачасныя падзеі бачыць іменна з пункту гледжання вайскоўца, афіцэра, галоўнае для якога — перыпетыі ўзброенай барацьбы, а не аб'ектыўныя шырокія рэаліі, не палітычныя складанасці і тонкасці адносінаў вярхоў Арміі Краёвай і беларускіх нацыяналістычных групоўкаў. Для нас мемуары начальніка штаба Навагрудскай акругі каштоўныя тым, што зыходзяць ад непасрэднага ўдзельніка падзеяў «унізе». Чалавека, які ў той час менш за ўсё думаў, як і з кім весці

перагаворы, а якога больш за ўсё цікавіла, як і з кім ваяваць. Што фарміраванні Беларускай службы парадку (дапаможнай паліцыі) і Беларускай краёвай абароны былі для Арміі Краёвай такія ж самыя ворагі, як немцы, Саветы, літоўцы, напэўна, можна не сумнявацца. Бо Сэндзяк думаў пра сучасную і будучую Польшчу, а не пра палітычныя гульні дзеячаў.

Тым больш што ваяваць з беларускімі фарміраваннямі, якія падпарадкоўваліся немцам, АК трэба было не на словах, а на справе. Напрыклад, у часе акцыі ў Івянцы ў чэрвені 1943 г. атрад Каспера Мілашэўскага захапіў у палон 300 беларускіх паліцэйскіх на чале з іх начальнікам Пазнаньскім.

Але не заўсёды перамога была на баку акаўцаў. У красавіку 1944 г. 8-ы батальён 77-га пяхотнага палка (кодавая назва «Багданка») пад камандаваннем паручніка Тадэвуша Масакоўскага ("Ястшэмбца") атакаваў моцны гарнізон Беларускай краёвай абароны ў мястэчку Уселюб за 15 кіламетраў на поўнач ад Навагрудка. У ходзе кровапралітнага бою загінуў паручнік «Ястцэмбец». Няўдачнай для акаўцаў аказалася ўся акцыя ў цэлым. Панёсшы значныя страты, «Багданка» вымушаны быў адступіць. (Падрабязна гэтая аперацыя апісваецца ў польскім часопісе «Вайсковы пшэглёнд хісторычны». 1991. № 1).

Так што вярхі вялі перагаворы, спрабавалі іх весці, а нізы ваявалі. З пераменным поспехам.

## АПЕРАЦЫЯ «ВОСТРАЯ БРАМА»

У сакавіку 1944 г. у АК нарадзіўся план аперацыі «Вострая Брама» — інтэгральнай часткі намечанай польскім Вярхоўным галоўнакамандаваннем усеахопнай акцыі «Навальніца». Яго аўтарам быў маёр Мацей Калянкевіч («Котвіч»), ён пасля суда над Юзэфам Сьвідам узначальваў Наднёманскае злучэнне АК. Сутнасць аперацыі «Вострая Брама» заключалася ў тым, што яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі аб'яднанымі сіламі Віленскай і Навагрудскай акругаў АК Вільня ачышчаецца ад немцаў, каб стаць у горадзе паўнапраўнымі гаспадарамі і даказаць Саветам, каму ўсё ж такі належыць тэрыторыя «крэсаў».

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Станіслава Сэндзяка («Варты») — начальніка штаба Навагрудскай акругі АК:** «З планам аперацыі «Вострая Брама» я пазнаёміўся ў пачатку сакавіка 1944 г., яшчэ ў чарнавым варыянце. Мяне пазнаёміў з ім маёр «Котвіч» пасля вяртання з Вільні, дзе, як аказалася, адбывалася нарада, на якой «Котвіч» прадстаўляў Навагрудскую акругу, дзе ён раіўся з «Вількам», камендантам Віленскай акругі, і прадстаўнікамі палітычных плыняў.

Я быў уражаны такім паваротам справаў. Не падтрымлівалі мы адносіны з Вільняй. Якім жа чынам «Котвіч» выйшаў на кантакт з «Вількам» і чаму паехаў туды адзін? Чаму так нечакана «выскачыў» гэты праект?

Усё сведчыла пра тое, што за нашымі плячыма вырашаліся

справы, пра якія ні Праўдзіц, ні я паняцця не мелі. Яшчэ большае здзіўленне ахапіла мяне, калі бліжэй пазнаёміўся з прынцыпамі, на якіх грунтаваліся план і акцыя, іх ваенна-палітычнымі аспектамі. Вынікала, што ў Вільні мы павінны цвёрда выступіць у ролі гаспадароў. Калі «Котвіч» спытаў мяне, што я думаю пра гэты план, я не стаў таіць: яго аўтары бачаць у ім толькі кончык свайго носа, не болей. Адносіны Праўдзіца да плана былі таксама надта крытычныя.

Маёр «Котвіч» верыў у дыпламатычны талент англійскіх дыпламатаў. У час побыту ў штабе галоўнага камандавання ён знаходзіўся, як кажуць, «бліжэй да багоў», і мы не сумняваліся, пра многія рэчы ведаў больш і лепш за нас, бо мы жылі ў свеце, забітым дошкамі. Словам, да плана «Вострая Брама» «Котвіч» аднёсся з непрыхаваным энтузіязмам».

Безумоўна, няма ніякіх прычынаў западозрыць Сэндзяка, асабліва Праўдзіца-Шляскага, у сімпатыях да Саветаў і бальшавікоў. Але гэтыя людзі мелі дакладнае ўяўленне пра рэальнае становішча, добра разумелі авантурызм і бяссэнсавасць намечанай акцыі, адчувалі, што ў выпадку ўзброенага сутыкнення з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі атрадам АК пагражала хуткае знішчэнне альбо раззбраенне. У палітычнай сферы, разумелі, любы малы канфлікт воінаў мог стаць повадам для канфлікту паміж саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Як людзі ваенныя, дысцыплінаваныя, Праўдзіц-Шляскі і Сэндзяк былі поўныя рашучасці выканаць любы загад свайго камандавання, але іх настроі сталі вядомыя вышэйшаму начальству, гэта на далейшае прадвызначыла камандзірскі лёс абодвух.

12 чэрвеня 1944 г. у варшаўскай штаб-кватэры АК адбылася нарада камендантаў Віленскай і Навагрудскай акругаў у прысутнасці генерала Тадэвуша Камароўскага («Бура») і некаторых вышэйшых афіцэраў. План віленскай аперацыі «Вострая Брама» прадставіў «Вільк». Генерал Камароўскі яго адобрыў. Сілы абедзвюх акругаў аб'ядноўваліся ў адно цэлае. Камандаваць імі прызначылі «Вілька». Праўдзіц-Шляскі і Сэндзяк былі звольнены са сваіх пасадаў. Новым камендантам Навагрудскай акругі стаў падпалкоўнік Адам Шыдлоўскі («Паляшук»), начальнікам штаба — капітан Казімір Фартуна («Сіла»). Абодва «ціхацёмныя», добра падрыхтаваныя вайскоўцы, але без малейшага ўяўлення пра партызанскую тактыку і спецыфіку рэгіёна, у якім павінны былі служыць. Дарэчы, Фартуна так і не паспеў прыняць функцыі начальніка штаба акругі ад свайго папярэдніка Сэндзяка.

19 чэрвеня «Вільк» вярнуўся з Варшавы ў Вільню. Пачалася спешная падрыхтоўка да правядзення аперацыі «Вострая Брама». 20 чэрвеня пачалі рыхтаваць аператыўны загад аб захопе Вільні. Тым часам у ходзе бліскучай аперацыі «Баграціён» Чырвоная Армія заняла 2 ліпеня Вілейку (120 км ад Вільні), 4 ліпеня —Смаргонь (70 км ад Вільні). Савецкае наступленне было настолькі імклівым, што, каб паспець выканаць свой план, «Вільк» вымушаны быў перанесці пачатак аперацыі з 10 на 7 ліпеня.

Аб'яднаныя сілы дзвюх акругаў АК — Віленскай і Навагрудскай

— налічвалі да таго моманту прыкладна 16 тысяч чалавек. Але ў «паходзе на Вільню» прынялі ўдзел не ўсе. Аб пераносе тэрміну аперацыі не былі своечасова паведамлены камандзір ударнай групоўкі «Паляшук», камендант Віленскага гарадскога гарнізона АК «Людвік», які павінен быў ударыць па немцах з тылу, камандзір Паўночнага злучэння «Вэнгельны», камандзір 6-й (асобнай) брыгады «Конар», не гаворачы ўжо пра некаторых камандзіраў з Навагрудскай акругі, якія проста фізічна не маглі перадыслацыраваць свае часці пад Вільню ў найсціслыя тэрміны.

Разам з тым у апошні, рашаючы, момант неспадзяванай для штаба «Вілька» аказалася рэакцыя часткі тых камандзіраў, якія сігнал пра наступленне атрымалі загадзя.

З боязні прыйсці ў прамую сутычку з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі ад удзелу ў акцыі наадрэз адмовіліся камандзіры наступных акаўскіх фарміраванняў: «Лупашка» (брыгада —550 чалавек), «Рагнар» (батальён — 1440 чалавек), «Крыся» (батальён — 650 чалавек), «Бустрамяк» (частка 5-га батальёна).

Такім чынам, з запланаваных для ўдзелу ў аперацыі 10 тысяч жаўнераў у вызначаныя для атакі месцы з`явіліся толькі 4040. У той час нямецкі гарнізон у Вільні разам з адступілымі з фронту часцямі вермахта налічваў, паводле даных Рамана Кораба-Жэбрыка, каля 17400 чалавек. Было ў іх 60 танкаў, 270 гармат рознага тыпу, тактычная авіяцыя, 600 парашутыстаў-дэсантнікаў. Сілы былі занадта няроўныя, што загадзя прадвызначала няўдачу наступлення акаўцаў на Вільню. Не забудзем таксама адносіны немцаў да палякаў, каб іх было ўдвая меней за акаўцаў, то і тады не здаліся б. Мы ўпэўненыя ў гэтым.

Аперацыя пачалася 6 ліпеня, у 3.00. На ўсіх напрамках штурму акаўцы натраплялі на моцны агонь, іх атакі захлёбваліся адна за адной. Усвядоміўшы безнадзейнасць сітуацыі, 7 ліпеня, каля 5 гадзін раніцы, «Вільк» аддаў загад пра адыход. Страты АК у наступленні: 71 загінуў, прыкладна 500 чалавек параніла.

У той жа дзень, каля 10 гадзін, адступаўцы-жаўнеры з брыгады маёра «Пахарэцкага» ўбачылі першыя савецкія танкі.

Першая брыгада віленскай акругі АК пад камандаваннем паручніка «Юранда» прыняла ўдзел у наступленні на Вільню сумесна з савецкай 277-й стралковай дывізіяй. У ходзе баёў загінула 79 акаўцаў, у тым ліку «Юранд». Вельмі многіх параніла.

Пасля першых ужо кантактаў з савецкімі вайскоўцамі «Вільк» адчуваў, яго атрадам пагражае небяспека. У дэпешы ў штаб галоўнага камандавання АК ад 12 ліпеня 1944 г. ён адзначыў: «Лічу, што канчатковым намерам Расіі з`яўляецца ліквідацыя нашых атрадаў. Гэты момант аддаляюць толькі цяжкасці, якія расійская армія зведвае ў сувязі з незвычайна шпаркім яе маршам наперад. Ад афіцэра, прадстаўніка штаба Чарняхоўскага, я патрабаваў зброю, амуніцыю і баявыя задачы для барацьбы з немцамі. Абяцалі даць адказ назаўтра. Прайшлі ўжо тры дні чакання. Атрады АК, якія знаходзяцца па-за горадам, не дапускаюць увайсці ў Вільню.

Становішча ўскладняе той факт, што ў раён Вільні павінны прыйсці часці Берлінга».

Праз дзень, 13 ліпеня, «Вільк» перадаў у галоўны штаб новае меркаванне наконт далейшых дзеянняў:

«У залежнасці ад адносінаў Саветаў намерваюся:

1) Застацца ў ваколіцах Вільні, сканцэнтраваўшы большасць сілаў у раёне Рудніцкай пушчы, часткова падтрымліваючы савецкую армію ў яе барацьбе з немцамі. Хачу заваяваць прызнанне нас Саветамі іменна як АК.

2) Ні ў якім разе не дам сябе раззброіць, а ў выпадку імкнення Саветаў да вынішчэння польскага элемента сярод насельніцтва стану ў яго абарону.

3) Толькі па вашаму дакладнаму загаду адмаршыруем на Захад».

Ці ведалі пра планы Вілька органы НКДБ?

Так, ім было вядома пра ўсё. І пра планы «Вілька», і пра тайную глыбока законспіраваную арганізацыю «Не» («Непадлегласць»), якая ствараласся для барацьбы з Саветамі пры заняцці імі тэрыторыі «крэсаў», і пра двайную гульню польскага ўрада ў Лондане, і пра многае іншае.

Эдмунд Банасікоўскі, чалавек, блізкі да штаба «Вілька», пазней адзначыў, што «... у перыяд масавага і спантаннага росту сілаў Арміі Краёвай укараненне чырвоных партызанаў у польскія шарэнгі было мажлівым і напэўна мела месца. Задачай савецкай шпіёнскай сеткі з`яўляліся не толькі збор даных пра баявыя магчымасці польскіх атрадаў і іх узбраенне, але перш за ўсё выяўленне палітычных настрояў. Стратэгічная разведка чырвоных сачыла за людзьмі Арміі Краёвай вышэйшага рангу, каб вядомымі ёй метадамі схіліць іх да супрацоўніцтва на карысць Саветаў.

Галоўным аб`ектам зацікаўленасці з боку НКДБ былі, ясная справа, штабы акругаў, куды прыходзілі загады галоўнага камандавання АК, якія датычыліся палітычных і ваенных задачаў і дзе фарміраваліся аператыўныя планы.

Азірнуўшыся з перспектывы часу на віленскія падзеі, смела можна сцвярджаць, што разгалінаваная савецкая разведвальная сетка дзейнічала рознымі шляхамі, атрымлівала шматлікую інфармацыю аб польскім падполлі і Арміі Краёвай. Гэта дазволіла савецкім органам хутка ліквідаваць нашы атрады і іх кіраўнікоў...»

Безумоўна, Эдмунд Банасікоўскі меў рацыю. На савецкую разведку працавалі многія, каго-нікага даследчыкі ведаюць, называюць, многіх, па зразумелых прычынах, не ведаюць. Ні радавых, ні афіцэраў.

На Саветы працаваў жаўнер 6-й брыгады маёра «Конара» Генрык. Па заданню НКУС у контрразведку Віленскай акругі АК пад кодавай назвай «Цэцылія» быў укаранёны Казімір Н. Але, бадай, самымі значнымі інфарматарамі з`яўляліся афіцэры са штабоў АК.

Акрамя таго, за дзейнасцю фарміраванняў АК уважліва назіралі

шматлікія чэкісцкія групы, дэсантаваныя на Беларусь з Масквы са спецыяльнымі і разведвальнымі заданнямі.

СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Са справаздачы ад 8.10.1944 г. пра дзейнасць чэкісцкай спецгрупы «Наватары» з 12.9.1943 г. па 12.07.1944 г. камандзіра групы Уладзіміра Літвінскага:

«Адкрытая барацьба белапалякаў была накіравана супраць савецкіх партызанаў. Гэтая вайна прыняла масавыя формы і выйшла за рамкі эпізодаў.

Пацвярджэннем таму можа служыць тэкст загада белапольскага камандзіра «Панурага», у якім ён, між іншым, піша... (поўны тэкст загада змешчаны ў раздзеле «Навагрудская акруга АК» гэтае кнігі.— Я. С.).

Пра мэты белапалякаў сведчыць і пісьмо таго ж «Панурага» каменданту горада Ліды (маецца на ўвазе нямецкі камендант.— Я. С.).

«... я б хацеў, каб вы, пан камендант, зразумелі, што сутнасць сённяшняй барацьбы — барацьба з бальшавікамі. Калі ваша вайна будзе скончана, мы яе прадоўжым...»

Белапольскія ўзброеныя атрады мелі распаўсюджванне ў раёнах Аўгустова, Радуні, Васілішкаў, Ваўкавыска і Вільні.

У раёне Аўгустова, па недакладных дадзеных, канцэнтравалася ад 15 да 18 тысяч палякаў. У раёнах Вільні і Радуні — да 5 тысяч, у Васілішкаўскім раёне — да паўтары тысячы, у раёне Ваўкавыска — да тысячы чалавек.

Зімой 1942 года ў раёне Ваўкавыска быў арганізаваны польскі пяхотны полк. Полк арганізаваны палкоўнікам польскай арміі (прозвішча невядома). Прыкметы: галава прадаўгаватая, твар голены, лысы, па знешняму выгляду — кадравы вайсковец. Летам 1943 г. полк меў наступнае ўзбраенне: 40 ручных кулямётаў, 60 аўтаматаў, больш чым 100 вінтовак і вялікую колькасць патронаў.

Сістэма канспірацыі: адзін ведае двух. Грашыма і літаратурай полк забяспечваецца з Вільні. Акрамя таго, у Ваўкавыскім раёне дзейнічае нацыяналістычная польская арганізацыя — «Саюз ганаровых польскіх афіцэраў», цэнтр знаходзіцца ў Беластоку.

Аб белапольскіх падраздзяленнях «Крысь», «Антанега», «Маланка» і «Віленскі полк» мы паведамлялі па радыё.

Сярод камандавання польскіх нацыяналістычных арганізацыяў існуе ўпэўненасць, што Польшча даб'ецца, пры актыўным садзеянні Англіі і Амерыкі, незалежнасці, у той момант, калі Чырвоная Армія яшчэ толькі падыдзе да польскіх граніцаў. Што датычыць падпольнай прапаганды палякаў, то яна была накіравана як супраць Германіі, так і супраць Савецкага Саюза. Акрамя безыменных лістоўкаў, палякі выдавалі друкаваныя бюлетэні — раз у дзесяць дзён. Друкаваныя выданні падпісвалі ўпаўнаважаныя польскага эміграцыйнага ўрада па ваяводствах. Напрыклад, Віленскае ваяводства, Навагрудскае ваяводства і г. д.

Пра нянавісць палякаў да Савецкага Саюза лепш за ўсё сведчаць іх друкаваныя выданні (арыгіналы прыкладзены да справаздачы).

БЕЛЫЯ НАСТРОЙВАЮЦЬ ПАЛЯКАЎ СУПРАЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗА І ТАВ. СТАЛІНА:

Прыводжу асобныя выказванні польскай прапаганды:

«... грамадзяне рабочыя, Польшча, якая вае і церпіць нечуваныя ў гісторыі крыўды, прынесеныя ёй двума бандыцкімі суседзямі — немцамі і Саветамі, — стаіць цяпер на парозе новага дня...

...Рабочыя, тысячы вашых сыноў загінулі ў барацьбе са здрадніцкімі войскамі Сталіна, якія ў цяжкі для польскага народа момант перайшлі на бок гітлераўскай Германіі, каб знішчыць Польшчу навекі. Тысячы матак і дзяцей рабочых, тысячы простых польскіх рабочых вывезены на пакуты і смерць у Сібір і ў пустыні Казахстана, на 40-градусныя маразы толькі за тое, што яны былі палякамі...»

«...камуністы не павінны забываць, што мы — частка арміі саюзнікаў і падпарадкоўваемся іх галоўнаму камандаванню...»

БЕЛЫЯ ПАГРАЖАЮЦЬ ППР (Польская рабочая партыя.— Я. С.) і ПАРТЫЗАНАМ:

«Кіраўніцтва падпольнай барацьбой напамінае тым «дзеячам», якія і надалей будуць працаваць на шкоду Польшчы, каб яны спынілі сваю бандыцкую дзейнасць. У выпадку непадпарадкавання іх чакае справядлівы суд...»

БЕЛАПАЛЯКІ АФІЦЫЙНА ЗАЯЎЛЯЮЦЬ АБ СВАЁЙ БАРАЦЬБЕ З ЧЫРВОНЫМІ ПАРТЫЗАНАМІ:

«...Барацьба з бандытызмам.

У многіх раёнах ГГ (Генеральная губерня.— Я С.) пашыраецца ў вялікім маштабе бандытызм, з якім немцы не ў стане справіцца. Кіраўніцтва падпольнай барацьбы паведаміла, што на Люблінішчыне атрады польскіх узброеных сілаў ліквідавалі 10 бандаў, пры чым было застрэлена 40 бандытаў...»

Пры ўступленні Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі буйных сутычак з белапалякамі не адбылося, іх сённяшнія паводзіны зводзяцца да чакання. Асобныя палякі здаюцца нашым войскам і імкнуцца пранікнуць на працу ў органы ўлады. Другія хаваюцца па хатах.

Значная частка канцэнтруецца ў раёне Аўгустова, перамяшчаючыся туды па лясных дарогах (22 ліпеня 1944 г. праз вёску Пагародна ў напрамку Парэчча Гродзенскага раёна прайшло 10 палякаў, 25 ліпеня праз тую вёску прайшло 300 палякаў, узброеных выключна аўтаматычнай зброяй)».

Вядома ж, адзін такі дакумент яшчэ не даваў для органаў НКУС поўны малюнак пра асабовы склад АК, яе кіраўніцкія кадры, іх ваенныя і палітычныя намеры. Ёсць у ім і нязначныя недакладнасці. Напэўна, можна паспрачацца наконт колькасці атрадаў, і, канешне ж: «Крысь» — гэта «Крыся» (Ян Барысевіч), а замест «Віленскі полк» трэба было б сказаць «Віленская брыгада» і г. д. Але падобных чэкісцкіх спецгрупаў, якія назіралі за акаўскімі фармаваннямі, было нямала. Плюс савецкія разведчыкі ў штабах . Усе яны дапаўнялі, перапраўлялі адзін аднаго. Іх рапарты, радыёграмы, шыфроўкі, данясенні, справаздачы ўважліва і карпатліва вывучаліся,

удакладняліся, аналізаваліся — і на аснове агульнага аналізу рабіліся пэўныя вывады.

Якія? Зразумець няцяжка.

Змест і тон усіх дакументаў недвухзначна сцвярджалі: Армія Краёва — вораг для Чырвонай Арміі і для Савецкай улады. Падобныя дэпешы выконвалі своеасаблівую ролю цвікоў, якія органы НКДБ збіраліся забіць у века труны для АК.

Калі «Вільк», нягледзячы на змрочныя прадчуванні, усё яшчэ на штосьці спадзяваўся, суцяшаў сябе ілюзіямі, у прыватнасці, меркаваў на базе Віленскай і Навагрудскай акругаў стварыць вайсковы корпус, лёс яго і іншых афіцэраў АК быў прадвызначаны. «Вілька» і яго бліжэйшых памочнікаў штаб 3-га Беларускага фронту (а, можа, нават і не штаб, а кіраўнікі спланаванай органамі НКДБ аперацыі) запрасіў на нараду на 16 (па другіх звестках — на 17) ліпеня ў Вільню. На нарадзе меркавалася падпісаць дакумент пра стварэнне корпуса. Увечары таго дня планавалася сустрэча прадстаўнікоў савецкага камандавання з сярэднім афіцэрскім складам АК — у Багушах, невялічкай вёсцы пад Вільняй.

Спатканню «Вілька» з савецкім камандаваннем у штабе Чарняхоўскага (як мы цяпер ведаем, праводзіць яго ўсур`ёз савецкі бок нават думкі не дапускаў) папярэднічалі падзеі, якія, праўда, у далейшым істотнай ролі не адыгралі, тым не менш яскрава сведчылі, што з прыходам Чырвонай Арміі палітычная пазіцыя АК у прынцыпе не мянялася.

14 ліпеня вышэйшае кіраўніцтва АК правяло нараду ў Вільні ў кватэры прафесара Стэфана Эрэнкройтца, у ёй удзельнічалі «Вільк» і паўнамочны прадстаўнік эміграцыйнага ўрада ў Лондане Зыгмунт Федаровіч («Альбін»). Апошні толькі што вярнуўся з Варшавы, куды ездзіў параіцца са сваімі калегамі — членамі «дэлегатуры жонду» — пра далейшыя тактычныя паводзіны ў адносінах да Саветаў. У Варшаве было вырашана, што «Альбін» не павінны сябе дэканспіраваць, пакуль не можна будзе зрабіць вывад, што Саветы прызнаюць Віленшчыну польскай тэрыторыяй. Таму нарада ў прафесара была не проста закансп іраванай — звышта йнай.

Назаўтра раніцай у кватэры самога «Альбіна» адбыўся сход кіраўніцтва падпольнай барацьбой. Прысутнічала больш за дзесяць чалавек, у тым ліку прадстаўнікі чатырох палітычных партыяў. «Вільк» быў настроены даволі аптымістычна, меркаваў, што зыход сустрэчы з савецкім камандаваннем будзе на карысць АК, бо перагаворы, на яго думку, павінны былі прывесці да канчатковага рашэння пра фарміраванне самастойнага вайсковага корпуса з ліку акаўцаў Віленшчыны і Навагрудчыны. «Альбін» не падзяляў ягонага ружовага аптымізму, заявіў, што апарат «дэлегатуры жонду» пакуль мусіць застацца ў падполлі.

Улічваючы, што на абедзвюх сустрэчах прысутнічаў савецкі разведчык — падпалкоўнік К., змест гутаркаў, несумненна, адразу станавіўся вядомым органам НКДБ.

У нядзелю, 16 ліпеня, Любаслаў Кшэшоўскі «Людвік» выдаў

загад пра роспуск АК на тэрыторыі Віленшчыны, бо, маўляў, стваралася рэгулярнае чыста польскае войска, падпольная Армія Краёва сваю задачу на «крэсах» выканала. Гэты загад ніколі не быў абвешчаны ў падраздзяленнях АК, бо далейшыя падзеі набылі для акаўцаў нечаканы паварот.

Як ужо адзначалася, «Вільк» да канца не давяраў Саветам, для гэтага ў яго былі падставы. Тады чаму ж ён згадзіўся весці перагаворы з савецкім камандаваннем? Цяжка сказаць адназначна. Найбольш верагодным з`яўляецца тое, што органы НКДБ умела згулялі на празмерным самалюбстве каменданта. Па сведчанню відаводчцаў, «Вільк» вельмі марыў стаць камандзірам асобнага корпуса. Незалежнага. Не падпарадкаванага ні Саветам, ні ўраду ў Лондане. Корпус ваяваў бы з немцамі самастойна. Ілюзія, канешне, манілаўшчына, але так ужо ўстроены чалавек... Марыць нікому не забаронена.

Калі перафразіраваць вядомую прымаўку, то які афіцэр не марыць стаць маршалам! Добра ведаючы такую слабую струнку душы Аляксандра Кжыжаноўскага, НКДБ папярэдне падрыхтаваў нажыўку ў выглядзе пасады камандзіра корпуса. Камендант клюнуў на яе без аглядкі. Характэрная дэталь: каб прыдаць большую значнасць сваёй персоне, на нараду ў савецкі штаб «Вільк» адбыў у форме польскага генерала, хаця сам быў толькі падпалкоўнікам. Яго суправаджалі начальнік штаба маёр Тодар Цэтыс («Слаў») і савецкі вайсковец у форме палкоўніка (хутчэй за ўсё — супрацоўнік НКДБ).

У штабе Івана Чарняхоўскага «Вілька» і «Цэтыса» не пасадзілі за стол перамоваў, а зразу арыштавалі і адправілі на Лукішкі.

У той дзень, дзесьці каля полудня, у Валкарабішкі пад Вільняй, дзе знаходзіўся штаб АК і кватаравала 6-я брыгада, прыбыў савецкі генерал-маёр у суправаджэнні некалькіх афіцэраў, зрабіў агляд брыгады, а пасля паведаміў, што ў штабе генерала Чарняхоўскага ідуць перагаворы «Вілька» з савецкім камандаваннем, хто жадае прыняць у іх удзел, то тых ён гатовы ўзяць з сабою ў Вільню. Згадзіліся ехаць новы камендант Навагрудскай акругі падпалкоўнік Адам Шыдлоўскі («Паляшук») і яшчэ некалькі афіцэраў. Па прыбыцці ў прыгожы асабняк па вуліцы Касцюшкі, дзе размяшчаўся штаб 3-га Беларускага фронту, іх спасцігнуў той самы лёс, што і «Вілька». Арышт.

Пад вечар таго дня на нараду і сустрэчу ў Багушах з прадстаўнікамі савецкага камандавання, у ролі якіх павінны былі выступаць чэкісты, сабраўся сярэдні афіцэрскі склад Віленскай акругі АК. Сабраныя былі вельмі ўражаныя, што замест чырвоных камандзіраў і легкавушак прыехалі крытыя брызентам грузавікі з пагранічнікамі ў зялёных фуражках (каля 150 чалавек), але не разбягаліся, чакалі, што будзе далей. Калі маёр Казімір Радзікоўскі («Дэмбак») пастроіў сваіх афіцэраў у дзве шарэнгі і пачаў дакладваць савецкаму палкоўніку, прыбыў яшчэ адзін грузавік. З яго кабіны выйшаў генерал- маёр у форме НКДБ (патрэба ў маскіроўцы адпала), з кузаваў пачалі выскакваць аўтаматчыкі.

Загад быў суровы і адназначны: скласці зброю.

Пасля збянтэжанасці акаўцы спрабавалі супраціўляцца. Было запозна. Ды і сілы аказаліся занадта няроўныя.

Абышлося без страляніны. Усіх афіцэраў раззброілі, абшукалі, запіхнулі ў кузавы грузавікоў і — ганьба ганорнаму польскаму афіцэру — загадалі легчы ніцма. Прыйшлося паслухацца. Праз хвілінаў колькі машыны рушылі ў Вільню.

Сярод затрыманых аказалася суквецце афіцэрскіх кадраў Віленскай акругі: камандзір 6 -й брыгады АК маёр Францішак Капроўскі («Конар»); камандзір 2-га Віленскага злучэння АК маёр Мечыслаў Патоцкі («Вэнгельны»); начальнік інтэнданцкай службы акругі маёр Казімір Радзікоўскаі («Дэмбак»); інтэндант 2-й брыгады маёр Чэслаў Макоўскі («Веслаў»); капітан Ян Копка («Грабавецкі»); камандзір батальёна 85-га пяхотнага палка капітан Баляслаў Загурны («Ян»); начальнік штабу 1-га Віленскага злучэння капітан Аляксандр Васілеўскі («Алясіньскі»); капітан Эдвард Гапік («Роланд»); камандзір 4-й брыгады Лёнгін Вайцяхоўскі («Ронін»); капітан Людвік Навіцкі («Сіла»), які так і не паспеў прыняць абавязкі начальніка штабу Навагрудскай акругі; камандзір 3-й брыгады капітан Грацыян Фруг («Шчэрбец»); памочнік «Шчэрбца» капітан Уладыслаў Шуберт («Улад»); паручнік Барыс Штарк («Пташнік»); камандзір 23-й брыгады Вітольд Кісель («Сьвятолдыч»); камандзір 36-й брыгады Вітольд Кеўліч («Вуяк»); камандзір 1-й брыгады Раман Жэбрык («Кораб»); начальнік канцылярыі Віленскай акругі падпаручнік Уладыслаў Квянціньскі («Фокс»); сяржант Антоні Шышка («Сосна»); падхаружыя Дабеслаў Смаліньскі, Станіслаў Гурскі, Альбін Пальчэўскі, Чэслаў Пляеўскі і больш дзесятка радавых жаўнераў.

Аперацыя «Вострая Брама» для іх завяршылася пасткай, якую лоўка паставіў НКДБ. Безумоўна, план чэкісцкай аперацыі па захопу кіраўніцтва Віленскай АК можна назваць вераломным, жорсткім, але на вайне з праціўнікамі не цырымоняцца, план быў распрацаваны і выкананы па-майстэрску. Ніводнага стрэлу, ніводнага больш-менш значнага інцыдэнту пры раззбраеннях і арыштах. Усё гэта прарабілі з людзьмі, якія мелі за плячыма пяцігадовы вопыт падпольнай работы, шмат зрабілі, яшчэ болей разлічвалі зрабіць.

Тое, што адбылося з імі, для іх, канешне, з'явілася нечаканасцю, больш таго — здрадніцкім ударам у спіну. Але давайце на імгненне перанясёмся ў той час і паставім сябе на месца Сталіна і вышэйшага савецкага кіраўніцтва. Ці маглі яны дапусціць, каб узброеныя фарміраванні АК, наскрозь прасякнутыя антысаветызмам, запратэнзаваныя на савецкія тэрыторыі, знаходзіліся ў тыле Чырвонай Арміі, якая вяла цяжкія кровапралітныя баі на подступах да Усходняй Прусіі і пад Віслай? Не, не маглі. А раз так, то цячэнне падзеяў набыло для акаўцаў хоць і непажаданы, але заканамерны ход.

Думаецца, у дадзенай сітуацыі няма сэнсу абвінавачваць ці папракаць толькі «Вілька», «Паляшука», Праўдзіца-Шляскага, а тым больш радавых жаўнераў АК. На лёсах Віленскай і Навагрудскай акругаў АК згубна адбіліся вынікі палітыкі польскіх эмігранцкіх колаў і галоўнага камандавання АК у Варшаве. Яны не пажадалі ці не змаглі прыняць пад увагу палітычную рэальнасць і ваеннае

становішча і настойліва імкнуліся да рэалізацыі намечанага плана «Навальніца» (для «крэсаў» — «Вострая Брама»). Але ўжо ў сваёй аснове план не меў ні аднаго шанца на поспех. Віленская брама аказалася для акаўцаў празмерна вострай.

А з другога боку... Арышты і тагачаснае раззбраенне захавала жыцці арыштаваных акаўцаў. Ёсць усе падставы сцвярджаць: за гады вайны (да лета 1954 г.) з іх ацалеў бы адзін з пяці. Не болей. А так ацалелі практычна ўсе.

Цярпелі прынукі ў турме, не мелі волі, але выжылі. Вярнуліся ў родную Польшчу.

Так што праход праз Віленскую браму быў не смяртэльны, а выратавальны. Праўда, потым многія з іх былі асуджаныя ўжо ў Польшчы, некаторыя -- расстраляныя, у тым ліку "Вільк".

# ЧАСТКА 3
# СХВАТКА ДАЎЖЫНЁЮ Ў 10 ГАДОЎ

## З РУДНІЦКАЙ ПУШЧЫ Ў РУСКУЮ (ГРОДЗЕНСКУЮ)

Вестка пра арышт штаба "Вілька" і афіцэраў у Багушах абляцела акаўскія шарэнгі з хуткасцю маланкі. У першы момант яна выклікала разгубленасць, паніку, дэпрэсію...

Страта любога кіраўніцтва нічога добрага не абяцае калектыву. Тым болей страта ваеннага кіраўніцтва. Але ў самай экстрэмальнай сітуацыі людзі пачынаюць шукаць выйсце. А шукаць яго было каму. Арыштавалі ж далёка не ўсіх.

У пастку НКДБ пакуль -- размова ідзе пра ліпень 1944 г.-- не папаў ніводны афіцэр з Навагрудскай акругі, у тым ліку яе ранейшыя кіраўнікі. Януш Праўдзіц-Шляскі і Станіслаў Сэндзяк ("Варта"). Навагрудскія кіраўнікі былі запрошаныя на "нараду" ў Багушах, але не прыбылі туды. Чаму?

На гэты конт польскія даследчыкі вылучаюць дзве версіі. Першая -- афіцэры проста не паспелі прыехаць. У адпаведнасці з другой -- не паехалі знарок, бо прадчувалі, чым скончыцца справа. Здаецца, маюць рацыю аўтары абедзвюх версіяў. Былі такія афіцэры, што сапраўды спазніліся, знайшліся і тыя, хто прыехаць пабаяўся.

Што датычыцца камандзіраў з Віленскай акругі, то таксама ўцалелі многія. У "невад" НКДБ пасля першага закіду не трапілі афіцэры з 7-й брыгады на чале з яе камандзірам Вільгельмам Тупікоўскім. Дарэчы, іменна гэтай брыгадзе было загадана на ўсялякі непрадбачаны выпадак ахоўваць спатканне ў Багушах, стварыць бяспечныя ўмовы, і пры спробе Саветаў раззброіць афіцэраў -- умяшацца і не дапусціць. Але прыбылі ахоўнікі пад Багушы запозна, за раззбраеннем назіралі здалёк, на дапамогу сваім таварышам па зброі не прыйшлі -- сілы былі занадта няроўныя,--і таму паціху павярнулі ў бок Рудніцкай пушчы.

Не з'явіліся на сустрэчу ў Багушах таксама камандзір 1-га (Віленскага) злучэння маёр Антоні Аляхновіч ("Пахарэцкі"), камандзір 3-га (Ашмянскага) злучэння маёр Чэслаў Дэмбіцкі ("Ярэма"), камандзір 5-й брыгады Зыгмунт Шандзеляж ("Лупашка") і другія афіцэры. Не прыбылі па розных прычынах. Напрыклад, "Пахарэцкі" незадоўга да гэтых падзеяў быў часова зняты з камандзірскай пасады "Вількам" за невыкананне даручанага задання, яго справу разбірала спецыяльна

назначаная камісія. "Ярэма" і "Лупашка" не паехалі, бо ўсё жыццё не давяралі Саветам.

Уцалелым камандзірам трэба было прыняць рашэнне, выбраць з чатырох магчымых варыянтаў адзін:

1) зламжыць зброю, затым уступіць у шарэнгі Войска Польскага пад кіраўніцтвам генерала Зыгмунта Берлінга ці (па выбару) у Чырвоную Армію, ісці на фронт і біць немцаў;

2) са зброяй у руках прабівацца на захад, на тэрыторыю Польшчы і дзейнічаць там адпаведна з абставінамі;

3) распусціць батальёны і брыгады, даць магчымасць кожнаму афіцэру і жаўнеру АК самастойна вызначыць свой далейшы лёс;

4) заставацца на "крэсах" і змагацца з Саветамі за пальшчызну да апошняй кроплі крыві, да апошняга патрона.

На практыцы (парадокс жыцця!) атрымалася так, што ўсе гэтыя розныя, несумяшчальныя варыянты былі ўвасоблены ў жыццё. Усе чатыры.

Чаму так здарылася? Пэўна таму, што не было адзінства поглядаў сярод камандзіраў.

Праўдзіц-Шляскі, "Саблеўскі", часткова "Пахарэцкі", "Лупашка", выступалі за другі варыянт. "Котвіч", "Рагнар", "Крыся", "Ярэма", "Тур", "Гром"-- за варыянт чатыры. "Варта" і найбольш разважлівыя і памяркоўныя афіцэры былі за тое, каб не рабіць ніякіх самастойных крокаў, а дачакацца рашэння вышэйшага камандавання ў Лондане і Варшаве.

Радавая жаўнерская маса, падафіцэры і некаторыя афіцэры проста не ведалі, як ім паводзіць сябе далей. У такой сітуацыі частка радавых жаўнераў была настроена на самае простае выйсце: пры першым зручным моманце вярнуцца ў родныя хаты, а там будзе што будзе. Так многія потым і зрабілі. Прыйшлі дамоў, а потым накіраваліся на прызыўныя пункты ў ваенкаматы, паехалі на фронт змагацца з немцамі -- хто ў арміі Берлінга, хто ў Чырвонай.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў радавога жаўнера АК Юліана Трусілы:** "... Ад 18 ліпеня 1944 г. да 19 студзеня 1945 г. быў перыяд, калі мы заставаліся ў баявой гатоўнасці і чакалі далейшых загадаў. Камендант Арміі Краёвай генерал Акуліцкі ("Нядзвядак") выдаў загад пра роспуск усёй арганізацыі АК толькі 19 студзеня 1945 г., праз два дні пасля вызвалення Варшавы ад немцаў. Загад прагучаў па радыё. Пасля яго абнародавання і мы прынялі адпаведнае рашэнне. 21 студзеня пастанавілі пайсці ў Войска Польскае праз райваенкамат у Шчучыне, дзе знаходзіўся прадстаўнік народнага Войска Польскага.

22 студзеня мы прыбылі ў ваенкамат. Яўка была масавай. З Васілішкаў, Старых Васілішкаў, Дварчанаў, Шкордзяў, Зброжкаў, Банюкоў, Алешкаўцаў, Глінічаў, Ладыгі, Дзекцяроў, Ранятычаў, Мосяў і Жыбалаў у адзін дзень з'явілася каля 250 чалавек, а, можа, і больш. Напэўна, я назваў не ўсе мясцовасці, з якіх прыйшлі добраахвотнікі, бо сёння ўжо цяжка прыпомніць. Адразу з нас сфарміравалі роту, якая па сваймў колькаснаму саставу збліжалася да батальёна..."

Але ўсё гэта будзе значна пазней. А пакуль што камандаванне ўсімі сіламі Віленскай і Навагрудскай акругаў узяў у свае рукі начальнік аператыўнага аддзела штаба падпалкоўнік Зыгмунт-Ізідор Блюмскі ("Стрыханьскі"). Ён прымае рашэнне пачаць узброеную барацьбу.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З радыёшыфроўкі "Стрыханьскага" галоўнакамандаванню АК у Варшаве і штаб польскіх узброеных сіл у Лондане 17.07.1944 г.:** "17.07. штаб акругі Нов (Навагрудак.--Я. С.) і Вільна вераломна арыштаваны. Атрады АК у колькасці каля шасці тысяч чалавек паходным маршам рухаюцца ў бок Рудніцкай пушчы, дзе прымем бой".

Такім чынам, выбар шляху быў зроблены. Напэўна, тады ніхто не мог дапусціць думкі, што абраны шлях вядзе да смерці. Многіх, занадта многіх. Фізічнай, не толькі маральнай. Асобных людзей і АК у цэлым.

Органы НКДБ былі гатовы да такога павароту падзеяў. Для каардынацыі буйнамаштабнай аперацыі па ліквідацыі акаўскага падполля, раззбраення фарміраванняў АК і бязлітаснага знішчэння атрадаў, якія не пажадаюць скласці зброю, з Масквы ў Вільню прыбыў генерал-лейтэнант Іван Сяроў.

Ён адыграў фатальную ролю ў лёсах Арміі Краёвай не толькі на "крэсах", але і ў самой Польшчы. Менавіта ён распрацаваў план аперацыі па закопу ў 1945 г. пад Варшавай вышэйшага кіраўніцтва падпольнай Польшчы на чале з камендантам АК Леапольдам Акуліцкім.

Гэта быў той самы Іван Сяроў, які меў прамое дачыненне да расстрэлу 15 тысяч польскіх ваеннаслужачых у Катыні і другіх месцах. Доўгі час ён быў намеснікам Лаўрэнція Берыі, вельмі блізкім яму чалавекам, непасрэдна ўдзельнічаў у пагалоўнай высылцы цэлых народаў -- немцаў Паволжа, карачаеўцаў, чачэнцаў, інгушоў, балкарцаў, крымскіх татараў...

Пасля разгрому кіраўніцтва акаўскага падполля працаваў у Германіі ў якасці прадстаўніка НКУС СССР па эвакуацыі маёмасці. У той час паслаў шыфроўку Сталіну на генерал-лейтэнанта І. Ф. Цялегіна, у якой паведамляў, што той "азлоблены на НКУС". У выніку Цялегін быў арыштаваны і асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі.

Доўгі час лёс быў добразычлівым для Сярова. Пасля ліквідацыі Берыі заставаўся да канца снежня 1958 г. старшынёй КДБ СССР. Потым быў начальнікам Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Міністэрства абароны СССР. І толькі значна пазней Івана Сярова звольняць з пасады, пакараюць у партыйным парадку, разжалуюць да генерал-маёра, пазбавяць узнагародаў, атрыманых за высяленне рэпрэсіраваных народаў.

Сёння мы ведаем, хто прымаў рашэнні аб расстрэле ў Катыні, перасяленні народаў. Сяроў жа быў тым, каго называюць сляпым выканаўцам. Адданым, верным, няспрэчным і... здольным. Так- так, моцна здольным. Таленту яго памагаў багаты вопыт аператыўна-пошукавай работы, кіраўніцтва буйнымі чэкісцка-вайсковымі

аперацыямі. Іменна пад яго кіраўніцтвам па АК быў нанесены першы сакрушальны ўдар. Для гэтага ў сваім распараджэнні генерал меў усё неабходнае: спецыяльныя, добра падрыхтаваныя для такіх акцый фарміраванні -- 136-ы полк унутраных войскаў, 97-ы пагранічны атрад, аператыўныя групы тэрытарыяльных органаў НКДБ, знішчальныя атрады з учарашніх чырвоных партызанаў. Гэтыя сілы, падмацаваныя ўсюдыходамі-"амфібіямі", лёгкай артылерыяй, разведвальнымі самалётамі-кукурузнікамі, былі кінутыя за ўзброенымі фарміраваннямі АК, якія рухаліся ў напрамку Рудніцкай пушчы.

Дзеля аб`ектыўнасці трэба адзначыць, што напачатку генерал Сяроў меркаваў усё вырашыць бяскроўным шляхам. Над акаўскімі калонамі бесперапынна баражыравалі кукурузнікі і скідалі лістоўкі, у якіх афіцэрам і жаўнерам АК прапаноўвалася неадкладна спыніць марш, павярнуць назад, прыбыць на зборны пункт у Гудзельках, скласці зброю. Лістоўкі грозна папярэджвалі, што пры невыкананні загада атрады АК будуць знішчаны.

Першай была раззброена трэцяя брыгада. Пасля арышту яе камандзіра "Шчэрбца" ў Багушах яна перадыслацыравалася на ўскраек Рудніцкай пушчы. Тут брыгаду і акружылі савецкія часці. Брыгада склала зброю без адзінага стрэлу. Камандзіраў і жаўнераў накіравалі ў часовы лагер для інтэрніраваных акаўскіх ваеннаслужачых у Медніках (25 кіламетраў ад Ашмянаў). Сюды, дарэчы, былі накіраваныя і другія падраздзяленні АК, а таксама асобныя акаўцы, якія не пажадалі ваяваць супраць савецкіх войскаў і добраахвотна з`явіліся на зборны пункт у Гудзельках.

Да канца ліпеня 1944 г. у Медніках, на тэрыторыі напаўразбуранага замка каралевы Боны (яна адыграла ў гісторыі беларусаў надзвычай адмоўную ролю), было сканцэнтравана каля 7 тысяч жаўнераў і афіцэраў АК. Сярод іх ішла ўзмоцненая агітацыя за ўступленне ў армію Берлінга. Жадаючых знайшлося нямнога. Некаторым з лагернікаў удалося ўцячы дадому, балазе ахова лагера была не надта пільная.

Хто не захацеў скласці зброю, пайшлі ў лясы. Але і тут дарогі акаўцаў пачалі разыходзіцца. Праўдзіц-Шляскі са сваім акружэннем, у асноўным з сёмага батальёна, і батальён "Саблеўскага", усяго каля ста чалавек, узялі курс на Захад. Іх шлях ляжаў праз Рудніцкую пушчу ў Рускую (Гродзенскую), далей -- на Беласток і Варшаву. "Ярэма", "Котвіч" і другія афіцэры з вернымі ім сіламі рашылі застацца на "крэсах", каб абараняць гэтыя землі ад Саветаў, стварыць партызанскія базы. Засталіся на Беларусі самыя стойкія акаўцы, гатовыя на ўсё, як і любыя прававерныя.

Нечакана для ўсіх падпалкоўнік "Стрыханьскі" адмяніў сваё рашэнне пра ўзброеную барацьбу з "праклятымі" Саветамі, аддаў загад пра роспуск брыгадаў і батальёнаў. Усе афіцэры і жаўнеры павінны былі вярнуцца ў раёны свайго цывільнага пастаяннага пражывання, схаваць зброю і чакаць далейшых указанняў галоўнага камандавання АК. Відавочна, ён бярог людзей. На жаль, гэты загад, як і ранейшы загад падпалкоўніка Любаслава Кшэшоўскага

("Людвіка"), не быў даведзены да ведама падраздзяленняў АК. I не мог быць выкананы.

"Польскі жаўнер,-- напісаў пазней у сваёй кнізе Праўдзіц-Шляскі,-- крайне стомлены фарсіраванымі маршамі, пры тым галодны, цалкам траціць надзею. Цяпер, ясная справа, нам трэба было ратаваць сваё жыццё...

Дэмаралізацыя сярод войска расце. Самавольны адыход некаторых атрадаў на зборны пункт разбівае згуртаванне дарэшты. Падпалкоўнік "Стрыханьскі" аб'яўляе войску, што ўсё страчана, кожны можа рабіць, што лічыць патрэбным. Аддаў згаданы загад. Пераапранаецца ў цывільнае адзенне і едзе ў "Вільню".

Праўдзіц-Шляскі заднім чыслом хоча папракнуць за неабачнае рашэнне "Стрыханьскага", а сам тады прытрымліваўся той жа думкі. Як успамінае "Варта", "падпалкоўнік Праўдзіц, як і падпалкоўнік "Стрыханьскі", пастанавіў, каб кожны жаўнер сам паклапаціўся пра свой лёс. Атрады былі распушчаны, людзі атрымалі загад ісці ў месцы свайго цывільнага пражывання і чакаць распараджэнняў галоўнага штаба".

У камандаванні АК пачалася кадравая неразбярыха. "Стрыханьскі", яшчэ да адбыцця ў Вільню, вярнуў на пасаду каменданта Навагрудскай акругі Праўдзіца-Шляскага, на пасаду начальніка штаба -- "Варту". Праўда, "Варта" адразу адмовіўся, матываваў сваю адмову: ён з самага пачатку выступаў супраць аперацыі "Вострая Брама" і цяпер не хоча ўзвальваць на сябе цяжар адказнасці за яе вынікі і быць вінаватым за лёсы жаўнераў. Тым не меней,"Варта" заставаўся ў радах АК.

Перад адыходам на Захад Праўдзіц-Шляскі ўсё ж угаварыў "Варту" ўзяць камандаванне акругай на сябе для, як ён пісаў пазней, "поўнага завяршэння канспірацыі на нашай тэрыторыі". Праўдзіц-Шляскі і не падазраваў, як многа яшчэ часу сплыве (гады!), пакуль наступіць гэтае "завяршэнне".

Фармальна "Варта" пагадзіўся з прапановай, але фактычна ўсю справу ўзяў у свае рукі маёр "Котвіч", аўтар плана "Вострая Брама". "Котвіч" не прыняў удзел у наступленні на Вільню -- па дарозе, ля Іўя, быў паранены ў сутычцы з немцамі, некалькі тыдняў лячыўся ў палявым акаўскім шпіталі пад Ашмянамі. Там яму ампутавалі руку.

5 жніўня 1944 г. "Варта" афіцыйна перадаў камандаванне акругі "Котвічу". Перадаў чыста па-партызанску, без узгаднення з вышэйшым кіраўніцтвам. Ды і з кім было ўзгадняць! У Варшаве поўным ходам ішло паўстанне, сувязі з Лонданам не было. Толькі 18.08.1944 г. з Варшавы па радыёстанцыі быў перададзены загад пра назначэнне "Котвіча" камендантам Навагрудскай акругі і прысваенні яму чарговага воінскага звання падпалкоўніка. Аднак гэты загад сапраўднаму вою "Котвічу" не было суджана прачытаць ці праслухаць.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў Эдмунда Банасікоўскага** (нязначныя падрабязнасці апушчаны): "Напрамак маршу -- праз двор Петаша на тракт Вільня -- Яшуны, а потым на поўдзень, у Яшуны. На чале калоны, у пярэдняй ахове, 13-я брыгада, за ёю 12-я, а на канцы, у задняй ахове, 9-я брыгада.

Атрады нашага злучэння (Ашмянскага.--Я. С.), расцягнутыя ў доўгай маршавай калоне, рухаліся ў начной цішы без усялякіх інцыдэнтаў. Часам скрыпне кола возу, заіржэ конь альбо дзесьці далёка пачуецца чалавечы голас. Раптам наш пярэдні дазор дакладвае, што па дарогах, на захад ад нас, паралельна нашаму накірунку маршыруюць савецкія часці. Нібыта не заўважаюць нашай прысутнасці.

Месцам нашага адпачынку быў вялікі лясны яр... Я падышоў да "Ярэмы".

-- "Еж",-- сказаў ён.-- Адчуваю, усё дрэнна, вельмі дрэнна. Думаю, нас акружаюць з усіх бакоў.

Як толькі вымавіў гэтыя словы, высока над лесам пачуўся рокат матораў. Жаўнеры паднялі галовы ўверх. Коні заіржалі. Усе занялі баявую гатоўнасць. Праляцелі над намі савецкія самалёты. Праз хвіліну дождж белых невялікіх лістоўкаў упаў на дрэвы, кусты і траву. Адна з іх упала каля мяне. Падняў яе і прачытаў: "Складзіце зброю ў вёсцы Гудзелькі. У адваротным выпадку будзеце знішчаныя. Пасля раззбраення пойдзеце дамоў".

Кукурузнікі ляталі нізка, адчувалі сябе бяспечна. Міжволі зірнуў на нашых жаўнераў. На некаторых тварах пачуцце бяссілля, разгубленасці і абыякавасці да ўсяго адбыванага навокал. Я звярнуўся да "Ярэмы".

-- Непакоюся за нашых хлопцаў. У іхніх вачах пакорлівасць, недахоп волі для супраціўлення, безнадзейнасць. Баюся, каб не зламаліся.

Нечакана групка польскіх жаўнераў хутка пабегла ў наш бок. У вачах страх. Дакладвалі з пачуццём трывогі:

-- Дзевятая брыгада раззброена.

Усе жаўнеры, афіцэры, хутка падхапіліся на ногі. "Ярэма" памкнуўся ў гушчар пушчы, але ў гэты момант у месцы адпачынку трынаццатай брыгады савецкая пяхотная часць з поўнай баявой выкладкай, са зброяй напагатоў акружыла польскіх партызанаў. Чуліся шматгалосыя загады:

-- Руки вверх!.. Ложи оружие!.. Сдавайтесь!..

Пачуццё безнадзейнасці ва ўсіх расло ад непасрэднай, блізкай пагрозы. Вораг, бачна, не выбіраў сродкі. Чалавечыя нервы не вытрымалі. Жаўнеры кінулі зброю на зямлю, паднялі рукі ўгору. Трынаццатая брыгада "Нетапежа"-- гордасць акаўскага злучэння -- перастала існаваць. Невялікія групкі адважненцаў, выкарыстаўшы мітусню, рызыкуючы жыццём, беглі да рэшткаў нашых атрадаў.

У пэўны момант я напаткаў ксяндза Віктара Гагалінькага, капелана нашага злучэння (быў пры 13-й брыгадзе). Ксяндзу давялося размаўляць з савецкім афіцэрам, які праводзіў раззбраенне трынаццатай.

-- Брыгада капітуліравала,-- злосна цадзіў скрозь зубы Гагалінькі.-- Я-- ксёндз, таму адпусцілі мяне на волю. Буду дабірацца да Вільні.

-- Што цяпер?-- спытаў я "Ярэму".

-- Пойдзем далей. Бой у такую хвіліну -- самагубства. Для ўсіх.

Праз гадзіну далейшага маршу астатніх акаўцаў на многіх блізкіх дарогах як з-пад зямлі перад імі выраслі савецкія калоны. Я паглядзеў на компас. Усе -- я, мы і яны -- ішлі ў адным напрамку. На паўднёвы захад. Саветы рабілі выгляд, што ставяцца да нас абыякава.

Потым на скрыжаванні дарогаў група савецкіх афіцэраў, больш дзесяці чалавек, затрымала "Ярэму". Ведалі, хто ён. У ходзе кароткай размовы ад імя свайго камандавання патрабавалі раззбраення падначаленых яму атрадаў.

"Ярэма" праз ганца вызваў мяне да сябе. Калі я прыблізіўся да яго, сядзеў выпрастаны на кані. Група савецкіх афіцэраў акружала яго паўкругам, трымалі напагатове аўтаматы.

-- Пан капітан,-- сказаў "Ярэма",-- гэтыя панове (паказаў на савецкіх афіцэраў) патрабавалі ад мяне скласці зброю і распусціць атрады. Мы самі павінны падацца ў іх штаб. Па інструкцыі.

-- Говори по-русски,-- умяшаўся адзін з савецкіх афіцэраў.

-- Он не понимает по-русски,-- хутка паясніў "Ярэма", баяўся, каб я не ўклініўся ў ход размовы па-руску. Потым павярнуўся да мяне, коратка прамовіў:

-- Прашу ад майго імя аддаць нашым камандзірам загады, адпаведныя з вымаганнямі савецкага камандавання.

Стоячы каля "Ярэмы", па выразу яго твару я адчуў, што скіраваныя да мяне словы маюць зусім інакшы сэнс.

Я пакінуў скрыжаванне дарогаў. Выклікаў усіх камандзіраў. Абмаляваў сітуацыю. Трэба ратаваць "Ярэму". Трэба пазбавіцца ўсіх абозаў, цяжкай амуніцыі і коняў. Жаўнераў, якія хочуць вярнуцца дамоў, неабходна адпусціць. Рэшту воінаў з усім неабходным, што можна панесці, накіраваць у глыб лесу.

Нашы абозы рушылі. Я праз бінокаль назіраў за паводзінамі "Ярэмы". Заўважыў, што яго конь увесь час прытанцоўвае і адступае. Раптам ён даў каню шпоры, той стралою панёсся ў блізлеглы лясны гушчар. Заслед конніку застракаталі аўтаматы савецкіх афіцэраў. Ім імгненна адказалі нашыя кулямёты. На скрыжаванні дарогаў запанавала замяшанне. На небе з`явілася чырвоная савецкая ракета. Мы адступалі ўсляпую, у самую глыбокую гушчэчу лесу. Праз хвіліну "Ярэма" быў сярод нас, але без свайго любімага скакуна.

Сярод напаўзаціхлага посвіту куляў і рокату над пушчай самалётаў мы моўчкі прадзіраліся скрозь лес. Праз некаторы час увайшлі ў гразкае балота. Марш станавіўся надзвычай цяжкі. Нягледзячы на частыя адпачынкі, на тварах людзей, разцягнутых у доўгую калону, выразная пакута. Нарэшце мы апынуліся на развілцы двух трактаў: Руднікі -- Гродна, Вільня -- Гродна.

Тут затрымаліся на працяглы прывал. Жаўнеры дасталі са сваіх рэчавых мяшкоў астаткі ежы. Голад браў верх над патрэбай хаця б кароткага сну. Вызначылі каравульных.Адзін з нашых жаўнераў далажыў, што непадалёку, на невялікай паляне, знаходзіцца група польскіх афіцэраў і невялічкі партызанскі атрад.

Я пайшоў з двума сувязнымі, каб пазнаёміцца з суседзямі. Застаў там падпалкоўніка Праўдзіца-Шляскага ў акружэнні некалькіх афіцэраў і салдатаў. Мяне чакала сардэчная нечаканая сустрэча.

Двое маіх людзей з "Вахляжа", з чацвёртага ўчастка, падхарунжы Януш Скальскі ("Лін") і падхарунжы Тадэвуш Роман ("Дужы Тадзік"), пасля ліквідацыі "Вахляжа" служылі ў Праўдзіца-Шляскага, кінуліся да мяне ў абнімкі. Расцалаваліся як браты. Радасць была бясконцай.

Хутка з'явіўся "Ярэма", яго таксама віталі сардэчна. Пачалася гутарка. Праўдзіц-Шляскі імкнуўся пазбегнуць праследавання, быў поўны рашучасці як мага хутчэй пакінуць гэтую тэрыторыю і дабрацца да Варшавы. Яго намер з энтузіязмам падтрымалі "ціхацёмныя", якія знаходзіліся пры ім. Трагедыя Віленскай АК наклала глыбокі адбітак на іх самаадчуванне. Верылі, што ў Варшаве будзе лепей. Мы з "Ярэмам" у дыскусіі падкрэслівалі, што Рудніцкая пушча акружана савецкімі войскамі, няма ніякай магчымасці прарвацца на Захад. Праўдзіц-Шляскі верыў у сваё шчасце і адстойваў рашэнне рухацца са сваім атрадам у цэнтральную Польшчу.

Непадалёку кружылі рэшткі 3-га батальёна 77-га пяхотнага палка пад камандаваннем Баляслава Пясэцкага ("Саблеўскага"). У часе размовы з намі ён таксама выказаў думку, што неабходна пакінуць гэты раён і прарвацца ў Варшаву. Пасля выхаду з пушчы "Саблеўскі" перажыў нямала розных прыгодаў, але ўсё-такі дабраўся да сталіцы, якая ўжо да таго часу ляжала ў руінах.

Праўдзіц-Шляскі ў суправаджэнні сваёй групы Кедыву, у яе ўваходзілі мае хлопцы "Лін" і "Дужы Тадзік", з вялікімі цяжкасцямі дайшоў да ваколіцаў Гародні. Адтуль невялікімі групкамі яго людзі пранікалі ў раён Варшавы сваімі, асобнымі маршрутамі.

У часе размовы з "Саблеўскім" даведаліся, што дзесьці блізка знаходзяцца атрады "Котвіча" і "Бустрамяка". На жаль, з імі ў той момант сустрэцца не прывялося".

Такім чынам, найбольш хітрыя і прадбачлівыя акаўцы падаліся на Захад. Для засталых пачаліся бясконцыя "блуканні па пакутах". Уцёкі ад пагоні, пастаянная боязнь засадаў, выматвальныя, знясільныя пераходы з аднаго месца на другое, пошукі кавалка хлеба і прытулку на начлег. "Ход канём" вырашылі зрабіць камандзір 8-й брыгады Вітольд Туронак ("Тур") і камандзір кавалерыйскага атрада пры штабе Віленскай акругі Уладыслаў Кітоўскі ("Гром"). Яны не засталіся ў Рудніцкай пушчы, але і на Захад не пайшлі. Наадварот, рушылі на Усход, у раён Валожына і Налібоцкай пушчы.

Хаваліся, шукалі ратунку ў непраходных гушчэрнях, акружаных балотамі, ні дня не былі на адным месцы, бо часці ўнутраных войскаў, падмацаваныя артылерыяй, прачэсвалі лес за лесам. Над стаянкамі акаўцаў пастаянна кружылі разведчыкі-кукурузнікі. Тым не меней атрады "Тура" і "Грома" змаглі пратрымацца даволі значны час. Крытычным момантам для іх стаў дзень 9 лютага 1945 г. Акаўцаў акружылі ў Равінах, каля Карэлічаў, разгром быў поўным і канчатковым. Праўда, абодвум камандзірам удалося выратавацца. Праз некаторы час яны вярнуліся ў Вільню, адтуль уцяклі на Захад.

Але давайце зноў вернемся ў прадмесці Вільні і Рудніцкую пушчу. З успамінаў Эдмунда Банасікоўскага ўжо ведаем, як складвалася сітуацыя з тымі атрадамі, што ўзначальваў маёр "Ярэма".

Ну, а што адбывалася з групоўкай маёра "Котвіча", у склад якой ўваходзілі фарміраванні АК Навагрудскай акругі?

Не даходзячы да Рудніцкай пушчы, вялізная, як вокам акінуць, калона прайшла праз брод ракі Мерачанкі і рэзка павярнула на поўдзень, у лес. У адрозненне ад злучэння "Ярэмы" на пачатку руху "Котвічу" ўдалося пазбегнуць сутычкаў з буйнымі савецкімі часцямі і раззбраення атрадаў. Праўда, усюдыходы-"амфібіі" ўвесь час не выпускалі калону "Котвіча" са свайго поля зроку, праследавалі на працягу ўсяго шляху, неаднаразова прабіраліся ў самую гушчу калоны. Болей таго, старшы экіпажа задаваў акаўцам адно і тое пытанне: "Куды і чаго ідзяце?" "Котвіч" трымаўся незалежна: маўляў, ідзём выконваць баявое заданне, не перашкаджайце нам. Усюдыходы-"амфібіі" пакідалі калону. Пакуль абыходзіліся без узаемнай страляніны.

У час адпачынку ў Солах (не блытаць з Соламі ў Смаргонскім раёне) над акаўцамі пачалі баражаваць кукурузнікі. Скідвалі лістоўкі. Іх змест нам ужо вядомы. "Котвіч" нават думкі не дапускаў пра раззбраенне і здачу на літасць Саветаў. Калона паглыбілася ў лес. Ноччу, з 18 на 19 ліпеня 1944 г., адбылася нарада "Котвіча" з камандзірамі атрадаў калоны.

"Котвіч" сказаў,-- успамінае камандзір 5-га батальёна Станіслаў Шабуня ("Ліха"), выпускнік Нясвіжскай гімназіі,-- што застаецца ў пушчы. Лічыў, што належыць абараняць гэтыя землі і польскае насельніцтва. Жаўнераў можна распусціць, гаварыў ён, няхай апасля робяць, як лічаць патрэбным. Хто хоча, няхай застаецца са мной.

Я вырашыў застацца з ім".

"Котвіч" правёў добры кусок жыцця ў Англіі, ён вельмі спадзяваўся, што англічане не пакінуць АК сам-насам з Саветамі, да апошняй хвілі верыў, што пры падтрымцы саюзнікаў партызанскі рух АК на "крэсах" будзе існаваць да самага канца вайны. Відаць, ён верыў, што вайна разгромам Германіі не закончыцца.

Пасля гутаркі з "Котвічам" камандзіры правялі аналагічныя нарады ў сваіх часцях.

"Я склікаў на нараду камандзіраў аддзяленняў і вышэй,-- расказваў пра 33 гады ў Канадзе аўтару кнігі "Вострая Брама" Яну Эрдману былы камандзір 7-га батальёна АК Баямір Тважыньскі ("Астоя").-- Паведаміў ім пра размову з "Котвічам" і загадаў паўтарыць падначаленым: няхай свой лёс рашаюць самі. Могуць ісці, куды хочуць, але няхай пакінуць у атрадзе зброю.

У час канцэнтрацыі пад Вільняй батальён атрымаў ад Праўдзіца-Шляскага 2.000 долараў дробнымі купюрамі, зразумела, з касы акругі. Гэтыя грошы я падзяліў па-роўнаму на ўсіх у атрадзе, незалежна ад пасадаў і званняў. Цяжкую зброю закапалі. Людзей раздзялілі на групы па 60 чалавек, для кожнай групы вызначылі камандзіра і пункт па-за межамі пушчы. Некаторыя з групаў рушылі ў дарогу ноччу, каб пад покрывам цемры адарвацца ад савецкіх дазораў".

На досвітку наступнага дня ў лясным лагеры не далічыліся прыкладна паловы людзей. Тым не меней лік акаўцаў, рашылых

застаецца з "Котвічам", усё яшчэ ішоў на сотні, а дакладней -- болей тысячы чалавек. Плюс 300 вазоў з амуніцыяю, харчам, табун коней.

Для захавання такой колькасці людзей Рудніцкая пушча была занадта малой і небяспечнай. Параіўшыся з акаўцамі, мясцовымі жыхарамі, "Котвіч" вырашыў перадыслацыравацца ў Рускую ці, як яе называюць палякі, Гродзенскую пушчу. Гэты вялікі лясны масіў пачынаецца за 35 кіламетраў ад Ліды і доўга цягнецца ўздоўж Котры (у раёне Скідзеля ўпадае ў Нёман), даходзіць аж да Гродна. Рудніцкую пушчу ад Рускай аддзяляла паласа -- прыкладна 30 кіламетраў -- палёў, рэдкалесся, балотцаў і рачулкаў. Для праходу такой мізэрнай адлегласці, калі рухацца возам у хуткім тэмпе, спатрэбілася б меней паўсутак.

Да таго часу генерал-лейтэнтант І. А. Сяроў зразумеў, што значная частка акаўцаў складваць зброю і здавацца не збіраецца. Часткі савецкіх унутраных войскаў пачалі атакаваць атрад "Котвіча". Безупынна. Першая такая атака была яшчэ ў Рудніцкай пушчы. Тады яе лёгка адбіла адна рота 5-га батальёна. Абышлося без стратаў акаўцамі. Але з гэтага моманту органы НКДБ не давалі спакою ім ні ўдзень, ні ўначы.

У час маршу на Рускую (Гродзенскую) пушчу іх атакавалі зноў і зноў. Адстрэльваючыся, калона прыспешвала рух. Самую вялікую перашкоду, шашу Гродна -- Вільня, перайшлі без інцыдэнтаў. 24 ліпеня дайшлі да месца прызначэння. Пераначавалі на закінутым тартаку і на золку рушылі далей. Над калонай пачалі кружыць самалёты на нізкай вышыні.

У час чарговага прывалу "Котвіч" паклікаў афіцэраў на нараду. Не з`явіліся ні "Крыся", ні "Рагнар". Яны вырашылі ваяваць з бальшавікамі самастойна. А гэта былі камандзіры самых буйных фарміраванняў АК Навагрудскай акругі. З гэтага часу "Котвіч" застаўся ў Рускай (Гродзенскай) пушчы з атрадам крыху больш двухсот чалавек. Пры ім засталася і афіцэрская эліта акругі-- "ціхацёмныя" "Варта", "Астрога", "Хатрак".

Атрад дзейнічаў у трохкутніку Дубічы -- Пеляса -- Радунь, прычым штаб пастаянна перамяшчаўся (канспірацыя) з месца на месца. "Котвіч" дамагаўся сустрэчы з "Рагнарам" і "Крысям", каб намеціць план сумесных скаардынаваных дзеянняў. Збіраўся зрабіць першы крок сам. "Калі не могуць прыйсці яны да мяне, я паеду да іх",- -заявіў ён свайму бліжэйшаму акружэнню. Для гэтага трэба было выйсці з Рускай (Гродзенскай) пушчы, бо "Крыся" знаходзіўся ў раёне Радунь -- Эйшышкі, а "Рагнар" -- за Лідай.

Сустрэліся камандзіры (прыяцелі і сябры) у першай дэкадзе жніўня 1944 г. у леснічоўцы на ўскрайку вёскі Скірэйкі Радунскага (цяпер Воранаўскі) раёна. Акрамя "Котвіча", удзельнічалі "Варта", "Крыся", "Бустрамяк", больш дзесяці другіх афіцэраў АК. "Рагнар" зноў не прыехаў.

Вынікам сустрэчы з`явілася адозва да жаўнераў АК і насельніцтва Навагрудскай акругі з прапагандысцкімі заклікамі антысавецкага зместу. У адозве таксама паведамлялася пра рэарганізацыю акругі і

стварэнні двух злучэнняў АК -- паўночнага і паўднёвага. Паўночным "Котвіч" загадаў кіраваць "Крысі", паўднёвым-- "Ліху".

"Крыся" зноў пачаў дзейнічаць самастойна, наладжваў засады на дарогах, з іезуіцкай жорсткасцю нападаў на адзіночныя савецкія машыны, граміў сельсаветы, забіваў партыйных і савецкіх работнікаў, актывістаў.

У сярэдзіне жніўня сувязным "Котвіча" ўдалося ўстанавіць кантакт з рэшткамі брыгадаў Віленскай акругі, якімі кіравалі "Ярэма" і "ціхацёмны" Адам Барычка. Рашылі параіцца, што рабіць далей. Сустрэча адбылася на хутары ля возера Стаі. У ёй удзельнічала болей дваццаці чалавек. Дэлегацыю віленчукоў узначальваў "Ярэма", Навагрудскую акругу прадстаўляў "Котвіч" са сваімі афіцэрамі. Тон на нарадзе задаваў "Котвіч". Як пазней сведчылі ўдзельнікі спаткання "Еж" і "Ліха", ён па-ранейшаму быў поўны рашучасці заставацца тут, у пушчы, заклікаў сумесна ствараць сталыя базы для партызанскай барацьбы з Саветамі. "Яго аптымізм,-- успамінае "Еж",-- асноўваўся на веры ў саюзнікаў, асабліва англічанаў".

"-- Яны, пэўна, не ведаюць, што з намі здарылася,-- гаварыў "Котвіч" на нарадзе. Любой цаной трэба ім паведаміць пра гэта, яны абавязкова дапамогуць". У той час сярод афіцэраў АК хадзілі чуткі, што быццам пры штабе Чарняхоўскага знаходзіцца група англійскіх афіцэраў-сувязных. У час нарады ля возера Стаі ўзнікла ідэя напісаць ім пісьмо, расказаць пра сваё становішча, папрасіць пра ўмяшанне і дапамогу. Пісьмо напісалі па-англійску "ціхацёмныя", адрэгаваў яго "Котвіч". Да гэтага часу невядома, куды трапіла тое пісьмо.

16 жніўня "Котвіч" перадае дзве радыёшыфроўкі ў галоўны штаб. У першай паведамлялася аб падпарадкаванні Навагрудскай акругі віленскаму камандаванню. Да таго часу камендантам аб'яднаных Віленскай і Навагрудскай акругаў замест арыштаванага "Стрыханьскага" стаў падпалкоўнік Юліян Куліхоўскі ("Рынграф"). У другой шыфратэлеграме, якая, дарэчы, была перахоплена органамі НКДБ і цытавалася на "Працэсе-16" дзяржаўным абвінаваўцам пракурорам Афанасьевым, "Котвіч" дакладваў пра становішча на курыраванай ім тэрыторыі. Па яго словах, мясцовае насельніцтва вядзе сябе цудоўна, амаль цалкам сабатуе прызыў у савецкае войска, а самі Саветы ставяцца да людзей з АК лагодна, бо пакуль што, часова, бракуе сілаў для расправы з АК. Далей паведамляў, што рыхтуе польскае насельніцтва да рашучага супраціўлення, уключна усеагульнай узброеннай барацьбы. На заканчэнне прасіў прыслаць паветраным шляхам міжнародную камісію, абяцаў падрыхтаваць лётнае поле да пасадкі самалётаў.

З дэпешы бачна, як далёка ад жыцця, ад рэчаіснасці стаяў вайсковы летуценнік, аўтар плана нашчэнт праваленай аперацыі "Вострая Брама", чалавек, які ўсё яшчэ спадзяваўся на цудадзейную дапамогу чужынцаў... "Котвіч" верыў і рыхтаваўся да зімы: атрад пачаў запасацца саланінаю, мясам, мукою, кажухамі, бялізнаю, збожжам.

Людзі кажуць, што хто патанае, саломінку хапае. Такой

саломінкай для "Котвіча" і яго паплечнікаў з`яўляліся саюзнікі, перш за ўсё англічане. На самай справе гэтая саломінка аказалася вельмі ломкаю. Проста прывіднаю.

Чым імклівей развівала наступленне Чырвоная Армія, тым больш стрыманымі і прахалоднымі ставалі адносіны англічанаў да палітычных імкненняў польскага ўрада ў Лондане, у тым ліку датычных савецка-польскай граніцы.

"У цяперашняй сітуацыі,-- скардзіўся тагачасны прэм`ер Станіслаў Мікалайчык у дэпешы свайму прадстаўніку ў Польшчы 14.07.1944 г.,-- мы натрапляем на ўсё большыя цяжкасці з выказваннем нашай палітычнай пазіцыі ў англійскай прэсе, на радыё адносна ўсходніх земляў, занятых савецкай арміяй..."

Як толькі Мікалайчык атрымаў звестку пра раззбраенне АК на Віленшчыне, ён адразу -- 18 ліпеня -- дабіўся прыёму ў Уінстана Чэрчыля. У час гутаркі англійскі прэм`ер павёў сябе нядобразычліва. "Абураны Чэрчыль нападаў на нас за баі на Віленшчыне і Валыні,-- на чацвёры дзень пасля гутаркі паведамляў генерал Мар`ян Кукель вярхоўнаму галоўнакамандуючаму Саснкоўскаму (у той час знаходзіўся ў Італіі).-- Па-ранейшаму сварыўся за нашы прэтэнзіі на Вільню, крытыкаваў, што замест адступлення на Захад, пхаемся туды (на Усход.--Я. С.) толькі, каб зазначыць там нашу прысутнасць".

"У той самы дзень,-- піша ў сваёй кнізе "Вострая Брама" Ян Эрдман,-- Мікалайчык накіраваў Чэрчылю мемарандум, у якім дамагаўся скідвання (на парашутах.--Я. С.) міжсаюзніцкай камісіі сувязных і прыдання яе галоўнакамандаванню АК (у Варшаве.--Я. С.), а таксама прасіў распараджэння для брытанскай вайсковай місіі ў Маскве аб дэлегаванні ёю аднаго афіцэра ў Вільню. Як гарох аб сцену".

Адказу Чэрчыль не даў.

Пра лонданскія асечкі польскага ўрада, акаўцы на "крэсах" у той час не ведалі. Нават не здагадваліся. Галоўным у той момант акаўцы лічылі: выцярпець нягоды, дачакацца лепшага часу і па сігналу з Лондана ці Варшавы нанесці ўдары па Саветах, вырваць "крэсы" з-пад улады Масквы. У баі з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі яны не ўвязваліся, дзейнічалі зпадцішка, па-партызанку. Знішчалі партыйны і савецкі актыў, энкавэдзістаў і міліцыянераў, сексотаў, праводзілі дыверсіі на дарогах, у тым ліку чыгунцы, актывізавалі антысавецкую прапаганду. Падпольная друкарня БІПу дзейнічала бесперапынна -- выпускаліся лістоўкі, адозвы, газеты "Шлякам Нарбута" ("Шляхам Нарбута"), "Сьвіт Польшчы" ("Ранак Польшчы").

Рэгулярна выходзілі ў эфір радыёстанцыі Віленскай і Навагрудскай акругаў -- "Ванда-19" і "Ванда-20". 10 жніўня 1944 г. "Ванда-19" і ўвесь персанал былі захоплены органамі НКДБ. "Ванда-20" пачала працаваць на дзве акругі. Дэпешы ў Лондан і Варшаву перадаваліся пастаянна: пра ваенна-палітычную і аператыўную абстаноўку на "крэсах", настроі насельніцтва, сітуацыю ў атрадах АК. Пастаянныя былі просьбы пра дапамогу, скідкі грузаў на парашутах і г. д. Завяршаліся дэпешы тым, што чакаюць указанняў на далейшыя дзеянні.

Лондан маўчаў. Невядома з якой прычыны, але шыфроўкі з Рудніцкай і Рускай (Гродзенскай) пушчаў у лонданскім штабе былі прачытаны толькі 7.01.1945 г.

Варшава, хоць горад пылаў у агні паўстання, знаходзіла час, каб сяды-тады адказаць пушчанцам. Але не тое, што хацелася б ведаць "Котвічу". "Закідваеце нас устарэлымі дэпешамі,-- злаваўся ён у радыёшыфроўцы ад 18.08.1944 г.-- Праглядайце ўласны матэрыял".

"Котвіч" чакаў дакладных інструкцыяў, нарэшце галоўны камендант АК "Бур" перадаў яму з Варшавы: "... Не паддавайцеся на ашуканствы, не давайце сябе арыштаваць. На перагаворы не ездзіць. Вызываць да сябе савецкіх камандзіраў. (...) У выпадку раззбраення з ужываннем насілля супраціўляцца.

... У сувязі з агульнай сітуацыяй загадваю. Перайсці да падпольнай барацьбы, сабатаваць прызыў у Армію Берлінга і сав(ецкую). Усе вашы рашэнні, якія маюць прынцыповае значэнне, патрабуюць майго зацвярджэння. Аб прысланні саюзніцкай камісіі нават не думайце".

Змест дэпешы "Бура" не пакідае ніякіх сумненняў, што атрады АК ні ў якім разе не павінны былі пакідаць тагачаснае месца дыслакацыі і перамяшчацца ў цэнтральныя раёны Польшчы. Нельга было скласці зброю і спыніць барацьбу.

Тым часам тэрмін ультыматуму акаўцам скончыўся. Генерал-лейтэнант Сяроў выдатна зразумеў (разведка працавала), што пра бяскроўнае раззбраенне сілаў АК у Рускай (Гродзенскай) пушчы, мірным зыходзе канфлікту не можа быць гаворкі. Часці ўнутраных войск і пагранічнікі перайшлі ў наступ. Імкнуліся акружыць узброеныя акаўскія атрады і знішчаць на месцы.

У суботу, 19 жніўня, савецкія войскі пачалі ліквідацыю атрада "Ярэмы". На хутары Баравым у трох кіламетрах ад мястэчка Дубічы. Акаўцамі камандаваў намеснік "Ярэмы" "Еж", сам камандзір ляжаў хворы. "Яжу" ўдалося вывесці, хоць і са стратамі, людзей з акружэння. Праз дзве-тры гадзіны атрад адарваўся ад праследавальнікаў і назаўтра па ўласнай ініцыятыве "Еж" распусціў атрад, бо, па яго словах, "поўнасцю разумеў, што сітуацыя наша безнадзейная, ведаў, што савецкае войска прачэсвае лес".

Тым часам адсталы ад атрада "Ярэма" пераапрануўся ў сялянскае адзенне, здабыў каня з возам і накіраваўся ў Вільню. Па дарозе быў затрыманы энкавэдзістамі, дастаўлены ў Эйшышкі. Там яго апазналі і арыштавалі.

У той самы суботні дзень спецчасці НКДБ атакавалі атрад "Бустрамяка" (80 чалавек), які знаходзіўся ў некалькіх кіламетрах ад "Яжа"-- на ўскрайку лесу побліз вёскі Паддубічы. У часе перастрэлкі 6 акаўцаў забілі, чатырох паранілі. "Бустрамяк" з дапамогай "ціхацёмных" "Хатрака" і "Астрогі" прарваў агнявое кальцо і рушыў з атрадаўцамі ў бок штаб-кватэры "Котвіча" на хутар Сурконты.

Аб тым, што адбылося ў Сурконтах, можна даведацца з рапартаў "Варты" ў варшаўскі цэнтр.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Дэпеша "Варты" генералу "Буру"**

26.08.1944 г. "21.08. ашуканым шляхам у Сурконтах быў акружаны Саветамі падпалкоўнік "Котвіч" і частка афіцэраў, а таксама група аховы.

Назначаны "Котвічам" яго намеснікам, я ўзяў кіраўніцтва акругай у свае рукі. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, буду працаваць з неаслабнай энергіяю, пакуль вы, пан генерал, не назначыце новага каменданта акругі".

Праз тры дні "Варта" паведамляе ў штаб падрабязнасці: "У Сурконтах загінулі "Котвіч", "Астрога", "Хатрак", "Яры" (Валенты Васілеўскі.--Я. С.) і 32 жаўнеры.

Сав(еты) дабівалі параненых. Прычына нашай трагедыі -- неканспіратыўныя паводзіны "Котвіча", ліхацтва, супраціўленне і жаданне адпомсціць за ганьбу раззбраення ў Рудніцкай пушчы. "Котвіч" у час бою меў дзве гадзіны перапынку да часу прыбыцця сав(ецкага) падмацавання. Адмовіўся ад адступлення, хоць амаль не меў стратаў. Сав(ецкія) страты складаюць 132 забітыя".

З гібеллю "Котвіча" АК на "крэсах" страціла свайго найздатнейшага афіцэра, самага адданага АК і Польшчы камандзіра. Адданага да фанатызму. Ён праліў на беларускай зямлі ўласную кроў двойчы: спярша быў цяжка паранены ў баі з немцамі, а потым загінуў ад кулі невядомага савецкага байца. Прычым у апошнім баі людзі загінулі іменна з-за яго фанатызму, сляпога неадкладнага жадання біць "камуністых".

Справа, за якую ён і яго паплечнікі злажылі галовы, была заведама прайграна. "Котвіч" ушчэнт выматаў ва ўсіх нервы, у бяздумнай гарачцы палез пад кулю сам і падставіў пад кулі таварышаў. Палажылі свае галовы, больш за сотню, ні ў чым не вінаватыя чырвонаармейцы -- учарашнія сяляне, рабочыя, студэнты, выпускнікі школ, якія ў той момант пазарэз былі патрэбныя фронту.

Пра мёртвых альбо добра, альбо нічога,-- гаварылі калісьці рымлянцы і славянцы. Але ў жыцці, на жаль, не заўсёды атрымліваецца рабіць так, як раіць гэтая мудрасць. Як любую грамадскую з`яву, жыццё чалавека нельга ахарактэрызаваць адной фарбай: чорнай ці белай. Нікольki не апраўдваючы сляпую веру "Котвіча", якая прывяла да бессэнсоўнай смерці многіх людзей, нельга не заўважыць яго высакародных якасцяў. Ён належаў да той, ужо даволі рэдкай у наш час, кагорты змагароў, для якіх воінскі доўг і грамадзянскі абавязак -- не проста словы, а найвышэйшы жыццёвы прынцып. Такія людзі даюць клятву ці прымаюць прысягу толькі адзін раз на жыцці і застаюцца вернымі ім да канца.

"Котвіч" загінуў у адкрытым баі, не запляміў афіцэрскі гонар і чалавечую годнасць. Засталыя жыць пасля яго зачастую былі пазбаўленыя такіх якасцяў і паняццаў. Яны стралялі ў спіну, з-за вугла, па-зладзейску, часта ў бяззбройных людзей, якія не маглі сябе абараніць. Пасля ўжо і радавыя акаўцы, і асабліва афіцэры, пачнуць гаварыць пра нейкія высакародныя матывы хваляў іхніх забойстваў людзей на Беларусі, якіх забівалі нізка, подла, з-за вугла.

У вайну АК на Беларусі, па вялікаму рахунку, паўторымся, фактычна адседжвалася. Дробна дыверсійнічалі. Лавіравалі. Так фактычна хацелі рабіць і пасля вызвалення Беларусі ад немцаў. Але тут яны ўжо білі не прышлякоў, а гаспадароў. Славянаў.

Апору ў народзе трацілі. З кожным забойствам, з кожным днём.

Пачалася бяссэнсоўная бойня, якая каштавала жыцця многім людзям па абодвых баках барыкадаў, пачалася вялікая трагедыя. Пра яе маштабы яскрава сведчаць старонкі крымінальнай справы № 3710/822, дзе гаворка ідзе пра ўсяго адзін атрад -- атрад "Крысі".

"Ноччу з 19 на 20 кастрычніка 1944 г. некалькі ўзброеных групаў бандытаў з прыблізнай колькасцю да 150 чалавек напалі на мястэчка Эйшышкі... Бандыты ўварваліся ў будынак выканкома гміны, знішчылі там усе службовыя дакументы і падпалілі будынак. Мясцовыя жыхары патушылі пажар уласнымі сіламі.

У час нападу бандыты ўварваліся ў кватэру грамадзяніна Сонензона, расстралялі яго жонку і дзіця. У кватэры Сонензона знаходзіўся капітан дзяржбяспекі, які прыбыў у Эйшышкі ў рамках службовай камандзіроўкі. Быў захоплены бандытамі разам з усімі сакрэтнымі дакументамі, якія знаходзіліся пры ім, г. зн. следчымі дакументамі, і выведзены бандай у лес. Лёс капітана да гэтага часу невядомы.

У той самы час група бандытаў уварвалася ў кватэру грамадзяніна Яткевіча і расстраляла старэйшага сяржанта Чырвонай Арміі, які быў там. Прозвішча яго ўстанавіць не ўдалося.

Па дарозе з Эйшышкаў бандыты схапілі чырвонаармейца, раздзелі яго і расстралялі, труп забітага забралі з сабою.

- Адначасова з нападам на выканкам Эйшышскай гміны група бандытаў пад кіраўніцтвам камандзіра батальёна нелегальнай контррэвалюцыйнай, белапольскай, нацыяналістычнай арганізацыі "Армія Краёва" Хіневіча абрабавала гарбарню, захапіла 40 хромавых скураў.

Пасля адыходу з Эйшышкаў на адлегласці 2 км ад мястэчка банда абрабавала магазін саўгаса "Гарнастаішкі" і забрала каля тоны збожжа.

У ноч з 6 на 7.12. 1944 г. пад кіраўніцтвам верхавода "АК" "Крыся" зроблены другі збройны напад на памяшканне турэмнай варты ў Эйшышках, яго абстралялі і закідалі ручнымі гранатамі. Абстрэл вялі запальнымі кулямі, вартаўнічае памяшканне загарэлася. Скарыстаўшы выпадак, бандыты выламалі турэмныя краты і вызвалілі 31 арыштаванага бандыта. У час гэтага налёту бандыты заблакавалі:

а) памяшканне турэмнай варты;

б) памяшканне гарнізона, у якім знаходзіліся чырвонаармейцы;

в) будынак гміннай міліцыі, і агнём карабінаў на працягу некалькіх гадзінаў абстрэльвалі доступ да заблакаваных аб'ектаў.

У ходзе гэтага нападу адзін чырвонаармеец быў паранены.

У час адбівання атакі было забіта і ранена некалькі бандытаў. Адступаючы, забітых і раненых бандыты забралі з сабою.

ДАВЕДКА

аб праведзеных аператыўных вайсковых аперацыях у перыяд ліквідацыі бандыцкіх групаў, выкананых 97-ым пагранічным атрадам, 136-ым палком унутраных войскаў, аператыўным складам супрацоўнікаў НКДБ, а таксама узброеным партыйна-савецкім актывам...

У выніку праведзеных аператыўных вайсковых аперацыяў з мэтай ліквідацыі бандыцкіх групаў з 17 па 29.12.1944 г. ... забіта 16 і ўзята раненымі 6 бандытаў.

У ходзе аперацыі ў бандытаў канфіскавана з магазінных скрынкаў, забрана з поля бою, адабрана ў працэсе затрымання наступная зброя і боепрыпасы:

кулямётаў -- 5; аўтаматаў -- 7; карабінаў -- 40; пісталетаў --4; ручных гранатаў--19; розных боепрыпасаў --3047; ракетніцаў --1; ракетных патронаў --30; выбуховых рэчываў--16 кг; запальнікаў--100 шт.; бікфордавых шнуроў--50 метраў; магазінаў для ручных кулямётаў і аўтаматаў--14 шт.; радыёпрыёмнікаў --3 шт.; радыёперадатчыкаў --1.

7 студзеня 1945 г. вайсковая аперацыя па ліквідацыі бандыцкіх групаў у Рудніцкай пушчы была праведзена другі раз.

У ходзе ліквідацыі было забіта 106 бандытаў. Бандыты прымянялі бязлітасныя формы барацьбы з вайсковымі падраздзяленнямі Чырвонай Арміі — пераапраналіся ў форму салдатаў і камандзраў Чырвонай Арміі. У ходзе ліквідацыі бандыцкай групы ў Рудніцкай пушчы 7.01.1945 г. устаноўлена, што сярод 106 трупаў бандытаў адзін бандыт быў пераапрануты ў форму маёра Чырвонай Арміі, другі — у форму лейтэнанта і 20 -- у форму салдатаў Чырвонай Арміі. Канфіскаваныя такая зброя і амуніцыя:

кулямётаў -- 1; аўтаматаў --2; карабінаў --29; пісталетаў --1; боепрыпасаў --3 тыс.; выбуховых рэчываў --8 кг; радыёстанцыя --1;

ЗАЎВАГА. Указаная зброя і амуніцыя былі канфіскаваны толькі 97-ым пагранічным атрадам. Што датычыць зброі і амуніцыі, якую забраў 136-ы полк унутраных войскаў, то ён адразу ж выступіў на фронт і дадзеных пра канфіскаваную зброю не пакінуў.

16 сакавіка 1945 г."

Пагадзіцеся, нават праз многа гадоў пасля тых падзеяў жудасна чытаць радкі падобных дакументаў. А такіх крымінальных справаў пра ўдзельнікаў Арміі Краёвай было заведзена не дзесяткі -- сотні!

Снежнем 44-га і студзенем 45-га, пра якія ідзе гаворка ў справе № 3710/822, ні ў Рускай (Гродзенскай) ні ў іншых пушчах і лясах барацьба не закончылася. Яна то затухала, то разгаралася з новай сілаю. Аб складанасцях і перыпетыях той барацьбы будзе сказана ў наступных раздзелах.

А цяпер, для лагічнага завяршэння аповяду пра падзеі ліпеня -- жніўня 1944 г., вернемся да тых акаўцаў, якія былі інтэрніраваны і знаходзіліся ў Медніках. Ім, бадай, пашанцавала, больш за ўсіх. Ацалелі!

Сярод інтэрніраваных была праведзена пільная "селекцыя": радавых жаўнераў аддзялілі ад афіцэраў і падафіцэраў. Радавых -- прыкладна 4 тысячы чалавек -- накіравалі ў Калугу. Там іх размясцілі ў вайсковых казармах і наладзілі ваенную перападрыхтоўку. Хацелі стварыць з акаўцаў пяхотны полк, падмацаванне для фронту. Не атрымалася. Акаўцы адмовіліся прыняць савецкую вайсковую прысягу і замест фронту... апынуліся на лесараспрацоўках. Праз год пачалі вяртацца на радзіму. Большасць выехала ў Польшчу.

З афіцэрамі было інакш. Арыштаваных у Багушах і інтэрніраваных у Медніках вывезлі ў спецлагер № 178 (Дзягілева), за пяць кіламетраў ад Разані. Афіцэраў і падафіцэраў, якія не прадстаўлялі інтарэсаў для органаў дзяржбяспекі, у лютым 1946 г. адпусцілі ў Польшчу (827 чалавек). Да пакінутых у кастрычніку 1946 г. далучыўся і былы камендант Віленскай акругі "Вільк".

Яго змясцілі з другімі польскімі высокапастаўнымі, затрыманымі і схопленымі акаўцамі.

Вайна і даваенныя "разборы" адкрылі вочы і чэкістам. Як бы не было, Катынская трагедыя не паўтарылася. Хаця рахункі акаўскім афіцэрам можна было прад`явіць, і немалыя.

Вясной 1947 г. група польскіх афіцэраў і генералаў у сувязі з дрэнным харчаваннем і невыноснымі бытавымі ўмовамі аб`явілі галадоўкі і забастоўкі. У выніку чатырох генералаў АК, некалькі дзесяткаў старшых афіцэраў, у тым ліку "Вілька", адтранспартавалі ў Гразавец пад Волагдаю. І тут здарылася такое, у што, ведаючы, як пільна ахоўваліся ў той час падобныя ўстановы, проста цяжка паверыць: "Вільк" і яшчэ два афіцэры ўцяклі з лагера.

Адзін з трох уцекачоў Аляксандр Васілеўскі, праз шмат гадоў падрабязна апісаў уцёкі ў беластоцкім часопісе "Кантрасты" (№ 1. 1990).

"Вільк" дабраўся да Вільні. Там, па адных звестках, добраахвотна з`явіўся ў польскае консульства, каб выказаць пратэст супраць нечалавечых умоваў утрымання вязняў-афіцэраў АК -- у савецкіх лагерах. У выніку -- быў арыштаваны. Па другіх дадзеных, пра гэта сведчыць Аляксадр Васілеўскі, "Вільк" паспяхова хаваўся ў ваколіцах Вільні. Быў там арыштаваны па даносу.

Як бы ні было, "Вільк" быў схоплены чэкістамі, накіраваны ў Маскву на Лубянку, а адтуль, пасля кароткачасовага следства, зноў у Дзягілева пад Разань.

Польскі ўрад не забываў сваіх вояў. Варшава і Масква вялі перамовы. 4 лістапада 1947 г. спецпоезд даставіў "Вілька" і другіх афіцэраў АК у Брэст, дзе яны былі перададзеныя ўладам Польскай Народнай Рэспублікі.

Сапраўды, не ведае чалавек, дзе што сустрэне. У пушчах акаўцы паклалі галовы, а гэтыя ўцалелі. Вярнуліся героямі на Радзіму.

# КАЛІ ВАЙНА АДКАЦІЛАСЯ НА ЗАХАД

Позні дажджлівы вечар 18 лістапада 1944 года. Вайна далёка адкацілася на Захад. Па шашы Ліда -- Вільнюс ідзе цяжка нагружаная паўтаратонка, яе суправаджае шэсць чырвонаармейцаў.

У кузаве грузавіка зброя і боепрыпасы, 86 вінтоўкаў, 2 станкавыя кулямёты, гранаты і вялікая колькасць патронаў.

Шлях машыне няблізкі -- яна кіравалася ў бок Усходняй Прусіі, да перадавой лініі фронту. Таму, праязджаючы мястэчка Тракелі, байцы вырашылі зрабіць кароткачасовы прыпынак. Крыху перакусіць і дазаправіць паўтаратонку.

Спыніліся на невялікай плошчы насупраць Тракельскага касцёла. Толькі чырвонаармейцы прыняліся за няхітры харч, як з-за касцёльнай агароджы, быццам каршуны, адчуўшы лёгкую здабычу, наляцелі невядомыя са зброяй у руках. Ва ўпор расстралялі салдат.

Разграбілі змесціва аўтамашыны, нападалыя бесцырымонна пакідалі забітых у кузаў, аблілі грузавік бензінам і падпалілі. Самі ж, прыхапіўшы нарабаванае, зніклі ў лесе.

Пра гэта здарэнне адразу даведалася большасць жыхараў мястэчка, аднак ніхто з іх не паведаміў органам Савецкай улады аб расправе над чырвонаармейцамі.

Людзі баяліся. Не хацелі высоўвацца. Гэта ўсё ў пэўнай ступені наглядна сведчыла аб той атмасферы, што панавала ў асобных раёнах Заходняй Беларусі пасля вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў.

Пра зробленае злачынства лідскія міліцыянеры і чэкісты даведаліся з паведамлення ваеннаслужачых, што праязджалі праз Тракелі. Калі аператыўная група прыбыла на месца нападзення, знайшла толькі асобныя жалезныя часткі дашчэнту згарэлай машыны. Прозвішчы загінулых чырвонаармейцаў устанавіць не ўдалося. Праўда, адна з мясцовых жыхаркаў па імені Марта, праходзіла каля паўтаратонкі перад яе знішчэннем, чула гаворку чырвонаармейцаў. Аднаго з іх таварышы называлі "сяржант Смірноў". Адзіная інфармацыя для надпісу на брацкай магіле.

Хто ж яны, натхняльнікі і выканаўцы гэтага цяжкага злачынства? Што тычыцца выканаўцаў, дык ужо на пачатку 1945 года яны сталі вядомымі. Арыштаваны органамі дзяржбяспекі камандзір атрада Арміі Краёвай па мянушцы "Внім" не толькі пацвердзіў факт забойства салдатаў і захопу зброі, але і падрабязна расказаў, як гэта было, назваў усіх саўдзельнікаў.

Ёсць сэнс прывесці дадзеныя, якія пераканаўча напамінаюць, што ўтворанае ў Тракелях -- адзін з мноства крывавых тадышніх эпізодаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З судовай справаздачы па абвінавачванню Леапольда Акуліцкага і другіх кіраўнікоў Арміі Краёвай на працэсе ў Маскве 18—22 чэрвеня 1945 г. (далей для сціслаcці будзем называць "Працэс 16-ці"):**

**"Па няпоўных дадзеных, у выніку тэрарыстычнай дзейнасці**

**Арміі Краёвай толькі з 28 ліпеня па 31 снежня 1944 г. было забіта 277 і паранена 94 байцы і афіцэры Чырвонай Арміі, у тым ліку забіта і паранена афіцэраў --77, сяржантаў—87, байцоў --207 чалавек. З 1 студзеня па 30 мая 1945 г. забіта 317 чал. і паранена 125 чал. байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі".**

Што з'явілася прычынай гэтых і іншых ахвяраў? Хто з'яўляўся непасрэдным віноўнікам смерці і пакутаў невінаватых людзей? Герояў, якія вызвалялі Еўропу? Хто імкнуўся павярнуць ход падзеяў назад насуперак рэальнай сітуацыі, насуперак новай рэчаіснасці, насуперак цвярозаму сэнсу, нарэшце? У нейкай ступені адказы на гэтыя пытанні дадзены ў ранейшых раздзелах кнігі. Гаварылася там пра гістарычныя перадумовы ўзброенага супрацьстаяння, пра яго сацыяльныя і нацыянальныя карані.

Калі падсумаваць сказанае, можна адказаць коратка: галоўнай прычынай зацяжнога і кравапралітнага канфлікту з'явілася спроба польскага эмігранцкага ўрада ў Лондане рэстаўрыраваць ранейшую буржуазна-памешчыцкую дзяржаву ў межах 1939 г.

Здарылася, што не раз здаралася ў гісторыі: безадказныя палітыканы робяць памылкі, а расплачваецца за іх просты чалавек, часта абсалютна невінаваты, як тыя шэсць воінаў. Прасачыць за ўсёй абсурднасцю рашэнняў праўных нацыяналістычных колаў, якія прывялі Армію Краёву да сумнага канца, выразна ўбачыць і ўсвядоміць вытокі трагедыі масы людзей памагаюць дакументы -- раўнадушныя сведкі гісторыі. Мы разумеем, агульныя ацэнкі дзенідзе паўтараюцца. Гэта не памылка. Так робіцца сумысна. Для ўзмацнення, магчымасці большага цытавання першакрыніцаў (дакументаў).

Нагадаем. Яшчэ 28 верасня 1940 г. генерал Стэфан Равецкі, будучы камандуючым Арміяй Краёвай, перадаў дырэктыву для камендантаў абшараў № 2 (Беласток) і № 3 (Львоў)-- кіраўнікоў падпольных структур ЗВЗ, ужо створаных да таго часу ў Заходняй Беларусі і на Заходняй Украіне, г. зн. тэрыторый, уз'яднаных з СССР у верасні 1939 г.

У дырэктыве падкрэслівалася, што, незалежна ад таго, ці будзе ў будучай вайне СССР саюзнікам Англіі або не, у любым выпадку пазіцыя ЗВЗ застанецца нязменнай. У выпадку магчымага наступлення савецкіх войскаў на Захад, што прадвызначыла б разгром нямецкай арміі, дырэктыва загадвала: "... вы павінны быць гатовыя выканаць мой спецыяльны загад па правядзенню масавых дыверсіяў і арганізацыі партызанскага руху".

Дадзеная ўстаноўка давалася за восем месяцаў да пачатку Вялікай Айчыннай! Безумоўна, вытокі падобных дырэктыў перш за ўсё трэба шукаць у палітычнай блізарукасці, наяўнасці ўстойлівых ідэалагічных стэрэатыпаў і яўнай вялікадзяржаўнай нацыяналістычнай пазіцыі, характэрнай для тагачаснага польскага ўрада ў эміграцыі, якому ЗВЗ непасрэдна падпарадкоўваўся.

Такая палітыка багата асабліва небяспечнымі вынікамі, менавіта яна з'явілася прадвеснікам стварэння ў будучым тайнай, глыбока заканспіраванай арганізацыі "NIE" ("Не"). Што выданне дадзенай

дырэктывы невыпадковы эпізод, а вынік мэтанакіраванай палітыкі, пераканаўча сведчаць іншыя дакументы.

**З дырэктывы генерала Равецкага ад 8--19 чэрвеня 1943 г.:** "Неабходна, каб мы на ўсходніх землях прадэманстравалі перад уступаючымі расіянамі нашу цвёрдую рашучасць і заявілі свае правы на гэтыя землі". Дырэктыва загадвала: адносіны да Чырвонай Арміі, калі яна пачне прэтэндаваць на землі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны як прыналежнасць тэрыторыі СССР, павінны быць "адкрыта варожымі". Генерал Равецкі намеціў контуры плана, які прадугледжваў: 1) шырокую дыверсію на камунікацыйных лініях Чырвонай Арміі для затрымкі яе руху на Захад; 2) уступленне ва ўзброеную барацьбу "там, дзе будзе хаця б найменшы шанц для яе вядзення"; 3) падрыхтоўка канспіратыўнай сеткі на тэрыторыях, занятых СССР, быць гатовымі -- пры спалучэнні спрыяльных абставін -- да баявых акцыяў.

Пасля арышту немцамі Стэфана Равецкага яго палітыку актыўна працягваў кіраўнік АК Бур-Камароўскі. Пры поўнай падтрымцы галоўнакамандуючага польскімі ўзброенымі сіламі генерала Саснкоўскага. Пацверджаннем гэтаму з`яўляюцца радыёграмы Бур-Камароўскага ў Лондан, у штаб вярхоўнага галоўнакамандуючага (16 жніўня 1944 г.), каменданту АК акругі Навагрудак (17 жніўня і 8 верасня 1944 г., камандуючым усіх акругаў АК (1 верасня 1944 г.) і г. д.

Духам варожасці да Чырвонай Арміі, органаў Савецкай улады прасякнуты радыёграмы ў адказ Бур-Камароўскаму: ад камендата акругі Навагрудак (22 жніўня 1944 г.), ад каменданта акругі Вільня (26 жніўня 1944 г.) і інш. Па слядах сваіх папярэднікаў пайшоў і Акуліцкі, які змяніў Бур-Камароўскага ў кастрычніку 1944 г.

**СВЕДАЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З судовай справаздачы аб "працэсе 16-ці": "Факт атрымання абвінавачаным Акуліцкім з Лондана радыёграм з указаннем захаваць штабы, зброю, боепрыпасы і радыёсродкі Арміі Краёвай пацвярджаецца расшыфраванымі радыёграмамі, што маюцца ў справе, польскага эмігранцкага ўрада і кіраўніцтва Арміі Краёвай.**

У адной з гэтых радыёграм (№ 11869 ад 8 снежня 1944 г.) паведамляецца поўны тэкст пастановы эмігранцкага ўрада ад 14 кастрычніка 1944 г. У гэтай пастанове ўказваецца на неабходнасць правядзення вялікай канспіратыўнай работы, прапаноўваецца ажыццявіць наступнае: заканспіраваць Армію Краёвую, пільна ўкрываць зброю, арганізоўваць нелегальныя кіраўнічыя органы і сувязь, захаваць людзей.

У заключэнне ў радыёграме гаворыцца:

"Выдаванне гэтай пастановы цягне за сабой суровае пакаранне ў адносінах да асоб, якія выдалі сакрэтнасць яго.

Гэтая пастанова зыходзіць сапраўды ад урада "Варта".

Абвінавачаны Акуліцкі прызнаў, што слова "Варта" служыць шыфраваным абазначэннем генеральнага штаба польскіх войскаў у Лондане.

Абвінавачаны Акуліцкі паказаў, што ў ліпені 1944 г. Бур-

Камароўскі паведаміў яму, што ў адпаведнасці з указаннямі Саснкоўскага ён загадаў стварыць і ўзначаліць ваенна-палітычную арганізацыю пад назвай "Не", што азначае "Незалежнасць".

Следствам устаноўлена, што ў задачы падпольнай арганізацыі "Не" ўваходзіла:

1) збіраць кадры арганізацыі, захоўваць зброю для легальнай работы і падрыхтоўкі паўстання супраць СССР;

2) ствараць узброеныя баявыя атрады ў колькасці не больш за 60 чалавек у кожным;

3) ствараць тэрарыстычныя, так званыя ліквідацыйныя групы, ажыццяўляць тэрарыстычныя акты над праціўнікамі АК і прадстаўнікамі савецкага ваеннага камандавання;

4) рыхтаваць кадры дыверсантаў для ажыццяўлення дыверсійных актаў толькі ў перыяд набліжэння моманту паўстання;

5) займацца ваеннай разведкай і контрразведвальнай работай у тыле Савецкай Арміі;

6) захаваць радыёстанцыі і падтрымліваць радыёсувязь з галоўным камандаваннем АК праз Лондан;

7) праводзіць друкаваную і вусную прапаганду, накіраваную супраць СССР.

На першым этапе арганізацыя "NIE" ("Не") павінна была мець ваенна-палітычны характар, затым павінна была дзейнічаць як чыста ваенная арганізацыя -- у адпаведнасці са спецыяльным загадам галоўнага камандавання Арміі Краёвай.

Як устаноўлена следствам, на тэрыторыі заходніх абласцей Украіны і Беларусі, у Літве і Польшчы, у тыле Чырвонай Арміі на працягу 1944 г. і ў пачатку 1945 г. падпольнымі ўзброенымі атрадамі Арміі Краёвай сістэматычна праводзіліся тэрарыстычныя акты ў адносінах да байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі і ўзброеныя налёты на савецкія ваенныя і грамадзянскія ўстановы".

## ПЕЛЕНГАТАР ЗАФІКСАВАЎ

Любыя заўвагі аўтара не заменяць дакументы, устаноўленыя, правераныя, апора якіх -- факты і толькі факты. Таму іх у гэтым раздзеле будзе шмат.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З судовай справаздачы аб "Працэсе 16-ці: "Матэрыяламі следства ўстаноўлена, што па заданню польскага эміграцкага ўрада праводзілі ў тыле Чырвонай Арміі збор звестак разведвальнага характару таксама ўдзельнікі мясцовых арганізацыяў Арміі Краёвай.

Гэта пацвярджаецца дырэктывай польскага эміграцкага ўрада ў адрас Акуліцкага і камендантаў акругаў АК ад 11 лістапада 1944 г. за № 7201/1/777. Вось вытрымкі з гэтай дырэктывы:

"З ліквідацыяй варшаўскага цэнтра разведка перастала перасылаць вычарпальныя фатаграфічныя месячныя разведвальныя рапарты.

Веданне ваенных намераў і магчымасцяў... Саветаў на Усходзе

мае асноўнае значэнне для прасоўвання і далейшага планавання развіцця падзей у Польшчы. Вы павінны... ліквідаваць недахопы пры перадачы разведвальных данясенняў згодна з загадам разведаддзела штаба".

Далей ідуць падрабязныя ўказанні, якія даныя збіраць пра воінскія часці, транспарт, умацаванні, аэрадромы, узбраенне, становішча на фронце, пра ваенную прамысловасць і да т. п.

20 лістапада 1944 г. на ст. Ваўкавыск быў затрыманы ўдзельнік Арміі Краёвай Шанціла Франц Францавіч, у якога быў знойдзены і адабраны пакет са шпіёнскімі звесткамі.

На допыце 19 студзеня 1945 г. Шанціла паказаў:

"Я ўдзельнік нелегальнай антысавецкай польскай арганізацыі, дзеючай па дырэктыве польскага ўрада ў Лондане...

У гэтую арганізацыю быў прыцягнуты ў сакавіку 1944 года Баўтрукевічам...

20 лістапада 1944 г. мяне сапраўды затрымаў на ст. Ваўкавыск сяржант Сафараў у момант, калі я атрымаў ад галоўнага кандуктара Багдановіча Дзіяніса пакет... У гэтым пакеце былі шпіёнскія звесткі пра стан чыгуначнага транспарту.

Па заданню кіраўніка арганізацыі ў Ваўкавыску Баўтрукевіча пакеты са шпіёнскімі данымі я дастаўляў у горад Беласток, дзе ўручаў іх членам арганізацыі... па ўмоўленых паролях".

У перадачы звестак разведвальнага характару польскія падпольныя арганізацыі АК выкарыстоўвалі радыёперадаючыя станцыі, якія ў іх былі.

**БЫЛО ГЭТА ТАК.** З успамінаў начальніка штаба акругі Навагрудак АК Станіслава Сэндзяка: "Побач з развіццём сеткі канспіратыўнай сувязі мы пачалі ўпарта дабівацца ад кіраўніцтва АК забеспячэння акругі радыёстанцыямі. Нарэшце восенню 1943 г. шэф 5 аддзела акругі "Юз" (паручнік Юзэф Арэхва-Рыльскі.--Я. С.), адказны за арганізацыю радыёсувязі, атрымаў 16 апаратаў. Чатыры з іх мы адразу ж перадалі ў інспектарат Баранавічы, астатнія "Юз" заканспіраваў на сваёй тэрыторыі.

Рота сувязі акругі налічвала 80 чалавек. Гэта былі выдатныя, з першакласнай падрыхтоўкай кадры. Мы не хацелі дачасна дэканспіраваць тое, чым валодалі. Таму ўпершыню ўстанавілі радыёсувязь з вярхоўным галоўнакамандуючым у Лондане толькі ў маі 1944 г.

У час акцыі на Вільна карэспандэнцыя паміж палкоўнікам "Вількам" (Аляксандрам Кжыжаноўскім -- камендантам аб`яднанай акругі АК "Навагрудак -- Вільня".-- Я. С.) і Лонданам ажыццяўлялася выключна сіламі нашай роты сувязі".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З судовай справаздачы аб "Працэсе 16-ці": "За перыяд са жніўня 1944 г. па май 1945 г. савецкімі ваеннымі ўладамі канфіскавана 25 нелегальных радыёперадатчыкаў... 10 з іх на тэрыторыі заходніх абласцей Украіны і Беларусі, у Літве (у гарадах Львове, Лідзе, Вільнюсе і іншых). Пры канфіскацыі радыёстанцыі арыштаваны радысты, тэхнікі, утрымальнікі канспіратыўных радыёстанцый...

... 8 верасня 1944 г. на хутары Залескі (16 км на паўночны захад

ад горада Ліды, БССР) была канфіскавана падпольная радыястанцыя № 20 Арміі Краёвай.

Пры ліквідацыі гэтай радыёстанцыі канфіскаваны: партатыўная прыёмна-перадавальная радыёстанцыя, радыёпрыёмнік і дэталі да іх; два сшыткі з запісамі тэкстаў перададзеных і прынятых шыфраваных радыёграмаў; умовы радыётэлеграфных кодаў.

Начальнік сувязі Навагрудска-Лідскай акругі Арэхва-Рыльскі, які працаваў на гэтай станцыі, на допыце паказаў:

"Будучы членам Арміі Краёвай, першы час працаваў на радыёстанцыі штаба Навагрудскай акругі ў прамым падначаленні начальніка штаба "Варты" (Станіслава Сэндзяка.--Я. С.).. Пасля раззбраення Арміі Краёвай па прапанове "Варты" перайшоў на нелегальнае становішча для арганізацыі і ўстаноўкі падпольнай радыёстанцыі ў тыле Чырвонай Арміі".

БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў чэкіста А. М. Нібуша: "Глыбокай восенню 1944 г. я прымаў непасрэдны ўдзел у ліквідацыі адной з апошніх радыёстанцый АК на тэрыторыі Гродзеншчыны. Наша станцыя пеленгацыі зафіксавала работу нелегальнай радыёстанцыі на тэрыторыі былога Радунскага раёна. Час перадачы быў даволі кароткатэрміновы. Кіраўніцтва Лідскага гараддзела НКДБ прыняло рашэнне кінуць усе сілы на яе пошукі. На месца магчымага дзеяння радыёстанцыі тэрмінова накіравалі групу аператыўных работнікаў з 5 чалавек. Разлік нашых пеленгатараў аказаўся дакладным, аператыўнікі хутка напалі на след.

На падыходзе да аднаго з хутароў іх абстралялі з кулямёта і вінтовак, пры гэтым быў ранены старшы оперупаўнаважаны гараддзела, капітан дзяржбяспекі Праманосаў. Аднак захапіць станцыю і затрымаць радыстаў першым разам не ўдалося. Праз двое сутак нелегальная радыёстанцыя зноў выйшла ў эфір. На гэты раз для яе пошуку накіравалі групу з 20 чалавек.

Аперацыя закончылася паспяхова. Мы знайшлі радыёстанцыю ў вёсцы Ваеджышкі былога Радунскага раёна. Яна была схавана ў хляве, у снапах жыта, знаходзілася ў спраўным стане. Мы затрымалі таксама двух радыстаў -- афіцэраў АК. Як высветлілася ў ходзе следства, радыёстанцыяй у апошні час карыстаўся штаб атрада "Рагнара".

## "РАГНАР" І ДРУГІЯ

СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. Са службовай справаздачы аб "Працэсе 16-ці": "На тэрыторыі Баранавіцкай і Гродзенскай абласцей дзейнічалі да апошняга часу дыверсійныя атрады АК -- "Рагнара", "Крыся", "Сібірака", "Германа" і інш.

Атрад "Рагнара" меў каля 300 чалавек (Лічба па стану на снежань 1944 г.-- Я. С.) і рабіў шматлікія тэрарыстычныя і дыверсійныя акты ў тыле Чырвонай Арміі, рабаваў мясцовае насельніцтва, паліў, узрываў і да т. п.".

БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў начштаба акругі АК Навагрудак Станіслава Сэндзяка: "У паўднёвай частцы Лідскага раёна першы

партызанскі атрад быў створаны ў сакавіку 1943 г. у ваколіцах Беліцы. Яго камандзірам прызначылі "Рагнара" (Чэслава Заянчкоўскага). Да адыходу ў лес "Рагнар" жыў з сям`ёй у Лідзе і займаў нейкую пасаду ў адміністрацыі блізкіх торфараспрацовак. Невядома, як ён спраўляўся са сваімі службовымі абавязкамі, паколькі быў прыгодны, бадай, толькі для аднаго -- быць камандзірам партызанскага атрада. 13 сакавіка 1943 г. "Рагнар" выехаў з горада па справах службы і аказаўся "выкрадзеным". Немцы, апісваючы ў рапарце гэты выпадак, зацвердзілі: "выкраданне" зрабілі савецкія партызаны. "Страцілая надзею" сям`я "Рагнара" неўзабаве пакінула Ліду, знікла ў невядомым напрамку.

Тым часам маленькі атрад, спачатку чалавек дзесяць, рос як на дрожджах і ўжо ў красавіку 1943 г. павялічыўся да ста чалавек.

Неяк разам з капітанам "Сава" мы паехалі паглядзець, як "Рагнар" спраўляецца са сваімі камандзірскімі абавязкамі. Атрад размясціўся на пастой у фальварку Чэхаўшчызна над Нёманам. Салдаты былі добра ўзброены, нядрэнна харчаваліся, настрой мелі надзвычайны. У лютым 1944 г. на базе 312-га атрада "Рагнара" быў створаны 4 батальён 77 пяхотнага палка АК. У ліпені батальён "Рагнара" разам з нададзенымі яму двума эскадронамі уланаў налічваў 1600 чалавек".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З судовай справаздачы аб "Працэсе 16-ці": 10 верасня 1944 г. у раёне вёскі Варнішкі Аполінскага сельсавета Лідскага раёна Гродзенскай вобласці Беларускай ССР частка гэтага атрада ("Рагнара".--Я. С.) пад камандаваннем сяржанта Паўлоўскага Вацлава Сцяпанавіча ("Завеі")* уступіла ў адкрыты бой з воінскай часцю Чырвонай Арміі.

Арыштаваны 22 студзеня 1945 г. В. С. Паўлоўскі паказаў, што з`яўляўся ўдзельнікам Арміі Краёвай, кіраваў баявымі аперацыямі супраць часцей Чырвонай Арміі па заданню кіраўніцтва АК, за гэта ўзнагароджаны і павышаны ў чыне. Гэта пацверджана загадам па атраду "Рагнара" "Юг" № 50 ад 15 верасня 1944 г., дзе сказана:

"Старшаму сяржанту "Завеі", камандзіру 311-га канспіратыўнага атрада, і салдатам 311-га атрада аб`яўляю падзяку за праяўленую ініцыятыву ў разгроме савецкай аблавы. Адначасова паведамляю, што старшы сяржант "Завея" прадстаўлены да ўзнагароды "Крыжам Валечных" і да павышэння ў чыне".

У кастрычніку-лістападзе 1944 г. атрадам "Рагнара" ў вёсцы Любарты забіты лейтэнант Чырвонай Арміі Л. А. Кугляк, абстраляна праязджалая па шашы аўтамашына, прычым забіты два ваеннаслужачыя. У вёсцы Дзітрыкі Лідскага раёна быў павешаны адзін савецкі грамадзянін, у вёсцы Клюкавічы быў расстраляны другі.

У кастрычніку 1944 г. атрад "Рагнара" абакраў жыхара вёскі

---

* Ёсць некаторыя падставы меркаваць, што ў даным выпадку гутарка ідзе пра Паўла Клімашэўскага, былога "плютонавага", г. зн. узводнага 7 батальёна 77 пяхотнага палка АК, сфарміраванага на тэрыторыі Навагрудскай акругі ў 1944 г.

Маруліны Свірыда, у снежні расстраляў жыхараў вёскі Котлава — Урбановіча і Касцюшына.

Атрад узарваў і падпаліў вадакачку на ст. Бастуны Беластоцкай чыгункі і ўтварыў цэлы шэраг іншых злачынстваў.

Гэта пацверджана ўдзельнікамі атрада Урбановічам, Няверскім, Шумскім і шэрагам дакументаў.

Камандзір атрада АК "Сібірак", ён жа Лубікоўскі (паручнік Юзэф Лубікоўскі ў штабе АК акругі Навагрудак кіраваў сапёрна-інжынернай службаю.—Я. С.), меў спецыяльную школу дыверсантаў у маёнтку "Дзітрыкі", у якой пад яго кіраўніцтвам навучалася каля 200 дыверсантаў. Яны пасля размеркаваны па атрадах "Рагнара", "Сібірака", "Крыся" і інш. (Паручнік "Крыся", ён жа "Мсціўца", ён жа Ян Барысевіч, камандзір 2-га батальёна 77-га пяхотнага палка АК. Батальён у ліпені 1944 г. налічваў 650 чал. Паручнік забіты ў баі з савецкімі органамі дзяржбяспекі ў ваколіцах вёскі Кавалькі 21 студзеня 1945 г. — Я. С.).

Лубікоўскі Ю. В. заклікаў байцоў у гадавіну далучэння заходніх абласцей Беларусі і Украіны да Савецкага Саюза праводзіць дыверсійныя акты на чыгуначным транспарце.

Па гэтаму пытанню сам Лубікоўскі выказаў: "...3 верасня 1944 года я напісаў свой загад камандзірам атрадаў "Рагнару", "Крыся" і "Аркану", у якім прапаноўваў з 17 па 18 верасня 1944 г. зрабіць дыверсіі, як бы дэманстрацыю пратэсту супраць уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Польшчы".

І далей:

"...Я атрымаў пісьмовую справаздачу аб выкананні майго загада ... ад "Рагнара", які паведаміў, што ён правёў 12 дыверсіяў — два паязды пушчаны пад адхон, узарваны 2 масты і пашкоджана чыгуначнае палатно ў васьмі месцах".

Дэталізуючы падрыўную дзейнасць атрада Лубікоўскага, удзельнікі атрадаў Календа, К. А. Лукашэвіч выказалі:

"У ноч з 17 на 18 верасня 1944 г. па загаду камандзіра атрада Ягельскага з мэтай, як ён растлумачыў, пратэсту супраць уступлення ў гэты дзень у 1939 годзе Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі, я разам з групай удзельнікаў нашага атрада ўзарваў палатно чыгункі на перагоне паміж станцыямі Нёман і Нова-Ельня".

Лукашэвіч выказаў:

"У атрадзе "Сібірака" я два разы ўдзельнічаў у падрыве таварных паяздоў на перагоне Ліда — Вільня".

Пры ліквідацыі атрада і арышце Лубікоўскага былі канфіскаваны два склады з мінамі, выбуховымі рэчывамі і іншымі прыладамі для правядзення падрыўных актаў.

Загад, амаль аналагічны загаду Лубікоўскага, быў аддадзены і камендантам Навагрудскага абводу АК па мянушцы "Труд" 9 верасня 1944 г. Ён загадаў падначаленым 17 верасня выканаць серыю дыверсійных актаў на тэрыторыі ўсіх раёнаў.

У загадзе гаварылася:

"Аперацыя павінна быць усеагульнай -- узрывы воінскіх эшалонаў, спальванне мастоў, ліквідацыя складоў і сельсаветаў. Выкананне канспіратыўнае".

На следстве з прычыны дыверсій і тэрарыстычных актаў у адносінах да байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі абвінавачаны Акуліцкі 4 чэрвеня 1945 г. заявіў наступнае:

"Як камандуючы Арміяй Краёвай я прызнаю сябе поўнасцю адказным за тэрарыстычныя акты супраць афіцэраў і салдат Чырвонай Арміі, праведзеныя ўдзельнікамі Арміі Краёвай як на тэрыторыі Савецкага Саюза, г. зн. у заходніх абласцях Украіны і Беларусі, так і на тэрыторыі Польшчы".

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў чэкіста А. М. Нібуша:** "Восенню 1944 г. мне было загадана ўзначаліць аператыўна-вайсковую групу ў Запольскім сельсавеце Лідскага раёна. У складзе групы 3 аператыўныя работнікі дзяржбяспекі і 25 салдат з камандзірам. Мы дыслацыраваліся тады ў вёсцы Бельскія. Аднойчы ад мясцовых жыхараў даведваюся, што ў доме аднаго з гаспадароў хутара Рылаўцы захоўваецца вялікая колькасць нарабаванай маёмасці, у асноўным -- чырвонаармейскага абмундзіравання. У гэты ж дзень, а гэта было 13 кастрычніка, вырашыў пацікавіцца, наколькі адпавядае праўдзе атрыманая інфармацыя. Але перш чым з`явіцца ў дом Баркоўскага з вобыскам, вырашылі зрабіць ля хутара засаду і паназіраць. І правільна зрабілі.

Толькі пачало змяркацца, як з дома выйшаў чалавек і, аглянуўшыся навокал, паспяшаўся да лесу. Мы спрабавалі затрымаць, але безпаспяхова. Стала ясна: незнаёмец здавацца не збіраецца. Відаць, у свам рашэнні ён меў рацыю, бо чалавек гэты аказаўся адным з бліжэйшых памочнікаў "Рагнара" па мянушцы "Рыч". У нас, зразумела, заставалася адно выйсце. У сумцы забітага знайшлі важныя дакументы, у тым ліку і тыя, што вывелі на след "Рагнара".

Што мы ведалі пра "Рагнара" да інцыдэнту на хутары Рылаўцы? Бадай, нямала. Па нашых звестках, на пачатак паходу Арміі Краёвай на Вільню (ліпень 1944 г.) у яго абводзе разам з рэзервам налічвалася каля 3 тысяч чалавек. У раёне Вільні "Рагнар" адмовіўся ад заклiку савецкага камандавання здаць зброю. Больш таго, уступіў у бой з рэгулярнай часцю Чырвонай Арміі. У выніку значная частка сілаў яго атрада была рассеяна, а ён з рэшткамі акаўцаў (прыкладна 400 чалавек) вярнуўся ў Лідскі раён на месца ранейшай дыслакацыі.

Неадкладна правёў рэарганізацыю атрада. Многія перайшлі на легальнае становішча, вярнуліся да сваіх сем`яў, але зброю не здалі, схавалі. Другія таксама накіраваліся ў родныя мясціны, але хаваліся ў спецыяльна абсталяваных схронах і бункерах.

Пры сабе "Рагнар" пакінуў узброеную да зубоў ударную групу з 30 найбольш верных і праверaных акаўцаў. Для правядзення дыверсійных і тэрарыстычных актаў па меры неабходнасці ён прыцягваў "рэзервістаў". Пасля выканання задання яны вярталіся на месца свайго ранейшага пражывання або хаваліся дробнымі групамі.

Не буду падрабязна спыняцца на тых злачынствах і зверствах,

якія зрабіў атрад "Рагнара" на тэрыторыі Лідскага, Воранаўскага, былых Жалудоцкага і Радунскага раёнаў. Заўважу, што нават мне, сустрэламу вайну радавым у Беластоку, адступаламу да Масквы, усяго нагледзеўся на фронце, часцяком станавілася не па сабе, калі даводзілася бачыць "плады" яго суда і расправы над няўзброенымі людзьмі: рускімі, яўрэямі, украінцамі, беларусамі. Помсціў за супрацоўніцтва з Саветамі нават жанчынам.

Таму задачай нумар адзін з'явілася для нас знішчэнне ядра групы "Рагнара" і захоп яго самога. Мяркуючы па дакументах, канфіскаваных з сумкі забітага "Рыча", банда хавалася ў лясным масіве на стыку Лідскага і Жалудоцкага раёнаў. Гэтыя дадзеныя трэба было дакладна праверыць, вывучыць дасканала ўказаную мясцовасць, прадугледзець усе нюансы аперацыі і прыняць канчатковае рашэнне.

У сярэдзіне снежня, ноччу, разам з операупаўнаважаным Гарэлкіным і трыма салдатамі я падышоў да вёскі Клюкавічы. Ззаду заставаўся працяглы пераход і мы ад стомы літаральна валіліся з ног. Трэба было падумаць пра начлег. Салдат пакінулі ля знадворных пабудоў, а я з Гарэлкіным накіраваўся да аднаго з дамоў.

Пастукаў у дзверы, гаспадар пасля некаторай затрымкі адкрыў іх нам. Мы ўвайшлі ў дом, абсвяцілі пакой ліхтаром і ўбачылі чыесьці ногі, што тырчалі з-пад печы. Мы адразу ж скумекалі, што тут маем справу не з гульнёй у схованкі. Не без супраціўлення выцягнулі спрабавалага схавацца пад печкай чалавека. Ён быў узброены, але скарыстаць зброю ўжо не мог.

"З дому -- ні кроку!" -- даволі сурова папярэдзіў я гаспадара і заадно растлумачыў, што яму і сям'і пагражае, калі хаця б адна жывая душа даведаецца аб начным інцыдэнце. Абяззброенага канспіратара-няўдачніка мы даставілі ў мястэчка Беліца -- бліжэйшы гарнізон адной з нашых аператыўных груп -- і адразу дапыталі.

Як аказалася, перад намі -- "Пазуркевіч", ён жа падпаручнік Ежы Баклажэц, камандзір 11-й роты ў 4-ым батальёне АК, якім, як вядома, камандаваў "Рагнар". Забягаючы крыху наперад, адзначу, што пазней за зробленыя злачынствы "Пазуркевіч" будзе засуджаны да вышэйшай меры пакарання і публічна павешаны ў Лідзе ў канцы 1944 г. А ў ходзе допыту ён даў паказанні і назваў дакладнае месца схованкі "Рагнара".

Мы рашылі дзейнічаць не марудзячы і самастойна, не паспеўшы нават паведаміць у гараддзел НКДБ.

Група "Рагнара" размяшчалася ў армейскіх палатках у гушчары. Мы ўпотай акружылі месца стаянкі, але сілы свае, а было нас дзесьці 15 чалавек, яўна не разлічылі -- акаўцам удалося знікнуць.

Аднак "Рагнар" на гэты раз таксама пралічыўся. Ён, вядома ж, не ведаў, што "Пазуркевіч" у нашых руках і ўжо назваў другое магчымае месца схованкі. Таксама ў гушчары, за тры кіламетры на захад ад вёскі Ляснікі.

Да правядзення аперацыі прыцягнулі каля 400 салдатаў. Мы бясшумна стварылі трайное кальцо ачаплення. "Рагнар" зразумеў, што становішча бязвыхаднае, і вырашыў трымацца да апошняга. 20

снежня адбыўся кароткачасовы, але жорсткі і кровапралітны бой.

20 акаўцаў, у тым ліку і самога камандзіра, забілі ў перастрэлцы. Быў цяжка паранены, але заставаўся жывым 21-ы -- намеснік "Рагнара" "Табота". Паказанні даваць рашуча адмовіўся, памёр праз некаторы час у шпіталі. Пры разгроме групы "Рагнара" захапілі 80 ствалоў агнястрэльнай зброі, вялікую колькасць гранатаў, боепрыпасаў.

У выніку праведзенай аперацыі мы нанеслі адчувальны ўдар па польскаму нацыяналістычнаму падполлю, аднак, улічваючы аператыўныя абставіны, што склаліся да канца 1944 г., мы добра разумелі: да канчатковай перамогі яшчэ вельмі далёка".

Радкі змешчаных ніжэй дакументаў наглядна паказваюць усю складанасць становішча ў Заходняй Беларусі. Яны як бы падводзяць своеасаблівую рысу пад самым кравапралітным перыядам (ліпень 1944--1945 гг.) барацьбы з акаўскім, літоўскім і беларускім нацыяналістычным падполлем. Аб маштабах пошукавых і чэкісцка-вайсковых аперацый гавораць лічбы задзейнічаных у іх людзей: 18 палкоў НКУС агульнай колькасцю 25 тысяч чалавек. Плюс тэрытарыяльныя органы дзяржбяспекі і міліцыі і знішчальныя атрады з ліку былых партызан і партыйна-савецкага актыву. Як бачна з дакументаў, для ажыццяўлення кіраўніцтва ліквідацыяй антысавецкага узброенага падполля замест генерала Сярова восенню 1944 г. з Масквы прыбылі памагатыя Берыі генералы Кабулаў і Круглоў.

Хацелася б звярнуць увагу чытача на змешчаныя ў падборцы дакументаў вытрымкі з пратакала допыту былога афіцэра Беларускай краёвай абароны, члена Беларускай незалежніцкай партыі Глеба Багдановіча. Пасля абучэння ў нямецкай дыверсійна-разведвальнай школе, якая была створана для спецыяльнай падрыхтоўкі дыверсантаў з ліку беларускіх нацыяналістаў у мястэчку Дальвітс (Усходняя Прусія), у сярэдзіне лістапада 1944 г. Багдановіч у групе з 28 тэрарыстаў-дыверсантаў быў закінуты ў тыл Чырвонай Арміі для вядзення ўзброенай барацьбы. Пазней быў арыштаваны органамі дзяржбяспекі. Яго паказанні сведчаць аб тым, што беларускія нацыяналісты і акаўцы -- яшчэ нядаўна заклятыя ворагі -- у канцы вайны пайшлі на прымірэнне і аб'ядноўваліся для сумеснай барацьбы супраць "праклятых" Саветаў...

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ**

**З пісьма Л. Берыі ад 1 снежня 1944 г.**

**Тав. Сталіну І. В.**

**тав. Молатаву В. М.**

**Пра дзейнні ў заходніх абласцях Беларусі* бандгруп літоўскіх нацыяналістаў пад кіраўніцтвам так званага "Літоўскага нацыянальнага фронту" (блок буржуазных нацыянальных партый Літвы).**

---

* Асноўнай крыніцай папаўнення тэрарыстычных груп з'яўляліся тыя, хто дэзерціраваў і ўхіляўся ад службы ў Чырвонай Арміі. Па даных "Даведкі аб колькасці выяўленых дэзерціраў і тых, хто ўхіляўся ад службы ў Чырвонай Арміі", прадстаўленай Аддзелам па барацьбе з бандытызмам НКУС СССР, іх кантынгенты на Беларусі налічвалі: у 1943 г.: дэзерціраў --755 чал., хто ўхіліўся --333 чал., за 1-ю палавіну 1944 г. адпаведна 2396 і 902; усяго --4406 чалавек.

Па данных НКУС, у заходніх абласцях Беларускай ССР дзейнічае 80 польскіх бандгруп Арміі Краёвай і ў Літоўскай ССР -- 84 літоўскія і польскія бандгрупы. Пачасціліся напады на савецка-польскіх актывістаў, антысавецкая агітацыя.

НКУС СССР для арганізацыі мерапрыемстваў камандзіравала ў Літоўскую ССР -- Круглова, у Беларускую ССР -- Кабулава.

Для гэтых жа мэтаў НКУС СССР накіравала ў Беларускую ССР 13 палкоў войскаў НКУС агульнай колькасцю 6020 чалавек*.

Народны камісар унутраных спраў Саюза ССР

1 снежня 1944 г. Л. Берыя.

Б. КАБУЛАВУ,
С. БЕЛЬЧАНКА,
Л. ЦАНАВА**

Падтрымліваю мерапрыемствы па выяўленню ўдзельнікаў антысавецкіх арганізацыяў, ліквідацыі бандытызму і накіраванню ў лагеры НКУС. 3000 чал. вывезці ў Пячорлаг (ст. Абешч Паўночна-Пячорскай чыгункі--200 чал.), у Поўначдарлаг (ст. Княж. Пагост -- 1000 чал.).

Нарком унутраных спраў Саюза ССР Л. БЕРЫЯ.

13 снежня 1944 г.

СНК СССР таварышу Сталіну І. В.
СНК СССР таварышу Молатаву В. М.
ЦК ВКП(б) таварышу Маленкову Г. М.
№ 1089 б
17 верасня 1945 г.

НКУС Беларускай ССР паведамляе наступныя дадзеныя пра выніκі аперацыі па ачыстцы заходніх вобласцяў Беларусі ад бандзіцкага і антысавецкага нацыяналістычнага падполля.

З 1 жніўня па 1 верасня г.г. у выніку агентурных аператыўных мерапрыемстваў і чэкісцка-вайсковых аперацыяў арыштавана і затрымана 6.146 чалавек, у тым ліку бандзітаў — 219, бандсаўдзельнікаў -- 60, удзельнікаў антысавецкіх арганізацыяў -- 57, нямецкіх стаўленікаў, саўдзельнікаў і другога антысавецкага элементу -- 61, дэзерціраў і ўхілялых ад вайсковай службы -- 5741 чал. Акрамя таго, забіта бандзітаў -- 79, дабраахвотна з'явіліся ў органы НКУС -- 243.

Усяго за час правядзення аперацыяў з ліпеня 1944 г. да 1

---

* Праз два тыдні Л. Берыя далажыў, што пад кіраўніцтвам генерала Кабулава ў Заходняй Беларусі разам з НКУС і НКДБ Беларускай ССР С. Бельчанкам і Л. Цанавам было выяўлена і ліквідавана 288 антысавецкіх польскіх і беларускіх арганізацыяў. Арыштаваны 5069 іх удзельнікаў, 700 агентаў разведвальных органаў праціўніка, ліквідаваны 13 рэзідэнтур германскай разведкі. Удалося таксама ліквідаваць 800 удзельнікаў паўстанцкіх груп, затрымаць 1643 дэзерэіры, 48 000 тых, хто ўхіліўся ад прызыву ў Чырвоную Армію. У раёнах Брэста, Пінскай і Палескай вобласцяў, якія мяжуюцца з Украінскай ССР, былі ліквідаваны 11 паўстанцкіх груп, перайшоўшых з Валынскай і Ровенскай вобласцяў. Забіты 385 і захоплены ў палон 160 аунаўцаў.

** С. Бельчанка з'яўляўся наркомам унутраных спраў БССР, Л. Цанава -- наркомам дзяржбяспекі БССР.

верасня 1945 г. НКУС Беларускай ССР арыштавана і затрымана 97094 чал., у тым ліку бандзітаў -- 6514, бандсаўдзельнікаў -- 1036, удзельнікаў антысавецкіх арганізацыяў -- 651, нямецкіх стаўленнікаў і другога антысавецкага элементу -- 6141, дэзерціраў і ўхілялых ад службы ў Чырвонай Арміі -- 82752 чал. Забіта 3232 бандзітаў, дэзерціраў і другога антысавецкага элементу.

Акрамя таго, прыйшлі з пакаяннем 698 бандзітаў, 48188 дэзерціраў і ўхілялых ад мабілізацыі.

Пры правядзенні аперацыі канфіскавана: мінамётаў -- 62, ПТР -- 30, кулямётаў -- 657, аўтаматаў -- 1359, вінтовак -- 10485, рэвальвераў -- 771, гранатаў-- 1435, мінаў -- 1164, патронаў -- 94845, выбуховых рэчываў ---893 кг, рацыяў --12, радыёпрыёмнікаў --51.

Сярод злачынстваў—забойствы савецкіх і партыйных работнікаў, абрабаванне магазінаў, гаспадаркаў мясцовых жыхараў...

Л. БЕРЫЯ".

СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З пратакола допыту (31 кастрычніка 1949 г.) Г. Б. Багдановіча, год нараджэння 1913, ураджэнец г. Вільні, беларус, з мяшчан, адукацыя вышэйшая, урач.

Пытанне: Як вы выконвалі атрыманае ў разведшколе заданне?

Адказ: Скід нашай групы з самалёта адбыўся ў дрэнных метумовах, з вялікай вышыні і не ў той мясцовасці, дзе меркавалася, у выніку члены групы не змаглі сабрацца ва ўмоўленым месцы. Я асабіста пасля прызямлення сустрэўся з Вітушкам, радысткай Чэрамшагінай, Грыгарцэвічам і Шунько.

Пасля безвыніковых пошукаў другіх членаў групы на наступны дзень, 18 кастрычніка 1944 г., мы з дапамогай аднаго хутаранца даведаліся, што знаходзімся каля станцыі Салечнікі, г. зн. у 120 кіламетрах ад месца, дзе нас павінны былі скінуць.

Адначасова з гэтым мы вызначылі, што мясцовасць, дзе мы прызямліліся, кантралявалася савецкімі войскамі, пасля чаго вырашылі перабрацца ў Рудніцкую пушчу. Там 3 снежня 1944 г. мы былі затрыманы групай Арміі Краёвай, якую ўзначальваў "Комар" (прозвішча невядома.-- Я. С.). Вымушаны былі дзейнічаць па загаду кіраўнікоў АК і выконваць іх указанні.

Пытанне: Як да вас адносіліся кіраўнікі акаўскага антысавецкага падполля?

Адказ: Пасля нашага затрымання кіраўнік "Комара" паведаміў пра нас камандаванню Віленскай акругі АК, пасля чаго ў снежні 1944 г. да "Комара" прыбыў камандзір акругі "Корвель" (прозвішча невядома.-- Я. С.), якому Вітушка падрабязна расказаў пра нашы мэты. Пасля гэтага па загаду "Корвеля" мы былі залічаны ў банду "Комара", у яе складзе знаходзіліся да лютага 1945 г. 7 студзеня Вітушка быў забіты ў час баявога сутыкнення з савецкімі войскамі ў раёне возера Кернава. Потым мы былі перададзены ў другі атрад АК -- пад камандаваннем "Мысьлівага" (прозвішча невядома.--Я. С.).

Пытанне: Якую варожую дзейнасць вы праводзілі ў складзе польскага антысавецкага падполля?

Адказ: У час майго знаходжання ў групе "Комара" яе ўдзельнікі

правялі шэраг тэрарыстычных актаў супраць партыйна-савецкага актыву і ваеннаслужачых Савецкай Арміі, з якіх я памятаю наступныя: у снежні 1944 г. у Тургельскім раёне былі забіты старшыня сельсавета Васілеўкі, яго жонка і 14-гадовая дачка, у тым жа месяцы быў забіты адзін савецкі актывіст у вёсцы Руднікі.

У атрадзе "Мысьлівага" я знаходзіўся да красавіка 1944 г., пасля чаго захварэў і паўтара месяца хаваўся ў мясцовых жыхароў. За час майго знаходжання ў гэтым атрадзе, акрамя грабяжу мясцовага насельніцтва, тэракты не адбываліся. У маі 1945 г. я наладзіў сувязь з групай АК пад камандаваннем "Ляпюся", у яе складзе ў чэрвені 1945 г. нелегальна перайшоў граніцу СССР на тэрыторыі Польшчы.

Пытанне: Чым гэта было выклікана?

Адказ: К таму часу савецкімі войскамі быў знішчаны рад узброеных атрадаў польскага антысавецкага падполля, у сувязі з чым было атрымана ўказанне: з мэтай захавання кадраў перайсці на тэрыторыю Польшчы. Пры пераходзе граніцы мы былі заўважаныя савецкімі пагранічнікамі, з імі вялі бой".

## ПАСЛЯ ЗАГАДУ ПРА РОСПУСК АРМІІ КРАЁВАЙ

Радкі дакументаў бясстрасныя. Яны не могуць перадаць усю складанасць і драматызм абставін. І тое сказаць: у жніўні 1944 года толькі на тэрыторыі Гродзенскай вобласці (у яе цяперашніх межах) было каля 5 тысячаў акаўцаў, якія са зброяй у руках хаваліся ў лясах.

Акрамя таго, амаль у кожным населеным пункце, дзе пражывала каталіцкае насельніцтва, меліся рэзервовыя "пляцуўкі" АК, яны налічвалі ў залежнасці ад колькасці ў іх насельніцтва ад 3 да 20 чалавек. Яны ўсе захоўвалі зброю. Усяго, па падліках саміх кіраўнікоў штаба акругі Навагрудак, у Прынёманскім краі рэзерв АК ахапіў больш за 11 тысячаў чалавек.

"Пляцуўкі" былі аб`яднаны ў "плютоны" (узводы)-- гэта, як правіла, падпольныя арганізацыі на тэрыторыі аднаго ці двух сельсаветаў. У сваю чаргу "плютоны" ўваходзілі ў "кампаніі" (роты), "кампаніі" з`яўляліся састаўнымі часцямі "абвода", які ахопліваў прыкладна 2-3 раёны. У Гродзенскай вобласці меліся 4 такія "абводы". Такім чынам, чэкістам і міліцыі давялося мець справу з выдатна арганізаванай, з добра наладжанымі сувязямі, сеткай варожага для Саветаў падполля.

Як вядома, 19 студзеня 1945 г. брыгадны генерал Акуліцкі аддаў загад пра роспуск Арміі Краёвай і вызваліў яе членаў ад прынятай прысягі. На самай справе гэта быў толькі фармальны акт. АК лічылася распушчанай, але не спынялі сваю ўзброеную барацьбу акаўцы. Поўнасцю ці часткова захоўваючы на месцах, у тым ліку і ў Заходняй Беларусі, створаная раней арганізацыйныя структуры, яны толькі ў некаторай ступені відазмянілі формы барацьбы. Пра гэта недвухсэнсоўна гаворыць і змест самога загаду, аддадзенага

праз 2 дні пасля вызвалення Савецкай Арміяй Варшавы, ў той дзень, калі савецкія войскі вызвалілі старабытную сталіцу Польшчы -- Кракаў.

Заўважым, дарэчы, калі б не савецкія армейскія разведчыкі, якім праз вялікія страты і цяжкасці ўдалося перарэзаць, адключыць замініраваныя кабелі, не дапусціць немцаў да рубільнікаў, каб не імклівае наступленне "праклятых" Саветаў -- старабытнага прыгожага Кракава не існавала б на зямлі. Горад быў замініраваны так, што не ацалеў бы ніводзін вялікі дом. Пацярпеў бы больш за "пані Варшаву", Мінск, Дрэздэн.

Праклінаючы бальшавікоў, вылоўліваючы толькі мінусавае ў жыцці пад камуністамі, не трэба забываць вялікія плюсы. У цяперашняй Польшчы ўжо з'яўляюцца праблемы з заходнім суседам. Не выключана, іх будзе ўсё болей.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З загаду генерала Акуліцкага ("Нядзвядка") ад 19.01.1945 г.: "п. 1. Савецкае наступленне, якое развіваецца, можна прывесці ў кароткі час да заняцця ўсёй Польшчы Чырвонай Арміяй, што ў сапраўднасці азначае замену нямецкай акупацыі савецкай акупацыяй...**

**п. 2. Навязаная ў 1939 годзе вайна Польшчы не скончыцца перамогай Саветаў, яна скончыцца для нас толькі тады, калі мы дасягнем сваёй мэты...**

**п. 3. У змененых умовах новай акупацыі сваю дзейнасць мы павінны накіраваць на адраджэнне незалежнасці і абарону насельніцтва ад небяспекі.**

**п. 3. АК распушчана. Камандзіры не легалізуюцца. Салдатаў вызваліць ад прысягі, выплаціць двухмесячную дапамогу і законспіраваць. Зброю схаваць. Скампраментаваных (г. зн. дэканспіраваных.-- Я. С.) перавесці на іншыя тэрыторыі і законспіраваць. Пра рэшткі грашовых сродкаў і маёмасці данесці Руніку. Захаваць малыя, добра законспіраваныя штабы і ўсю радыёсетку. Трымайце сувязь са мной і дзейнічайце ў згодзе з апаратам дэлегатуры* ўрада".**

Загад, зразумела, выконваўся. Яго вынікі згубна адбіліся на лёсах многіх людзей. Аднак тут, відавочна, будзе дарэчы зрабіць невялікае тлумачэнне. Сёння тыя гады трэба разглядаць з рэалістычных пазіцый. Менавіта рэалістычны падыход дазваляе зрабіць цвёрды вывад: ніхто не стаў бы выконваць ні гэты, ні другі падобны загад, ад каго б яны ні зыходзілі, каб падполле не падтрымлівалася часткай мясцовага насельніцтва. Ніякія "Рагнары", "Сібіракі", "Завірухі" і прыбліжаныя не змаглі б пратрымацца і тыдзень, каб не было ніякой апоры.

Такая падтрымка была вялікая -- як у маральным, так і матэрыяльным плане. Ад простай чалавечай сімпатыі (там, у лесе, нашы браты па крыві і веры), да ўкрывальніцтва, збору і перадачы неабходнай інфармацыі, дапамогі харчаваннем, адзеннем і зброяй, якой за час ваеннага ліхалецця нямала асела ў вёсках і на хутарах.

Усё гэта вынік працяглай і масіраванай ідэалагічнай апрацоўкі

польскага і беларускага насельніцтва ў духу антысаветызму і нацыяналізму, у тым ліку і ў гады вайны.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў начальніка штаба акругі Навагрудак АК Станіслава Сэндзяка.** "Побач з прынятымі мерамі па матэрыяльнаму забеспячэнню не менш важнай для нас з'яўлялася маральная падрыхтоўка польскага насельніцтва, прыцягненне яго інтарэсу да будучай узноўленай дзяржавы. Шэф бюро інфармацыі і прапаганды доктар "Лігенза" (Станіслаў Ваўжыньчык), пражывалы ў Пагародна (цяпер Воранаўскі раён.-- Я. С.), аддаўся гэтай справе ўсёй душой.

У пачатку 1943 г. мы выдавалі для сваёй акругі друкаваны на шклографе ўласны "Інфармацыйны бюлетэнь". Адначасова "абводы" Шчучын, Ліда, Стоўбцы і Баранавічы мелі свае газеты, яны таксама друкаваліся на шклографах і выходзілі адзін раз у два тыдні.

Усе "абводы" штотыднёва размнажалі на пішучых машынках радыёзводкі, аднак попыт на друкаваную прадукцыю быў велізарны і ён не задавальняўся. Таму вырашылі закупіць друкарню (цяжка сказаць, што ў тых умовах разумелася пад словам "закупіць".-- Я. С.). План удаўся, месцаў для размяшчэння друкарні было дастаткова, і на пачатку 1944 г. акруга мела сваю газету "Сьвіт" ("Рассвет")- выданне для ўсёй навагрудскай зямлі. Пры гэтым мы зыходзілі з прынцыпу: "як бачыцца, так і пішацца". А тое, што выдаецца, сведчыць аб саліднасці выдаўца. Таму не шкадавалі грошай ні на друкарню, ні на паперу, і наш "Сьвіт"-- калі мець на ўвазе паліграфічнае выкананне,-- з'яўляўся адным з лепшых канспіратыўных выданняў у краі.

Да тых, хто быў больш за другіх звязаны з работай Бюро інфармацыі і прапаганды, належаў дэкан акругі ксёндз "Длугаш"-- Гедымін Пілецкі, пражываў у Германішках паблізу ад Воранава. На першапачатковым этапе нашай выдавецкай дзейнасці менавіта на калакольні яго касцёла знаходзіўся шклограф, на якім тыражыраваўся "Інфармацыйны бюлетэнь". Ксёндз "Длугаш" адчуваў вялікую цікавасць да тэхнікі, і ў двары яго дома знаходзіліся розныя станкі і варштаты, на якіх заўсёды штосьці свідравалі, дзяўбалі, чынілі, наладжвалі, канструявалі -- часцяком з удзелам самога ксяндза.

Калі ў маі 1944 г.. у суправаджэнні кавалерыйскага ўзвода я прыехаў у Германішкі на святочную месу, ксяндза ля алтара не застаў. Пасля доўгага чакання мы селі на коней і накіраваліся на яго пошукі. Як заўсёды, ксёндз "Длугаш" быў пры справе. Штосьці рамантаваў. Сардэчна павітаўся з намі, а калі я паказаў на гадзіннік і заўважыў, што паства чакае, ён сказаў: "Нічога страшнага. Ідзе вайна. Гэта ўсе павінны разумець. Зараз пераапрануся і прыйду".

1944 год застаў нас гатовымі да выканання заданняў, пастаўленых галоўнакамандаваннем. І што не менш важна -- мы былі гатовы крывёю абараняць інтарэсы нашага народа, асабліва на правым беразе Нёмана".

---

* Дэлегатура жонду -- прадстаўнікі польскага ўрада ў эміграцыі, якія былі надзелены кіраўніцкімі паўнамоцтвамі.

Аднак на паверку выйшла, што нічога, акрамя гора для народа, падобная "гатоўнасць" не абяцала, хоць, трэба прызнацца, у прапагандысцкім плане ідэолагамі Арміі Краёвай было зроблена нямала, каб падбухторваць "паству" на рэалізацыю сваіх авантурных планаў. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў варожая антысавецкая прапаганда і агітацыя з боку фарміраванняў АК не спынялася. Удзельнікі падполля займаліся выпускам і распаўсюджаннем сярод насельніцтва рознага роду пракламацый, лістовак і адозваў, што заклікалі да актыўнай барацьбы супраць Савецкай улады, праводжаных ёю мерапрыемстваў, да байкоту паставак харчавання для патрэбаў Савецкай Арміі, зрыву выбараў у Саветы дэпутатаў пацоўных і да т. п.

Пасля выяўлення і канфіскацыі ў 1945 г. органамі дзяржбяспекі апошняй падпольнай друкарні ўпор быў зроблены на вусную агітацыю, распаўсюджанне лжывых чуткаў, домыслаў. Усё гэта не праходзіла бясследна, давала плён. Пра тое, як праявіла сябе частка насельніцтва ў гэтай сітуацыі, можна знайсці мноства прыкладаў на старонках крымінальных спраў, ва ўспамінах чэкістаў-ветэранаў. Спынюся на некалькіх эпізодах.

У чэрвені 1945 г., як раз у тыя дні, калі ў Маскве праходзіў "Працэс 16-ці", інструктар Лідскага райкома партыі Падабед знаходзіўся ў камандзіроўцы ў Фалькавіцкім сельсавеце. Па дарозе ў вёску Табала разгубіўся -- затрымаў, абяззброіў яго і закрыў у свіране.

Не забудзем, што Саветы на ўдар адказвалі не проста ўдарам -- трайным ударам. Усе камуністы-пасаднікі (партыйныя работнікі, старшыні сельсаветаў, кіраўнікі раённых арганізацыяў) не толькі хадзілі з рэвальверамі. Яны абавязаныя былі актыўна абараняцца -- стралялі часта.

На выстрал ці пагрозу з аднаго боку чуліся тры выстралы з другога. Пры нязначным непадпарадкаванні ўзброены камуніст мог прымяняць зброю.

Праўда, перакосаў, а то і злачынстваў такія ўзбраенцы дапускалі нямала. Людзі ў вёсках і мястэчках гэта бачылі. Не адабралі. Але гэта ўжо другая тэма.

Падабед пайшоў у блізкі адсюль сельсавет, каб пазваніць у Ліду і паведаміць пра здарэнне. Тым часам група акаўцаў збіла з дзвярэй свірна замок, вызваліла "Доктара" і разам з ім накіравалася да сельсавета. Уварваліся ў будынак і на месцы расстралялі Падабеда, пазванілі ў міліцыю: з яўным здзекам распавядалі пра здарэнне. Аблілі газай будынак сельсавета, падпалілі, а самы зніклі. Да слова сказаць, "Доктара" ўдалося абясшкодзіць толькі праз чатыры гады.

А пакуль паставім пытанне: "Якім чынам, з чыёй дапамогай акаўцы даведаліся пра месцазнаходжанне Падабеда?"

Уся справа ў тым, што ў кожным населеным пункце, прычым у абодвух яго канцах, польскае нацыяналістычнае падполле мела сваю агентуру: яна неадкладна перадавала ўзброеным групам інфармацыю, якая іх цікавіла.

"Я ўпершыню сутыкнуўся з падобнай з`явай яшчэ пры

расследаванні справы "Вніма",-- успамінае А. М. Нібуш,-- і быў уражаны. Уявіце сабе: у складзе агентурнай сеткі "кампаніі" "Вніма" было 10 дзяўчат ва ўзросце 20--23 гадоў. Усе яны мелі псеўданімы, збіралі даныя пра савецкія часці, месцы іх дыслакацыі, дзеянні партыйна-савецкага актыву і гэтак далей. Часцяком сустракаліся са сваім рэзідэнтам у касцёле, перадавалі яму інфармацыю ў часе богаслужэння..."

Старшы оперупаўнаважаны Лідскага гараддзела МДБ лейтэнант Наскоў у ходзе правядзення чэкісцка-вайсковай аперацыі ў раёне вёскі Паперня вырашыў зайсці да даўняга знаёмага. Але не думаў не гадаў Іван Міхайлавіч, што ў гэтым доме спіць на ложку верхавод тэргрупы "Клён". У кухні гаспадар замітусіўся і прапанаваў госцю прайсці ў пакой. "Клён" ужо быў напагатове, падрыхтаваўся да сутычкі. Яму ў што б там.ні стала трэба было бясшумна расправіцца з Насковым і непрыкметна знікнуць.

Як толькі нічога не падазраваны афіцэр увайшоў у пакой, на яго напалі. У маўклівым рукапашным паядынку "Клён" спрабаваў вырваць з кабуры Наскова пісталет. Увесь час за мужчынамі-змагарамі назіраў гаспадар дома, нават пальцам не паварушыў, каб прыйсці на дапамогу чэкісту або, у крайнім выпадку, паклікаць людзей.

"Клён" нарэшце зразумеў, што адабраць пісталет у Наскова яму не ўдасца, смяротна раніў лейтэнанта са сваёй зброі, а сам стаў бегчы праз акно. Хутка быў забіты пры ўзброеным супраціўленні.

Нешта падобнае адбылося і з групай міліцыянераў з васьмі чалавек, якія выконвалі аператыўнае заданне па пошуку ўзброенай групы Станіслава Радзевіча па мянушцы "Слон". Праблукалыя працяглы час па заснежаных палях і пералесках, абследавалі шэраг населеных пунктаў, стомленыя да знямогі, яны вечарам падышлі да аднаго з хутароў вёскі Банцэвічы і спыніліся на начлег у Баніфата Макоры. Калі пасля вячэры разамлелыя ад цяпла і яды міліцыянеры пачалі драмаць, гаспадар выйшаў на двор. У яго ў хляве якраз і хавалася частка ўзброенай групы на чале з самім "Сланом". Ну, а спрыту ў справе правядзення тэрактаў падручным Радзевіча не трэба было займаць. У выніку -- усіх міліцыянераў расстралялі, трупы забітых па-звярынаму знявечылі, затым затапілі пад лёд ракі Дзітвы.

Што і казаць, вераломства ў нашым недасканалым свеце не рэдкасць. Усплёск здрады звычайна прыпадае на пераломныя моманты гісторыі, якім, уласна, і з`яўляўся апісаны перыяд. Ваююць ідэолагі, партыі, дзяржавы, а просты селянін, мястачковец, гараджанін хоча спакою. Не чапайце мяне. А яго чапаюць -- то адны, то другія.

Пад пагрозай расстрэлу змушваюць яго гаварыць, хаваць, забяспечваць. Для адных Баніфат Макора -- здраднік, пасобнік, для другіх -- герой, залаты чалавек.

А ён, на нашу думку, проста ратаваў сям`ю і сябе. Як мог. Ён не быў вінаваты, што апынуўся на перакрыжаванні варагоўных прыцэлаў. Не быў вінаваты. Але пацярпеў -- і сам, і сям`я.

Гэтаксама паводзіў сябе ранейшы гаспадар пры схватцы "Клёна" з лейтэнантам Насковым.

Мы, як лёгка заўважыць, стараемся паменей называць прозвішчы мясцовых людзей, змушаных памочнікаў АК. Шкадуем -- іх саміх, калі яны жывыя, іхніх родзічаў. Не трэба раны варушыць. Неразумны чытач былое пачне пераносіць на дзень сённяшні. А гэта рабіць нявapта.

Пры ліквідацыі падполля органам дзяржбяспекі ледзь не на кожным кроку прыходзілася сутыкацца з правакатарамі і двурушнікамі. Асаблівую небяспеку ўяўлялі тыя з іх, якім нячэсным шляхам удавалася ўцерціся ў давер да органаў улады і заняць тыя або іншыя адміністрацыйныя пасады.

Мяркуйце самі. Старшынёй Крупаўскага сельсавета працаваў Ян Букатка, ён адначасова з`яўляўся агентам тэргрупы, якой кіраваў былы асаднік і афіцэр Дурыс. На яе ліку было нямала злачынстваў -- забойства васьмі ваеннаслужачых на хутары Астроўля, работніка міліцыі ў вёсцы Верх-Ліда, падпалы адміністрацыйных і грамадскіх будынкаў і да т. п.

Менавіта па наводцы Букаткі людзі Дурыса ўчынілі зверскую расправу над сакратаром сельсавета Ірыный, з якой Букатка разам працаваў. Раней былі спробы перацягнуць сакратара на свой бок, да таго ж быццам і падстава для гэтага была. Яна жонка збеглага на Захад афіцэра АК, з даволі заможнай сям`і.

Але Ірына ад супрацоўніцтва катэгарычна адмовілася, за што і заплаціла жыццём. Пасля ліквідацыі Дурыса Букатка перайшоў на нелегельнае становішча і сам узначаліў дасталую яму ў спадчыну тэргрупу. Яна зрабіла 20 тэрарыстычных актаў, забіла 35 чалавек, сярод іх -- 4 старшыні сельсаветаў. Багата і менш значных злачынстваў. З дапамогай тэрору акаўцы імкнуліся не толькі фізічна знішчаць актыўных прыхільнікаў Савецкай улады, але і маральна прыгнятаць насельніцтва, каб не дапусціць яго ўдзелу ў будаўніцтве новага жыцця.

Такіх групаў, як ужо гаварылася, было шмат.

## АТАМАНШЫ

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З данясення: "26 ліпеня 1945 г. на шляху руху ў вёску Чараткі Аполінскага сельсавета была заўважана жанчына, што ўцякала ў бок кустоў. Па ёй адкрылі папераджальны вінтовачны агонь, пасля чаго яна была затрымана. Паказала дакументы на імя Цыгель Станіславы ... У працэсе далейшага апытання затрыманая назвалася Лялеўскай Юанай...**

**Оперупаўнаважаны Лідскага гараддзела НКДБ малодшы лейтэнант Худзякоў".**

Такім чынам, 30-гадовая Юана Лялеўская--Гадон, яна ж "Русалка", яна ж "Замеж"-- камендант "пляцувкі" № 311, атрыманай у спадчыну пасля арышту органамі дзяржбяспекі вядомага па "Працэсу 16-ці" "Завірухі".

Лялеўская менш за ўсё падобная была на знаёмых нам па кнігах

і фільмах атаманшаў часоў грамадзянскай вайны -- якую-небудзь Марусю або Галіну. Нарадзілася ў інтэлігентнай сям'і, бацька -- вядомы адвакат, скончыла Віленскую гімназію, перад вайной працавала настаўніцай, муж займаў адказную пасаду ў адміністрацыі Нясвіжскага павета, пазней афіцэр АК.

Прыгожая, мяккая, усміхлівая, а таксама па свайму выхаванню і адукацыі, яна была не раўня баявым паплечніцам бацькі Махно. Затое па-дзелавых якасцях наўрад ці адрознівалася ад сваіх "гістарычных" папярэдніцаў. Бязлітаснасць, жорсткасць былі ёй уласцівыя не ў меншай меры.

Знайшлося многа сведкаў, што праходзілі па справе Лялеўскай, яны сцвярджалі, што на допытах захопленых у палон работнікаў савецкіх органаў і актывістаў яна прымяняла асабліва вытанчаныя метады. Калі стала камендантам "пляцувкі" ў снежні 1944 года, першае, што зрабіла не пазбаўленая дзелавой хваткі Лялеўская (відаць, перадалася ў спадчыну ад бацькі-адваката) аблажыла падворным "аброкам" усе сялянскія гаспадаркі, падпалыя ў сферы яе ўплыву. Літаральна за некалькі тыдняў "для патрэбаў руху" было сабрана 14 тысяч рублёў і вялікая колькасць зерня. Калі хтосьці з сялянаў спрабаваў супраціўляцца ці наракаць з прычыны незаконных пабораў -- метад уціхамірвання непакорных прызнаваўся толькі адзін: дула пісталета пад нос. Маглі вывесці карову, калі пашкадаваў авечку.

**Па матэрыялах крымінальнай справы Лялеўскай-Гадон.** Група, пад кіраўніцтвам Лялеўскай, налічвала 22 чалавекі. На ўзбраенні мелі: 1 ручны кулямёт , 2 вінтоўкі, 8 аўтаматаў, 4 пісталеты. Удзельнікі групы 25 снежня 1945 г. у вёсцы Тубіловічы Аполінскага сельсавета забілі двух чырвонаармейцаў і аднаго паранілі.

У тым жа месяцы ўчынілі тэракты (забілі) над дырэктарам маёнтка Арашаны Янам Казінскім і жыхарам вёскі Бенькавічы Каэтанам Адамовічам. У сакавіку 1945 года тэргрупа "Іскра" з удзелам Лялеўскай расстраляла сям'ю Казлоўскіх у складзе 5 чалавек, трупы спалілі разам з домам і надворнымі пабудовамі. Каня, дзве каровы, цяля і парася забралі з сабой. У гэтым жа месяцы членамі групы Лялеўскай у раёне вёскі Вялікія Рэксці расстраляны тры мужчыны і адна жанчына -- так званыя "ўсходнікі", прыбылыя на Гродзеншчыну за набыццём прадуктаў.

Юана Лялеўская добра разумела, што рана ці позна за зробленае прыйдзецца атрымаць заслужанае пакаранне. Ведала, што яе асоба, як бы ні прыкрывалася псеўданімамі, трапіла ў поле зроку органаў бяспекі. Па ўзгадненню са сваім высокім начальствам, прыняла рашэнне перабрацца ў іншыя краі, каб на новым месцы працягваць работу ў "руху" з падвоенай энергіяй. Вось ужо і дакументы надзейныя аформлены на імя Станіславы Цыгель. Праз пару дзён апынулася б далёка ад месца ўчыненых пад яе кіраўніцтвам злачынстваў. Ды не выйшла -- недарэчная выпадковасць парушыла планы.

Кроў людская не вадзіца, не прападае. Лёс Лялеўскай яшчэ адно пацверджанне гэтай аксіёмы.

Не яна выпадкова папалася энкавэдзістам -- яе на волю не адпусцілі забітыя ёю.

Як сведчаць факты, у дзейнасць падполля было ўцягнута нямала дзяўчат і жанчын. Некаторыя з іх, як і Юана Лялеўская, узначалілі ўзброеныя групы. Адной з такіх груп у Гродзенскім раёне кіравала жанчына з дзіўнай мянушкай -- "Экземплярная". Правай рукой і першым памочнікам у яе быў сын. Разам са сваімі супольнікамі на працягу некалькіх гадоў яны ўтваралі цяжкія злачынствы -- забойствы, крадзяжы, падпалы. У ходзе ліквідацыі банды ў красавіку 1950 г. маці і сын былі затрыманы жывымі.

## ПЕРАЛОМНЫ 1948-ы

У 1944--1946 гг. акаўскія ўзброеныя фарміраванні сустрэлі такое рашучае супрацiўленне з боку органаў дзяржбяспекі, што, здавалася, вось-вось з імі будзе скончана назаўсёды. Бо, акрамя названых вышэй, ужо былі разгромлены атрады "Слана" (Станіслава Радзевіча), "Іскры" (Адама Лашакевіча), "Ветра" (прозвішча невядома), мноства дробных групаў.

Адначасова энкавэдзісты нанеслі моцны ўдар па рэзерву, пастаяннай крыніцы папаўнення радоў тэрарыстаў. Тым не менш наперадзе яшчэ была жорсткая, цяжкая барацьба.

Заканамерна ўзнікаюць пытанні: чаму нацыяналістычны рух мог існаваць так доўга? Што жывіла яго карані? Чаму замест ліквідаваных тэрарыстычных групаў з'яўляліся новыя?

Думаецца, адказы на іх трэба шукаць перш за ўсё ў крыўдах (не промахах), якія прынесла мясцоваму люду новая ўлада пасля верасня 1939 г. Пра гэтыя перакосы ўлады мы ўжо гаварылі.

Заходнікі не мірыліся. Памагала незамірэннію і тагачасная міжнародная абстаноўка.

Саветаў вось-вось павінны былі турнуць. А мо і раздавіць. Нашчэнт. Усім светам.

Давайце нагадаем.

Сакавік, 1946 год. Прамова лідэра брытанскіх кансерватараў Уінстана Чэрчыля ў амерыканскім горадзе Фултане паслужыла свайго роду сігналам да пачатку "халоднай вайны", развязванню псіхалагічных дыверсій, адкрытай палітычнай канфрантацыі з СССР і краінамі Усходняй Еўропы. Нацыяналістычныя колы многіх краінаў рэалізацыю сваіх задумаў ставілі ў прамую залежнасць ад іншаземнага ўзброенага ўмяшальніцтва. Калі заходнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі сталі на шлях "адкідвання камунізму", прыступілі да падрыхтоўкі планаў вайны супраць СССР, ажывіліся ўсе віды падполляў. Узмацнілася антысавецкая агітацыя, пачалі наладжвацца тайныя сходкі, выцягвацца з схронаў прыхаваная да пары да часу зброя...

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З дакладной запіскі начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МДБ сакратару Гродзенскага абкома КП(б)Б С. В. Прытыцкаму: "На тэрыторыі Ваўкавыскага, Мастоўскага і Зэльвенскага раёнаў актыўна дзейнічала бандгрупа 9-га Ваўкавыскага "абводу" АК, пад кіраўніцтвам каменданта гэтага "абводу" Браніслава Хвядука па мянушцы "Чэчаў". У яе складзе было 60 чалавек...

Для ліквідацыі тэрбанды "Чычава" была створана аператыўная група, якая ў кароткі тэрмін напала на след і абясшкодзіла банду, арыштавала пры гэтым каменданта 9-га "абводу" Хвядука Браніслава ("Чэчаў"), яго намесніка Вялічку Браніслава ("Адрэнчы"). Бандгрупай "Чэчава" зроблена 35 тэрарыстычных актаў, пры гэтым забіта 52 чалавекі, паранена 8".

**БЫЛО ГЭТА ТАК.** З успамінаў чэкіста В. М. Асеева: "Ішоў чэрвень 1948 г. Група бандытаў на чале з "Чэчавым" размясцілася ў адным з хлявоў у вёсцы Вайдзевічы Мастоўскага раёна. У гэтую ж вёску днём прыбылі агенты Мінзагу, маслапрома і фінагент. Бандзіты нечакана напалі на дваіх з іх. Агенту Мікалаенка ўдалося знікнуць. На месца здарэння з Ваўкавыска выехала спецгрупа. Пачаліся пошукі і праследаванне тэрарыстаў. Наступным днём удалося напасці на іх след.

На ноч яны размясціліся на лясным хутары Плішча Ваўкавыскага раёна. Іх паставы заўважыў аператыўную групу, што набліжалася да хутара, падняў банду па трывозе, яна непрыкметна знікла ў лесе. Аднак пры аглядзе хлява знайшлі на саломе пакінутую ў спешцы гранату Ф-1.

Пад сілай неабвержаных доказаў гаспадар хутара вымушаны быў прызнацца, што ў хляве хаваліся 22 бандыты, у тым ліку іх верхавод. Опергрупа разгарнулася ланцугом і пачала прачэсваць лес. У густой чашчобе завязаўся бой. У перастрэлцы былі забітыя трое --"Голуб", "Луста", "Каварны"-- і столькі ж паранена. Астатнія разбегліся, кінуўшы параненых супольнікаў. У час бою загінуў салдат унутраных войскаў.

Праз некалькі дзён на лясной паляне, паблізу вёскі Падбалоцце, знайшлі схрон, адкуль вылавілі двух удзельнікаў банды -- "Валадыеўскага" і "Чорнага". Прыкладна праз паўтара месяца большасць бандытаў злавілі. Заставаўся "Чэчаў" і сем супольнікаў.

У верасні 1948 г. нам стала вядома, што яны хаваюцца ў вёсцы Станілевічы Зэльвенскага раёна. На час затаіліся, але, як гаворыцца, голад -- не цётка.. Ноччу зрабілі вылазку і абрабавалі адзін з хутароў -- забралі прадукты харчавання, забілі парася ў двары, разабралі па частках і знеслі з сабой.

Асноўны склад опергрупы на досвітку акружыў дом, у якім пражывала сувязная 9-га Ваўкавыскага абвода "Ружа" (Ядвіга Мазец). Мне з трыма салдатамі было загадана ў гэты час праверыць дом непадалёку, дзе, па нашых даных, пражываў адзін з памагатых "Чэчава". У хляве мы наткнуліся на бандзітаў. Перастрэлка. Яны спрабавалі вырвацца з памяшкання і ўцячы, але падалі на двары,

скошаныя нашымі кулямі. А выстралы з адчыненых дзвярэй хлява ўсё яшчэ працягваюцца.

Я кінуў туды гранаты. Прагрымелі два магутныя выбухі. І тут жа пасылаю гаспадара дома ў хлеў з ультыматумам: "Застальым здацца!" Аднак "Гонар", брат "Чэчава", паранены, працягваў адстрэльвацца -- відаць, вырашыў трымацца да канца. У выніку -- забіты. Бой быў імклівы і хуткасны. Дваіх узялі жывымі, адзін з іх -- "Чэчаў".

**Па матэрыялах крымінальнай справы на Хвядука Б. І. ("Чэчава"). 1921 г. нараджэння, адукацыя --5 класаў.** Уступіў у банду ў красавіку 1945 г. У чэрвені гэтага ж года ўдзельнічаў у аграбленні магазіна ў в. Дындавічы. Прыкладна ў той жа час разам з супольнікамі затрымаў двух упаўнаважаных па нарыхтоўках і дэпутата сельскага Савета, якіх спачатку па-звярынаму пабілі, а затым расстралялі. З яго ўдзелам былі абрабаваны грамадзяне Дудук Уладыслаў, Почак Міхаіл, спалены надворныя пабудовы Камянка Станіслава.

Стаўшы камендантам 9-га Ваўкавыскага "абводу" АК, "Чэчаў" аддаваў загады пра паўстанцкія выступленні і заклікаў да сабатажу мерапрыемстваў Савецкай улады. У чэрвені 1946 г. "Чэчаў" у складзе бандгрупы ўчыняе забойства рабочага Крэшаніцкага спіртзавода Ярохіна, аграбіў двух афіцэраў Савецкай Арміі, завалодаў пры гэтым пісталетам ТТ і другой маёмасцю. Зімой 1947 г. бандгрупа пад кіраўніцтвам "Чэчава" зрабіла тэракт над старшынёй сельсавета Камойціным Эдвардам. У красавіку 1948 г. яны ж забілі байцоў Савецкай Арміі Свістуна і Багдановіча...

Прыгаворам Ваеннага трыбунала ад 21 лістапада 1948 г. Хвядук асуджаны па арт. 63-1, 70 УК БССР на 25 гадоў пазбаўлення волі. Адбываючы пакаранне, да 1962 года неаднаразова парушаў рэжым утрымання зняволеных, меў спагнанні. У 1964--1966 гг. адміністрацыяй калоніі прадстаўляўся на зніжэнне тэрміну пакарання, аднак з улікам цяжару зробленага ім у гэтым хадайніцтве суд адмовіў. Адбыў пакаранне больш за 23 гады. 10 снежня 1971 г. па вызначэнню Ваеннага трыбунала Прыволжскай акругі вызвалены са зняволення. Да апошняга часу пражываў у Рызе.

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З дакладных запісак начальніка абласнога ўпраўлення МДБ сакратару Гродзенскага абкома КП(б) Б С. В. Прытыцкаму: "На 1 студзеня 1948 г. у вобласці заставаліся неліквідаванымі 5 "абводаў" польскага нацыяналістычнага падполля Арміі Краёвай і 13 тэрарыстычных дыверсійных бандаў з агульнай колькасцю 215 чалавек. Сярод іх, у прыватнасці, тэргрупа пад кіраўніцтвам каменданта 10-га Гродзенскага "абводу" АК Няздзінскага Мечыслава па мянушцы "Морскі", ён жа "Нёман", і Міклашэвіча Іосіфа па мянушцы "Фаля". Колькасны склад атрада даходзіў да 60 чалавек. Ён дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскага. Сапоцкінскага, Скідзельскага раёнаў і прылеглай да іх тэрыторыі Літвы. У сучасны момант бандгрупа поўнасцю ліквідавана...**

**Пры ліквідацыі ўзброеных бандаў у 1948 г. захоплена: кулямётаў --10, аўтаматаў --7620, гранат --38, радыёпрыёмнікаў -- 2, пішучых машынак --2..."**

**З даклада Міністра ўнутраных спраў Саюза ССР С. Круглова на**

імя І. Сталіна, В. Молатава, Л. Берыі, Г. Маленкова, А. Кузняцова ад 13 верасня 1948 г.

... Усяго за час праведзенай работы па выкананню Указа* па стану на 30 жніўня г. г. агульнымі сходамі калгасаў і сялян выселены, а раённымі Саветамі дэпутатаў працоўных зацверджаны прыгаворы аб высяленні 23 156 чалавек, разам з імі выказалі жаданне выехаць 9207 членаў іх сем'яў: з Украінскай ССР выселена 8670 чал., далі згоду выехаць добраахвотна --2786 чал.; Беларускай -- 150--12...

Такім чынам, МУС СССР у адпаведнасці з Указамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 лютага і 2 чэрвеня 1948 г. усяго адпраўлена на спецпасяленні 230 869 чалавек, асуджаных да высялення, і членаў іх сем'яў, выказаўшых жаданне добраахвотна выехаць разам з выселенымі.

Міністр унутраных спраў Саюза ССР
С. КРУГЛОЎ.

## НЯЎЛОЎНЫ "ОЛЕХ"

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ.** З дакладной запіскі начальніка абласнога ўпраўлення МДБ сакратару Гродзенскага абкома КП(б) Б С. В. Прытыцкаму. "Удзельнікамі банды "Олеха" за перыяд з 1945 г. па чэрвень 1949 г. на тэрыторыі Ваўкавыскага, Лідскага, Жалудоцкага, Шчучынскага, Васілішкаўскага і Радунскага раёнаў зроблена 115 тэрарыстычных актаў над мясцовым насельніцтвам і актывам, зроблены аграбленні магазінаў сельпо..."

У запісцы гутарка ідзе, бадай, пра адно з самых буйных нацыяналістычных фарміраванняў -- як па радыусу дзеянняў і колькасці ўдзельнікаў, так і па ліку ўтвораных злачынстваў. Атрад "Олеха", створаны ў лютым 1945 г. на базе рэзервістаў "абводу" "Рагнара", налічваў адзін час 800 узброеных акаўцаў. Усе яны былі размеркаваны па асобных групах -- ад 10 да 50 чалавек, мелі сваіх камандзіраў, а агульнае кіраўніцтва ажыццяўляў штаб "Олеха" праз сувязных. Напрыклад, бандгрупай, што дзейнічала ў Васілішкаўскім раёне, кіраваў "Урубель", яго ж сын з'яўляўся ад'ютантам "Олеха". Адной з прычын таго, што "Олеху" ўдавалася гэтак доўга заставацца няўлоўным, паслужыла абраная ім тактыка пастаянных скрытых перамяшчэнняў з аднаго месца на другое. Прычым яго мянушкі мяняліся ў залежнасці ад таго, у якім раёне ён дзейнічаў.

Хто ж ён, няўлоўны "Олех", які прынёс гэтулькі бедаў і няшчасцяў людзям? Праглядаючы крымінальную справу Лялеўскай-Гадон, звярнуў увагу, што ў пратаколе яе допыту фігуруе "Олех". Ён быў названы як адзін з кіраўнікоў падполля АК акругі Навагрудак. "Олех" раней узначальваў атрад у колькасці да 60 чалавек, які ў

---

* Указ аб высяленні асоб, што ўхіляюцца ад працоўнай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы, асуджаных агульнымі сходамі калгасаў і сялян, быў выдадзены на падставе Пастановы Савета Міністраў СССР № 1841--730 ад 2 чэрвеня 1948 г

асноўным дзейнічаў уздоўж ракі Дзітва, пераходзячы з Шчучынскага раёна ў Лідскі і наадварот,-- паказала на допыце Ляляўская.-- Пасля забойства "Ружы" (Станіслава Круліка) замяніў яго на пасадзе каменданта "абводу-76", адначасова працягваючы камандавацъ узброеным атрадам. На выгляд яму прыкладна 35 гадоў. Воінскае званне -- паручнік. Прозвішча не ведаю. Чула, што да вайны працаваў настаўнікам у адной са школ Шчучынскага раёна..."

Канечне, Ляляўская не магла ведаць, што чэкістам пра "Олеха" да таго часу было вядома значна больш, чым яна расказала пра яго на допыце. Анатоль Радзівонік, ён жа "Олех", ён жа "Айцец", ён жа "Мрук", ён жа "Стары", 1916 г. нараджэння, родам з Ваўкавыскага раёна, прайшоў нядрэнную вывучку вядзення партызанскай барацьбы ў складзе ўдарнага кадравага батальёна АК, які прыбыў у сакавіку 1944 г. у беларускія лясы з-за Буга, удзельнічаў у акцыі па "захопу Вільна", ва ўзброеных сутычках з часцямі Савецкай Арміі. Такі ж паслужны спісак мелі і яго бліжэйшыя памочнікі.

**Па матэрыялах крымінальных спраў асобных удзельнікаў бандгрупы "Олеха".** 15 красавіка 1947 г. у вёсцы Баравыя Васілішкаўскага раёна забіты былы оперупаўнаважаны Васілішкаўскага РА МУС Якімовіч Мікалай і ўчастковы ўпаўнаважаны гэтага ж РА МУС Цімошкаў Уладзімір. Учынены тэракт над жыхарам вёскі Пескаўцы Ясюкайцісам. 7 верасня 1948 г. у вёсцы Савічы бандай "Олеха" забіты дэпутат Навадворскага сельсавета Хоміч, настаўніца Пурвіна і калгаснік Будзько. 22 верасня -- падпал жывёльнага двара ў калгасе імя Сталіна. 27 верасня забойства прадаўца магазіна в. Серафіны Лідскага раёна Серафімовіча Казіміра Іванавіча. У кастрычніку 1948 г. "Олех", камендант "абводаў" 49/76, назначыў сваім намеснікам Вітольда Маленчыка, ён жа "Цыган", ён жа "Мазепа", які раней удзельнічаў у дыверсіі на чыгунцы Ліда -- Баранавічы. Маленчык узначаліў тэрарыстычную групу ў колькасці 8 чалавек, якая займалася палітычным бандытызмам і ўзброеным грабяжом. У прыватнасці, 10 верасня ў вёсцы Вавюрка Лідскага раёна забіты работнік міністэрства нарыхтовак Тарасаў і абрабавана пошта, дзе ўкрадзена 24 тысячы рублёў, а ў сельсавеце спалены дакументы. 21 снежня 1948 г. у вёсцы Кудзеркі Шчучынскага раёна бандгрупай "Цыгана" забіты 10 чалавек. У вёсцы Вайнілаўцы абрабавалі грамадзяніна Шмігера -- адабралі 1000 рублёў і забралі кабана. Як вынікае з матэрыялаў крымінальных спраў, саўдзельнікі "Олеха" не шкадавалі нікога -- ні маладых, ні старых.

Але як умела ні маскіраваўся "Олех", як часта не мяняў свае мянушкі і канспіратыўныя хованкі, ў рэшце рэшт і яго напаткала заслужанае пакаранне. У канцы красавіка 1949 г. жыхары адной з вёсак, размешчанай на беразе ракі Лебяды, вярталіся на досвітку дадому з Усяночнай. Падыходзячы да сваіх дамоў, яны пачулі гучную пальбу з боку лесу, на ўскрайку якога пражывала каля дзесятка хутаран. Ніхто з удзельнікаў богаслужэння Вялікадня і дапусціць не мог, што на гэтых хутарах размясцілася на адпачынак частка банды "Олеха", у тым ліку і сам верхавод, і была атакавана аперпгрупай,

прыбылай з гарнізона Табала. Вынік аперацыі: забіты тэрарыст "Доктар", арыштаваны многія яго хаўруснікі, некаторыя з іх параненыя. Загінуў адзін чалавек з саставу опергрупы. "Олеху" і яшчэ 17 бандытам удалося ўцячы, але на гэты раз недалёка і ненадоўга. Прыкладна праз два тыдні, у лясным масіве ў раёне вёскі Бершты, кальцо ачаплення вакол "Олеха" і яго хаўруснікаў самкнулася канчаткова. Для правядзення аперацыі быў задзейснены полк унутраных войскаў. Жывым застаўся толькі ад'ютант "Олеха". Яшчэ раней былі абясшкоджаны "Цыган", Вацлаў Шварабовіч ("Кепура"), "Урубель", Станіслаў Апановіч ("Куліс") і іншыя найбольш актыўныя памочнікі "Олеха".

**СВЕДЧАЦЬ ДАКУМЕНТЫ. З дакладной запіскі начальніка абласнога ўпраўлення МДБ сакратару Гродзенскага абкома КП(б)Б С. В. Прытыцкаму. "Пасля ліквідацыі 12.5.1949 г. кіруючага штаба "абводаў" 69--76 нацыяналістычнай арганізацыі АК і тэрарыстычнай банды, пад кіраўніцтвам каменданта "абводаў" "Олеха", значная большасць насельніцтва Васілішкаўскага, Лідскага, Шчучынскага, Жалудоцкага і Радунскага раёнаў Гродзенскай вобласці, на тэрыторыі якіх працяглы час дзейнічала банда "Олеха", сустрэла гэтую вестку патрыятычнымі выказваннямі ўдзячнасці Савецкай уладзе за гарантыю бяспекі пражывання...**

**Пасля разгрому тэрбанды "Олеха" партыйна-савецкія актывісты ў Касцянеўскім, Васілішкаўскім, Шайбакпольскім і Навадворскім сельсаветах Васілішкаўскага раёна правялі агульныя сходы сялян, растлумачальную работу па выкрыццю нацыяналістычнага падполля і яго бандгрупаў".**

## ВЯРТАННЕ НЕЛЕГАЛАЎ

З цягам часу тэрарысты з нацыяналістычнага падполля пачалі губляць арэол "змагароў за нацыянальную ідэю" нават у вачах сваіх заўзятых прыхільнікаў, не гаворачы ўжо пра "сімпатыкаў", г. зн. проста спачувальных. Яно і зразумела. Кожны чалавек цвярозага розуму бачыў, што дзень за днём "нацыянальныя вызваліцелі" ўсё больш становяцца бандамі рабаўнікоў і забойцаў, усё часцей дзейнічаюць самымі звычайнымі крымінальнымі метадамі. Часам гэтая "дзейнасць" праяўлялася ў выглядзе асобных хуліганскіх і антыграмадскіх выступленняў. І якімі б прыгожымі лозунгамі ні прыкрываліся верхаводы падполля, асноўнымі матывамі іх паводзінаў заставалася імкненне вярнуць страчаныя фальваркі і саслоўныя прывілеі. У сваю чаргу тупік адчулі і многія з тых, хто падманам або пад страхам расправы быў уцягнуты ва ўзброеную барацьбу. Трэба мець на ўвазе і той факт, што двойчы, у 1945 і 1947 гг., аб'яўлялася поўная амністыя тым, хто складзе зброю, з поўным дараваннем нават цяжкіх памылак і злачынстваў. Да таго ж 26 мая 1947 г. быў прыняты Указ "Аб адмене смяротнага пакарання".

Гэтую сітуацыю спрабавалі актыўна выкарыстаць партыйныя органы, ідэалагічны актыў. Яны праводзілі настойлівую растлумачальную работу, перш за ўсё сярод родзічаў пайшоўшых у лясы, прапануючы ўсім удзельнікам узброеных фарміраванняў вярнуцца да мірнага і вартага працоўнага жыцця. Побач з вуснай агітацыяй для гэтай мэты даволі інтэнсіўна выкарыстоўваліся друк і радыё. Дастаткова сказаць, што ў 1945--1948 гг. толькі ў газетах Гродзеншчыны было апублікавана 258 артыкулаў, перадана сотні радыёзваротаў, у якіх заклікалі нацыяналістаў да спынення варожай дзейнасці, выхаду з нелегальнага становішча. У зоне асаблівай увагі ідэалагічных кадраў і актыву былі раёны і сельсаветы з найбольш складанымі аператыўнымі абставінамі. Туды для агітацыйна-прапагандысцкай работы партыйныя органы накіроўвалі ў працяглыя камандзіроўкі найбольш падрыхтаваныя і сталыя кадры, як правіла, былых франтавікоў і партызан. Усе гэтыя намаганні несумненна давала свой плён.

"Толькі ў адным Тракельскім сельсавеце з падполля выйшла 35 нелегалаў,--успамінае чэкіст У. С. Казьянін.-- А пачалося з таго, што я пазнаёміўся з сям`ёй аднаго акаўца. Бачу: сумленныя, працалюбівыя людзі. Пагутарыў адзін раз, што называецца, па душах, другі, трэці... А потым і кажу неяк: да якога часу, маўляў, ваш гаспадар будзе па лясах бадзяцца. Пара ўжо і за розум брацца, сям`і памагаць. Жанчына паабяцала перадаць нашу гутарку мужу. І калі я зайшоў у чарговы раз да іх у дом, яна мне яшчэ ля парога заяўляе: было ні было -- рашыўся, нарэшце. І -- з-за печы выходзіць мужчына, аказваецца, там для яго схрон быў абсталяваны. Калі я пакінуў іх дом, ён яшчэ з кіламетр за мною па пятах ішоў -- усё дапытваўся, ці пасадзяць яго. Не, нікога з 35 не пасадзілі..."

Так людзі на свае вочы пераканаліся, што ўсе, хто выйшаў з нелегальнага становішча і здаў зброю, рэпрэсіям не падвяргаліся. К канцу 1951 г. да мірнага жыцця ў Гродзенскай вобласці вярнуліся каля дзвюх тысяч былых акаўцаў. Некаторыя, з дазволу адпаведных органаў, паехалі на пастаяннае месцажыхарства за мяжу, другія ж засталіся, прыступілі да працы ў разнастайных галінах народнай гаспадаркі. Праўда, працэс вяртання нелегалаў праходзіў нялёгка. Кіраўнікі нацыяналістычнага падполля катэгарычна забаранялі выходзіць з нелегальнага становішча, рабілі ўсё ад іх залежнае, каб перашкодзіць гэтаму працэсу, у тым ліку і жорстка каралі "адступнікаў". Асабліва стараўся ў гэтым камендант рэзервовага "абводу" горада Ліды Мечыслаў Гурскі. Часам справа даходзіла да зверскіх забойстваў тых, хто рашыў легалізавацца. Менавіта па гэтай прычыне, напрыклад, загінуў адзін з былых актыўных акаўцаў- - Ян Вадэйка. Нельга не браць у разлік і той момант, што значная частка ўдзельнікаў нацыяналістычнага руху, асабліва тыя з іх, за якімі цягнуўся шлейф крывавых злачынстваў, ні пад якой прычынай не захацелі выйсці з падполля.

# СВОЙ СЯРОД ЧУЖЫХ

**БЫЛО ГЭТА ТАК. З успамінаў чэкіста У. Я. Сцёпіна.** Я здаў свой аўтамат у кастрычніку 1952 г. Колькі ж гадоў я з ім не расставаўся? Ды не меней дзесяці. Вы ведаеце, сёння шмат нядобрых слоў можна пачуць у адрас супрацоўнікаў дзяржбяспекі -- са старонак друку, тэлебачання; проста ў гутарках... Сапраўды, няма і не можа быць апраўдання злачынствам часоў культу асобы, тым, хто непасрэдна ажыццяўляў рэпрэсіі, чыніў дэспатызм і беззаконнасць, парушаў правы і інтарэсы людзей. Але, паверце, да слёз крыўдна чуць, калі ідзе агульнае шальмаванне ўсіх пагалоўна чэкістаў. Забываюць пра тое, што ў 30-я гг. менавіта яны былі аднымі з першых знішчаны і выгнаны з работы -- людзі, якія прайшлі школу падполля, рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, у тым ліку разведчыкі, што выконвалі адказныя задачы за рубяжом.

На маіх вачах гінулі баявыя таварышы -- і на фронце, і ад бандыцкіх куль. І памяць пра іх зараз таксама камусьці вельмі хацелася б апаганіць. А за што? За тое, што аддавалі свае маладыя жыцці, каб на нашай зямлі хутчэй усталявалася цішыня і спакой. Вось і тут, у заходніх абласцях, барацьба ішла жорсткая, бязлітасная, смяротная. Мы, аператыўныя работнікі абласнога ўпраўлення МДБ, месяцамі знаходзіліся ў так званых гарнізонах з 15--20 чалавек, размешчаных у самых гарачых і неспакойных кропках, як правіла, у глухіх месцах, побач з непраходнымі лясnымі масівамі, дзе маглі знайсці прыстанак бандыты. Адарваныя бездарожжам і адлегласцю ад нармальных, чалавечых умоў існавання, мы, бывала, арганізоўвалі засады, суткамі моклі ў балоце, пакутавалі ад камароў, машкары, холаду. І нядзіўна, што многія мае баявыя таварышы падарвалі здароўе ў маладым узросце, пераносілі найцяжэйшыя нервовыя перагрузкі і так рана пакінулі жыццё.

Такая вось была наша чэкісцкая служба. І калі мяне сёння хтосьці хоча паставіць на адну дошку з тымі, хто фабрыкаваў справы, седзячы ў цёплым маскоўскім кабінеце, крычаць ад абурэння хочацца: "Таварышы дарагія, ды што ж гэта такое?! Мы ж сорак гадоў назад, рызыкуючы жыццём, не шкадуючы здароўя, ад кулі бандыцкай вас засцерагалі. А цяпер, выходзіць, вось яна якая, удзячнасць?" Лічу, што людзі павінны ведаць праўду і дакладна ўяўляць, каго аддаваць астракізму, а каго ўшанаваць за яго неверагодна складаную, вельмі небяспечную, проста страшэнную працу. Я пачаў сваё апавяданне з напамінку пра тое, калі здаў свой аўтамат. На вялікі жаль, у тыя, яшчэ не такія далёкія часы часта даводзілася пускаць яго ў справу. Кажу "на вялікі жаль" таму, што ў пасляваенныя гады ў аператыўныя групы ўваходзілі салдаты, сяржанты -- маладыя, неабстраляныя хлопцы. Балюча і цяжка ўспамінаць, як у ходзе правядзення чэкісцка-вайсковых аперацый некаторыя з іх загінулі, яшчэ так і не паспелі па-сапраўднаму панюхаць пораху. І ўсё ж не зброя з'яўлялася самай галоўнай

падмогай у нашай барацьбе. Якраз наадварот -- ад нас, чэкістаў, патрабавалася зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб як мага радзей узнікала неабходнасць прымяняць аўтаматы, каб як мага меней было праліта чалавечай крыві.

Патрэбны былі і дакладны разлік, і дасканале веданне абставін, і ўменне абаперціся на патрыятычна настроенае мясцовае насельніцтва, і хітрасць, кемлівасць у выяўленні актыўных бандхаўруснікаў. Асобага падыходу патрабавалі тыя людзі, якія аддавалі бандытам прадукты харчавання, адзенне, коней пад прымусам, у поўнай меры адчуваючы на сабе недвухсэнсавыя пагрозы, а то і прамы тэрор. З-за страху за сваё жыццё, а таксама жыццё родных і блізкіх той-сёй вымушаны быў нават хаваць нязваных гасцей. Ды і як не баяцца! Я аднойчы прымаў удзел у расследаванні беспрэцэнэнтнага нават па тых жорсткіх часах злачынства: у сям'і з дзевяці чалавек было знішчана восем. Уцалеў толькі адзін з сыноў старшыні сельсавета, які ў час тэракту знаходзіўся на аднаўленні шахтаў у Данбасе. Між тым, калі гэты сын вярнуўся ў родныя мясціны, такой жудасцю на яго павеяла ад свайго разбуранага гнязда, што ў бацькоўскім доме проста не змог жыць. Праўда, і на чужыну не паехаў -- пабудаваў сабе новы дом і жыве там да гэтага часу. Не хачу называць прозвішча гэтага няшчаснага чалавека і ўказваць мясцовасць таму, што не варта лішні раз верадзіць яму незажыўную душэўную рану. Да таго ж у той вёсцы да гэтага часу пражываюць родныя і блізкія тых, хто ўтварыў злачынства. Дык навошта сеяць варожасць паміж аднасяльчанамі?!

Што і казаць, успаміны пра трагізм мінулых падзеяў, сведкам і ўдзельнікам якіх давялося быць, і цяпер, праз шмат гадоў, прымушаюць хвалявацца і як занава ўсё перажыць. Ну, а тады праяўляць эмоцыі было неяк не прынята, знешне, прынамсі. На ўсе глядзелі перш-наперш вачыма прафесіяналаў, нездарма мы самі сябе жартам называлі "бандаловамі". Унікалі, супастаўлялі, аналізавалі, і, нарэшце, прымалі рашэнні, разумелі, што памыліцца нельга -- гэта можа камусьці каштаваць жыцця. На няшчасце, не абыходзілася без памылак -- з-за гэтага і даводзілася хаваць забітых таварышаў.

Але здаралася, праводзілі аперацыю, што называецца, ні сучка ні задзірынкі. У прыватнасці, менавіта так яна завяршылася ў раёне ракі Котра, калі нам удалося без адзінай страты абясшкодзіць банду "Гражуоліса". Яна базіравалася ў Варэнскім раёне Літвы, але часцяком лютавала на нашай тэрыторыі. Мы выйшлі на чалавека, у якога з "Гражуолісам" былі свае разлікі -- ад рук бандытаў загінуў яго дваюрадны брат. Чалавек той пражываў ля самага краю пушчы, таму магчымасць паяўлення "Гражуоліса" на хутары была амаль стопрацэнтнай. Так яно і выйшла. Гаспадар аказаўся на рэдкасць гасцінным, пяцёра прыблудаў з Літвы былі вельмі задаволены гасцінным прыёмам і шчодрым пачастункам. Калі мы прыехалі на ўзлесак, верхавод банды і яго бліжэйшыя падручныя спалі непрытомным сном. Мы пагрузілі іх на машыну і паехалі. Але гэта яшчэ паўсправы. Трэба было засцерагчы ад небяспекі гаспадара,

адвесці ад яго самыя маленькія падазрэнні -- бо на волі ящчэ засталася частка бандытаў. Таму за якія-небудзь 20 кіламетраў ад хутара нашы салдаты адкрылі моцную стральбу, інсцэніравалі сутычку з бандай. Потым мы праехалі па некалькіх вёсках, каб мясцовыя жыхары маглі пераканацца: адбыўся бой -- і ў кузаве пяцёра забітых. І толькі праз некалькі гадзін, калі машына ўехала на двор Гродзенскай турмы, першым апрытомнеў "Гражуоліс".

Прыкладна тое ж самае адбылося з ядром банды "Бяржыса" на тэрыторыі былога Радунскага раёна. Аднак, бадай, самы складаны момант чэкісцкай работы ў той час і пры тых абставінах -- гэта ўкараненне у склад тэрбандрупы нашага чалавека для яе ліквідацыі. У правядзенні такой аперацыі мне давялося прыняць удзел. Самая галоўная складанасць заключалася ў падборы патрэбнага чалавека. Думаю, ясна чаму. Каб бандыты камусьці паверылі, канчаткова прынялі за свайго, кандыдатура павінна была поўнасцю адпавядаць усім уяўленням аб шчырым "аднаверцы", а менавіта: адданасць нацыянальнай ідэі, лютая нянавісць да Савецкай улады, наяўнасць канфлікту з гэтай уладай, рашучасць змагацца з ёю са зброяй у руках і г. д. Да таго ж чалавеку з падобнай рэпутацыяй трэба было быць асабіста добра вядомым аднаму ці некалькім удзельнікам бандгрупы, або, на благі канец, іх верным памагатым. Вось і паспрабуй знайсці такую кандыдатуру! Аднак шукалі і знаходзілі.

Характэрна ў гэтым сэнсе ліквідацыя бандгрупы "Сенка". Мы ўшчыльную заняліся ёю ў 1951 г. пасля таго, як пакончылі ў Гродзенскім раёне з тэрарыстычнымі фарміраваннямі "Семпа" і "Сосны". Мы -- гэта аператыўная група ў складзе маёра Нілава, старшых лейтэнантаў Манучарава, Пяроўскага і мяне, тады таксама старшага лейтэнанта. Акрамя таго, у наша падначаленне перадалі 25 салдат унутраных войскаў. Па-першае, пастараліся выгнаць бандытаў з лясных схронаў. Схрон уяўляе крыты прасторны падвал, выкапаны ў зямлі для жылля і ўкрыцця і закамуфліраваны зверху дзёрнам, а над векам, зноў-такі для камуфляжу, магла, скажам, тырчаць сухая сасна. Пройдзеш па такому месцу і, калі загадзя не ведаеш, не здагадаешся, што ў цябе пад нагамі. Выкурваць насельнікаў схронаў таксама трэба мець спрыт: проста так не сунешся -- куля ў лоб. Трэба ўлічыць і той факт, што некаторым з гэтых насельнікаў губляць не было чаго -- занадта важкім аказваўся іх паслужны крывавы спіс, таму і трымаліся да апошняга. Між іншым, не пажадаўшы здацца, менавіта ў схроне скончыў самагубствам былы акаўскі афіцэр, мацёры тэрарыст "Семп" (па некаторых звестках, падхаружы Альгерд Заржыцкі, ён жа "Аркан" -- былы кіраўнік дыверсійнай групы акругі АК Беласток .-- Я. С.). Так што пры выяўленні падобных сховішчаў, перш чым спусціцца ў яго, для вернасці кідалі гранату.

Аднак бліжэй да "Сенка". Пасля неаднаразовага прачэсвання ляснога масіву вакол Старой і Новай Руды-- месцаў дыслакацыі банды -- мы прымусілі "Сенка" і яго падначаленых пакінуць схроны і безупынна шастаць па лясах, пастаянна мяняць месцы стаянкі, ратуючыся ад пагоні. Адначасова выявілі і арыштавалі найбольш актыўных бандсаўдзельнікаў з навакольных вёсак. Тым не менш ядро групы "Сенка" ўсё яшчэ заставалася на свабодзе і працягвала рабіць злачынствы. Але да таго часу ў банду ўжо быў засланы свой чалавек. Па зразумелых прычынах я не магу адкрыць яго сапраўднае прозвішча і надалей буду ўмоўна называць "Раман". Мусіць, няма сэнсу шмат гаварыць пра тое, як мы зрабілі свой выбар на ім, тым болей, раней я ўжо адзначаў, наколькі гэта архіскладаная справа. Карацей, "Раман" з пэўнага моманту павёў сябе так, што неўзабаве аказаўся пад "пагрозай арышту" і яму нічога не заставалася, як перайсці на нелегальнае становішча. Але і пасля гэтага нам у глыбокай тайне прыходзілася сустракацца з ім і накіроўваць яго далейшыя дзеянні -- бо самы малы неасцярожны крок пагражаў яму смерцю.

У сакавіку 1952 года "Раман" па нашаму жаданню сустрэўся з родзічам "Лёдзі" -- бліжэйшай памочніцы і сувязной "Сенка". Праз некаторы час "Рамана" прынялі за свайго, і "Лёдзя" прывяла яго да схрону. Праўда, "Сенк" яшчэ не раз правяраў "Рамана", перш чым канчаткова даверыцца яму. І вось мы атрымалі ад яго першы сігнал пра тое, што ўдзельнік бандгрупы Ясюкевіч у бліжэйшы час наведае сваіх родных на хутары Паляны. Мы зрабілі там засаду, але выйшла асечка -- узяць Ясюкевіча без шуму не ўдалося, ён адкрыў стральбу, і банда, якая ішла за ім, знікла. У сярэдзіне мая "Раман" зноў выйшаў на сувязь і паведаміў, што ў бліжэйшыя 2--3 дні "Сенк" са сваёй групай пяройдзе ў наваколле вёскі Янотавічы. З гэтага моманту ля месца тайнай сувязі з "Раманам" я і мой калега Пяроўскі знаходзіліся пастаянна.

18 мая "Раман" сказаў, што банда размясцілася ў лясным урочышчы -- прыкладна за 500 метраў ад вёскі Янотавічы. Адначасова ён указаў нам арыенцір -- высокую сасну сярод дробнага лесу. Адносна далейшых намераў "Сенка" "Раман" паведаміў, што ноччу банда збіраецца пераправіцца праз Нёман і адысці на тэрыторыю Літвы. Пяроўскі гэтыя даныя неадкладна перадаў па рацыі ў опергрупу. Маёр Нілаў адразу ж выдзеліў групы ачаплення і захопу. Тым часам "Сенк" вырашыў паслаць на разведку ў вёску "Лёдзю", але тая, быццам адчуўшы штосьці нядобрае, ісці рашуча адмовілася. Тады ён накіраваў туды "Рамана", які лёгка і хутка знайшоў нашу засаду.

Мы тут жа пераапранулі яго ў вайсковую форму і далі ў рукі аўтамат. Каб рухацца як мага цішэй, усе ўдзельнікі групы захопу знялі боты і крадком накіраваліся да лесу. Вось, нарэшце, мы прыбылі на ўказанае "Раманам" месца. Сяржант Бескудзелін пачаў паўзком прабірацца наперад, каб бясшумна зняць часавога. Але ў апошняе імгненне той заўважыў сяржанта і выстраліў. Завязаўся бой, у выніку чацвёра бандытаў былі забіты. Астатніх, у тым ліку і

"Сенка", узялі жывымі. Так на Гродзеншчыне былі ліквідавана апошняя бандгрупа, якая на працягу васьмі гадоў тэрарызавала мясцовае насельніцтва.

## ТЭРОР І ЯГО АХВЯРЫ

Час далёка адсунуў апісваныя падзеі. Мінулі гады, дзесяцігоддзі, і тым, хто нарадзіўся ў тую пару, калі ў лясах і на хутарах гучалі выстралы, бандыты грамілі будынкі сельсаветаў і яшчэ неакрэплых калгасаў, знішчалі другія грамадскія пабудовы, палілі дамы актывістаў, выводзілі са строю сельгастэхніку, разбуралі сродкі сувязі, ўжо за сорак. І хтосьці можа сказаць: сам час сцёр усе сляды -- дык ці варта варушыць мінулае, корпацца ў архівах, напамінаць чытачу пра тое, што знікла беззваротна? Так, час сцірае сляды. Але так ужо арганізавана чалавечая памяць, што нікому і ніколі не ўдасца вытравіць з яе мінулае, жывую нашу гісторыю, тым болей, тыя яе адрэзкі, якія да краёў запоўнены трагічнымі падзеямі. Народ ніколі не забудзе ахвяр тэрору, ад каго б ён ні зыходзіў і якімі б лозунгамі ні прыкрываўся.

Старонкі дакументаў, паказваючых барацьбу з нацыяналістычным падполлем, прасякнуты сумнымі матывамі. Пра многія трагедыі скалечаных чалавечых лёсаў ужо нямала сказана вышэй. А вось перада мной яшчэ адзін журботны спіс: 2.08.1944 г. невядомай бандгрупай забіты рэдактар Іеўеўскай раённай газеты Міхал Лявонавіч Бікман; 1.10.1944 г.-- забіты першы сакратар Ашмянскага райкома камсамол Васіль Дзмітравіч Сюксін; красавік 1945 г.-- удзельнікамі тэрбанды "Вертэр" забіты дэпутат Некрашынскага сельсавета Іўеўскага раёна Кузьма і яго жонка; 27.08.1945 г.-- каля вёскі Навасёлкі Лідскага раёна забіты адказны работнік апарату ЦК КП(б)Б Т. І. Максіменка і інструктар Лідскага райкома партыі В. К. Варфаламееў у часе камандзіроўкі; 12.10.1945 г.-- зроблены тэракт над жыхарам вёскі Гатуўка Воранаўскага раёна В. П. Маркевічам і яго жонкай Юанай; 1.09.1946 г.-- забіты дырэктар Юрацішкаўскай МТС П. М. Чуднеў; 30.11.1946 г.-- бандай Белавуса забіты жыхары вёскі Атубалі Воранаўскага раёна Станіслаў Акштулевіч і яго дачка Станіслава; 21.12.1946 г.-- забіты сакратар Іўеўскага райкома камсамола Э. О. Шэйбак; 24.04.1947 г.-- забіты старшыня Васілішкаўскага райплана А. С. Жырбутовіч; 17.05.1947 г. бандай Жаймоцеля забіты старшыня Некрашынскага сельсавета Іўеўскага раёна Н. П. Варанчук і яго жонка Ася; верасень 1944 г.-- забітыя бухгалтар Радунскага райфо А. М. Асіповіч і яго дзеці -- Браніслаў і Яўгенія; 4.02.1948 г.-- удзельнікамі банды "Олеха" забіты намеснік старшыні Васілішкаўскага райвыканкама М. В. Міхалёў; 23 чэрвеня 1948 г.-- тэрбандай "Браварскага" забітыя пагранічнікі Цітоў і Крыванос.

Нават з гэтага невялікага спіса добра бачна, якія розныя людзі гінулі -- па ўзросту і роду заняткаў, нацыянальнасці і веравызнанню... Але было ў іх і шмат агульнага -- жылі з верай у заўтрашні дзень, сумленна працавалі і служылі, аднаўлялі разбураныя вайной гарады

і вёскі і, вядома ж, ні ў чым не былі вінаватыя перад Радзімай і сваім народам. Такі ж горкі лёс спасцігнуў сотні іншых людзей. Па маючыхся даных, ад рук нацыяналістычнага падполля ў 1944--1952 гг. на Гродзеншчыне загінулі 774 чалавекі, з іх у Гродзенскім раёне --132, Іўеўскім--124, Шчучынскім --118, Воранаўскім --112, Лідскім --97... Гэтыя лічбы не ўлічваюць страт салдатаў і афіцэраў, якія загінулі смерцю храбрых у час правядзення чэкісцка-вайсковых аперацый.

Ужо, напэўна, не ўдасца высветліць імёны тых, хто навекі знайшоў апошні прыстанак на гэтай шматпакутнай зямлі ў нядобры час, асабліва са жніўня 1944 года і на працягу 1945-га. Іх былі сотні -- чырвонаармейцаў, камандзіраў, супрацоўнікаў дзяржбяспекі, міліцыі. Вядомыя толькі прозвішчы афіцэраў МДБ, якія загінулі ў пазнейшы час. Сярод іх:

**Анатоль Фёдаравіч Фядосімаў.** Нарадзіўся ў вёсцы Фядосімава Уржумскага раёна Кіраўскай вобласці 27.04.1921. У 1946/47 г.г. удзельнік ліквідацыі тэргрупаў Гродзенскай вобласці. Быў смяротна ранены ў ходзе правядзення чэкісцка-вайсковай аперацыі 4.12.1947. Пахаваны ў Гродне.

**Іван Міхайлавіч Наскоў.** Нарадзіўся ў вёсцы Ключнікава Яраслаўскай вобласці 18.09.1911 г. Загінуў у вёсцы Паперня Лідскага раёна 15.12.1948 г. Яго імем названа вуліца ў Лідзе.

**Мікалай Іванавіч Стрэльнікаў.** Нарадзіўся 7.01.1921 г. у сяле Тупікоўка Бузулукскага раёна Арэнбурскай вобласці. Загінуў ад рук тэрарыстаў 14.02.1949 г. Яго імем названа вуліца ў Воранаве.

**Аляксандр Сцяпанавіч Іваноў.** Нарадзіўся ў вёсцы Паруб'е Полацкага раёна 14.04.1924 г. Загінуў ад бандыцкай кулі 4.08.1950 г. Яго імем названа вуліца ў Смаргоні.

**Андрэй Ямяльянавіч Стралкоўскі.** Нарадзіўся ў вёсцы Стралкоўцы Барысаўскага раёна 18.02.1917 г. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 26.08.1953 г. Яго імем названа вуліца ў Лідзе, дзе ён і пахаваны.

**Іван Рыгоравіч Арэф'еў.** Нарадзіўся ў сяле Здвінскае Навасібірскай вобласці 11.04.1913 г. Загінуў ад рукі тэрарыста-адзіночкі Пухальскага 2.09.1951 г. Пахаваны ў Гродне. Яго імем названа вуліца у г. п. Жалудок.

**Георгі Аляксандравіч Князеў.** Нарадзіўся ў вёсцы Жарабец Арэхаўскага раёна Запарожскай вобласці. Прайшоў баявы шлях ад Сталінграда да Берліна. Загінуў пры ліквідацыі тэргрупы на тэрыторыі Зэльвенскага раёна ў 1952 г.

...Знаёмішся з архіўнымі дакументамі, і проста кроў у жылах стыне: да якой лютасці, крыважэрнасці трэба дайсці, каб рабіць такія жорсткія і садысцкія злачынствы. Вось толькі адзін прыклад. У 1946 г. у сувязі з засухай на Украіне ў пошуках хлеба і заробку на Гродзеншчыну прыехала нямала жыхараў Палтаўскай і Варашылаўградскай абласцей. Толькі ў Лідскім раёне часова пасялілася каля 300 чалавек -- як правіла, уладкоўваліся працаваць па найму ў сялян-аднаасобнікаў. Вось над гэтымі абяздоленымі і ўтварыла звярыную расправу банда на чале з "Палоем" (Альфонсам

Тыркіным). На тэрыторыі Запольскага сельсавета былі расстраляны 38 бежанцаў, заробленае імі зерне разрабавана. Целы забітых, у тым ліку і падлеткаў, закапалі ў лесе непадалёку ад вёскі Дайнава. Дарэчы, за "Палоем" і яго бандай лічылася нямала другіх злачынстваў. І калі ўсіх падручных "Палоя" злавілі, каго раней, каго пазней, дык самому верхаводу ўдалося ўцячы нелегальна за мяжу. Кампетэнтныя органы ўстанавілі дакладна, дзе ён пражывае, дзе працуе. У 70-я гг. па справе "Палоя" былі падрыхтаваны адпаведныя дакументы, у якіх былі неабвержныя доказы злачынстваў, у тым ліку і матэрыял па слядах раскопак пахаванняў, і органы пракуратуры звярнуліся да ўрада Польшчы, дзе пражываў Альфонс Тыркін, з патрабаваннем выдаць злачынца ў рукі савецкага правасуддзя. Аднак гэтае патрабаванне было адхілена. Зразумела, выпадак з "Палоем" -- толькі выключэнне з правілаў, паколькі ўсе злачынцы прыцягваліся да адказнасці і атрымалі заслужанае пакаранне.

Само сабой зразумела, нямала загінула і ўдзельнікаў нацыяналістычнага падполля. Яшчэ ў чэрвені 1945 года, выступаючы на "Працэсе 16-ці", камандуючы АК генерал Л. Акуліцкі заявіў наступнае: "Пан пракурор прывёў тут дакладныя даныя аб колькасці забітых афіцэраў і салдат Чырвонай Арміі ў выніку тэрору з боку членаў АК. Але я перакананы, што страты Арміі Краёвай у гэтай бяссэнсоўнай, недарэчнай барацьбе нікольki не меншыя".

Так было і ў наступныя гады. Гінулі здаровыя, моцныя людзі з абодвух бакоў.

## АДЗІНОЧКІ

26 жніўня 1953 года. Шаша Ліда -- Мінск. Група ў складзе капітана дзяржбяспекі Стралкоўскага, сяржанта і двух радавых салдат з унутраных войскаў правярала дакументы ў прахожых, затрымвала і аглядала аўтамашыны. Лідскім чэкістам стала вядома: дзён колькі таму ў раён Рудніцкай пушчы былі закінуты самалётам два чужаземныя агенты. Адзін з іх прызямліўся вельмі няўдала -- адкрыты пералом нагі. Існі не змог, здавацца не захацеў, прыняў атруту.

Пошук другога працягваўся. Узмоцнена правяралі дакументы.

Дзень выдаўся спякотны, душны. Стралкоўскі і яго падначаленцы знемагалі ад спякоты і смагі. Але служба ёсць служба. Група спраўна выконвала заданне. Зрэшты, яно было не надта цяжкім, бо дарога ў гэты час выглядала даволі пустэльнай.

Гарачая пара, уборка, мясцовае насельніцтва ў полі, на жніве. Толькі калі-нікалі праедзе сялянская фурманка ці прамчыцца ахутаны клубамі пылу грузавік.

Нарэшце група размясцілася ў цяні прыдарожнага куста. Уважліва паглядалі на шашу. Яшчэ здалёк заўважалі, з боку Ліды рухаецца чалавек. Адзеты ў звычаёвую для гэтых месцаў сялянскую вопратку, ідзе басанож, боты, звязаныя шнурком, перакінутыя цераз плячо. Вось ён ужо прыблізіўся на зусім кароткую адлегасць,

Стралкоўскі са сваімі напарнікамі добра разгледзелі незнаёмца. Ростам пад два метры, гарбаносы, даўно няголены, парослы жорсткім чорным шчаціннем твар. Позірк сонны, абыякаўскі.

-- Што за граміла з бальшака? -- як бы сам у сябе напаўголас спытаў капітан, і таксама ціха прадоўжыў:

-- На шуканца не падобны, але праверыць абавязаны.

Басаногі параўняўся з назіральнікамі. Стралкоўскі рашуча шагнуў з укрыцця яму насустрач. Услед за капітанам рушылі суправаджальнікі.

-- Праверка дакументаў. Хто вы, адкуль і куды ідзяце? -- спакойным голасам спытаў Стралкоўскі.

Рэакцыя незнаёмца была імгненнай. Выхоплівае пісталет ТТ і страляе ва ўпор. Смяротна ранены капітан адскочыў на некалькі крокаў назад і з зямлі паспеў тры разы стрэліць. Стрэлы не былі прыцэльныя. Памочнікі Стралкоўскага зусім нічога не паспелі. Салдат і сяржант былі забіты на месцы.

Трэці, радавы Трыфанаў, быў цяжка паранены, але застаўся жыць. У яго паралізавала пазваночнік, хлопец на ўсё жыццё застаўся інвалідам, прыкаваным да пасцелі. Ён і расказаў, калі ў шпіталі вярнулася памяць, пра здарэнне на дарозе. Не мог толькі ўспомніць Трыфанаў, што здаравяка да ўцёкаў прыхапіў з сабою аўтамат з боепрыпасамі, але чамусьці пакінуў на месцы злачынства свае гумавыя боты -- ці то забыўся ў спешцы, ці то ноша здалася не вельмі патрэбнай.

У сваім меркаванні капітан Стралкоўскі безумоўна меў рацыю: даўгавязы бамбіза не быў ні шпіёнам, ні дыверсантам. Калі ў Лідскім гараддзеле МДБ пазнаёміліся з паказаннямі радавога Трыфанава і прааналізавалі "почырк" расправы на шашы, адразу зрабілі вывад: гэта не хто іншы, як 26-гадовы Ян Грынцэвіч.

Яго ўжо шукалі даўно. У свой час ён служыў у "Рагнара", быў злоўлены са зброяй у руках, асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Тэрмін пакарання адбываў пад Тулай, працаваў на шахце. Разам з яшчэ двума зняволенымі акаўцамі ўдалося ўцячы. Двух хаўруснікаў хутка арыштавалі. А Грынцэвіч папоўніў спісак тэрарыстаў-адзіночкаў.

У тым спісе іх налічвалася нямала -- Артых, Палубінскі, Хадыка, Людкоўскі, Мурын, Пухальскі і многія іншыя. Гэта асабліва небяспечныя злачынцы. Паводле прызнання супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі тых часоў, намнога лягчэй было выйсці на след групы, чым тых, хто дзейнічаў самастойна, на свой страх і рызыку.

Аднаму заўсёды лепей знайсці надзейны прытулак, ёсць неабмежаваныя магчымасці для пераходаў, мінімальнае кола сведкаў.

І невыпадкова паасобныя асколкі развеяных акаўскіх фарміраванняў змаглі пратрымацца вельмі доўга, прынеслі людзям на абодвух баках барыкадаў шмат пакутаў.

Узяць таго ж Грынцэвіча. У 1951 г. забіў упаўнаважанага Міністэрства нарыхтовак Дзягілева і забраў з сабой яго парабелум. Праз некаторы час учыніў тэракт над супрацоўнікам міліцыі лейтэнантам Кірылавым. Зноў-такі прыхапіў з сабой пісталет ТТ і дакументы. Затым ад рукі Грынцэвіча гіне старшыня калгаса Шот

-- 60-гадовы мясцовы жыхар, паважаны і аўтарытэтны сярод аднавяскоўцаў чалавек. Прыёмны бацька Яна ўсё жыццё сябраваў з Шотам, даведаўся, хто павінны ў смерці сябра, і скончыў самагубствам. Плюс да ўсяго грабяжы, бясконцыя пагрозы тым, хто адмаўляўся дапамагаць.

Інцыдэнт на шашы Ліда -- Мінск не быў падобны на помсту страціўшага надзею барацьбіта, гэта быў звычайны бандытызм дзеля выжывання.

Адным з тых, хто "паляваў" на тэрарыстаў-адзіночкаў быў Уладзімір Сяргеевіч Казьянін. Ураджэнец Віцебшчыны, маладым хлопцам пайшоў ваяваць у легендарнае партызанскае злучэнне У. Я. Лабанка. Пасля вызвалення Беларусі ад немцаў яго накіравалі ў органы дзяржбяспекі. Доўгі час знаходзіўся ў савецкай зоне Германіі, памог у размяшчэнні нашых войскаў затрымаць двух шпіёнаў, падрыхтаваных у вядомай дыверсійнай школе Рэйнхарда Гелена.

У 1951 г. прыбыў у распараджэнне МДБ БССР. Прасіўся прадоўжыць службу на радзіме, у Віцебскай вобласці, але Цанава і слухаць не захацеў. "Паедзеш куды я скажу",-- фанабэрыста заявіў міністр Казьяніну.

26-гадовы лейтэнант аказаўся ў Лідзе. Адразу па прыездзе на яго плечы навалілася груда спешных, неадкладных спраў. Безумоўна, да гэтага часу пік самага бязлітаснага змагання з тэрарыстычнымі групамі ўжо некалькі гадоў як мінаваў, і ўсё ж у многіх месцах было неспакойна.

**БЫЛО ГЭТА ТАК. Успамінае чэкіст Казьянін:** "Добра памятаю першы дзень знаходжання ў горадзе. Быў чэрвень, я ішоў з чыгуначнага вакзала і любаваўся кронамі дрэваў, густа пакрытых зялёным лісцем. Разам з тым у вочы кідаліся разбурэнні і разваліны ваеннага ліхалецця. Без асаблівых цяжкасцяў адшукаў гараддзел -- малапрыкметны вузкі трохпавярховы будынак з цёмна-чырвонай цэглы. Нават неспецыялісту было бачна, гэта даўняе збудаванне. Унутры будынка было ціха і нейк бязлюдна. Цішу паруша даляталае аднекуль стракаценне пішучай машынкі.

Адрэкамендаваўся дзяжурнаму. "Усе ў раз`ездзе, начальнік на бюро гаркама, прыйдзецца пачакаць",-- растлумачыў ён.

Пад вечар пачалі збірацца супрацоўнікі. Па-праўдзе кажучы, мяне, на першы погляд, нейк непрыемна ўразіў знешні выгляд маіх будучых саслужыўцаў: мятыя, абшарпаныя кіцелі, выцвілыя фуражкі, пакрытыя густым слоем пылу боты...

Неўзабаве падпалкоўнік, начальнік аддзела, распачаў нараду. Стаў я ўнікаць у абставіны справаў, слухаць, у якіх умовах даводзіца працаваць мясцовым чэкістам, у якія перыпетыі трапляць, і засаромеўся за сваю думку. Больш таго, мне няёмка стала за сваю новенькую, з іголачкі, форму. А хутка і на сваім вопыце пазнаў, пры нашай паўсядзённай рабоце не да бліскучых мундзіраў.

І тое сказаць: калі ішлі росшукі Грынцэвіча, я з некалькімі салдатамі два тыдні прасядзеў у засадзе на адных вясковых могілках. Па некаторых звестках, іменна ў гэтай мясцовасці мог з`явіцца тэрарыст. Ён так і не прыйшоў. Крыўдна? Вядома! Столькі часу

затрачана, намаганняў -- і ўсё марна.

Пасля забойства Стралкоўскага і салдатаў усе сілы і сродкі гараддзела былі задзейнічаны на злоў гэтага асабліва небяспечнага злачынцы. Раней яго вышукам займалася ў асноўным толькі міліцыя, хоць быў Грынцэвіч асуджаны іменна па палітычных матывах.

На маю долю прыпала яшчэ і яшчэ раз пераправерыць адрасы яго магчымага з'яўлення ў родных мясцінах.

Неяк я зусім выпадкова даведаўся, што Грынцэвіч прымусіў да пастаяннага сужыцельства непаўналетнюю дзяўчыну, дачку ўдавы. Быццам нядаўна бачылі іх на ўскрайку лесу, дзе Ядзя, так звалі дзяўчыну, пасвіла каровы. Я прапанаваў у гараддзеле акружыць хутар, дзе пражывалі Ядзя з маці, і правесці там старанны вобыск. Начальства завагалася: "Ці патрэбна гэта? Шуму наробім, а там, глядзіш, нічога няма. Трэба дзейнічаць абачліва, дарма не раздражняць насельніцтва, сем разоў адмерай -- адзін раз адрэж. Сам ведаеш, які час..."

Я добра ведаў, якія часы настаді. Быў арыштаваны Берыя і яго падручныя, ішла чыстка органаў. Той-сёй з начальнікаў пачаў залішне нервавацца, праяўляць неразумную асцярожнасць. Тым не меней я настаяў на сваім, дабіўся ордэра на вобыск і згоды кіраўніцтва аддзела на правядзенне аперацыі. Праўда, прыйшлося даць распіску, што пры няўдачы ўсё вазьму пад сваю асабістую адказнасць.

... У 5 гадзін вечара мы акружылі хутар. Маці Ядзі корпалася на агародзе, самой дзяўчыны нідзе не было відаць. Я падышоў да плота:

"Хто ў хаце?"

"Нікога",-- гаспадыня нават не разгінала спіны.

"Ну што ж, зараз праверым".

"Праверайце".

Пачалі вобыск, і першае расчараванне: у хаце сапраўды нічога падазронага знайсці не ўдалося. Але пры болей пільным і скрупулёзным аглядзе выявілі бясспрэчныя рэчавыя доказы: палявую сумку лейтэнанта Кірылава, веласіпед і дакументы Шота, аўтамат забітага разам са Стралкоўскім сяржанта Якаўлева...

Арыштавалі і павезлі ў горад Ядзю і яе маці. У час допыту адкрылася многае. Аказалася, што Грынцэвіч перыядычна хаваўся на хутары на працягу двух гадоў. І што самае дзіўнае: як пазней высветлілася, пра гэта ведалі многія жыхары бліжкай вёскі, у тым ліку абодва старшыні -- калгаса і сельсавета. Абодва, дарэчы, камуністы. У чым-чым, а ў прапольскіх нацыяналістычных настроях абодвух нельга было западозрыць -- прыехалі сюды з усходніх абласцей, сваяцкіх сувязяў з мясцовымі жыхарамі ніколі не мелі. І тым не менш маўчалі.

Чаму? Мне і самому цяжка адказаць. Хутчэй за ўсё спрацаваў абывацельскі прынцып "Мая хата з краю...", а, можа, проста апрыкрала кроў, ці мо баяліся. Каб такое выявілася 3--4 гады назад, то для ўсіх іх гэта дабром не скончылася б. Але, паўтаруся, часы былі іншыя, і слава Богу, што яны прайшлі.

Што датычыць арышту Грынцэвіча, то было ўсё на дзіва празаічна і буднічна. З паказанняў Ядзі (яе хутка адпусцілі на волю,

праз тры гады яна паехала ў Польшчу на пастаяннае месца жыхарства) мы даведаліся, дзе і ў каго можа адседжвацца злачынца. Выйшлі на правільны след. Трэбы было падумаць толькі, як правесці аперацыю бяскроўна.

І тут нечакана па ўласнай ініцыятыве прыйшоў нам на дапамогу чалавек, у якога хаваўся бандыт. Пакуль Грынцэвіч цягаў у хату крадзеных курэй і авечкаў, гаспадар маўчаў, як вады ў рот набраў. Але як толькі заўважыў, што той самым нахабным чынам стаў прыставаць да жонкі, адразу вырашыў пазбавіцца ад няўдзячнага пастаяльца.

Словам, аперацыя па захопу тэрарыста прайшла без ніводнага стрэлу. Гэта здарылася 19 студзеня 1954 г. Грынцэвіча прыгаварылі да вышэйшай меры пакрання. Заканамерны фінал чалавека, які ўзяў у рукі зброю для барацьбы за нейкую нацыянальную ідэю і скаціўся на шлях звычайнага забойцы.

Апошнія выстралы ў нашых краях прагучалі 26 красавіка 1954 г. Яны былі звязаны з ліквідацыяй тэрарыстаў Озіма і Мурына. Пра Вацлава Озіма хацелася б сказаць асобна. Спрытны, хітры, вёрткі -- любое з гэтых слоў магло падысці для яго характарыстыкі. Меў за плячыма салідны баявы вопыт. Ваяваў на фронце ў складзе дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, быў узнагароджаны савецкімі і польскімі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны вярнуўся ў родныя мясціны, устанавіў кантакт з рэшткамі акаўцаў.

У 1946 г. удзельнічаў у налёце на паштовае аддзяленне і забойстве яго начальніка. З таго часу хаваўся. Здабыў сельсавецкую пячаць, мог падрыхтаваць любую праўку -- для сябе і паслужнікаў.

Уявіце сабе: 8 гадоў на нелегальным становішчы. Я не стаў бы ўсё тлумачыць звычайным шанцаваннем. Ён чуў небяспеку за вярсту, умеў выйсці сухім з вады ў любой складанай сітуацыі. Ва ўсякім разе, тройчы кругом яго сціскалася кальцо, і заўсёды яму ўдавалася вышмыгнуць. Аднойчы нават быў затрыманы, але сувязь з горадам не працавала, аператыўная група не магла дазваніцца ў гараддзел МДБ ці міліцыю, каб прыслалі машыну для праверкі Озіма. Засталіся на начлег у глухамані. Озім спрытна выкарыстаў нявопытнасць маладога ахоўніка, і толькі яго бачылі.

У апошні раз наткнуліся на Озіма зусім выпадкова. У адной з вёсак на Нёмане быў забіты калгасны брыгадзір. Падазрэнне пала на яго папярэдніка -- Мурына, які незадоўга да гэтага быў звольнены з брыгадзірскай пасады за п`янства і крадзеж. Два супрацоўнікі міліцыі і наш работнік паехалі да Мурына з вобыскам. Адзін з іх зрушыў з месца куфар і заўважыў вечка ад склепа. Пацягнуў раз за кальцо, пацягнуў другі...

Што за халера! Вечка быццам крыху прыпадымалася, але невядомая сіла цягнула яго назад. Тады старэйшы лейтэнант паднатужыўся і пацягнуў з такой сілай, што вечка адскочыла і... на яго пагрозліва глянуў аўтамат Озіма. А ў супрацоўніка міліцыі нават пісталета ў руках няма.

"Вацэк, бі бандытаў!" -- усё роўна як з насмешкай раўнуў Мурын, збіў з ног аператыўніка-капітана, кінуўся ў сенцы і быццам у ваду кануў.

Озім шум паднімаць не стаў, стральбу не адкрыў. Маланкава сігануў праз вакно на панадворак, а праз імгненне яго і след прастыў.

Хто б мог падумаць, што былы калгасны брыгадзір -- даўні хаўруснік Озіма. Але, пэўна, таму і змог ён пратрымацца так доўга, што ўмеў выкарыстоўваць людзей па-за ўсякімі падазрэннямі.

Вось і апошні яго прыстанак -- убогая, старэнькая хатка беднай мнагадзетнай сям'і. Між іншым, калі мы даведаліся, дзе знаходзяцца Озім і Мурын, перад пачаткам аперацыі прынялі ўсе меры засцярогі, каб ніхто з членаў гарэтнай сям'і не пацярпеў -- усіх вывелі з хаты і адправілі перачакаць у бяспечнае месца. Озім і Мурын у гэты час моцна спалі на гарышчы пасля добрай чаркі гарэлкі. У дзесяць гадзін па ранку вырашылі іх разбудзіць: "Здавайцеся!".

На адказ маўчанне. Мы захацелі паказаць, што з імі ніхто шуткаваць не збіраецца -- адкрылі кулямётны і аўтаматны агонь. Кулі паўсюдна ўздыбілі саламяную страху.

Мурын скаціўся з гарышча і паўзком да нас: "Озім загадаў перадаць, здавацца не будзе".

У пацвярджэнне гэтага наказу Озім спусціўся з гарышча і выпусціў некалькі аўтаматычных чэргаў у наш бок. Мы адказалі агнём, ён зноў падняўся на гарышча. Прымаем рашэнне браць хату штурмам. У перастрэлцы паранены старшына ўнутраных войскаў і забіты пошукавы сабака.

Што рабіць? Озіма загадана ўзяць жывым. Але і сваіх людзей пасылаць на заведамую смерць на дзевяты год па вайне недаравальна, хату спаліць нельга.

Хтосьці прапанаваў прывезці сюды маці Вацлава -- яна жыла дзесьці непадалёку.

Прывезлі. Скажу прама: асабіста ў мяне аблічам і паводзінамі яна пакінула моцнае ўражанне. Статная прыгожая жанчына з сівымі валасамі, разумны, спакойны і пранікл іўы позірк. Пайшла ў хату першы раз, вяртаецца: "Няма там нікога".

"Ідзіце і пашукайце лепей. Перадайце сыну, калі здасца дабравольна, для яго яшчэ не ўсё згублена. Можа застанецца жыць".

Пайшла зноў. Трынаццаць разоў падымалася яна на гарышча і вярталася назад. Мы не ведалі, пра што ішла размова паміж маці і сынам, але кожны раз яна прыносіла адмову на нашу прапанову. Калі спусцілася з гарышча ў апошні раз, цвёрда прамовіла: "Усё! Больш не пайду. Вацэк развітаўся са мною. Альбо ўцячэ, альбо загіне".

Ніводзін мускул не зварухнуўся на твары мужнай, гордай полькі, ні адна слязінка не выкацілася з патухлых вачэй. Адчуваецца, сама нас не баіцца, гатовая да ўсяго. Не баіцца нас і не паважае. У ранейшыя часы яе, невінаватую, за страшныя правіны сына саслалі б далёка, а так спакойна ад'ехала ў Польшчу.

У гэты час хтосьці ўзбуджана ўсклікнуў: "Глядзіце -- дым!"

Я зірнуў уверх. Сапраўды, са страхі, каля цаглянага коміна, у неба паднімалася тонкая стужка чорнага дыму. Не магу напэўна сцвярджаць пра прычыну пажару: ці салома ўзгарэлася ад куль у ходзе перастрэлкі, ці яе падпаліў сам Озім?

Дагарае страха, рухнула сталяванне, забушавала полымя ў вокнах. "Ну, згарэў",-- сказаў афіцэр побач са мной. І тут я заўважыў, як у густым патоку чорна-шэрых клубоў дыму па зямлі да частаколу кінулася чалавечая постаць, затаілася ў самым вугалку агарожы. Мы сталі набліжацца да плоту. Озім узнавіў стральбу. Чыясьці чарга з аўтамата прымусіла яго змоўкнуць навекі.

Я азірнуўся. Над дагарэлай хатай згушчаўся красавіцкі змрок. Стаяла незвычайная цішыня. Чутна, як патрэскваюць дагарэлыя бярвёны на папялішчы. Іменна тут, у дзесяці кіламетрах ад крутога берага Нёмана, і прыйшоў нарэшце доўгачаканы супакой на гэтую шчодра палітую кроўю зямлю".

Так, усё было скончана 26 красавіка 1954 г. А пачыналася, яшчэ раз напомню, амаль дзесяць гадоў назад, непадалёку ад гэтых мясцінаў. Тады, у жніўні 1944 г., у жорсткую схватку з савецкай ваеннай часцю ўступіў атрад падпалкоўніка Мацея Калянкевіча ("Котвіча") -- аднаго з апошніх камендантаў АК Навагрудскай акругі. І тут жа было скончана з апошнім узброеным удзельнікам былой падпольнай акаўскай арганізацыі. Паварот на паварот, нітка да ніткі -- і кола завяршыла бег. Дбайна сатканае павуцінне парвалася, выкінута на сметнік. Назаўжды.

На заўжды?!

А можа яшчэ хто з палякаў захоча вырашаць свае амбіцыйныя праблемы беларускаю крывёю?

Прайшло дзесяць гадоў бесперапыннай крывавай барацьбы, зыход якой быў вызначаны наперад. Дзесяць гадоў тэрору, пакутаў і слёзаў. Ашуканыя, пакінутыя на волю лёсу лідэрамі, ахопленыя роспаччу радавыя акаўцы прадаўжалі шлях у прорву. Шкада загінулых мірных грамадзянаў, байцоў і камандзіраў, шкада многіх простых людзей у радах АК, зачумленых прапагандай і загінулых у бяссэнсавай і бязглуздай барацьбе, у якой не аказалася ні пераможцаў, ні пераможаных.

Гісторыя шматкрать засведчыла, і падзеі ў краінах былога СССР, Югаславіі ў апошнія гады яшчэ раз пацвердзілі, што няма нічога больш небяспечнага для міру і спакою людзей, чым вірус перадзелу межаў. Урокі крывавых і трагічных падзеяў на землях Заходняй Беларусі ў 1939--1954 гг. яшчэ і яшчэ раз перасцярагаюць нас.

# БЫЛО, ПРАЙШЛО, НЕ ВЕРНЕЦЦА

## ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Хуткі цягнік Масква -- Гродна спыніўся на станцыі Скрыбаўцы дзесьці каля чатырох гадзінаў ночы. Я сышоў на перон.

Пачатак чэрвеня. Відната. На ўсходзе яснела ўсё болей. Я на пероне ўслухоўваўся ў перастук колаў, з кожнай хвіляю ўсё больш прыглушаны. Цягнік імкліва на Захад. Я рашаў дылему: ісці праз лес і прыцемкі пешшу ці пачакаць прыгараднага "дызеля", ён падвязе пад самую бацькоўскую хату? Пешкі дайду за добрую гадзіну. Чакаць значна больш. Прыгарадны цягнік адпраўляўся са станцыі праз гадзіны тры. "Няма нічога горшага, як чакаць і даганяць",-- мільганула ў галаве. І я падхапіў няцяжкую паклажу і рушыў па асфальце ў бок ракі.

Наваколле было такім, якім можа быць на пачатку лета -- цудоўным, уражлівым. Усё зялёнае цвіло, дурманіла галаву пахам і стварала своеасаблівы настрой. Думкі з паўсядзённага, жыцейскага, дробязнага міжволі пераключаліся на высокую сферу адвечных тэмаў.

Шлях пралягаў побач з паўсюль вядомай Маламажэйкаўскай царквою -- слаўным помнікам ваенна-царкоўнай архітэктуры 16 стагоддзя. Ніхто не мог прайсці побліз і не палюбавацца адмысловым тварэннем продкаў. Высокія купалы царквы на фоне засвятлістага неба гожа ўзвышаліся над вежамі-байніцамі, расказвалі многае, нават пра тое, што з гадамі сціраецца з памяці людской.

Апошняе збудаванне пасёлка, дзе абрываецца асфальт -- рэшткі фальварка колішняга пана Брахоцкага. У пасляваенныя гады тут асталявалася МТС, потым РТС, у пост-хрушчоўскі час "пасадзілі" рамонтны заводзік, дзе штосьці ўпарта кляпаюць да сённяшняга дня. У ходзе ўсіх гэтых пераўтварэнняў ад былога фальварка мала што засталося. З гэтага "мала" ўвагу прахожага, тым болей новага чалавека, прыцягнуць дзіўныя для гэтых месцаў кедры. Яны ў свой час акалялі ўсю сядзібу Брахоцкага. Не стала гаспадара, зніклі ці не ўсе і кедры.

Ад заводзіка сцяжынка з прыгорка закруціла ўніз, да ракі, дзе ў раніцовым малочна-белым тумане шумела і кляКатала бурча. Прама ля яе падвясная кладка, змантаваная гадоў дваццаць таму ўмельцамі з заводзіка -- ужо пражавела, з дзіркамі ў дашчаным пераходзе. Прыкладна з кіламетр адсюль збудаваны сучасны бетонны мост, пракладзена гравійная дарога, але ісці да маста далекавата ды і, па праўдзе, нецікава. Ні на што нельга падзівіцца на голай пустой гравійцы, дзе на паўкіламетра ўлева і ўправа ніводнага дрэўца, ніводнага кусціка.

Асцярожна, баючыся плюхнуцца ў яшчэ халодную чэрвеньскую плынь, трымаюся адной рукой за пражавелы поручань (у выглядзе троса), нацягнуты паміж берагамі, ледзь не паўзком перабраўся праз раку па хісткай, дзіравай падвешанай кладцы. І адразу акунуўся ў густы, расісты лазняк. Аглушальныя перасвісты

пласта салодзяць слых. Дружныя гарластыя харысты не могуць перасвістаць натхняльніка паэтаў і спадарожніка закаханых -- салаўёў. Пад акампанемент разнагалосых спеваў, апрысканы расою з галавы да пятаў, я праскочыў дрыготкую, балоцістую левабярэжную лугавіну і апынуўся на гарыстым пясчаным палетку са збажынаю. Уздалечы сцяной стаяў густы хваёвы маладняк.

Паміж маладняком і ўскрайкам жытняга поля, у дваццаці метрах ад прасёлкавай дарогі, скрозь ранішні туман праглядваліся рэшткі таго, што калісьці было чалавечым жыллём. Утомлены дарогаю, я вырашыў хвілінку перадыхнуць. Звярнуў управа, дзе ў спакойнай векавой дрымоце спачываў вялізны валун. Прысеў на яго гладкую адпаліраваную часам і прыродай паверхню.

Поплаў патанаў у тумане, за ракой ужо выразна праглядвалі збудаванні. На самым высокім месцы віднеўся занядбалы, усё яшчэ ўнушальны, двухпавярховы каменны белы палац. Ён належаў калісьці Ваньковічу -- яшчэ больш важнаму і багатаму пану, чым Брахоцкі. З мясцовага насельніцтва ніхто Ваньковіча ніколі не бачыў. Ён увесь час жыў у Варшаве і за мяжою. Справы ў маёнтку вёў упраўленец Трацяк. Упраўленец пакінуў пра сябе добры ўспамін у тутэйшых людзей, бо выдатна ведаў праблемы сельскай гаспадаркі і памяркоўна адносіўся да сялянства. У адрозненне ад многіх мясцовых шляхцюкоў і арандатараў-яўрэяў Трацяк ставіўся да простага люду без ганарыства і фанабэрыі.

Але калі палац за ракой яшчэ дажываў свой век, то ад былой сядзібы, якая знаходзілася тут, побач з валуном, акрамя напаўдзікага саду, падмурку і закінутай студні, не засталося нічога. Я добра памятаю гэты дом з двума комінамі, у якім у свой час жылі два браты з сем`ямі. У пачатку мая 1949 года гаспадары зніклі, бо іменна тут спынілася на начлег і была акружана аператыўнікамі лідскага гараддзела МДБ частка атрада "Олеха". У ходзе раз`юшанай трохгадзіннай перастрэлкі былі ахвяры з абодвух бакоў. За сувязь з "Олехам" усе мясцовыя хутаранцы-католікі былі арыштаваны, асуджаны і кінуты ў Сібір. Пачалі вяртацца дамоў амаль праз дзесяць гадоў. Вярнуліся і браты з жонкамі. Адзін з іх пасля змены сібірскага клімату і выжыльнай працы там пражыў тут усяго некалькі месяцаў, другі -- значна больш, але таксама аказаўся недаўгавечны. Дом прадалі, жыхары раз`ехаліся хто куды.

Я сядзеў на валуне, а перад вачыма стаяў гэты пуставалы дом у тыя гады, калі адсутнічалі яго гаспадары. Сцены дома былі густа зрашэчаны кулямі. Нас, хлапчукоў, ён страшыў жудаснай адзінотай. І адначасова прыцягваў, бо можна было падысці да сцяны і, цярпліва пакалупаўшыся сцізорыкам, выцягнуць з бервяна кулю.

Цяпер жыллё, сляды жылля, аддавалі пустэчай, адзінотай, навейвалі смутак. Яго не маглі развеяць ні шчодра расцвілы бэз, ні звонкі голас жаўрукоў у вышыні, ні меладычныя гукі акардыёна з-за ракі ўперамешку з вясёлым дзявочым спевам. Дзесьці ў бліжняй вёсцы так позна дагарала чыёсьці вяселле ці маладзёжная вечарынка.

Калі я глядзеў на разбуранае гняздо працавітых добрых людзей, якое ўжо было густа пакрыта няўмольнай травой забыцця, міжволі ўзгадвалася купалаўскае:

**Усё прайшло, мінула,**
**Як і не было.**
**У капцах паснула,**
**Зеллем зарасло.**

Усё ўспрымалася іначай, па-новаму, не толькі таму, што ад дзяцінства прайшло нямала часу, а я пачуваўся сталым чалавекам. Я цяпер ужо добра ведаў, за што змагаліся і пакутавалі гэтыя людзі. Ці варта ім было ваяваць і ўкрываць ваяўнікоў, перці на ражон за польскую ідэю? Польшча несправядліва, як калісьці Крулеўства Польскае, далучала беларускія землі, акаталічвала іх, а сыны Беларушчыны зноў расплачваліся. За чужыя ідэі.

Колькі цярпець беларусу абнімкі чужынцаў?

Уладальнікі гэтае хаты, магчыма, зусім не былі за "Олеха". Прыйшлі ўзброенцы на хутар. "Давай, гаспадар, яды".-- "Не разумею".-- "Выведзем карову і зарэжам, зразумееш". Зразумеў. Частаваў. А потым на хутар напаўзлі эмгэбэшнікі. Бой.

Ворагі ваявалі, а расплачваліся беларусы. Як пры шведах, белапаляках, як пры немцах.

Дакуль так будзе? Хто ты, беларус? Чаму не скажаш хціўцам-"дабрадзеям": пайшлі вон! Я ў вашу хату не лезу. Пайшлі воз з мае хаты!!

Журба тачыла сэрца.

...Неяк у рэдакцыю, дзе мне ў свой час давялося працаваць, а было гэта вясной 1990 г., зайшоў знаёмы навуковец, выкладчык гісторыі ў Беларускім універсітэце. Пагаварылі пра тое-сёе, а на адыход ён дастаў з партфеля кнігу ў зеленаватай вокладцы і прапанаваў:

-- Калі зацікавіць, магу пакінуць на тыдзень-другі.

На вокладцы -- два ўзброеныя коннікі ў вайсковай форме. Пад імі загаловак на польскай мове: "З успамінаў жаўнераў АК Навагрудскай акругі". Я падзякаваў выкладчыку, развітаўся і адразу пачаў гартаць старонкі. То тут, то там замільгалі знаёмыя назвы мястэчкаў і вёскаў. Багатая ілюстрацыя, здымкі людзей у вайсковым і цывільным адзенні, розныя штабныя схемы. Пра ўсё гэта я чуў і раней. Ужо давялося чытаць "Партызанскія ўспаміны" Станіслава Трушкоўскага ("Штрэмера"), зборнік нарысаў Цэзары Хлябоўскага "Асколак гранаты", розную польскую перыёдыку... Але гэтая кніга давала больш поўнае і сістэматызаванае, хаця крыху аднабаковае, уяўленне пра дзейнасць АК на "крэсах". З яе, да прыкладу, упершыню даведаўся, што непадалёку ад валуна, на які прысеў перадыхнуць, не далей за кіламетр, размяшчаўся штаб Навагрудскай акругі АК напярэдадні паходу на Вільню. Менавіта сюды 22 чэрвеня 1944 г. прыбыў "ціхацёмны", падпалкоўнік Адам Шыдлоўскі ("Паляшук"). Ён замяніў каменданта Праўдзіца-Шляскага. Чым закончыўся для акаўцаў паход на Вільню, мы ўжо ведаем.

...Неўзабаве мой роздум-успамін перапыніла блізкае рыканне кароў. Пастухі выгналі калгасны статак. Я ўжо сабраўся паднімацца з каменя-валуна і тэпаць далей, як з туману вылушчылася высокая постаць у доўгім, да пятаў, прагумаваным плашчы. Пастух нетаропка,

з пугай у руцэ набліжаўся. Я чакаў. Чалавеку на выгляд -- далёка за шэсцьдзесят. Прывыклы да непагадзі і спякотнага сонца сухі маршчыністы твар, прыгорбленая жыццёвымі цяжкасцямі і нягодамі фігура.

Мы пазналі адзін аднаго, павіталіся. Пагаварылі пра надзённае, і пастух як бы ва унісон маім толькіштошным думкам, глянуў у бок былой сядзібы, нечакана спытаў:

-- Скажы мне, браце, каму замінaлі гэтыя людзі? Каму лепш, калі тут бадыллё і мышы?

Моўчкі паціснуў я плячыма. Нечакана ўспыхнула рэзкая подумка: "Можа, табе, дзядзька, яны ў першую чаргу і перашкаджалі". Падумаў так нездарэмніцы. Усе яго аднавяскоўцы ведалі, што ў майго суразмоўцы ў часы аднаасобнікаў было ўсяго тры гектары ворнай зямлі і шматок сенажаці. А ў сям'і -- сем чалавек. Дзеці з голаду пухлі. Такіх беднякоў тут жыло нямала. Гэтыя ж гаспадары мелі ажно 18 гектараў зямлі, каля дзесяці гектараў лугу, трымалі статак кароў, каля дзесяці коней. Наймалі парабкаў. Так што ў свой час у пастуха-бедняка, нават пры найдабрэйшай душы, не было ніякіх падставаў для асаблівай сімпатыі да заможных гаспадароў, затое хапала повадаў для зайздрасці і, не выключана, нянавісці.

Добрыя і талковыя людзі не атрымалі ад патомкаў спадчыны. Самі выбіцца, не ў багацце, проста на заможнасць, не здолелі. І праглі перадзелаў.

Вось і яшчэ адна прычына акаўшчыны. Самалёт разаб'ецца: пасажырам і іх родным гора, а хтосьці збоку падбірае манеты, рэчы. Разжываецца.

У нашых вёсках пад часы калектывізацыі ці не тая акаўшчына была?

Не, не тое думаецца, абсалютна няправільна. Там бедната і камуністы раздзявалі багатых, а тут барацьба нацыянальна-межавая. Не маю я рацыі.

А ўсё-такі...

...Прайшоў час. Палеткі і сенажаці паўсюль сталі лічы што нічыйнымі. Людзей у ваколіцах засталося так мала, што абрабляць і даглядаць гэтую зямлю ім самім сёння ўжо не па сіле. У маршчыністага разумнага бедака перада мною з'яўляецца пачуццё жалю і шкадавання. Да тых, багатых, разумных. Не дачакаўшыся майго адказу, ён у другі раз, быццам сам у сябе, задумліва пытае:

-- І каму яны замінaлі?

Я зноў прамаўчаў. Не мог даць просты і сціслы адказ на такое кароткае, яснае пытанне.

...Праз доўгія гады маўчання такое пытанне ў апошні час пачало ў мяне ўзнікаць усё часцей і часцей. У іншай форме, чым паставіў яго бясхітрасны вясковец. У розных слаях беларускага грамадства, асабліва ў асяродках інтэлігенцыі, неяк у адначассе загаварылі пра рэабілітацыю жаўнераў Арміі Краёвай на Беларусі. Не болей і меней -- пра рэ-а-бі-лі-та-цы-ю.

* * *

Упершыню гэта прагучала ў шэрагу публікацыяў на старонках газеты "Глос з-над Немна" за 1992 г., у "Мінскай праўдзе" (8.9.1992 г., 21.11.1992 г.). 24 красавіка 1993 г. на 2-ім з`ездзе палякаў на Беларусі дэлегаты прынялі зварот да вышэйшых уладаў дзяржавы пра наданне жаўнерам Арміі Краёвай статуса ветэрана Другой сусветнай вайны. Зварот падтрымалі асобныя беларускія навукоўцы. На старонках друку разгарнулася палеміка ("Звязда", 11.01.1993 г., 30.04.1993 г.; "7 дней", 16.04.1993 г.; "Советская Белоруссия", 29.09.93 г.; "7 дней", 23.10.1993 г.).

Некаторыя навукоўцы, напрыклад, прафесар Аляксандр Хацкевіч, выступілі за тое, каб прызнаць салдатаў і афіцэраў фарміраванняў АК, грамадзянаў Беларусі, якія змагаліся супраць гітлераўскай Германіі, ветэранамі Другой сусветнай вайны. Прызнаць. Праўда, А. Ф. Хацкевіч заклікаў падысці да рэабілітацыі надта асцярожна і дыферэнцыравана. Заслужаны прафесар супраць рэабілітацыі тых акаўцаў, чые рукі скрываўлены тэрактамі супраць мірных грамадзянаў (калі даказана) у перыяд фашысцкай акупацыі ці пасля вызвалення Беларусі ад немцаў.

Другія лічаць, што ставіць пытанне аб рэабілітацыі Арміі Краёвай нам няма неабходнасці, бо яе ніхто не абвінавачваў і, тым больш, не судзіў. А калі, маўляў, ідзе гаворка пра асобных людзей, то пытанне трэба вырашаць датычна да кожнага выпадку. Ва ўстаноўленым законам парадку. З такой думкай, напэўна, можна пагадзіцца, каб не было шырокавядомага судовага "працэсу 16-ці" ў Маскве ў чэрвені 1945 г.

Калі гаварыць пра аргументы праціўнікаў любой рэабілітацыі акаўцаў, то ў гэтым сэнсе характэрнае пісьмо ветэрана Вялікай Айчыннай Серафіма Янеца з Ліды, надрукаванае ў газеце "7 дней" 17.04.1993 г.: "...Даведаўся, што група былых удзельнікаў Арміі Краёвай звярнулася ў Вярхоўны Савет з просьбай рэабілітаваць усіх акаўцаў. Калі такое здарыцца, то Вярхоўны Савет прыпадабніцца да гаспадара, які падсунуў тлеючую галавешку пад страху ўласнае хаты. Калі называць рэчы сваімі імёнамі, дык нам прапаноўваюць рэабілітаваць тых, хто вёў узброеную барацьбу на працягу дзесяці гадоў за аднаўленне Польшчы ў граніцах 1939 г., другімі словамі -- за расчляненне Беларусі.

Як толькі прыйшлі немцы, былыя "стшэльцы" (члены ваенізаванай арганізацыі пілсудчыкаў.-- Я. С.) выйшлі з падполля і ўзялі ўладу ў свае рукі ў Сабакінскай гміне. Цяпер газета "Глос з-над Немна" сцвярджае, што гэта была "першая акцыя сілаў збройных на Навагрудчыне". У сапраўднасці акцыя была скіравана зусім не супраць немцаў. Узброеныя "стральцы" знішчылі ў першую чаргу камуністаў, дэпутатаў, работнікаў савецкіх органаў. Балазе ўсё добра ведалі. Потым сагналі яўрэяў у мястэчка Васілішкі і праз некаторы час дапамаглі немцам ліквідаваць гета. Там, дарэчы, загінула мая аднакласніца Бэба Любецкая. Спачывае яна ў агульнай магіле побач з цяперашняй Васілішкаўскай фермай. Ніхто туды

чамусьці не носіць кветкі. Месцы ж пахавання загінулых акаўцаў прыведзены ў парадак, на іх устаноўлены крыжы, памятныя знакі, там рэгулярна праводзяцца богаслужэнні..

У Шчучынскім павеце, адкуль я родам, немцы акаўцаў не чапалі. Да лета 1944 г. яны спакойна адседжваліся па вёсках, хутарах, і маёнтках. З немцамі ваявалі чырвоныя партызаны. З апошнімі адносіны ў акаўцаў былі далёка не дружалюбныя. Не раз даходзіла да ўзброеных сутычкаў. З пачаткам беларускай аперацыі "Баграціён" атрады АК ажывіліся, правялі некалькі ўзброеных акцыяў супраць немцаў, каб паказаць Саветам, хто тут сапраўдныя гаспадары. Застаўшыся ў тыле Чырвонай Арміі, акаўцы нападалі на савецкіх байцоў і камандзіраў, узрывалі эшалоны, якія ішлі на фронт, пазверскі знішчалі прадстаўнікоў мясцовых органаў улады. Ад іх рук на тэрыторыі Заходняй Беларусі загінулі сотні людзей, часам выразалі цэлыя сем'і.

Цяпер вакол акаўцаў спрабуюць стварыць арэол святасці. Як толькі "Лідская газета" апублікавала праўдзівыя матэрыялы пра АК, у наш горад прыехаў прафесар з Польшчы Цэзары Хлябоўскі. Ён выступіў перад мясцовымі ветэранамі АК і актывістамі Саюза палякаў на Беларусі. Мне давялося прысутнічаць на сустрэчы. Усю віну за тэракты АК прафесар спрабаваў зваліць на каменданта Навагрудскай акругі Януша Праўдзіца-Шляскага, які быццам рабіў так з-за асабістых крыўдаў. Але ці можна ўсю справу зводзіць да асобы аднаго толькі чалавека?! Не, канешне, не. Размова ідзе пра мэтанакіраваную палітыку: акаўцы заўсёды лічылі сябе гаспадарамі на нашай зямлі, і сваю ўладу не збіраліся дзяліць з кім бы там ні было. Адсюль і тэрор у адносінах да беларусаў. Што датычыць непрыязні Хлябоўскага да Праўдзіца-Шляскага, то для мяне ўсё зразумела: справа ў тым, што апошні (Праўдзіц-Шляскі) быў звольнены з пасады каменданта Навагрудскай акругі за нежаданне прыняць удзел у захопе Вільні напярэдадні прыходу туды Чырвонай Арміі -- авантуры, якая мела для акаўцаў трагічныя вынікі.

Як вядома, у Польшчы АК ужо даўно рэабілітавана. І ў нас у сувязі з гэтым не павінна быць ніякіх прэтэнзіяў да польскага ўрада. Шкада адно, што такая рэабілітацыя праходзіла на фоне знішчэння помнікаў байцам і камандзірам Чырвонай Арміі. Мы ў гэтым пытанні павінны праявіць цывілізаваны падыход. Няхай, хто жадае, ушаноўваюць памяць загінулых акаўцаў на беларускай зямлі, даглядае іх магілы. Няхай. Але нашай незалежнай дзяржаве не да твару рэабілітаваць людзей, якія ваявалі супраць гэтай дзяржавы і яе незалежнасці".

Напэўна, выказванні ветэрана камусьці здадуцца спрэчнымі, але аргументы яго -- аргументы цвёрдыя. Думкі многіх беларусаў. Чалавек ваяваў за пальшчызну, супраць Беларусі, а Беларусь цяпер яму скажа дзякуй. А потым і пенсію мусяць прыбавіць. Як жа, ветэран. Смешна? Не, горка. Серафім Янец мае права на сваю думку, і яе трэба таксама браць пад увагу пры вырашэнні такога няпростага пытання. Яе мы падзяляем.

У ходзе палемікі выказвалася і вось якая прапанова. Акаўцы з самага пачатку існавання прызнаны воінамі Войска Польскага,

беларусам трэба лічыць іх як воінаў Войска Польскага, якія жывуць на Беларусі. Нараўне з удзельнікамі і ветэранамі з другіх краін. Адпаведна з дагаворамі на ўрадавым узроўні з краінамі па такіх пытаннях.

У сувязі са зваротам Саюза палякаў на Беларусі, пісьмом на адрас урада былых жаўнераў АК Савет Міністраў Беларусі ў чэрвені 1993 г. стварыў камісію на чале са старшынёй Камітэта па архівах і справаводству Аляксандрам Міхальчанкам. Яна занялася вывучэннем пытанняў па прызнані статуса ветэранаў вайны за грамадзянамі, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях у фарміраваннях Арміі Краёвай ("Звязда", 30 чэрвеня 1993 г.).

Палеміка трохі заціхла. У верасні 1993 г. успыхнула з новай сілай. Яе ўдзельнікі не паспелі нават дачакаца вывадаў урадавай камісіі. Справа ў тым, што ў гэтым месяцы ў Гродне адбыўся з'езд палякаў -- ветэранаў Другой сусветнай вайны, дзе зноў-такі жаўнеры АК настойліва дамагаліся рэабілітацыі. На гэтым жа з'ездзе быў створаны беларускі клуб ветэранаў Арміі Краёвай. Пры асвятленні з'езду ў друку выказваліся супрацьлеглыя погляды (Уладзімір Саласюк. Армія Краёва ідзе ў наступленне. "Советская Белоруссия", 29.09.1993 г.; Аляксандр Хацкевіч. З'езд палякаў -- ветэранаў вайны. "Во славу Родины", 2.10.1993 г.; яго ж--Праўда і домыслы. "7 дней", 23.10.1993 г.).

Як бы ні было, якое б рашэнне ні прыняла камісія Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, на нашу думку, ёсць акаўцы, якіх даўным-даўно рэабілітавала само жыццё. Напрыклад, загінулых у Мінскай турме "вахляжаўцаў" ці забітага ў баі з немцамі Яна Піўніка ("Панурага"). Ну, а тых, хто знішчаў чырвонаармейцаў і афіцэраў, узрываў савецкія эшалоны, хто стаў на шлях бандытызму, праліваў кроў нявінных мірных грамадзянаў, не зможа рэабілітаваць ніякі ўрад, ніякая пастанова. Бо ў памяці людской яны навекі застануцца забойцамі і тэрарыстамі.

Страсці вакол Арміі Краёвай пачалі разгарацца ў нашых паўночных суседзяў, дзе за апошнія гады створаныя і актыўнічаюць ветэранскія арганізацыі былых жаўнераў АК. Літоўцы не доўга ваганіся. У сярэдзіне кастрычніка 1993 г. у Вільні адбыўся грамадскі суд над Арміяй Краёвай. Яна, як мы ўжо ведаем, ваявала на Віленшчыне не толькі супраць немцаў і Саветаў, але і супраць літоўцаў.

Суд быў арганізаваны клубам ахвяраў АК.

На адказ Сусветны саюз Арміі Краёвай прыняў заяву, у якой сказана, што "Армія Краёва накіроўвала сваю дзейнасць супраць савецкіх і нямецкіх акупантаў і іх саюзнікаў. Такім чынам, дайшло да сутыкнення з літоўскімі фарміраваннямі, якія супрацоўнічалі з акупантамі". У заяве нагадваецца пра ўдзел літоўскіх калабарантаў у ліквідацыі палякаў і яўрэяў. Вэтэраны АК дагэтуль не публікавалі фактаў "у імя будучыні". Аднак цяпер, у сувязі з антыпольскай кампаніяй у Літве, адзначаецца ў заяве, устрымацца ад такіх публікацыяў будзе цяжка...

Не зусім так. Публікацыі пра барацьбу з літоўскімі калабарантамі

былі і раней. Некаторыя факты публікацыяў увайшлі ў раздзел "Віленская акруга АК" гэтай кнігі.

Даволі вычарпальны адказ на балючае пытанне дае даследванне Рамана Кораба-Жэбрыка "Белая кніга ў абарону Арміі Краёвай на Віленшчыне" (Люблін, 1991).

Але справа не ў публікацыях, былых і сучасных. Паленміка вакол Арміі Краёвай яшчэ раз яскрава засведчыла складанасць і нешаблоннасць тэмы.

Мы добра разумеем, што ў яе даследванні застаецца нямала "белых плямаў". Штосьці яшчэ высветліцца з часам, пра нешта мы, напэўна, не даведаемся ніколі.

Сапраўднае заключэнне дасць жыццё.

## МАКСІМАЛЬНАЕ ПРЫБЛІЖЭННЕ ДА БЕРАГУ ПРАЎДЫ

### ПАСЛЯСЛОЎЕ РЭДАКТАРА

Сярод кнігаў пра Армію Краёву праца Яўгена Сямашкі, спадзяемся, будзе заўважаная і вучонымі, і радавымі чытачамі ў многіх краінах. Асабліва кінецца яна ў вока беларускаму чытачу. Бо тут яна -- першая.

Аўтар падкупляе грунтоўнасцю даследавання, шырынёю ахопу дакументаў, публіцыстычнасцю падачы матэрыялаў. Неабыякавасцю да адбылага на "Крэсах Всходніх".

Мы ўпэўненыя, хаця пра кнігу будуць спрачацца, яе не абміне ўвагаю і сусед беларуса.

Узняцца на высокі ўзровень навуковай грунтоўнасці, дзёрзкай даследвальнасці, набыць смеласць у падачы вострых пытанняў аўтару памог, безумоўна, немалы журналісцкі вопыт. Я. І. Сямашку беларускі чытач ведае як палеміста. Ён нямала працаваў у газетах Гродзеншчыны, рэспубліканскім друку.

З ягонаю трактоўкаю Арміі Краёвай на Беларусі можна згаджацца ці не, але забыць нельга. Нікому. Гэта радуе.

Разам з тым, павінны сказаць, кніга мае хібы, упушчэнні. Узяць напрыклад, баявыя дзеянні Арміі Краёвай супраць савецкіх партызанаў на Беларусі як рэакцыю на разрыў адносінаў савецкага ураду з польскім урадам у Лондане (красавік 1943), з аднаго боку, і рэалізацыяй беларускімі партызанамі загаду П. Панамарэнкі пра раззбраенне атрадаў Арміі Краёвай, з другога. Гэтая тэма ў кнізе абазначаецца, але даследуецца слаба.

Ці хоць яшчэ адзін накірунак. Армія Краёва вельмі шмат пабіла люду беларускага ў часы вайны і пасля вайны. Толькі атрады Навагрудскай акругі правялі 81 аперацыю (аўтар кнігі спасылаецца на другія дадзеныя) супраць беларускіх партызанаў (Ермаловіч Уладзімір. Армія Краёва// Беларуская мінуўшчына, 1993--№ 5-6). Атрады Стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай, па словах А. Пільха, са снежня 1943 да канца чэрвеня 1944 забілі каля шасці тысячаў

бальшавікоў (тамсама). Большая частка гэтых "бальшавікоў" -- мірныя жыхары. Сяляне абраблялі зямлю і не жадалі выконваць распараджэнні начных госцяў. Іх акаўцы залічвалі да спачоўнікаў Саветам -- і да сценкі.

Рэабілітаваць АК на Беларусі -- значыць прызнаць барацьбу справядлівай. А калі яна справядлівая, то патрэбна выконваць мэты гэтай барацьбы: узнавіць польскія граніцы ў межах да верасня 1939 года. Значыць, зноў вайна. А за што? Хельсінская дэкларацыя падпісаная ўсімі краінамі Еўропы, а для Беларусі гэта не мае значэння? Давайце зноў пачнём праліваць кроў народаў-братоў: беларуса, паляка, рускага, украінца, літоўца.

Кастусь Акула (Аркадзь Качан), жыхар Канады з паваенння, доказна сцвярджае ў сваёй кніжцы, што акаўцы часта ў барацьбе з беларускімі партызанамі разыгрывалі нямецкую карту: падтыкалі гітлераўцам беларускіх партызанаў.

Пра гэта ўсё у кнізе гаворыцца да крыўднага мала. Разгорнутай карціны дзеянняў няма. І зусім практычна не апавядаецца пра ўзаемаадносіны Арміі Краёвай з польскай Арміяй Людовай, Беларускай народнаю самадапамогаю, Беларускай Краёвай Абаронай.

... Можна зразумець аўтара. Радавы працаўнік журналісцкага фронту доўгі час амаль у адзіночку распрацоўваў закрытую да нядаўняга часу тэму -- "Армія Краёва на Беларусі". Штодня зарабляе на хлеб надзённы сабе і дзецям і ўрыўкамі ў вольны час расшуквае, дабіваецца доступу да некранутых дасюль дакументаў пра АК.

Мы разумеем, тэма была табу для навукоўцаў, і нікога не асуджаем. Проста канстатуем факты. Адзначаем неўзнятыя пласты праблемы ў кнізе Яўгена Сямашкі і ўпотайкі спадзяёмся, што кнігу неўзабаве дапоўняць другія даследчыкі, публіцысты, пісьменнікі.

Чаму пісьменнікі?

Грэх праліваць чалавечую кроў. Хто зрабіў гэта -- узяў грахі, злачынствы, злыбеднасць параненага ці забітага на сябе і род свой. У такога можа зусім не быць роду. Абарвецца нечакана. Як ён абарваў ці навучыў абарваць жыццё другога. Армія Краёва пралівала людскую кроў на Беларусі. Тэма даўно заслугоўвае пісьменніцкай распрацоўкі.

...Уважлівы чытач абавязкова заўважыць, што асобныя факты, спасылкі на дакументы, вывады ў аўтара паўтараюцца. Тут справа не ў аўтарскай ці рэдактарскай няўважлівасці. Так робіцца спецыяльна. Каб пазбегнуць двухсэнсавасці пры інтэрпрэтацыі тых ці іншых падзеяў у другім раздзеле; такі паўтор, будзем спадзявацца, дапаможа чытачу не забыць адну з асноўных думкаў, ацэнкаў аўтара.

У адным-двух месцах можна заўважыць, што недастаткова глыбока і сістэматычна гаворыцца пра адбылыя падзеі і пабуджальныя матывы герояў. На жаль, яшчэ не ўсе архівы адкрытыя. Ды і няможна з-за аб'ектыўных прычынаў дасканальна беларусу зрабіць тое, што могуць выканаць даследчыкі з другіх краінаў і гарадоў -- Варшавы, Масквы, Лондана...

Пры некаторых прозвішчах стаяць два ініцыялы, пры асобных адзін, а то і саўсім ініцыял адсутнічае. У адным выпадку прозвішча

даецца з падпольным псеўданімам, у другім -- без яго, альбо толькі псеўданім ці прозвішча. Зноў-такі не трэба падазраваць аўтарскую і рэдактарскую нядбайнасць. Проста на дадзены момант не ўсе звесткі пра дзейныя асобы ўдалося ўстанавіць.

Па матывах чыста маральнага парадку аўтарам зменена некалькі прозвішчаў герояў, назваў мясцовасцяў. Не трэба пячы жывых нашчадкаў адмоўных герояў, як правіла, цяпер старанных працаўнікоў, узорных сем`янінаў, выхавацеляў дзяцей і ўнукаў. Нам вядомыя прыклады, калі пажылыя самавітыя аўтары (пры пасадах!) не пераправерылі данясенне партызанскага сувязнога, камандзіра, камісара, у кнізе абазвалі вяскоўца паліцаем, а той (ці сваяк), не дабіўшыся апраўдання, спрабаваў труціцца. Нават помсціліся. Дык навошта іскры (і слёзы), калі касцёр даўно патухнуў. Навошта кідаць полымя ў чужую хату?

Не ўсе даты адбываных падзеяў высветленыя дакладна, тады яны не ўказваюцца, а калі называюцца, то са словамі "прыкладна".

У кнізе багата цытуецца дакументаў, успамінаў. Не ўсё ў іх, будзем шчырыя, адпавядае сённяшняй праўдзе. Прычыны простыя: час вымагаў акрэсленых і рэзкіх ацэнкаў; у дакументантаў не было поўнай інфармацыі; складальнікі не зусім былі дасведчаныя людзі; мемуарысты зачастую перабольшвалі, як гаворыцца, судзілі са сваіх купінаў. Напрыклад, у вельмі многіх польскіх крыніцах, дзе размова ідзе пра карныя акцыі немцаў на тэрыторыі Беларусі (Вайсрутэніі -- Беларутэніі) ёсць спасылкі на гестапа. Між тым, яно лютавала ў Генеральнай губерні (Польшчы), а на Беларусі ў асноўным дзейнічала СД. Аналогія не такая ўжо і супярэчлівая, але калі афіцыйны гісторык (гісторыкі) так памыляецца, забывае, што дакладнасць -- родная сястра аб`ектыўнасці, то што хацець ад успамінаў партызанскага камандзіра, камісара, радавога разведчыка ці падрыўніка. Яўген Сямашка, як мог, выпраўляў грубыя фактычныя хібы. Асабліва шмат недакладнасцяў, пераўвялічэнняў, выдумкі ва ўспамінах і некаторых "пераможных" данясеннях-рапартах ваеннага часу. Іх аўтар не выпраўляў -- не прыводзіў зусім.

Хацелася б звярнуць увагу чытача на тэксты ў рубрыках "Было гэта так" і "Сведчаць дакументы". Лёгка ўбачыць, што дзе размова ідзе ад імя былых супрацоўнікаў НКУС--НКДБ--МДБ, то жаўнеры Арміі Краёвай называюцца бандзітамі і г. д. І наадварот, ва ўспамінах і дакументах акаўцаў пра Саветы тыя ж ацэнкі, але ўжо ў супрацьлеглы бок. Такія выказванні ў тэкстах не выпраўляліся, не прыгладжваліся, прыводзяцца ў адпаведнасці з арыгіналам. Як слушна адзначае аўтар, з песні слова не выкінеш.

Слова гэтае і выкідаць, на нашу думку, не патрэбна. Дзеля аб`ектыўнасці, максімальнага прыбліжэння да берагу праўды. Болей таго, сам аўтар думкі героя выказвае адпаведна.

Верым, пасля удумнага прачытання кнігі чытач не забудзе яе важкі змест. І пры ўзгадцы пра жорсткую эпоху на Беларусі і жорсткіх людзей будзе мець да яе герояў літасць і спагаду. Як да любое мінуўшчыны на мілай сэрцу радзімнай зямлі.

**Валер САНЬКО.**

# ТЛУМАЧЭННІ НЕЗРАЗУМЕЛЫХ СЛОВАЎ І НАЗВАЎ АРГАНІЗАЦЫЯЎ, ЯКІЯ СУСТРАКАЮЦЦА Ў КНІЗЕ

**Абвер** -- ваенная разведка і контрразведка ўзброеных сіл фашысцкай Германіі.

**Абвод** -- тэрытарыяльная адзінка ў сістэме ваенна-адміністрацыйнага дзялення Арміі Краёвай.

**Абшар** -- тэрытарыяльная адзінка ў сістэме ваенна-адміністрацыйнага дзялення Арміі Краёвай.

**Армія Берлінга** -- 1 армія Войска Польскага, яна было створана на тэрыторыі СССР у 1943 г. па ініцыятыве Саюза польскіх патрыётаў.

**Армія Краёва (АК)** -- Айчынная Армія. Польская падпольная вайсковая арганізацыя ў гады Другой сусветнай вайны, падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане.

**Армія Людова (АЛ)** -- Народная Армія. Польская падпольная вайсковая арганізацыя. Створана 1.1.1944 г. Краёвай Радай Нарадовай (КРН). У яе склад увайшлі розныя канспіратыўныя антыфашысцкія фармаванні левага накірунку.

**Асаднікі** -- польскія вайскоўцы з легіёнаў Пілсудскага. Атрымалі ў падзяку за самааданую службу багатыя зямельныя надзелы на тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Віленшчыны.

**АУН** -- Арганізацыя Украінскіх Нацыяналістаў.

**БІП** -- Бюро інфармацыі і прапаганды галоўнага камандавання Арміі Краёвай.

**БКА** -- Беларуская Краёвая Абарона.

**БНС** -- Беларуская Народная Самадапамога.

**БСА** -- Беларуская Самаахова.

**БЦР** -- Беларуская Цэнтральная Рада.

**Вайсковыя званні ЗВЗ** -- АК (асноўная): шэраговец (радавы), капрал, плютоновы (узводны), сяржант, падхарунжы, харунжы, падпаручнік, паручнік, капітан, ротмістр (у кавалерыі), маёр, падпалкоўнік, брыгадны генерал, генерал броні.

**Ваяводства** -- адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, прыкладна роўная вобласці, губерні.

**"Вахляж"** (польск.) -- "Веер". Назва спецыяльнай дыверсійнай арганізацыі Арміі Краёвай.

**Варшаўскае паўстанне** (1.8.-- 2.10.1944 г.). Узброеная барацьба ў акупаванай немцамі Варшаве. Пачатае па ініцыятыве Арміі Краёвай. Мэта -- авалоданне горадам і ўстанаўленне ў сталіцы Польшчы органаў улады, якія павінны былі падпарадкоўвацца эміграцыйнаму ўраду ў Лондане.

**Войт** -- валасны старшыня.

**Гаўптман** (ням.) -- капітан.

**Гвардыя Людова (Народная Гвардыя)** -- падпольная ўзброеная арганізацыя Польскай сацыялістычнай партыі ў гады фашысцкай акупацыі.

**Генеральная губерня** -- назва цэнтральнай Польшчы ў гады фашысцкай акупацыі.

**Гестапа** -- дзяржаўная тайная паліцыя фашысцкай Германії, утвораная ў красавіку 1933 г.

**Гета** -- лагер масавага ўтрымання і знішчэння яўрэйскага насельніцтва.

**Гміна** -- адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, роўная воласці.

**ГРУ** -- Галоўнае разведвальнае ўпраўленне Чырвонай Арміі.

**ГУЛАГ** -- Галоўнае ўпраўленне лагераў ў сістэме НКУС -- МУС.

**"Двуйка"** -- "двойка". Распаўсюджаная назва разведаддзела польскага генштаба.

**Дэлегатура жонду (1940--1945 гг.)** -- падпольнае прадстаўніцтва лонданскага ўрада на тэрыторыі былой 2 Рэчы Паспалітай.

**ДПУ** -- Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне. Назва савецкіх органаў дзяржбяспекі ў 20-я -- пачатку 30-х гадоў.

**Дэфензіва** -- тайная палітычная паліцыя ў даваеннай Польшчы.

**Жонд** (польск.) -- урад.

**ЗВЗ** -- Звёнзэк валькі збройнэй. Саюз узброенай барацьбы.

**"Знак"** -- назва польскай антыфашысцкай арганізацыі з яскрава выражаным клерыкальным адценнем.

**ЗО** -- Звёнзэк одвету. Саюз помсты.

**ЗСЛ** -- З'едночонэ стронніцтво людовэ. Аб'яднаная народная партыя.

**Інспектарат** -- тэрытарыяльная адзінка ў сістэме ваенна-адміністрацыйнага дзялення Арміі Краёвай.

**Калабарацыяністы (калабаранты)** -- здраднікі, якія супрацоўнічалі з ворагамі сваёй радзімы ў часы яе акупацыі гітлераўскімі войскамі ў гады Другой сусветнай вайны.

**Камендант** -- вайсковая пасада ў структуры Арміі Краёвай.

**Канфідэнт** -- тайны асведаміцель паліцыі.

**Капелан** -- свяшчэннаслужыцель у баявых часцях Арміі Краёвай.

**Кедыў** -- Кіраўніцтва дыверсіямі. Самастойны аддзел галоўнага штаба АК. Створаны ў 1942/43 гг. Дыяпазон дзейнасці -- дыверсіі, сабатаж, выкананне прыгавораў спецыяльных ваенных судоў, арганізацыя партызанскага руху.

**Колэ пулковэ** (польск.) -- палкавая суполка.

**КПЗБ** -- Кампартыя Заходняй Беларусі.

**"Крэсы Всходне"** -- распаўсюджаная ў даваеннай Польшчы назва тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Віленшчыны.

**ЛЛА** (літоўская абрэвіятура) -- Літоўская падпольная армія.

**МДБ** -- Міністэрства дзяржбяспекі.

**МУС** -- Міністэрства ўнутраных спраў.

**МЧК** -- Міжнародны Чырвоны Крыж.

**НД** -- Народова дэмакратыя. Польская палітычная партыя.

**НКДБ** -- Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі.

**НКУС** -- Народны камісарыят унутраных спраў.

**НКШЗ** -- Народны камісарыят шляхоў зносінаў.

**НЛК** (літоўская абрэвіятура) -- Камітэт вызвалення Літвы.

**НСЗ** (польск. абрэвіятура) -- Народовэ сілы збройнэ. Нацыя-

нальныя ўзброеныя сілы. Ваенна-палітычная арганізацыя пілсудчыкаў ў гады Другой сусветнай вайны.

**НСДАП** (ням. абрэвіятура) -- Нацыянал-сацыялістычная рабочая партыя Германіі.

**Павет** -- адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, прыкладна роўная раёну.

**Паліцыя аховы парадку** -- нямецкія ўзброеныя фарміраванні. Ахоўвалі ваенныя і другія аб'екты, вялі барацьбу з партызанамі, удзельнічалі ў знішчэнні мірнага насельніцтва і адпраўцы людзей на катаргу ў Германію.

**Пастэрунак** (польск.) -- паліцэйскі ўчастак.

**ПБН** -- Партыя Беларускіх Нацыяналістаў.

**Пляцувка** (польск.) -- пляцоўка. Тэрытарыяльная адзінка ў сістэме ваенна-адміністрацыйнага дзялення Арміі Краёвай.

**ПОВ** (польск. абрэвіятура) -- Полькая вайсковая арганізацыя.

**Польскі эміграцыйны ўрад у Лондане, альбо Лонданскі Ўрад** -- распаўсюджаная назва польскага ўрада ў эміграцыі.

**ППР** (польск. абрэвіятура) -- Польская Рабочая Партыя.

**ППС** (польск. абрэвіятура) -- Польская Сацыялістычная Партыя.

**ППС — ВРН** (польск. абрэвіятура) -- Польская Сацыялістычная Партыя -- Свабода. Роўнасць. Незалежнасць.

**ППСД** (польск. абрэвіятура) -- Польская Сацыял-Дэмакратычная Партыя.

**"Працэс 16-ці"** -- судовы працэс у Маскве па справе арганізатараў, кіраўнікоў і ўдзельнікаў польскага падполля ў тыле Чырвонай Арміі на тэрыторыі Польшчы, Літвы і заходніх раёнаў Беларусі і Украіны. Адбыўся 18--21 чэрвеня 1945 г.

**ПРПС** (польск. абрэвіятура) -- Рабочая Партыя Польскіх Сацыялістаў.

**ПЧК** -- Польскі Чырвоны Крыж.

**Рэч Паспаліта** (польск.) -- Рэспубліка.

**Санацыя** (польск.) -- прыхільнікі Пілсудскага і іх палітыка.

**Саўгума** -- літоўская палітычная паліцыя.

**СД** -- Паліцыя бяспекі і служба бяспекі. Адзін з асноўных карных органаў гітлераўскай Германіі. Ён аб'ядноўваў дзяржаўную тайную паліцыю (гестапа), крымінальную паліцыю і шпіёнскую карную арганізацыю СД (зіхерхайтсдзінст. -- ням.).

**СЗП** (польск. абрэвіятура) -- Служба звыценьству Польскі. Служба за перамогу Польшчы.

**Солтыс** -- сельскі стараста.

**Стараста** -- павятовы начальнік.

**СС** -- Ваенізаваныя ахоўныя атрады. Карныя фарміраванні нямецкіх фашыстаў, якія адзначаліся асобай жорсткасцю.

**Стронніцтво Дэмакратычнэ** -- Дэмакратычная Партыя.

**Стронніцтво Людовэ** -- Польская Сялянская Партыя, знаходзілася ў апазіцыі да ўрада Пілсудскага.

**Стронніцтво Народовэ** -- Нацыянальная Партыя.

**"Стшэлец"** (польск.) -- "Стралец". Польская ўрадавая ваенізаваная арганізацыя моладзі.

**ТАП** -- Тайная армія Польшчы. Падпольная антыфашысцкая арганізацыя ў гады Другой сусветнай вайны.

**УБК** (польск. абрэвіятура) -- Ударны кадравы батальён.

**Узнагароды Арміі Краёвай** (асноўныя): ордэн Віртуці Мілітары, Крыж Заслугі, Крыж Валечных.

**УПА** -- Украінская паўстанцкая армія.

**"Усходнікі" ("васточнікі", "рускія")** -- распаўсюджаная назва грамадзянаў, якія прыбылі ў Заходнюю Беларусь пасля верасня 1939 г. з усходніх тэрыторыяў СССР, у тым ліку з Усходняй Беларусі.

**ХД** -- Партыя Хрысціянскіх Дэмакратаў.

**Харцэры** -- члены вучнёўскай маладзёжнай арганізацыі ў Польшчы.

**"Ціхацёмныя"** -- распаўсюджаная ў Польшчы назва парашутыстаў-дыверсантаў, якія прайшлі спецпадрыхтоўку ў Англіі ў час Другой сусветнай вайны.

**Шутцпаліцыя** -- нямецкая ахоўная паліцыя.

**Шутцпункт** -- вайсковае ўмацаване, пабудаванне з мэтай вядзення абароннага бою.

**Эйнзатцгрупа** -- спецыяльная аператыўная група, у склад яе ўваходзілі каманды эсэсаўцаў, паліцыі і СД. Выконвала карныя функцыі, адзначалася асаблівай жорсткасцю.

**Экспазітура** (польск.) -- прадстаўніцтва.

**Эсэсман** -- радавы ў войсках СС.

## КРЫНІЦЫ


Ампилов В. А. Герои Лидского подполья // Смена. -- 1959. -- № 4;

Ампилов В. А., Смирнов В. В. В маленьком городе Лиде.-- М.: Молодая Гвардия, 1962;

Архіў упраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці: Калекцыя дакументаў;

Архіў упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці: Калекцыя дакументаў;

Асееў В. М. Успаміны. Машынапіс. Копія -- у архіве аўтара;

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941--1945: Энцыкл.-- Мн.: БелСЭ, 1990;

Борьба трудящихся Западной Белорусии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы. (В 2-х т.) -- Мн: Беларусь, 1972;

Бессмертные имена. -- Мн.: Беларусь, 1979;

Боровский А. И. О них молчали сводки. -- Мн.: Беларусь, 1970;

Бугай Н. Ф. Депортация // Политический собеседник. -- 1990. -- № 6;

Бугай Н. Ф. К вопросу о депортации // История СССР.-- 1989. -- № 5;

Бугай Н. Ф. Шли поезда на Восток // Политический собеседник.-- 1991. -- № 5;

Будай Г. В. Свинцом и словом: Записки журналиста. -- 2-е изд., испр. и доп. -- Мн.: Беларусь, 1981;

В единой семье советских народов. Материалы Республиканс-

кой межвузовской конференции, посвященной 30-летию воссоединения белорусского народа в единое Советское социалистическое государство. -- Мн.: Вышэйшая школа, 1970;

В едином строю: Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии, 1941--1944 -- М.: Беларусь, 1970;

В памяти народной. -- Мн.: Беларусь, 1970;

В Принеманских лесах: Воспоминания партизан и подпольщиков. -- Мн.: Беларусь, 1970;

Василючек М. В. В семье единой: Воссоединение Западной Белоруссии в братской сёмье народов. -- Мн.: -- Высш. школа, 1977;

Венце Б. Участие поляков в борьбе советского народа с немецко-фашистскими захватчиками на временно оккупированной территории Белоруссии (1941--1944 гг.). -- М.: Акад. общест. наук ЦК КПСС. Каф. истории СССР;

Викторов Б. А. Без грифа "секретно": Записки военного прокурора. -- М.: Юрид. лит., 1990;

Вильчинский Р. Люди героической судьбы // Гродненская правда. -- 1987.-- 19 декабря;

Волков Ф. Д. Тайное становится явным: Деятельность дипломатии и разведки западных держав в годы 2-й мировой войны. -- М.: Политиздат, 1989;

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 -- июль 1944): Документы и материалы. В 3-х т.-- Мн.: Беларусь, 1973;

Высоцкі Я. В. 50 гадоў бітве пад Леніна: Погляд з Польшчы // Звязда. -- 1993--12 кастрычніка.

Вярстак Р. Канец "ваўка-адзіночкі": Дакументальная аповесць // Звязда. -- 1987.--27--29 лістапада;

Гарбацэвіч А. Палёнізацыя Заходняй Беларусі. -- Мн., 1932;

Гарбуноў Т. Год пад сцягам Саветаў: Да гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі ад іга панскай Польшчы. -- Мн.: Дзяржвыд. пры СНК БССР, 1940;

Гарбуноў Ц. З. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве. -- 2-е выд. -- Мн.: Дзяржвыд. БССР, 1952;

Гісторыя Беларускай ССР у 5-ці т. Т. 4. -- Мн.: Навука і тэхніка, 1975;

Горлов С. Литовская земля... // Неделя. -- 1989. -- № 8;

Гроднеў М. П. Нязведаная даль. -- Мн.: Маст. літ., 1989;

Груздев К. А. Солдаты партизанского фронта. -- Мн.: Беларусь, 1969;

Дело Берия. Пленум ЦК КПСС -- 2--7 июля 1953 г.: Стенографический отчет // Известия ЦК КПСС.-- 1991. -- № 1--2;

Джибути В. Независимость за чужой счет? // Сельская газета. -- 1990. -- 13 мая;

Долготович Б. Д. В одном строю -- к единой цели. -- Мн.: Наука и техника, 1985;

Дорогами отцов. -- М.: Мол. квардия, 1967;

Жук Н. П. Партизанское движение в Белоруссии периода

Великой Отечественной войны в отражении Западногерманской буржуазной историографии: Дис. канд. ист. наук / АН БССР, Ин-т истории.-- Мн., 1990;
Игнатенко И. М., Мацко А. Н. Дорогой борьбы и созидания: К 40-летию воссоединения Западной Белоруссии с БССР. -- Мн.: Беларусь, 1979;
Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941--1944 гг.): Сборник воспоминаний. -- Мн.: Госиздат БССР, 1961;
Каваленка В. Вяртанне нацыянальнай ідэі // Звязда.-- 1993. -- 26 лістапада;
Казьянін У. С. Успаміны. Запіс размовы 1.11.1990 г. -- у архіве аўтара;
Калубовіч А. Крокі гісторыі: Даследаванні, артыкулы, успаміны. -- Мн.: Маст. літ., 1993;
Канун и начало второй мировой войны: Тезисы, подготовленные комиссией ученых СССР и ПНР по истории международных отношений между двумя странами // Правда.-- 1989. -- 25 мая;
Карев Д. С., Савицкий Н. И. Очерки истории советской военной прокуратуры.-- М.: ВЮА., 1948;
Колас І. За гадзіну да світання // Маладосць.-- 1971. -- № 8;
Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 3. (1943--1945). -- Мн.: Беларусь, 1985;
Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне: Документы и материалы (Сост. Г. Н. Шевела). -- Мн.: Беларусь, 1988;
Корсак А. Страсці вакол Арміі Краёвай разгараюцца // Звязда -- 1993.--23 кастрычніка;
Котляр Н. М. Именем закона. -- М.: Воениздат, 1981;
Крапивин С. В ожидании "чуда на Немане": Армия Крайова и белорусские партизаны // Советская Белоруссия.-- 1990.--30 октября;
Круталевіч В. А. Станаўленне дзяржаўнасці: Да 70-годдзя абвяшчэння БССР. -- Мн., 1989;
Ладысеў У. Шлях да свабоды: З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919--1939 гг.-- Мн.: Б. выд-ва, 1978;
Липский Я. Ю. Две Родины -- два патриотизма // Иностранная литература. -- 1993. -- № 2;
Люди легенд: Очерки о партизанах и подпольщиках. Вып. 3. -- М.: Политиздат, 1968;
Люди легенд: Очерки о партизанах и подпольщиках. Вып. 3. -- М.: Политиздат, 1968;
Люди Нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны.-- Мн.: Беларусь, 1975;
Малецкі І. Пад знакам "Пагоні". -- Таронта, 1976;
Мацко А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933--1939 гг.).-- Мн.: Изд-во Акад. наук БССР, 1963;
Михайлашев Н. А. Буря гнева. Записки чекиста: О деятельности

подпольщиков и партизан-чекистов в годы Великой Отечественной войны. -- Мн.: Беларусь, 1971;

Михнюк В. Н. Социалистические преобразования в западных областях БССР (сентябрь 1939 -- июнь 1941 гг.): Историографический очерк. -- Мн.: Наука и техника, 1979;

Млечин Л., Чернова Г. "Нас проверяли еще целый год": Беседа с бывшим сотрудником ГРУ Красной Армии Виталием Никольским // Новое время. -- 1991. -- № 26;

Националисты -- пособники гитлеровцев (Сборник документов) -- Вильнюс: Минтис, 1970;

Нацистская политика геноцида и "выжженной земли" в Белоруссии (1941 -- 1944). -- Мн.: Беларусь, 1984;

Непокоренная Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. -- М.: Воениздат, 1963;

Нібуш А. М. Успаміны. Рукапіс. Копія -- у архіве аўтара;

Орехов Н. С. Дела и люди КПЗБ: Воспоминания.-- Мн.: Беларусь, 1983;

Орлов А. С. СССР -- Германия: август 1939 -- июнь 1941. -- М.: Знание, 1991;

Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 2 (1921--1966). -- Мн.: Беларусь, 1967;

Павлов Я. С. В суровом сорок первом. -- Мн.: Беларусь, 1985;

Палецкис Ю. И. В двух мирах. -- М.: Политиздат, 1974;

Парсаданова В. С. Депортация населения из Западной Украины и Западной Белоруссии // Новая и новейшая история. -- 1989. -- № 2;

Парсаданова В. С. Советско-польские отношения в годы Великой Отечественной войны, 1941 -- 1945. -- М.: Наука, 1982;

Парсаданова В. С. Советско-польские отношения, 1945--1959.-- М.: Наука, 1990;

Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927--1939 гг.).-- Мн.: Наука и техника, 1978;

Пракопчык В. Салдаты Арміі Краёвай сабраліся ў Гродне // Звязда. -- 1993.--28 верасня;

Преступления немецко-фашисцких захватчиков в Белоруссии, 1941 -- 1944. Документы и материалы. Изд. 2-е, испр. и доп.-- Мн.: Беларусь, 1965;

Пышкин Н. С. Коммунистическая партия Белоруссии в борьбе за социалистическое преобразование сельского хозяйства западных областей Белоруссии (1944--1950 гг.). Автореф. дис. на соиск. ученой степени канд. ист. наук. -- Мн., 1956;

Рамаnоўскі В. П. Саўдзельнікі ў злачынствах. -- Мн.: Беларусь, 1964;

Раманоўскі В. П. Супраць фальсіфікацыі гісторыі савецкага партызанскага руху. -- Мн.: Дзяржвыд. БССР, 1962;

Реабилитация: КГБ СССР сообщает // Правительственный вестник. -- 1990. -- № 7;

Салосюк В. Армия Крайова переходит в наступление // Советская Белоруссия. -- 1993.--29 сентября;

Салосюк В. Камо грядеши? // Советская Белоруссия. -- 1993.-- 16 ноября;

Свобода пришла с Востока: Торжественное заседание, посвященное 50-летию воссоединения Западной Белоруссии с Белорусской ССР // Советская Белоруссия.-- 1989.--12 ноября;

Секретные документы из особых папок // Вопросы истории.-- № 1;

Семашко Е. Когда умирали молодыми // Красное знамя. -- 1970.--12 сентября;

Семашко Е. Под знаком ложной цели // Политический собеседник. -- 1990.--№ 8;

Семашко Е. Схватка длиною в 10 лет // Политический собеседник. -- 1990._--№ 2--6;

Сланеўскі А. Армія Краёва: стрэл з мінулага?.. // Звязда. -- 1993.--11 лютага;

Смоленский Л., Токарев Н. Джана взять живым // Белорусская нива. -- 1993. -- 14, 16, 20, 21, 23 июля;

Снітко А. З кім ваявалі акаўцы? // Літаратура і мастацтва. -- 1992.--23 кастрычніка;

Сообщения Советского Информбюро, 1944--1945. Т. 7. Июль -- декабрь 1944. -- М.: Совинформбюро, 1945;

Сорокин А. А. Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Беларуссии (1920--1939 гг.).-- Мн.: Изд. БГУ, 1970;

Сташкевич Н. С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белорусии (1917--1925). -- Мн.: Ун-т, 1985;

Судебный отчет по делу об организаторах, руководителях и участниках польского подполья в тылу Красной Арми на территории Польши, Литвы и западных районов Белоруссии и Украины, рассмотренному Военной коллегией Верховного Суда Союза ССР 18 -- 21 июня 1945 г. (Стеногр. отчет). М.: Юрид. изд-во НКЮ СССР, 1945;

Сушчук А. Хто я -- беларус? Украінец? Яцвяг?.. //. Звязда. -- 1993. -- 21 студзеня;

Сцёпін У. Я. Успаміны. Запіс размовы 29.10.1990 г.-- у архіве аўтара;

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польскай В. Ждановіч. Каментарыі А. М. Літвіна. -- Мн.: Беларусь, 1993;

У суровыя гады падполля: Успаміны былых членаў КПЗБ -- актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. -- Мн.: Дзярж. выд. БССР, 1958;

Филимонцев И. Был тихий месяц верасень...: Межнациональные отношения: история и современность // Сельская жизнь. -- 1989. -- 2 ноября;

Хацкевич А. Аресты и депортация в западных областях Беларуси (1939--1941) // Беларускі гістарычны часопіс. -- 1994. -- № 1--2;

Хацкевіч А. Армія Краёва: што мы пра яе ведаем? // Звязда. -- 1993.--30 красавіка;

Хацкевіч А. Бандэроль з Лондана // Звязда. -- 1991.--14 чэрвеня;

Хацкевіч А. Ведаю: не ўсё было так: "Белыя плямы" гісторыі // Мінская праўда. -- 1992--21 лістапада;

Хацкевіч А. Змагаліся разам, затым пасварыліся: "Белыя пля-

мы" гісторыі // Мінская праўда. -- 1992. -- 8 верасня;
Хацкевіч А. Правда и вымыслы // 7 дней -- 1993. -- 23 октября;
Хацкевіч А. "Над Нёманам і Ашмянкай": Гісторыя без "белых плям" // Звязда. -- 1991--27 снежня;
Хацкевич А. Узлы развязывает время: Формирования польской Армии Крайовай на территории западных областей Беларуси (1943--1944) // Нёман.-- 1994.-- № 1;
Хацкевіч А. Хто забіў Вацлава Іваноўскага? // Звязда.-- 1993.--22 ліпеня;
Храналогія гісторыі Беларусі. 3-е выданне, перапр. і дапоўн. -- Мн.: Бел. Энцыклапедыя, 1992;
Цанава Л. Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков. Ч. 2 -- Мн.: Госиздат БССР, 1951;
Царьков В. А. Школа особого назначения // Военно-исторический журнал. -- 1989. -- № 12;
Царюк И. П. В семье единой. -- Мн.: Беларусь, 1969;
Черненко П. Они воевали против оккупантов // 7 дней--1993.--17 апреля;
Черный И. Н. Данные достоверны. -- М.: Воениздат, 1968;
Шелепин А. Н. История --учитель суровый // Труд. -- 1991--14 марта;
Шумейко М. Если завтра война...: Военно-политическая обстановка в Белоруссии накануне Великой Отечественной войны // Белорусская нива. -- 1991.--20 июня;
Энциклопедический словарь.-- М.: Советская энциклопедия, 1987;
Этнаграфія беларусаў.-- Мн.: Навука і тэхніка, 1985;
Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя.-- Мн.: БелСЭ, 1989;
Юркин М. Я. У нас особое задание.-- М.: Сов. Россия, 1973;
Янец С. Давайте вещи называть своими именами // 7 дней -- 1993--17 апреля.

Armia Krajowa w dokumentach, 1939--1945. T. 1--5.-- Londyn, 1970--1981;
•Baczyński D. M. Ty musisz żyć... (Pamiętnik zesłańca).-- W-wa, 1990;
Banasikowski E. Na zem ziemi Wileńskiej. -- W-wa, 1990;
Białe plamy. 1--5. -- W-wa, 1989;
Białorus, Litwa, Polska: Współzycie, konflikty, punkty widzenia. -- W-wa, 1989;
Bielski M. Obrona Grodna we wrzesniu 1939 r. // WPH*--W-wa, 1990, N 3/4;
Bilewicz M. M. Wyszedłem z mroku. -- W-wa, 1989;
Blum J. Polacy w Związku Radzieckim. Wrzesień 1939 -- maj 1943 // WPH -- W-wa, 1967, № 1;
Bystrzycki P. Głosa do "cichociemnych" // WPH -- W-wa, 1991 -- № 1;
Bystrzycki P. W sprawie śmierci "cichociemnego" kpt Bochdana Piątkowskiego -- "Maka" // WPH -- W-wa, 1967 -- № 2;
Bystrzycki P. Znak cichociemnych. -- W-wa, 1983;
Caban I. Polacy internowani w ZSRR w latach 1944--1947: Transporty i obozy. -- Lublin, 1990;
Cherubin D. Ludnosc polska w więzieniach i obozach. -- W-wa, 1988;
Chlebowski C. Gdy las był domen. -- Lodz, 1972;
Chlebowski C. Odłamki granatu. -- W-wa, 1972;
Chlebowski C. Wachlarz: Monografia wydzielonej organizacji dywersyjnej Armii Krajowej. Wrzesień 1941 -- marzec 1943. -- W-wa, 1985;
Cłowała J. Purga: Wśród więzniów i zesłańców w ZSRR. 1941--1955.-- W-wa, 1990;
Cozdawa-Golembiowski J. Kiedyw Białowiezy. -- W-wa, 1990;
Cygan W. K. Działanie na Nowogrodczyznie, Wilenszczyznie i Gradzieńczczyznie po 17.9.1939 r. // WPH -- W-wa, 1990 -- №. 1/2;
Czapski I. Na nieludzkiej ziemi. -- W-wa, 1990;
Czerkawski T. M. W więzieniu i łagrze. 1940--1941 (Ja socialno opasnyj element). -- W-wa, 1989;
Czerniakiewicz J. Przemieszczenie polakow i zydow na Kresach Wschodnich II Rzeczpospolitej i w ZSRR. 1939--1959 // Studia i materialy CBW -- W-wa, 1991-- Z. 21;
Czerniakiewicz J. Stalinowska depolonizacja Kresow Wschodnich II Rzeczpospolitej // Studia i materialy CBW -- W-wa, 1992--Z. 33;
Dobaczewska W. Wileńszyzna. -- Wilno, 1937;
Drewnowska J. Cynga: Wspomnienia z łagrow Pólnocy. 1940--1941. -- W-wa, 1988;
Drobniak T. 8 batalion 77 PP AK "Bochdanka" zgrypowania Nadniemańskich batalionow partyzanckich // WPH -- W-wa, 1991 -- № 1;
Encyklopedia II wojny światowej. -- W-wa, 1975;
Erdman J. Droga do Ostrej Bramy. -- W-wa, 1990;
Fikus. D. Pseudonim "Lupaszka".-- W-wa, 1990;
Gasztold T. Nad Niemnem i Oszmianka. -- Koszalin, 1991;

Gerty J. O pszyszłości Ziem Wschodnich. -- Londyn, 1946;
Głowacki A. Uwagi o tworzeniu terenowych struktur organizacyjnych Związku Patriotow Polskich w ZSSR (1943--1945). ZPP na Wileńszczynie, Zachodnej Białorusi i Zachodniej Ukrainie // Acta Univ. lodziensis -- Łodz, 1986--№ 24;
Gondek L. Polska karząca. 1939--1945.-- W-wa, 1988;
Grelak C. Grodno, 1939. -- W-wa, 1980;
Habelski R. Niezłomni nieprzejednani: Emigracyjne "Wiadomości" i ich krag. 1940--1981. -- W-wa, 1991;
Herling-Grudzinski G. Jnny swiat: Zapiski sowieckie. -- W-wa, 1989;
Historia i wspólczesnność polakow na wschodzie // Przegląd Wshodni -- W-wa, 1991-- z.1;
Hołub Cz. Jeszcze o rozbiciu więzienia w Pińsku w 1943 // WPH -- 1967--№ 2;
Hołub Cz. Okręg Poleski ZWZ -- AK w latach 1939--1944: Zarys dziejow. -- W-wa, 1991;
Jankowski S. M. "Agaton" z falszywym auswejsem w prawdziwej Warszawie: Wspompienie, 1939--1946. T. 1-2. -- W-wa, 1991;
Jarecki W. Nieostygła ziemia.-- Gdańsk, 1970;
Jasenica P. (Beynar L.) Pamęitnik. -- Kraków, 1989;
Jasudowicz T. Losy obywatelstwa polskiego na Ziemi Wileńskiej // Studia i materiały SBR -- W-wa, 1991-Z. 10;
Jaworski M. Korpus bezpieczeństwa wewnętznego. -- W-wa, 1984;
Jadrzejewski Z. Od września do września. -- W-wa, 1989;
Juchniewicz M. Gdzie byl wróg, tam walczyli polacy. -- W-wa, 1985;
Juchniewicz M. Na wschod od Bugu. -- W-wa, 1985;
Juchniewicz M. Polacy w radzieckim ruchu podziemnym i partyzanckim. 1941--1944. -- W-wa, 1973;
Katyn: Relacje, wspomnienia, publicystyka. -- W-wa, 1989;
Kochanowicz T. W Komi i gdzie indziej: Wspomnienia z pobytu w ZSRR (1939--1942).-- W-wa, 1989;
K osiński Z. 3 brygada partyzancka Wileńskiego okręgu AK // WPH -- W-wa, 1991--№ 1;
Korab-Żebryk W. Opieracja Wilenska AK. -- W-wa, 1988;
Korab -- Żebryk R. Riala
Ksiega w obronie Armii Krajowej na Wileńszczyznie.-- Lublin, 1991;
Korpalska W. Władysław Eugeniusz Sikorski: Biografia polityczna. -- Wrocław, 1981;
Kosman M. Historia Białorusi. -- Wrocław, 1976;
Kosowicz I. Białorus w 1939--1945 r.-- Londyn, 1949;
Kosztyła X. Oddział wydzielony Wojska Polskiego majora Hubała. -- W-wa, 1987;

---

*WPH -- Wojskowy przegląd historyczny--Ваенна-гістарычны агляд. Польскі часопіс. Як правіла, выходзіць адзін раз у квартал.

Kowalski W. Bolszewicka okupacia Białostocczyzny // Kontrasty -- Białystok, 1990 -- №№ 3--5/6;
Kowalski W. Dla czego Wilno nie bronilosię? // WPH -- 1990 -- № 3/4;
Kowalski W. Krzywda Marysi // Kontrasty -- Białystok, 1990 -- № 2;
Kowalski W. Tak bronilosię Grodno // Kontrasty -- Białystok, 1990 -- № 1;
Krajewski H. Droga wiodła przez Urał.-- W-wa, 1988;
Kumorek M. Z kresow do Pieczorskich lagrow . -- W-wa, 1990;
Kumoś Z. O wolna i demokratyczna Polska: Mysl polityczna i wojskowa lewicy polskjej w ZSSR. 1941--1944. -- W-wa, 1969;
Kusinski W. Deportacje ludnosci w ZSRR // Studia i materiały CBR -- W-wa, 1991 -- Z. 9;
Lechowicz W. Będziesz przeklinał ten dzień... -- W-wa, 1989;
Leinwand A. Przywodcy Polski podziemnej przed sądem Moskiewskim. -- W-wa, 1989;
Libich H. Spod Wilna na Siberie. -- W-wa, 1990;
Lipińska G. Jesli zapomnie o nich. -- W-wa, 1990;
Lisiewicz P. M. Bezimenni: Z dziejow wywiadu Armii Krajowej. -- W-wa, 1987;
Łojek J. Agresia 17 września 1939: Studium aspektow politycznych. -- W-wa, 1990;
Łopinowski N. Rozmowy z NKWD, 1940--1941. -- W-wa, 1990;
Łossowski P. Po tej i tamtej stronie Niemna: Stosunki polsko-litewskie.-- W-wa, 1985;
Machejek W. Podziemne państwo AK -- wróg № 1 i wróg № 2 // Zycie literackie, Kraków, 1956 -- №№ 21--22;
Madajczyk Sz. Dramat Katyński. -- W-wa, 1989;
Malewski J. Ptasznik z Wilna: O Józefe Mackiewiczu. -- Kraków, 1991;
Malinowski K. Tajna Armia Polska. Znak. Konfederacja Zbrojna. -- W-wa, 1986;
Materiały do epitafiow Katyńskich // WPH -- 1990 -- №№ 2/3--3/4;
Mazur G. Biuro Informacji i Propagandy SZP--ZWZ--AK, 1939--1945.-- W-wa, 1987;
Mikuszowa D. Jeszsze raz w sprawie Mińska // Za wolność i lud -- 1967-- № 7;
Monkiewicz W. Białowieża w cieniu swastyki. -- Białystok, 1984;
My, deportowani: Wspomnienia Polakow z więzień, łagrów i zsyłek w ZSRR. -- W-wa, 1989;
Na odnowionym cmentarzu w Mikuliszkach // Kurier Wileński -- 1992--30 czerwca;
Noskowski W. Wałki 77 PP w obronie Ziemi Lidzkiej // WPH-- 1990-- 3/4;
Paczkowski A. Lekarz nie przyjmuje. -- W-wa, 1981;
Pamięć wspulnej walki. -- W-wa, 1989;

Pamiętnik Wileński. -- Londyn, 1972;
Pisarewski-Parry F. Orly i reszki.-- W-wa, 1984;
Podlaski K. (Skardziński W.) Białorusini. Litwini. Ukraińcy. -- Białystok, 1990;
Polacy w ZSSR, 1939--1942: Antołogia. -- W-wa, 1991;
Polska, 1918--1988. -- W-wa, 1989;
Polska: Informator encykłopedyczny. -- W-wa, 1986;
Polska podziemna: Rozmowa z prof. Tomaszem Strzemboszem // Glos znad Niemna -- 1992--№ 22;
Polska w czasie II wojny światowej. -- W-wa, 1986;
Polska w polityce międzynarodowej, 1939--1945: Zbiór dokumentów.-- W-wa, 1989;
Polskie Sily Zbrojne w drugiej wojnie światowej. T. 3. "Armia Krajowa".-- Londyn, 1950;
Polski ruch oporu, 1939--1945. -- W-wa, 1988;
Popiel K. Generał Sikorski w mojej pamięci. -- Wyd. 3-- W-wa, 1986;
Prawdzic-Szlaski I. Nowogrodczyna w walce. 1940--1945. -- Londyn, 1978;
Prus E. Atamania UPA: Tragedia kresów. -- W-wa, 1989;
Pruszyński K. Noc na Kremlu. -- W-wa, 1989;
Rzepecki I. Organizacja i działania Biura informacji i propagandy (BIP) Komendy Głownej AK // WPH -- 1971 -- № 4;
Rzepecki I. Wspomnienia i przyczynki historyczne. -- W-wa, 1983;
Roszko I. Major Dobrzański idzie na Warszawą // Kontrasty -- Białystok, 1990 -- № 3;
Ryszk F. Wspomnienia o ziemiaństwe kresowym // Polityka -- 1989 -- № 51/52;
Siemiński I. Walczące Grodno: Wspomnienia harcerza. -- Białystok, 1990;
Skarzyński K. Katyń. -- Paryz, 1990;
Sosabowski S. Droga wiodła ugorem.-- Kraków, 1990;
Stechiewicz S. Ieszcze raz y sprawie opieracji Wileńskiej AK // WPH -- 1990, № 1/2;
Stępniowski T. Powstanie i działalność organizacyjno-bojowa "Wachlarza" // WPH -- 1967--№ 2;
Subotkin W. Tragiczny lot generała Sikorskiego: Fakty i dokumenty. -- Szczecin, 1986;
Szczesniak I. Ieszsze pare slow o zagladzie IV odcinka "Wachlarza" // WPH -- 1969 -- № 4;
Ślaski E. Polska walcząca, 1939--1945 T. 1--4. -- W-wa, 1985/86;
Tajne rokowania polsko-radzieckie w 1919 r. -- W-wa, 1986;
Tarka K. Komendant "Wilk" (1895--1951): Z dziejow Wileńskiej AK. -- W-wa, 1990;
Terej I. I. Na rozstajach drog: ze studiow nad obliczem i modelem Armii Krajowej. -- Wrosław, 1986;
Terlecki O. Władysław Sikorski. -- Wroslaw ets., 1985;
Tragedia Komunistysznej Partii Polski. -- W-wa, 1989;
Truszkowski Z. Partyzanckie wspomnienia. -- W-wa, 1968;

Truszkowski Z. Z dni pokoju i wojny 1921--1939. -- W-wa, 1983;
Tucholski I. Cichociemni. -- W-wa, 1984;
Tucholski I. Przemysławowi Bystrzyckiemu w odpowiedzi // WPH -- 1991 -- № 1;
Turonek I. Kwestia bialoruska w polityce obozu łondyńskiego (1941--1944) // Studia z dziejow ZSRR i Europy Środkowej. T. 19. -- Wrocław ets., -- 1983;
Turonek I. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. -- W-wa, 1992;
Tuszyński W. II wojna światowa: Ruch oporu w Polsce, 1939--1943. -- W-wa, 1985;
Tuszyński W. II wojna światowa: Bitwy partyzanckie: Ruch oporu w Polsce, 1944--1945.-- W-wa, 1987;
Tymowski M. et al. Historia Polski. -- Parys, 1986;
Uborowski L. Okręg ZWZ -- AK Białystok pod radziecka okupacja, 1939--1941 // Kierunki -- W-wa, 1989 -- № 42;
Ungar Z. W. Walczące Grodno // Głos znad Niemna -- 1992 -- №№ 18--21;
"W czterdziestym nas Matko na Sibir zesłali..." Polska a Rosja, 1939--1942. Wyd. 2.-- W-wa, 1989;
W kraju i na emigracji: Materiały z łondyńskiego archiwum ministra prof. Stanisława Kota (1939--1943). -- W-wa, 1989;
W sojuszniczym Londynie: Dziennik ambasadora Edwarda Raczyńskiego, 1939--1945.-- W-wa, 1989;.
Wanat I. Zakonspirowany w klasztorze żolnierz Armii Krajowej z Wilna // Kurier Wileński -- 1992-- 18 grudnia;
Wańkowicz M. Wrzesien zagiący. -- W- wa, 1990;
Wasilewski A. Konspiracja w Wilnie // Kontrasty.-- Bialystok, 1990-- № 2;
Wasilewski A. Ucieczka gen. Wilka z obozu w Griazowcu // Kontrasty -- Białystok, 1990-- № 3;
Wieczorkiewicz P. P. Batalion bohaterow // Polityka -- 1983 -- № 51;
Wróblewski I. Samodzielna grupa opieracyjna "Polesie", 1939. -- W-wa, 1989;
Wrzesień 1939 w relacjach dyplomatów... -- W-wa, 1989;
Wrzesień 1939 w relacjach i wspomnieniach. -- W-wa, 1989;
Z gminy Ejszyszskjej // Kurier Wileński. -- 1992--7 sierpnia;
Zabiełło S. Kształtowanie się koncepcji "Burzy" // WPH--1968 -- № 1;
Zamojski I. Wielka Brytania w swietle działalnośći Special Operations Executive // Dzieje najnowsze -- W-wa, 1971 -- № 1/2;
Ze wspomnień żolnierzy AK okręgu Nowogrodek. -- W-wa, 1983;
Żaron P. Kierunek wschodni w strategii woiskowo -- politycznej gen. Władyslawa Sikorskiego, 1940--1943. -- W-wa, 1988;
Żaron P. Ludnosc polska w Związku Radzieckim. -- W-wa, 1990.

## ЗМЕСТ


Трэба расчысціць поле. Уступнае слова аўтара. . . . . . . . . . . 3
**ЧАСТКА І.** Прадвеснікі АК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Яшчэ да вайны. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Абшар Беласток. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Канспірацыя на Віленшчыне. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Яны ішлі на ўсход. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Пад ударамі НКУС. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Узняўся меч над Віліяй. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Арышты і дэпартацыя. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
**ЧАСТКА 2.** Пад знакам канцэпцыі "двух ворагаў" . . . . . . . . 54
У новых абставінах. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
"Ціхацёмныя". . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
"Вахляж". . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
"Вахляж". Участак 3. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
"Вахляж". Участак 4. "Мінскі кірмаш". . . . . . . . . . . . . . . . 83
"Вахляж". Участак 4. Мінская трагедыя . . . . . . . . . . . . . . . 94
"Вахляж". Участак 5. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
План "Навальніца" ("Бура"). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Палеская акруга АК. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Навагрудская акруга АК. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Віленская акруга АК. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
У пошуках паразумення. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Канфрантацыя. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
Свая кашуля бліжэй да цела. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173
Аперацыя "Вострая Брама". . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
**ЧАСТКА 3.** Схватка даўжынёй ў 10 гадоў . . . . . . . . . . . . . 188
З Рудніцкай пушчы ў Рускую (Гродзенскую) . . . . . . . . . . . . 188
Калі вайна адкацілася на Захад. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
Пеленгатар зафіксаваў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
"Рагнар" і другія. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 210
Пасля загаду пра роспуск АК. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218
Атаманшы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Пераломны 1948-ы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 225
Няўлоўны "Олех". . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
Вяртанне нелегалаў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 230
Свой сярод чужых. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232
Тэрор і яго ахвяры. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Адзіночкі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
Было, прайшло, не вернецца... Замест заключэння . . . . . . . 245
Максімальнае прыбліжэнне да берагу праўды
Пасляслоўе. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
Тлумачэнне незразумелых словаў і назваў арганізацыяў,
якія сустракаюцца ў кнізе. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 255
Крыніцы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 258

Навукова-папулярнае выданне

**Сямашка** Яўген Іванавіч
**АРМІЯ КРАЁВА НА БЕЛАРУСІ**

Адказны за выпуск **В. А. Санько**
Рэдактар **В. А. Санько**
Мастакі **А. І. Раманцоў, А. І. Цыркуноў**
Мастацкі рэдактар **В. А. Ярмоленка**
Тэхнічны рэдактар **Т. А. Тарасенка**
Карэктар **Р. С. Ахрэмчык**

Камп 'ютарны набор.
Здадзена ў набор 16.2.1994 г. Падпісана да друку 17.05.94 г.
Фармат 60х84/16. Папера кніжна-журнальная. Ул. выд. арк. 17,8.
Ум. друк. арк. 17,25.
Тыраж 25 000 экз. Ліцэнзія ЛВ № 119. Зак. 1072.

Беларускае выдавецкае Таварыства "Хата". 220029, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 31. Заснавальнік Беларускі дзіцячы фонд.

Гродзенская абласная ўзбуйнёная друкарня
230003, г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 2

"Армія Краёва: зараджэнне, дзейнасць, фініш. Невядомыя старонкі беларускай гісторыі. І не толькі беларускай -- польскай, рускай, літоўскай, украінскай таксама.

Жыццё даваеннай і пасляваеннай Беларусі ў непрыфарбаваным выглядзе. Дэпартацыі. Рэпрэсіі. Падполле. Дыверсіі. Тэрор.

Жорсткія кровапралітныя схваткі. Клубок супярэчнасцяў.

Трагічныя лёсы ўдзельнікаў драматычных падзеяў суровага ваеннага часу.

Пошукі выйсця з заблытаных гістарычных лабірынтаў. Два бакі рэабілітацыі.

Гародня, Вільня, Палессе, Менск, Варшава, Ліда, Масква, Лондан -- у гэтых і другіх мясцінах жывуць і змагаюцца героі і антыгероі кнігі.

Першая кніга на Беларусі і СНД (СССР), дзе амаль поўная непрычасаная праўда пра Армію Краёву.

Гэта не чытанка для душы, **гэта кніга для роздуму і сэрца**".